чалавек і грамадства

АСНОВЫ СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

АКАДЭМІЯ ПЕДАГАГІЧНЫХ НАВУК СССР
НДІ агульнай сярэдняй адукацыі

чалавек і грамадства

АСНОВЫ СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Вучэбны дапаможнік для вучняў сярэдніх навучальных устаноў

МІНСК
«НАРОДНАЯ АСВЕТА»
1992

ББК 60я721
Ч-16

Вучэбны дапаможнік для выпускных класаў
падрыхтаваны лабараторыяй грамадазнаўчай
адукацыі НДІ агульнай сярэдняй адукацыі
АПН СССР

Кіраўнік аўтарскага калектыву праф. ***Л. Н. Багалюбаў;***
нам. кіраўніка канд. пед. навук ***А. Ю. Лазебнікава***

Аўтары:

Л. Н. Багалюбаў — § 16 (сумесна з *А. Ю. Лазебнікавай*), § 17—20, § 21 (сумесна з *Л. Ф. Івановай*); *Я. А. Глушкоў* — § 23, 25, 26; *Я. І. Жыльцова* — § 27—31; *Л. Ф. Іванова* — § 9, 10, 13; *А. Ю. Лазебнікава* — § 1—8, 15, 37; *А. І. Мацвееў* — § 24; *Ю. Я. Сакалоў* — § 11, 12, 14; *І. Н. Сухалет* — § 32—34, 38; *Э. М. Ягорава* — § 35, 36.

Пераклад зроблены па ратапрынтнаму выданню: Человек и общество. Основы современной цивилизации: Учеб. пособие для учащихся сред. учеб. заведений/(Л. Н. Боголюбов, Е. А. Глушков, Е. И. Жильцова и др.: В 5 вып.— М., 1991.

Перакладчыкі:
Р. С. Ахрэмчык, М. Г. Вінаградава, В. М. Захарэвіч,
Н. Ф. Лапіцкая, Т. Ю. Пшыркова, Т. А. Саўрыцкая

Чалавек і грамадства. Асновы сучаснай цывіЧ-16 лізацыі: Вучэб. дапам. для вучняў сярэд. навуч. устаноў / Л. Н. Багалюбаў, Я. А. Глушкоў, Я. І. Жыльцова і інш.— Мн.: Нар. асвета, 1992.— 335 с.
ISBN 5-341-00968-1.

Человек и общество. Основы современной цивилизации: Учеб. пособие для учащихся сред. учеб. заведений.

4306020800—003
Ч ——————— 137-92
М 303(03)—92

ББК 60я721

© Коллектив авторов, 1991
© Пераклад на беларускую мову. Р. С. Ахрэмчык, М. Г. Вінаградава, В. М. Захарэвіч, Н. Ф. Лапіцкая, Т. Ю. Пшыркова, Т. А. Саўрыцкая, 1992

ISBN 5-341-00968-1

Перад вамі падручнік з незвычайнай назвай — «Чалавек і грамадства». Ёсць падручнікі гісторыі: іх фундамент — гістарычная навука; падручнікі фізікі, хіміі, біялогіі — яны таксама тлумачаць асновы навук, назвы якіх супадаюць з назвай вучэбнага прадмета. Якія ж веды дае курс «Чалавек і грамадства»? Ён аб'ядноўвае групу навук, што называюцца «сацыяльнымі» («грамадскімі»). Падручнік змяшчае неабходныя кожнаму выпускніку школы звесткі з такіх грамадскіх навук, як філасофія, эканамічная тэорыя, сацыялогія, паліталогія.

Кожны з вас узаемадзейнічае з грамадствам, уступае з іншымі людзьмі ў эканамічныя, палітычныя, маральныя і іншыя адносіны. Разумець сацыяльны механізм не менш важна, чым законы прыроды. Курс «Чалавек і грамадства» закліканы даць вам такія веды, якія дапамогуць правільна арыентавацца ў сучасным свеце, бачыць магчымасці рэалізацыі сваіх здольнасцей. Усе разумеюць, што на вытворчасці прымаць рашэнні патрэбна з веданнем справы. Але і ў любой іншай сацыяльнай дзейнасці поспех прыходзіць толькі да тых, хто ведае яе спосабы, хто разумее «што да чаго».

Звярніце вашу ўвагу таксама на падзагаловак падручніка. Часам гавораць аб «цывілізаваных» і «нецывілізаваных» грамадствах, аб дасягненнях сусветнай цывілізацыі. У нашай краіне ўмацоўваецца перакананне ў тым, што стварыць для чалавека чалавечыя ўмовы жыцця, пры якіх людзі стануць разумнейшымі, прыгажэйшымі, дабрэйшымі, можна толькі абапіраючыся на каштоўнасці сусветнай цывілізацыі. Для таго каб супольнасць людзей развівалася да больш высокіх ступеней жыцця, яна не павінна зноў і зноў вынаходзіць кола або паравую машыну, а, выкарыстоўваючы ўсё

каштоўнае, што апраўдала сябе ў шматвекавой гісторыі, на гэтай глебе ствараць новае. Чалавеку ўласціва перш чым што-небудзь рабіць ставіць перад сабой мэту. Ва ўсе часы складвалася ўяўленне аб ідэальных грамадскіх парадках, пры якіх наступіць гармонія чалавека, прыроды, грамадства. Але нагадаем словы А. І. Герцэна: «Ідэал для кожнай эпохі — яна сама, ачышчаная ад выпадковасці, перайначанае сузіранне сучаснага. Зразумела, чым больш усеабдымнае і поўнае сучаснае, тым сусветнейшы і сапраўднейшы яго ідэал». Лепш зразумець ідэю стварэння ў нашай краіне гуманнага, дэмакратычнага грамадства, шляхі яе ажыццяўлення павінна дапамагчы вам гэта вучэбная кніга.

Аддзел першы.

НА ШЛЯХУ ДА СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Раздзел І. МЫСЛІЦЕЛІ МІНУЛАГА І СУЧАСНАСЦІ АБ ГРАМАДСТВЕ І ЯГО РАЗВІЦЦІ

§ 1. ГРАМАДСТВА І ГРАМАДСКІЯ АДНОСІНЫ

Што такое грамадства

На першы погляд здаецца, што адказаць на гэта пытанне нескладана. Сапраўды, паняцце «грамадства» даўно і трывала ўвайшло ў наш навуковы і штодзённы лексікон. Але як толькі мы робім спробу даць яму азначэнне, адразу пераконваемся, што такіх азначэнняў можа быць мноства. Давайце паспрабуем успомніць знаёмыя нам устойлівыя словазлучэнні, у якія ўваходзіла б гэта слова. Напрыклад: грамадства кнігааматараў, дваранскае грамадства, педагагічнае грамадства. У гэтым выпадку пад грамадствам мы разумеем пэўную групу людзей, якія аб'ядналіся для зносін, сумеснай дзейнасці, узаемадапамогі і падтрымкі адзін аднаго.

Але вось другі шэраг звязаных паняццяў: першабытнае грамадства, феадальнае грамадства, французскае грамадства. Тут ужо, ужываючы паняцце «грамадства», мы маем на ўвазе пэўны этап гістарычнага развіцця чалавецтва або канкрэтную краіну. Калі і далей рухацца па гэтай логіцы разважання (ад прыватнага да агульнага), то грамадствам называюць і чалавецтва ў цэлым — у яго гістарычным і перспектыўным развіцці. Гэта ўсё насельніцтва Зямлі, сукупнасць усіх народаў. Іншымі словамі — гэта частка матэрыяльнага свету, якая адасобілася ад прыроды і ўключае ў сябе спосабы ўзаемадзеяння людзей і формы іх аб'яднання.

Апошняе з прыведзеных азначэнняў грамадства ёсць значэнне паняцця ў шырокім сэнсе. Паспрабуем разабрацца ў гэтым азначэнні больш грунтоўна.

Грамадства і прырода

Пачнём з палажэння аб тым, што грамадства — гэта адасобленая ад прыроды (у дадзеным выпадку пад прыродай разумеецца сукупнасць натуральных умоў існавання чала-

века) частка свету. У чым жа заключаецца гэта адасабленне? У адрозненне ад стыхійных прыродных сіл у цэнтры грамадскага развіцця стаіць чалавек, які мае свядомасць і волю. Прырода ж існуе і развіваецца па сваіх уласных, незалежных ад чалавека і грамадства законах. Ёсць і яшчэ адна акалічнасць: чалавечае грамадства выступае ў якасці творцы, пераўтваральніка, стваральніка культуры. Само слова «культура» ў шырокім сэнсе азначае ўсё створанае чалавекам — гэта створаная чалавекам «другая прырода», якая як бы надбудавана над прыродай натуральнай. Усё гэта спараджала ўяўленні аб тым, што чалавек і грамадства ў сваёй дзейнасці супрацьпастаўляюцца прыродзе. Адносіны да прыроды як да нечага неаформленага, больш нізкага, чым культура, ставяць чалавека ў пазіцыю заваёўніка, пакарыцеля прыроды. Успомнім вядомыя словы тургенеўскага героя Базарава: «Прырода — не храм, а майстэрня, і чалавек у ёй працаўнік». Да чаго вядзе і ўжо прывяла гэта пазіцыя, сёння добра вядома. Небяспечнае для жыцця чалавека забрудненне асяроддзя яго знаходжання, паступовае вычэрпванне прыродных рэсурсаў выклікала экалагічны крызіс, стварыла пагрозу самому існаванню чалавецтва.

Сёння вельмі важна ўсведамляць непарыўную сувязь прыроды і грамадства, якая носіць узаемны характар. З аднаго боку, прыроднае асяроддзе, геаграфічныя і кліматычныя асаблівасці значна ўздзейнічаюць на грамадскае развіццё. Гэтыя фактары могуць паскараць або запавольваць тэмп развіцця краін і народаў, рабіць уплыў на грамадскі падзел працы. Чытаем, напрыклад, у Ключэўскага аб уплыве рэк на гаспадарчае і грамадскае жыццё славян: «З'яўляючыся гатовымі першабытнымі шляхамі, рачныя басейны сваімі рознабаковымі напрамкамі рассейвалі насельніцтва па сваіх галінах. Па гэтых басейнах рана абазначыліся розныя мясцовыя групы насельніцтва, плямёны, на якія старажытны летапіс падзяляе рускае славянства IX—X стст... Але гэта цэнтрабежнае дзеянне рачной сеткі стрымлівалася другой яе асаблівасцю. Узаемная блізкасць галоўных рачных басейнаў раўніны... не дазваляла часткам насельніцтва, што размяшчаліся па іх, адасабляцца адзін ад аднаго, замыкацца ў ізаляваныя гідраграфічныя клеткі, падтрымлівала зносіны паміж імі, падрыхтоўвала народнае

адзінства і садзейнічала дзяржаўнаму аб'яднанню краіны».

З другога боку, грамадства робіць уплыў на прыроднае асяроддзе жыцця чалавека. Аб узмацненні адмоўнага ўздзеяння на прыроду гаспадарчай дзейнасці сучаснага чалавека мы ўжо ўпаміналі, а грунтоўная размова аб гэтым наперадзе. Тут жа адзначым, што гісторыя чалавецтва сведчыць як аб дабрачынным уплыве дзейнасці людзей на прыроднае асяроддзе пражывання, так і аб пагібельных яе выніках. Так, у свой час былі асушаны балоцістыя багны вакол Фларэнцыі, якія сталі затым квітнеючымі землямі. Сады і вінаграднікі на схілах Каўказскіх гор, таксама як цудоўныя гаі на астравах Ціхага акіяна,— справа рук чалавека. Разам з тым вядомы выпадкі, калі няўмелае гаспадаранне ператварала ўрадлівыя ўчасткі ў пустыні, статкі хатніх жывёл вытоптвалі глебу, аб'ядалі падрост. Так, аб антычнай Грэцыі гаварылі, што яе магутнасць «з'елі» козы, што распладзіліся паўсюдна.

Такім чынам, вяртаючыся да таго азначэння паняцця грамадства, з якога мы пачыналі свае разважанні, удакладнім: гаворачы аб адасабленні грамадства ад прыроды, мы маем на ўвазе яго якасную спецыфіку, але не адарванасць ад прыроды і працэсаў яе натуральнага развіцця.

Жыццё ва ўзаемасувязі

У другой частцы нашага азначэння паняцця «грамадства» падкрэслена ідэя ўзаемасувязі людзей і ўзаемадзеяння розных сфер грамадскага жыцця. У філасофскай літаратуры грамадства азначаецца як дынамічная сістэма. Новае паняцце «сістэма» можа здацца складаным, але ёсць сэнс у ім разабрацца, таму што ў свеце нямала аб'ектаў, якія ахопліваюцца гэтым паняццем. Да іх адносяцца назіраемы намі Сусвет, культура асобнага народа, ды і дзейнасць самога чалавека можна апісаць, выкарыстоўваючы гэта паняцце. Слова «сістэма» мае грэчаскае паходжанне, азначае цэлае, складзенае з частак, сукупнасць. Такім чынам, кожная сістэма ўключае ўзаемадзеючыя часткі: падсістэмы і элементы. Галоўнае значэнне набываюць сувязі і адносіны паміж часткамі. Дынамічныя сістэмы дапускаюць розныя змяненні, развіццё, узнікненне новых і адміранне старых частак і сувязей паміж імі.

Грамадства складаецца з велізарнай колькасці

элементаў і падсістэм, што складаюць яго, якія абнаўляюцца і знаходзяцца ў зменлівых сувязях і ўзаемадзеяннях.

Паспрабуем вылучыць некаторыя з гэтых частак і прасачыць сувязі паміж імі. Да ліку падсістэм можна аднесці, у першую чаргу, сферы грамадскага жыцця. Іх вылучаюць некалькі: эканамічная (адносіны ў працэсе матэрыяльнай вытворчасці), сацыяльная (узаемадзеянне класаў, сацыяльных слаёў і груп), палітычная (дзейнасць дзяржаўных арганізацый, палітычных партый), духоўная (развіццё і ўзаемадзеянне грамадскай свядомасці, навукі, мастацтва, адукацыі).

Неабходна сказаць, што кожная са сфер грамадскага жыцця таксама з'яўляецца складаным утварэннем, элементы, што складаюць яе, даюць уяўленне і аб грамадстве ў цэлым. Не выпадкова адны даследчыкі разглядаюць грамадства на ўзроўні дзеючых у ім арганізацый (дзяржавы, царквы, сістэмы адукацыі і інш.). Другія — скрозь прызму ўзаемадзеяння сацыяльных супольнасцей. Чалавек уваходзіць у грамадства праз калектыў, з'яўляючыся членам некалькіх калектываў (працоўнага, прафсаюзнага, танцавальнага і інш.). Грамадства ўяўляецца як калектыў калектываў.

Чалавек уваходзіць і ў больш буйныя супольнасці людзей. Ён належыць да пэўнай сацыяльнай групы, класа, нацыі.

Разнастайныя сувязі, якія ўзнікаюць паміж сацыяльнымі групамі, класамі, нацыямі, а таксама ўнутры іх у працэсе эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага, культурнага жыцця і дзейнасці, называюцца грамадскімі адносінамі. Прынята адрозніваць адносіны, якія складваюцца ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, і тыя, што пранізваюць духоўнае жыццё грамадства. Калі першыя забяспечваюць грамадству матэрыяльныя магчымасці існавання і развіцця, то другія (ідэалагічныя, палітычныя, юрыдычныя, маральныя і інш.) ёсць вынік і ўмова ўзаемадзеяння людзей у працэсе стварэння і пашырэння духоўна-культурных каштоўнасцей. Разам з тым, матэрыяльныя і духоўныя грамадскія адносіны знаходзяцца ва ўзаемасувязі і забяспечваюць развіццё грамадства.

Праілюстраваць сувязі паміж падсістэмамі і элементамі грамадства можна рознымі прыкладамі. Так, вывучэнне далёкага мінулага чалавецтва дало магчымасць вучоным зрабіць вывад аб тым, што ма

ральныя адносіны людзей ва ўмовах першабытнасці будаваліся на калектывісцкіх пачатках, гэта значыць, кажучы на сучаснай мове, прыярытэт заўсёды аддаваўся калектыву, а не асобнаму індывіду. Вядома таксама, што маральныя нормы, якія існавалі ў многіх плямён тых архаічных часоў, дапускалі забойства слабых членаў роду: хворых дзяцей, старых, і нават людаедства. Ці зрабілі ўплыў на гэтыя ўяўленні і погляды людзей аб межах маральна дапушчальнага рэальныя матэрыяльныя ўмовы іх існавання? Адказ ясны. Неабходнасць сумесна здабываць матэрыяльныя даброты, асуджанасць на хуткую пагібель чалавека, які адарваўся ад роду,— у гэтым трэба шукаць вытокі калектывісцкай маралі. Таксама з пазіцый барацьбы за існаванне і выжыванне людзі не лічылі амаральным вызваляцца ад тых, хто мог стаць цяжарам для калектыву

Добра прасочваецца сувязь прававых норм і сацыяльна-эканамічных адносін. Звернемся да вядомых вам гістарычных фактаў. У адным з першых зводаў законаў Кіеўскай Русі, які называецца «Руская праўда», прадугледжаны розныя пакаранні за такія злачынствы, як забойства. Пры гэтым мера пакарання вызначалася ў першую чаргу месцам чалавека ў сістэме іерархічных адносін, яго прыналежнасцю да таго ці іншага сацыяльнага слоя або групы. Так, штраф за забойства цівуна (управіцеля) быў вялізны: ён быў роўны кошту статка ў 80 валоў або 400 бараноў Жыццё смерда або халопа цанілася ў 16 разоў танней.

Жыццё ў руху

Няма неабходнасці даказваць, што грамадскае жыццё знаходзіцца ўвесь час у змяненні. Тэмпы і маштабы гэтых змяненняў могуць быць рознымі: у гісторыі чалавецтва былі перыяды, калі ўстаноўлены парадак жыцця не мяняўся ў сваіх асновах стагоддзямі; з цягам часу тэмпы змяненняў пачалі павялічвацца. Паступова ўзнікла разуменне таго, што гэтыя змяненні не носяць хаатычнага характару. Узнікла ідэя грамадскага прагрэсу (ад лац.— рух наперад). Нямецкі філосаф пачатку XIX ст. Гегель сцвярджаў, што грамадскае развіццё ёсць рух наперад ад недасканалага да больш дасканалага. Але што ж выступае крытэрыем (мерай, меркай) прагрэсу?

На гэта пытанне даюцца розныя адказы. Прывядзём некаторыя з найбольш распаўсюджаных і абгрунтаваных пунктаў погляду:

«Крытэрый прагрэсу — у развіцці розуму. Галоўная прычына чалавечых бядот — гэта невуцтва, цемрашальства. Паступова ўплыў розуму, ведаў узрастае, што паляпшае сацыяльныя адносіны».

«Меркай прагрэсу выступае мараль. Менавіта ўдасканаленне маральных норм, развіццё грамадскай маралі ляжыць у аснове ўдасканалення ўсіх бакоў жыцця грамадства. Чалавецтва прайшло складаную эвалюцыю ад прымітыўнай першабытнай маралі спачатку да саслоўна і класава-абмежаваных норм маралі і, нарэшце, да прызнання агульначалавечых маральных каштоўнасцей».

«Галоўным крытэрыем прагрэсу выступае ўзровень развіцця прадукцыйных сіл, якія ўключаюць у сябе сродкі вытворчасці (прылады працы, прадмет працы), а таксама людзей як вытворцаў матэрыяльных даброт. Крок за крокам, усё больш паскараючыся, ішоў працэс удасканалення прылад працы ад прымітыўнага рубіла да сучаснай камп'ютэрнай тэхнікі. Увесь час удасканальваліся і працоўныя навыкі людзей. У выніку адбываўся рост прадукцыйнасці працы, што рабіла ўздзеянне на ўсе бакі жыцця грамадства».

Вызначце свае адносіны да прыведзеных пунктаў погляду. Ці ёсць, на вашу думку, іншыя крытэрыі грамадскага прагрэсу? Ці можа быць меркай развіцця адзін паказчык альбо яны павінны выступаць у комплексе?

Ведаць грамадства, у якім жывеш

Грамадскае жыццё, як мы ўжо пераканаліся, складанае і шматграннае, таму яго вывучаюць многія навукі, якія атрымалі назву грамадскіх (гісторыя, філасофія, сацыялогія, паліталогія, праваznаўства, этыка, эстэтыка і іншыя). Кожная з іх разглядае пэўную галіну грамадскага жыцця. Так, юрыспрудэнцыя даследуе сутнасць і гісторыю дзяржавы і права. Прадметам этыкі з'яўляюцца нормы маралі, эстэтыкі — законаў мастацтва, мастацкай творчасці людзей. Найбольш агульныя веды аб грамадстве ў цэлым даюць такія навукі, як філасофія і сацыялогія.

Мы ўжо адзначалі, што грамадства мае сваю спецыфіку ў параўнанні з прыродай. «...Ва ўсіх галінах прыроды... пануе пэўная заканамернасць, незалежная ад існавання разумнага чалавецтва...»,— пісаў буйнейшы вучоны-фізік М. Планк, таму прыродазнаўства можа займацца вывучэннем гэтых аб'ектыўных законаў

развіцця, незалежных ад чалавека. Грамадства ж — гэта не што іншае як сукупнасць людзей, якія маюць волю і свядомасць, ажыццяўляюць дзеянні і ўчынкі пад уплывам пэўных інтарэсаў, матываў, настрояў. Ці дзейнічаюць у сацыяльнай рэчаіснасці аб'ектыўныя, гэта значыць незалежныя ад свядомасці людзей, законы развіцця? Ці можна вывучаць грамадскае жыццё ў адрыве ад разнастайнасці поглядаў, інтарэсаў, намераў людзей? Калі не, то ці можна прызнаць грамадазнаўства навукай, якая дае дакладныя і аб'ектыўныя веды аб свеце?

Гэтыя пытанні даўно паўставалі перад даследчыкамі грамадскага жыцця. І адказы на іх даваліся і даюцца розныя. Так, філосафы-неапазітывісты (ад лац.— станоўчы) зыходзяць з таго, што сацыяльныя з'явы падпарадкоўваюцца законам, агульным для ўсёй рэчаіснасці, і ў іх пазнанні можна выкарыстоўваць дакладныя метады сацыяльнага даследавання, а сацыялогія як навука павінна быць свабоднай ад сувязей з ідэалогіяй, што патрабуе аддзялення ў ходзе канкрэтнага даследавання рэальных фактаў ад іх суб'ектыўных ацэнак. У рамках другога філасофскага напрамку — фенаменалогіі (ад грэч.— узнікаючы) зроблена спроба ўстараніць процістаянне аб'ектыўных з'яў і чалавека, які іх пазнае. Прыхільнікі гэтага напрамку імкнуцца асэнсаваць сацыяльны свет у суаднясенні з мэтамі, ідэямі і матывамі рэальна дзеючых людзей. Такім чынам, у цэнтры вывучэння аказваецца сам «перажываючы» чалавек і ўспрыманне свету праз прызму адносін да яго індывіда.

Хто ж правы ў гэтай спрэчцы? А можа абодва пункты погляду з'яўляюцца недасканалымі з-за аднабаковасці? Не будзем спяшацца з адказамі.

Каб лепш разабрацца ў рэальна існуючым грамадстве, характары грамадскіх адносін, у шляхах і спосабах пазнання сацыяльных з'яў, звернемся да гісторыі развіцця грамадскай думкі. Але аб гэтым гутарка пойдзе ў наступных параграфах.

Пытанні і заданні

1. Што трэба разумець пад грамадствам у шырокім і вузкім сэнсе слова?
2. Якая ўзаемасувязь грамадства і прыроды? У чым заключаецца спецыфіка грамадскіх з'яў?
3. Чаму грамадства можна характарызаваць як сістэму?

4. Якія асноўныя сферы жыццядзейнасці грамадства? Прасачыце сувязі паміж імі.

5. Прывядзём выказванне К. Маркса: «Вазьміце пэўную ступень развіцця вытворчасці, абмену і спажывання і вы атрымаеце пэўны грамадскі лад, пэўную арганізацыю сям'і, саслоўяў або класаў,— адным словам, пэўнае грамадзянскае грамадства» (Творы. Т. 27. С. 402). Раскрыйце змест гэтага палажэння. Сувязь паміж якімі сферамі грамадскага жыцця прасочваецца ў ім?

6. Узаемасувязь паміж маральнасцю асобы і яе сацыяльнакласавым становішчам К. Маркс паказвае наступным чынам: «У рэспубліканца — іншае сумленне, чым у раяліста, у заможнага іншае, чым у незаможнага, у разумнага — іншае, чым у таго, хто не здольны думаць» (Творы. Т. 6. С. 140). Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

7. Што разумеецца пад грамадскімі адносінамі? Якая іх класіфікацыя?

8. Што такое грамадскі прагрэс і якія яго крытэрыі?

9. Вядомы амерыканскі сацыёлаг мінулага стагоддзя Г. Спенсер сцвярджаў, што крытэрыем сацыяльнага прагрэсу выступае пераход ад грамадства, у якім асоба цалкам падпарадкавана сацыяльнаму цэламу, да такога стану, пры якім грамадства «служыць» індывідам, што складаюць яго.

Ці можна згадзіцца з гэтым сцверджаннем? Свой адказ абгрунтуйце.

Якія іншыя падыходы да вызначэння крытэрыяў грамадскага прагрэсу вам вядомы?

10. Якія навукі вывучаюць грамадства? У чым спецыфіка пазнання сацыяльных з'яў?

11. Існуе пункт погляду, згодна з якім грамадазнаўства нельга аднесці да строгай навукі, гэта значыць яно непарыўна звязана з інтарэсамі людзей, з існуючымі ідэалагічнымі плынямі. Якія вашы адносіны да гэтай пазіцыі?

12. Адным з асноўных метадаў пазнання ў прыродазнаўчых навуках з'яўляецца эксперымент. Як вы лічыце, ці можна дапусціць эксперыменты ў сацыяльным пазнанні?

13. Вядомы нямецкі сацыёлаг М. Вебер лічыў, што даследчык-грамадазнавец, таксама як і выкладчык, павінен быць непрадузятым у пошуках і раскрыцці навуковай ісціны. «Калі ў народным сходзе гавораць аб дэмакратыі, то са сваёй асабістай пазіцыі не робяць ніякай тайны... Словы, якія пры гэтым ужываюцца, выступаюць у гэтым выпадку не як сродак навуковага аналізу, а як сродак палітычна завербаваць іншых... Наадварот, на лекцыі або ў аўдыторыі было б злачынствам карыстацца словамі такім чынам. Тут патрэбна, калі, напрыклад, гутарка ідзе аб дэмакратыі, паказаць яе розныя формы, прааналізаваць, як яны функцыяніруюць, устанавіць, якія асобныя вынікі жыццёвых адносін мае тая ці іншая з іх... і імкнуцца, наколькі гэта ўдасца, да таго, каб слухач быў у стане знайсці пункт, зыходзячы з якога ён мог бы заняць пазіцыю ў адпаведнасці са сваімі вышэйшымі ідэаламі. Але добры настаўнік не стане навязваць слухачу з кафедры якую-небудзь пазіцыю, няхай сабе шчыра ці шляхам пераканання...» (Вебер М. Выбр. творы. М. 1990. С. 721—722).

Ці падзяляеце вы выказаны тут пункт погляду? Сваю пазіцыю абгрунтуйце.

§ 2. РАЗВІЦЦЁ ВЕДАЎ АБ ГРАМАДСТВЕ

Міфы старажытнасці

Людзі здаўна спрабавалі растлумачыць існаванне грамадства. Як узнікае грамадства? Як яно развіваецца? Куды яно ідзе ў сваім развіцці, якія яго перспектывы? Адказы на гэтыя пытанні вызначаліся ўзроўнем развіцця канкрэтнага грамадства.

На ранняй стадыі грамадскага развіцця асноўным спосабам разумення свету з'яўляецца *міфалогія* (ад грэч.— паданне, сказанне і — слова, вучэнне). Міфы існавалі ва ўсіх народаў. Старажытныя паданні аб фантастычных істотах, аб справах багоў і герояў тлумачылі сацыяльную рэчаіснасць. З дапамогай міфа мінулае звязвалася з цяперашнім і будучым, забяспечвалася духоўная сувязь пакаленняў. Перадаваліся з пакалення ў пакаленне духоўныя каштоўнасці, пачаткі ведаў, рэлігійныя вераванні, палітычныя погляды, розныя віды мастацтва і інш.

Такім чынам, у міфалогіі выказваецца надзённая патрэба чалавека ў асэнсаванні сябе самога і навакольнага свету. І гэта патрэба ўвасабляецца ў разнастайных фантастычных варыянтах карцін рэальнага свету. У старажытных міфах аб паходжанні свету і людзей вылучаюцца дзве ідэі: ідэя стварэння (свет створаны нейкай звышнатуральнай істотай — богам, вялікім чарадзеем) і ідэя развіцця (свет паступова развіўся з нейкага бясформеннага стану — хаосу, вады, яйка і г. д.). Своеасаблівае спалучэнне гэтых двух пачаткаў можна ўбачыць у міфе аб паходжанні Японіі са свяшчэннай кнігі «Кодзікі» (летапіс). Багі Ідзанагі і Ідзанамі па вясёлцы спускаліся з нябёсаў, каб аддзяліць зямлю ад неба. Ідзанагі стукнуў волатаўскім кап'ём па бездані, якая зыбка хісталася ўнізе. З яго кап'я скацілася чарада кропель і, застыўшы, утварыла выгнуты ланцуг астравоў.

Вялікая колькасць міфаў прысвечана працы людзей, іх побыту, звычаям. Прыкладам можа быць індыйская «Рамаяна», карэла-фінская «Калевала» і іншыя, дзе сабраны міфы, якія расказваюць аб жыцці людзей.

Мара аб «залатым веку»

У класавым грамадстве адказы на пытанні аб узнікненні і развіцці грамадства разам з міфалогіяй давалі *рэлігія* і *філасофія*.

У будызме — адной са старажытных сусветных

рэлігій — сцвярджалася, нібы пасля «залатога веку» чалавецтва наступіў перыяд няроўнасці людзей, падманаў і несправядлівасці, таму людзі выбралі цара. Правіцель павінен быў знішчыць варожасць паміж людзьмі.

Міф аб «залатым веку» ідэалізуе першабытны стан грамадства, дзе, яе лічылася, чалавек і прырода былі гарманічна звязаны, дзе былі ўсе свабодныя і роўныя. Ва ўмовах сацыяльнай няроўнасці гэта ператваралася ў ідэал справядлівасці і гуманізму, у мэту пабудовы несправядлівага грамадскага ладу.

Антычныя філосафы Платон і Арыстоцель зыходным пунктам свайго ўяўлення аб ідэальным грамадстве бяруць ідэю аб «залатым веку». Людзі спярша жылі, не ведаючы няроўнасці, не ведаючы войнаў і разладаў. Платон (428/427—348/347 да н. э.) спрабуе зразумець прычыны ўзнікнення няроўнасці людзей, несправядлівасці ў арганізацыі грамадскага жыцця. Паводле Платона людзі маюць патрэбу ў сумесным пасяленні для задавальнення патрэбы ў харчы, жыллі, адзенні. Такое сумеснае пасяленне называецца дзяржавай. Яно забяспечвае ахову насельніцтва і сваіх тэрыторый ад знешніх ворагаў і падтрымлівае парадак унутры краіны. Як зрабіць гэта грамадства справядлівым?

Платон малюе ідэал справядлівай дзяржавы, якой кіруюць таленавітыя і добра падрыхтаваныя, высокаманальныя асобы, што сапраўды здольныя добра кіраваць дзяржавай. Асноўным прынцыпам ідэальнай дзяржавы Платон лічыць Справядлівасць. Кіруючыся справядлівасцю, дзяржава вырашае самыя важныя задачы: абароны людзей, іх забеспячэння матэрыяльнымі дабротамі, стварэння ўмоў для іх творчай дзейнасці і духоўнага развіцця. Платон падзяляе людзей на тры групы. Да першай належаць тыя, у каго пераважае разумны пачатак, развіта пачуццё справядлівасці, імкненне да права. Іх ён называе мудрацамі. Яны павінны быць правіцелямі ў ідэальнай дзяржаве. Тых жа, хто вызначаецца смеласцю, мужнасцю, пачуццём абавязку, Платон адносіць да другой групы — воінаў і «стражаў», якія павінны клапаціцца аб бяспецы дзяржавы. І нарэшце, ёсць людзі, якія павінны займацца фізічнай працай — сяляне і рамеснікі. Яны робяць неабходныя матэрыяльныя даброты. Ва ўяўленнях Платона індывідуальнае павінна быць цалкам пад-

парадкавана ўсеагульнаму: чалавек жыве дзеля дзяржавы, а не дзяржава — дзеля чалавека. Тут яшчэ злітыя паняцці грамадства і дзяржавы.

Арыстоцель (384—322 да н. э.), развіваючы ідэі Платона, адрознівае ўжо разам з дзяржавай сям'ю і пасяленне як асобыя тыпы зносін, але дзяржава стаіць над усім, пры гэтым у Платона і ў Арыстоцеля гутарка ідзе аб дзяржаве свабодных, рабы не лічацца грамадзянамі дзяржавы.

Тэорыя грамадскага дагавору

У перыяд сярэдневякоўя ў Заходняй Еўропе з'явілася ідэя, якая тлумачыла ўзнікненне грамадства як вынік дагавору чалавека з богам. На рубяжы новага часу з'яўляюцца свецкія трактоўкі гэтай ідэі. Новы падыход развіты ў працах англійскіх філосафаў Д. Лока і Т. Гобса. Канцэпцыя апошняга заключаецца ў наступным: у людзей да згоды ёсць пэўныя правы, «абсалютная свабода», роўнасць. Неабмежавана карыстаючыся гэтымі правамі, людзі могуць апынуцца ў стане «вайны ўсіх супраць усіх». Каб не дапусціць гэтага, людзі заключылі мірны грамадскі дагавор, адмовіўшыся ад замаху на свабоду, уласнасць і жыццё адзін аднаго. Гарантам выканання гэтага дагавору выступае дзяржава, на карысць якой грамадзяне адмаўляюцца ад часткі сваёй натуральнай свабоды.

Французскі філосаф, дзеяч Асветы Ж. Ж. Русо (1712—1778), падтрымліваючы ідэю грамадскага дагавору, інакш, чым яго папярэднікі, тлумачыў прычыны яго з'яўлення. На яго думку, чалавек у натуральным стане знаходзіцца ў гармоніі з прыродай. Рост насельніцтва і геаграфічныя прычыны вядуць да ўзнікнення супрацоўніцтва і саперніцтва. Натуральная няроўнасць у сілах і талентах людзей са з'яўленнем прыватнай уласнасці вядзе да няроўнасці палітычнай. Каб прадухіліць пастаянныя сутычкі магутных і абяздоленых, устанавіць грамадзянскі мір, людзі прыходзяць да неабходнасці заключыць грамадскі дагавор. У адпаведнасці з ім «чалавек траціць натуральную свабоду... набывае ж ён свабоду грамадзянскую і права ўласнасці на ўсё, што ў яго ёсць». Любыя правіцелі — толькі прадстаўнікі народа, які заўсёды можа адмовіцца ад любога раней прынятага закону і прыняць новы.

Працоўнае грамадства Сміта

Шэраг новых і плённых ідэй, якія раскрываюць прыроду чалавека, характар грамадскіх адносін, быў выказаны ў XVIII ст. у працах англійскага эканаміста і філосафа А. Сміта. На думку Сміта, грамадскія сувязі паміж людзьмі ўстанаўліваюцца на аснове грамадскага падзелу працы з наступным абменам пладамі працы. Такім чынам, кожны, працуючы на сябе, вымушаны працаваць на іншых, і, наадварот, працуючы на іншых, працуе на сябе.

Праца, імкненне кожнага чалавека да шчасця выступаюць галоўнымі крыніцамі грамадскага багацця. Высока ацэньваючы з эканамічнага пункту погляду значэнне грамадскага падзелу працы, Сміт бачыў і яго недахопы: узмацняецца аднабаковасць развіцця людзей. Аднак яе, лічыў Сміт, можна пераадолець шляхам увядзення ўсеагульнай адукацыі.

Сміт вылучаў тры асноўныя ўмовы росквіту дзяржавы: панаванне прыватнай уласнасці, неўмяшанне дзяржавы ў эканоміку, адсутнасць перашкод для развіцця асабістай ініцыятывы. У класавай структуры грамадства Сміт вылучыў наступныя асноўныя класы: наёмных рабочых, капіталістаў і буйных зямельных уласнікаў, адрозніваючы іх галоўным чынам па крыніцах даходу: заработная плата, прыбытак, рэнта (даход, атрымліваемы з зямлі і не звязаны з прадпрымальніцкай дзейнасцю).

Становішча, пры якім інтарэсы рабочых процілеглыя інтарэсам маёмных класаў, Сміт лічыў непазбежным.

Значная роля Сміта ў гісторыі цывілізацыі вызначаецца тым, што яго ідэі зрабілі вялікі ўплыў на развіццё навуковай думкі, а таксама на настрой розумаў многіх перадавых людзей першай палавіны XIX ст. У прыватнасці, гэта ўздзеянне адчулі на сябе дзекабрысты ў Расіі. У час следства па іх справе сярод названых у анкетах аўтараў, творы якіх маглі стаць крыніцай «вальнадумных і ліберальных думак», дзекабрысты часта звярталіся да імя Сміта. У Сміта, у першую чаргу, прыцягвала ідэя свабоды, асуджэнне ўсіх форм феадальнага прыгнёту.

Наперад, да «залатога веку»

Французскія філосафы А. Сен-Сімон, Ш. Фур'е і брытанец Р. Оуэн у канцы XVIII — пачатку XIX ст. марылі аб справядлівым грамадстве, якое ляжыць не ў мінулым, а прыйдзе ў будучым. Яны ства-

рылі ідэал сацыялістычнага грамадства, працягваючы справу вялікіх утапістаў XVI ст. Т. Мора, Т. Кампанелы і інш. Назва «утапісты» пайшла ад кнігі Т. Мора «Утопія». Сучасны пераклад гэтага тэрміна мае дзве версіі: 1) месца, якога няма; 2) благаславенная краіна. Сутнасць тэорый Сен-Сімона і Фур'е заключалася ў адлюстраванні ідэальнага грамадскага ладу.

У такім грамадстве існуе сацыяльная гармонія і агульнасць інтарэсаў усіх грамадзян, свабодная творчая праца і раўнапраўе ў магчымасці прымянення сваіх здольнасцей. Прамысловая вытворчасць і сельская гаспадарка развіваюцца на аснове дзяржаўнага планавання. Усе члены грамадства абавязкова працуюць, і размеркаванне даброт ажыццяўляецца па працы. Адсутнічае эксплуатацыя чалавека чалавекам.

А. Сен-Сімон, Ш. Фур'е і Р. Оуэн крытыкавалі сучасны ім капіталістычны лад, паказваючы, што грамадства, заснаванае на прыватнай уласнасці і эксплуатацыі, не можа прынесці ні свабоду, ні роўнасць, ні братэрства людзей. Крыніцай асноўных грамадскіх недахопаў яны лічылі прыватную ўласнасць і бачылі ў ёй прычыну крызісаў, анархіі вытворчасці, беспрацоўя. Свет капіталізму, адзначалі сацыялісты-утапісты,— гэта хаос і раз'яднанасць, славалюбства і хцівасць, індывідуалізм і эгаізм, разлад і варожасць.

У перыяд раннекапіталістычнага развіцця пралетарыят быў нешматлікім, жорстка эксплуатуемым з боку буржуазіі класам. Гэты абяздолены клас быў варты толькі спачування і дапамогі. Сацыялісты-утапісты асуджалі прыгнятальнікаў пралетарыяту, складалі утапічныя праекты палягчэння яго лёсу, самі займаліся дабрачыннай дзейнасцю і спрабавалі арганізаваць дапамогу пралетарыяту з боку буржуазіі.

Устанаўленне сацыялістычнага грамадства яны лічылі аб'ектыўным працэсам. Ш. Фур'е гаварыў, што чалавецтва ў сваім развіцці прайшло праз дзікасць, варварства і цывілізацыю і ідзе да грамадства ўсеагульнай гармоніі. Асноўнымі ступенямі грамадскага прагрэсу А. Сен-Сімон аналагічна лічыў пераход ад першабытнага ідалапаклонства да рабства, затым да феадальна-саслоўнага ладу і індустрыяльна-прамысловага. Паводле яго вучэння капіталістычнае грамадства павінна прайсці ў сваім развіцці чатыры фазы: дзяцінства, юнацтва, узмужнеласць і старэнне. Затым прыходзіць час сацыялістычнага грамадства.

Р. Оуэн праверыў на практыцы сваю сістэму ідэй сацыялістычнага грамадства. У ЗША ён арганізаваў абшчыну «Новая гармонія», статус якой засноўваўся на прынцыпах ураўняльнага камунізму. Ідэя, аднак, паглынуўшы амаль усё багацце Оуэна, правалілася. Сацыялісты-утапісты верылі, што варта тэарэтычна або шляхам нагляднага прыкладу прадэманстраваць даброты новай сістэмы грамадскай арганізацыі, каб багатыя добраахвотна адмовіліся ад усіх багацця, а тыя, хто мае ўладу, падтрымалі стварэнне справядлівага грамадства. Яны звяртаюцца да царуючых асоб, дзяржаўных дзеячаў, вядомых пісьменнікаў, палкаводцаў з просьбай ахвяраваць сродкі на перабудову грамадства па сацыялістычнаму ідэалу. Вядома, што Р. Оуэн звяртаўся за дапамогай нават да рускага цара Мікалая I, які славіўся як душыцель свабоды.

Грамадзянскае грамадства Гегеля

Шэраг важных і глыбокіх ідэй аб грамадстве, яго ўзнікненні і шляхах развіцця быў выказаны ў працах выдатнага нямецкага філосафа канца XVIII — пачатку XIX ст. Г. Гегелем.

Мы ўжо адзначалі, што доўгі час паняцці «грамадства» і «дзяржава» разглядаліся як сінонімы. Паступова, па меры развіцця тэарэтычнай думкі, умацоўвалася перакананне ў тым, што грамадства — нешта больш шырокае, чым дзяржава, што ёсць сферы грамадскага жыцця, непасрэдна не рэгулюемыя дзяржавай. Да іх, у першую чаргу, была аднесена сям'я. Новым крокам у развіцці гэтага падыходу стала распрацаванае Гегелем паняцце «грамадзянскае грамадства», якое філосаф вызначаў як «сістэму ўсебаковай залежнасці», дзе «пражытак і дабрабыт адной асобы і яе прававое існаванне пераплецены з пражыткам, дабрабытам і правам усіх, заснаваны на іх і толькі ў гэтай сувязі сапраўдныя і забяспечаныя».

Такім чынам, грамадзянскае грамадства — гэта перш за ўсё сфера матэрыяльнага, эканамічнага жыцця і дзейнасці людзей. Французскі гісторык Гізо лічыў, што адносіны паміж дзяржавай і грамадзянскім грамадствам ёсць адносіны паміж уладай і індывідуальнай свабодай. Гістарычны вопыт паказаў, што, чым больш развіта грамадзянскае грамадства, тым больш падстаў для дэмакратычных форм дзяржавы.

Як жа развіваецца грамадства ў гісторыі? Паводле Гегеля асновай гістарычнага развіцця з'яўляецца

разгортванне «абсалютнай ідэі». Для тлумачэння сэнсу гэтага цэнтральнага паняцця гегелеўскай філасофіі абмяжуемся наступнымі разважаннямі: кожная адзінкавая, пачуццёва ўспрымаемая з'ява мае, апрача знешне выражаных уласцівасцей, сваю скрытую сутнасць, якая аб'ядноўвае увесь клас роднасных з'яў. Чые ж гэта думкі? Паколькі яны ахопліваюць увесь свет — гэта думкі нейкага «духа», якога Гегель называе «сусветным духам» або «абсалютнай ідэяй».

Сусветны дух ахоплівае ў Гегеля і сферу сацыяльнага жыцця. Ён узвышаецца над асобнымі людзьмі і выражаецца ў праве, маралі, рэлігіі. Гісторыю Гегель разглядае як «прагрэс духу ва ўсведамленні свабоды», які выяўляецца праз «дух» асобных народаў, што змяняюць адзін аднаго ў гістарычным працэсе па меры выканання сваёй місіі.

Пераасэнсоўваючы гістарычнае мінулае чалавецтва і ўсе сферы сучаснага яму грамадскага жыцця, Гегель выкарыстаў створаны ім дыялектычны метад, дзякуючы якому філосаф «...упершыню ўявіў увесь прыродны гістарычны і духоўны свет у выглядзе працэсу, гэта значыць у няспынным руху, змяненні, пераўтварэнні і развіцці, і зрабіў спробу раскрыць унутраную сувязь гэтага руху і развіцця» (Маркс К., Энгельс Ф. Творы. Т. 20. С. 23). Паводле гегелеўскай дыялектыкі, крыніцай, «маторам» усялякага, у тым ліку і грамадскага развіцця, выступаюць унутраныя супярэчнасці, якія ўласцівы ўсім рэчам. Такое ж значэнне, як супярэчнасці, мае ў дыялектыцы і паняцце «адмаўленне», што азначае знікненне шэрага зжыўшых сябе рыс пэўнай стадыі развіцця пры захаванні станоўчых уласцівасцей і ўзнікненні новых. Гегель лічыў, што кожны народ ажыццяўляе дыялектычнае адмаўленне культуры сваіх папярэднікаў. Абнаўленне і пераемнасць — неабходныя рысы гістарычнага развіцця.

На шляху да навуковай сацыялогіі

Паняцце «сацыялогія» як навуковае вывучэнне з'яў грамадскага жыцця было ўведзена ва ўжыванне французскім філосафам і сацыёлагам першай палавіны XIX ст. А. Контам. Вызначаючы месца сацыялогіі ў сістэме іншых навук, Конт даў іх агульную класіфікацыю. «Іерархія асноўных навук» такая: матэматыка — астраномія — фізіка — хімія — біялогія (таксама тэрмін Конта) — сацыялогія. Кожная наступная ступень — навука больш высокага парадку,

якая засноўваецца на законах папярэдняй, але і аперыруе сваімі спецыфічнымі для дадзенай галіны ведаў законамі. Такім чынам, вывучаючы сацыяльныя з'явы, неабходна ўлічваць законы біялагічнага развіцця, а таксама выяўляць і даследаваць законы назіраемых грамадскіх з'яў, не шукаючы звышнатуральных прычын змяненняў.

Развіццё сацыялогіі XIX ст. звязана таксама з імем англійскага філосафа і сацыёлага Г. Спенсера. Таксама, як і Конт, ён падтрымліваў ідэю эвалюцыі грамадства як цэласнага арганізма. Галоўны напрамак змяненняў, якія адбываюцца, Спенсер бачыў у росце разнастайнасці ўнутранай дыферэнцыяцыі грамадскага развіцця (сацыяльнае расслаенне, з'яўленне новых арганізацый і г. д.) пры адначасовым узмацненні грамадскіх сувязей. Спенсер вылучае два тыпы грамадства: «ваеннае», дзе супрацоўніцтва людзей у дасягненні агульнай мэты носіць прымусовы характар, і «прамысловае», у якім супрацоўніцтва добраахвотнае. Грамадства як сацыяльны арганізм, на думку Спенсера, складаецца з трох галоўных сістэм: «вырабляючай сродкі для жыцця», «размеркавальнай», «рэгулятыўнай». Апошняя ўключае ў сябе сістэму сацыяльнага кантролю, які трымаецца на страху. «Страх перад жывымі» падтрымлівае дзяржава, а «страх перад мёртвымі» — царква.

Спенсер актыўна абараняў ідэю аб тым, што грамадства не можа і не павінна паглынаць асобу.

У заключэнне адзначым, што новыя ідэі ў сацыялогіі ў XIX ст. толькі прабівалі сабе дарогу. І шмат якімі даследчыкамі грамадства разглядалася як «арганізм», аналагічны арганізмам жывой прыроды.

Пытанні і заданні

1. Якую ролю адыгрывалі міфы ў жыцці першабытнага грамадства? Якія бываюць міфы? Прывядзіце прыклады.
2. Ці захоўваецца міфалагічная свядомасць у сучасных умовах? Чаму?
3. Што ў гісторыі філасофскай думкі разумелася пад «залатым векам»?
4. У чым сутнасць «тэорыі грамадскага дагавору»? Ці можа яна, на вашу думку, служыць тлумачэннем прычын узнікнення дзяржавы?
5. Якія мэты, выказаныя А. Смітам, уяўляюцца вам актуальнымі сёння, а якія з'яўляюцца ўстарэлымі?
6. Чаму вучэнні Сен-Сімона, Фур'е і іх паслядоўнікаў аднесены да утапічных? Што, як вы лічыце, каштоўнае яны ўнеслі ў развіццё ўяўленняў аб грамадстве?

7. Паняцця «грамадзянскае грамадства» многія дзесяцігоддзі ў нашым грамадазнаўстве не было. Сёння яно актыўна ўвайшло ў наш лексікон, шырока выкарыстоўваецца вучонымі, публіцыстамі, палітыкамі. Чым, на вашу думку, гэта выклікана?

§ 3. МАРКСІСЦКАЕ ВУЧЭННЕ АБ ГРАМАДСТВЕ

ч. I

Пытанне аб месцы і ролі марксізму ў сучасным свеце набыло вастрыню. Выказваюцца думкі, што вучэнне гэта ўстарэла і не можа з'яўляцца арыенцірам далейшага развіцця: нарадзіўшыся паўтара стагоддзя назад, яно не ў стане растлумачыць новыя сацыяльныя з'явы і працэсы, узнікненне якіх у рамках дадзенай тэорыі не меркавалася. На думку шэрага даследчыкаў, марксізм ужо ў сваім першапачатковым выглядзе разам з правільнымі вывадамі і глыбокім прадбачаннем меў і памылковыя палажэнні, якія ўзнікалі на аснове абагульнення абмежаванага гістарычнага вопыту асобных, у першую чаргу, еўрапейскіх краін. І менавіта гэтым — недасканаласцю тэорыі марксізму — некаторыя аўтары схільны растлумачыць крызісны стан нашага грамадства. У той жа час выказваецца і абгрунтоўваецца думка аб тым, што, нягледзячы на вядомую гістарычную абмежаванасць марксізму, многае ў ім мае вялікае значэнне, гэта значыць працуе і сёння. Робіцца нават такі вывад, што ў нечым, вельмі важным і істотным, мы не тое, каб перараслі Маркса, а яшчэ не дараслі да яго.

Для таго каб мець сваю абгрунтаваную пазіцыю ў гэтых спрэчках і ўмець яе абараняць, важна разабрацца ў тым, як і чаму ўзнікла марксісцкае вучэнне, якія яго асноўныя ідэі.

Узнікненне марксізму

Стварэнне марксісцкага вучэння адносіцца да сярэдзіны XIX ст. Што гэта быў за час? Нагадаем некаторыя гістарычныя факты. Па Еўропе праносіцца хваля буржуазных рэвалюцый, змятаючы адзін за адным феадальныя рэжымы, якія яшчэ захаваліся. У тых жа краінах, дзе капіталізм ужо ўсталяваўся, з'яўляюцца адзнакі першых эканамічных крызісаў. Скінуўшы феадальна-саслоўнае адзенне, сацыяльная рэчаіснасць паўстала як прамое процістаянне класаў: пралетарыяту і буржуазіі. Рабочыя ўжо заявілі аб сабе як сама-

стойнай палітычнай сіле першымі масавымі выступленнямі ў Францыі, у Германіі.

Усе гэтыя падзеі, рэальная грамадская сітуацыя гэтага перыяду зрабілі сур'ёзны ўплыў на светапогляд, грамадскія і палітычныя погляды К. Маркса і Ф. Энгельса — стваральнікаў новай тэорыі грамадскага развіцця. Аднак не толькі асэнсаванне сацыяльнай рэчаіснасці стала крыніцай новых ідэй. Маркс і Энгельс былі добра знаёмы з перадавой грамадскай думкай свайго часу, дасягненнямі прыродазнаўчых навук. Непасрэднымі ідэйна-тэарэтычнымі крыніцамі марксізму сталі нямецкая класічная філасофія, у асобе такіх яе выдатных прадстаўнікоў, як Г. Гегель і Л. Феербах, англійская палітычная эканомія, развітая ў працах А. Сміта і Д. Рыкарда, і утапічны сацыялізм, выдатнымі прадстаўнікамі якога былі Р. Оуэн, А. Сен-Сімон і Ш. Фур'е.

Найбольш буйнымі дасягненнямі нямецкай філасофіі заснавальнікі марксізму лічылі гегелеўскае вучэнне аб развіцці — дыялектыку (аб яе асноўных рысах мы гаварылі ў папярэднім параграфе) і ідэі матэрыялізму Феербаха, які, у адрозненне ад Гегеля, імкнуўся растлумачыць духоўныя з'явы не з іх саміх, а з зямной асновы. У цэнтры ўвагі англійскіх палітэканомаў былі пытанні працы і вартасці. Ужо А. Сміт прыйшоў да разумення таго, што ў аснове вартасці тавару ляжыць праца, хоць, на думку вучонага, не толькі яна: вартасць таксама вызначаецца даходам, што прыносіцца капіталам і зямлёй. Д. Рыкарда абгрунтоўваў ідэю аб тым, што толькі створаная працай рабочага вартасць з'яўляецца крыніцай і прыбытку (даходу ад капіталу), і рэнты (даходу ад зямлі). Гэтыя ўяўленні, якія склалі ядро так званай працоўнай тэорыі вартасці, былі ў далейшым улічаны і развіты Марксам пры вывучэнні эканамічных адносін капіталістычнага грамадства.

Погляды утапістаў-сацыялістаў ужо былі разгледжаны ў папярэднім параграфе. Тут жа мы адзначым, што марксісцкім вучэннем была ўспрынята ў першую чаргу вострая крытыка сацыялістамі існуючай рэчаіснасці, а таксама сама ідэя магчымасці пераходу да новага этапу развіцця, у рамках якога будуць пераадолены недахопы і супярэчнасці капіталізму.

З прыродазнаўчых навуковых адкрыццяў, якія зрабілі ўплыў на з'яўленне новага вучэння, неабходна

вылучыць закон ператварэння энергіі, які пацвярджае ўзаемасувязь з'яў аб'ектыўнага свету; вывад аб клетачнай будове арганізмаў, што даказвае ўнутранае адзінства жывой прыроды; эвалюцыйную тэорыю Ч. Дарвіна, якая тлумачыць паходжанне відаў. Гэтыя адкрыцці далі магчымасць усталявацца ў свядомасці мыслячых людзей філасофскім ідэям, якія разглядаюць свет у развіцці, адзінстве і ўзаемасувязі.

Што такое матэрыялістычнае разуменне гісторыі

Абапіраючыся на дасягненні перадавой грамадскай думкі, Маркс і Энгельс істотным чынам перагледзелі раней існаваўшыя ўяўленні аб грамадстве, характары рухаючых сіл і накіраванасці яго развіцця, выказаўшы шэраг прынцыпова новых ідэй.

Перш за ўсё імі было рашуча адкінута палажэнне, якое непадзельна панавала ў грамадазнаўстве, аб тым, што грамадства, грамадскія адносіны — спараджэнне духу або вынік духоўнай дзейнасці людзей. Гэты вывад грунтаваўся на відавочным для ўсіх факце: грамадства складаюць людзі, якія надзелены свядомасцю і кіруюцца ў сваёй дзейнасці зусім пэўнымі мэтамі. Ці не сведчыць гэта аб прымаце (першынстве) свядомага, духоўнага пачатку ў жыцці грамадства? Не, лічылі заснавальнікі марксізму. Першаасновай развіцця грамадства з'яўляецца працоўная, прадукцыйная дзейнасць людзей, накіраваная на задавальненне матэрыяльных патрэб. Прасцей кажучы, перш чым думаць, займацца навукай, філасофіяй, палітыкай, рэлігіяй чалавеку неабходна есці, піць, мець жыллё і г. д. Для задавальнення гэтых патрэб людзі ўзаемадзейнічаюць з прыродай, уступаюць ва ўзаемныя адносіны адзін з адным. З гэтага і складваецца **грамадскае быццё** людзей, якому ўласцівы аб'ектыўныя (незалежныя ад свядомасці) законы развіцця.

Такім чынам, у адпаведнасці з марксізмам, грамадскае быццё вызначае **грамадскую свядомасць** (г. зн. духоўны бок жыцця грамадства) «...Людзі, якія развіваюць сваю матэрыяльную вытворчасць... змяняюць разам з гэтай дзейнасцю таксама сваё мысленне і прадукты свайго мыслення. Не свядомасць вызначае жыццё, а жыццё вызначае свядомасць»,— пісалі К. Маркс і Ф. Энгельс у «Нямецкай ідэалогіі» (Выбр. творы. Т. 2. С. 20).

Разам з тым разнастайным формам грамадскай

свядомасці (мараль, рэлігія, мастацтва, навука, філасофія) уласціва пэўная самастойнасць. Звернемся да канкрэтнага прыкладу. Возьмем само ўзнікненне марксісцкага вучэння (як з'явы, што адносіцца да сферы грамадскай свядомасці) Вядома, сам факт яго з'яўлення быў абумоўлены, у першую чаргу, рэальнымі сацыяльнымі ўмовамі, якія склаліся ў жыцці еўрапейскіх краін да сярэдзіны XIX ст. Але ці толькі гэтым? Мы не выпадкова досыць падрабязна разгледзелі вучэнні, якія папярэднічалі з'яўленню марксізму: толькі абапіраючыся на ўжо наяўныя дасягненні грамадскай думкі, Маркс і Энгельс маглі рухацца наперад. Значыць, мы можам заключыць, што навуковыя, філасофскія і іншыя ідэі залежаць ад накопленага раней ідэйнага багацця і падпарадкоўваюцца пэўнай унутранай логіцы свайго развіцця.

Для таго каб лепш зразумець марксаву тэорыю грамадскага развіцця, неабходна разгледзець яшчэ некалькі ключавых паняццяў, уведзеных у грамадазнаўства заснавальнікамі марксізму.

Даследуючы грамадскую вытворчасць, Маркс вылучае два яе бакі: прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны. Што яны такое? Рэчы вырабляюцца з пэўных матэрыялаў. Гэта могуць быць драўніна, жалезная руда, гліна, нафта і іншыя матэрыялы, што з'яўляюцца прадметам працы, паколькі на іх накіравана працоўная дзейнасць чалавека.

Для арганізацыі вытворчасці рэчаў чалавеку патрэбны, па-першае, прылады працы (інструменты, станкі, машыны), з дапамогай якіх чалавек уздзейнічае на прадметы працы; па-другое, памяшканні, крыніцы энергіі, дарогі і інш. Разам з прыладамі працы яны складаюць сродкі працы.

Сукупнасць неабходных матэрыяльных умоў вытворчасці (прадметы працы і сродкі працы) утвараюць сродкі вытворчасці. Вытворчасць абавязкова ўключае ў сябе і працоўную дзейнасць людзей.

Створаныя грамадствам сродкі вытворчасці разам з людзьмі, якія валодаюць ведамі і навыкамі, складаюць **прадукцыйныя сілы** грамадства.

У працэсе сумеснай дзейнасці людзі ўступаюць у **вытворчыя адносіны,** у аснове якіх ляжаць адносіны да ўласнасці на сродкі вытворчасці. Уся сістэма вытворчых адносін залежыць ад таго, у чыёй уласнасці знаходзяцца асноўныя сродкі вытворчасці. Гэта вызна-

чае месца чалавека ў сістэме вытворчасці (уладальнік, кіраўнік, вытворца), размеркаванне і прысваенне даходаў ад зробленага. Асноўная доля даходу ідзе ўладальніку сродкаў вытворчасці, вытворца ж атрымлівае заработную плату за сваю рабочую сілу

Прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны ва ўзаемасувязі ўтвараюць **спосаб вытворчасці.**

Узаемадзеянні грамадскага быцця і грамадскай свядомасці раскрываюцца ў паняццях базісу і надбудовы.

Базіс — гэта эканамічны лад грамадства, які ўяўляе з сябе сукупнасць вытворчых адносін. **Надбудова** — сукупнасць грамадскіх поглядаў, ідэй, тэорый, разнастайных палітычных, юрыдычных, маральных і іншых адносін, а таксама ўстаноў і арганізацый. Базіс і надбудова цесна ўзаемазвязаны. Марксісцкае вучэнне галоўную ролю надае базісу ў адносінах да надбудовы. Разам з тым апошняя не проста прыстасоўваецца да эканамічнага ладу, а адыгрывае самастойную і актыўную ролю ў грамадскім жыцці. Ідэі, тэорыі накіроўваюць дзейнасць людзей і робяць уплыў на развіццё ўсіх сфер жыцця грамадства, у тым ліку і на эканоміку. Маркс гаварыў, што ідэі, якія авалодалі масамі, становяцца матэрыяльнай сілай. Гістарычная ступень грамадскага развіцця, заснаваная на пэўным спосабе вытворчасці, са сваім базісам і надбудовай атрымала назву ў марксісцкім вучэнні **грамадска-эканамічнай фармацыі.**

Такім чынам, матэрыялістычнае разуменне грамадскага развіцця выявілася ў марксізме ў першую чаргу ў прызнанні першаснымі, вызначальнымі тых адносін, якія аб'ектыўна складваюцца ў сферы матэрыяльнай вытворчасці.

Развіццё грамадства — натуральна-гістарычны працэс

Новы падыход марксізму да праблем грамадазнаўства выявіўся таксама ў тлумачэнні прычын і рухаючых сіл развіцця грамадства. Прагрэс, на думку Маркса і Энгельса, выражаецца ў змене адной грамадска-эканамічнай фармацыі другой, якая дасягае больш высокага ўзроўню развіцця асноўных сфер грамадскага жыцця.

Як жа адбываецца гэты працэс? Грамадства ўвесь час разбураюць узнікаючыя супярэчнасці. Гэта з'яўляецца крыніцай грамадскага развіцця. Асноўнай

выступае супярэчнасць паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі.

Паміж двума бакамі спосабу вытворчасці ёсць унутранае адзінства: пэўны ўзровень прадукцыйных сіл патрабуе пэўных вытворчых адносін. Разам яны паказваюць, як людзі робяць матэрыяльныя даброты.

Прадукцыйныя сілы найбольш рухомы бок спосабу вытворчасці. Што датычыць вытворчых адносін, то яны больш устойлівыя. Гэта забяспечваецца ўстойлівасцю форм уласнасці. Так, грамадская ўласнасць пры першабытным ладзе існавала дзесяткі тысяч гадоў, рабаўладальніцкая ўласнасць — некалькі тысячагоддзяў, феадальная — больш за тысячагоддзе, капіталістычная — некалькі стагоддзяў.

Вытворчыя адносіны залежаць ад прадукцыйных сіл. Адпаведнасць паміж імі — аб'ектыўнае патрабаванне вытворчасці.

Што можа быць, калі яны не адпавядаюць адзін аднаму? Вытворчыя адносіны адстаюць ад прадукцыйных сіл, уступаюць з імі ў супярэчнасць, якая з цягам часу паглыбляецца і перарастае ў канфлікт. Вытворчыя адносіны становяцца тормазам развіцця прадукцыйных сіл. Канфлікт вырашаецца ў выніку замены ўстарэлых вытворчых адносін новымі, якія адпавядаюць узроўню развіцця прадукцыйных сіл.

Вядома, змена грамадска-эканамічных фармацый не адбываецца аўтаматычна. Яе ажыццяўляюць у ходзе сацыяльнай і палітычнай барацьбы людзі, кіруючыся сваімі інтарэсамі.

Такім чынам, падвядзём вынік. Распрацаваныя марксізмам палажэнні аб прымаце грамадскага быцця ў адносінах да грамадскай свядомасці, рашаючай ролі матэрыяльнай вытворчасці ў жыцці грамадства, аб неабходнасці адпаведнасці вытворчых адносін характару і ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл, аб вызначальным уздзеянні эканамічнага базісу на ўсю разнастайнасць надбудовачных з'яў, аб непазбежнасці пераходу ад адной фармацыі да другой — усе гэтыя вывады выкладзены і абгрунтаваны ў марксісцкай тэорыі як законы грамадскага развіцця, якія дзейнічаюць гэтак жа аб'ектыўна і непарушна, як законы прыроды. Менавіта таму заснавальнікі марксізму назвалі развіццё грамадства натуральна-гістарычным працэсам. Пры гэтым, аднак, у адрозненне ад прыроды, у грамадскім жыцці законы пракладваюць сабе

дарогу праз свядомую дзейнасць людзей. «Гісторыя» не ёсць нейкая асаблівая асоба, якая карыстаецца чалавекам як сродкам для дасягнення *сваіх* мэт. Гісторыя — *не што іншае,* як дзейнасць чалавека, які дамагаецца сваёй мэты» (Творы. Т. 2. С. 102).

Пытанні і заданні

1. Чым было абумоўлена з'яўленне новай тэорыі грамадскага развіцця — марксізму?

2. Якія тэарэтычныя крыніцы марксізму? Якія ідэі сваіх папярэднікаў прынялі Маркс і Энгельс, ствараючы сваё вучэнне?

3. Што прынцыпова новае ва ўяўленне аб грамадстве і яго развіцці ўнеслі заснавальнікі марксізму?

4. У чым сутнасць матэрыялістычнага разумення гісторыі?

5. У 1890 г. у адным са сваіх пісьмаў Энгельс адзначаў: «Маркс і я часткова самі вінаватыя ў тым, што моладзь іншы раз надае больш значэння эканамічнаму боку, чым гэта неабходна. Нам даводзілася, пярэчачы нашым праціўнікам, падкрэсліваць галоўны прынцып, які яны адхілялі, і не заўсёды знаходзіўся час, месца і магчымасці аддаваць належнае астатнім момантам, што ўдзельнічаюць ва ўзаемадзеянні» (Творы. Т. 37. С. 396). Як вы разумееце гэта выказванне? Што Энгельс мае на ўвазе, гаворачы аб «астатніх момантах» грамадскага ўзаемадзеяння?

6. Вядома, што кожная грамадская з'ява, узятая ва ўсёй сукупнасці адзнак, непаўторная. У той жа час Маркс і Энгельс зрабілі вывад аб існаванні аб'ектыўных законаў грамадскага развіцця, што дапускае наяўнасць устойлівасці і паўторнасці схопленай законам сувязі з'яў або іх бакоў. Што, на вашу думку, дало магчымасць стваральнікам новага вучэння зрабіць такі вывад?

7. Крытыкі марксізму сцвярджаюць, што слабасць гэтага вучэння заключаецца ў тым, што ў ім сцвярджаецца непарушнасць гістарычнага развіцця, непазбежнасць руху грамадства ў пэўным напрамку. Тым самым выключаецца магчымасць выбару розных шляхоў развіцця, няма ўмоў для выяўлення свабоднай волі чалавека. Ці згодны вы з такімі сцверджаннямі? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

8. Звернемся да першакрыніц.

К. Маркс. Прадмова «Да крытыкі палітычнай эканоміі». «У грамадскай вытворчасці ў сваім жыцці людзі ўступаюць у пэўныя, неабходныя, ад іх волі незалежныя адносіны — вытворчыя адносіны, якія адпавядаюць пэўнай ступені развіцця іх матэрыяльных прадукцыйных сіл. Сукупнасць гэтых вытворчых адносін складае эканамічную структуру грамадства, рэальны базіс, на якім узвышаецца юрыдычная і палітычная надбудова і якому адпавядаюць пэўныя формы грамадскай свядомасці. Спосаб вытворчасці матэрыяльнага жыцця абумоўліваюць сацыяльны, палітычны і духоўны працэсы жыцця наогул. Не свядомасць людзей вызначае іх быццё, а, наадварот, іх грамадскае быццё вызначае іх свядомасць. На пэўнай ступені свайго развіцця матэрыяльныя прадукцыйныя сілы грамадства прыходзяць у супярэчнасць з існуючымі вытворчымі адносінамі, або — што з'яўляецца толькі юрыдычным выяўленнем апошніх — з адносінамі ўласнасці, унутры якіх яны да гэтага часу развіваліся. З форм развіцця прадукцыйных сіл гэтыя адносіны ператвараюцца ў іх путы. Тады надыходзіць

эпоха сацыяльнай рэвалюцыі. Са змяненнем эканамічнай асновы больш або менш хутка адбываецца пераварот ва ўсёй велізарнай надбудове. Пры разглядзе такіх пераваротаў неабходна заўсёды адрозніваць матэрыялы, з натуральна-навуковай дакладнасцю канстатуемы пераварот у эканамічных умовах вытворчасці ад юрыдычных, палітычных, рэлігійных, мастацкіх або філасофскіх, карацей — ад ідэалагічных форм, у якіх людзі ўсведамляюць гэты канфлікт і змагаюцца за яго вырашэнне. Як аб асобным чалавеку нельга меркаваць на падставе таго, што ён пра сябе думае, зусім гэтак жа нельга меркаваць аб падобнай эпосе пераваротa па яе ўсведамленню. Наадварот, гэта ўсведамленне патрэбна растлумачыць з супярэчнасцей матэрыяльнага жыцця, з існуючага канфлікту паміж грамадскімі прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі. Ніводная грамадская фармацыя не гіне раней, чым разаўюцца ўсе прадукцыйныя сілы, для якіх яна дае дастаткова прастору, і новыя больш высокія вытворчыя адносіны ніколі не з'яўляюцца раней, чым выспеюць матэрыяльныя ўмовы іх існавання ў нетрах самога старога грамадства. Таму чалавецтва ставіць сабе толькі такія задачы, якія яно можа вырашыць, таму што пры бліжэйшым разглядзе заўсёды атрымліваецца, што сама задача ўзнікае толькі тады, калі матэрыяльныя ўмовы яе вырашэння ўжо ёсць у наяўнасці, або, па крайняй меры, знаходзяцца ў працэсе станаўлення (Творы. Т. 13. С. 6—7).

Прачытаўшы фрагмент, падумайце і адкажыце:

а). Якія новыя паняцці, уведзеныя класікамі марксізму ў грамадазнаўства, выкарыстаны ў гэтым урыўку? Пакажыце сувязь паміж імі.

б). Як вы разумееце вывад Маркса аб тым, што аб эпосе рэвалюцыйнага пераваротa нельга меркаваць толькі «па яе ўсведамленню»? Якімі фактамі можна пацвердзіць гэты вывад?

в). Пакажыце на канкрэтных гістарычных прыкладах, што вытворчыя адносіны могуць стаць тормазам развіцця прадукцыйных сіл.

г). Якія вынікі можна вывесці са сцверджання аб тым, што ніводная грамадская фармацыя не гіне да таго часу, пакуль яна дае прастору развіццю прадукцыйных сіл, а новыя вытворчыя адносіны не праяўляюцца раней, чым выспеюць для гэтага неабходныя матэрыяльныя ўмовы?

У чым, на вашу думку, заключаецца актуальнасць гэтага палажэння ў сучасных умовах?

9. У працах заснавальнікаў марксізму чытаем: «Усякі прагрэс у той жа час азначае і адносны рэгрэс, калі дабрабыт і развіццё адных ажыццяўляецца цаной пакут і прыгнечання іншых». Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

§ 4. МАРКСІСЦКАЕ ВУЧЭННЕ АБ ГРАМАДСТВЕ

ч. II

Пагібель буржуазіі і перамога пралетарыяту аднолькава непазбежныя?

Гэтыя радкі ўзяты з праграмнага дакумента марксізму «Маніфест Камуністычнай партыі», у якім тады яшчэ маладыя Маркс і Энгельс упершыню ясна і паслядоўна з палемічнай завостранасцю расказалі аб асновах сваіх

тэарэтычных поглядаў і палітычных пазіцый. А вось пытальнік у канцы гэтай фразы паставіў час. Ці так бясспрэчны гэты вывад, ці пацвярджаецца ён ходам грамадска-гістарычнага развіцця?

Не будзем спяшацца з адказам. Разгледзім абгрунтаванні гэтага вываду, выказаныя ў «Маніфесце...», звернемся да вядомых гістарычных фактаў. «Сучаснае буржуазнае грамадства, з яго буржуазнымі адносінамі вытворчасці і абмену, буржуазнымі адносінамі ўласнасці, якое стварыла як бы па чарадзейству такія магутныя сродкі вытворчасці і абмену, падобны на чарадзея, які не ў стане больш справіцца з падземнымі сіламі, выкліканымі яго заклінаннямі. Вось ужо некалькі дзесяцігоддзяў гісторыя прамысловасці і гандлю ўяўляе з сябе толькі гісторыю абурэння сучасных прадукцыйных сіл супраць сучасных вытворчых адносін, супраць тых адносін уласнасці, якія з'яўляюцца ўмовай існавання буржуазіі і яе панавання»,— пішуць Маркс і Энгельс (Творы. Т. 4. С. 424). Сапраўды, ужо ў 1825 г. разбушаваўся першы вялікі эканамічны крызіс у еўрапейскіх краінах, за ім з невялікімі інтэрваламі другі, трэці. На змену ўздыму вытворчасці прыходзіць яе спад, многія прадпрыемствы закрываюцца, банкі церпяць банкруцтва, у асяроддзі пралетарыяту растуць рады беспрацоўных, якія ледзь жывуць. Але і жыццё тых, хто працягвае працаваць на фабрыках, не на многа лепшае: знясільваючая праца, шматгадзінны рабочы дзень, нізкая аплата, нечалавечыя ўмовы працы. Рабочы выконвае ўсё больш манатонныя і прымітыўныя аперацыі, ён становіцца прыдаткам машыны, праца яго ўсё больш абясцэньваецца. Пры гэтым такое становішча рабочых не ёсць вынік маральнай сапсаванасці буржуазіі (як думалі некаторыя сацыялісты-утапісты). У сваіх творах і асабліва ў «Капітале», які з'яўляецца, паводле слоў Леніна, «галоўным асноўным і асноўным творам, што выкладае навуковы сацыялізм» (Поўн. зб. тв. Т. 1. С. 187.), Маркс аналізуе супярэчнасці, тэндэнцыі развіцця капіталістычнага ладу, раскрывае сутнасць капіталістычнай эксплуатацыі.

Разгледзім коратка асноўныя палажэнні тэорыі прыбавачнай вартасці, якія Энгельс ахарактарызаваў як другое (пасля матэрыялістычнага разумення гісторыі) вялікае адкрыццё марксізму.

Вядома, што ўжо ў працах англійскіх палітэканомаў

змяшчалася ідэя аб працы як крыніцы ўсялякага багацця. Абапіраючыся на яе, Маркс выказаў шэраг новых прынцыповых палажэнняў. Пры гэтым зыходным пунктам яго разважанняў выступае паняцце тавар — прадукт чалавечай працы, зроблены для абмену. Тавар мае дзве асноўныя ўласцівасці. Па-першае, ён павінен задавальняць патрэбы чалавека. Гэта ўласцівасць атрымала назву спажывецкая вартасць. Па-другое, тавар мае здольнасць у пэўных прапорцыях абменьвацца на іншыя тавары. Што ж дазваляе зусім розныя тавары прыраўноўваць адзін да другога, сувымяраць іх у час продажу на рынку? Гэта агульнае ёсць вартасць тавару, пад якой падразумяваецца грамадска неабходная праца (яна ў сваю чаргу вызначаецца рабочым часам, неабходным для вырабу тавару пры сярэднім для дадзенага грамадства ўзроўні тэхнікі, узроўні ўмення, інтэнсіўнасці працы). Такім чынам, калі адзінка аднаго тавару на рынку абменьваецца на адзінку другога, значыць на іх вытворчасць затрачана аднолькавая колькасць грамадска неабходнай працы (на практыцы, зразумела, абмен ажыццяўляецца таксама з улікам попыту і прапановы, якія ўвесь час вагаюцца). У гэтым сутнасць закона вартасці.

На пэўным этапе гістарычнага развіцця чалавецтва на рынку з'яўляецца новы тавар — рабочая сіла. Маркс указваў на дзве неабходныя ўмовы з'яўлення гэтага тавару: асабістая свабода і «свабода» ад сродкаў вытворчасці. Такія ўмовы склаліся ў шэрагу краін Заходняй Еўропы з ліквідацыяй адносін феадальнай залежнасці і разарэннем многіх самастойных вытворцаў. Гэты тавар мае тыя ж уласцівасці, што і ўсе астатнія. Яго спажывецкай вартасцю з'яўляецца здольнасць працаваць, ствараць матэрыяльныя даброты, г. зн. новыя тавары, новую вартасць, якія перавышаюць яго ўласную вартасць. Вартасць жа тавару — рабочая сіла вызначаецца вартасцю сродкаў яе існавання, г. зн. усяго таго, што патрэбна для задавальнення патрэб рабочага і яго сям'і (але толькі ў той меры, каб рабочы мог прадукцыйна працаваць). Рабочы вырабляе для капіталіста тавары, якія маюць значна большую вартасць, чым вартасць яго рабочай сілы. Гэту розніцу (прыбавачную вартасць) бязвыплатна прысвойвае капіталіст, які ўладае сродкамі вытворчасці. У гэтым заключаецца сутнасць капіталістычнай эксплуатацыі. Такім чынам, эксплуатацыя наёмнай працы — аснова

капіталістычнага спосабу вытворчасці і можа быць знішчана толькі пасля яго пагібелі.

Выносячы прыгавор капіталізму як грамадству, не здольнаму справіцца са сваімі ўнутранымі супярэчнасцямі, заснавальнікі марксізму паказалі і на тую сацыяльную сілу, якая можа змесці існуючыя адносіны і ўсталяваць новы грамадскі лад, свабодны ад эксплуатацыі. «З усіх класаў, якія процістаяць цяпер буржуазіі, толькі пралетарыят з'яўляецца сапраўды рэвалюцыйным класам» (Творы. Т. 4. С. 434). Яго роля як «магільшчыка буржуазіі» вызначаецца, на думку заснавальнікаў марксізму, яго становішчам у грамадстве як класа эксплуатуемага, які не мае «нічога свайго, што трэба было б ахоўваць», і ў той жа час згуртаванага, здольнага на рашучыя дзеянні, надзеленага класавай мудрасцю і рэвалюцыйнай адвагай, гатовага кінуць праціўніку дзёрзкі выклік: **«я — нішто, але я павінен быць усім»** (Творы. Т. 1. С. 426).

Такім чынам, вернемся да пытання, вынесенага ў падзагаловак аддзела. Ці вытрымалі гэтыя марксісцкія сцверджанні і прадказанні праверку часам? Спачатку аб вывадзе аб **непазбежнай пагібелі капіталізму.** Наўрад ці хто-небудзь з тых, хто знаёмы з канкрэтнымі гістарычнымі фактамі, якія характарызуюць «класічны капіталізм свабоднай канкурэнцыі», будзе адмаўляць наяўнасць тых адмоўных бакоў і тэндэнцый развіцця, аб якіх пісаў Маркс. Аднак, відавочна, што меркаванні аб хуткай пагібелі гэтага ладу не спраўдзіліся. Больш таго, капіталізм істотна змяніўся, і сёння ён мала падобны на той, які аналізавалі заснавальнікі марксізму. У чым жа справа? Адказ на гэта пытанне нам сёння ўяўляецца відавочным: яны недаацанілі магчымасці самаразвіцця капіталізму; тое, што было ўласціва толькі адной яго стадыі — першай стадыі машыннай вытворчасці (разбуральная анархія, пастаянны рост беднасці пралетарыяту), лічылі, што гэтыя ўласцівасці капіталізму нельга зжыць наогул. Але чаму ж тое, што здаецца зараз такім відавочным, не прымалася пад увагу, хоць бы ў якасці дапушчэння (рэчаіснасць тады не давала падстаў для сур'ёзнага аналізу гэтай магчымасці), такімі глыбокімі мысліцелямі і даследчыкамі грамадскага жыцця, як Маркс і Энгельс?

Прывядзём адно з выказванняў, якое прагучала ў дыскусіі аб ролі марксізму ў сучасным свеце... на прыкладзе жыцця Маркса можна пераканацца, што

«мысліцель любога рангу не ў стане сумяшчаць у адной асобе функцыі вучонага і ідэолага». Інакш кажучы, існуе яўная супярэчнасць паміж патрабаваннямі навуковага аналізу: аб'ектыўнасцю, непрадузятасцю, з аднаго боку, і класава-партыйным пунктам погляду на падзеі, які дапускае разгляд з'яў з пазіцый пэўнага класа, з другога. А паколькі Маркс выступаў як палкі абаронца інтарэсаў пралетарыяту, то ва ўсіх частках яго вучэння «мы можам назіраць барацьбу Маркса-вучонага з Марксам-ідэолагам, і частыя выпадкі, калі першы ўступаў другому». Давайце больш грунтоўна разбяромся ў гэтым пытанні.

Марксізм як тэорыя і ідэалогія

Тое, што марксізм носіць класавы характар, выступае ідэалогіяй рабочага класа, адмаўляць няма сэнсу. Ці нанесла гэта шкоду навуковаму боку марксізму? Перш за ўсё прымем пад увагу дзве акалічнасці: першая, падзел грамадства на класы — не выдумка марксістаў. Гэта рэальнасць, якая захавалася і да нашых дзён. Другое: наўрад ці гэты факт можа ігнаравацца грамадазнаўствам, і, пакуль класавыя адносіны не зжыты, цяжка дапусціць магчымасць існавання «чыстай» сацыяльнай тэорыі, якая не мае сувязі з інтарэсамі тых ці іншых грамадскіх груп. Пытанне ў іншым: ці павінен вучоны, усведамляючы свае сацыяльныя і палітычныя прыхільнасці, блакіраваць іх у працэсе пошуку навуковай ісціны або наадварот кіравацца імі? У нашай літаратуры мінулых гадоў праблема вырашалася проста. Паміж навуковасцю і партыйнасцю (з пазіцый рабочага класа і камуністычнай партыі) супярэчнасцей няма: рабочы клас, як сцвярджалася, больш чым хто-небудзь зацікаўлены ў аб'ектыўным пазнанні рэальнага свету. Пры гэтым пралетарская партыйнасць процістаўлялася буржуазнай, якая «паводле азначэння» выключала магчымасць дасягнення аб'ектыўнай ісціны. Сёння з гэтым падыходам цяжка згадзіцца. Нам ужо відавочна, што падзел грамадства на класы з рознымі інтарэсамі — толькі адзін з бакоў супярэчнасці, другі адлюстроўвае той факт, што мы жывём у цэласным і ўзаемазвязаным свеце. Адсюль вынікае значэнне агульначалавечых інтарэсаў, іх прыярытэт над усімі іншымі. Аднак ці патрэбна прыносіць у ахвяру навуковай ісціне свае палітычныя перакананні і сацыяльныя прыхільнасці і ці гатовы мы да гэтага?

Навуковы прагноз або сацыяльная утопія?

Вывучаючы асноўныя этапы грамадскага развіцця, Маркс і Энгельс прыйшлі да вываду, што на змену капіталізму павінна прыйсці новая грамадска-гістарычная фармацыя — камуністычная. Яе прынцыповае адрозненне ад папярэдняй фармацыі класікі марксізму паказалі ўжо ў «Маніфесце Камуністычнай партыі». Далейшае развіццё гэтыя ідэі атрымалі ў працы К. Маркса «Крытыка Гоцкай праграмы». Прывядзём з яе некаторыя ўрыўкі. «Паміж капіталістычным і камуністычным грамадствам ляжыць перыяд рэвалюцыйнага ператварэння першага ў другое. Гэтаму перыяду адпавядае і палітычны пераходны перыяд, і дзяржава гэтага перыяду не можа быць нічым іншым, акрамя як **рэвалюцыйнай дыктатурай пралетарыяту»** (Творы. Т. 19. С. 27). Характарызуючы першую фазу камуністычнай фармацыі — сацыялізм, Маркс піша: «Мы маем тут справу не з такім камуністычным грамадствам, якое **развілося** на ўласнай аснове, а, наадварот, з такім, якое толькі што **выходзіць** якраз з капіталістычнага грамадства і якое таму ва ўсіх адносінах, у эканамічных, маральных і разумовых, захоўвае яшчэ радзімыя плямы старога грамадства, з нетраў якога яно выйшла» (Творы. Т. 19. С. 18). Тут ужо сродкі вытворчасці выйшлі з прыватнай уласнасці асоб, кожны за вылікам той колькасці працы, якая ідзе ў грамадскі фонд, атрымлівае ад грамадства столькі ж, колькі яму ён даў. Пры гэтым, улічваючы розныя магчымасці людзей да працы, на гэтым этапе захоўваецца няроўнасць. Але эксплуатацыя чалавека чалавекам ужо немагчыма. «На вышэйшай фазе камуністычнага грамадства, пасля таго як знікне падпарадкаванне яго падзелу працы, якое занявольвае чалавека; калі знікне разам з гэтым процілегласць разумовай і фізічнай працы; калі праца перастане быць толькі сродкам для жыцця, а сама стане першай неабходнасцю для жыцця; калі разам з усебаковым развіццём індывідаў вырастуць і прадукцыйныя сілы і ўсе крыніцы грамадскага багацця пальюцца поўным патокам,— толькі тады можна будзе зусім пераадолець вузкі гарызонт буржуазнага права, і грамадства зможа напісаць на сваім сцягу: «Кожны па здольнасцях, кожнаму па патрэбнасцях!» (Творы. Т. 19. С. 20).

Уяўленні Маркса і Энгельса аб сацыялізме і камунізме сталі сёння прадметам вострых дыскусій. У арбіту

спрэчак уключаюцца такія, напрыклад, пытанні: ці не утапічныя ў сваёй аснове гэтыя ўяўленні? Ці магчыма ў прынцыпе стварэнне грамадскіх адносін па загадзя пэўнаму плану? Ці не ўступае гэта ў супярэчнасць з натуральным працэсам развіцця чалавецтва?

Сёння нямала скептыкаў, якія выказваюць сумненні ў магчымасці ажыццяўлення ідэалаў камунізму. Крытычна ацэньваюцца таксама такія палажэнні марксізму, як неабходнасць усталявання грамадскай уласнасці, згортвання таварна-грашовых адносін з пераходам да сацыялізму.

Што датычыць эканамічных праблем, пакінем іх для разгляду ў далейшым. Спынімся на ідэі камуністычнай перспектывы чалавецтва. Дадзім слова выдатным савецкім філосафам, эканамістам, гісторыкам, палітолагам, якія ўдзельнічалі ва ўжо ўпамянутай дыскусіі на тэму «Ці памёр марксізм?». Вызначце свае адносіны да выказаных пунктаў погляду.

«Камуністычная ідэя ўзнікла задоўга да Маркса і належыць не яму, яе крытыкам давядзецца «змагацца» з цэлай традыцыяй сацыяльна-філасофскай думкі, якая знаходзіла водгук у грамадскай свядомасці некалькіх эпох, заўсёды пацвярджаючы сваю прыцягальную сілу».

«Камуністычная ідэя належыць да звыш далёкага прагнозу, а любы такі прагноз заўсёды ўключае ў сябе некаторыя утапічныя элементы, якія б навуковыя метады ні ўжываліся пры яго распрацоўцы. Бяда пачынаецца тады, калі да такога прагнозу пачынаюць адносіцца як да канкрэтнага праекта бліжэйшага будучага».

«Марксава ўяўленне аб камунізме — гэта не навукова-тэхнічны прагноз, а сацыяльнае прароцтва. Камунізм — гэта не праграмная дарога, а ідэальны арыенцір, дасягненне якога не гарантавана самацёкам гісторыі. Ён можа ўключаць у сябе таму і такія мэты, ажыццяўленне якіх амаль неверагодна, але ад якіх мы тым не менш не можам адмовіцца па маральнаму ўладкаванню нашага грамадства».

Аб ролі рэвалюцыйнага насілля

Адным з пунктаў марксісцкага вучэння, які сёння значна пераасэнсоўваецца, з'яўляецца пытанне аб ролі рэвалюцыйнага насілля ў грамадска-гістарычным развіцці: яго мэтазгоднасць, межы, формы, ацэнка з агульнагуманістычных пазіцый.

Вышэй ужо ішла гутарка аб марксісцкіх уяўленнях аб камунізме як грамадстве сацыяльнай справядлівасці, якое не дапускае ніякага насілля. Аднак шлях да гэтага грамадства, на думку заснавальнікаў марксізму, ляжыць толькі праз сацыялістычную рэвалюцыю, г. зн. перыяд вострага класавага проціборства. Рэвалюцыйнае насілле непазбежна, таму што буржуазія добраахвотна ўладу не аддасць, пралетарыят павінен завяваць яе. У той жа час яно, як лічылі Маркс і Энгельс, маральна апраўдана, паколькі пралетарская рэвалюцыя заўсёды ёсць адказ на сістэматычнае насілле над працоўнымі, якое рабілася вякамі. «Там, дзе класавая барацьба адхіляецца як нешта непрыцягальнае і «грубае», там у якасці асновы сацыялізму застаюцца толькі... пустыя фразы аб «справядлівасці» (Творы. Т. 19. С. 173).

Разам з тым, падкрэсліваючы «законнасць» рэвалюцыйнага насілля, заснавальнікі марксізму рэзка выступалі супраць яго крайнасцей, «бескарысных жорсткасцей». «Паўстанне было б безразважнасцю там, дзе мірная агітацыя прывяла б да мэты больш хуткім і правільным шляхам» (Творы. Т. 17. С. 635). Маркс адзначаў, што рабочы клас заўсёды, калі дазваляюць абставіны, імкнецца стварыць такія ўмовы, у якіх класавая барацьба зможа праходзіць найбольш рацыянальным і гуманным шляхам.

Ці правыя, аднак, былі Маркс і Энгельс, адводзячы насільным дзеянням, няхай нават у імя высакароднай мэты, такую значную ролю? Ці можна пабудаваць справядлівы свет, пачынаючы пераўтварэнні з выкарыстання прымусу, рэпрэсій, усемагчымых абмежаванняў у маштабах дзяржавы? Ці не адбываецца наогул пры выкарыстанні такіх сродкаў падмена мэты? Драматычныя падзеі гісторыі XX ст., асабліва ў нашай краіне, прымушаюць зноў і зноў вяртацца да гэтых балючых пытанняў.

Розныя грамадска-палітычныя напрамкі і ідэйныя плыні, якія ўзніклі ў канцы XIX — пачатку XX ст. і спрабавалі прымяніць марксізм у новых гістарычных умовах, рэзка разышліся перш за ўсё ў пытанні аб дапушчальнасці і мэтазгоднасці рэвалюцыйнага насілля. Аб гэтым гутарка ў наступным параграфе.

Пытанні і заданні

1. Як заснавальнікі марксізму абгрунтоўвалі непазбежнасць гібелі капіталізму? На якія канкрэтныя гістарычныя факты яны пры гэтым абапіраліся? У чым яны, на вашу думку, былі правыя ў сваіх ацэнках капіталізму і прагнозах аб яго будучым, а ў чым памыляліся?

2. У чым, на думку Энгельса, заключалася другое вялікае адкрыццё марксізму? Раскрыйце асноўныя палажэнні тэорыі прыбавачнай вартасці.

3. Якую ролю ў гісторыі адводзілі Маркс і Энгельс пралетарыяту? Як абгрунтоўвалі сваю пазіцыю?

4. Ці лічыце вы правільным вывад: непрадузятай сацыяльнай навукі ў класавым грамадстве быць не можа? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

5. Якімі былі ўяўленні класікаў аб сацыялізме і камунізме? Ці зрабілі на іх уплыў ідэі сацыялістаў-утапістаў? У чым ён выявіўся?

6. Чаму пытанне аб ролі рэвалюцыйнага насілля набыло ў нашы дні такую вастрыню?

7. Прывядзём выказванні старой камуністкі Р. Б. Лерт: «Рэвалюцыя была неабходна ў такой краіне, як Расія, і гэта рэвалюцыя не магла абысціся без насілля, нельга было перамагчы ў грамадзянскай вайне без масавага тэрору. Але мы, як рэвалюцыйная партыя, дапусцілі памылку, калі паказалі рэвалюцыйнае насілле не як непрыемную непазбежнасць, а як подзвіг Масавае насілле, тэрор, нават «чырвоны» ўсё роўна застаецца злом... Мы пачалі думаць і гаварыць, што ўсё, што карысна і неабходна для рэвалюцыі, гэта дабро, гэта маральна. Але такі падыход да ацэнкі падзей няправільны ў прынцыпе. Рэвалюцыя несла з сабой не толькі дабро, але і зло. Пазбегнуць насілля ў рэвалюцыі было немагчыма, але патрэбна было разумець, што гутарка ідзе аб часовым дапушчэнні зла ў наша жыццё, у нашу практыку. Рамантызаваўшы насілле, мы прадоўжылі яму жыццё, мы захавалі яго нават тады, калі яно стала зусім залішнім, стала абсалютным злом...»

Ці лічыце вы правільнай выказаную тут пазіцыю? Свой вывад абгрунтуйце.

8. У савецкай філасофскай літаратуры існуе пункт погляду, што марксава крытыка капіталізму — гэта па сутнасці крытыка ўсёй цывілізацыі, якая існавала да гэтага часу і якая рухалася па шляху ўсё большага падзелу і раз'яднання людзей. Пры капіталізме такая адасобленасць дасягае сваёй вышэйшай стадыі. Гэтай цывілізацыі процістаўляецца другая — камунізм, якая прасякнута ідэямі калектывізму, заснавана на прынцыпах сусветнага аб'яднання, салідарнасці.

Выкажыце свае адносіны да гэтых поглядаў

§ 5. ГІСТАРЫЧНЫ ЛЁС МАРКСІЗМУ (Развіццё марксісцкага вучэння ў XX ст.)

Гісторыя марксісцкага вучэння пасля смерці яго творцы разнастайная і шматбаковая. Стаўшы ў канцы XIX ст. уплывовай ідэйнай плынню, марксізм збіраў пад свае сцягі ўсё новых і новых прыхільнікаў. Пры гэтым абазначылася некалькі напрамкаў, прыхільнікі якіх па-рознаму тлумачылі марксісцкія ідэі і прынцыпы, пе-

раасэнсоўваючы іх пад вуглом зроку набываемага гістарычнага вопыту. У заходнееўрапейскай сацыял-дэмакратыі — гэта рэвізіяністы на чале з Э. Бернштэйнам; «захавальнікі канонаў», прадстаўленыя прыхільнікамі К. Каўцкага; у Расіі — бальшавікі на чале з Леніным, а таксама і меншавікі (Г. Пляханаў, Ю. Мартаў і інш.), якія па сутнасці падтрымлівалі погляды заходнееўрапейскіх сацыялістаў.

Маркс адзін, а «марксізмаў» шмат

Чаму ж марксізм распаўся на розныя, нярэдка варожыя адна другой плыні? Адну з прычын гэтага сучасныя даследчыкі бачаць у разнастайнасці самога вучэння. Пры ўсёй сваёй цэласнасці яно мае даволі самастойныя часткі (палітэканомія, філасофія, тэорыя сацыялізму). У рамках кожнай з іх ёсць нямала пытанняў, даследуючы якія самі аўтары часта прыходзілі да розных вывадаў у розныя перыяды сваёй творчасці (дастаткова параўнаць, напрыклад, некаторыя палажэнні «Маніфеста» з выказваннямі Энгельса 90-х гг.). Шэраг даследчыкаў звяртае ўвагу на некаторыя супярэчнасці ў самой марксісцкай тэорыі. Так, выступаючы праціўнікамі «казарменнага камунізму», заснавальнікі марксізму прапанавалі ажыццявіць такія пераўтварэнні пасля заваявання пралетарыятам палітычнай улады, якія, пры пэўных умовах, маглі прывесці менавіта да такога сацыялізму: скасаванне прыватнай уласнасці, усеагульнае адзяржаўленне, цэнтралізаванае дзяржаўнае кіраванне народнай гаспадаркай.

Інакш кажучы, само марксісцкае вучэнне складанае, рухомае, адкрытае, не выключала магчымасці розных яго тлумачэнняў у іншых гістарычных умовах.

Апрача таго, пачаўся працэс пашырэння марксізму. Ён не мог не змяняць яго асобныя палажэнні, іх спрашчаць, а іншы раз і дагматызаваць, ператвараць у нейкі абсалютны канон. У канцы жыцця Энгельс з трывогай адзначаў, што асобныя месцы з твораў і перапіскі Маркса тлумачацца некаторымі рэвалюцыянерамі «як збор догмаў, якія неабходна вывучыць на памяць і паўтараць уголас, накшталт формулы заклінання або каталіцкай малітвы» (Маркс К., Энгельс Ф. Творы. Т. 38. С. 82).

Але галоўнае ўсё ж было ў іншым. На рубяжы XIX—XX стст. адбыліся глыбокія змены ў самой гістарычнай рэчаіснасці.

Новыя вывады ў новых умовах

Уступленне капіталістычнага свету ў стадыю імперыялізму праходзіла з узмацненнем супярэчлівасці грамадскага развіцця. У гістарычнай літаратуры адзначаецца, што на рубяжы стагоддзяў выразна выявіліся дзве розданакіраваныя тэндэнцыі. Адна з іх праяўлялася ва ўзмацненні стабілізацыйных пачаткаў, магчымасцей мірнага прагрэсу: назапашванне манаполіямі звышпрыбыткаў і як вынік гэтага пэўныя павелічэнні заработнай платы рабочых, скарачэнне рабочага дня; развіццё акцыянернай формы капіталу і з'яўленне новых шляхоў абагачэння сярэдніх слаёў. Другая выявілася ва ўзмацненні рэвалюцыйных настрояў, якое было выклікана захаваннем кантрастаў паміж багаццямі новых мільярдэраў і становішчам працоўных.

Гэта апошняя тэндэнцыя, якая стала найбольш выразнай у Расіі, дзе развіццё капіталізму ішло пакутлівым шляхам ва ўмовах існуючых феадальных перажыткаў, параджала веру ў хуткую перамогу пралетарскай рэвалюцыі. У гэтых умовах нарадзіўся ленінізм — найбольш рэвалюцыйная плынь у развіцці марксізму. У. І. Ленін ужо ў першых сваіх працах канца XIX — пачатку XX ст. выступіў як вялікі знаўца марксісцкага вучэння і разам з тым як сур'ёзны даследчык рэальных эканамічных і сацыяльна-палітычных праблем.

Абапіраючыся на распрацаванае ім вучэнне аб імперыялізме як вышэйшай стадыі капіталізму, Ленін перагледзеў некаторыя вывады марксісцкага вучэння і ўнёс у яго шэраг новых ідэй. Сярод іх: нераўнамернасць эканамічнага і палітычнага развіцця краін як «безумоўны» закон капіталізму (Поўн. зб. тв. Т. 26. С. 354) і вывад, які вынікае адсюль, аб немагчымасці перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі ва ўсіх капіталістычных краінах адначасова. Сацыялізм пераможа «першапачаткова ў нямногіх або нават у адной асобна ўзятай краіне» (Поўн. зб. тв. Т. 26. С. 354). Ацэньваючы перспектывы развіцця рэвалюцыі, Ленін адзначаў, што яна лягчэй можа пачацца не ў самых развітых дзяржавах, якія эксплуатуюць іншыя краіны. Уводзячы паняцце «краіна — вузел супярэчнасцей», Ленін лічыў, што прарыў ланцуга капіталістычных дзяржаў хутчэй за ўсё адбудзецца ў той краіне, дзе супярэчнасці дасягнулі найбольшай вастрыні. У такіх краінах, дзе матэрыяльныя перадумовы (узровень развіцця прадукцыйных сіл, колькасць рабочага класа) менш гатовыя

да рэвалюцыі ў параўнанні з іншымі капіталістычнымі дзяржавамі асаблівае значэнне набывае палітычная ўлада. Заваяваўшы яе, пралетарыят можа выкарыстаць дзяржаўныя рычагі кіравання для вырашэння задач эканамічнага развіцця. Адсюль вынікае значэнне дыктатуры пралетарыяту і адпаведна гэтаму тое месца, якое Ленін адвёў аналізу гэтай формы ўлады ў сваіх працах. Другой слабасцю рэвалюцыйнага працэсу ў гэтай групе краін можа стаць нізкі ўзровень масавай палітычнай культуры. Пераадоленню гэтага недахопу, на думку Леніна, садзейнічае авангардная роля камуністычнай партыі ў сістэме дыктатуры пралетарыяту. У шэрагу сваіх прац («Што рабіць?», «Крок наперад, два крокі назад», «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме» і інш.) Ленін развівае ідэі аб неабходнасці стварэння партыі новага тыпу, здольнай узначаліць барацьбу пралетарыяту ў зменených сацыяльных умовах.

Важным этапам развіцця марксісцкіх ідэй аб сацыялізме і камунізме сталі апошнія працы Леніна, вядомыя як «палітычны запавет». Ужо набыты да гэтага часу вопыт пераўтварэнняў першых гадоў савецкай улады прымусіў па-новаму асэнсаваць некаторыя класічныя палажэнні марксізму, падтрыманыя раней і Леніным. Пераважаючыя ў ленінскіх працах перыяду грамадзянскай вайны ўяўленні аб сацыялізме як «адзінай фабрыцы» змяніліся ідэяй «ладу цывілізаваных кааператараў», якія дзейнічаюць ва ўмовах рынку і таварна-грашовых адносін.

Ленінізм не ў меншай меры, чым тэарэтычная спадчына Маркса, з'яўляецца сёння прадметам вострай палемікі і дыскусій. Тут ужо пад крытычным «абстрэлам» знаходзяцца не толькі тэарэтычныя погляды Леніна, але і практыка рэвалюцыйных пераўтварэнняў, якія ажыццяўляліся ў кіруемай ім дзяржаве. Пазбягаючы крайнасцей у меркаваннях, непрадуманых і паспешных ацэнак, неабходна падкрэсліць галоўнае: на «выклік часу», запатрабаванні грамадскага жыцця ленінізм даў свае адказы ў духу марксізму, улічваючы пры гэтым новыя рэвалюцыйныя магчымасці, якія адкрываліся ў пачатку XX ст. У ленінізме знайшла сваё адлюстраванне адна з дзвюх супярэчлівых тэндэнцый грамадскага развіцця — тэндэнцыя ўзмацнення крызісных з'яў і нарастання ў гэтых умовах рэвалюцыйнага руху.

Пасля смерці Леніна, калі ленінізм стаў афіцыйнай ідэалогіяй у нашай краіне, а затым у шэрагу ўсходнееўрапейскіх краін, якія абвясцілі пачатак сацыялістычных пераўтварэнняў, яго пачалі спрашчаць і скажаць. Сталінскае тлумачэнне ленінізму грунтавалася галоўным чынам на ідэях, выказаных у эпоху «ваеннага камунізму». Пры гэтым прыглушаліся або замоўчваліся ідэі і трывожныя разважанні, што змяшчаліся ў палітычным запавеце Леніна. Усё гэта неабходна было для ідэйнага падмацавання рэальнай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай практыкі перыяду сталінізму.

Што такое рэвізіянізм?

Другая тэндэнцыя развіцця грамадства стабілізацыі, паслаблення ў шэрагу вядучых капіталістычных краін сацыяльнай напружанасці найбольш поўна ўлічана ў працах нямецкага сацыял-дэмакрата Э. Бернштэйна, які неўзабаве пасля смерці Энгельса выступіў з крытыкай рада палажэнняў марксісцкага вучэння. Адсюль і назва напрамку, пачатак якому палажылі працы Бернштэйна,— рэвізіянізм, гэта значыць перагляд, рэвізія класічнага вучэння. Доўгія гады ў нашай літаратуры рэвізіянізм ацэньваўся надта адмоўна, разглядаўся як сінонім здрадніцтва інтарэсам рабочага класа.

Якія ж погляды выказвае Бернштэйн?

Перш за ўсё ён крытыкуе вывад Маркса аб збяднені пралетарыяту (хоць не адмаўляе факта эксплуатацыі рабочых капіталістамі). Ён лічыць тэндэнцыю збяднення пралетарыяту часовай з'явай, уласцівай пачатковаму стану капіталістычнага спосабу вытворчасці, пераадольваемай з цягам часу. Бернштэйн знаходзіць, што колькасць уласнікаў павялічваецца, сярэднія слаі мяняюць свой характар, але захоўваюць свае пазіцыі ў грамадстве. Ён высока ацэньвае ролю дэмакратыі ў сучасным грамадстве, якую можна прызнаць абазначэннем такога сацыяльнага ладу, пры якім ні адзін клас не карыстаецца палітычнымі прывілеямі ў адносінах да ўсяго грамадства. У цэлым Бернштэйн больш аптымістычна глядзіць на перспектывы капіталізму. Хаця ў грамадстве існуе класавая барацьба, але час працуе на змякчэнне класавых супярэчнасцей. Палітыка «малых спраў», частковых рэформ дазволіць капіталізму паступова змяняцца ў сацыялістычным напрамку. Такім чынам, няма неабходнасці, на думку

Бернштэйна, у разбуральных рэвалюцыйных катастрофах, у адмаўленні ад дэмакратычных заваёў на карысць дыктатуры пралетарыяту.

Сёння пазіцыя Бернштэйна ў многіх сваіх палажэннях здаецца дастаткова дальнабачнай. Аднак у тых рэальных гістарычных умовах, калі рэвізіянізм вылучыўся ў якасці самастойнага ідэйнага напрамку, ён крытыкаваўся не толькі Леніным і яго прыхільнікамі, але і другой часткай нямецкай сацыял-дэмакратыі, погляды якой найбольш поўна выказаў К. Каўцкі.

Прыхільнікі гэтага напрамку заяўлялі аб сваёй вернасці ідэям марксізму. Яны падтрымлівалі ўсе яго асноўныя вывады, у тым ліку і неабходнасць пралетарскай рэвалюцыі. Пры гэтым асабліва падкрэслівалася думка аб недапушчальнасці правакавання рэвалюцыйных дзеянняў пры адсутнасці спелых матэрыяльных перадумоў, неабходных для перамогі рэвалюцыі. Яна павінна аблегчыць выхад ужо паспелага і непазбежнага.

«Святла, больш святла!»

Гэтыя словы Гётэ працытаваў у адной са сваіх прац тэарэтык і дзеяч расійскага рэвалюцыйнага руху Г. В. Пляханаў, і яны сталі дэвізам яго жыцця. Важнейшую задачу мыслячай асобы Пляханаў бачыў следам за В. Бялінскім, А. Герцэнам, М. Чарнышэўскім у тым, каб несці народу святло ведаў, выконваць высакародныя задачы асветніцтва.

З імем Пляханава звязана развіццё марксізму ў канцы XIX — пачатку XX ст. і яго распаўсюджанне ў Расіі. У сваіх працах «Аб матэрыялістычным разуменні гісторыі», «Да пытання аб ролі асобы ў гісторыі» і іншых Пляханаў выступаў як матэрыяліст-дыялектык, які вёў непрымірымую барацьбу з рэвізіяй марксісцкага вучэння. Падтрымліваючы палажэнні гэтага вучэння аб рашаючай ролі эканамічнага базісу, Пляханаў у той жа час крытыкаваў прыхільнікаў спрошчанага, прамалінейнага падыходу да гэтага пытання. Ён падкрэсліў, што «эканоміка амаль ніколі не перамагае сама сабой... а **заўсёды толькі пры дапамозе надбудовы,** заўсёды **толькі** пры дапамозе пэўных палітычных устаноў» (Выбр. філасоф. тв. М., 1956. Т. 2. С. 216).

Абараняючы разам з заходнееўрапейскімі сацыял-дэмакратамі ідэю спеласці эканамічных умоў як неабходнай умовы пераходу да новага грамадскага ладу, Пляханаў перасцерагаў ад заўчасных камуністычных

эксперыментаў. Захоп рэвалюцыянерамі ўлады пры адсутнасці ўмоў для далейшай сацыяльнай перабудовы, лічыў ён, «можа прывесці да палітычнай недарэчнасці, накшталт старажытнакітайскай або перувіанскай імперыі, г. зн. да абноўленага царскага дэспатызму на камуністычнай падкладцы» (Выбр. філасоф. тв. Т. 1. С. 105).

Нягледзячы на разыходжанне палітычных поглядаў з Пляханавым, Ленін высока цаніў яго творчую спадчыну, адзначаў, што ўсё напісанае Пляханавым па філасофіі «гэта лепшае ва ўсёй міжнароднай літаратуры марксізму» (Поўн. зб. тв. Т. 42. С. 290).

Наперад, да Маркса, або назад да «постмарксізму»?

Рэзка крытыкуючы афіцыяльны марксізм-ленінізм (асабліва ў сталінскай трактоўцы), які ўсталяваўся ў СССР, прыхільнікі марксісцкага вучэння ў заходнім свеце пачалі настойліва заклікаць вярнуцца да сапраўднага марксізму, ачышчанага ад дагматычных скажэнняў і спрошчаных падыходаў. Такую спробу зрабіў, у прыватнасці, італьянскі марксіст А. Грамшы (1891—1937). Ён выступаў супраць абсалютызацыі «жалезных законаў гісторыі», разглядаў гістарычны працэс як поле магчымасцей, паміж якімі чалавек ажыццяўляе свой выбар. У ходзе сваёй дзейнасці людзі рэалізуюць адны магчымасці і блакіруюць другія. Гэта робіць асобу адказнай за свае ўчынкі.

Другі напрамак марксісцкай думкі Захаду паказаны ў працах тых даследчыкаў, якія спрабуюць перагледзець шэраг палажэнняў марксізму з улікам новых грамадскіх працэсаў, звязаць марксізм з іншымі ідэйнымі плынямі. Тэарэтыкі постмарксізму імкнуцца аддзяліць гуманістычныя прынцыпы марксісцкага вучэння (свабоднае развіццё кожнага як умова развіцця ўсіх, задавальненне сапраўдных чалавечых патрэб, пераадоленне эксплуатацыі і адчужэння) ад выказаных Марксам умоў іх ажыццяўлення, да якіх ён адносіў бяскласавую і бездзяржаўную арганізацыю грамадства, ліквідацыю прыватнай уласнасці і таварна-грашовай эканомікі. Лічачы, што гуманістычныя прынцыпы не страцілі свайго значэння і цяпер, прыхільнікі постмарксізму расцэньваюць умовы іх ажыццяўлення як утапічныя.

У літаратуры гэтага напрамку крытычна ацэньваюцца ідэі Маркса аб «родавай сутнасці чалавека», у

адпаведнасці з якімі станоўчыя якасці асобы: здольнасць да творчасці, таварыскасць, імкненне да свабоды — як бы з самага пачатку закладзены ў чалавека, а такія рысы, як эгаізм, агрэсіўнасць і іншыя, народжаны ўмовамі існавання. Постмарксісты лічаць, што і тыя, і другія якасці належаць самой чалавечай сутнасці, і ў гэтым выпадку мы маем справу не са знешняй, а з унутранай супярэчнасцю.

Вялікая ўвага ў працах вучоных гэтага напрамку ўдзяляецца вывучэнню пытання аб суадносінах ідэй марксісцкага вучэння і хрысціянства.

Ці ёсць будучыня ў марксізму?

Пытанне гэта ў сучасных умовах ужо не аднясеш да ліку рытарычных або пустых. Незаціхаючая палеміка вакол ідэйнай спадчыны заснавальнікаў марксізму, наступных напрамкаў марксісцкай думкі прымушае зноў і зноў шукаць адказы на яго. Пры ўсёй процілегласці пазіцый тых, хто спрачаецца, большасць з іх аднадушныя ў тым, што марксізм нельга выкрасліць з гісторыі грамадскай думкі. У шэрагу выдатных мысліцеляў мінулага Маркс займае, безумоўна, адно з ганаровых месц.

Але ці захоўваюць марксісцкія ідэі актуальнасць сёння, ці могуць яны стаць надзейнымі арыенцірамі будучага грамадскага развіцця? Тут адзінадушша ў спрэчках канчаецца. Адны сцвярджаюць, што марксізм, які ўзнік як тэорыя 150 гадоў назад, не ў стане быць «кіраўніцтвам да дзеяння» ў настолькі змененых абставінах. Другія зыходзяць з таго, што ў марксізме разам з гістарычна абмежаванымі палажэннямі ёсць і ідэі, якія маюць пастаяннае значэнне і якія па-ранейшаму будуць уздзейнічаць на развіццё грамадскай думкі і гістарычную практыку. Да іх ліку адносяць ідэі сацыяльнай справядлівасці і калектыўнай салідарнасці, такі крытэрый грамадскага прагрэсу, які класікі выказалі словамі: свабоднае развіццё кожнага як умова свабоднага развіцця ўсіх. Не траціць свайго значэння развіты Марксам дыялектычны падыход да з'яў грамадскага жыцця, які прадугледжвае іх разгляд у пастаянным развіцці і змяненні, у пераходзе ад аднаго якаснага стану ў другі праз барацьбу супярэчлівых пачаткаў і тэндэнцый.

Сучасная гісторыя пацвярджае марксісцкую думку аб ключавым значэнні адносін уласнасці, аб важнай ролі эканамічнай сферы жыцця грамадства. Знаходзіць

свае дадатковыя аргументы і ідэя аб натуральна-гістарычным ходзе грамадскага развіцця, які выключае магчымасць адвольных змяненняў сацыяльных адносін.

У той жа час гістарычны вопыт не пацвердзіў шэраг палажэнняў марксісцкага вучэння: аб ліквідацыі таварна-грашовых адносін пры сацыялізме, аб росце збяднення рабочага класа ва ўмовах капіталізму. Прадстаўнікі гістарычнай навукі выказваюць сумненне ў тым, што толькі па адной падставе — эканамічнае развіццё і адносіны ўласнасці — можна стварыць навуковую перыядызацыю (паслядоўная змена фармацый) гістарычнага працэсу. Сёння відавочна і тое, што Маркс недаацаніў магчымасці самаразвіцця капіталізму, які змог успрыняць дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і на гэтай аснове стварыць высокі ўзровень дабрабыту большасці насельніцтва. Усё гэта так. І відаць, гэты «чорны спіс» таго, што не адбылося, не апраўдала сябе, было рамантычна-утапічным у марксісцкім вучэнні, можна прадоўжыць.

Якая ж сапраўдная роля марксізму?

Мы бачым, як няпроста склаўся яго гістарычны лёс. Два фактары, як нам здаецца, змогуць дапамагчы вызначыць гістарычнае месца гэтага вучэння. Першы з іх — час: далейшы ход грамадска-гістарычнага развіцця дапаможа зрабіць больш глыбокія і правільныя вывады аб будучым марксізму. Другі — ачышчэнне марксізму ад скажоных тлумачэнняў, вызваленне ад дагматычных адносін да яго.

Але ўжо зараз можна з упэўненасцю сцвярджаць, што марксісцкая тэорыя зрабіла вялікі ўплыў на развіццё грамадскай думкі. Гэта прызналі нават тыя вучоныя Захаду, якія ніколі не лічылі сябе марксістамі. У адной з гутарак амерыканскі эканаміст і сацыёлаг Дж. Гэлбрэйт выказаўся так: «Шчыра кажучы, я лічу Маркса надта вялікай фігурай, каб цалкам аддаць яго вам, сацыялістам і камуністам». Магчыма, і нам не трэба цалкам аддаваць марксісцкія ідэі мінулым гістарычным эпохам?

Пытанні і заданні

1. У чым прычыны ўзнікнення розных плыняў марксісцкай думкі на рубяжы XIX—XX стст.?

2. Якія палажэнні марксісцкага вучэння атрымалі развіццё ў ленінізме? Якія ідэі марксізму і чаму былі перагледжаны Леніным?

3. У артыкуле «Аб нашай рэвалюцыі», палемізуючы з заходнееўрапейскімі сацыял-дэмакратамі і расійскімі меншавікамі, якія сцвярджалі, што Расія не мае неабходнай умовы цывілізаванасці і культуры, Ленін пісаў: «Калі для стварэння сацыялізму патрабуецца пэўны ўзровень культуры.., то чаму нам нельга пачаць спачатку з заваявання рэвалюцыйным шляхам перадумоў для гэтага пэўнага ўзроўню, а **потым** ужо, на аснове рабоча-сялянскай улады і савецкага ладу, рушыць даганяць іншыя народы».

Падумайце і адкажыце:

а) Што мае на ўвазе Ленін, гаворачы аб перадумовах дасягнення новага ўзроўню развіцця?

б) Чаму гэтыя ўмовы маглі паскорыць наш рух наперад? Ці спраўдзіліся гэтым меркаванні?

в) Ці можна з гэтага ўрыўка зрабіць вывад, што важнейшай мэтай пераўтварэнняў у Расіі Ленін лічыў уключэнне краіны ў агульнацывілізацыйны працэс сусветнага развіцця? Свой адказ абгрунтуйце.

4. Чаму ідэйная плынь, заснавальнікам якой лічыцца Бернштэйн, атрымала назву рэвізіянізм?

5. У пачатку стагоддзя Каўцкі выступаў рэзкім крытыкам поглядаў Бернштэйна, аднак паступова пазіцыі цэнтрыстаў і рэвізіяністаў у заходнееўрапейскай сацыял-дэмакратыі зблізіліся. Паспрабуйце растлумачыць прычыны гэтай з'явы.

6. Прывядзём некалькі ленінскіх выказванняў:

а) «У нашым ідэале няма месца насіллю над людзьмі» (Поўн. зб. тв. Т. 30. С. 122);

б) «Без рэвалюцыйнага насілля немагчыма зламаць супраціўленне эксплуататараў» (Поўн. зб. тв. Т. 4. С. 264);

в) «Ёсць умовы, пры якіх насілле і неабходна, і карысна, і ёсць умовы, пры якіх насілле не можа даць ніякіх вынікаў» (Поўн. зб. тв. Т. 38. С. 43).

Якія вывады аб адносінах Леніна да насілля ў грамадска-гістарычным развіцці можна зрабіць?

7. Чаму ідэйная спадчына Маркса і Леніна з'яўляецца ў нашым грамадстве прадметам вострай палемікі? Якая ваша пазіцыя ў гэтай спрэчцы?

§ 6. РАЗВІЦЦЁ ГРАМАДАЗНАЎСТВА Ў XX ст.

Расказваючы аб развіцці грамадазнаўчай думкі ў XIX ст., спадзяёмся, пераканалі вас, што гэты час вызначаўся не толькі буйнымі дасягненнямі ў галіне прыродазнаўчых навук, але і стаў новым важным этапам у паглыбленні і абагачэнні ведаў аб сацыяльнай рэчаіснасці. Поспехі ў гэтай галіне дапамаглі развіцца многім напрамкам грамадазнаўства, якія захавалі сваё значэнне і ў наступныя дзесяцігоддзі. Разам з тым бурныя грамадска-палітычныя падзеі XX ст. паставілі шэраг новых праблем. Час патрабаваў далейшага асэнсавання грамадскай практыкі, а таксама, у пэўнай меры, перагляду ранейшых уяўленняў. З'явіліся новыя канцэпцыі, вучэнні, напрамкі. Адны з іх дапаўнялі адна другую,

але многія грунтаваліся на ўзаемавыключных ідэях. Відавочна, што гэта акалічнасць стала адлюстраваннем той рэальнай ідэйнай і грамадска-палітычнай барацьбы, якой былі прасякнуты падзеі стагоддзя, якое адыходзіла. Як бы там ні хацелі многія стварыць зусім аб'ектыўную сацыяльна-філасофскую навуку, непарушным пакуль застаецца факт уплыву светапоглядных, цэнасных установак грамадства, групы або самога даследчыка на адбор, інтэрпрэтацыю і ацэнку рэальных фактаў і з'яў.

Звернемся цяпер да разгляду некаторых найбольш важных ідэй і ўплывовых напрамкаў грамадазнаўства. Паколькі аб развіцці марксісцкай думкі гутарка ўжо ішла і да асэнсавання асобных палажэнняў марксізму ў сучаснай савецкай філасофскай і сацыялагічнай літаратуры мы яшчэ вернемся, то ў гэтым раздзеле мы падыдзем да аналізу немарксісцкага грамадазнаўства, асобныя напрамкі якога развіваліся тым не менш пад уплывам марксізму.

Адно з цэнтральных пытанняў, якое займала і займае філосафаў, сацыёлагаў, палітолагаў, можна сфармуляваць так: што ляжыць у аснове змяненняў грамадскага жыцця, пераўтварэнні ў якіх сферах грамадства робяць рашаючае ўздзеянне на зрухі ў іншых галінах? Адказы на гэта фундаментальнае пытанне даюцца розныя.

Прагрэс тэхнікі — прагрэс грамадства?

Пэўная група даследчыкаў зыходзіць з перакананння, што рашаючым фактарам грамадскага развіцця выступае тэхніка, вытворчыя тэхналогіі. Ствараемая чалавечым розумам і рукамі тэхнічная цывілізацыя не залежыць ад чалавека і грамадства, мае здольнасць да самаразвіцця, да пастаяннага прагрэсу, удасканалення сваіх параметраў. У гэтых умовах асаблівая роля ў грамадстве належыць людзям, якія маюць навукова-тэхнічныя веды — тэхнакратам. Прыйшоўшы да ўлады, гэтыя людзі арганізуюць кампетэнтнае кіраванне грамадскімі працэсамі. Адлюстраванне такога падыходу можна знайсці ў працах амерыканскага эканаміста Дж. Гэлбрэйта (нарадзіўся ў 1908 г.). Асноўная задача грамадства, паводле думкі Гэлбрэйта,— развіццё вытворчасці. Пры гэтым рэальная ўлада размяркоўваецца паміж спецыялістамі вытворчасці і кіраўніцтва (менеджэрамі). Вучоны лічыць, што такія ж працэсы ідуць пры сацыялізме. Таму ў перспектыве маг-

чыма канвергенцыя (слова лацінскага паходжання, азначае збліжаюся, сыходжуся) дзвюх сістэм, на аснове іх збліжэння з далейшым сінтэзам у «змешаным грамадстве».

З'яўленне камп'ютэрнай тэхнікі дало новы ўздым тэхнакратычных ідэй. Разам з тым сёння нямала іх крытыкаў. Звяртаецца ўвага на тое, што перабольшанне ролі тэхнікі і індустрыі ў цэлым у грамадскім развіцці з'явілася абгрунтаваннем варварскіх адносін да прыроды, да чалавека і паставіла перад сучасным чалавецтвам праблему выжывання. Указваецца таксама, што прыхільнікі тэхнакратычных поглядаў недаацэньваюць ролю іншых важных бакоў у жыцці грамадства, такіх,як культура, не ўлічваюць уздзеяння на чалавека і сацыяльную сферу біялагічных, прыродных фактараў.

Барацьба за існаванне, або «Гора слабым»

Яшчэ ў канцы XIX ст. у грамадскіх навуках нарадзілася плынь, якая спрабавала звесці законы грамадскага развіцця да біялагічных заканамернасцей натуральнага адбору, выжывання найбольш прыстасаваных. Сучасныя неадарвіністы лічаць, што разнастайныя варыянты сацыяльнага і культурнага развіцця ў грамадстве адбываюцца таму, што пры перадачы культуры ад пакалення да пакалення і ад чалавека да чалавека здараюцца памылкі і навацыі, аналагічныя генетычным мутацыям. Некаторыя грамадскія арганізацыі будуць лепш за іншыя прыстасаваны да сацыяльнага або прыроднага асяроддзя і рана ці позна выцясняць менш прыстасаваных. Усё што патрэбна — гэта разнастайнасць розных камбінацый і варыянтаў; свайго роду сыравіны для эвалюцыі і натуральнага адбору, якія знішчаюць дрэнна прыстасаваныя спалучэнні шляхам спроб і памылак.

Супраць такога падыходу ў навуцы выстаўлены шэраг сур'ёзных пярэчанняў. Вось адно з іх. Прымяненне выпадковага адбору ў эвалюцыі нават самых простых грамадстваў сустракае непераадольныя цяжкасці, таму што колькасць магчымых камбінацый асобных уласцівасцей і рыс сацыяльнага і культурнага развіцця велізарная, а час эвалюцыі (не больш за 10 тыс. гадоў пасля прыручэння жывёл і пачатку земляробства) і колькасць вядомых за гэты час гістарычных грамадстваў надта малыя. Для дзеяння выпадковага адбору ў дарвінаўскім сэнсе тут няма ні часу, ні матэрыялу, каб растлумачыць высокі тэмп сацыяльнай эвалюцыі.

А якія дадатковыя крытычныя меркаванні маглі б прывесці вы?

Каштоўнасці і іх роля ў развіцці грамадства

Паняцце «каштоўнасць» стала адным з асноўных у філасофіі і сацыялогіі. Ёсць розныя падыходы да азначэння гэтага паняцця. Спынімся на поглядах нямецкага сацыёлага М. Вебера (1864—1920), які і ўвёў у сацыялогію праблематыку каштоўнасцей. Следам за нямецкім філосафам Г. Рыкертам (1863—1936) Вебер лічыў, што даследчык культуры, у адрозненне ад даследчыка прыроды, павінен вылучаць не агульнае для ўсіх з'яў (законы), а значнае. Вылучыць гэта значнае дапамагаюць каштоўнасці, якія можна разглядаць як усвядомленыя інтарэсы. Трапляючы ў сферу інтарэсаў чалавека, любы прадмет можа ацэньвацца з пункту гледжання дабра і зла, ісціны і хлусні, прыгажосці або агіднасці, дапушчальнага або забароненага і г. д. Але хто задае гэтыя каштоўнасці? Вебер лічыў, што яны вызначаюцца нейкім інтарэсам эпохі, г. зн. носяць гістарычны характар і маюць сілу толькі для пэўнага перыяду эпохі, а затым страчваюць сваё значэнне. Іншыя філосафы, у тым ліку і Рыкерт, разглядалі каштоўнасці як «надгістарычныя» прынцыпы, вечныя і універсальныя.

Каштоўнасці робяць уплыў не толькі на пазнанне і ацэнку з'яў, але і вызначаюць нормы паводзін людзей, іх мэты. Гэтую сувязь Вебер прасочваў у ходзе сацыялагічнага аналізу рэлігіі. У яго працы «Пратэстанцкая этыка і дух капіталізму» разглядаецца ўплыў каштоўнасцей этыкі пратэстантызму на ўсталяванне індустрыяльнага грамадства. Лепшым выяўленнем «духу капіталізму», на думку аўтара, могуць быць правілы Б. Франкліна: «Памятай, што час — грошы. Памятай, што грошы па сваёй прыродзе пладаносныя і здольныя нараджаць новыя грошы... Памятай пагаворку: таму, хто дакладна плоціць, адкрыты кашалёк іншых...» Такім чынам, ідэал ранняга капіталізму — крэдытаздольны, прыстойны чалавек, абавязак якога імкнуцца да памнажэння свайго капіталу. Вебер паказвае, як на ўсталяванне такой этыкі паводзін робіць уплыў этыка рэлігіі — пратэстантызму, якая, у адрозненне ад іншых рэлігій, вызваляла прадпрыемца ад маральных абвінавачванняў у гандлярстве, жульніцтве, больш таго, у рамках пратэстантызму прадпрымальніцтва пачало

разглядацца не толькі як законны, але і як патрэбны богу занятак.

Такім чынам, на думку шэрага заходніх філосафаў, каштоўныя ўстаноўкі ў многім вызначаюць уклад жыцця, робяць уплыў на характар адносін паміж людзьмі.

«Чалавек зусім свабодны ў сваім унутраным жыцці»

Гэтыя словы, вынесеныя ў падзагаловак, належаць сусветна вядомаму пісьменніку і філосафу Ж. П. Сартру. Па сваіх поглядах ён належыць да філасофскага напрамку, які атрымаў назву экзістэнцыялізм (ад лац. existentia — існаванне), г. зн. філасофія існавання. Сярод заснавальнікаў гэтага напрамку — выдатны рускі філосаф М. Бярдзяеў (1874—1948). У цэнтры ўвагі экзістэнцыялістаў — праблемы сутнасці і існавання чалавека. Для высвятлення пазіцый гэтых філосафаў звернемся да выказванняў Сартра. У адной са сваіх прац ён разважае наступным чынам: у час вырабу рэчы чалавек папярэдне фарміруе яе ідэю. Напрыклад, рамеснік, які робіць нож, зыходзіць са сваіх уяўленняў аб тым, што такое нож і які менавіта нож зараз трэба зрабіць. Тут сутнасць папярэднічае існаванню. Дзіця, нарадзіўшыся, ужо існуе, але яму яшчэ трэба стаць чалавекам, набыць чалавечую сутнасць. Яму патрэбна стаць такім, якім ён зробіць сябе сам. Значыць, няма зададзенай прыроды чалавека, ніякая знешняя сіла, ніхто, апрача гэтага індывіда, не можа за яго ажыццявіць яго ператварэння ў чалавека. Гэта рэзка ўзмацняе адказнасць як за самога сябе, за тое, каб атрымалася асоба, так і за ўсё, што адбываецца з іншымі людзьмі. «Калі мы кажам, што чалавек сам сябе выбірае, то тым самым мы таксама хочам сказаць, што, выбіраючы сябе, мы выбіраем усіх людзей... Калі я, напрыклад, рабочы і вырашаю ўступіць у хрысціянскі прафсаюз, а не ў камуністычную партыю, калі я гэтым уступленнем хачу паказаць, што пакорнасць лёсу — рашэнне, якое найбольш падыходзіць для чалавека, што царства чалавека не на зямлі,— то гэта не толькі мая асабістая справа: я хачу быць пакорным для ўсіх, і, значыць, мой учынак закранае ўсё чалавецтва».

Такім чынам, на думку экзістэнцыялістаў, чалавек — унутрана свабодны, яго цяжкі лёс — быць заўсёды ў дарозе, увесь час клапаціцца аб набыцці сваёй сутнасці.

Значыць, мы выявілі, што філосафы і сацыёлагі

даюць розныя адказы на пытанні, што з'яўляецца вызначальным у жыцці чалавека і грамадства; ад прызнання жорсткай залежнасці сацыяльнай рэчаіснасці ад тэхналагічных, эканамічных, біялагічных або культурных фактараў да сцвярджання аб поўнай свабодзе і ўнутранай незалежнасці асобы.

Не менш важнай з'яўляецца і другая праблема: што такое грамадства, якія сацыяльныя групы яго ўтвараюць, як яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і з дзяржаўнай уладай. Большасць даследчыкаў падтрымліваюць вывад аб тым, што грамадства — гэта не механічная сума асобных індывідаў, а сукупнасць розных сацыяльных груп.

«Лісы і львы»

Адна з існуючых тэорый разглядае грамадства як сістэму, падзеленую на эліту («лепшыя»), здольную да кіравання, і неэліту. У аснове гэтага падзелу біялагічныя і псіхалагічныя якасці людзей.

Паводле гэтай тэорыі ў грамадстве існуюць тыя, хто ад нараджэння надзелены здольнасцямі кіраваць людзьмі з дапамогай хітрасці і падману («лісы»), альбо, выкарыстоўваючы прымус і насілле («львы»). Склад кіруючай эліты павінен пастаянна абнаўляцца за кошт прытоку новых свежых сіл, інакш грамадства асуджана на дэградацыю, якая можа змяніцца сацыяльнай рэвалюцыяй, увесь сэнс якой будзе заключацца ў персанальным абнаўленні кіруючай вярхушкі. У гаспадарчым жыцці тып «ільва» ўвасабляе бізнесмен, а «лісы» — ранцье, нясмелы ўкладчык, які жыве стрыжкай купонаў. Пераважанне ў грамадстве ранцье — сведчанне ўстойлівасці грамадства, якая пераходзіць у загніванне. У проціległасць гэтаму ўзмацненне ўплыву бізнесменаў робіць грамадства актыўным і дынамічным.

Аналагічныя ідэі аб «уладнай эліце» развіваюцца ў працах прыхільнікаў тэхнакратычных (карані грэчаскага паходжання, што азначаюць уладу і майстэрства) вучэнняў. Мы ўжо ўпаміналі аб поглядах Дж. Гэлбрэйта. А вось разважанне другога амерыканскага сацыёлага Т. Веблена: сучаснае грамадства не можа існаваць без індустрыі, а яна не можа працаваць без тэхнічных спецыялістаў. Таму варта ім, аб'яднаўшыся, прыгразіць дзяржаве ўсеагульным сабатажам, як адбудзецца сусветная рэвалюцыя — адмаўленне прыватнага капіталу, гэта значыць уласнікаў прамысловых прадпрыемстваў, ад сваёй улады і перадача яе савету тэх-

нікаў. У 30-х гг. паслядоўнікі Веблена паспрабавалі яго ідэю ажыццявіць: стварыць цэнтралізаваныя арганізацыі тэхнічных саветаў і замяніць імі палітычныя органы. Аднак гэтыя спробы былі асуджаны на няўдачу.

«Жыццё — гэта тэатр»

У заходняй сацыялогіі вялікае распаўсюджанне атрымала тэорыя сацыяльных роляў, у адпаведнасці з якой кожны чалавек рэгулярна і на працягу доўгага часу аднаўляе пэўны ўзор паводзін у адпаведнасці са сваім сацыяльным статусам, гэта значыць пэўным становішчам у грамадстве. Пры гэтым паводзіны аднаго і таго ж чалавека будуць рознымі ў залежнасці ад таго, якую сацыяльную ролю ён рэалізуе ў дадзены момант. Такім чынам, паняцці «статус» і «сацыяльная роля» цесна звязаны: статус — гэта пэўнае становішча ў грамадстве і звязаная з ім сукупнасць правоў і абавязкаў; роля ж — гэта дынамічны, паводзінны бок статуса. Статус асобы вызначаецца ўзростам, полам, паходжаннем, прафесіяй, сямейным становішчам. Адрозніваюць статус прыроджаны (сацыяльнае паходжанне, нацыянальнасць) і дасягнуты (адукацыя, кваліфікацыя і да т. п.). Адсюль вынікае, што чалавек можа змяніць свой сацыяльны статус, напрыклад павысіць, атрымаўшы добрую адукацыю. Даследуючы праблемы грамадскіх адносін, сацыёлагі звярнулі ўвагу на той факт, што само паняцце «статус» мае дваістае значэнне: з аднаго боку, кожны чалавек мае пэўны сацыяльны статус (і ў адпаведнасці з ім займае месца ў сістэме грамадскіх адносін), з другога — ён сумяшчае ў сваёй асобе мноства статусаў, з'яўляючыся, напрыклад, адначасова бацькам, членам палітычнай партыі, кіраўніком прадпрыемства і г. д. Іншы раз гэтыя статусы прыходзяць у супярэчнасць адзін з адным. У гэтай сітуацыі чалавек, выконваючы тую ці іншую ролю, вымушаны аддаць перавагу аднаму са статусаў. Ці можаце вы прывесці прыклады, якія канкрэтызуюць гэта палажэнне?

І нарэшце, звернемся да яшчэ адной праблемы, распрацоўка якой займае важнае месца ў грамадазнаўстве. Гэта вызначэнне асноўных этапаў развіцця грамадства, агульнай накіраванасці змяненняў грамадскага жыцця.

Адкуль і куды рухаецца чалавецтва

Пачнём з тэорыі «гістарычнага кругавароту». Нарадзіўшыся даволі даўно, яна і ў XIX ст. не страціла сваіх прыхільнікаў. У сваіх працах яны выстаўлялі новыя пацверджанні ідэі развіцця гра-

мадства па замкнёнаму кругу з вяртаннем да зыходнага стану. Так, шэраг даследчыкаў, што стаяць на пазіцыях разумення гістарычнага працэсу як паслядоўнай змены цывілізацый, выказваюць сцверджанне, што кожная з іх праходзіць рад агульных стадый у сваім развіцці. Нямецкі філосаф А. Вебер (1868—1958) назваў іх: «маладосць», «сталасць» і «заняпад». Некаторыя аўтары следам за Шпенглерам бачаць у гісторыі чалавецтва паступовую змену толькі дзвюх фаз развіцця: варварства і цывілізацыі.

У той жа час больш глыбокі аналіз гістарычнага мінулага выклікаў крытыку тэорыі гістарычнага кругавароту. Многія мысліцелі бачылі нейкую агульную лінію, якая пранізвала ход сусветнай гісторыі. Большасць з тых, хто падтрымліваў ідэю грамадскага прагрэсу, бралі за яго аснову змяненні ў матэрыяльнай культуры, перш за ўсё ў галіне тэхнікі і вытворчасці, і ў адпаведнасці з гэтым вылучалі асноўныя этапы гістарычнага шляху чалавецтва. Адной з найбольш разгорнутых у гэтых адносінах з'яўляецца тэорыя «стадый эканамічнага росту» амерыканскага сацыёлага У. Растоў (нарадзіўся ў 1916 г.). Вылучаюцца наступныя пяць этапаў.

Традыцыйнае грамадства. Да яго даследчык адносіць аграрныя грамадствы з даволі прымітыўнай тэхнікай, перавагай у сферы эканомікі сельскай гаспадаркі, саслоўна-класавай структурай і ўладай буйных зямельных уласнікаў;

Пераходнае грамадства. На гэтым этапе развіцця адбываюцца даволі бурныя змены ў грамадскім жыцці: расце сельскагаспадарчая вытворчасць, з'яўляецца новы від дзейнасці — прадпрымальніцтва і адпаведны яму новы тып прадпрымальных людзей, складваюцца цэнтралізаваныя дзяржавы, расце нацыянальная самасвядомасць. Усё гэта рыхтуе перадумовы для пераходу грамадства на новую ступень развіцця;

Стадыя «зруху». Яе змест складаюць прамысловыя рэвалюцыі і наступныя за імі сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні;

Стадыя «сталасці». Гэты перыяд аўтар звязвае з развіццём навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, ростам значэння гарадоў і колькасці гарадскога насельніцтва;

Эра «высокага масавага спажывання». Важнейшай рысай гэтай стадыі з'яўляецца значны рост сферы паслуг, вытворчасці тавараў ужытку з ператварэннем іх у асноўны сектар эканомікі.

У апошнія дзесяцігоддзі вялікі ўплыў атрымалі ідэі амерыканскага філосафа і публіцыста О. Тофлера (нарадзіўся ў 1928 г.). У развіцці чалавечай цывілізацыі ён вылучае тры стадыі: I — аграрная, II — індустрыяльная. Трэцюю стадыю, назву якой аўтар пакуль не дае, ён звязвае з пачаткам камп'ютэрнай эры і пераходам да інфармацыйнага грамадства.

Больш падрабязна прагноз грамадскага развіцця мы разгледзім у наступных аддзелах курса.

Пытанні і заданні

1. Якія асноўныя праблемы былі разгледжаны ў прыведзеным кароткім аглядзе развіцця немарксісцкага грамадазнаўства ў XX ст.? Пакажыце розныя падыходы да рашэння гэтых праблем.

2. Як вы лічыце: ці з'яўляецца адсутнасць адзінай тэорыі грамадскага развіцця, наяўнасць разнастайных школ, напрамкаў, вучэнняў станоўчым бокам немарксісцкага грамадазнаўства ці, наадварот, гэта ёсць слабасць?

3. Раскрыйце сэнс і канкрэтызуйце палажэнне: сацыяльная роля — гэта «чакаемыя паводзіны ў залежнасці ад дадзенага становішча чалавека ў грамадстве».

4. Ці згодны вы з азначэннем класавай барацьбы як барацьбы індывідаў за лепшы сацыяльны статус ва ўмовах, калі вышэйшыя ролі і статусы колькасна абмежаваны?

5. Прывядзём некаторыя выказванні М. А. Бярдзяева аб сэнсе гісторыі з яго працы «Філасофія свабоды»: «Гісторыя не можа мець сэнсу, калі яна ніколі не скончыцца, калі не будзе канца; сэнс гісторыі і ёсць рух да канца, да завяршэння, да выніку. Рэлігійная свядомасць бачыць у гісторыі трагедыю, якая мае пачатак і будзе мець канец. У гістарычнай трагедыі ёсць шэраг актаў, і ў іх наспявае канчатковая катастрофа, катастрофа, якая ўсё вырашае...

Знешнія і грубыя формы зла паступова адмаюць у гісторыі. Людзі не будуць ужо паядаць адзін аднаго, не будзе такіх забойстваў, пакаранняў і разбояў, не будзе такой варожасці і невуцтва, такіх патрэб і бездапаможнасці перад прыродай. Але туга ўзрасце, радасці будзе яшчэ менш, жах пустаты і небыцця дасягне размераў небывалых...

І самы страшэнны жах чакае чалавецтва наперадзе, самае страшэннае зло ўвасобіцца ў будучым, калі канчаткова знікнуць першапачатковыя формы зла. Для перамогі над будучым злом расце сіла царства божага, сіла творчая; увасобіцца ў будучым і вышэйшае дабро. У гэтым сутнасць апакаліптычных прароцтваў аб сэнсе і канцы гісторыі».

Падумайце над разважаннямі філосафа, вызначце да іх свае адносіны.

6. У сваёй кнізе «Запіскі рэвалюцыянера» П. А. Крапоткін пісаў: «Вядома, да якіх вывадаў прыйшла большасць паслядоўнікаў Дарвіна... Няма такога насілля белых народаў над чорнымі або дужых у адносінах да слабых, якога не імкнуліся апраўдаць гэтымі словамі — «барацьба за існаванне».

Вы ўжо заўважылі, што ў гэтых словах змяшчаецца крытыка грубых форм сацыял-дарвінізму. Але вось які контраргумент супраць ідэй гэтай тэорыі прыводзіць аўтар: у прыродзе існуе не толькі

барацьба, але і ўзаемная дапамога, якая значна важнейшая для прагрэсіўнага развіцця віду. Аналагічным чынам складваецца сітуацыя і ў грамадстве.

Ці згодны вы з такой аргументацыяй? Абгрунтуйце свой пункт гледжання.

§ 7. ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАГА ГРАМАДАЗНАЎСТВА

На папярэдніх занятках мы прасачылі з вамі развіццё ўяўленняў аб грамадстве з моманту іх нараджэння да сённяшняга дня. Гісторыя захавала і данесла да нас імёны выдатных мысліцелей мінулага, якія імкнуліся стварыць цэласныя вучэнні, што тлумачаць прычыны грамадскіх змяненняў, іх накіраванасць, змест уяўленняў аб ідэальным грамадскім і дзяржаўным ладзе, вывады аб шляхах дасягнення гэтых станаў. Важнай вяхой у развіцці перадавой грамадскай думкі стаў марксізм, які стварыў новую філасофію сусветна-гістарычнага развіцця чалавецтва.

Складаным быў лёс марксісцкага грамадазнаўства пасля смерці яго стваральнікаў. Розныя напрамкі прэтэндавалі на адзіна правільнае і сучаснае тлумачэнне гэтага вучэння. З перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. марксізм-ленінізм стаў пануючай, а затым і адзінай ідэалогіяй нашага грамадства. Ператварэнне марксізму ў сродак «ідэалагічнай падтрымкі ажыццяўляемага ў нашай краіне ў 30—70 гг. палітычнага курса, звядзенне яго да набору непарушных догмаў (ад грэчаскага «догма» — нязменнае палажэнне, якое прымаецца слепа, на веру) прывяло да звужэння яго магчымасцей у якасці навуковай тэорыі. А разам з тым цяжкі час пачаўся для ўсяго грамадазнаўства, якое грунтуецца на ідэях марксізму-ленінізму. Яно ператварылася ў падлізлівую служанку ідэалогіі.

Сёння грамадскія навукі развіваюцца ў новых умовах. Перш за ўсё зняты ідэалагічныя абмежаванні, вучоныя атрымалі магчымасць адкрыта выказваць свае пункты погляду, крытычна пераглядаць шэраг палажэнняў, якія існавалі раней у выглядзе абсалютных і бясспрэчных ісцін. Апрача таго, у навуковы абарот і проста ў кола чытання многіх увайшлі новыя крыніцы, якія раней знаходзіліся ў закрытых сховішчах бібліятэк і архіваў, у прыватнасці, працы вядомых кіраўнікоў партыі М. Бухарына, Л. Троцкага, Г. Зіноўева і інш., успаміны буйных грамадскіх і партыйных дзеячаў

мінулага, военачальнікаў А. Керанскага, А. Дзянікіна, П. Мілюкова. Пачалося асэнсаванне поглядаў і ідэй вучоных-эканамістаў першых гадоў Савецкай улады А. Чаянава, М. Кандрацьева. З'явілася магчымасць сур'ёзнага азнаямлення са спадчынай рускіх філосафаў У. Салаўёва, М. Бярдзяева, С. Булгакава.

Вучоныя пашыраюць рамкі сваіх даследаванняў, уключаючы ў іх вострыя праблемы сучаснасці. У цэнтры ўвагі грамадазнаўцаў сёння навуковая трактоўка палажэнняў аб правах грамадзян і сацыяльнай справядлівасці, даследаванне магчымасцей развіцця ў нашай краіне рыначных адносін, дапушчальнасці і межаў прыватнай уласнасці, аналіз адносін царквы і дзяржавы ва ўмовах дэмакратызацыі нашага грамадства, даследаванне суадносін навукова-матэрыялістычнага і рэлігійнага светапогляду і шэраг іншых праблем. Іх абмеркаванне часта адбываецца ў форме дыскусій, дзе непасрэдна супастаўляюцца розныя пункты погляду. Пазнаёмімся са зместам некаторых з іх.

Сацыялізм. Яго спадчына і будучыня

У цэнтры ўвагі ўсіх грамадскіх навук, і ў першую чаргу паліталогіі, сацыялогіі, філасофіі, стаяць пытанні сацыяльна-эканамічнай сутнасці сацыялізму як грамадскага ладу, аналіз палітычных спроб ажыццяўлення яго прынцыпаў, вызначэнне перспектыў далейшага развіцця нашага грамадства. Якое грамадства мы пабудавалі? Ці адпавядае яно тэарэтычным уяўленням, распрацаваным заснавальнікамі марксізму? Ці ёсць будучыня ў сацыялізму? На гэтыя пытанні існуюць, як вядома, розныя адказы. Крайнімі пунктамі погляду ў шырокай палітры меркаванняў, ацэнак можна лічыць, з аднаго боку, сцверджанні аб краху сацыялізму як ідэі і сацыяльнай практыкі, а з другога — і заклікі аднавіць дыктатуру пралетарыяту і цвёрдай рукой працягваць весці народ выбраным у 1917 г. шляхам сацыялізму.

Зыходным пунктам абмеркаванняў часта становіцца пытанне аб тым, як нарадзілася сама сацыялістычная ідэя. Адны сцвярджаюць, што яна — плод пустых разважанняў, канструкцыя чыстага розуму і не мае ніякіх каранёў у рэальным жыцці, што гэта той ідэал, які ніколі не можа ажыццявіцца. Але вось аргументы другога боку. Перш за ўсё звернемся да першапачатковага значэння слова «сацыялізм», які ўжыў упершыню французскі рэвалюцыянер П'ер Леру. Сацыялізм раз-

глядаўся як калектывісцкі пачатак, супрацьлеглы «індывідуалізму». У гэтым сэнсе за плячамі сацыялістычнай ідэі стагоддзі, не Марксам яна выдумана. Буржуазныя рэвалюцыі, абвясціўшы свабоду індывіда, на практыцы прывялі да раннекапіталістычнага грамадства сацыяльнай няроўнасці і класавых антаганізмаў. Высветлілася, што сапраўдная свабода асобы патрабуе вызвалення ўсіх членаў грамадства, ці, як пісалі класікі марксізму, «свабоднае развіццё кожнага з'яўляецца ўмовай свабоднага развіцця ўсіх». Узнікнуўшы, ідэі сацыялізму авалодалі розумам мільёнаў людзей, прывялі ў рух магутныя грамадскія сілы, выклікалі глыбокія змены ў сусветным грамадска-палітычным развіцці. Гэта пад сілу толькі ідэям, якія маюць глыбокія карані ў матэрыяльным і духоўным развіцці чалавецтва. Ці можна ў такім выпадку згадзіцца з тымі, хто гаворыць аб крызісе самой ідэі сацыялізму? Нам уяўляецца, што прыведзеныя аргументы дазволяць даць адмоўны адказ на дадзенае пытанне. А як лічыце вы? Паспрабуйце абгрунтаваць свой пункт погляду.

Перабудова і мараль

Істотнае абнаўленне перажывае і такая галіна грамадазнаўства, як этыка. Мяняецца само разуменне маралі. Ва ўсякай культуры існуе свой вобраз маралі. Напрыклад, у рамках хрысціянскай культурнай традыцыі ён задаваўся запаведзямі Маісея, а яшчэ больш Нагорнай Пропаведдзю Ісуса Хрыста. Новы час выпрацаваў ідэал, у якім маральная асоба паўстае ў якасці свабоднага грамадзяніна. У нашым грамадстве ў 20—50-я гг мараль атаясамлялася з палітычнай карыснасцю, практычнымі патрэбамі дзяржавы. Зараз мараль усё больш разумеецца як агульначалавечая з'ява, а апрача таго, яна разглядаецца не як адно з выяўленняў культуры, разам з многімі іншымі (правам, мастацтвам), а вылучаецца з гэтага рада ў якасці асновы, кораня, з якога вырастае ўсё астатняе.

Асаблівае значэнне набываюць маральныя аспекты дзейнасці ва ўмовах пераходу да рынку. Прывядзём тры розныя падыходы да гэтай праблемы. Прапануем абдумаць прыведзеныя аргументы і выпрацаваць сваю пазіцыю.

1. Эканамічная эфектыўнасць непарыўна звязана з маральнасцю. Пераход да рыначных адносін адкрывае дарогу новай, больш эфектыўнай эканоміцы, а значыць вырастае гуманістычны змест працы, і з маральна-

этычнага пункту гледжання такі пераход цалкам апраўданы. Інакш кажучы, чалавек, які выконвае добрыя, патрэбныя людзям рэчы, з'яўляючыся высокім прафесіяналам у сваёй справе, займае адначасова і высокаманальную пазіцыю (нават калі як асоба ён можа быць малапрыемным, злым чалавекам).

2. Рыначная эканоміка прыносіць з сабой у грамадскае жыццё рысы, якія зневажаюць маральныя пачуцці людзей: узмацненне маёмаснай няроўнасці, утварэнне «сацыяльнага дна» з людзей, якія не вытрымліваюць эканамічныя гонкі, рост адчужэння паміж людзьмі. Таму новым эканамічным адносінам не можа быць дадзена адназначная маральная ацэнка.

3. Маральныя катэгорыі — гэта нешта ўстойлівае, у многім нават абсалютнае для грамадства. І іх нельга атаясамляць з часовым, адносным, няхай гэта нават цывілізаваны рынак і аплата па працы. Чалавек не можа і ніколі не зможа прымірыцца з тым, каб больш зарабляць і жыць лепш за суседа. Чалавеку патрэбны кантакт са светам абсалютнага, і забяспечвае гэты кантакт маральнасць, якая, наогул кажучы, пачынаецца толькі там, дзе ўзнікае незадаволенасць сучасным, г. зн. часовым і мінучым, якім бы шчаслівым яно ні было, дзе свядомасць выяўляе неадольны зазор паміж ідэалам і рэчаіснасцю.

Моладзь у сучасным свеце

У цэнтры абмеркавання гэтай праблемы выявілася некалькі пытанняў. 1. Выхаванне і навучанне падрастаючых пакаленняў — важнейшыя функцыі любога грамадства. Што змянілася ў гэтых працэсах сёння? Якія якасці асобы з'яўляюцца ў сучасных умовах найбольш сацыяльна-каштоўнымі?

Вось якія меркаванні былі выказаны па гэтых праблемах. Сённяшнім дзецям трэба будзе жыць у свеце, які істотна адрозніваецца ад таго, у якім жывуць іх бацькі. Таму для старэйшых пакаленняў важна не толькі перадаць маладым свае веды і перакананні, але і падрыхтаваць іх да таго, каб самастойна дзейнічаць і прымаць рашэнні ва ўмовах, якіх не было пры жыцці бацькоў. Каб жыць і працаваць у дынамічным грамадстве бліжэйшага будучага, індывід павінен мець у пэўнай меры процілеглыя якасці. З аднаго боку, трэба быць асобай, мець устойлівы светапогляд, маральныя перакананні, інакш у складаных жыццёвых сітуацыях чалавек будзе альбо «раздвойвацца», альбо рэагаваць

неўрозамі. З другога боку, неабходна высокая псіхалагічная гібкасць, здольнасць засвойваць і перапрацоўваць новую інфармацыю, ствараць нешта новае не толькі ў юнацтве, але і ва ўзросце, калі мы прывыклі абыходзіцца старым багажом. Без гэтага індывід адстане ад ходу гісторыі.

2. Які ж сацыяльны вопыт перадаваць дзецям? Сёння гэта пытанне многіх ставіць у тупік. Некаторыя лічаць, што наша старэйшае пакаленне на самай справе не мае ў сваёй культуры таго цвёрдага ўзору дзейнасці, да якога раней або пазней прыйдзе малодшае пакаленне. Веды, якія сёння адкрываюцца «бацькам», ёсць веды аб тым, наколькі насычана міфамі наша свядомасць, наколькі яна не адпавядае сітуацыі, якая склалася ў свеце і ў нашай краіне к канцу XX ст. Калі няма ўзору, то, можа, вучыцца на памылках старэйшага пакалення? Але як? Магчыма формула павінна быць такой: «не будзьце такімі, як мы, не паўтарайце нас з нашымі ўчарашнімі спадзяваннямі і сённяшнімі спрэчкамі і расчараваннямі?» Але якая ж станоўчая праграма? Вось адзін з магчымых адказаў. Развіццё агульнацывілізацыйных пачаткаў у нашым грамадстве мае на ўвазе выпрацоўку ў кожнага наступных установак: адмаўленне ад ідэі абагачэння спекулятыўнымі спосабамі; сумленная праца; развіццё прывычкі антырабскіх паводзін пры безумоўнай павазе да правоў і свабод чалавека — і самога сябе, і іншых; у культуры — устаноўка на разнастайнасць, культурны плюралізм.

Ці згодны вы, што выхаванне і самавыхаванне гэтых якасцей сёння жыццёва неабходныя для падрастаючых пакаленняў? Што пры гэтым можа быць узята з вопыту старэйшых пакаленняў? Якая ваша станоўчая праграма самавыхавання?

3. Што такое «культура маладых»? Ці з'яўляецца рок-культура культурай пратэсту?

Існуе сцверджанне, што рок — гэта не сучасная музыка (сучаснай у гэтай музыцы з'яўляецца толькі апаратура), а сама рок-культура ўзыходзіць да карнавальнай культуры сярэдневякоўя. Сувязь гэта праяўляецца ў многіх знешніх атрыбутах рок-спевакоў і груп, касцюмерыя якіх балансуе паміж гіпертрафіямі нармальнага адзення і голым целам. Сюды трэба далучыць металічныя ланцугі і рознага роду вярыгі, а таксама пакутніцкі (фізіялагічна апраўданае напружанне галасавога апарату, але яшчэ і спецыяльна стымулюемае) выраз твару

музыканта. Узнікае аналогія з такім элементам смехавой культуры, як юродства, г. зн. агідна страшэнным і разам з тым сур'ёзным.

Адносна сацыяльнай ролі рок-музыкі выказваюцца розныя пункты гледжання. Многія схільны бачыць у ёй форму маладзёжнага пратэсту і ў нас, і на Захадзе. А за самой з'явай «абуральных паводзін» заўсёды стаіць творчы пошук нейкага новага шляху ў развіцці культуры. У той жа час ёсць даследчыкі, якія не падзяляюць гэтую пазіцыю. Яны сцвярджаюць, што ўсе нашы намаганні «гуманізаваць» рок выглядаюць наіўнасцю, таму што сам ён звязаны з той часткай маладзёжнай культуры, якая альбо прама ўсталёўвае сябе як культура крымінальная, альбо сцірае адрозненні паміж дабром і злом, паміж злачыннымі і законнымі тыпамі сацыяльных паводзін.

А які ваш пункт погляду?

Пытанні і заданні

1. Што ў сучасных умовах садзейнічае развіццю грамадскіх навук?

2. Чаму адной з найбольш распаўсюджаных форм даследавання праблем грамадазнаўства сталі дыскусіі, «круглыя сталы»?

3. Выкажыце свае адносіны да праблем, якія ўзняты ў дыскусіі «Моладзь у сучасным свеце». Якія яшчэ пытанні ў рамках гэтай тэмы з'яўляюцца на ваш погляд цікавымі?

4. Ці лічыце вы маральныя нормы абсалютнымі або гістарычна зменлівымі? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

5. Выкажыце свае адносіны да тэзісаў: «Маральнасць — аснова духоўнага жыцця грамадства»; «мараль вызначае ўсе бакі жыцця грамадства, у тым ліку і эканамічныя адносіны»; «маральныя нормы і адносіны другасныя, яны вызначаюцца характарам эканамічных адносін, якія існуюць у грамадстве».

6. Чаму пытанне аб сацыялізме як тэарэтычнай мадэлі ў практычным сэнсе стала сёння прадметам вострых дыскусій?

7. Прывядзём выказванне італьянскага палітычнага дзеяча К. Расселі з кнігі «Ліберальны сацыялізм»: «Сацыялізм — гэта не сацыялізацыя, не пралетарыят ва ўладзе і нават не матэрыяльнае раўнапраўе. Сацыялізм па сутнасці справы — гэта прагрэсіўнае ажыццяўленне ідэі свабоды і справядлівасці паміж людзьмі, ідэі прыроджанай, якая... знаходзіцца ў глыбіні кожнай чалавечай істоты. Гэта намаганне забяспечваць усім людзям роўную магчымасць пражыць менавіта такое жыццё, якое толькі і можа звацца жыццём, пазбаўляючы іх ад рабскай залежнасці ад матэрыяльных патрэб...»

Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

Раздзел II. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ МІНУЛАГА

§ 8. ШТО ТАКОЕ СУСВЕТНАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

«Гісторыя ў двух вымярэннях»

Ужо некалькі гадоў вы вывучаеце гістарычнае мінулае народаў нашай краіны і іншых дзяржаў і народаў свету. Многія з вас, безумоўна, чыталі кнігі з гістарычнымі сюжэтамі. Давайце паспрабуем мысленна ахапіць увесь шлях, які прайшло грамадства з моманту з'яўлення Чалавека разумнага да сённяшніх дзён. Пры гэтым нам прыйдзецца мысліць сама меней у двух вымярэннях: у «вертыкальным» — маючы на ўвазе многія тысячагоддзі, якія аддзяляюць нас ад першабытных людзей, і ў «гарызантальным» — падразумяваючы мноства плямён, народаў, краін, якія запаўняюць рэальную гістарычную прастору на кожным адрэзку грамадскага развіцця.

Якія ж вобразы або абагульненыя ўяўленні ўзнікаюць пры гэтым у нашай свядомасці? Думаем, што ў свядомасці многіх проста выбудоўваецца якаясьці храналагічная паслядоўнасць этапаў, якія змяняюць адзін аднаго, краін, асобных рэгіёнаў: першабытнае грамадства, Старажытны Усход; Грэцыя і Рым эпохі рабаўладання; старажытнаруская дзяржава з цэнтрам у Кіеве; сярэдневяковая Еўропа; Расія Пятра I; і зноў Еўропа, а затым і Паўночная Амерыка, што кіпяць у «катле» першых буржуазных пераўтварэнняў; і зноў Расія эпохі рэвалюцыйных пераўтварэнняў; і нарэшце шматаблічны сённяшні свет, усю палітру фарбаў якога пры жаданні можна звесці толькі да двух адценняў: цывілізаваныя краіны і ўсе астатнія. У гэтым сэнсе паняцце «цывілізаванасць» выступае сінонімам вышэйшых дасягненняў чалавека і чалавецтва. Заўважым адначасова, што менавіта так гэта паняцце трактаваў, да прыкладу, Ф. Энгельс, проціпастаўляючы эпосе цывілізацыі перыяд варварства, што папярэднічаў ёй. Аднак сёння многія вучоныя і палітыкі лічаць, што дадзенае азначэнне гэтага паняцця з'яўляецца занадта вузкім. Іншыя яго значэнні мы разгледзім у ходзе далейшых разважанняў.

Уверх па лесвіцы, якая вядзе...

Такім чынам, што ж такое гістарычны працэс? Адным ён уяўляецца ў выглядзе лесвіцы, кожная прыступка якой — гэта этап развіцця, што адкрывае перад чалавецтвам новыя магчымасці і перспек-

тывы. І ўсе народы паступова ўзыходзяць па ёй, праўда, адбываецца гэта не адначасова. Магчыма і пераскакванне цераз прыступкі, і затрымка на той або іншай стадыі развіцця. З гэтага пункту погляду сёння ўсе прыступкі лесвіцы гістарычнай эвалюцыі заняты нейкай часткай насельніцтва. Большасць размясцілася на прыступках з надпісам «капіталізм». Некалькі дзяржаў адносяць сябе да сацыялістычных. Але, акрамя гэтага, мы знойдзем на зямным шары і такія вобласці, дзе захаваліся, няхай у няяўным выглядзе, феадальныя, рабаўладальніцкія і першабытныя адносіны. У марксісцкім вучэнні аб грамадстве, як вам ужо вядома, гэтыя прыступкі гістарычнага працэсу атрымалі назву «грамадска-эканамічных фармацый». У рамках гэтага вучэння на першы план ставіцца выяўленне таго агульнага, што ўласціва розным краінам, якія знаходзяцца ў рамках адной фармацыі. А гэта дазволіла, па словах Леніна, перайсці ад апісання грамадскіх з'яў да іх навуковага аналізу, заснаванага на вывучэнні агульных заканамернасцей развіцця і асаблівасцей іх праяўлення ў розных краінах. Выбудавалася і ўнутраная логіка сусветнай гісторыі. «Хаос і самавольства, што панавалі да гэтага часу ў поглядах на гісторыю і на палітыку, змяніліся надзвычайна цэльнай і стройнай навуковай тэорыяй, якая паказвае, як з аднаго ўкладу грамадскага жыцця развіваецца, з прычыны росту прадукцыйных сіл, другі, больш высокі,— з прыгонніцтва, напрыклад, вырастае капіталізм» (Ленін У. І. Поўн. зб. тв. Т. 23. С. 46). Вышэйшым этапам развіцця, якога рана ці позна дасягне ўсё чалавецтва, на думку заснавальнікаў марксізму, стане камунізм. Усюды на зямлі ўсталюецца супольнасць свабодных і свядомых працаўнікоў, установіцца поўная сацыяльная роўнасць, створацца ўмовы, пры якіх «усе крыніцы грамадскага багацця пальюцца поўным патокам», а асоба кожнага атрымае ўсебаковае і гарманічнае развіццё, ажыццявіцца самы справядлівы прынцып: «ад кожнага па здольнасці, кожнаму па патрэбнасцях».

Гэтыя ўяўленні, што яшчэ нядаўна разглядаліся ў нашым грамадазнаўстве як адзіна правільныя, сёння ўспрымаюцца многімі дастаткова крытычна. Па-першае, узмацняюцца сумненні адносна дасягальнасці ў аглядным будучым камуністычнай фазы развіцця (некаторыя філосафы і палітолагі сцвярджаюць, што такі стан чалавецтва наогул недасягальны). Па-другое, не

ўсе гістарычныя факты «ўкладваюцца» ў фармацыйную мадэль. Так, з курса гісторыі вы ведаеце, што адначасова з рабаўладальніцкімі дзяржавамі Міжземнамор'я існавалі плямёны, якія знаходзіліся на стадыі першабытнага, архаічнага ладу, а таксама і грамадствы ўсходняга тыпу. Тэарэтычна рабаўладальніцкі лад уяўляў сабой наступную ступень пасля радавога, а ў рэальнай жа гісторыі ён з гэтым ладам суіснаваў аж да сваёй гібелі, якую і прынеслі яму народы і плямёны, што знаходзіліся на больш прымітыўнай стадыі. Па-трэцяе, поруч з узмацненнем інтэгральных працэсаў, у свеце нарастае і разнастайнасць, «мазаічнасць» сацыяльнай рэчаіснасці.

Непаўторная своеасаблівасць

Адштурхоўваючыся ад апошняга доваду, разгледзім другую сістэму поглядаў на сусветную гісторыю. У яе аснове ідэя унікальнасці сацыяльных з'яў, своеасаблівасць шляху, пройдзенага асобнымі народамі. З гэтага пункту погляду, гістарычны працэс — гэта змена цэлага рада цывілізацый, якія існавалі ў розны час у розных рэгіёнах планеты і адначасова існуюць у цяперашні час. У навуцы існуе мноства азначэнняў паняцця «цывілізацыя». Вышэй ужо ўпаміналася, што доўгі час цывілізацыя разглядалася як этап гістарычнага развіцця чалавецтва, што ідзе следам за дзікасцю і варварствам. Сёння даследчыкі прызнаюць гэты сэнс паняцця недастатковым і недакладным. Пад цывілізацыяй разумеецца якасная спецыфіка (своеасаблівасць матэрыяльнага, духоўнага, сацыяльнага жыцця) той або іншай групы краін, народаў на пэўным этапе развіцця. «Цывілізацыя — гэта сукупнасць духоўных, матэрыяльных і маральных сродкаў, якімі дадзеная супольнасць узбройвае свайго члена ў яго процістаянні знешняму свету»,— піша савецкі гісторык М. Барг.

Па меркаванню рада даследчыкаў, цывілізацыі рашучым чынам адрозніваліся і адрозніваюцца адна ад адной, паколькі грунтуюцца на несумяшчальных сістэмах сацыяльных каштоўнасцей.

Любая цывілізацыя характарызуецца не толькі спецыфічнай грамадска-вытворчай тэхналогіяй, але і ў не меншай меры адпавядаючай ёй культурай. Ёй уласцівы пэўная філасофія, грамадска значныя каштоўнасці, абагульненае аблічча свету, свой прынцып жыцця, які прадстаўляе асновы духу народа, яго мараль, перакананасць, што вызначаюць адносіны да самога сябе.

Асноўны прынцып жыцця аб'ядноўвае людзей у народ дадзенай цывілізацыі, забяспечвае яго адзінства на працягу ўсёй уласнай гісторыі.

Сярод мноства цывілізацый гісторыкі вылучаюць так званыя традыцыйныя грамадствы: Старажытную Індыю і Кітай, дзяржавы мусульманскага Усходу, Вавілон і Старажытны Егіпет. Іх самабытныя культуры былі падтрыманнем спосабу жыцця, які сфарміраваўся ў гэтых дзяржавах. Перавага аддавалася традыцыйным вобразам і нормам, якія ўвабралі ў сябе вопыт продкаў. Віды дзейнасці, іх сродкі і мэты мяняліся вельмі павольна.

Асобым тыпам цывілізацыі стала еўрапейская, якая пачала свой разбег у эпоху Адраджэння. Яна грунтавалася на іншых каштоўнасцях. Сярод іх: значэнне навукі, пастаяннае імкненне да прагрэсу, да змяненняў форм дзейнасці, якія склаліся. Іншым было і разуменне прыроды чалавека, яго ролі ў грамадскім жыцці. Яно грунтавалася на хрысціянскім вучэнні аб маралі і адносінах да чалавечага розуму, як створанага па вобразу і падабенству божага і таму здольнага да зразумення сэнсу быцця.

Такім чынам, цывілізацыйны падыход да гістарычнага працэсу мае на ўвазе ўлік і вывучэнне, у першую чаргу, таго своеасаблівага, самабытнага, што ёсць у гісторыі народа або цэлага рэгіёна.

Разам з тым дадзены падыход, даведзены да крайняга свайго выяўлення, можа прывесці да поўнага адмаўлення агульных рыс у развіцці народаў, элементаў паўтаральнасці ў гістарычным працэсе. Так, рускі гісторык М. Я. Данілеўскі пісаў, што не існуе сусветнай гісторыі, а ёсць толькі гісторыя дадзеных цывілізацый, якія маюць індывідуальны замкнуты характар.

Гэта тэорыя расчляняе сусветную гісторыю ў часе і ў прасторы на ізаляваныя і проціпастаўляемыя адна адной культурныя супольнасці. Яна выглядае цяпер, на зыходзе нашага стагоддзя, калі рэзка ўзмацніліся ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў розных краін і народаў, гістарычна абмежаванай. Наўрад ці яна ў дастатковай меры адлюстроўвае і рэальнасці мінулых этапаў развіцця.

Такім чынам, знаёмства з грамадска-гістарычнай думкай мінулага не толькі малюе карціну дасягненняў і поспехаў у развіцці грамадазнаўства, але і служыць перасцярогай ад празмернага захаплення якой-небудзь

ідэяй, ад неапраўданага пашырэння меж яе прымянення.

Сёння гісторыкі і грамадазнаўцы, улічваючы, што цывілізацыйны падыход, у сучасным яго разуменні, у аснову вывучэння мінулага і сучаснага ставіць чалавека, яго выкарыстанне лічаць вельмі плённым, што дапамагае растлумачыць з'явы і працэсы, якія не ўкладваюцца ў схему фармацыйнага аналізу.

Як адносяцца цывілізацыйны і фармацыйны падыходы ў вывучэнні грамадскага жыцця? Некаторыя даследчыкі, падкрэсліваючы слабасці фармацыйнага падыходу, прапануюць наогул адмовіцца ад яго прымянення ў навуцы. Аднак не ўсе падзяляюць гэты пункт погляду. У прыватнасці, дастаткова пераканаўча аргументуюць сваю пазіцыю прыхільнікі разглядання фармацыйнага падыходу як дадатковага кампанента цывілізацыйнага аналізу.

Цывілізацыя і культура

Паняцце «культура» амаль такое ж многазначнае, як і паняцце «цывілізацыя» (першае з іх мае каля ста сэнсавых значэнняў). У найбольш агульным сэнсе пад культурай разумеецца творчая дзейнасць чалавецтва, накіраваная на пераўтварэнне рэчаіснасці, на выяўленне і развіццё магчымасцей і здольнасцей чалавека. Прынята вылучаць культуру матэрыяльную (тэхніка, матэрыяльныя каштоўнасці) і духоўную (навука, мастацтва, філасофія, мараль і г. д.).

Сувязь цывілізацыі і культуры была падмечана даўно. Але характар гэтай сувязі ацэньваецца па-рознаму. Многія даследчыкі лічаць, што развіццё культуры — гэта і ёсць развіццё цывілізацыі. Такі пункт погляду найбольш распаўсюджаны і ў абывацельскай свядомасці. Ён зарадзіўся яшчэ ў эпоху Асветы, калі Вальтэр, Цюрго разглядалі культуру як, у першую чаргу, развіццё розуму. Пры гэтым «культурнасць», «цывілізаванасць» нацыі або краіны процілпастаўляліся «дзікасці» і «варварству» першабытных народаў.

Разам з тым ужо ў XIX ст. выявіўся і іншы падыход, які рэзка «разводзіць» паняцці «культура» і «цывілізацыя». Так, нямецкі філосаф О. Шпенглер (1880—1936) вылучаў восем культур. Кожная з іх праходзіць у сваім жыцці рад стадый і, паміраючы, ператвараецца ў цывілізацыю. Пераход ад культуры да цывілізацыі азначае ўпадак творчасці, гераічных дзеянняў, калі мастацкая творчасць аказваецца непатрэбнай, а трыум-

фуе механічная работа. Прыхільнікі такога падыходу адмаўляюць узаемасувязь і пераемнасць у развіцці культуры.

З развіццём тэорыі каштоўнасцей (М. Вебер і інш.) зноў былі збліжаны паняцці «цывілізацыя» і «культура». Пад духоўнай культурай сталі разумець у першую чаргу сістэму каштоўнасцей і ідэй, уласцівых дадзенаму грамадству. І менавіта гэта сістэма каштоўнасцей надае цэласнасць і непаўторную своеасаблівасць той або іншай цывілізацыі.

Адзіная сусветная цывілізацыя або разнастайнасць цывілізацый

У гістарычнай навуцы і грамадазнаўстве ўжо даўно ідзе спрэчка аб тым, ці рухаецца свет да адзінай цывілізацыі, каштоўнасці якой стануць набыткам усяго чалавецтва, ці захаваецца і нават узмацніцца тэндэнцыя да культурна-гістарычнай разнастайнасці і грамадства будзе ўяўляць сабой сукупнасць рада цывілізацый, якія развіваюцца самастойна.

Прыхільнікі апошняй з названых пазіцый падкрэсліваюць тую бясспрэчную думку, што ў аснове развіцця любога жыццяздольнага арганізма (у тым ліку і супольнасцей людзей) ляжыць разнастайнасць. Распаўсюджванне ж адзіных, агульных для ўсіх народаў каштоўнасцей, жыццёвых укладаў пакладзе канец развіццю чалавечага грамадства.

Важкія аргументы ёсць і ў іншага боку. Пацвярджаецца і падмацоўваецца канкрэтнымі фактамі грамадска-гістарычнага развіцця, што некаторыя асноўныя, выпрацаваныя пэўнай цывілізацыяй формы яе дасягнення атрымліваюць агульнае прызнанне, распаўсюджанне.

Так, да каштоўнасцей, якія зарадзіліся ў еўрапейскай цывілізацыі, але набылі цяпер агульначалавечае значэнне, адносяць наступныя.

У сферы адносін грамадства з навакольнай рэчаіснасцю — гэта дасягнуты ўзровень развіцця прадукцыйных сіл, сучасныя тэхналогіі, пароджаныя новым этапам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

У сферы эканомікі агульнацывілізацыйная база ўключае ў сябе сістэму таварна-грашовых адносін, наяўнасць рынку. Вопыт, назапашаны чалавецтвам, паказвае, што яно не выпрацавала пакуль ніякага іншага механізму, які дазваляў бы больш рацыянальна сувымяраць вытворчасць са спажываннем.

У палітычнай сферы ў агульнацывілізацыйную базу ўваходзіць прававая дзяржава, якая дзейнічае на аснове дэмакратычных норм.

У духоўнай сферы агульным дасягненнем усіх народаў з'яўляюцца вялікія дасягненні навукі, мастацтва, культуры, плады думкі і творчасці многіх пакаленняў.

У сферы маральных адносін — гэта агульначалавечыя маральныя каштоўнасці.

Важнейшы сацыяльны і маральны аспект аналізу сусветнай цывілізацыі — становішча асобы ў грамадстве. Якая ступень яе эканамічнай, палітычнай і духоўнай свабоды? Ці ёсць сацыяльныя ўмовы для яе паўнацэннага развіцця, рэалізацыі разнастайных інтарэсаў і патрэбнасцей? Адказы на гэтыя пытанні даюць магчымасць вызначыць узровень цывілізаванасці той або іншай супольнасці.

Тут мы толькі пералічваем асноўныя праявы агульнацывілізацыйнага пачатку. Падрабязней разгледзім іх у далейшым.

Ці пагражае сусветнай цывілізацыі крызіс?

Нярэдка даводзіцца чуць, што, не паспеўшы яшчэ канчаткова скласціся, сучасная цывілізацыя рызыкуе загінуць, не вытрымаўшы цяжару вострых праблем, якія ахапілі ўсё чалавецтва. Гэтыя праблемы атрымалі назву глабальных. Да іх адносяцца пагроза ядзернай катастрофы, экалагічная небяспека, што тоіць у сабе не менш сур'ёзныя вынікі, чым ядзерны канфлікт. Да цяжкіх сацыяльных і эканамічных вынікаў можа прывесці разрыў паміж развітымі краінамі і краінамі, што развіваюцца, які ўсё павялічваецца.

Безумоўна, глабальныя праблемы тояць у сабе пагрозу ўсяму чалавецтву. Але і вырашэнне іх патрабуе яднання, кааперацыі намаганняў усіх краін і народаў, нягледзячы на глыбокія адрозненні паміж імі. Відавочна, у цяжкіх сумесных пошуках вырашэння гэтых праблем будзе развівацца і ўнутранае адзінства чалавечага свету.

Пытанні і заданні

1. Калі мы ўжываем выраз «весці справы цывілізавана», «цывілізаваныя краіны», які сэнс мы ўкладваем у паняцце «цывілізацыя»? Раскрыйце іншыя значэнні гэтага паняцця.
2. Як звязаны цывілізацыя і культура?
3. У рамках фармацыйнага падыходу даследчыкі часцей за ўсё выкарыстоўваюць паняцці «класы», «базіс», «надбудова».

А якія, на ваш погляд, паняцці трэба выкарыстаць, вывучаючы рэчаіснасць у рамках цывілізацыйнага падыходу?

4. Вядомы рускі філосаф і багаслоў У. Салаўёў пісаў: «...мы павінны разглядваць чалавецтва ў яго цэлым як вялікую зборную істоту або сацыяльны арганізм, жывыя члены якога прадстаўляюць розныя нацыі. З гэтага пункту погляду відавочна, што ні адзін народ не можа жыць у сабе, цераз сябе і для сябе, але жыццё кожнага народа прадстаўляе толькі пэўны ўдзел у агульным жыцці чалавецтва».

Ці згодны вы з гэтым выказваннем? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

5. Настаўнік паставіў перад вучнямі два пытанні. Дайце характарыстыку сярэдневяковай еўрапейскай цывілізацыі. Назавіце асноўныя рысы феадальнай грамадска-эканамічнай фармацыі. У чым адказы могуць супасці, а чым яны павінны адрознівацца?

6. Вядомы філосаф О. Шпенглер лічыў, што цывілізацыя — гэта пэўная заключная стадыя развіцця любой культуры, якая характарызуецца развіццём індустрыі і тэхнікі, дэградацыяй літаратуры і мастацтва, канцэнтрацыяй людзей у вялікіх гарадах, ператварэннем народаў у безаблічныя масы.

Сфармулюйце і абгрунтуйце свае адносіны да гэтай пазіцыі.

§ 9. АСАБЛІВАСЦІ СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ

Эпохі, як і людзі, непаўторныя. Кожная мае свой характар, толькі ёй уласцівыя рысы. Аддаленасць старажытных цывілізацый ад нас у часе і прасторы не дазваляе дакладна ўзнавіць іх аблічча, рэальна адчуць дыханне жыцця ў высокіх духоўных імкненнях і самых звычайных справах людзей, якія некалі жылі. Тым не менш мы імкнёмся заглянуць у свет старажытнасці, каб, зразумеўшы яго, лепш зразумець сябе. Старажытнасць вабіць нас, прыцягвае сваёй загадкавасцю і невытлумачальным абаяннем.

Свет старажытных цывілізацый

Адны цывілізацыі прайшлі перад вамі ў курсе старажытнай гісторыі: «Дар Ніла» — цывілізацыя Старажытнага Егіпта; Месапатамія — адна са старажытнейшых у свеце цывілізацый; загадкавы Старажытны Кітай; цывілізацыя Старажытнай Індыі, названай яшчэ ў старажытнасці краінай мудрацоў; старажытнагрэчаская цывілізацыя, чые дасягненні леглі ў аснову еўрапейскай культуры; цывілізацыя элінізму, у якой як бы сустракаюцца Захад і Усход, нараджаючы найвысачэйшыя праяўленні культуры; Старажытны Рым з яго асобай сістэмай каштоўнасцей.

Аб іншых цывілізацыях вы даведваліся ў сувязі з гісторыяй нашай краіны. Гэта цывілізацыі Сярэдняй

Азіі, якія захоўвалі сваю культурную своеасаблівасць і ў грэка-македонскую эпоху; самабытныя цывілізацыі Закаўказзя, адной з асаблівасцей якіх была жыццёвасць культурных традыцый. Асобае месца займала цывілізацыя скіфаў, якія не мелі ўласнай пісьменнасці, і таму звесткі аб іх дайшлі з іншакультурных крыніц і з археалагічных знаходак.

Свет старажытных цывілізацый уключае і малавядомыя нам цывілізацыі Афрыкі і Паўднёвай Аравіі, традыцыі якіх захоўваліся многа стагоддзяў і паўплывалі на Егіпет; цывілізацыі Старажытнага Ірана; Старажытнага Афганістана; Малой Азіі, якая была натуральным мостам у перадачы культурных дасягненняў; старажытныя цывілізацыі Паўднёва-Усходняй Азіі — рэгіёна непаўторнай культуры, параўнальна позна адкрытай вучонымі і адносна мала вывучанай; старажытнаяпонская цывілізацыя, якая і цяпер уражвае сваёй загадкавасцю, даказвае, што яе культурныя каштоўнасці валодаюць дастатковымі магчымасцямі як у часе, так і ў прасторы; цывілізацыі Новага Свету, дзе прадстаўлены амаль усе стадыі развіцця чалавецтва.

Зразумела, у кароткім нарысе немагчыма даць падрабязнае апісанне свету старажытных цывілізацый. Наша задача — зірнуць на той шлях, які чалавецтва прайшло ад старажытных цывілізацый да сучаснай эпохі.

Адрозненне старажытнасці ад першабытнасці

Старажытныя цывілізацыі пры ўсёй іх непадобнасці паміж сабой з'яўляюцца ўсё ж якімсьці адзінствам, якое процістаіць таму, што цывілізацыяй не з'яўляецца — дакласаваму і дадзяржаўнаму, дагарадскому і даграмадзянскаму, дапісьмоваму стану грамадства і культуры. Яшчэ параўнальна нядаўна першабытнае грамадства нават называлі дагістарычным. Цяпер, калі даследаванне перыяду, які папярэднічаў цывілізацыі, узбагацілася новымі данымі, ад гэтага азначэння прыйшлося адмовіцца.

Тым не менш узнікненне і развіццё сацыяльна-класавых адносін, гарадоў, пісьменнасці стварае такую змястоўную напоўненасць самога гістарычнага часу, якой да яго не магло быць. Безумоўна, цывілізацыі старажытнасці захоўвалі многае з першабытнага грамадства, напрыклад залежнасць ад прыроды, міфалагічныя формы мыслення, мовы, культу і рытуалу, арыентаванага на прыродныя цыклы. Успомнім, што ў рэлі-

гійных вераваннях старажытных народаў адлюстроўвалася змена пор года, паміранне і адраджэнне прыроды. Аднак характар узаемадзеяння грамадства з прыродай пры пераходзе ад першабытнага грамадства да старажытных цывілізацый істотна мяняецца. Змяненні звязаны з пазнаннем прыроды, імкненнем паўней выкарыстаць яе багацці для задавальнення патрэбнасцей грамадства, пераходам да вырабляючага тыпу гаспадаркі.

Залежнасць людзей ад прыроды была ўсё яшчэ вялікай, асабліва ў экстрэмальных сітуацыях прыродных бедстваў — паводак, землятрасенняў, вывяржэнняў вулканаў і г. д. Тым не менш авалоданне металамі, назапашванне ведаў і перадача іх з дапамогай пісьменнасці мянялі формы гэтай залежнасці. Немагчыма ўявіць сабе Старажытны Егіпет або Міжрэчча без ірыгацыі, Старажытную Грэцыю — без мараплавання і марскога гандлю, галоўнага, што сведчыла аб пераходзе ад першабытнасці да старажытных цывілізацый, аднак стала пачаткам вытворчай дзейнасці чалавека. Гэты скачок у развіцці грамадства атрымаў назву «аграрнай рэвалюцыі». Пры гэтым на ўсім працягу старажытнасці грамадства ўсведамляе сябе як частку прыроды, якая звязана з ёй цеснымі вузамі. Аднак гэта своеасаблівая частка, дзе чалавек адыгрывае нярэдка ролю тварца і стваральніка.

Пераход ад першабытнасці да цывілізацыі звязаны і са змяненнем характару ўзаемадзеяння людзей у грамадстве, з нараджэннем новага тыпу грамадскіх адносін, якія ўзнікаюць у выніку сканцэнтравання насельніцтва і эканамічнай дзейнасці ў гарадах, з ускладненнем сацыяльнай структуры, станаўленнем дзяржаўнасці, са з'яўленнем новых відаў дзейнасці, асабліва ў сферы кіравання і навучання, са змяненнем характару і спосабаў перадачы інфармацыі.

Для дагарадской беспісьмовай культуры першабытнасці характэрна адсутнасць якіх-небудзь самастойных каналаў перадачы інфармацыі: навучанне неабходным гаспадарчым, прамысловым і рамесным навыкам, як і рэлігійнаму рытуалу, строілася на непасрэдным падключэнні навучаемага да адпаведнай практыкі. Чалавек пры гэтым цалкам упадаў у дзейнасць, ён не ацэньваў сваіх учынкаў, сваіх адчуванняў. Яго мысленне было «нерасчлянёным», без вылучэння сутнасці падзей і працэсаў, што адбываліся. Панаваў звычай, які

замяняў абагульненыя ўяўленні, а жыццё ішло павольна, змяненні адбываліся рэдка, ад пакалення да пакалення ва ўкладзе жыцця мала што мянялася.

Авалоданне новымі відамі дзейнасці садзейнічала развіццю іншага тыпу свядомасці і з'яўленню іншых каналаў перадачы інфармацыі. Ад чалавека патрабавалася ўжо не простае паўтарэнне ўзораў, а разважанне, аналіз уласных дзеянняў і станаў. Першапачаткова ён быў уласцівы толькі частцы старажытнага грамадства. Носьбітамі такога тыпу мыслення былі перш за ўсё чыноўнікі і вучоныя пісары. Людзі, якія кіравалі складанай царскай або храмавай гаспадаркай, планавалі буйныя будаўнічыя работы або ваенныя паходы, занятыя прагназіраваннем будучага, назапашваннем карысных звестак, удасканальваннем сістэмы пісьма і падрыхтоўкай будучых вучоных, не маглі абмежавацца аўтаматычным узнаўленнем дзеянняў па ўзору, традыцыі, шаблону. Патрабаваліся новыя веды, новыя спосабы дзеянняў.

Новыя магчымасці захоўвання і перадачы інфармацыі дало з'яўленне пісьменнасці. Пісьмовыя помнікі старажытнасці, якія дайшлі да нашых дзён, прыадкрываюць нам заслону часу і дазваляюць пранікнуць у свет старажытных цывілізацый. Напрыклад, адна са старажытнейшых цывілізацый — Месапатамія — дастаткова добра вывучана дзякуючы прачытанню шматлікіх надпісаў на гліняных таблічках, пакрытых клінапісам. У вядомай меры можна лічыць такую таблічку сімвалам Старажытнага Міжрэчча. Пісьменнасць, якая зарадзілася тут яшчэ ў старажытнасці, стала свайго роду сродкам міжнародных зносін на ўсім Блізкім Усходзе. Сярод запісаў, што захаваліся, сустракаюцца рытуальныя надпісы, «навуковыя» (зборнікі прымет, медыцынскіх рэцэптаў, астралагічных прадказанняў, шумера-акадскія слоўнікі) і літаратурныя тэксты, якія перапісваліся і перакладаліся на іншыя старажытныя мовы.

Сярод знойдзеных таблічак сустракаюцца старажытнейшыя з вядомых чалавецтву прававыя акты (законы цара Хамурапі і яшчэ больш старажытныя законы Урунімгіна (2318—2312 гг. да н. э.), які абвясціў лозунг «Няхай моцны не крыўдзіць удоў і сірот!»).

Вавілонскія «рукапісы» на гліне змяшчаюць матэматычныя трактаты і астранамічныя зборнікі. Многае з таго, што дала свету вавілонская навука, мы выкары-

стоўваем і цяпер, напрыклад шасцідзесяцярычнае лічэнне — дзяленне круга на 360 градусаў, гадзіны — на 60 мінут і г. д.

Старажытная пісьменнасць Міжрэчча данесла да нас і цікавыя літаратурныя крыніцы. Так, у эпасе аб Гільгамешу ставіцца адно з «вечных» пытанняў аб сэнсе чалавечага існавання, аб пошуках бяссмерця. Бачанне свету чалавека ў старажытнай літаратуры Міжрэчча аказала значнае ўздзеянне на літаратуру суседніх народаў, на Біблію, а праз яе — на літаратуру Еўропы і Амерыкі.

Чытанне і разуменне старажытных пісьмовых крыніц з усёй вастрынёй ставіць задачу ўзнаўлення цэласнай карціны старажытных цывілізацый.

«Відавочнае — неверагоднае»

Пры ўсёй уяўнай даступнасці дасягненняў старажытных цывілізацый адной з найбольш складаных праблем для сучаснай навукі застаецца праблема правільнага разумення гэтых дасягненняў. Свет старажытнасці ў многім застаецца загадкавым і няясным. Прастата старажытнасці аказваецца падманлівай, а глыбокае пранікненне ў мінулае больш ставіць пытанняў, чым дае адказаў на іх.

Часцей за ўсё пры ўспаміне аб старажытнасці мы зварочваемся да Старажытнай Грэцыі. Многія бакі яе жыцця знаёмы нам з VI класа. Хто не памятае аб славутай Саламінскай бітве, каму не знаёма імя Фемістокла? Але, успамінаючы аб гэтых падзеях, мы не задумваемся над тым, што менавіта перад Саламінскай бітвай Фемістокл распарадзіўся прынесці ў ахвяру трох знатных персідскіх юнакоў. І нікому гэта не здалося жахлівым або недарэчным. Сама ідэя акта прыняцця смерці заключалася ў тым, што чалавеку проста надаваўся статус ахвяры, нібы ахвярнай жывёле. Дарэчы, раз ужо размова зайшла аб ахвярных жывёлах, хіба задумваемся мы над тым, што старажытныя антычныя храмы, уключаючы цудоўны Парфенон, у час ахвярапрынашэнняў нагадвалі грамадскія бойні? Як бы мы выносілі пах крыві і гарэлага мяса і тлушчу? А гэта ж быў быт антычных свяцілішчаў.

А псіхалогія рабства? Хіба яна не параджала вельмі часта страшэнныя, з нашага пункту гледжання, з'явы? У лепшую пару дэмакратычных Афін рабу, які ні ў чым не абвінавачваўся і нават не падазраваўся, а проста прыцягваўся да дазнання ў якасці сведкі, у абавязко-

вым парадку належала рабіць допыт з прымяненнем катавання. Паказальны не сам гэты факт — гісторыі вядомы і больш жорсткія норавы,— а адносіны да яго грамадства самай адукаванай і свабоднай дзяржавы тагачаснага свету.

Так, старажытныя цывілізацыі выключалі чужынца і пагарджалі непаўнапраўным. Пагарджалі адкрыта і спакойна, без крывадушнасці або агаворак. І ў той жа самы час у лоне старажытных цывілізацый зараджаліся прынцыпы ўсечалавечага адзінства і маральнага ўдасканалення асобы, усведамленне ёю магчымасці выбару і адказнасці. Гэтыя прынцыпы ўмацаваліся разам са з'яўленнем і развіццём сусветных рэлігій, што абавязкова мелі на ўвазе схіленне на свой бок веруючых, якія свядома выбіраюць дадзеную веру, а не належаць да яе па закону нараджэння.

У далейшым менавіта сусветныя рэлігіі адыгрывалі ролю аднаго з фактараў цывілізацыйнай інтэграцыі.

Пакуль мараль не аддзялялася ад свяшчэнных радавых «табу», а асабістая маральная свядомасць атаясамлівалася з грамадскай думкай радавога калектыву, самастойны выбар складу думак, спосабу жыцця быў немагчымым. Разбурэнне аўтаматызму традыцый роду зрабіла актуальнай праблему самастойнага выбару жыццёвай пазіцыі кожным асобным чалавекам.

Менавіта ў перыяд старажытных цывілізацый была адкрыта ўлада ідэі, зыходзячы з якой можна было нанова будаваць паводзіны чалавека сярод людзей, падпарадкоўваючы іх не прывычцы і рытуалу, а ісціне. Адсюль такое багацце маляўнічых і незвычайных дэталей у біяграфіях барацьбітоў за свае ідэі, такіх, як філосаф Дыяген, які пасяліўся ў гліняным сасудзе (піфосе), або вялікі мудрэц Сакрат, які прыняў па прыгавору суда атруту (цыкуту), але не адмовіўся ад таго, што ён лічыў ісцінай.

У лоне старажытных цывілізацый узнік ідэал вернасці ісціне, пошуку і распаўсюджвання яе, нягледзячы на страх перад насіллем, гатоўнасць у надзвычайных сітуацыях пацвердзіць сваю вернасць ісціне пакутніцтвам або нават смерцю. Так, легенда аб грэчаскім філосафе Зеноне Элейскім гаворыць, што ён на допыце ў прысутнасці тырана* Неарха адкусіў сабе

* *Тыран* (ад грэч. tyranos) — чалавек, які насільна захапіў уладу ў полісе, устанавіў аднаасобнае кіраванне; іншае значэнне — правіцель, дзеянні якога заснаваны на самавольстве і насіллі.

язык і выплюнуў яго ў твар ворага.

Безумоўна, што многае ў свеце старажытных цывілізацый можа параджаць цяжкасці ў разуменні гэтага часу. Многія палажэнні і ісціны, выказаныя ў пісьмовых крыніцах, патрабуюць дадатковых намаганняў для разумення, становяцца відавочнымі толькі ў кантэксце гісторыі, але тым не менш загадкі старажытнасці дапамагаюць лепш разумець сучаснасць.

Адзінства свету старажытных цывілізацый

Даныя сучаснай навукі паказваюць, што старажытныя народы знаходзіліся ў пастаянных кантактах, узаемаўплыве і ўзаемаабагачэнні. Нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, вельмі старажытнымі былі сувязі Блізкага Усходу, Сярэдняй Азіі і Індыі; уплыў месапатамскай цывілізацыі даходзіў да Аравіі. Грэкі і рымляне дабіраліся да Індыі, радзей — да Кітая, індыйскія гандлёвыя калоніі існавалі ў Іране і Егіпце. Пацвярджэннем гэтых кантактаў з'яўляюцца не толькі археалагічныя даныя, але і вынікі экспедыцый Тура Хеердала на копіях старажытных суднаў егіпцян (экспедыцыя «Ра») і жыхароў Міжрэчча (экспедыцыя «Тыгрыс»).

Выключна важнымі этапамі ў паглыбленні сувязі Захаду і Усходу былі паходы Аляксандра Македонскага, утварэнне велізарнай дзяржавы, затым эліністычныя дзяржавы і Рымская імперыя, аб якіх размова пойдзе далей. У гэтых дзяржавах складвалася самабытная культура, якая спалучала элементы розных культур у арганічнае цэлае.

Свой уклад у станаўленне старажытных цывілізацый унеслі ў старажытнасці качавыя народы. Яны асвоілі неабсяжныя прасторы стэпаў, недаступных для земляробства пустынь і паўпустынь. Па сутнасці, земляробы і качэўнікі не маглі існаваць адзін без аднаго, без узаемнага абмену прадуктамі земляробства і жывёлагадоўлі — важнейшага элемента гаспадарчай сістэмы старажытнага свету. Так складваліся рынкавыя адносіны — абмен прадуктамі дзейнасці, заснаваны на падзеле працы.

Фундамент старажытных цывілізацый закладвалі не толькі прадстаўнікі народаў, у якіх атрымала росквіт культура, але і незлічонае мноства невядомых працаўнікоў, адарваных войнамі і насіллем ад сваіх ачагоў і кінутых у каменяломні, майстэрні, на палі рабаўладальніцкіх віл і галеры. Многія выдатныя

творцы культуры старажытнасці былі рабамі. Успомнім, што рабом з Фрыгіі быў Эзоп, байкапісец, чые творы не толькі шырока былі вядомы ў Грэцыі, але і зрабілі ўплыў на творчасць М. Лютэра, Ж. Лафантэна, Г. Лесінга і І. А. Крылова. Рымскім рабом быў Тэрэнцый, да якога ўзыходзяць вытокі еўрапейскай драмы. І гэты рад імён можа быць працягнены.

Старажытныя цывілізацыі — не згаслыя светы, святло ад якіх яшчэ ідзе да нас. Іх дасягненні — частка сучаснай культуры. Мы зварочваемся да іх не толькі дзеля эстэтычнай асалоды завешчанымі старажытнасцю шэдэўрамі літаратуры і мастацтва. Урокі мінулага закліканы служыць высакародным мэтам сучаснасці — узаемаразуменню і ўзаемаабагачэнню народаў, узаемнай павазе і ўсведамленню сябе наследнікамі агульнага багацця старажытных цывілізацый.

Пытанні і заданні

1. У чым заключаецца адрозненне старажытных цывілізацый ад першабытнага грамадства?

2. У чым заключаюцца цяжкасці сучаснага разумення старажытных цывілізацый?

3. Якія сувязі існавалі паміж старажытнымі цывілізацыямі?

4. Якое значэнне мела пісьменнасць у падрыхтоўцы чыноўніка ў старажытнасці? Ведамі з якіх галін чалавечай дзейнасці ён павінен быў абавязкова валодаць? Адкажыце на пытанні, прыцягваючы наступныя даныя:

а) Старажытнаегіпецкі пісар Хоры задаваў свайму калегу пытанні, жадаючы выкрыць яго ў недасведчанасці: «Які рацыён войска на маршы? Колькі патрэбна цаглін для пабудовы платформы зададзеных памераў? Колькі патрэбна людзей для перавозкі абеліска? Як паставіць на п'едэстал каласальную статую? Як арганізаваць ваенную экспедыцыю?»

б) У жыццеапісанні аднаго з егіпецкіх чыноўнікаў па імені Уна гаворыцца аб тым, што ён быў спачатку стражнікам і суддзёй, затым займаўся пошукам камянёў (для царскіх помнікаў) у далёкай краіне, будаваў караблі, ачышчаў каналы, а калі грымнула вайна, стаў начальнікам штаба.

5. Якія вывады аб развіцці гаспадаркі і гандлю можна зрабіць з супастаўлення наступных фактаў:

а) У Вавілоніі збожжа (II тысячагоддзе да н. э.) у разліках адыгрывае такую ж ролю, як серабро. Збожжам плацяць сельскагаспадарчым работнікам, паганятым валоў, пастухам, за наём павозак, валоў, аслоў.

б) Рымская назва грошай «пекуніа» паходзіць ад «пекус» — жывёла. Да IV ст. да н. э. меркай вартасці тавару служыла жывёла (быкі і бараны), прычым вартасць 10 бараноў была роўнай вартасці 1 быка?

6. Надзвычайнай папулярнасцю сярод грэкаў карысталіся выказванні так званых «Сямі мудрацоў». Гэта былі вядомыя ўсёй Грэцыі мысліцелі і дзяржаўныя дзеячы, якія мелі практычны жыц-

цёвы вопыт і глыбокі дзяржаўны розум. Свае мыслі мудрацы выказвалі ў выглядзе афарызмаў (па-грэчаску — гном). Якія вывады аб дабрачыннасцях, што карысталіся павагай у Старажытнай Грэцыі, можна зрабіць на аснове аналізу выслоўяў сямі мудрацоў (сабраны ў кнізе Дыягена Лаэрцкага каля 220 г. н. э.):

«Не багацей дрэннымі сродкамі» (Фалес).

«Чым падтрымаў ты сваіх бацькоў, такой падтрымкі чакай і ад дзяцей» (Фалес).

«Заводзь сяброў не спяшаючыся, а завёўшы, не кідай» (Салон).

«Не абгаворвай блізкага, каб не пачуць такога, чаму сам не парадуешся» (Хілон са Спарты).

«Што лепшае за ўсё? Добра рабіць, што робіш» (Пітак).

«Толькі хворая душа можа быць глухая да чужой бяды» (Біянт)?

7. Зрабіце вывады з аналізу наступных фрагментаў:

а) Платон (427—347 гг. да н. э.). Законы, V, 742 а:

«...Для штодзённага абмену павінна быць манета, таму што абмен амаль непазбежны для рамеснікаў і ўсіх тых, каму трэба выплачваць жалаванне,— для наёмнікаў, рабоў і чужаземных прышэльцаў. Дзеля гэтага трэба мець манету».

б) Ісакрат (436—338 гг. да н. э.). Панегірык, IV, 42:

«Кожны народ валодае краінай, якая... у адным адчувае недахоп, другі ж прыносіць у колькасці большай, чым патрабуецца, і вялікая існуе цяжкасць — куды збыць адно і адкуль увезці другое...»

8. На сцяне аднаго з дамоў у Пампеях, горадзе, засыпаным попелам вулкана ў 79 г., выяўлены запісы расходаў сям'і з 3 чалавек. Запісы ахопліваюць 8 дзён. У іх паўтараюцца адны і тыя ж тавары: хлеб, цыбуля, аліўкавы алей, сыр, віно... Звычайна траты ў гэтыя дні былі невялікія. У пералік упісаны траты на ўтрыманне рабоў. Купля хлеба для рабоў абыходзілася ў 2—4 разы дзешавей.

Зрабіце ўсе магчымыя вывады з прыведзеных даных.

9. Апіраючыся на даныя з фрагмента, які належыць пяру Элія Арыстыда «Пахвала Рыму» (II ст. н. э.), дакажыце, што ў старажытнасці існавалі цесныя гаспадарчыя сувязі краін і народаў:

«З усёй зямлі і з усіх мораў дастаўляецца вам усё, што робіць кожная пара года і ўсякая мясцовасць, што даюць рэкі і азёры, мастацтва і рамёствы грэкаў і варвараў. Так што, калі хто-небудзь хацеў бы ўсё гэта ўбачыць, ён павінен быў бы або аб'ехаць увесь свет, або пабываць у вашым горадзе... Тут можна ўбачыць столькі тавараў з Індыі, а калі пажадаеш, то і са шчаслівай Аравіі, што здаецца, быццам там засталіся толькі голыя дрэвы, а мясцовым жыхарам, калі ім што спатрэбіцца, даводзіцца ехаць сюды, каб выкарыстаць свае ж плады. Тканін з Вавілона і ўпрыгожанняў з больш аддаленых варварскіх краін дастаўляюць вам больш і лягчэй, чым калі б патрэбна было прывесці што-небудзь з Наксаса або Кіфна ў Афіны... А калі чаго-небудзь тут не відаць, то таго і не было або няма зусім».

У чым, вы лічыце, аўтар дапускае перавелічэнні? З якой мэтай?

§ 10. СТАРАЖЫТНЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ ЕЎРОПЫ

Не прымяншаючы значэння іншых старажытных цывілізацый, мы ўсё-такі павінны прызнаць, што асобы ўплыў на гісторыю народаў Еўропы зрабілі Старажыт-

ная Грэцыя, эліністычныя дзяржавы і Старажытны Рым. Іх гісторыя, багатая падзеямі і даволі падрабязна апісаная і вывучаная вучонымі, у многім вядома і вам. Аднак наўрад ці будзе лішнім яшчэ адзін погляд на яе з пункту гледжання руху чалавецтва да сучаснай цывілізацыі. Чым абагаціліся гэтыя старажытныя цывілізацыі чалавецтва? Чаму памяць аб іх захоўваецца ў стагоддзях, а цікавасць да іх не памяншаецца з цягам часу?

Зараджэнне антычнай цывілізацыі

У Грэцыі ў перыяд VIII—VI стст. да н. э. развіліся тыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя з'явы, якія надалі антычнаму грамадству пэўную спецыфіку ў параўнанні з іншымі цывілізацыямі старажытнасці. Да іх адносяцца: класічнае рабства, сістэма грашовага абарачэння і рынку, поліс — асноўная форма палітычнай арганізацыі, ідэя суверэнітэту народа і дэмакратычная форма кіравання. Тады ж былі распрацаваны асноўныя прынцыпы маралі, эстэтычныя ідэалы, якія аказалі ўздзеянне на антычны свет аж да ўзнікнення хрысціянства. Нарэшце, у гэты перыяд зарадзіліся асноўныя з'явы антычнай культуры — навука і філасофія, галоўныя жанры літаратуры, тэатр, ордэрная архітэктура, спорт.

Імклівы пад'ём, падрыхтаваны папярэднім развіццём гаспадаркі, меў разнастайныя вынікі для грамадства. Рост прадукцыйнасці працы ў сувязі з выкарыстаннем жалезных прылад у сельскай гаспадарцы і рамястве прыводзіў да павелічэння залішняга (звышнеабходнага для вытворцы) прадукту працы. З сельскай гаспадаркі вызваляўся ўсё большы лік людзей, што забяспечвала хуткі рост рамяства. Адасабленне рамяства ад сельскай гаспадаркі выклікала рэгулярны абмен паміж імі, іншымі словамі — з'яўленне рынку не як месца, куды з усёй Грэцыі звозіліся тавары, а як наладжванне рэгулярных гандлёвых сувязей паміж абласцямі і раёнамі краіны. Развіццё гандлю патрабавала з'яўлення такога прадукту працы, які мог адыграць ролю ўсеагульнага эквіваленту, гэта значыць лёгка абменьвацца на іншыя прадукты працы. Такім эквівалентам становяцца грошы. Першапачаткова ролю грошай адыгрывала жывёла, але пазней іх функцыю сталі выконваць манеты з металу, якія можна было абменьваць на іншыя прадукты па пэўнаму кошту.

Нягледзячы на тое што ў архаічны перыяд Грэцыя не была адзінай краінай, аднак рэгулярныя гандлёвыя сувязі паміж асобнымі полісамі прыводзілі да паступовага фарміравання этнічнай самасвядомасці — грэкі паступова ўсведамлялі сябе адзіным народам, які адрозніваўся ад іншых — неэлінаў. Адным з праяўленняў такой самасвядомасці былі славутыя Алімпійскія гульні, якія праводзіліся з 776 г. да н. э. і на якія дапускаліся толькі эліны.

Асноўнай рысай этыкі старажытнагрэчаскага грамадства гэтага перыяду было злучэнне пачуцця калектывізму і спаборнага пачатку. Існаванне асобнага чалавека па-за рамкамі абшчыны, поліса было немагчымым, таму вышэйшая доблесць грамадзяніна заключалася ў абароне свайго поліса. «Соладка жыццё страціць, сярод воінаў доблесці загінуўшы, храбраму мужчыну ў баі дзеля айчыны сваёй»,— пісаў спартанскі паэт Тыртэй. А прынцып спаборнасці ўвасабляўся ў імкненні як мага лепш паслужыць полісу.

Да VIII—VI стст. да н. э. адносіцца з'яўленне дасканалай архітэктуры, перш за ўсё грамадскай, культавай. Усе сілы грамадства былі звернуты на манументальныя збудаванні — храмы, перш за ўсё храмы апекуноў абшчыны. Для поліснага светапогляду было характэрна ўяўленне аб асобай сувязі поліса з пэўным бажаством-апекуном. Агульнагрэчаскае значэнне мелі толькі свяцілішчы ў Дэльфах і Алімпіі. Звычай прынашэння дароў у храмы садзейнічаў таму, што апошнія сканцэнтроўвалі лепшыя творы мастацтва, а іх тэрыторыя служыла нечым накшталт музея.

Найвялікшым дасягненнем грэчаскай культуры гэтай эпохі з'явілася стварэнне алфавітнага пісьма. Пераўтварыўшы фінікійскую складовую сістэму, грэкі стварылі просты спосаб фіксацыі інфармацыі. Для таго каб авалодаць пісьмом і лічэннем, не патрэбны былі гады ўпартай працы. Адбылася «дэмакратызацыя» сістэмы навучання, якая дазволіла зрабіць практычна ўсіх свабодных жыхароў Грэцыі пісьменнымі. Авалоданне граматай давала магчымасць карыстацца пісьмовымі спосабамі перадачы інфармацыі, знаёміцца з працамі літаратараў і вучоных.

Асобае значэнне для ўсёй еўрапейскай культуры мела ўзнікненне філасофіі — прынцыпова новага падыходу да пазнання свету, які карэнным чынам адрозніваўся ад міфалогіі. Пастаноўка праблем, апора на

чалавечы розум як сродак пазнання, арыентацыя на пошукі прычын усяго, што адбываецца ў свеце, у ім самім, а не па-за ім,— гэта істотна адрознівае філасофскі падыход да свету ад рэлігійна-міфалагічных поглядаў.

Можна згадзіцца з думкай вучоных, якія звязваюць узнікненне філасофіі з грамадскім вопытам грамадзяніна ранняга поліса. Свет поліса, адносіны ў ім — вось тая мадэль, якая ляжала ў аснове ўяўленняў грэчаскіх філосафаў аб вялікім свеце — космасе.

У філасофіі, якая зараджалася, складваліся процілеглыя падыходы да рашэння важнейшых пытанняў наладжвання свету. Так, мысліцелі, якія атрымалі назву натурфілосафаў (ад «natura» — прырода) шукалі першааснову свету ў самой прыродзе, а не ў бажастве або ідэі. Яны імкнуліся раскрыць узаемасувязь з'яў і паказаць развіццё свету. Іх філасофія была стыхійна матэрыялістычнай і дыялектычнай.

Другі напрамак філасофіі прадстаўлялі піфагарэйцы, паслядоўнікі вядомага матэматыка Піфагора. Асновай асноў піфагарэйцы лічылі матэматыку. Яны меркавалі, што колькасць, форма вызначаюць сутнасць усяго. Паступова яны сталі атаясамліваць рэчы з лікамі, пазбавіўшы рэчыўны свет матэрыяльнага зместу. Ператвораны ў абсалют лік уяўляўся ім як аснова сутнасці свету.

Важнейшыя заваёвы цывілізацыі архаікі былі развіты ў перыяд класічнай Грэцыі (ад рубяжа VI—V стст. да н. э. да 338 г. да н. э.).

Росквіт старажытна-грэчаскай цывілізацыі

Гэта быў вялікі перыяд росквіту паліснай арганізацыі грамадства, якая зрабіла ўплыў на ўсе бакі яго жыцця.

Поліс уяўляе сабой грамадзянскую абшчыну, для якой характэрна спалучэнне абшчыннага характару і своеасаблівых рыс, што адрозніваюць гэту абшчыну ад радавой, сямейнай, тэрытарыяльнай і да т. п. У яе аснове ляжала антычная форма ўласнасці. Яна з'яўлялася адначасова ўласнасцю дзяржаўнай (сумеснай) і ўласнасцю прыватнай. Уладальнікам асноўнага сродку вытворчасці (зямлі) мог стаць толькі той, хто быў паўнапраўным членам грамадзянскай абшчыны. Вярхоўным правам на зямлю (правам уладаць, карыстацца і распараджацца ёю) валодаў толькі калектыў грамадзян. Узаемасувязь

і ўзаемаабумоўленасць права ўласнасці на зямлю і грамадзянскіх праў прыводзіла да таго, што ўсе грамадзяне, у ідэале, валодалі роўнымі правамі.

У полісах дзейнічалі розныя органы кіравання, але вярхоўным органам у большасці полісаў быў народны сход, якому належала права канчатковага рашэння ўсіх важнейшых пытанняў.

Яшчэ адной асаблівасцю поліса было супадзенне палітычнай і ваеннай арганізацыі. Грамадзянін-уласнік адначасова з'яўляўся і воінам, які забяспечваў недатыкальнасць поліса, а значыць, і сваёй уласнасці.

Эканоміка поліса базіравалася на земляробстве і жывёлагадоўлі, вінаградарстве і садоўніцтве. Асноўным прынцыпам яго гаспадаркі была ідэя аўтаркіі, гэта значыць самазабеспячэння. Сродкі існавання, якія не залежалі ад знешніх фактараў, разглядаліся як эканамічная аснова свабоды. Лішкі прадуктаў абменьваліся праз рынак, складалі прадмет продажу.

Такім чынам, поліс уяўляў сабой своеасаблівую з'яву, у якой спалучаліся эканамічныя, ваенныя і палітычныя функцыі.

У адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі поліса выпрацоўвалася **полісная сістэма каштоўнасцей:** цвёрдая ўпэўненасць у тым, што поліс — вышэйшае шчасце, што існаванне чалавека па-за яго рамкамі немагчыма, а дабрабыт кожнай асобы залежыць ад дабрабыту поліса. Да каштоўнасцей поліса адносіліся і прызнанне перавагі земляробчай працы над усімі іншымі відамі дзейнасці (выключэнне складала толькі Спарта); асуджэнне імкнення да прыбытку, імкненне захаваць нязменнымі і эканамічную аснову, і ўсе астатнія ўмовы жыцця поліса, прыярытэт традыцый.

У гэты ж перыяд пачалося распаўсюджванне рабства класічнага тыпу. Напрыклад, у Афінах раб не толькі не меў уласнасці на сродкі вытворчасці, але і сам уяўляў сабой «гаворачую прыладу», якая належыць свайму гаспадару. Права ўласнасці рабаўладальніка на раба нічым не абмяжоўвалася. Дзеці рабынь называліся прыплодам і таксама станавіліся рабамі. Рабы ў Грэцыі, як правіла, не з'яўляліся яе ўраджэнцамі. Іх захоплівалі ў час ваенных паходаў або пірацкіх набегаў. Затым яны паступалі на нявольніцкія рынкі, становячыся «жывым таварам».

Поліс, які сфарміраваўся ў выніку асаблівасцей прыродных умоў Элады і своеасаблівасці яе сацыяль-

на-эканамічнага і палітычнага развіцця, быў з'явай практычна невядомай у свеце старажытных цывілізацый Пярэдняга Усходу, якая рэзка адрознівалася ад існаваўшых там форм арганізацыі грамадства. Поліс зрабіў уплыў на цывілізацыі эліністычнага і Рыма.

Цывілізацыя эліністычнага

Пачатак ёй паклаў Усходні паход Аляксандра Македонскага і масавы каланізацыйны паток элінаў у нанава заваяваныя землі. У выніку паступова склалася новая ступень развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры, формаў палітычнай арганізацыі і сацыяльных адносін народаў Міжземнамор'я, Пярэдняй Азіі і прылягаючых раёнаў. Распаўсюджванне і ўплыў цывілізацыі эліністычнага былі незвычайна шырокімі — Заходняя і Усходняя Еўропа, Пярэдняя і Цэнтральная Азія, Паўночная Афрыка.

Новыя формы жыцця грамадства з'явіліся вынікам своеасаблівага сінтэзу, у якім мясцовыя, галоўным чынам усходнія і грэчаскія элементы, спалучаліся, адыгрывалі тую або іншую ролю ў залежнасці ад канкрэтна-гістарычных умоў.

Найбольш характэрнымі рысамі эканамічнага развіцця эліністычнага былі рост гандлю і вытворчасць прадуктаў працы, прызначаных для абмену. Нягледзячы на частыя ваенныя сутыкненні, устанаўліваліся рэгулярныя марскія сувязі, пракладваліся гандлёвыя шляхі, узнікалі новыя буйныя цэнтры рамяства, вытворчасць у якіх у значнай меры была разлічана на рынак.

З развіццём гандлю значна пашырылася грашовае абарачэнне, чаму садзейнічала уніфікацыя манетнай справы, што пачалася пры Аляксандру Македонскім, які заснаваў шырокую вытворчасць залатых манет.

Гістарычныя падзеі канца IV — пачатку III ст. да н. э. прывялі да стварэння новай формы сацыяльна-палітычнай арганізацыі — эліністычнай манархіі. Яна злучыла ў сабе элементы ўсходняй дэспатыі* — манархічную форму ўлады, якая мела пастаянную армію і цэнтральную адміністрацыю, і элементы паліснага ладу. Апошняе было прадстаўлена гарадамі, з прыпісанай да іх сельскай мясцовасцю, якія захавалі органы ўнутранага самакіравання, але ў значнай меры пад-

* *Дэспатыя* (ад грэч. despotea) — неабмежаваная ўлада. Патрэбнасць старажытнаўсходніх дзяржаў у дэспаце як арганізатару грамадскіх работ, перш за ўсё звязаных з ірыгацыяй, была аб'ектыўна неабходнай.

парадкаваліся цару. Ад цара залежалі памеры прыпісаных да поліса зямель. У большасці выпадкаў дзейнасць полісных органаў самакіравання кантралявалася царскімі чыноўнікамі. Страта знешнепалітычнай самастойнасці кампенсавалася бяспечнасцю існавання, большай сацыяльнай устойлівасцю і забеспячэннем трывалых эканамічных сувязей з іншымі часткамі дзяржавы. Царская ўлада ў гарадскім насельніцтве набыла важную апору і атрымала неабходныя крыніцы папаўнення арміі і чыноўніцтва.

Змяніліся ў эліністычнай дзяржаве і адносіны ўласнасці. На тэрыторыі поліса зямельныя адносіны складваліся па звычайнаму ўзору. Але складанасць заключалася ў тым, што да гарадоў магла быць прыпісана зямля з мясцовымі вёскамі, што знаходзіліся на ёй, насельніцтва гэтых вёсак не станавілася грамадзянамі поліса, але працягвала ўладаць сваімі ўчасткамі, выплачваючы падаткі гораду або прыватным асобам, якія атрымлівалі ад цара гэтыя землі. На тэрыторыі, не прыпісанай да гарадоў, уся зямля лічылася царскай.

Поруч з класічным рабствам захаваліся і больш прымітыўныя формы рабства: за нявыплату даўгоў, самапродаж і інш. Роля рабскай працы ў эліністычных гарадах была не меншай, чым у грэчаскіх полісах, але ў сельскай гаспадарцы праца рабоў не магла выцесніць працу мясцовага свабоднага насельніцтва.

Культура эліністычнай цывілізацыі ўяўляе сабой спалучэнне мясцовых устойлівых традыцый з культурай, прынесенай заваёўнікамі і перасяленцамі, грэкамі і нягрэкамі. Аднак гэта была цэласная культура, а ўсім яе мясцовым варыянтам былі ўласцівы некаторыя агульныя рысы, абумоўленыя ўплывам грэчаскай культуры, а таксама падобнымі тэндэнцыямі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця.

Нават беглы пералік дасягненняў і помнікаў культуры эліпізму паказвае яго важнае значэнне ў гісторыі чалавецтва. Эліпізм узбагаціў чалавецтва новымі адкрыццямі ў галіне навуковых ведаў і ў вынаходніцтве. Дастаткова назваць імёны Еўкліда і Архімеда. У рамках філасофіі нарадзіліся і атрымалі развіццё сацыяльныя утопіі, якія апісваюць ідэальны грамадскі лад, свабодны ад недахопаў і канфліктаў. Скарбніца сусветнага мастацтва папоўнілася такімі шэдэўрамі, як алтар Зеўса ў Пергаме, статуя Венеры Мілоскай і Нікі Самафракійскай, скульптурная група Лаакаон.

З'явіліся грамадскія будынкі новага тыпу: бібліятэка, мусеён, які служыў цэнтрам работ і прымянення навуковых ведаў. Гэтыя і іншыя дасягненні культуры былі атрыманы ў спадчыну пазней Візантыйскай імперыяй, арабамі, увайшлі ў залаты фонд агульначалавечай культуры.

Каштоўнасці старажытнарымскай цывілізацыі

Сярод вучоных няма адзінства ў вызначэнні месца старажытнарымскай цывілізацыі ў гістарычным працэсе. Адны сцвярджаюць, што Рым не меў самастойнага значэння як цывілізацыя і ўяўляў сабой крызіс антычнасці. Другія сцвярджаюць, што Рым — асобая цывілізацыя, заснаваная на сістэме каштоўнасцей, якія склаліся ў рымскай грамадзянскай абшчыне.

Якія ж гэта каштоўнасці? Якое значэнне яны могуць мець для разумення пройдзенага чалавецтвам шляху?

Перш за ўсё сістэму такіх каштоўнасцей вызначаў патрыятызм, уяўленне аб асобай богавыбранасці рымскага народа і самім лёсам прызначаных яму перамогах. Рым разглядаўся як вышэйшая каштоўнасць, а доўг грамадзяніна заключаўся ў тым, каб служыць Рыму ўсімі сіламі, не шкадуючы самога жыцця.

Для таго каб адпавядаць гэтым каштоўнасцям, грамадзянін павінен быў валодаць мужнасцю, стойкасцю, сумленнасцю, вернасцю, годнасцю, умеранасцю ў жыцці, здольнасцю падпарадкоўвацца жалезнай дысцыпліне на вайне і ўладзе закону і звычаям продкаў у мірны час.

Распаўсюджанне ў Рыме рабства, якое дасягнула менавіта тут найвышэйшага для старажытнасці развіцця, прывяло да проціпастаўлення ў ідэалогіі паміж рабом і свабодным грамадзянінам. Апошні лічыў для сябе ганебным быць западозраным у «рабскіх заганах» (такіх, як хлусня, ліслівасць) або «рабскіх занятках», якія ўключалі тут у адрозненне ад Грэцыі не толькі рамяство, але і выступленне на сцэне, напісанне п'ес, работу скульптара і жывапісца. Справамі, дастойнымі рымляніна, асабліва са знаці, прызнаваліся толькі палітыка, вайна, распрацоўка права. Сярод элементаў культуры трэба вылучыць права і красамоўства.

Рымскае права складвалася на працягу некалькіх стагоддзяў. У ім была распрацавана сістэма прававых

норм, якія рэгулююць маёмасныя і іншыя гаспадарчыя адносіны, звязаныя з правам уласнасці, устаноўлены правілы забеспячэння дагаворных абавязацельстваў і адказнасці, вельмі дасканалыя нормы аб атрыманні ў спадчыну маёмасці. Рымскія юрысты дзялілі права на прыватнае, гэта значыць якое адносіцца да «карысці асобных людзей», і на публічнае, гэта значыць якое адносіцца да «стану Рымскай дзяржавы». Менавіта ў Рыме паявілася дактрына, згодна з якой воля імператара з'яўляецца законам для ўсіх грамадзян. У імператарскую эпоху вялікае значэнне атрымала заканадаўчая дзейнасць імператараў, якія выдавалі эдыкты, дэкрэты, рэскрыпты і мандаты, што аб'ядноўваліся пад агульнай назвай «канстытуцыя».

Мастацтва красамоўства развівалася ў антычных цывілізацыях у непасрэднай сувязі з асаблівасцямі палітычнага жыцця. Авалоданне прамоўніцкім мастацтвам было важнейшым і найбольш дзейсным спосабам умацавання аўтарытэту ў грамадстве і заваяванне палітычнага поспеху. Рымскае красамоўства дасягнула свайго апагею ў асобе Цыцэрона (106—43 гг. да н. э.), ад якога да нас дайшло больш за 50 прамоў, што поўнасцю захаваліся, а таксама творы па тэорыі рыторыкі. У сваіх творах Цыцэрон прыводзіў ідэал усебакова адукаванага філосафа-прамоўцы і дзяржаўнага дзеяча. Менавіта Цыцэрону належыць думка аб тым, што любой галіне дзейнасці адпавядаюць свае абавязкі, у выкананні якіх і заключаецца маральны сэнс усяго жыцця.

Безумоўна, рымскія каштоўнасці мяняліся на працягу бурнай гісторыі гэтай цывілізацыі. У канцы існавання Рыма крызіс, што яго ахапіў, не мог не закрануць і сістэму каштоўнасцей, усё далей адступала рымскае грамадства ад тых прынцыпаў, якімі так ганарыліся жыхары Вечнага горада. Змяніўся склад жыхароў Рыма: усё больш «варвараў» аказвалася ў іх ліку. Карупцыя, злоўжыванні, палітычныя інтрыгі, нястрымная пагоня за нажывай, жорсткія і крывавыя грамадзянскія войны, кар'ерызм з апорай на сямейныя сувязі, дэспатызм, даносы і бязмежнае рабалепства і крывадушнасць — усё гэта характарызавала сітуацыю Рыма перад падзеннем пад націскам варварскіх плямён. Аднак гэта не прымяншае значэння тых каштоўнасцей, на вернасці якім рымляне лічылі неабходным выхоўваць юнацтва.

Завяршаючы размову аб старажытных цывілізацыях і іх значэнні на шляху да сучаснасці, успомнім словы Цыцэрона: «Не ведаць, што адбылося да твайго нараджэння,— значыць заўсёды заставацца дзіцем».

Пытанні і заданні

1. Якія найбольш істотныя дасягненні культуры архаічнай Грэцыі?

2. У чым заключаюцца асаблівасці поліснай арганізацыі грамадства?

3. Ахарактарызуйце полісную сістэму каштоўнасцей.

4. Раскрыйце значэнне цывілізацыі эліпізму.

5. Якія каштоўнасці старажытнарымскай цывілізацыі, з вашага пункту погляду, найбольш значныя? Чаму?

6. Зрабіце ўсе магчымыя вывады з аналізу наступнага фрагмента крыніцы:

Цыцэрон. Аб абавязках. Кн. I, VII, 20.

«...Але першая задача справядлівасці — у тым, каб нікому не наносіць шкоды, калі толькі цябе на гэта не вымусілі супрацьзаконнем, затым у тым, каб карыстацца грамадскай уласнасцю як грамадскай, а прыватнай — як сваёй. Прыватнай жа ўласнасці не бывае ад прыроды. Яна ўзнікае або з прычыны даўнейшай акупацыі, напрыклад, калі людзі некалі прыйшлі на свабодныя землі, або ў выніку перамогі, напрыклад, калі зямлёй завалодалі шляхам вайны, або на падставе закону, пагаднення, умовы, жэрабя...

З прычыны гэтага,— паколькі прыватная ўласнасць кожнага з нас утвараецца з таго, што ад прыроды было агульным,— няхай кожны валодае тым, што яму дасталося; калі хто-небудзь іншы паквапіцца на што-небудзь з гэтага, ён парушыць правы чалавечага грамадства».

7. Пры раскопках у Грэцыі ў Платэях выяўлены наступны дакумент, які адносіцца да 301 г. да н. э.

Маштабы цэн на рынках:

Від прадукцыі	Мера	Цана ў дынарыях
Жыта	1 модый (8,75 л)	60
Пшаніца, ячмень	«	100
Віно	1 секстарый (0,55 л)	30
Аліўкавы алей	«	12—40
Соль	1 модый	100
Свініна, бараніна	1 фунт	12
Ялавічына	«	8
Гусь адкормленая	1 шт.	200
Кураняты	1 пара	60
Рыба рачная	1 фунт	12
Рыба марская	«	6
Часнок	10 шт.	4
Цыбуля	1 модый	50
Яйцы	4 шт.	4
Яблыкі, грушы	10 шт.	4
Фінікі	8 шт.	4

Якія вывады можна зрабіць на падставе аналізу гэтага дакумента?

8. Ацаніце аргументы, якія змяшчаюцца ў выказванні Арыстоцеля (384—322 гг. да н. э.):

«Ва ўсіх рамёствах... патрэбны бываюць адпавядаючыя ім інструменты... і з гэтых інструментаў адны з'яўляюцца неадушаўлёнымі, другія — адушаўлёнымі... раб жа з'яўляецца ў вядомай ступені адушаўлёнай уласнасцю...

Калі б кожны інструмент мог выконваць уласцівую яму работу сам... калі б ткацкія чаўнакі самі ткалі... панам не патрэбны былі б рабы.

...Прырода зрабіла так, што і фізічная арганізацыя свабодных людзей адрозніваецца ад фізічнай арганізацыі рабоў: у апошніх цела магутнае, прыгоднае для выканання неабходнай фізічнай працы, свабодныя ж людзі трымаюцца прама і не здольныя да выканання падобнага роду работ, затое яны прыгодны для палітычнага жыцця... адны людзі па сваёй прыродзе свабодныя, другія — рабы, і гэтым апошнім быць рабамі і карысна і справядліва».

9. Супастаўце наступныя фрагменты крыніц, якія характарызуюць дэмакратыю як форму палітычнага ладу. Зрабіце неабходныя вывады.

а) Фукідыд. Гісторыя, II, 36—41.

«...Наш дзяржаўны лад не пераймае чужыя ўстанаўленні; мы самі хутчэй служым узорам для некаторых, чым пераймаем іншых. Называецца гэты лад дэмакратычным, таму што ён трымаецца не на меншасці, а на большасці... У адносінах да прыватных інтарэсаў законы нашы даюць раўнапраўе ўсім, што ж датычыцца палітычнага значэння, то ў нас у дзяржаўным жыцці ім карыстаюцца з перавагай перад іншымі не з прычыны таго, што яго падтрымлівае тая або іншая палітычная партыя, але ў залежнасці ад яго доблесці, што здабыла яму добрую славу ў той ці іншай справе; таксама скромнасць звання не служыць бедняку перашкодай да дзейнасці, калі толькі ён можа зрабіць якую-небудзь паслугу дзяржаве».

б) Платон. Дзяржава, кн. 8.

Дэмакратыя.

«Дэмакратыя, на мой погляд, ажыццяўляецца тады, калі беднякі, атрымаўшы перамогу, некаторых са сваіх праціўнікаў знішчаць, іншых выганяць, а астатніх ураўнуюць у грамадзянскіх правах і ў замяшчэнні дзяржаўных пасад, што пры дэмакратычным ладзе адбываецца большай часткай па жэрабю».

10. Якія вывады можна зрабіць з аналізу надпісаў на дамах у Пампеях, якія замянялі штодзённую прэсу, аб палітычным жыцці ў гэтым горадзе (не пазней 79 г. н. э.):

«Зрабіце Пансу эдылам*, прашу вас. Ён варты гэтага»;

«Усе ювеліры заклікаюць выбраць эдылам Гая Куспія Пансу»;

«Сатурнін разам з вучнямі заклікае зрабіць Гая Куспія Пансу эдылам»;

«Цырульнікі: у эдылы — Юлія Трэбія»;

«Земляробы патрабуюць зрабіць эдылам Марка Казелія Марцэла»;

«Рыбакі, выбірайце эдылам Папідыя Руфа»;

«Калі хто адхіляе Квінтыя, той ды ўсядзецца побач з аслом»?

11. Вядома, што канец IV ст. да н. э. у Афінах быў часам жорсткай барацьбы паміж дэмакратамі і прыхільнікамі алігархіі. Гэта

---

* *Эдыл* — гарадскі магістрат. У яго абавязкі ўваходзілі нагляд за будаўніцтвам, станам вуліц, храмаў і рынкаў, а таксама раздача хлеба, правядзенне грамадскіх гульняў і ахова дзяржаўнай казны.

барацьба адлюстравана ў творы філосафа і вучонага Феафраста (378—287 гг. да н. э.). Вызначце палітычныя сімпатыі гэтага аўтара на падставе фрагмента твора «Прыхільнасць да алігархіі»:

«Прыхільнасць да алігархіі — гэта, думаецца, імкненне да панавання, цесна звязанае з карыслівасцю. А прыхільнік алігархіі вось які чалавек. Калі народ рашае, каго ўзяць у дапамогу архонту распарадчыкамі святочнай працэсіі, ён бярэ слова і прапануе надзяліць выбарных неабмежаванай уладай. І нават калі іншыя вылучаюць дзесяць кандыдатур, гаворыць: «Хопіць і аднаго, але няхай гэта будзе сапраўдны мужчына». З усяго Гамера ён запомніў толькі адзін-адзіны радок: «Няма ў многаўладдзі карысці, хай будзе адзіны ўладар», і больш ніводнага не ведае. Вось якія павучальныя выслоўі ён пастаянна паўтарае: «Трэба нам сабрацца і паміж сабой абмеркаваць, як пазбавіцца ад чэрні...»; «У судах нам бяда ад подлых, якія нас судзяць»; «Гаворыць аб тым, як ён саромеецца, калі побач з ім у народным сходзе ўсаджваецца які-небудзь варты жалю і брудны жабрак...».

12. Якія аргументы вы можаце прывесці, фармулюючы свой пункт погляду адносна наступнага фрагмента з твора рымскага дзяржаўнага дзеяча, пісьменніка і філосафа Сенекі (4 г. да н. э.— 65 г. н. э.)? Ці згодны вы з аўтарам?

Сенека. Маральныя пісьмы да Луцылія, LXXVI, 9—10.

«А што лепшае ў чалавеку? Розум, які вылучае яго сярод жывёл і набліжае да багоў. Значыць, дасканалы розум ёсць дабро, уласцівае іменна чалавеку, бо ўсё астатняе ён дзеліць з жывёламі. Чалавек моцны? І львы таксама! Ён прыгожы? І паўліны прыгожыя! Ён спрытны? І коні спрытныя... Ён можа рухацца і адвольна накіроўваць рухі? Але гэтак жа і звер, і чэрві! У яго ёсць голас? Але ў сабак голас званчэйшы, у арлоў — прарэзлівейшы, у быкоў — гусцейшы, у салаўёў — больш прыемны. Што ж уласціва іменна чалавеку? Розум».

13. Якое значэнне ў станаўленні афінскага поліса як дэмакратычнага мелі рэформы Салона і Клісфена?

§ 11. СВЕТ ВАРВАРСТВА

Слова «варвары» з'явілася першапачаткова ў грэкаў, а затым перакачавала ў мову рымлян. Азначала яно і ў тых, і ў другіх толькі адно — нягрэкі, нярымляне, усе астатнія свабодныя (людзі другога сорту). У другі сорт, такім чынам, была запісана значная частка тагачаснага чалавецтва, уключаючы індусаў і кітайцаў (цывілізацыі якіх былі больш старажытнымі, чым грэчаская).

Для сучаснага гісторыка слова «варвары» мае іншае значэнне. Для яго — гэта народы, якія жылі ў эпоху Грэцыі і Рыма дакласавым, дадзяржаўным ладам*.

* Не трэба думаць, што ўсе народы адначасова прыйшлі да цывілізаванай ступені развіцця. Наадварот, на працягу гісторыі цывілізацыі вельмі часта суседнічалі і ўзаемадзейнічалі з першабытнымі радавымі грамадствамі.

Тут мы спынімся толькі на тых з іх, хто, адыграўшы ракавую ролю ў лёсе Рымскай імперыі, пабудаваў на яе абломках цывілізацыю сярэдневяковай Еўропы. Перш за ўсё — гэта германцы, а таксама кельты і славяне. Кельты насялялі Еўропу ўжо к II тысячагоддзю да н. э. Германцы і славяне паявіліся там пазней. Такім чынам, якімі ж яны былі — варвары?

Гаспадарка

У пачатку новай эры плямёны, якія нас цікавяць, вялі ўжо зусім аселы спосаб жыцця. Рымляне ва ўсякім выпадку рэзка адрознівалі іх ад качавых плямён Усходу, паколькі германцы, кельты і славяне займаліся земляробствам, будавалі дамы і ваявалі ў пешым страі. Ды і лясы, якія пакрывалі тэрыторыю старажытнай Еўропы, выключалі магчымасць качавой жывёлагадоўлі. Лес наогул меў у жыцці варвара велізарнае значэнне. Адносіны да яго былі дваістыя. З аднаго боку, лес служыў крыніцай харчавання (паляванне, збіральніцтва), з другога — бязлітасна знішчаўся ў барацьбе за ворныя землі. Яго змрочныя глыбіні давалі ўкрыцце ад ворагаў і ў той жа час нараджалі жудасныя легенды накшталт «дзікага палявання» ў германцаў і лясной нечысці (русалак, лесуноў і г. д.) у славян. Але так ці інакш жыцця без лесу варвар сабе не ўяўляў. Зямля ў гэтым грамадстве знаходзілася ў калектыўнай радавой уласнасці. Кожная вялікая сям'я, што ўваходзіла ў род, мела свой надзел, які не падлягаў куплі-продажу. Трэба мець на ўвазе, што адносіны да зямлі ў варвара былі зусім не тыя, што ў селяніна больш позняга часу. Для варвара гэта не проста месца, якое можна ўзараць, засеяць, пасля чаго зняць ураджай. Радавы надзел — перш за ўсё ўвасабленне містычнай «душы роду». Валоданне ім забяспечвала чалавеку падтрымку ўсіх пакаленняў продкаў, якія жылі і памерлі тут да яго. «Маці-зямлі» ён пакланяўся, прыносіў ахвяры, выконваў розныя магічныя рытуалы. Паказваючы непахіснасць гэтай радавой каштоўнасці, аўтар адной з старажытнаанглійскіх паэм гаворыць, што ўсім можна ахвяраваць дзеля сябра, «толькі зямля непадзельная і войска адзінае».

Наогул жа, як зазначыў Юлій Цэзар (I ст. да н. э.), варвары «не шчыравалі ў апрацоўцы зямлі». Яго падтрымлівае другі рымскі пісьменнік Карнелій Тацыт (I ст. н. э.), гаворачы, што германцы даручаюць клопат аб жыллі, хатняй гаспадарцы і раллі жанчынам, старым і найбольш слабамоцным. А таксама «не прыкладаюць

намаганняў, каб прымножыць працай урадлівасць глебы».

«Любімым іх набыткам» (Тацыт) была жывёла, якая не толькі давала ім малако і мяса, але таксама служыла плацежным сродкам, замяняючы грошы. Паказальна, што адно і тое ж старажытнагерманскае слова азначала і «жывёла», і «маёмасць», і «грошы» (як у свой час і ў рымлян).

Варварскія паселішчы, як правіла, былі хутарскога тыпу і знаходзіліся даволі далёка адно ад аднаго, чым нямала здзіўлялі рымлян, якія прывыклі жыць скучана. Гаспадарка была натуральнай, і кожная абшчына забяспечвала сябе ўсім: ад адзення і хатняга начыння да зброі. У цэлым жа, як мы ўбачым у хуткім часе, свет гэты быў хутчэй грамадствам воінаў, чым сялян.

Сацыяльныя структуры

У пачатку н. э. асноўнай формай аб'яднання ў свеце варвараў з'яўлялася племя, усе члены якога былі свабодныя і раўнапраўныя. Вышэйшы орган улады — народны сход (куды ўваходзілі ўсе паўналетнія мужчыны) вырашаў важнейшыя пытанні, выбіраў племянных правадыроў і савет старэйшын. Тацыт малюе яркія карціны такіх сходаў, дзе варвары ў поўным узбраенні слухаюць выступаючых, шумна не прымаюць адных і, наадварот, бразгаючы зброяй, выказваюць ухваленне другім. «Ушанаваць пахвалу зброяй, на іх погляд,— самы ганаровы від ухвалення». Такая роля народнага сходу зразумелая. У грамадстве, зарыентаваным на вайну, дзе кожны мужчына абавязкова быў воінам, яно з'яўлялася адначасова значнай ваеннай сілай.

Аднак побач расце і ўмацоўваецца новая сіла, якой суджана (у аддаленым, праўда, будучым) пакончыць з народаўладдзем. Гэтай сілай была знаць. Заснавальнікамі знатных родаў былі прадпрымальныя воіны, якія арганізоўвалі супляменнікаў для набегаў на суседзяў і павялічвалі такім чынам сваю славу і багацце. Відавочна, такая ініцыятыва заахвочвалася і з боку народнага сходу вылучэннем гэтым людзям вялікіх зямельных надзелаў. Так ці інакш, але, праводзячы такую палітыку з пакалення ў пакаленне, знатныя роды становяцца настолькі ўплывовымі, што к I ст. н. э. народны сход мог выбіраць правадыроў племені і старэйшын толькі з іх ліку.

Але галоўнае было нават не ў гэтым. Карыстаючыся багаццямі, назапашанымі пакаленнямі продкаў, прад-

стаўнікі знаці атрымалі магчымасць мець уласныя дружыны. Гэта выклікала пераварот у грамадскім жыцці і ваеннай справе. Сярод простых варвараў, якія дзялілі жыццё паміж вайной і гаспадаркай, з'яўляюцца воіны-прафесіяналы. «Значна цяжэй пераканаць іх узараць поле і чакаць цэлы год ураджаю, чым схіліць уступіць у бой з ворагам і зведаць раны; больш таго, па іх уяўленнях, потым здабываць тое, што можна набыць кроўю,— лянота і маладушнасць» (Тацыт).

Народны сход цяпер неабходны знаці толькі ў выпадку вялікай вайны, ва ўсім астатнім яна імкнецца абысціся без яго. З'яўленне знаці і дружын, зразумела, не азначае, што грамадства раскалолася на класы. Вядома, варвар-дружыннік знаходзіўся ў лепшым становішчы, чым просты член радавой абшчыны. Але, па сутнасці, і той і другі былі воінамі, і той і другі ўваходзілі ў народны сход і, нарэшце, і таго і другога аб'ядноўвала племя, а значыць, звязвалі (блізкія ці далёкія) сваяцкія вузы. Учарашні абшчыннік заўтра мог уступіць у дружыну, а прадстаўнікі знаці жылі па тых жа звычаях, што і ўсе астатнія. Сэнс таго, што адбываецца, не ў расколе грамадства на класы, а ў тым, што ўнутры яго ўзнікла лідзіруючая група, якая звязвае ўсе свае інтарэсы з вайной. Група, якая стварыла новую сістэму каштоўнасцей і павяла за сабой усіх астатніх. А калі так, то неабходна пагаварыць аб гэтых людзях асоба.

Правадыр і дружыннае асяроддзе*

На чым магла грунтавацца ў тую крывавую эпоху ўлада правадыра над воінамі, акрамя таго, што ён забяспечваў іх усім неабходным? Па-першае, на асабістай доблесці, якой ён абавязан быў перавышаць усіх, бо «...ганебна правадыру саступаць каму-небудзь у доблесці» (Тацыт). Другой падставай была знатнасць. Па словах таго ж Тацыта, «выдатная знатнасць і заслугі продкаў нават яшчэ зусім юным даюць годнасць правадыра». У словах гэтых многія гісторыкі схільны бачыць доказ сакральнай** прыроды ўлады правадыра над дружынай (і племем). Знаць жа мела звычай узводзіць свае радаслоўныя да вяр-

---

* У гэтым і наступных раздзелах адлюстраваны галоўным чынам звычаі германцаў.

** *Сакральны* (лац.) — свяшчэнны, які паходзіць ад багоў. Правадыр надзяляў дружынніка часткай сваёй удачы, дадзенай яму багамі.

хоўных багоў. Такім чынам, правадыра (нават маладога і нявопытнага) як бы падтрымлівалі вышэйшыя сілы, забяспечваючы яго містычнай удачай. У абавязак правадыру ставілася таксама выключная шчодрасць у адносінах да дружыннікаў. «Шчодрыя, смелыя (шчаслівыя ў жыцці) клопатаў не ведаюць; (а баязлівец, той заўсёды ратавацца гатовы), як скупы ад падарунка». Як бачыце, у гэтым урыўку са старажытнай песні скупасць прыраўноўвалася да самай страшнай заганы, якую толькі маглі сабе ўявіць варвары,— да баязлівасці. Дары (коні, зброя, каштоўнасці), акрамя матэрыяльнага, мелі псіхалагічнае значэнне.

Дружыннікі, у сваю чаргу, былі абавязаны праяўляць у адносінах да правадыра бязмежную адданасць, абараняць яго да апошняга, здзяйсняць подзвігі ў імя павелічэння яго славы. «Правадыры ваююць дзеля перамогі, дружыннікі — за свайго правадыра» (Тацыт). Выйсці жывым з бою, у якім загінуў правадыр, было для дружынніка найвялікшай ганьбай на ўсё жыццё. Наогул, дружына будавалася па тыпу роду — усе воіны (незалежна ад узросту) — сыны правадыра і браты адзін аднаму. Многія з іх спраўлялі рытуальны абрад змешвання крыві, становячыся такім чынам кроўнымі братамі. Старэйшыя дружыннікі ўсынаўлялі моладзь, якая прыходзіла. Ва ўмовах радавога быту такая мадэль была зусім натуральнай.

Аднак новыя каштоўнасці, вызначаныя дружынным асяроддзем, такія, як святасць вайны, пагарда да працы, лютая адвага воіна і г. д., прывялі тых, хто асабліва старанна прытрымліваўся іх, да супярэчнасці з радавымі адносінамі. Цэзар, Тацыт і больш познія пісьменнікі расказваюць аб з'яўленні сярод варвараў-германцаў такіх воінскіх груп, якія, у адрозненне ад звычайных дружыннікаў, поўнасцю парвалі з родам і, не маючы ні дома, ні зямлі, знаходзіліся ў пастаянных вандроўках і пошуках прыгод, славы і здабычы. Падкрэсліваючы сваю лютасць, яны адзяваліся ў воўчыя і мядзведжыя шкуры (адсюль казачны матыў аб ператварэнні чалавека ў звера). Прыводзячы сябе перад боем у поўнае шаленства (часам наркотыкамі), гэтыя людзі кідаліся на ворага, равучы, як дзікія звяры. У такім стане яны былі неадчувальныя да ран і таму лічыліся непрыступнымі для агню і жалеза. Законы радавога ладу для іх былі няпісаныя, і іх баяліся нават супляменнікі. Вядома, што германскае племя лангабар-

даў перапужала аднойчы ворагаў, паведаміўшы, што ў іх войску знаходзіцца група воінаў з сабачымі (або воўчымі) галовамі, якія настолькі лютыя, што харчуюцца кроўю ворагаў, а калі няма яе, то кроўю ўласных суплямённікаў. У аснове легенды яўна ляжыць інфармацыя аб адной з «дзікіх» воінскіх арганізацый. Такіх, зразумела, была меншасць. Гэта была, так сказаць, крайняя форма праяўлення воінскай ідэалогіі ў грамадстве.

Вернемся, аднак, да звычаяў большасці дружыннікаў. Як ужо было сказана, яны не займаліся гаспадаркай (хоць і мелі яе, знаходзячыся ў родзе), а праводзілі жыццё ў «высакародных занятках» — вайне, паляванні, балях.

Баль адыгрываў велізарную ролю ў жыцці варвара. Па-першае, нярэдка гэта было адначасовае святкаванне ў гонар багоў. Менавіта адтуль бярэ пачатак традыцыя паказваць бітву ў выглядзе балю. «Тут крывавага віна не хапала (тут баль закончылі храбрыя русічы), сватоў напаілі, а самі паляглі...» («Слова аб палку Ігаравым»). На балі абмяркоўваліся важнейшыя рашэнні, якія зацвярджаліся потым народным сходам. Тут жа правадыр узнагароджваў дружыннікаў, а тыя прыносілі яму прысягу.

У адносінах да правадыра пэўныя абавязкі неслі не толькі дружыннікі, але і астатнія члены племя. Так, Тацыт паведамляе, што існаваў звычай, па якому «кожны добраахвотна выдзяляў правадырам што-небудзь са сваёй жывёлы і пладоў зямных». Гэта былі не падаткі, а справа добраахвотная. Аднак незахаванне звычаю магло быць расцэнена правадыром як непавага з усімі наступнымі вынікамі. Сродкі, атрыманыя такім чынам, ішлі зноў-такі на ўтрыманне дружыны. Але ўсё ж галоўнай і натуральнай крыніцай яе існавання былі войны, якія не спыняліся.

У заключэнне агляду грамадскага жыцця варвараў неабходна сказаць яшчэ аб адной сацыяльнай групе — жрацах (у кельтаў яны называліся друідамі, а ў славян — вешчунамі). Роля іх была надзвычай вялікая. Ад іх залежала, ці даруюць багі перамогу ў бітвах і ўраджаі на палях. Жрацы займаліся прадказаннямі будучага і валодалі своеасаблівай сістэмай пісьменнасці, якая выкарыстоўвалася галоўным чынам у магічных заклінаннях. Правам выконваць ахвярапрынашэнні і магічныя рытуалы валодалі таксама і правадыры

(якія, як вы помніце, былі «ў сваяцтве» з багамі).

А цяпер разгледзім падрабязней асноўныя каштоўнасці свету варвараў. У іх можна вылучыць дзве групы:

1. *Радавыя каштоўнасці.* Асновай іх з'яўлялася святасць кроўных вуз, якія звязваюць членаў роду. У гэту групу ўваходзяць: асобыя адносіны да радавога зямельнага ўладання; абавязак помсціць за загінуўшага родзіча, прычым не толькі забойцу, але і ўсяму яго роду; абавязак гасціннасці (бо госць знаходзіцца пад апякунствам радавых божастваў) і г. д. Каштоўнасці гэтыя, ва ўяўленні варвара, былі непахісныя і маглі знікнуць толькі з гібеллю свету, калі «браты пачнуць/біцца адзін з адным,/родзічы блізкія/у разладзе загінуць...». Наймацнейшымі вузамі звязвалі яны людзей, аб чым сведчыць тое, што войска варвараў перад бітвай выстройвалася так, каб сваякі знаходзіліся побач.

2. Да другой групы адносяцца каштоўнасці «гераічныя», сфарміраваныя дружынным асяроддзем. Аб некаторых з іх, такіх, як *доблесць, святасць вайны, адданасць правадыру*, мы ўжо гаварылі. Спынімся яшчэ на некалькіх: *слава* — каштоўнасць вышэйшая і безумоўная, якая пераадольвае смерць, паколькі яна адна захоўвае імя чалавека ў стагоддзях. «Гінуць статкі,/радня памірае,/і смяротны ты сам;/але ведаю адно, што вечна бессмяротнае: памёршага слава. «Прызначанае лёсам немінучае — ляжаць па ўсіх краінах/ніці лёсу», але сэнс жыцця не ў пасіўным падпарадкаванні прадвызначанасці, а ў барацьбе.

Удача — адно з найбольш містычных, звязаных з рэлігіяй паняццяў. Яна вызначалася знатнасцю таго або іншага чалавека і прыхільнасцю да яго багоў. Адсутнасць яе не маглі кампенсаваць ніякія асабістыя якасці, і ніякімі асабістымі якасцямі нельга было яе набыць. У адной з саг аб «эпосе вікінгаў» (IX—XI стст. н. э.) (грамадства якіх у многім нагадвала варварскае) бацька, праводзячы сына на вайну з каралём Нарвегіі, гаворыць: «...Хоць у цябе многа адвагі і ўмення, табе не хапае ўдачы, каб ты мог цягацца з конунгам». Удача правадыроў (як найбольш блізкіх багам) роўных не мела і служыла залогам дабрабыту іх дружын і плямён. Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што вера ў гэта заключала ў сабе і немалую небяспеку для правадыра. Вядомы выпадкі, калі «няўдачлівых» правіцеляў іх расчараваныя падданыя прыносілі ў ахвяру, каб уміласціць таго або іншага бога.

Надзвычай блізка да прагі славы і ўдачы ў гэтай сістэме каштоўнасцей стаіць прага *здабычы*. На першы погляд паміж славай і грабяжом агульнага нямнога. Аднак не будзем спяшацца з вывадамі. Справа ў тым, што здабытае ў паходах цанілася не толькі як матэрыяльныя каштоўнасці, але ў яшчэ большай ступені як матэрыялізаваная ўдача іх уладальніка. Рэчы гэтыя часта не расходаваліся нікуды, аб чым сведчаць шматлікія клады. Адносіны да здабычы радыкальна адрозніваліся ад адносін да дабра, набытага гандлем або працай. Яркі прыклад гэтага мы знаходзім у фінскім эпасе «Калевала»: «Не патрэбна мне кладоўка,/серабро, што ўзята з бою,/непараўнана мне даражэйшае,/чым усё золата, што дома,/серабро, што ўзялі плугам».

Важнейшым момантам сістэмы каштоўнасцей з'яўляюцца таксама адносіны варвара да *зброі*. Яна адыгрывала ў яго жыцці надвычайную ролю, асабліва меч. У міфах лепшыя мячы выкоўваліся самімі багамі і ўручаліся героям. На клінках чарціліся магічныя знакі, якія надавалі ім яшчэ большую сілу. У германскіх павер'ях мячы адухаўляліся і мелі ярка выяўленую індывідуальнасць. Адзін прыносіць смерць кожны раз, калі яго вымаюць з ножнаў. Другі — помсціць за свайго адданага гаспадара. Трэці — пяе, калі воін вымае яго з ножнаў, і сыходзіць крывёю, калі дзе-небудзь далёка ідзе бітва, і г. д. Зброя суправаджала варвара ўсё жыццё. Яна — падарунак да паўналецця, дар, якім абменьваліся жаніх і нявеста. На ёй прыносілі непарушную прысягу, ёю кляліся, яна суправаджала воіна ў магілу. Зброя заўсёды была пад рукой, па сутнасці, яна — частка варвара, неаддзельная ад яго. Менавіта тут карані таго культу, якім абкружылі зброю сярэдневяковыя рыцары.

У самых агульных рысах мы разглядзелі грамадства, з якім прыйшлося сутыкнуцца грэка-рымскай цывілізацыі. Паглядзім, у што ператварылася гэта сутыкненне.

Рым і варвары

Упершыню пазнаёміцца з варварамі рымлянам давялося назаранку сваёй гісторыі. У 387 г. да н. э. плямёны галаў (кельцкага паходжання) захапілі і разграбілі Рым. Гэта, таксама як і словы гальскага правадыра Брэна: «Гора пераможаным!», рымляне запомнілі надоўга. Наступныя 300 гадоў аж да пачатку н. э. прайшлі ў безупынных сутыкненнях. Былі, вядома, і гандаль, і заключэнне дагавораў, але ўвогуле бакі глядзелі адзін

на аднаго як на ворагаў, ды яшчэ ў дадатак і з пагардай. Рымляне пагарджалі варварамі проста за тое, што тыя былі варварамі. Варвары ж, якія цанілі толькі ваенныя доблесці і прывыклі да суровага быту, пагарджалі рымлянамі за «спешчанасць». Перамога, аднак, заставалася за Рымам, і апафеозам яе быў захоп Цэзарам Галіі (сучасная Францыя) і ўварванне на Брытанскія астравы ў I ст. да н. э. Галаў, такім чынам, рымскай ваеннай машыне ўдалося «перамалоць». Аднак спроба зрабіць тое ж самае з германцамі, якія жылі за Рэйнам, не мела поспеху. На рубяжы I—II стст. н. э. Рымская імперыя вычарпала наступальныя магчымасці і перайшла да абароны. На яе граніцах спешна ствараюцца земляныя валы, крэпасці і вартавыя вышкі, з якіх рымскія легіянеры з трывогай углядваюцца ўдалечыню. Час варвараў наступіў.

Калі гавораць, што варварскія нашэсці загубілі імперыю, забываюць тую простую ісціну, што варвары яе і абаранялі. Атрымалася гэта наступным чынам. Канец II—V ст. былі для Рымскай імперыі перыядам заняпаду. Упадак сельскай гаспадаркі, палітычныя непаладкі, якія не спыняліся, узрастаючы ціск ворагаў на граніцы. Як ніколі, Рыму была патрэбна моцная армія, але каму служыць у ёй?

Тып рымскага грамадзяніна часоў рэспублікі (аб дабрачыннасці якога вы ўжо ведаеце) даўно знік у шматнацыянальнай і шматмоўнай імперыі. Для новых рымлян ваенная служба — цяжкая абуза. Выйсце толькі адно — прымусіць адных ворагаў ваяваць супраць другіх, адкрыць шырокі доступ на ваенную службу варварам. Для іх служба ў праслаўленага правадыра — прадмет мар. А рымскі імператар — правадыр правадыроў. І вось варвары становяцца военачальнікамі і целаахоўнікамі. Заходнія легіёны мала-памалу ператвараюцца ў кельцка-германскія. І дзіўная справа, пад іх уплывам традыцыйныя рымскія каштоўнасці пачынаюць пераглядвацца. У імператара паяўляецца «Гвардыя львоў» (чым не саюз воінаў-звяроў?). Палац цяпер называецца ваенным лагерам. Германскія легіёны на Захадзе пачынаюць выбіраць імператараў па свайму пачыну (чым не выбранне правадыра народным сходам?). Пры дварэ цяпер больш за ўсё цэніцца асабістая адданасць. Імператар знаходзіцца з воінамі сваёй гвардыі толькі што не ў сваяцкіх адносінах. Галава рымскага сената — жывы бог і «бацька народа» —

пачынае набываць усё большыя рысы ваеннага правадыра германцаў. Гэтым прыкладам, зразумела, кіруюцца яго намеснікі. Спробы карэннага рымскага насельніцтва спыніць працэс не маюць поспеху. «Варварызацыя» імперыі з верху да нізу — вось сэнс таго, што адбываецца. У імперыю ўліваецца маса прышлага свабоднага насельніцтва, што яшчэ больш падрывае і без таго непрадукцыйную сістэму рабскай працы. Разам з тым і варвары пераймаюць ад Рыма многае (прававыя нормы, уяўленне аб прыватнай уласнасці і г. д.), і гэта ўзмацняе разлажэнне першабытнаабшчынных адносін і радавога ладу. Ідзе ўзаемапранікненне дзвюх культур, складваецца база новай цывілізацыі.

І падзенне Заходняй Рымскай імперыі ў 476 г.— гэта не перамога варвараў і не паражэнне рымлян. Гэта сведчанне таго, што новае, якое так доўга выспявала, нарэшце нарадзілася. Еўропа пераходзіць у новую якасць. Пачынаецца эпоха сярэдневякоўя.

Пытанні і заданні

1. У адной са старажытнагерманскіх песень апісваецца сустрэча ў баі воіна-дружынніка са сваім сынам, які ваяваў на баку ворага. Абодва павінны зрабіць выбар... Канфлікт якіх каштоўнасцей тут паказаны?

2. У чым адрозненне «ваеннай дэмакратыі» варвараў ад дэмакратыі антычнасці?

3. Чым адрознівалася знаць Рыма ад варварскай?

4. Чаму ў варварскім свеце практычна адсутнічаў гандаль?

5. «Мудры! Не варта/засмучацца! — трэба/помсціць за сяброў,/а не плакаць дарэмна!/Кожнага смяротнага/чакае скон! — /няхай жа, хто можа,/пакуль жывы, заслужыць/вечную славу!/Бо для воіна/лепшая плата — /памяць дастойная!» Якія каштоўнасці варварскага свету выяўлены ў гэтых словах героя старажытнай паэмы?

6. Ці маглі варвары без рымскага ўплыву пабудаваць сваю цывілізацыю?

7. Параўнайце ідэальны тып рымскага грамадзяніна і ідэал чалавека свету варвараў.

8. Рымляне прымянялі на вайне дакладнае пастраенне, і кожная ваенная адзінка іх арміі (легіён, кагорта, маніпула) дзейнічала зладжана, як адзін чалавек. Варвары, наадварот, кідаліся на ворага дрэнна арганізаванай масай, дзе кожны клапаціўся не столькі аб зыходзе бітвы, колькі аб тым, каб прадэманстраваць асабістую храбрасць. Чым вызначалася розніца ў метадах вядзення бою?

9. У варвараў былі рабы. Аднак у адрозненне ад грэчаскіх і рымскіх яны не адыгрывалі ў гаспадарцы амаль ніякай ролі. Чаму?

§ 12. ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ ЭПОХІ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ

Адносна часавых і геаграфічных рамак цывілізацыі сярэдневякоўя сярод вучоных няма адзінства. Мы будзем мець на ўвазе Еўропу X—XIV стст., калі асноўныя структуры гэтай цывілізацыі ўжо склаліся, але яшчэ не пачалі размывацца элементамі новага, індустрыяльнага грамадства.

Сярэдневяковае грамадства

Мабыць, усе згодны з тым, што грамадства сярэдневяковай Еўропы было феадальным. Аднак што ж такое феадалізм? У курсе гісторыі VII і VIII класаў вы разглядалі яго як эканамічны лад, пры якім уласнікі зямлі, феадалы, эксплуатуюць залежных сялян. Паспрабуем падысці да яго яшчэ з аднаго боку і паглядзець, чым жылі людзі сярэдневякоўя.

Сялянства. Калі ўявіць сабе феадальнае грамадства ў выглядзе піраміды, то месца сялянства будзе каля самай яе асновы. І гэта натуральна, бо, з аднаго боку, яно з'яўлялася асноўнай прадукцыйнай сілай гэтага грамадства, а з другога — самай бяспраўнай яго часткай. Чаму ж грамадства адмовіла ў павазе тым, хто яго карміў? Часткова гэта было вынікам таго, што праца ў сярэднія стагоддзі не з'яўлялася бясспрэчнай каштоўнасцю. Ад Рыма і варвараў павагі да яго гэта цывілізацыя не атрымала ў спадчыну. А чытаючы Біблію, чалавек сярэдневякоўя не мог зразумець, што ж такое праца — дабро або пакаранне за грахі. Аднак галоўнае нават не ў гэтым.

Свет феадальнай вёскі — зусім асобы свет, які выхоўвае тып чалавека, непадобнага на прадстаўнікоў іншых саслоўяў. Доўгі час сялянская гаспадарка была натуральнай, і большасць сялян усё жыццё праводзілі на адным месцы, так ні разу не выехаўшы за межы вясковых зямель. Сусвет гэтых людзей абмяжоўваўся роднай вёскай, замкам сеньёра і сельскай цэркаўкай. Аб свеце, які ляжаў за межамі ўсяго гэтага, яны мелі самыя цьмяныя ўяўленні.

Думка аб тым, што грамадства развіваецца, была зусім незразумелай сялянам. Наадварот, пастаянныя зносіны з прыродай прыводзілі іх да ўпэўненасці, што ўсё рухаецца па крузе. Вясну змяняла восень, за ворывам ішло жніво, і так было заўсёды. Гэта была вялікая кансерватыўная сіла, якая з крайнім недаве-

рам адносілася да ўсяго новага. Ідэал сялян быў у мінулым, у «старых добрых часах».

Адсутнасць адукацыі і абмежаваны слоўнікавы запас прыводзіў да таго, што сяляне былі няздольныя зразумець ні вытанчаную мову рыцарства, ні тым больш латынь духавенства. Само сабой зразумела, што адрозніваліся яны ад «высакародных» і знешнім выглядам. «Смярдзючы мужык» — так звычайна называюць сялян у рыцарскіх раманах. Усё гэта, разам узятае, рабіла сялянства абсалютна чужым не толькі для вышэйшых саслоўяў, але і для гараджан. І «чужасць» гэта выклікала часам жаль, часцей пагарду, але ўжо ніяк не думку аб роўнасці ўсіх людзей.

Тут, праўда, трэба адзначыць, што духавенства, як захавальнік усеагульнай ідэалогіі сярэдневякоўя (хрысціянства), займала гібкую пазіцыю. Апраўдваючы існуючыя парадкі воляй Госпада, свяшчэннаслужыцелі адначасова ганьбавалі жорсткіх феадалаў і называлі сялянскую працу «патрэбнай Богу».

Што датычыцца рыцарства, то яго адносіны да сялянства непрымірымыя. «Мужык» у рыцарскай літаратуры — увасабленне ўсяго самага брыдкага і агіднага.

Ніякімі якасцямі селянін не мог загладзіць «нізасць» паходжання. Так, у былінах княгіня называе Ілью Мурамца «дзеравеншчынай» і «засельшчынай». А сярод легенд аб каралю Артуру ёсць і такая, дзе рыцар, пераадзеты селянінам, суправаджае знатную даму, аказваючы ёй паслугі і выратоўваючы ад небяспекі. Тая ж замест падзякі лае ўяўнага «мужыка».

Селяніну, такім чынам, навязвалася ўяўленне аб сабе, як аб істоце ніжэйшай, прызначанай для службы пану.

Разам з тым ідэя роўнасці была ўвогуле чужая і самім сялянам. Яны, вядома, змагаліся з феадаламі, учыняючы, дарэчы сказаць, жудасныя зверствы (вобраз «добранькага» селяніна — казка). Але, ненавідзячы феадала, яны пры гэтым глядзелі на яго знізу ўверх. Тым больш, што ён быў не толькі прыгнятальнікам, але і абаронцам, без якога ў той жорсткі час праіснаваць было нельга. Выслоўі тыпу «Калі Адам пачаў араць, а Ева — ткаць,— дзе тады была знаць?!» гучалі рэдка. Свет сялян не мог парадзіць ідэю роўнасці.

Рыцарства. Узнікненне рыцарства было выклікана не столькі расколам грамадства на класы, колькі ваеннай неабходнасцю. Традыцыйная пяхота варвараў не

магла эфектыўна процістаяць конным воінам Усходу, якія ўрываліся ў Еўропу. Вайна становіцца ўсё больш прафесіянальнай, а ўзбраенне ўсё больш дарагім. І ў выніку грамадства канчаткова дзеліцца на «тых, хто працуе» і «тых, хто ваюе»,— з'яўляецца рыцарства.

Ідэалогія новага саслоўя, якое аб'ядноўвала ўсіх свецкіх феадалаў аж да караля, узнікла не на пустым месцы. За плячамі ў рыцараў былі традыцыі продкаў — правадыроў і дружыннікаў варварскай эпохі. І рыцарская сістэма каштоўнасцей уяўляла сабой вычварны сплаў варварства і хрысціянства. Разгледзім яе.

Цэнтральным момантам рыцарскага ідэала была ***доблесць.*** Не трэба змешваць яе са звычайнай для кожнага рыцара храбрасцю. Доблесць — гэта смеласць, што даходзіць да безразважнасці. Пастаянны пошук небяспекі і пагарда да смерці. Усе гэтыя якасці падкрэсліваюцца ў гераяў рыцарскіх паэм. Так, граф Раланд («Песня аб Раландзе») катэгарычна адмаўляецца прасіць аб дапамозе, хаця ворагі ў шмат разоў перавышаюць яго атрад. А герой «Песні аб Нібелунгах» у адказ на просьбу не ехаць на баль да ворагаў, дзе яго чакае гібель, фанабэрыста кажа: «Адмовіць ім не дазваляе гонар».

Ідэалам рыцарства былі не разважлівыя палітыкі, а такія людзі, як Рычард Ільвінае Сэрца, які мог са жменькай воінаў кінуцца на цэлае войска. Сіла традыцыі была настолькі вялікая, што каралі дзеля подзвігаў рызыкавалі інтарэсамі дзяржавы. А военачальнікі нярэдка ахвяроўвалі зручнай пазіцыяй і прайгравалі бітву з-за боязі, што іх абвінавацяць у недахопе смеласці. У бітве пры Азенкуры (1415) французскія рыцары са словамі «Нашто нам гэтыя крамнікі?» адмовіліся ад дапамогі парыжскіх гараджан. Бітва была прайграна, але «гонар выратаваны».

Неразрыўна звязана з доблесцю абавязковасць дастойных паводзін на рыцарскім паядынку. У адной з паэм, напрыклад, з захапленнем расказваецца аб тым, як рыцар перад боем з праціўнікам, у якога няма шчыта, прапануе яму свой. А той, расчулены такой велікадушнасцю, клянецца, што не нанясе яму шкоды ў бітве.

Такім чынам, высакароднасць, пачцівасць, аднак усё ў сярэдневякоўі пабудавана на кантрастах. Поруч з цывілізаванасцю, у рыцару заставалася немалая доля дзікасці ад германскага воіна-звера. Тут і звярыная

эмблематыка на гербах. Пачцівыя мянушкі: Ільвінае Сэрца, Леў, Дзікі Вяпрук. Аўтар «Песні аб Нібелунгах» зусім спакойна апісвае тое, як рыцары на полі бітвы праганяюць смагу кроўю забітых ворагаў — звычай тыпова варварскі.

Вельмі важным аспектам сістэмы каштоўнасцей рыцарства былі *васальныя адносіны.* Іх эканамічная аснова простая — буйны феадал узнагароджваў рыцара зямельным уладаннем, за што той прыносіў яму прысягу на вернасць. Адносіны васала з сеньёрамі былі падобныя на адносіны правадыра і дружынніка варвараў.

«Служыць заўжды сеньёру рад васал,
Спёку за яго цярпець і халады.
Кроў за яго яму аддаць не шкода».

Са свайго боку, сеньёру належала клапаціцца аб васале, як аб члене ўласнай сям'і. Прыносячы прысягу, рыцар укладваў свае рукі ў рукі сеньёра, паказваючы гэтым, што ён аддаецца на яго міласць. Сеньёр абавязаны быў праяўляць выключную шчодрасць да васала, нічога для яго не шкадуючы. Яркі прыклад гэтага мы знаходзім у «Песні аб Раландзе», дзе Карл Вялікі выцірае кроў з твару свайго вернага рыцара краем раскошнай гарнастаевай мантыі.

У рэальным жыцці, вядома, сеньёры і васалы, бывала, і здраджвалі адзін аднаму. Аднак эталонам усётакі лічылася вернасць.

Шчодрасць і раскоша, якія пераходзяць у матаўство, прадпісваліся не толькі сеньёрам, але і наогул усім рыцарам. Яны — сведчанне доблесці і шырокай натуры. А калі так, то ўдзячныя рыцары стараліся перасягнуць адзін аднаго ў дзівацтвах. Адзін загадвае засеяць узаранае поле кавалачкамі серабра, другі — гатаваць ежу на дарагіх васковых свечках і г. д.

Надзвычай распаўсюджанай у літаратуры тэмай з'яўляюцца рыцарскія адносіны да жанчыны. Культ «прыгожай дамы» (як і вера ў Хрыста) з'яўляўся выражэннем парыву да чыстага і высокага «прыгожага жыцця», туга па якім станавілася тым большай, чым больш крывавымі і грубымі былі норавы эпохі. Трапяткія і пачцівыя адносіны да жанчыны пакрылі неўвядальнай чароўнасцю ідэю рыцарства.

Аднак і тут рэальнасць не заўсёды адпавядала ідэалу. У сямейных адносінах рыцары нярэдка былі грубымі

жывёламі. Паламаныя насы жонак — даволі звычайная з'ява таго часу. Ды і наогул адносіцца да жонкі гэтак жа пачціва, як да каханай, лічылася дрэнным тонам.

Варварскаму *пакланенню зброі* (асабліва мячу) хрысціянская рэлігія надавала новы сэнс. У дзяржанне мяча цяпер упраўляліся хрысціянскія святыні. Такім чынам, ён набываў як бы звышнатуральную сілу і сам станавіўся свяшчэнным прадметам. Акрамя таго, уваткнуты ў зямлю меч паўставаў у выглядзе крыжа, перад якім рыцар, укленчыўшы, мог памаліцца перад боем: «Гэта крыж Гасподні, ад якога бягуць ворагі». Гэты момант быў асабліва важны ў войнах з ворагамі «веры Хрыстовай». І наогул, рыцарская зброя ў сярэдневякоўі — сімвал свабоды і высакародства. Іншыя саслоўі насіць яе права не мелі.

З іншых момантаў рыцарскага «кодэкса гонару» неабходна адзначыць абавязковасць *помсты* за абразу родзіча і друга (спадчына радавога ладу). А таксама непарушнасць ваеннага пабрацімства, якое лічылася непадуладным нават смерці. Да прыкладу, удзельнікі ўзяцця Іерусаліма ў 1199 г. (1-ы крыжовы паход) сцвярджалі, што на штурм ішлі не толькі жывыя, але і тыя, хто загінуў у дарозе.

Не лішнім будзе заўважыць, што правілы гонару дзейнічалі толькі ўнутры рыцарскага саслоўя і на іншыя не распаўсюджваліся. Можа, гэта адна з прычын таго, што доблесць і высакародства вычварна перапляталіся ў «гаспадарах сярэдневякоўя» з фанабэрыяй, крыважэрнасцю, неадукаванасцю і г. д.

Духавенства. Гаварыць аб духавенстве як аб саслоўі феадалаў неправамерна. Вельмі ўжо розныя людзі ў яго ўваходзілі. Ад папы рымскага да апошняга сельскага свяшчэнніка. Ад князёў царквы, якія мелі велізарныя феадальныя маёнткі, да немаёмных пустэльнікаў. Ад нягоднікаў і інтрыганаў да святых. Яно не з'яўлялася саслоўем у звычайным сэнсе, паколькі было адкрыта для ўсіх слаёў насельніцтва. І бывала, што нашчадак знатнага роду станавіўся простым манахам, а выхадзец з сялян дасягаў кардынальскага звання. Што ж аб'ядноўвала гэтых людзей? Толькі адно — усе яны ўваходзілі ў магутную арганізацыю, якая кантралявала ўсё, звязанае з ідэалогіяй сярэдневякоўя — хрысціянствам. Менавіта аб ім мы і пагаворым спецыяльна, але перш закранём яшчэ адзін важны момант.

Манархія і царква ў сярэдневякоўі

І тое і другое вы ўжо вывучалі. Таму спынімся толькі на ролі гэтых палітычных структур у грамадстве. Каралі, вядома, таксама былі феадаламі і рыцарамі. Аднак умовы сярэдневякоўя ставілі іх у асобае становішча. Па-першае, феадальная раздробленасць. Тут «браты па класу» нярэдка былі для каралёў не падтрымкай, а ворагамі. Якая ўжо тут падтрымка, калі на папрок караля «Хто цябе зрабіў графам?!» свавольны падданы адказвае: «А вас, ваша вялікасць, хто зрабіў каралём?!» Тое, што каралі пры дапамозе гарадоў змагаліся са знаццю і апекавалі іх як цэнтры гандлю і рамяства, гэта вам вядома з курса гісторыі VII класа. Такім чынам, вера гараджан у «добрага караля» зусім не наіўная.

З сялянамі больш складана. Як вядома, кароль усё-такі быў феадалам. Аднак у Францыі, напрыклад, ініцыятарамі адмены прыгоннага права былі іменна каралі. Людовік Святы вызваляў сялян цэлымі вёскамі. За што тыя плацілі яму шчырай любоўю. Калі пранеслася чутка, што ў крыжовым паходзе кароль трапіў у палон, усё сялянства Поўдня паднялося, каб ісці яму на дапамогу.

Акрамя таго, лічылася, што краіна і ўвесь народ (а не адны феадалы) уручаны каралю Богам, і гэта мела на ўвазе сур'ёзныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Застаючыся па сутнасці феадальнай, каралеўская ўлада ўзвышалася над карыслівымі класавымі інтарэсамі, забяспечваючы раўнавагу і стабільнасць усяго грамадства.

Што датычыцца царквы, то незалежна ад таго, ганім мы або апраўдваем гэту арганізацыю, уявіць сабе сярэдневякоўе без яе немагчыма. І для таго каб поўнасцю ўсвядоміць яе значэнне, пастараемся зразумець, чым з'яўлялася хрысціянства для таго часу.

Хрысціянства і яго роля

Нам, аддаленым ад сярэдневякоўя некалькімі стагоддзямі, цяжка зразумець, наколькі нястрымнай і страснай была вера ў Бога людзей той эпохі. Як і рыцарская ідэя, была яна выражэннем імкнення да «прыгожага жыцця». І вызначала ўсе бакі іх існавання, кожны іх крок ад нараджэння да магілы.

Свет ва ўяўленні чалавека сярэдневякоўя быў не чым іншым, як сцэнай, на якой разгортвалася барацьба паміж «Божым» і «чартоўскім» воінствамі. Барацьба

гэта адбывалася на трох узроўнях: 1) паміж анёламі і д'ябламі; 2) паміж добрымі хрысціянамі і язычнікамі; 3) і нарэшце, у душы кожнага чалавека, паколькі Бог даў свабоду выбару паміж дабром і злом.

Тыя сілы, якія мы называем звышнатуральнымі, былі для сярэдневяковага чалавека рэальнасцю. У любой радасці, у любым горы людзі бачылі іх умяшанне. Людзі розных саслоўяў маглі знаходзіцца ў такім душэўным стане, калі яны бачылі анёлаў, Дзеву Марыю, Хрыста і г. д. Зусім гэтак жа, хто лічыліся ведзьмамі і ведзьмакамі, часам без усякай пагрозы катаванняў прызнаваліся ў тым, што заключылі дагавор з д'яблам і апісвалі яго знешнасць. Гэта зразумела, чалавек «бачыў» тое, што гатовы быў убачыць. Тое, што яны ўяўлялі хрысціянскі свет у выглядзе горада, асаджанага ворагамі (іншаверцамі), з тайнымі ворагамі ўнутры яго (адступнікі), нараджала пастаяннае адчуванне небяспекі.

Усе важнейшыя падзеі эпохі трывала звязаны з хрысціянствам. «Гэтага хоча Бог!» — пад гэты адзінадушны крык быў абвешчаны першы крыжовы паход. «Язычнікі вінаватыя, а хрысціяне невінаватыя»,— кідае Раланд, рыхтуючыся да бітвы з арабамі. Можна колькі хочаш тлумачыць крыжовыя паходы эканамічнымі прычынамі, але зусім відавочна, што яны ніколі б не адбыліся, калі б не глыбокая рэлігійнасць большасці іх удзельнікаў. Каралі аддавалі гарады ў абмен на рэлігійныя святыні. Доблесныя рыцары ваявалі ў імя веры. Манахі-пустэльнікі катавалі сябе «ў славу Хрыстову». Сяляне паднімалі паўстанні, маючы намер ажыццявіць «царства Божае на зямлі». Знатныя дамы даглядалі хворых беднякоў, таму што жабракі — «заступнікі багатых і знатных перад Богам». І няважна, што многія запаведзі хрысціянства парушаліся, ад гэтага яны не пераставалі быць каштоўнасцямі. Колькі б злачынстваў ні зрабіў чалавек, думка аб непазбежнай кары атручвала яму жыццё, а магчымасць памерці без даравання грахоў была страшнейшай за саму смерць.

Разам з тым у сярэдневяковым хрысціянстве можна вылучыць тры ўзроўні:

1. Высокае (царкоўнае) хрысціянства. Менавіта царква вызначала твар усяго хрысціянства і яго асноўныя каштоўнасці (абавязковасць «сляпой веры», выратаванне душы як мэта жыцця, культ святых і г. д.).

2. «Рыцарскае» хрысціянства. Рыцарству ў хры-

сціянстве найбольш блізкі і зразумелы быў ваенны аспект. Словы Хрыста «Я прынёс вам не мір, але меч» яны разумелі літаральна, і ў гэтым у прынцыпе іх падтрымлівала царква, якая абвясціла абавязкам кожнага барацьбу за веру. Найбольш поўным супадзеннем рыцарскага і хрысціянскага ідэалаў былі ваенна-манаскія ордэны, якія ўзніклі ў час крыжовых паходаў.

Рыцарскі культ «прыгожай дамы» таксама меў у нейкай ступені выток у хрысціянстве, а менавіта ў пакланенні Дзеве Марыі. Так, у адной з легенд рыцар, заключаючы здзелку з д'яблам, адракаецца ад Бога, але наадрэз адмаўляецца адрачыся ад Божай мацеры. А ў другой — Дзева Марыя прыходзіць да аднаго знатнага юнака, цалуе яго і называе сваім рыцарам.

3. Простанароднае хрысціянства, якое змяшала ў сабе царкоўнае вучэнне, язычніцтва і прымхі. Ператварыўшы асноўныя язычніцкія святы ў хрысціянскія, царква не выкараніла язычніцтва. І многія хрысціянскія звычаі працягвалі ўспрымацца народам у катэгорыях варварскай магіі. Напрыклад: існавала павер'е, што, калі праходзіць богаслужэнне, час спыняецца і чалавек не старэе. У Паўднёвай Германіі бытаваў звычай, па якому, калі ў дзень святога Урбана псавалася надвор'е, яго вобразатвор кідалі ў гразь. Ва ўсім гэтым тыпова варварскія ўяўленні аб тым, што, выконваючы пэўныя абрады, людзі могуць уздзейнічаць на Бога, час і г. д. Звышнатуральныя сілы ў простанародным хрысціянстве паўстаюць у цялесным вобразе і вельмі падобныя на людзей. Так, Хрыстос тут можа моцна штурхнуць нагой нядбайнага манаха. А які-небудзь гараджанін або селянін абводзіць вакол пальца прыдуркаватага д'ябла.

Не заўсёды, аднак, такое разуменне рэлігіі было бяскрыўдным. Вера ў цудадзейныя ўласцівасці, напрыклад, прывяла да таго, што каля 1000 г. народ у гарадах Умбрыі (Італія) хацеў забіць пустэльніка святога Рамуальда, каб толькі не прапусціць выпадку завалодаць яго астанкамі.

Страшным вынікам забабонаў было таксама паляванне на ведзьмаў, якое актыўна вялося простанароддзем.

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што не толькі рэлігія ўплывала на грамадскае жыццё, але і жыццё аказвала адваротны ўплыў на ўспрыняцце рэ-

лігіі. Так, рыцары ўяўлялі замагільны свет у васальных катэгорыях (перад смерцю Раланд падымае да неба правую пальчатку, якую і прымае архангел. Такім чынам ён прысягае новаму сеньёру). А адна з сялянскіх рэлігійных сектаў тлумачыла легенду пра бунт Сатаны супраць Бога тым, што Сатана абяцаў анёлам, якія пайшлі за ім, знізіць аброкі і падаткі.

Усе важнейшыя моманты чалавечага жыцця (нараджэнне, шлюб, пасвячэнне ў рыцары, смерць) былі звязаны з хрысціянствам. І на ўсіх галінах чалавечай дзейнасці ляжаў яго адбітак. Хрысціянства было свайго роду воссю гэтай цывілізацыі.

Свет горада

Менавіта ў ім спелі сілы, якія загубілі сярэдневяковую цывілізацыю. У адрозненне ад горада антычнасці, які складаў адзінае цэлае з акругай, горад сярэдневякоўя замкнуты ў сабе. Яму аднолькава чужыя як свет вёскі, так і свет феадальнага замка. Ён жыве сваім, непадобным жыццём. Горад самакіруецца, ён ашчаніўся крапаснымі сценамі, якія аддзяляюць яго ад феадальна-сялянскага свету. Па сутнасці, горад — гэта дзяржава ў мініяцюры. Ён змяшаў у сабе прадстаўнікоў усіх саслоўяў.

Большая частка яго насельніцтва — рамеснікі, патомкі сялян. Жывуць у ім таксама прадстаўнікі знаці і духавенства. Аднак у горадзе яны набываюць новую якасць — яны гараджане. Вядома, і ўнутры горада ідзе вострая барацьба: знаць супраць купецтва, багатыя супраць бедных. Аднак варта ўзнікнуць знешняй небяспецы, усе імгненна аб'ядноўваюцца і выступаюць адзіным фронтам. «Выпадзенне» гарадоў з сярэдневяковага грамадства вызначалася перш за ўсё тым, што яны ўзніклі як цэнтры гандлю і рамяства. Гэта вызначыла асобыя ўмовы жыцця ў іх і фарміраванне новых каштоўнасцей.

Свабода і раўнапраўе — менавіта «свету гарадоў» абавязана імі Еўропа. Уяўленне аб іх адкоўвалася ў многавяковай барацьбе за самакіраванне — камуны. Менавіта тут вытокі парламенцкага кіравання будучага.

Сярэдневякоўю ўласціва аб'яднанне людзей у розныя карпарацыі (манаскія і рыцарскія ордэны, сялянскія абшчыны, тайныя таварыствы і г. д.). Гэта натуральна, паколькі процістаяць небяспекам гэтага свету ў адзіночку было амаль немагчыма. У горадзе ролю та-

кіх карпарацый перш за ўсё адыгрывалі цэхі (аб'яднанні рамеснікаў па прафесіях). У VII класе вы вывучалі іх перш за ўсё як арганізацыі, якія рэгулююць працэс вытворчасці, караюць за недабраякасную прадукцыю і абараняюць сваіх членаў ад замаху феадалаў. Усё гэта так, аднак роля цэхаў значна шырэйшая. Таксама як і рыцарскія ордэны, цэх паходзіць ад ваенных саюзаў старажытных германцаў. У ранняе сярэдневякоўе члены цэха былі звязаны сумесным удзелам у рэлігійна-магічных абрадах і называлі адзін аднаго братамі (успомніце звычаі варварскай дружыны).

Цэхавыя ўлажэнні рэгламентавалі ўсе бакі жыцця, да найменшых падрабязнасцей. Акрамя пытанняў вытворчасці, сюды ўваходзілі: указанні аб парадку хрышчэння, правядзення вяселляў, відах адзення, клопаце аб жабраках і нават пералік забароненых лаянак з абазначэннем памераў штрафу за кожную з іх.

Менавіта ў цэхавым асяроддзі выпрацоўваюцца прынцыпова *новыя адносіны да працы*. Рамеснік знаходзіць у працы не толькі сродак існавання, але і задавальненне. Стваральчы яркі непаўторны выраб, майстар адначасова сцвярджаўся ў думцы аб уласнай значнасці і непаўторнасці. У гарадах, такім чынам, нараджаецца незвычайная для сярэдневякоўя думка, што чалавек не толькі частка нейкага супольніцтва, але і *індывідуальнасць*, каштоўная не знатнасцю або святасцю, а сваім талентам, які праяўляецца ў паўсядзённай працы. Нарэшце, узнікае прынцыпова новае ўяўленне аб працы як аб заслузе перад Богам.

Не ўпісвалася ў хрысціянскую схему і праца купцоў. Яны ж *працавалі ў імя багацця*, у той час як Хрыстос заклікаў не збіраць ні серабра, ні золата, але клапаціцца аб душы.

Большая частка насельніцтва горада, такім чынам, жыве актыўным жыццём. У сувязі з гэтым радыкальна мяняецца ўяўленне аб часе. Гараджане, у адрозненне ад сялян, усведамляюць, што ён рухаецца не па крузе, а па прамой і пры гэтым даволі хутка. Менавіта тут і нараджаецца славуты прынцып: час — грошы.

Горад, паўтараем, супрацьстаіць у сярэдневяковым грамадстве ўсім. Феадалам, якія імкнуцца пажывіцца за яго кошт. Царкве, калі яна ўмешваецца ў яго ўнутраныя справы. Ён вырас з вёскі, але і з сялянамі ў яго склаліся складаныя адносіны. З аднаго боку, гарады часта выступаюць у адносінах да іх як вызваліцелі. Балон-

ня (Італія) у 1257 г. выкупіла ў сеньёраў 6000 сялян. Паветра горада «робіць чалавека свабодным». З другога боку, сяляне з іх забітасцю і кансерватызмам чужыя гараджанам. Гарады самі эксплуатуюць вёскі, якія ім належаць. Гарадскія рамеснікі змагаюцца супраць сялянскіх. А калі сяляне бягуць у горад, каб стаць свабоднымі, іх нярэдка сустракаюць так: «Гультаі! Выбірайцеся араць!»

Сярэдневякоўе, у сваю чаргу, у многім прымае свет гарадоў з цяжкасцю. Гандаль мае ў сабе штосьці агіднае, ганебнае, бруднае, сцвярджае Фама Аквінскі (адзін з «бацькоў царквы»). Ды і наогул, большасць рамеснікаў і купцоў, па царкоўнаму вучэнню, трапяць у пекла, іх праца непажаданая Богу. Прадстаўнікі знаці заяўляюць: «На гэтым свеце ёсць тры роды крыкуноў, якіх цяжка прымусіць маўчаць: камуна мужыкоў, якія ўявілі сябе сеньёрамі, жанчыны, якія спрачаюцца, і статак рохкаючых свіней. Мы смяёмся з другіх, пагарджаем трэцімі, але хай пазбавіць нас Гасподзь ад першых».

Зразумела, усё гэта не значыць, што горад быў свабодным ад ідэй і традыцый сярэдневякоўя. У цэнтры яго звычайна гатычны сабор, які сімвалізуе непахіснасць царквы і стварае ілюзію блізкасці да Бога. Гарадскія калодзежы ўпрыгожваліся статуяй Раланда (уплыў рыцарскай ідэі). Ды і багатыя гараджане імкнуліся браць прыклад з жыцця феадалаў. Гарады знаходзіліся пад пільным наглядам каралеўскай улады і царквы...

І ўсё ж свабодны гараджанін сярэдневяковай Еўропы, які ўсвядоміў сваю індывідуальнасць, з'яўляўся носьбітам іншых каштоўнасцей. Прадвеснікам новага свету.

Пытанні і заданні

1. «Не страшнае мне адлучэнне (ад царквы.— *Аўт.*), мяне выратуе праца». Хто ў сярэдневяковым грамадстве мог сказаць такія словы? І ў выніку чаго ўзнікла такое ўяўленне?

2. Адзін з рыцараў, удзельнікаў першага крыжовага паходу, прысутнічаючы на прыёме ў імператара Візантыі, быў абураны тым, што «адзін чалавек можа сядзець, тады як такія слаўныя воіны абавязаны стаяць». Каб выразіць свой пратэст, ён выбраў момант, калі імператар устаў, і ўсеўся на яго трон. З гэтага прыкладу зрабіце вывад аб характары адносін паміж каралямі і рыцарствам на Захадзе.

3. Ці можна сказаць, што ўстанаўленне хрысціянства было прагрэсіўнай з'явай? Чаму?

4. Па якіх прычынах нідзе, акрамя гарадоў, у сярэдневякоўі не магла ўзнікнуць новая сістэма каштоўнасцей?

5. З чым звязана з'яўленне механічных гадзіннікаў на гарадскіх ратушах?

6. Ці маглі пры феадалізме існаваць дэмакратычныя формы кіравання? Чаму?

7. Валоданне ўладай у сярэдневякоўі абавязкова спалучалася з валоданнем уласнасцю. Якая прычына гэтага?

8. Нярэдка царква выступала супраць ліхвяроў і самавольства феадалаў над сялянамі. Ці можна сказаць, што яна рабіла гэта, зыходзячы з інтарэсаў немаёмных?

9. У адной з легенд селянін, які спрабуе пасля смерці пранікнуць у царства нябеснае, сустракае процідзеянне святых, якія заявілі, што ў раі не месца мужыкам. Ідэалогію якога саслоўя адлюстроўвае легенда?

10. «Хоць я не выбран каралём,
А прынцам быць я не вазьмуся.
З паслушэнствам — нізкім злом
Не прымірыся нізашто.
На полі бітвы быць арлом —
Вось чым дагэтуль ганаруся!
Арол не можа стаць рабом,
Быць незалежным я бяруся...»

Перад вамі дэвіз аднаго з феадальных родаў.

Якія характэрныя рысы сярэдневяковага грамадства ў ім адлюстраваны?

11. Чым (на вашу думку) былі выкліканы масавыя страхі (фобіі) у сярэдневякоўі (паляванне на ведзьмаў, чаканне блізкага «канца свету» і г. д.).

§ 13. ПЕРАХОД ДА ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Еўрапейская цывілізацыя адыграла унікальную ролю ў гісторыі чалавецтва. Перш за ўсё менавіта яна праз пранікненне ў іншыя раёны зямлі звязала адвечна розныя рэгіёны, якія знаходзяцца далёка адзін ад аднаго, у адзінае цэлае. Многія дасягненні еўрапейскай цывілізацыі набылі значэнне агульначалавечых каштоўнасцей.

Звернемся да некаторых рыс еўрапейскай цывілізацыі ў перыяд пераходу да індустрыяльнай фазы развіцця.

Перадумовы паскарэння грамадскага прагрэсу

Як вам вядома, тэхніка ў розныя часы развівалася з рознай ступенню хуткасці.

Канец сярэдневякоўя азначаўся ўступленнем чалавецтва ў новую эру навуковага і тэхнічнага развіцця. Гэта быў час вялікіх геаграфічных адкрыццяў, час адраджэння гуманістыч-

ных ідэалах антычнасці ў навуцы. Але адначасова гэта быў перыяд першапачатковага накаплення капіталу, якое ажыццяўлялася самымі крывавымі і брудныміметадамі.

Сярод важнейшых тэхнічных вынаходстваў, якія падрыхтавалі істотныя змяненні ў грамадскім укладзе Еўропы, а затым і за яе межамі, трэба назваць компас, порах, кнігадрукаванне, аўтаматычны гадзіннік.

Уласна, компас вядомы кітайцам з III ст., але з XIV ст. ён стаў важнейшым навігацыйным прыборам еўрапейцаў. Абсталяванне ім караблёў дазволіла зрабіць вялікія адкрыцці невядомых раней краін, пашырыць прастору, на якой праходзіла ад гэтага часу сусветная гісторыя.

Гадзіннік таксама быў вядомы людзям даўно. Вадзяны гадзіннік быў цудам VIII ст., у XIII—XIV стст. вежы многіх еўрапейскіх гарадоў упрыгожылі гадзіннікі з боем. Настольны гадзіннік паявіўся ў XV ст., а кішэнны яшчэ пазней. Гадзіннік становіцца прыметай новага часу. Цаніць час людзі навучыліся ў сувязі са змяненнем рытму вытворчай і бытавой дзейнасці. Асабліва ж важнае значэнне выкарыстанне механічнага гадзінніка набыло ў сувязі з развіццём мануфактурнай вытворчасці, дзе патрабавалася вымяраць працягласць асобных тэхналагічных працэсаў. Разам з тым магчымасць дакладнага вымярэння часу зрабіла вялікі ўплыў на развіццё навуковых доследаў і назіранняў.

Няма неабходнасці падрабязна гаварыць аб тым, што вынаходства кнігадрукавання, якое стала ў Еўропе рэгулярным з сярэдзіны XV ст., садзейнічала хуткаму распаўсюджванню ведаў і канчатковаму выкараненню манаполіі царквы на кніжную справу.

Выкарыстанне пораху (таксама адкрытага першапачаткова ў Кітаі ў VIII—IX стст.) не толькі дало магчымасць паспяхова змагацца супраць абарончых збудаванняў і даспехаў рыцараў, але і аблегчыла завяванне іншых краін і народаў.

XV стагоддзе стала паваротным у гісторыі. Менавіта ў гэтым стагоддзі пачала ўсталёўвацца гегемонія Еўропы ў свеце. Пачатак гэтаму быў пакладзены іспанцамі ў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы і Мексіцы. А ў XVII ст. партугальцы заснавалі першыя калоніі ў Афрыцы. Затым у каланіяльныя войны ўключыліся маракі і купцы Галандыі, Англіі, Францыі. Каланіяльныя захопы спалучалі ў сабе ваенны грабеж і гандаль,

часта вельмі несправядлівы, але выгадны для еўрапейцаў. «Адкрыццё залатых і сярэбраных прыіскаў у Амерыцы, выкараненне, заняволенне і пахаванне зажыва туземнага насельніцтва ў рудніках, першыя крокі па заваяванню і разграбленню Ост-Індыі, ператварэнне Афрыкі ў запаведнае поле палявання на чарнаскурых — такая ранішняя зорка капіталістычнай эры вытворчасці: (Маркс К., Энгельс Ф. Творы. Т. 23. С. 760).

Не больш высакароднымі былі спосабы першапачатковага накаплення ў метраполіях. У класічнай форме гэты працэс праходзіў у Англіі з апошняй трэці XV да канца XVIII ст. Вам вядома з курса гісторыі, што развіццё мануфактур у вытворчасці шарсцяных тканін зрабіла выгаднай авечкагадоўлю. Таму феадалы сталі пашыраць пашы, захопліваць абшчынныя землі, зганяючы з іх сялян. Дзяржава прыняла законы аб абгароджванні абшчынных зямель. У ходзе царкоўнай рэфармацыі ў беззямельных пралетарыяў ператвараліся сяляне, якія апрацоўвалі манастырскія землі. Услед за гэтым разрабаванню падвергліся дзяржаўныя землі. Яны аддаваліся ў дар, прадаваліся за бясцэнак, далучаліся да прыватных уладанняў. Даведзеныя да галечы людзі жабравалі, бадзяліся. У іх лёс, выдаючы закон за законам супраць бадзяг, умешвалася дзяржаўная ўлада. Заканадаўчым шляхам, пры дапамозе бязлітаснага насілля, масы даведзеных да галечы дробных вытворцаў былі сагнаны пры дапамозе вісельняў, ганебных слупоў і бізуноў на вузкую дарогу, якая вядзе да рынку працы.

Зараджэнне капіталу

Слова «капітал» паходзіць з позняй латыні, яно з'явілася каля XII—XIII стст. і азначала каштоўнасці, запас тавараў, масу грошай або грошы, якія прыносяць працэнт. Першапачаткова тэрмін гэты звязваўся толькі з грошамі. Менавіта яны давалі магчымасць набыць любы іншы тавар. Грошы, якія пускаліся ў гандлёвыя абароты, здавалася, самі сабой прыносілі даход. Купцы імкнуліся нажывацца на розніцы ў цэнах тавараў на розных рынках. Ліхвяры давалі грошы ў доўг пад працэнты. І ў тым і ў іншым выпадках грошы як бы выступалі крыніцай уласнага прырашчэння. Але гэтыя змяненні адбываліся з грошамі толькі ў сферы абарачэння. А для пранікнення капіталу ў вытворчасць патрэбны былі пэўныя грамадскія адносіны. Трэба было, каб уладальнік грошай мог знайсці на рынку такі тавар,

які, будучы ўкладзеным у вытворчасць іншых тавараў, даваў прыбытак устойліва і пастаянна. І такі тавар знайшоўся. Ім аказалася рабочая сіла — здольнасць чалавека сваёй працай ствараць тавары, якія маюць большую вартасць, чым вартасць самой рабочай сілы.

Ператварэнне рабочай сілы ў тавар стала магчымым у сувязі з першапачатковым накапленнем. Яно было падрыхтавана вызваленнем людзей працы ад прыгоннай залежнасці і «вызваленнем» іх ад уласнасці на сродкі вытворчасці.

Такім чынам, у корані змяніўся спосаб злучэння працаўніка са сродкамі вытворчасці. На месца пазаэканамічнага прымушэння да працы прыйшло іншае: фармальна раўнапраўны дагавор, у якім удзельнічаюць двое. Адзін з іх — прадпрымальнік, уладальнік сродкаў вытворчасці, другі — уласнік рабочай сілы. Аднак другі пры знешняй роўнасці становішча бакоў, якія дагаварыліся, не свабодны ў выбары ўмоў дагавора. Адносіны паміж працаўніком і ўласнікам сродкаў вытворчасці канчаткова набылі эканамічны характар, гэта не магло не адбіцца на іншых баках жыцця грамадства.

Новыя каштоўнасці новай цывілізацыі

Адным з ключавых момантаў еўрапейскай гісторыі, унікальным перыядам ломкі існаваўшых прасторавых і часавых меж была эпоха Адраджэння. Яна супала з адкрыццём Новага Свету і з паўторным адкрыццём антычнага свету.

Гістарычныя зрухі, пароджаныя развіццём капіталістычнага ўкладу, аслаблялі тыя каштоўнасці, якімі чалавек сярэдневякоўя быў «прыкаваны» да свайго саслоўя і той сацыяльнай ролі, якая не магла, здавалася б, змяніцца ні пры якіх акалічнасцях. Асабліва прыметныя змяненні былі ў гарадах, дзе імкліва набывалася вялікае багацце, што адразу мяняла сацыяльны статус сям'і, і нярэдкія былі страты капіталу аж да поўнага разарэння.

Сярэдневякоўе зжывала сябе. Усё большае значэнне атрымлівалі гарады і гарадскія рамесныя сувязі, якія паступова адыходзілі ад феадалізму і нацэльваліся на прыватнае прадпрымальніцтва, на выкарыстанне работніка з пункту гледжання эксплуатацыі яго рабочай сілы. Менавіта ў дэмакратычным асяроддзі гарадоў, дзе бурна ішло гаспадарчае і палітычнае жыццё, фарміраваліся новыя ўяўленні аб годнасці асобы. Чалавек разглядаўся не як носьбіт усялякіх заган, абавязаны

прысвяціць сваё жыццё выкупленню «першароднага грэху», а як свабодная асоба, якая валодае «натуральным» правам на шчасце. Не аскетычнае адмаўленне ад зямных радасцей, а паўнакроўнае, насычанае духоўнымі і цялеснымі ўцехамі жыццё разглядалася як вартае чалавека.

Носьбітамі новых ідэй з'яўляліся служачыя ў розных гандлёвых і прамысловых фірмах, чыноўнікі дзяржаўных і гарадскіх органаў кіравання, настаўнікі, урачы, юрысты, мастакі, скульптары, паэты і інш. Менавіта дзякуючы пастаяннаму і арганічнаму ўзаемадзеянню новых ідэалаў і каштоўнасцей эпоха Адраджэння змагла вылучыць тытанаў мыслі і стварыць вечныя духоўныя каштоўнасці.

Хто не ведае імён выдатных дзеячаў Адраджэння? Вы чыталі аб іх не толькі ў падручніках гісторыі, але і ў іншых кнігах. Але аб другім баку жыцця грамадства эпохі Адраджэння гаворыцца некалькі менш. Неад'емнай часткай жыцця і быту адраджэнскага грамадства з нізу да верху былі астралогія і магічныя дзеянні. І гэта зусім не вынік неадукаванасці, але хутчэй праяўленне прагі авалодаць таямнічымі сіламі прыроды. У эпоху Адраджэння гадалі на трупах, выклікалі дэманаў, рабілі магічныя аперацыі пры закладцы будынкаў, закопвалі ў зямлю аслоў для выклікання дажджу ў засуху, верылі ў прывіды, у паганае вока, займаліся хірамантыяй і да т. п.

Яшчэ адным праяўленнем захапленняў і пачуццяў чалавека быў авантурызм і схільнасць да прыгод. Так, герой адной з паэм Нястрымны Арланда (XV ст.), які стараецца дапамагаць бедным і пакутнікам, мае высокія і глыбокія чалавечыя мэты, у сваіх падарожжах сустракаецца з рознымі цудамі, бязмежнай любоўю аж да страты розуму, падарожжам гэтага розуму на Месяц і да т. п. У паэме фігуруюць любоўныя напіткі, чарадзейны пярсцёнак, выступаюць гаворачыя дрэвы, скалы і г. д. І ўсе гэтыя атрыбуты ўспрымаліся як зусім рэальныя.

Атэізм не быў характэрным для людзей эпохі Адраджэння, а вось антыцаркоўная накіраванасць поглядаў характэрна менавіта для гэтай эпохі.

У жыцці грамадства, якое выходзіла з сярэдневякоўя, нярэдка суседнічалі гуманізм і разгул захапленняў, свавольства і жорсткасці. Славуты Ларэнца Медычы (1449—1492) — найвялікшы апякун мастацтваў

і навук — адбіраў пасаг у дзяўчат, караў і вешаў, зусім не грэбаваў інтрыгамі, звязанымі з атрутай і кінжалам. Цэзар Борджыя (1475—1507), што быў для вядомага мысліцеля Макіявелі (1469—1527) узорам ідэальнага гасудара, які валодаў палітычным дарам, паслядоўнасцю і энергіяй, бязлітаснасцю і самавалоданнем, апекаваўся ў свой час над Леанарда да Вінчы (1452—1519), забіў уласнага брата, атруціў кузена, былі на яго сумленні і іншыя смерці.

Самі тытаны Адраджэння былі далёка не ідэальнымі з пункту погляду цяперашніх нораваў: яны сварыліся і біліся на дуэлях, сапернічалі адзін з адным, палеміка іх была перасыпана неверагоднымі абразамі і абвінавачаннямі.

Напомнім яшчэ адзін факт, які рэдка звязваецца ў нашай свядомасці з Рэнесансам. Інквізіцыя афіцыяльна ўзнікла ў Іспаніі ў 1480 г., у Італіі — у 1542 г. Падлічана, што за 150 гадоў да 1598 г. у Іспаніі, Германіі, Італіі было спалена 30 000 ведзьмаў.

Злачынствы і заганы былі ва ўсе эпохі чалавечай гісторыі. Былі яны і ў сярэднія стагоддзі, калі людзі грашылі і каяліся ў сваіх грахах. У эпоху Адраджэння людзі, учыняючы самыя дзікія злачынствы, не каяліся і рабілі так таму, што суддзю яны бачылі не ў Богу, а ў думцы іншых людзей. Нараджалася іншая этыка, якая не прызнавала страх перад Богам, этыка зусім свецкая.

Прыклад такога роду ўяўляюць сабой трактаты Леона Батыста Альберці (1404—1472). Вядомы біёграф дзеячаў Адраджэння Дж. Вазары піша аб ім: «Быў Леон Батыста чалавекам нораву далікатнага і пахвальнага, другам людзей дабрадзейных, прыветлівым і ўважлівым з усімі без выключэння; і пражыў ён сваё жыццё дастойна і як належыць высакароднаму чалавеку... дасягнуўшы вельмі сталага ўзросту, ён, задаволены і спакойны, пайшоў у лепшае жыццё, пакінуўшы па сабе паважаную славу». У сваіх трактатах Альберці апявае гаспадарчасць, якая разумеецца шырока, як распараджэнне ўласнай душой, целам і часам. Цела павінна быць здаровым, моцным і прыгожым (гэта ўжо далёка ад ідэалаў сярэдневякоўя). Належыць валодаць сваімі пачуццямі, не парушаць душэўнага спакою зайздрасцю, захоўваць вясёлы настрой. Час неабходна разумна размяркоўваць, напаўняючы яго працай. Праца не павінна выклікаць пачуццё цяжару і быць знясіль-

ваючай: тут трэба, як і ва ўсім, ведаць меру. У доме павінна быць усё не раскошным, але зручным, простым і самай лепшай якасці, паколькі добрыя рэчы больш трывалыя і радуюць вока. Натуральным імкненнем чалавека з'яўляецца памнажаць багацце, прычым не толькі працай, але і беражлівасцю. Расходы можна падзяліць на неабходныя і неабавязковыя. Сярод апошніх вылучае дапушчальныя і безразважныя. Да неабходных расходаў адносяцца ўтрыманне дома, памесця, вядзенне «справы», словам, усё, што мае мэтай забяспечыць сям'і камфорт і дастойнае становішча ў грамадстве. Шчодрасць дапушчальная там, дзе ад гэтага залежыць гонар сям'і, айчыны.

Дапушчальныя расходы на куплю серабра, раскошных дываноў, коней, кніг, вопраткі. Гэтыя расходы лепш адкладваць, каб або адмовіцца ад іх канчаткова, або добра абдумаць пакупку: расходаў тады будзе менш, а задавальнення больш. Да безразважных расходаў ён адносіць утрыманне натоўпу гультаёў-нахлебнікаў, паразітаў-лісліўцаў. Беражлівасць разглядаецца Альберці як гарантыя незалежнасці. Трэба трымацца залатой сярэдзіны паміж скупасцю і кіданнем грошай на вецер. Такая залатая сярэдзіна — умеранасць. Грошы лепш закладваць у маёнткі, у іншую справу, але пазбягаць даваць у доўг. Зусім несярэдневяковай рысай з'яўляецца вера ў чалавека, яго незвычайныя магчымасці. У чалавеку ёсць нешта ад смяротнага Бога. Актыўнасць, для якой народжан чалавек, патэнцыяльна бязмежная. Але каб рэалізаваць свае магчымасці, трэба быць гаспадаром усяго і накіроўваць на сваю карысць. Актыўнасць пазбаўлена рэлігійных матываў. Чалавек хутчэй павінен разлічваць на ўзнагароду і дабрадзейнае жыццё на зямлі ў выглядзе дастатку, любві, павагі навакольных людзей. Альберці перасцерагае ад бяздзейнасці, карысталюбства, нахабнасці і сварлівасці.

Фарміраванне новых каштоўнасцей звязана і з шырокім, складаным па саставу ўдзельнікаў сацыяльна-палітычным і ідэалагічным рухам супраць каталіцкай царквы — Рэфармацыяй, якая ахапіла Заходнюю і Цэнтральную Еўропу ў XVI ст. Ідэолагі Рэфармацыі настойвалі на тым, што чалавек для выратавання сваёй душы не мае патрэбы ў пасрэдніцтве царквы, а выратаванне дасягаецца толькі ўнутранай верай кожнага. У выніку Рэфармацыі каталіцкая царква страціла

сваё манапольнае становішча ў радзе краін, аказалася ў большай залежнасці ад дзяржаўнай улады. Духоўная дыктатура была зламана.

Маральныя ідэалы Адраджэння развіваліся, відазмяняліся ў «свецкай этыцы» пурытан (ад лац. puris — чыстата). Характэрнымі яе рысамі былі ашчаднасць, працавітасць, пакланенне багаццю, пагарда да бедных, скнарлівасць. Пурытане адрозніваліся бясстрашшам, упартасцю ў дасягненні мэт, рэлігійным фанатызмам і перакананасцю ў сваёй бязгрэшнасці і выбранасці ў радзе іншых людзей. Вядомы вам вучоны М. Вебер лічыў, што пурытанская этыка адыграла немалую ролю ў станаўленні «духу капіталізму», этыкі будучага грамадства.

Зараджэнне парламентарызму

Канец сярэдневякоўя азнаменаваўся істотнымі зменнямі ў сацыяльна-палітычнай структуры еўрапейскіх краін. Вучоныя сярод гэтых змяненняў вылучаюць падзел улады царкоўнай і свецкай; увядзенне прамога прадстаўніцтва, дзякуючы якому падданыя атрымалі магчымасць стаць грамадзянамі; рост значэння права як інструмента дзяржаўнай улады; упарадкаванне ўмяшання дзяржавы ў сацыяльныя і эканамічныя адносіны. Найбольш ярка пералічаныя павевы праявіліся ў парламентарызме. Парламентарызм уяўляў сабой такую сістэму кіравання, для якой характэрна наяўнасць прадстаўнічага органа — парламента, што ажыццяўляе заканадаўчую ўладу і вызначае большасць напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі ўрада. Парламентарызм мае на ўвазе прынцып адказнасці ўрада перад парламентарыямі, якія маюць права вынясення вотуму недавер'я ўраду. Парламент узнік першапачаткова ў Англіі ў XIII ст., аднак яго структура і функцыі канчаткова склаліся значна пазней. Структура (дзве палаты: палата лордаў — спадчынных прадстаўнікоў знаці і палата абшчын, у якой былі прадстаўнікі рыцарства і гараджан) мала змянілася на працягу вякоў. Парадак разгляду пытанняў і паўнамоцтвы парламента выпрацоўваліся на працягу XIII—XIV стст. У XIV ст. англійскі парламент меў у сваім распараджэнні заканадаўчую ініцыятыву — парламенцкія законы (статуты) прымаліся па петыцыях палаты абшчын з зацвярджаннем палатай лордаў і каралём. Свае правы парламент адваяваў у кароля ў ходзе працяглых спрэчак і канфліктаў. У XIV ст. кароль Эдуард II зрабіў спробу

абысці парламент і звярнуўся да выдання ўказаў, якія мелі сілу закона. Аднак парламент змог дамагчыся таго, каб каралеўскія ўказы не маглі мець іншай задачы, акрамя прывядзення ў выкананне дзеючых законаў. Гэта барацьба працягвалася ў наступныя стагоддзі. Па білю аб правах (1689) кароль не быў пазбаўлены права прыпыняць выкананне законаў без згоды парламента; а парламент атрымаў права санкцыі ўсіх налогаў, права на петыцыі, свабоду выбараў, дэбатаў у парламенце. Законы Англіі забяспечваюць з XVIII ст. незалежнасць дэпутатаў парламента ад каралеўскай улады. З XIX ст. Англія стала класічнай краінай парламентарызму з двухпартыйнай сістэмай.

«Стагоддзе вар'яцкае і мудрае»

Важнай вяхой на шляху да сучаснай цывілізацыі стала стагоддзе XVIII, вобразная характарыстыка якога з верша А. Радзішчава вынесена ў падзагаловак. Паступова складвалася раздзяленне эканамічнай і палітычнай улады на аснове фарміравання прававой дзяржавы і прававога стану грамадства, без чаго далейшае развіццё адносін свабоднага абмену было немагчымым, а канстытуіраванне трэцяга саслоўя ўскладнена. З курса гісторыі вы ведаеце, што XVIII стагоддзе азнаменавалася ўсталяваннем у краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі капіталістычнага спосабу вытворчасці, перамогай вялікай буржуазнай рэвалюцыі ў Францыі пад лозунгам свабоды, роўнасці і братэрства. Канчатковым усталяваннем буржуазных адносін завяршылася грамадзянская вайна ў ЗША.

Дзве вялікія буржуазныя рэвалюцыі далі дзве розныя мадэлі ўзаемаадносін дзяржавы і грамадзянскага грамадства. У Францыі рэвалюцыя дала імпульс завявання рэвалюцыйнай дзяржавай больш адсталага і коснага грамадзянскага грамадства і панавання над ім. Амерыканская ж рэвалюцыя вылучыла ідэю паслядоўнага вызвалення грамадзянскага грамадства з-пад апекі дзяржавы.

Істотныя змяненні адбыліся ў характары ўзаемадзеяння чалавека з прыродай. Гаспадарчая дзейнасць усё больш згубна адбівалася на стане прыроднага асяроддзя. Рост колькасці гарадскіх жыхароў прыметна апярэджваў рост агульнай колькасці насельніцтва. Усё больш станавілася ў свеце буйных гарадоў, цэнтраў ажыўленага эканамічнага жыцця.

У развіцці грамадства ўсё больш відавочна праяў-

ляліся такія фактары, як хуткая змена тэхнічных дасягненняў і тэхналогій, эканамічная канкурэнцыя, адчужэнне чалавека ад вынікаў сваёй працы, барацьба працоўных за свае эканамічныя правы. Прафесіянальны рух пралетарыяту, які зараджаўся, пачынае аказваць уплыў на палітыку дзяржавы, а ў далейшым садзейнічае ператварэнню яго ў інструмент узгаднення інтарэсаў грамадзян.

Адлегласць як бы «сціскаецца». Самыя далёкія краі дасягальныя пры дапамозе паравога транспарту. Шырокае распаўсюджанне газет аблягчае абмен інфармацыяй, доступ да навін і ведаў.

Жаданне з дапамогай рэлігіі здабыць свет, спакой і бессмяротнасць душы суседнічала з лютым атэізмам і выкрыццём царкоўнікаў. Новым «ідалам» станавіліся грошы, багацце, капітал, пакланенне якому рабілася сэнсам жыцця. Імкненне да прыгожага спалучалася з пашырэннем поля дзейнасці мастацтва, выхадам яго на масавую арбіту.

У другой трэці стагоддзя пачалося фарміраванне буйной машыннай вытворчасці. Індустрыяльная цывілізацыя наступала, несучы з сабой адчуванне велізарных магчымасцей чалавека, бурных змяненняў усяго навакольнага свету, сапраўды рэвалюцыйных зрухаў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Еўрапейская цывілізацыя з усёй сваёй відавочнасцю выступала як найбольш развітая, элементы якой пачалі капіраваць ва ўсім свеце.

Войны, саперніцтва з-за ўплыву ў свеце станавіліся ўсё больш жорсткімі і разбуральнымі, а імкненне чалавека да шчасця ўсё больш моцным, хоць нярэдка і прывідным. Цяжка не згадзіцца з Ф. Энгельсам, які пісаў аб прамысловым перавароце, як аб «...рэвалюцыі, якая адначасова зрабіла поўны пераварот у грамадскім грамадстве і сусветна-гістарычнае значэнне якой пачынаюць усведамляць сабе толькі ў цяперашні час» (Творы. Т. 2. С. 243).

Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце асноўныя перадумовы пераходу да індустрыяльнай цывілізацыі.

2. Як змяніўся спосаб злучэння працаўніка са сродкамі вытворчасці пры пераходзе да індустрыяльнай цывілізацыі?

3. Якія новыя ідэалы і каштоўнасці складваліся ў эпоху Адраджэння?

4. У чым сутнасць парламентарызму?

5. Якія змяненні ў жыцці людзей характарызавалі пераход да новай цывілізацыі?

6. Зрабіце ўсе магчымыя вывады з аналізу наступнага дакумента: «Агароджвальнік — крыважэрны воўк з двума д'ябальскімі іклямі, з якіх адзін — грошы... а другі — нячыстае сумленне, якое не баіцца плысці па моры крыві проста ў пекла» (з пропаведзі XVII ст.).

7. У якім выказванні паняцце «капітал» ужываецца ў навуковым палітэканамічным сэнсе? Адказ абгрунтуйце.

а) «Я маёнткаў не купляю: капіталаў няма» (Тургенеў І. С. Вясеннія воды);

б) капітал — гэта пэўныя грамадскія адносіны, аснову якіх складае эксплуатацыя наёмных рабочых;

в) «Чычыкаў пазбегнуў крымінальнага суда. Але ні капіталу, ні розных замежных рэчаў не засталося яму» (Гогаль М. Мёртвыя душы).

8. Ніжэй прыводзяцца афарызмы Б. Франкліна (1706—1790), якога называлі вынаходнікам маланкаадвода, рэспублікі і «газетнай вуткі», выдатнага асветніка і палітычнага дзеяча ЗША. Параўнайце дабрачыннасці, якім ён пакланяўся, з уяўленнямі Л. Б. Альберці. Якія змяненні можна адзначыць на аснове супастаўлення:

«Дзе кухня сытая, там завяшчанне беднае»; «Лепш спаць без вячэры, чым устаць з даўгамі»; «Хто купляе непатрэбнае, хутка прадасць неабходнае»; «Помніце, што час — гэта грошы»?

9. Адзін з твораў Б. Франкліна «Шлях да багацця» быў надрукаваны ва ўсіх газетах ЗША, 70 выданняў выйшла на англійскай мове, 50 — на французскай, 11 — на нямецкай, 9 — на італьянскай. Акрамя таго, ён быў перакладзены на іспанскую, каталонскую, дацкую, шведскую, уэльскую, польскую, рускую, чэшскую, галандскую, кітайскую, навагрэчаскую мовы. Ён друкаваўся каля 400 разоў. Чым можна растлумачыць такую папулярнасць твора? Зрабіце не менш за тры вывады.

10. Якія вывады можна зрабіць з наступных фактаў: на працягу XVI ст. у Еўропе налічвалася толькі 25 гадоў, калі не вяліся буйныя ваенныя дзеянні; у XVII ст. было 7 мірных гадоў; у XVIII ст. два з кожных трох знаменаваліся буйнымі войнамі?

Чым можна растлумачыць такія суадносіны мірных гадоў і гадоў вайны?

11. Нярэдка парламент называюць сходам прадстаўнікоў народа. Ці згодны вы з такой фармулёўкай? Сваю думку аргументуйце. Дадатковая інфармацыя аб адрозненні паміж паняццямі «прадстаўнік» і «дэлегат»: прадстаўнік не абавязан падпарадкоўвацца той праграме, якая яму можа быць навязана выбраўшымі яго асобамі. Дэлегат — наадварот, звязан паўнамоцтвамі, якія прадастаўлены яму давернікамі.

12. У адным з фларэнтыйскіх статусаў XV ст. сказана: «Свабода ёсць неад'емнае права не залежаць ад волі іншай асобы, і неабходна, каб рэспубліка не толькі падтрымлівала гэта права, але і павялічвала яго на сваёй тэрыторыі». Ці можна такое выказванне аднесці да антычных рэспублік? Свой адказ аргументуйце.

13. Ці згодны вы з наступным выказваннем: «Напярэдадні найвялікшай у гісторыі індустрыяльнай рэвалюцыі не было ні прымет, ні прадвызначэнняў. Капіталізм выйшаў на сцэну без аб'яў. Ніхто не прадказваў развіццё машыннай індустрыі: яна з'явілася абсалютна нечакана»?

Якія аргументы вы можаце прывесці, абапіраючыся на веды з курса гісторыі?

14. Дайце аргументаваны аналіз наступнага выказвання: «Рэфармацыя рэальна паўстае перш за ўсё як ідэйная барацьба з дапамогай друкаванага слова, па сутнасці, як першая масавая кампанія ў прэсе».

§ 14. ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ УСХОДУ

Да гэтага часу мы разглядалі развіццё еўрапейскіх цывілізацый, гэта значыць шлях, які завяршыўся стварэннем індустрыяльнага грамадства. Аднак неабходна помніць, што шлях гэты не быў адзіным. І поруч з Еўропай існавалі цывілізацыі, пабудаваныя на зусім іншых прынцыпах. Адной з іх была цывілізацыя Усходу.

Захад — ёсць захад, усход — ёсць усход,
не сустрэцца ім ніколі.
Толькі каля падножжа Прастола Божага,
у дзень страшнага суда.

Радкі гэтыя, што належаць выдатнаму англійскаму пісьменніку Рэдзьярду Кіплінгу (1865—1936), і па сённяшні дзень прыцягваюць напружаную ўвагу. Адны згаджаюцца з Кіплінгам, гаворачы, што Усходу і Захаду сапраўды не зразумець адзін аднаго. Другія, наадварот, пратэстуюць, адзначаючы тое, што Усход еўрапеізуецца, а Захад праяўляе ўсё большую цікавасць да традыцый Усходу (філасофіі, мастацтваў, медыцыны і да т. п.).

Усе гэтыя спрэчкі, аднак, адносяцца да сучаснага Усходу, які паспеў ужо пераняць як вартасці, так і заганы цывілізацыі Захаду. Але якім жа ён быў да сутыкнення з еўрапейцамі? Гэта быў самабытны свет, які развіваецца па асобых законах і не мае з Захадам нічога агульнага. Паспрабуем гэта даказаць, вылучыўшы некаторыя найбольш значныя асаблівасці Усходу.

Пад усходняй цывілізацыяй мы будзем падразумяваць перш за ўсё Індыю, Кітай і Японію на працягу гіганцкага часовага прамежку (з сярэдзіны II тысячагоддзя да н. э. да XVII ст. н. э.).

Як жа так? Могуць спытаць нас. Цэлыя 3000 гадоў! У гэты ж час на Захадзе паспелі адна за адной змяніцца некалькі цывілізацый.

Сапраўды, яўная неадпаведнасць. Але ў гэтым якраз і заключаецца першая асаблівасць Усходу.

Устойлівасць усходняй цывілізацыі

Захад рухаецца ўперад як бы рыўкамі. І кожны рывок (антычнасць, сярэдневякоўе і г. д.) суправаджаецца крушэннем старой сістэмы каштоўнасцей, а таксама палітычных і эканамічных структур. Развіццё Усходу, наадварот, паўстае як суцэльная лінія. Новыя павевы тут не разбураюць асновы цывілізацыі. Наадварот, яны арганічна ўпісваюцца ў старое і растваряюцца ў ім.

Але дазвольце, зноў могуць запярэчыць нам, гісторыкі ж вылучаюць рабаўладальніцкі і феадальны перыяды і на Усходзе. І тут адбываліся нашэсці дзікіх плямён, разбураліся дзяржавы, узнікалі новыя рэлігіі. Дзе ж тут «суцэльнае» развіццё?

На самай справе, перыяды рабаўладання і феадалізму вылучаюць і на Усходзе. Аднак яны тут настолькі непадобныя на заходнія*, што нават К. Маркс, стваральнік вучэння аб паслядоўна змяняючых адна адну фармацыях, вымушаны быў спецыяльна для Усходу вылучыць «азіяцкі» спосаб вытворчасці, прызнаўшы тым самым, што Усход у яго схему проста не ўпісваецца.

Усход вельмі гібкі, ён здольны ўвабраць і перапрацаваць многія чужыя сабе элементы. Так, як заўважыў буйнейшы савецкі ўсходазнавец, нашэсці «варвараў»** не толькі не знішчылі кітайскую дзяржаву, але нават не перарвалі яе існавання... І нават у паўночнай частцы краіны, дзе ўтварыліся «варварскія» каралеўствы, гэтыя каралеўствы вельмі хутка перасталі быць «варварскімі», ператварыўшыся ў тыя ж кітайскія. Карэннае кітайскае насельніцтва гэтай часткі краіны асімілявала прышэльцаў і прывіла ім сваю цывілізацыю.

Акрамя таго, у адрозненне ад Еўропы на Усходзе існавала мноства рэлігій, і нават іслам, непрымірымы ў адносінах да параднага хрысціянства, даволі спакойна ўжываўся з традыцыйнымі ўсходнімі вераваннямі. Такім чынам, якія б узрушэнні ні адбываліся, асновы цывілізацыі заставаліся непахіснымі.

---

* Напрыклад, нават у перыяд росквіту рабаўладання на Усходзе рабы не з'яўляліся тут асноўнай вытвараючай сілай. А змена рабаўладання феадалізмам адбывалася не ў выніку варварскіх уварванняў, якія ўсё разбуралі, але ў выніку паслядоўных рэформ, якія праводзіліся дзяржавай.

** Слова «варвары» тут ужыта для абазначэння качавых плямён, якія жылі на граніцах Кітая і пераможвалі перыяд разлажэння першабытнаабшчыннага ладу.

Сувязь грамадства з прыродай

Другой важнай асаблівасцю Усходу з'яўлялася тое, што грамадства тут не страціла сувязі з прыродай. Што гэта значыць?

Улюбёным довадам еўрапейскіх каланізатараў на карысць заваяванняў было сцвярджэнне, што яны ашчаслівілі людзей Усходу ўсім, што тыя былі няздольныя стварыць самі (машынамі, навейшай зброяй і г. д.). Звычайна ў гэтым бачаць толькі прымітыўную спробу апраўдацца. Аднак большасць еўрапейцаў былі ў свой час свята ў гэтым пераканаиы. Дык у чым жа тут справа? Разгадка ў прынцыповай розніцы псіхалогіі прадстаўнікоў дзвюх цывілізацый.

Еўрапейцы ў сваім развіцці пайшлі самым простым шляхам. Сваю недасканаласць і слабасць перад сіламі прыроды яны пачалі кампенсоўваць стварэннем грувасткіх машын. Яны рэзка вылучылі сябе з прыроды, перасталі адчуваць сябе яе часткай. Больш таго, прырода, у іх разуменні, стала нечым накшталт ворага. Яе трэба было адолець, перамагчы, паставіць сабе на службу. Пераканаўшы сябе, што чалавек ёсць вянец тварэння і ўсё ў гэтым свеце створана выключна для яго карыстання, еўрапейцы пачалі расцягваць яе багацці і перакройваць на свой лад, не лічачыся ні з забруджваннем навакольнага асяроддзя, ні з іншымі стратамі. Дзіва што — прырода ж «не храм, а майстэрня».

У адрозненне ад іх чалавек Усходу ніколі не траціў сувязі з асяроддзем пражывання. Свае думкі ён накіроўваў не на стварэнне механізмаў, што кампенсуюць уласную недасканаласць, а, наадварот, на тое, каб удасканаліць свае душу і цела. Свет успрымаўся імі як адзінае цэлае і чалавек у гэтым цэлым не пан, а толькі адна з састаўных частак. А раз так, то іх мэтай з'яўлялася не варожасць, а імкненне быць з прыродай у гармоніі. І, пазнаўшы асноўныя яе законы, пастарацца не пярэчыць ім. Так, філосафы Усходу лічылі, што народы і дзяржавы павінны развівацца натуральным (прыродным) спосабам. Беручы прыклад з раслін і жывёл, у жыцці якіх няма нічога лішняга, выпадковага.

Стылі розных баявых мастацтваў узялі пачатак з назіранняў за рухамі дзікіх звяроў (тыгра, мядзведзя, малпы і інш.). Дасканала вывучыўшы навакольнае асяроддзе, чалавек Усходу ведаў, як яно ўздзейнічае на яго арганізм. Напрыклад, эфектыўнасць удараў

(у баявых мастацтвах) у розныя кропкі цела разлічвалася ў залежнасці ад часу дня. Да гэтай пары не мае роўных і ўсходняя медыцына.

І яшчэ. Людзі Усходу былі перакананы ў тым, што толькі тады чалавек можа ўдасканальваць свет, калі шляхам удасканальвання стане гарманічным і цэльным сам. Паколькі яму поўнасцю чужыя зло і імкненне разбураць.

Адданасць традыцыі

Яна сустракалася і ў Еўропе, аднак у цывілізацыях Усходу брала свой пачатак у далёкім мінулым, у міфічным «залатым веку». І ўсё новае апраўдвалася толькі тады, калі можна было знайсці што-небудзь падобнае ў старажытнасці.

Усё тут бесперастанна паўтараецца, некалькі відазмяняючыся, але захоўваючы абавязкова рысы падабенства. Чалавеку еўрапейскага сярэдневякоўя ў галаву не магло прыйсці пісаць у стылі Гамера. А на Усходзе на працягу 3000 гадоў можна было сустрэць у вершах адны і тыя ж памеры, мелодыі і г. д.

Любое неапраўданае парушэнне традыцый (нават самых малазначных) успрымалася, як сапраўдны кашмар. Так, выдатны кітайскі філосаф Канфуцый расказвае аб адным саноўніку, што наладжваў «у храме танцы, у якіх танцоры выстройваліся ў восем радоў». Паколькі ў старажытнасці такія святы мог даваць толькі імператар, Канфуцый з абурэннем заяўляе: «Калі гэта можна вынесці, то што ж тады нельга выносіць?!» Ён жа стварыў цэлую тэорыю (якая да гэтага часу мае на Усходзе вялікі ўплыў) аб тым, што грамадства павінна жыць па раз і назаўсёды ўстаноўленаму рытуалу паводзін. Без рытуалу, на яго думку, абясцэньваецца ўсё. «Пачцівасць без рытуалу прыводзіць да мітусні. Абачлівасць без рытуалу ператвараецца ў боязь. Смеласць без рытуалу выглядае грубасцю». Рытуал уладарыць не толькі ў чалавечым грамадстве, але і ў прыродзе. Яму падпарадкаваны змена пор года, расцвітанне і завяданне. Сваю тэорыю Канфуцый таксама ўспрымаў не нечым новым, а толькі адраджэннем вучэнняў мінулых стагоддзяў. «Тлумачу, але не ствараю. З любоўю і верай адношуся да старажытнасці».

Адносіны да рэлігіі

Гэта адзін з важных паказчыкаў у характарыстыцы любой цывілізацыі. На Усходзе яны вельмі адрозніваюцца ад заходніх. Ды і самі рэлігіі тут — наколькі яны

разнастайныя і непадобныя на хрысціянства! Вось, да прыкладу, канфуцыянства. Яго называюць рэлігіяй, але гэта хутчэй набор правіл і норм, якія вызначаюць жыццё чалавека ў грамадстве. Багі не вельмі хвалююць Канфуцыя. Яны, вядома, устанавілі гэтыя самыя правілы ў незапамятныя часы. Але на гэтым увогуле і абмежаваліся іх кантакты са светам людзей. «Багоў я паважаю, але трымаюся ад іх як мага далей» — вось жыццёвы прынцып Канфуцыя.

Другая рэлігія — індуізм (Індыя). У ёй багі, уладарнічаючы як бы над прыродай, адначасова з'яўляюцца яе часткай і знаходзяцца ў залежнасці ад яе. Прыклад: на Захадзе манахі вялі праведнае аскетычнае жыццё, таму што яно прыемна Богу і забяспечвае райскую асалоду. У індуізме ж аскетызм — спосаб зрабіцца роўным з багамі, а часам і перасягнуць іх. Пустэльнік-аскет дзякуючы яму набываў ад Сусвету такую сілу, што мог накладваць на багоў праклёны і насылаць на іх усялякія няшчасці. Ведаючы магутную сілу аскетызму, яго нярэдка прытрымліваюцца і самі багі. Толькі ў індуізме можна сустрэць такую, з пункту гледжання еўрапейца, камічную карціну: магутнейшы бог Шыва, здольны адным дыханнем сцерці ўвесь Сусвет у парашок, вядзе жыццё аскета і жабруе па дарогах. На гэту міласціну існуе яго сям'я. Перыядычна такое жыццё становіцца яму цяжкім, і ён горка скардзіцца на сваю нешчаслівую долю (астатнія, маўляў, багі жывуць у дастатку, а ён жабруе). Аднак, разумеючы, што ў аскетызме крыніца яго звышнатуральнай сілы, Бог ад яго не адмаўляецца. У дадатак да ўсіх няшчасцяў у яго ўзнікаюць скандалы з жонкай, таму што міласціны ён прыносіць мала, і г. д.

Яшчэ адной рэлігіяй, якая ўзнікла на Усходзе і стала ў далейшым сусветнай, з'яўляецца будызм. Яго заснавальнік Буда адначасова з'яўляецца і якімсьці касмічным розумам, з якім імкнуцца зліцца яго паслядоўнікі шляхам вызвалення ад нікчэмных жаданняў і пачуццяў, што прывязваюць людзей да зямлі, прымушаюць нараджацца зноў і зноў у розных абліччах. Такім чынам, дасягнуўшы нірваны (прасвятлення), чалавек пераходзіў у новую якасць — незямную.

І нарэшце, у даасізме (узнік у Кітаі) Бог як такі наогул адсутнічаў. Замест яго тут прысутнічала даа (шлях) — якаясьці першааснова ўсіх рэчаў, пазнаўшы

законы якой і кіруючыся якімі чалавек станавіўся дасканалым.

Рэлігія Усходу — гэта, перш за ўсё, шляхі самаўдасканальвання, а праз іх удасканальванне навакольнага свету.

Істотную частку светапогляду людзей Усходу складалі вера ў бясконцы ланцуг смярцей і адраджэнняў кожнага чалавека ў розных абліччах, прычым будучае чалавечае аблічча трэба было заслужыць праведным жыццём. У адваротным выпадку можна было адрадзіцца кім непажадана. Гэта тэорыя парадзіла ўяўленне аб вечным руху ўсяго жывога ў замкнутым цыкле (усё некалі ўжо было і калі-небудзь паўторыцца зноў).

Адсюль жа бярэ паходжанне і славуты **фаталізм** Усходу — вера ў немагчымасць і непатрэбнасць змянення наканаванага лёсу. Вось як разважае Канфуцый, які заехаў у разбойніцкія землі: «Калі небу пажадана згубіць мудрасць, якая знаходзіцца ва мне,— так і будзе. А калі не, то што могуць зрабіць мне гэтыя разбойнікі?»

Поўнасцю адсутнічае на Усходзе паняцце свабоды, якое гэтак цэніцца заходняй цывілізацыяй. Таксама як і дэмакратычны спосаб кіравання. **Усходні чалавек не свабодны, а абавязаны.** Прычым абавязак гэты яму не ў цяжар, а прызнае ён яго зусім натуральным. Абавязаны захоўваць традыцыі, рытуалы, сістэмы падпарадкавання (бацькі — дзеці, муж — жонка, вышэйстаячы — ніжэйстаячы). Абавязкам гэтым звязаны ўсе, ад гасудара да самага апошняга з яго падданых. Чалавек абавязаны жыць па строга вызначаных правілах, у адваротным выпадку лепш яму памерці. У гэтым плане паказальны прыклад японскіх самураяў (ваеннага саслоўя). Пры любым парушэнні самураем «кодэкса гонару» ён абавязаны быў скончыць самагубствам, зрабіўшы сабе харакіры. Такім чынам, чалавек тут не мог ні жыць, ні памерці інакш, чым па ўстаноўленаму звычаю.

Сацыяльныя структуры Усходу

Яны вычварныя і неаднастайныя. Тут і замкнутыя касты (у Індыі). І магчымасць пераходу з адной сацыяльнай групы ў другую шляхам здачы дзяржаўных экзаменаў (Кітай). Сын селяніна, такім чынам, мог трапіць у самыя вярхі грамадства. Перад намі тут рэдкі для гісторыі выпадак, калі павы-

шэнне адукацыі азначала адначасова павышэнне сацыяльнага статуса.

Не менш мудрагелістымі былі і палітыка-эканамічныя формы. Так, імперыю Тан у Кітаі называюць феадальнай дзяржавай. Аднак са сваіх зямель кітайская знаць не атрымлівала ні гроша. Усе даходы паступалі ў казну, а ўжо адтуль (у выглядзе жалавання) да феадалаў, якія займалі розныя пасады ў дзяржаўным апараце. Гэтым яны зводзіліся фактычна да ролі простых чыноўнікаў.

Наогул трэба мець на ўвазе, што нягледзячы на агульныя для ўсёй усходняй цывілізацыі моманты, паміж краінамі, што ўваходзілі ў яе, былі і істотныя адрозненні ў традыцыях, спосабе мыслення, шляхах развіцця. Нават агульныя для ўсіх краін Усходу будызм і даасізм (Японія, Кітай) у кожнай з краін прымалі свае асобыя, непаўторныя формы. Што агульнага паміж японскім самурайствам, якое пагарджала ніжэйстаячымі саслоўямі, і вандроўнымі рыцарамі Кітая, якія лічылі сваім абавязкам уступацца за пакрыўджаных і адстойваць справядлівасць?

Нарэшце, калі Індыя і Кітай развіваліся выключна самабытна, то Японія ў многім ішла шляхамі перайманння і пераўтварэння на свой лад іх філасофіі, ваеннага мастацтва, традыцый, навук і г. д.

Гаварыць аб асаблівасцях Усходу можна бясконца. Тут мы не маем магчымасці даць колькі-небудзь поўную іх характарыстыку. Таму падвядзём вынікі.

Цывілізацыя гэта была жыццяздольнай, пакуль ёй даводзілася мець справу з варварскімі народамі. Яна абаранялася ад іх пасіўна, паглынаючы і перабудоўваючы на свой лад. Аднак, сустрэўшыся з цывілізацыяй Еўропы, тэхнічна больш развітой, якая нясе зусім іншую праграму і імкнецца да разбурэння ўсяго непадобнага на яе,— Усход не ўстаяў.

Дрэнна гэта ці добра, сказаць цяжка. Зразумела адно: старая цывілізацыя загінула і краіны Усходу былі ўключаны ў новую, на гэты раз агульнасусветную.

Пытанні і заданні

1. У чым вы бачыце прынцыповую розніцу паміж рэлігіямі Усходу і хрысціянствам?

2. Ці згодны вы са сцвярджэннем, што сёння Усход увайшоў у агульнасусветную цывілізацыю?

3. Што такое «традыцыйнае грамадства»?

4. Значная частка старажытнакітайскай паэзіі прысвечана

тэме абавязку (перад краінай, народам, гасударом і г. д.). Чым гэта тлумачыцца?

5. «Калі не паважаць мудрацоў, то ў народзе не будзе сварак. Калі не цаніць рэдкіх прадметаў, то не будзе зладзеяў сярод народа. Калі не паказваць таго, што можа выклікаць зайздрасць, то не будуць хвалявацца сэрцы народа. Таму, кіруючы (краінай), вельмі мудры робіць сэрцы (падданых) пустымі, а страўнікі — поўнымі. (Яго кіраванне) аслабляе іх волю і ўмацоўвае іх косці. Яно пастаянна імкнецца да таго, каб у народа не было ведаў і захапленняў, а тыя, хто маюць веды, не маглі б дзейнічаць».

Перад вамі фрагмент працы заснавальніка даасізму Лаа Цзы. Паспрабуйце сфармуляваць прынцып, які ён лічыць найважнейшым для дзяржаўнага кіравання і жыцця наогул.

6. Якая з пералічаных намі рэлігій Усходу магла стаць дзяржаўнай ідэалогіяй? Чаму?

7. Ці лічыце вы, што розніцу ў развіцці Усходу і Захаду прадвызначылі, акрамя ўсяго іншага, і розныя геаграфічныя ўмовы? Паспрабуйце абгрунтаваць свой адказ.

8. Што вы лічыце больш правільным для ідэальнага дзяржаўнага ладу: усходні «абавязак» або еўрапейскую «свабоду»?

9. «Ніколі на працягу ўсяго свайго жыцця я не павінен мець уласных меркаванняў аб намерах майго ўладыкі і пана. Не рабіць інакш ва ўсё сваё жыццё. Нават пасля смерці я ўваскрэсну сем разоў, каб засцерагчы ад няшчасцяў дом майго ўладыкі.

Я даю клятву выканаць чатыры задачы:

1. Ні перад чым не адступаць пры выкананні абавязку.
2. Быць карысным майму ўладыку.
3. Быць пачцівым да бацькоў.
4. Быць вялікім у міласэрнасці.

Перад вамі вытрымка з самурайскага «кодэкса гонару». Якія каштоўнасці тут абвешчаны? Якая з усходніх рэлігій, на вашу думку, зрабіла ўплыў на яго фарміраванне?

10. У чым вы бачыце «моцныя» і «слабыя» бакі Усходу ў параўнанні з заходняй цывілізацыяй?

Аддзел другі.

СУЧАСНАЕ ГРАМАДСТВА — ЦЭЛАСНЫ І ЎЗАЕМАЗВЯЗАНЫ СВЕТ

Раздзел III. СУЧАСНЫ ЭТАП СУСВЕТНАГА ЦЫВІЛІЗАВАНАГА РАЗВІЦЦЯ І НАША ГРАМАДСТВА

§ 15. СУЧАСНЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Шматаблічны і супярэчлівы свет

Сучаснае чалавецтва — гэта больш за 5 млрд зямлян, тысячы вялікіх і малых народаў. Гэта больш за паўтары сотні дзяржаў. Гэта разнастайнасць эканамічных укладаў, асаблівасці сацыяльна-палітычнага і культурнага жыцця.

Адна з прычын такой разнастайнасці звязана з адрозненнем прыродных умоў, асяроддзя пражывання людзей. Гэтыя ўмовы аказваюць сваё ўздзеянне на многія бакі грамадскага жыцця, але ў першую чаргу ўплываюць на гаспадарчую дзейнасць чалавека. І сапраўды, клімат, урадлівасць глебы, характар раслінасці — усё гэта і многае іншае парадзіла тыя ці іншыя спосабы апрацоўкі зямлі, прыёмы развядзення свойскай жывёлы, стымулявала стварэнне пэўных прылад працы, спосабаў апрацоўкі вырабаў. Не толькі жыллё, адзенне, хатнія рэчы і баявая зброя адлюстроўвалі асаблівасці прыродных умоў, у якіх жыло дадзенае грамадства. Успомніце ўрывак з лекцыі вядомага рускага гісторыка В. В. Ключэўскага, прыведзены ў пачатку нашай кнігі. Натуральнае асяроддзе ўплывала на палітычны лад дзяржавы. Адчувальна яго ўздзеянне і на характар адносін паміж людзьмі, на формы ўласнасці, якія складваюцца.

Успомніце, як зарадзілася прыватная ўласнасць на зямлю ў раёнах цывілізацыі Старажытнай Грэцыі і Рыма. Сярод іншых прычын гэтаму садзейнічалі прыродныя ўмовы. Разнастайны ландшафт — горы, даліны, лясы, мноства невялікіх рэк — ускладняў жыццё вялікімі абшчынамі. Цвёрдыя глебы патрабавалі цяжкай працы земляроба, суровыя зімы прымушалі клапаціцца аб стварэнні запасаў прадуктаў, насення для будучага

ўраджаю. І ўсё гэта патрабавала самастойнага забеспячэння, спадзявання на ўласныя сілы.

Поруч з прыроднымі ўмовамі разнастайнасць грамадскага жыцця звязана з гістарычным асяроддзем існавання грамадстваў, якое складваецца пад уплывам узаемадзеяння з іншымі плямёнамі, народамі, дзяржавамі. Вось што пісаў аб гэтым Г. В. Пляханаў: «Паколькі амаль кожнае грамадства пападае пад уплыў сваіх суседзяў, то можна сказаць, што для кожнага грамадства існуе ў сваю чаргу вядомае грамадскае, гістарычнае асяроддзе, якое ўплывае на яго развіццё. Сума ўплываў, якую адчувае на сабе кожнае дадзенае грамадства з боку яго суседзяў, ніколі не можа быць роўна суме тых жа ўплываў, якія адчувае на сабе ў той жа самы час іншае грамадства. Таму ўсякае грамадства жыве ў сваім асаблівым гістарычным асяроддзі, якое можа быць — і на самай справе часта бывае — вельмі падобным на гістарычнае асяроддзе, якое акружае іншыя народы, але ніколі не можа быць і ніколі не бывае тоесным з ім. Гэта ўносіць надзвычай моцны элемент разнастайнасці... у працэс грамадскага развіцця».

Але калі абстрагавацца, не браць пад увагу некаторыя унікальныя, уласцівыя толькі дадзеным грамадствам рысы, то можна сцвярджаць, што і сёння, як і некалькі стагоддзяў назад, чалавецтва прадстаўлена двума тыпамі цывілізацый, якія ўваходзяць сваімі каранямі ў далёкае мінулае.

Незаходнія цывілізацыі або традыцыйнае грамадства

Знаёмячыся са старажытнаўсходняй цывілізацыяй, вы даведаліся пра яе важнейшыя рысы і асаблівасці. Зямля, ірыгацыйная сістэма з'яўлялася ўласнасцю абшчыны. Кожная сям'я валодала пэўным участкам зямлі, дадзеным ёй у часовае карыстанне. Панавала экстэнсіўная тэхналогія, накіраваная галоўным чынам на авалоданне знешнімі прыроднымі працэсамі. Чалавек узгадняў сваю дзейнасць з рытмамі прыроды, максімальна прыстасоўваўся да навакольнага асяроддзя. Так, прынцып «у-вэй» у старажытных кітайцаў патрабаваў неўмяшання ў працяканне прыродных працэсаў.

Гэты тып грамадства, які атрымаў назву традыцыйнага, захаваўся да нашых дзён. Ён прадстаўлены многімі дзяржавамі «трэцяга свету»: краінамі Афрыкі і Азіі, якія параўнальна нядаўна вызваліліся ад кала-

ніяльнага прыгнёту. І сёння сярод духоўных каштоўнасцей гэтых грамадстваў адно з вядучых месц займае ўстаноўка на адаптацыю да сацыяльнага становішча, якое склалася, не заахвочваецца імкненне да яго мэтанакіраванага пераўтварэння. Каштоўна актыўнасць, накіраваная ўнутр чалавека, на самасузіранне. Асаблівае значэнне маюць традыцыі, звычаі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. У цэлым каштоўнасна-духоўная сфера чалавечага быцця ставіцца вышэй за эканамічную. У гаспадарчай дзейнасці пераважаюць экстэнсіўныя тэхналогіі. Аднак калі ў ранні перыяд развіцця традыцыйных грамадстваў гэтыя тэхналогіі садзейнічалі эканамічнаму прагрэсу (спрыяльныя прыродныя ўмовы, прастата ствараемых сродкаў працы), то ў далейшым праявіўся іх тармазны ўплыў (паступовае вычэрпванне прыродных багаццяў, застойны характар тэхнікі). Гэта абумовіла характэрную для рада краін «трэцяга свету» эканамічную адсталасць. З сярэдзіны 70-х гг. у гэтых краінах пачаў нарастаць працэс сцвярджэння рэлігіі як рашаючага фактару грамадскага жыцця. У радзе краін, дзе пануючай рэлігіяй з'яўляецца іслам, паяўляецца ідэя стварэння ісламскай цывілізацыі, асновай якой могуць стаць маральна-духоўныя каштоўнасці, якія прапаведуюцца гэтым веравучэннем.

Заходняя цывілізацыя

Гэта тып сацыяльнага развіцця, які даследчыкі называюць па-рознаму: тэхнагенная цывілізацыя, індустрыяльная, навукова-тэхнічная цывілізацыя, у многіх сваіх рысах супрацьлеглы традыцыйнаму грамадству, хоць таксама мае дастаткова глыбокія гістарычныя карані. Вы ўжо ведаеце, як адбывалася станаўленне індустрыяльнай цывілізацыі, якая ўвабрала ў сябе дасягненні антычнай культуры, заходнееўрапейскага сярэдневякоўя і ў далейшым эпохі Адраджэння. Гэта цывілізацыя існуе крыху больш за 300 гадоў. Інтэнсіўная вытворчасць, якая склалася ў еўрапейскім рэгіёне з яго больш суровым прыродным асяроддзем (у параўнанні з краінамі Усходу) патрабавала апошніх намаганняў фізічных і інтэлектуальных сіл грамадства, пастаяннага ўдасканальвання прылад працы, спосабаў уздзеяння на прыроду. Фарміравалася і новая сістэма каштоўнасцей. На першы план выходзіла актыўная, творчая, пераўтвараючая дзейнасць чалавека. Ідэаламі цывілізацыі стала пастаяннае абнаўленне, магутны

поступ прагрэсу. Безумоўнай каштоўнасцю стала навуковае пазнанне, якое істотна пашырае інтэлектуальныя сілы, вынаходніцкія здольнасці чалавека, яго магчымасці пераўтвараць свет. Такім чынам, свайго роду «сузіральнасці» традыцыйных грамадстваў стаў супрацьстаяць актыўны пачатак.

У адрозненне ад традыцыйных грамадстваў, дзе маюць значэнне, у першую чаргу, калектыўныя формы супольнага жыцця людзей, заходняя цывілізацыя выставіла ў якасці важнейшай каштоўнасці асобу як асобу — у яе аўтаномным, незалежным існаванні. Гэта прывяло, у сваю чаргу, да ідэй неад'емных правоў асобы, грамадзянскага грамадства і прававой дзяржавы.

У XX ст. навуковыя і тэхнічныя адкрыцці, у прыватнасці вынаходніцтва канвеера, дазволілі наладзіць масавую вытворчасць. Індустрыяльны свет імкнуўся да нарошчвання аб'ёмаў, скорасцей, магутнасцей. Амаль ва ўсіх галінах панавала гігантаманія: вялікія прадпрыемствы, гіганцкія будоўлі, велічныя збудаванні. Тады, з сярэдзіны стагоддзя 80—90-я гг. бачыліся такімі: паявяцца цягнікі, якія будуць перавозіць некалькі тысяч пасажыраў; самалёты з вялікай умяшчальнасцю і скорасцю, якая ў 10 разоў перавышае скорасць гуку; грузападымальнасць суднаў перавысіць мільёны тон. У гэтыя прагнозы верылі.

Межы росту

Такім чынам, к сярэдзіне нашага стагоддзя індустрыяльная цывілізацыя ператварылася ў грамадства масавай вытворчасці і спажывання. «Кожнае індустрыяльнае грамадства, незалежна ад таго, з'яўляецца яно капіталістычным ці сацыялістычным, усходнім ці заходнім, кіруецца пэўнымі прынцыпамі. Стандартызацыя, цэнтралізацыя, максімалізацыя, гігантаманія, дэзінфармацыя, спецыялізацыя, сінхранізацыя — прышэльцы з Марса знайшлі б усюды адно і тое ж». Гэтыя словы належаць вядомаму амерыканскаму вучонаму О. Тофлеру.

Аднак к сярэдзіне 70-х гг. сістэма, якая склалася на гэтых прынцыпах, пачала даваць збоі. Паявіліся шматлікія абмежаванні для руху ва ўжо пракладзеным напрамку. Гэта ў першую чаргу выявілася ў энергетычным крызісе: далейшы рост спажывання нафты, якая станавілася ўсё больш дарагой, пагражаў падарваць нацыянальныя эканомікі тых краін, якія жылі за кошт прывазной сыравіны. Выявіліся і экалагічныя абмежаванні. Масавая вытворчасць была таннай не

толькі ў сілу сваіх маштабаў, але і таму, што вытворцы не траціліся на ахову навакольнага асяроддзя, на прадухіленне шкодных выкідаў. Аднак такія адносіны да прыроды як да невычарпальнай кладоўкі рэсурсаў, з аднаго боку, і зручнага месца для скідвання адходаў — з другога боку, давялося змяніць ва ўмовах імклівага нарастання экалагічнага крызісу. Масавая вытворчасць з прыбытковай пагражала стаць даволі стратнай.

Не вытрымалі праверкі часам і некаторыя каштоўнасці індустрыяльнай цывілізацыі. Распаўсюдзіўшы свой актыўна-пераўтваральны ўплыў не толькі на прыроду, але і на сацыяльныя працэсы, людзі ўступілі ў перыяд маштабных сацыяльных эксперыментаў, вынікі якіх нярэдка не адпавядалі першапачатковым задумам. Пры гэтым і самі планы пераўтварэння грамадства здаваліся часам вельмі спрошчанымі: па аналогіі з распрацоўкай і ўкараненнем інжынернага праекта разлічваліся планы арганізаванай, сацыяльнай машыны, якая забяспечыць людзям шчаслівае жыццё.

Постіндустрыяльная цывілізацыя

Што ж, індустрыяльная цывілізацыя, якая так бурна стартавала, зжыла сябе, наблізілася да свайго непазбежнага краху? Хоць такія сумныя прагнозы выказваліся, аднак заходняе грамадства змагло знайсці рашэнне рада цяжкіх праблем. Адказы на многія пытанні дала навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Дзякуючы яе дасягненням удалося стварыць новыя рэсурсазберагаючыя тэхналогіі, выкарыстанне якіх прывяло да значнага скарачэння спажывання прыроднай сыравіны. На базе электронна-вылічальнай тэхнікі пачалася рэвалюцыя ў кіраванні вытворчасцю. Будучае, як лічаць многія вучоныя, за інфармацыйным грамадствам. Масавая вытворчасць уступае месца дробнасерыйнай. Аказалася, што вытворчасць па індывідуалізаваных заказах, але на аснове высокай тэхналогіі танней, чым масавая вытворчасць. Маленькую серыю вырабаў лягчэй прадаць, не патрэбны склады для захавання рэшткаў, а галоўнае, такая вытворчасць дае магчымасць хутка рэагаваць на змяненне попыту, своечасова замяняць устарэлую мадэль новай. Разнастайнасць расце не толькі ў сферы вытворчасці. Пашыраюцца камунікацыйныя магчымасці: шматканальнае і спадарожнікавае тэлебачанне, розныя друкаваныя выданні, разлічаныя на самыя розныя групы чытачоў,

асабістыя камп'ютэры. Этнічныя, культурныя адрозненні не разглядаюцца цяпер як перашкода на шляху развіцця грамадства.

Такім чынам, чалавецтва «зноў у дарозе». Ці азначае гэта, што ўсе праблемы, па крайняй меры, для тых, хто ўступае ў стадыю постіндустрыяльнага развіцця, вырашаны? Не. Узнікаюць новыя цяжкасці і тупікі. Але самымі небяспечнымі становяцца тыя з іх, якія закранаюць усё чалавецтва: экалагічны крызіс, рост узбраення і яго ўдасканаленне, дэмаграфічны выбух. Да аналізу сутнасці гэтых праблем, якія атрымалі назву глабальных, і пошукаў шляхоў выхаду з іх мы звернемся ў наступным параграфе.

Адзіны ўзаемазвязаны свет

Ідэя разнастайнасці грамадства не супярэчыць ідэі адзінства чалавецтва. Эканамічныя, палітычныя, культурныя сувязі, якія ўсё больш умацоўваюцца і расшыраюцца, дапамагаюць пераадольваць раз'яднанасць, фарміруюць у нас пачуццё прыналежнасці да адзінай чалавечай сям'і. Вось як выказваў гэту думку вядомы французскі мысліцель І палавіны нашага стагоддзя Тэер дэ Шардэн: «На працягу некалькіх пакаленняў вакол нас утварыліся ўсякага роду эканамічныя і культурныя сувязі, якія павялічваюцца ў геаметрычнай прагрэсіі. Цяпер, акрамя хлеба... кожны чалавек патрабуе штодзённа сваю порцыю жалеза, медзі, бавоўны, сваю порцыю электрычнасці, нафты і радыю, сваю порцыю адкрыццяў кіно і міжнародных звестак. Цяпер ужо не простае поле... а ўся Зямля патрэбна, каб забяспечваць кожнага з нас... Для чалавека няма будучага, якое чакаецца ў выніку эвалюцыі, без аб'яднання яго з іншымі людзьмі».

Але ва ўзаемадзеянне адзін з адным уступаюць не толькі людзі: ідзе дыялог культур, цывілізацый. І сёння мы даведваемся, што трэба вучыцца весці гэты дыялог, які дапаможа дасягненні розных культур і цывілізацый зрабіць здабыткам усяго чалавецтва.

У заключэнне прывядзём яшчэ адно выказванне О. Тофлера: «...Мы ўступаем у перыяд, калі культура будзе мець большае значэнне, чым калі-небудзь. Культура не з'яўляецца чымсьці закамянеўшым у янтары, гэта тое, што мы ствараем нанава кожны дзень. «Трэцяя хваля» (постіндустрыяльнае грамадства.— **Аўт.**) будзе змяшчаць у сабе многа культур, і гэта базіс для маралі. Можа, гэта і ёсць сапраўдны базіс для ўзаема-

разумення людзей, для фарміравання новых маральных каштоўнасцей у адносінах паміж людзьмі».

§ 16. ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАСЦІ

Што такое глабальныя праблемы?

У другой палавіне нашага стагоддзя чалавецтва сутыкнулася з групай праблем, ад рашэння якіх залежыць далейшы сацыяльны прагрэс, лёс цывілізацыі. Гэтыя праблемы атрымалі назву глабальных (ад лацінскага слова, якое абазначае «глобус» — Зямля, зямны шар). Да іх адносяцца ў першую чаргу наступныя: прадухіленне пагрозы новай сусветнай вайны, пераадоленне экалагічнага крызісу і яго вынікаў, скарачэнне разрыву ва ўзроўні эканамічнага развіцця паміж развітымі краінамі Захаду і краінамі «трэцяга свету», якія развіваюцца, стабілізацыя дэмаграфічнай сітуацыі на планеце. Усё большае значэнне ў апошняе дзесяцігоддзе набываюць таксама праблемы аховы здароўя і прадухіленне распаўсюджвання СНІДа, наркаманіі, адраджэнне культурных і маральных каштоўнасцей, барацьба з міжнародным тэрарызмам.

Галоўнае, аднак, не ў паўнаце спіса гэтых праблем, а ў асэнсаванні прычын іх узнікнення, характару і, што самае важнае, у выяўленні эфектыўных шляхоў і спосабаў рашэння.

Раздумваючы аб прычынах паяўлення глабальных праблем, вучоныя адзначаюць перш за ўсё ўзнікшую сусветную супольнасць людзей. З папярэдняга параграфа вы ўжо даведаліся, у чым праяўляецца цэласнасць сучаснага свету. Напомнім, што яе забяспечваюць у першую чаргу глыбінныя эканамічныя сувязі, палітычныя, культурныя кантакты, якія ўзмацніліся, навейшыя сродкі масавай камунікацыі. У гэтых умовах, калі планета Зямля становіцца адзіным домам чалавецтва, многія супярэчнасці, канфлікты, праблемы могуць перарасці лакальныя рамкі і набыць глабальны, агульнасусветны характар.

Справа, аднак, не толькі ў гэтым. Сама актыўна-пераўтваральная дзейнасць чалавека па магутнасці і выніках як творчых, так і разбуральных цяпер супаставіма з самымі грознымі сіламі прыроды. У той жа час, выклікаўшы да жыцця магутныя вытворчыя сілы, чалавецтва не заўсёды можа паставіць іх пад свой разумны

кантроль. Узровень грамадскай арганізацыі, палітычнае мысленне і экалагічная свядомасць, духоўна-маральныя арыентацыі яшчэ вельмі далёкія ад патрабаванняў эпохі.

Глабальныя праблемы ўзаемазвязаныя. Так, у цеснай залежнасці знаходзіцца рашэнне экалагічных і эканамічных пытанняў, існуе цесная сувязь паміж эканамічным адставаннем і рэзкім ростам народанасельніцтва ў краінах «трэцяга свету», не менш відавочны ўплыў гонкі ўзбраенняў на абвастрэнне экалагічных і эканамічных праблем.

Пагроза экалагічнага крызісу

Рост маштабаў экалагічнай дзейнасці чалавека, бурнае развіццё навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ўзмацнілі адмоўнае ўздзеянне чалавека на прыроду, прывялі да парушэння экалагічнай раўнавагі на планеце.

Узрасло спажыванне ў сферы матэрыяльнай вытворчасці **прыродных рэсурсаў.** За 40 год пасля другой сусветнай вайны было выкарыстана столькі мінеральнай сыравіны, колькі за ўсю папярэднюю гісторыю чалавецтва. Паколькі запасы вугалю, нафты, газу, жалеза, медзі і іншых мінералаў, металаў і да т. п. не аднаўляюцца, то яны будуць вычарпаны, па разліках вучоных, праз некалькі дзесяцігоддзяў.

Але нават лясныя рэсурсы, якія, здавалася б, пастаянна аднаўляюцца, на самай справе хутка змяншаюцца. Высяканне лесу ў сусветным маштабе ў 18 разоў перавышае прырост драўніны. Плошча лясоў, якія даюць зямлі кісларод, памяншаецца з кожным годам.

Галоўны фундамент жыцця — глебы ўсюды на Зямлі дэградзіруюць. У той час як Зямля накоплівае адзін сантыметр чарназёму за 300 гадоў, цяпер адзін сантыметр глебы гіне за 3 гады.

Не меншую небяспеку, чым нястрымная эксплуатацыя рэсурсаў Зямлі, уяўляе сабой забруджванне планеты, якое ўзрасло за апошняе дзесяцігоддзе. Сусветны акіян пастаянна забруджваецца з-за расшырэння здабычы нафты на марскіх промыслах. Вялікія нафтавыя плямы згубныя для жыцця акіяна. У акіян скідваюцца таксама мільёны тон фосфару, свінцу, радыеактыўных адходаў. Толькі ЗША скідваюць у акіян да 50 млн тон адходаў. На кожны квадратны кіламетр акіянскай вады цяпер прыпадае 17 тон розных адкідаў

з сушы. А мёртвы акіян, лічаць вучоныя,— гэта мёртвая планета.

Самай неабароненай часткай прыроды стала прэсная вада. Сцёкавыя воды, пестыцыды, угнаенні, дэзінфекцыйныя сродкі, ртуць, мыш'як, свінец, цынк у вялікіх колькасцях пападаюць у рэкі і азёры. Толькі ў СССР штогод скідваюцца ў рэкі, азёры, вадасховішчы і моры неачышчаныя сцёкавыя воды, якія ўтрымліваюць дзесяткі мільёнаў тон шкодных рэчываў. У рацэ Рэйн амаль знікла ўсё жывое. Вельмі забруджаны Дунай, Волга, Місісіпі, Вялікія Амерыканскія азёры. Па заключэнню спецыялістаў, у некаторых раёнах зямлі 80 % усіх хвароб выкліканы недабраякаснай вадой.

Вядома, што без ежы чалавек можа жыць пяць тыдняў, без вады — пяць дзён, без паветра — пяць мінут. Між тым забруджванне **атмасфернага паветра** даўно пераўзышло дапушчальныя межы. Вуглекіслата ў атмасферы рада буйных гарадоў, запыленасць узраслі ў дзесяткі разоў у параўнанні з пачаткам XX ст. 115 млн легкавых аўтамабіляў у ЗША паглынаюць кіслароду ў два разы больш, чым ствараецца на тэрыторыі гэтай краіны ўсімі прыроднымі крыніцамі. Агульны выкід шкодных рэчываў у атмасферу (прамысловасцю, энергетыкай, транспартам і да т. п.) у ЗША складае каля 150 млн тон у год, у СССР — больш за 100 млн тон. У 102 гарадах СССР з насельніцтвам больш за 50 тыс. чалавек канцэнтрацыя шкодных для здароўя рэчываў у паветры перавышае медыцынскія нормы ў 10 разоў і вышэй. Кіслотныя дажджы, якія ўтрымліваюць двухвокіс серы і вокіс азоту і з'яўляюцца вынікам функцыяніравання цеплавых электрастанцый і заводаў Германіі і Вялікабрытаніі, выпадаюць у Скандынаўскіх краінах і нясуць пагібель азёрам і лясам. СССР атрымлівае з кіслотнымі дажджамі з Захаду ў 9 разоў больш шкодных рэчываў, чым пераносіцца ў адваротным напрамку. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС паказала экалагічную пагрозу, якую ствараюць аварыі на атамных электрастанцыях, што эксплуатуюцца цяпер у 25 краінах свету.

Сур'ёзнай праблемай стала бытавое смецце: цвёрдыя адходы, поліэтыленавыя пакеты, сінтэтычныя мыйныя сродкі і да т. п.

Знікае вакол гарадоў напоенае пахамі раслін чыстае паветра, рэкі ператвараюцца ў сцёкавыя канавы, усюды кучы кансервавых бляшанак, бітага шкла і іншага смецця, звалкі ўздоўж дарог, захламленыя тэрыторыі,

пакалечаная прырода — такая карціна неразумнага гаспадарання індустрыяльнага свету, што кідаецца ў вочы.

Навукова-тэхнічны прагрэс і экалагічная альтэрнатыва

Што ж рабіць? Для адказу на гэта пытанне трэба падумаць: выклікае навукова-тэхнічны прагрэс разбурэнне прыроднага асяроддзя сам па сабе ці яго негатыўнае ўздзеянне абумоўлена спосабамі выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі, грамадскімі парадкамі? Гістарычны вопыт паказаў, што разбуральнае ўздзеянне на прыроду аказвала гаспадарчая дзейнасць, якая кіравалася толькі прыватнымі інтарэсамі. У нашай краіне ў супярэчнасць з інтарэсамі грамадства, якая можа нармальна развівацца толькі ў здаровым прыродным асяроддзі, уступалі інтарэсы ведамстваў, якія кіраваліся толькі ўласнымі, вузкімі інтарэсамі. Вопыт паказаў таксама, што грамадства ў стане абмежаваць негатыўнае ўздзеянне прыватных інтарэсаў, знаходзіць спосабы рэгулявання адносін вытворчасці і прыроды.

Сярод часткі вучоных і прадстаўнікоў грамадскасці экалагічная пагроза парадзіла настрой песімізму, нявер'я ў магчымасць прадухіліць разбурэнне навакольнага асяроддзя. Адсюль вывады, варожыя навуцы і тэхніцы, патрабаванні спыніць рост вытворчасці, больш таго, пакланенне перад дзікай неасвоенай прыродай. Водгаласам гэтых настрояў з'яўляюцца масавыя акцыі з патрабаваннямі закрыцця рада прадпрыемстваў, якія выпускаюць вельмі патрэбную прадукцыю (напрыклад, лякарствы), спыненне атамных электрастанцый і г. д. Аднак такое рашэнне праблемы толькі параджае новыя праблемы. Падумайце якія.

Сапраўдная перспектыва выхаду з экалагічнага крызісу — у змяненнях вытворчай дзейнасці чалавека, яго спосабу жыцця, яго свядомасці. Навукова-тэхнічны прагрэс стварае не толькі «перагрузкі» для прыроды; у найбольш прагрэсіўных тэхналогіях ён дае сродкі прадухілення негатыўных уздзеянняў, стварае магчымасці **экалагічна чыстай вытворчасці.** Узнікла не толькі вострая неабходнасць, але і магчымасць змяніць сутнасць тэхналагічнай цывілізацыі, надаць ёй прыродаахоўны характар.

Адзін з напрамкаў такога развіцця — стварэнне **безадходных вытворчасцей.** Выкарыстоўваючы дасягненні навукі, тэхналагічны прагрэс можа быць аргані-

заваны такім чынам, каб адходы вытворчасці не забруджвалі навакольнае асяроддзе, а зноў паступалі ў вытворчы цыкл як утыльсыравіна. Прыклад дае сама прырода: вуглякіслы газ, што выдзяляюць жывёлы, паглынаецца раслінамі, якія выдзяляюць кісларод, неабходны для дыхання жывёл.

Безадходнай з'яўляецца такая вытворчасць, у якой уся зыходная сыравіна ў канчатковым выніку ператвараецца ў тую ці іншую прадукцыю. Калі ўлічыць, што 98 % зыходнай сыравіны сучасная прамысловасць пераводзіць у адходы, то стане зразумелай складанасць і грандыёзнасць задачы стварэння безадходнай вытворчасці.

Разлікі паказваюць, што 80 % адходаў цеплаэнергетычнай, горназдабываючай, кокса-хімічнай галін прыгодныя для справы. Пры гэтым атрымліваемая з іх прадукцыя часта пераўзыходзіць па сваіх якасцях вырабы, зробленыя з першаснай сыравіны. Напрыклад, попел цеплавых электрастанцый, які выкарыстоўваецца ў якасці дабаўкі пры вытворчасці газабетону, прыкладна ў два разы павышае трываласць будаўнічых панелей і блокаў.

Вялікае значэнне мае развіццё **прыродааднаўленчых** галін (лясная, водная, рыбная гаспадарка і да т. п.). Наша краіна займае адно з першых месц у свеце па аб'ёму лесааднаўленчых работ.

«Ціск» на прыроду зніжаюць матэрыялазберагаючыя і энергазберагаючыя тэхналогіі, усе віды эканоміі рэсурсаў. Падумайце чаму.

Экалагічна чыстымі з'яўляюцца і некаторыя **альтэрнатыўныя** (у адносінах да цеплавых, атамных і гідраэлектрастанцый) **крыніцы энергіі.** Ідзе пошук спосабаў практычнага выкарыстання энергіі Сонца, ветру, прыліваў, геатэрмальных крыніц.

Экалагічная сітуацыя выклікае неабходнасць ацэньваць вынікі любой дзейнасці, звязанай з умяшаннем у прыроднае асяроддзе. Неабходна экалагічная экспертыза ўсіх тэхнічных праектаў.

Сучасная навука разглядае чалавека, чалавецтва і навакольнае асяроддзе як адзіную сістэму. Вядомы рускі вучоны У. І. Вярнадскі пісаў, што чалавеку давядзецца свядома прыняць на сябе адказнасць за развіццё біясферы. **Асяроддзе пражывання чалавецтва, якое кіруецца навуковым розумам,** У. І. Вярнадскі называў **наасферай.** Пераход біясферы ў на-

асферу — якасна новы этап у развіцці чалавечага грамадства. Гэта неабходная ўмова развіцця цывілізацыі.

Праблемы вайны і міру ў сучасных умовах

Вайна, якая нясе з сабою разбурэнне і пагібель многіх людзей, параджае імкненне да насілля і дух агрэсіі, асуджалася мысліцелямігуманістамі ўсіх гістарычных эпох. Разам з тым многія з іх услед за Ш. Фур'е з горыччу маглі б канстатаваць, што войны — пастаянны спадарожнік чалавецтва. «Войны, рэвалюцыі няспынна ахопліваюць усе пункты зямнога шара; буры, ледзь спыненыя, адраджаюцца з свайго попелу, таксама як галовы гідры множыліся пад ударамі Геркулеса. Мір — толькі праблеск, толькі сон на некалькі імгненняў...» — пісаў французскі утапічны сацыяліст. І сапраўды, з чатырох з лішкам тысяч гадоў вядомай нам гісторыі толькі каля трохсот былі поўнасцю мірнымі. Увесь астатні час у тым ці іншым месцы Зямлі палыхалі войны.

Малох вайны станавіўся ўсё больш пражэрлівым, множыліся людскія і матэрыяльныя страты. XX ст. увайшло ў гісторыю як эпоха, якая парадзіла дзве сусветныя вайны, у якіх удзельнічалі дзесяткі краін і мільёны людзей. Так, у арбіту другой сусветнай вайны было ўцягнута больш за 70 дзяржаў, а агульныя страты склалі 55 млн чалавек.

Па аднадушнай ацэнцы многіх вучоных і палітычных дзеячаў трэцяя сусветная вайна, калі яна выбухне, стане трагічным фіналам усёй гісторыі чалавечай цывілізацыі. Разлікі, праведзеныя даследчыкамі ЗША, СССР і іншых краін, паказваюць, што найбольш верагодным і самым згубным для ўсяго жывога вынікам ядзернай вайны стане наступленне «ядзернай зімы». У выніку выкарыстання ядзернай узрыўчаткі ў першую чаргу над гарадамі, якія стануць галоўнымі аб'ектамі нападу, утворацца чорныя, практычна непранікальныя для святла сажавыя воблакі. Затым чорнае покрыва цалкам ахутае ўсю Зямлю. Усталюецца ноч, разам з ёй прыйдзе холад, Зямля пачне хутка астываць. Рэзка зменяцца кліматычныя ўмовы, пачнуцца неабарачальныя працэсы ў біясферы. Такім чынам, вынікі вайны стануць катастрафічнымі не толькі для тых, хто будзе ў ёй удзельнічаць непасрэдна. Ядзерная вайна, калі яна

пачнецца, закране ўсіх. Значыць, прадухіленне гэтай вайны становіцца глабальнай праблемай чалавецтва.

Аднак, ці магчыма гэта? Ваенныя арсеналы яшчэ напоўнены зброяй. Не спыняюцца выпрабаванні навейшай ваеннай тэхнікі. Расходы на ўзбраенне складаюць цяпер трыльён долараў штогод. Нават 5 % ужо сабраных вялікімі дзяржавамі ядзерных запасаў дастаткова, каб уцягнуць планету ў незваротную экалагічную катастрофу. Не спыняюцца і лакальныя ваенныя канфлікты, кожны з якіх тоіць небяспеку перарастання ў рэгіянальны ці нават сусветны.

Дык ці ёсць надзея пазбегнуць ядзернай катастрофы? Яшчэ нямецкі філосаф І. Кант сцвярджаў, што свет непазбежна пракладзе сабе дарогу, паколькі прыходзіць усведамленне недапушчальнасці вайны. Аналагічную думку, па сведчанню Н. К. Крупскай, выказваў і Ленін, які сцвярджаў, што «будзе такі час, калі вайна стане настолькі разбуральнай, што яна наогул стане немагчымай» (Крупская Н. К. О Ленине. М. 1960. С. 40—41). Са стварэннем і накапленнем ядзернай зброі такі час прыйшоў. «Мы павінны ўвесь час яшчэ і яшчэ раз папярэджваць аб небяспецы; мы можам і павінны ўсімі сіламі дабівацца таго, каб народы свету і асабліва іх урады ўсвядомілі ўвесь жах катастрофы, якую яны абавязкова выкліча, калі не памяняюць сваіх адносін адзін да аднаго і свайго падыходу да задачы пабудовы будучага»,— заклікаў А. Эйнштэйн, звяртаючыся да вучоных свету.

Што значыць памяняць свае адносіны адзін да аднаго? Відаць, гэта мяркуецца стварэнне такога парадку ў свеце, які засноўваўся б на наступных зыходных прынцыпах, што складаюць сутнасць новага палітычнага мыслення:

прызнанне прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, адносіны да чалавечага жыцця і свету як да вышэйшых каштоўнасцей чалавецтва;

адказ ад вайны як сродку рашэння спрэчных пытанняў, няспынны пошук ва ўсіх выпадках палітычных шляхоў вырашэння канфліктаў і праблем;

прызнанне права народаў свабодна і самастойна выбіраць свой лёс;

разуменне сучаснага свету як цэласнага і ўзаемазвязанага згуртавання людзей.

Новае палітычнае мысленне пракладвае дарогу

новай практыцы міжнародных адносін. Ужо прыносяць свае рэальныя вынікі намаганні, у першую чаргу, СССР і ЗША, па скарачэнню ваенных арсеналаў. Практычна адзінадушны адпор згуртавання нацый выклікае любая агрэсія, у якім бы пункце Зямлі яна не ўзнікла. Мацнеюць адносіны даверу і супрацоўніцтва паміж народамі. Доўгі шлях да трывалага і надзейнага міру, але першыя, найбольш цяжкія крокі да яго ўжо зроблены.

Праблема «Поўнач — Поўдзень»

Так часта ў літаратуры абазначаецца тэндэнцыя росту эканамічнага адставання краін «трэцяга свету» ад вядучых дзяржаў Захаду. Крушэнне каланіяльнай сістэмы імперыялізму ў 50—60-я гг. парадзіла аптымістычныя прагнозы хуткага эканамічнага і культурнага адраджэння краін, якія заваявалі палітычную незалежнасць. Сапраўды, да 70-х гг. гэтыя дзяржавы захоўвалі даволі высокія тэмпы развіцця (у першую чаргу гэта адносіцца да так званых «новых індустрыяльных» і нафтаэкспартуючых краін). Аднак у 80-я гг. эканамічны рост у зоне вызваліўшыхся дзяржаў у цэлым рэзка запаволіўся. Падзенне іх долі ў сусветным гандлі прымусіла звярнуцца да знешніх пазык. К другой палавіне 80-х гг. утварыўся трыльённы доўг «трэцяга свету» Захаду. Пачаў павялічвацца разрыў паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Калі ў 1960 г. суадносіны паміж імі па валавому нацыянальнаму прадукту на душу насельніцтва былі 26:1, то цяпер яны складаюць 40:1.

Прычын узмацнення названай тэндэнцыі нямала. Адна з іх звязана з дэмаграфічнай сітуацыяй у краінах «трэцяга свету». У 1987 г. на Зямлі быў зарэгістраваны пяцімільярдны жыхар. К пачатку будучага стагоддзя па прагнозах спецыялістаў насельніцтва Зямлі можа дасягнуць 6 мільярдаў. Найбольш хуткімі тэмпамі насельніцтва павялічваецца ў менш сацыяльна-эканамічна развітых краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, што рэзка абвастрае праблему жылля, адукацыі, медыцынскага абслугоўвання і, у першую чаргу, харчавання. Па даных ААН, штогод ад голаду ў сённяшнім свеце памірае каля 50 млн чалавек. Пераважная большасць з іх прыпадае на долю краін, якія развіваюцца.

Няўжо голад, галеча і хваробы будуць пастаянным

спадарожнікам жыцця значнай часткі насельніцтва нашай планеты? Большасць вучоных лічыць, што чалавецтва валодае неабходнымі інтэлектуальнымі магчымасцямі і матэрыяльнымі рэсурсамі для пераадолення сацыяльна-эканамічнага адставання краін «трэцяга свету». Перш за ўсё, як паказвае сусветны вопыт апошніх дзесяцігоддзяў, паддаецца разумнаму рэгуляванню дэмаграфічная сітуацыя на аснове паступовага змянення каштоўнасных установак і паводзінскіх стэрэатыпаў у галіне шлюбна-сямейных адносін. Галоўнае, аднак, не ў гэтым. Скарачэнне гонкі ўзбраенняў, значнае змяншэнне ваенных расходаў даюць магчымасць вызваліць значныя сродкі, якія можна было б накіраваць на развіццё краін «трэцяга свету». Па наяўных разліках, адной дзесятай долі адлічэнняў ад ваенных расходаў дастаткова, каб забяспечыць неабходныя капіталаўкладанні для мадэрнізацыі эканомікі краін, якія развіваюцца.

Такім чынам, мы зноў упэўніваемся ва ўзаемасувязі глабальных праблем і неабходнасці комплекснага падыходу да іх рашэння на аснове міжнароднага супрацоўніцтва розных краін.

Пытанні і заданні

1. Якія праблемы адносяцца да глабальных? Чаму яны атрымалі такую назву?

2. Чым выклікана паяўленне глабальных праблем чалавецтва?

3. Пакажыце ўзаемасувязь глабальных праблем.

4. Якія прычыны экалагічнага крызісу? У чым ён праяўляецца?

5. Што такое новае палітычнае мысленне? Ці звязана яго зараджэнне з паяўленнем глабальных праблем? Адказ абгрунтуйце.

6. Па даных заходняй медыцыны, ужо цяпер 75 % хвароб чалавека звязана з забруджваннем навакольнага асяроддзя, якое носіць глабальны характар. Прывядзіце канкрэтныя прыклады такой сувязі.

7. «Культура,— пісаў К. Маркс,— калі яна развіваецца стыхійна, а не накіроўваецца свядома... пакідае пасля сябе пустыню...» (Творы. Т. 32. С. 45). Што меў на ўвазе Маркс пад словам культура? Што значыць накіроўваць развіццё культуры свядома?

8. Удзельнікі міжнароднай канферэнцыі па праблемах экалогіі ў 1989 г. успомнілі такую прытчу: «Дзве жабы папалі ў гаршчок з вяршкамі. Адна сказала: «Гэта канец», склала лапкі і захлынулася. Другая боўталася... збіла пад сабою камяк масла і выбралася з гаршка...» Якая сувязь паміж гэтай прытчай і экалагічнымі праблемамі, што абмяркоўваліся?

9. Вялікі рускі вучоны Д. І. Мендзялееў гаварыў: «Галоўная мэта перадавой тэхналогіі — адшукванне спосабаў вытворчасці карыснага з кінутага, бескарыснага».

Ці актуальная гэта думка сёння? Свой адказ абгрунтуйце.

10. У вядомым трактаце «Да вечнага міру» І. Кант выклаў

умовы дасягнення надзейнага і справядлівага міру: мірны дагавор не павінен пры сваім заключэнні захоўваць магчымасць новай вайны; ні адна самастойная дзяржава не можа быць набыта іншымі дзяржавамі шляхам наследавання, абмену, куплі ці дарэння; пастаянныя арміі павінны з часам знікнуць; ні адна дзяржава не павінна насільна ўмешвацца ў палітычны лад другой дзяржавы. Ці актуальныя гэтыя патрабаванні сёння? Свой адказ абгрунтуйце.

11. У краінах, якія развіваюцца, з найменшым нацыянальным даходам на душу насельніцтва ў 1972 г. на ваенныя расходы ішло 17,2 %, на адукацыю — 12,7 %, на ахову здароўя — 4,6 %. К 1983 г. доля ваенных расходаў павысілася да 19,5 %, а доля адукацыі скарацілася да 4,7 %; ахова здароўя — 2,7 %. Пракаменціруйце гэтыя даныя.

12. Англійскі эканаміст Т. Мальтус сцвярджаў, што насельніцтва Зямлі расце ў геаметрычнай прагрэсіі, г. зн. павялічваецца з неверагоднай скорасцю, а прырост неабходнага для яго пракармлення харчавання ажыццяўляецца ў арыфметычнай прагрэсіі. Якія вывады вынікаюць з гэтага сцверджання? Ці падзяляеце вы іх?

13. Чаму рашэнне глабальных праблем патрабуе сумесных намаганняў усіх народаў? Прывядзіце прыклады падобнага міжнароднага супрацоўніцтва.

14. Існуюць два пункты погляду на ролю глабальных праблем у развіцці. Адны сцвярджаюць, што вырашыць іх не ўдасца, і паяўленне гэтых праблем прадвяшчае блізкі крах сучаснай цывілізацыі. Іншыя лічаць, што людзі знойдуць прыдатныя сродкі вырашэння глабальных праблем, а сам гэты сумесны пошук аказвае інтэгруючае ўздзеянне на чалавецтва, збліжае народы, садзейнічае станаўленню адзінай цывілізацыі. А які ваш пункт погляду?

§ 17. САВЕЦКАЕ ГРАМАДСТВА Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ

Савецкае грамадства знаходзіцца ў паласе глыбокіх перамен. Спачатку іх назвалі перабудовай, нярэдка называлі абнаўленнем, а цяпер — мірнай рэвалюцыяй. Значыць, у жыццё ўваходзіць новае. Адны людзі гэта новае разумеюць так, што трэба ствараць грамадскія парадкі, якіх яшчэ нідзе не было, г. зн. быць першапраходцамі. Іншыя лічаць, што новымі для нас могуць стаць многія дасягненні чалавечай цывілізацыі, якія адхіляліся раней з-за жорсткага супрацьпастаўлення дзвюх сацыяльна-эканамічных сістэм: капіталізму і сацыялізму. Але ўсе прызнаюць, што краіна перажывае пераходны стан. А для пераходнага грамадства заўсёды характэрна наяўнасць элементаў старога (былых устаноў, законаў, трацыцый, прывычак і г. д.) і элементаў новага (новых арганізацый, якія ўзнікаюць, прававых норм, адносін і да т. п.). Іх узаемадзеянне супярэчлівае; яно параджае ў грамадска-палітычным

жыцці складаную сітуацыю, якая хутка мяняецца.

Пераходны стан грамадства можна правільна зразумець, калі задумацца над пытаннем: ад чаго і да чаго ажыццяўляецца пераход? З якімі сацыяльнымі парадкамі расстаёмся? Да якога грамадскага ладу імкнёмся?

Неабходнасць перабудовы

Каб адказаць на пастаўленыя пытанні, спатрэбіцца кароткі гістарычны экскурс. Напомнім пра спрэчку, якая разгарнулася ў гады рэвалюцыі ў асяроддзі сацыялістаў. Выказвалася наступнае меркаванне: Расія яшчэ не дарасла да сацыялізму, яна не дасягнула неабходнай вышыні развіцця вытворчых сіл, недастатковы ўзровень культуры. Для стварэння сацыялізму патрэбна цывілізаванасць, якой у Расіі няма.

Супрацьлеглы пункт погляду: Расія стаіць на мяжы краін цывілізаваных і краін, якія толькі яшчэ ўцягваюцца ў цывілізацыю. Таму яе развіццё можа быць своеасаблівым. Яна пачынае з заваявання рэвалюцыйным шляхам магчымасці стварэння асноўных пасылак цывілізацыі. Такія погляды развіваў у 1923 годзе У. І. Ленін. Кастрычніцкая рэвалюцыя, як ён лічыў, стварыла ўмовы для далейшага росту цывілізацыі ў Расіі. Аднак бязлітаснае класавае змаганне ўжо ў першыя гады пасля Кастрычніка прычыніла нямалы ўрон гаспадаркі і культуры краіны. Праз некалькі гадоў пасля смерці У. І. Леніна ў кіруючай бальшавіцкай партыі перамагло ўзнікшае ў папярэднія гады імкненне пайсці да сацыялізму не пасля стварэння неабходных для гэтага матэрыяльных і культурных прадпасылак, а адразу, як мага хутчэй. Узмацнілася жаданне «падагнаць» развіццё, паскорыць яго, выкарыстоўваючы прымус. Пры гэтым Сталін, які сканцэнтраваў у сваіх руках вялікую ўладу, умела сыграў на рэвалюцыйнай нецярплівасці мас, ураўняльнай псіхалогіі, якая шырока распаўсюдзілася.

У гэтых умовах узмацнілася роля каманды (дырэктывы), абавязковай для выканання. Узрасла роля адміністрацыйнага апарату, які забяспечваў правядзенне ў жыццё палітыкі паскоранага руху да сацыялізму. Работнікі кіравання занялі асобае становішча ў грамадстве, партыйна-дзяржаўны апарат прысвоіў сабе правы выбарных Саветаў; інструкцыі, якія ён выдаваў, сталі прыярытэтнымі перад законам. Склалася іерархічна арганізаваная, адарваная ад народа

і чужая яму бюракратычная сістэма кіравання грамадствам.

Усталяваўся аўтарытарна-дэспатычны рэжым, г. зн. палітычны парадак, пры якім жыццё грамадства падначалена не закону, а самавольнай, камандна-загаднай уладзе, якая патрабуе беспярэчнага паслушэнства. Ён знішчаў у зародку самыя малыя расткі дэмакратыі, душыў народную самастойнасць. Ён дазваляў Сталіну і яго акружэнню, якія кіравалі краінай, тварыць любыя беззаконнасці, пазбягаючы адказнасці за зробленыя злачынствы.

Дзяржаўнае рэгуляванне і кантроль былі распаўсюджаны на ўсе сферы грамадскага жыцця. Гэта літаральна спавіло грамадства, стала сур'ёзным тормазам для ініцыятывы людзей. У ідэалогіі элементы гуманістычных каштоўнасцей душыліся ідэямі спрошчанай калектыўнасці, бяздумнага падначалення загаду. Энтузіязм спалучаўся з падзеннем маральнасці, аслабленнем ролі сумлення. Сталінскія скажэнні прывялі да страты галоўнага ў гуманістычным разуменні сацыялізму: разумення чалавека як мэты. Чалавек стаў разглядацца як сродак, «вінцік» у партыйна-дзяржаўным механізме.

XX з'езд КПСС (1956), асудзіўшы змрочныя бакі сталінскага рэжыму, не закрануў у сваіх вывадах бюракратычную сістэму. У 70-х — пачатку 80-х гг. адміністрацыйна-камандная сістэма набірала ўсё большую сілу.

У выніку савецкае грамадства ўступіла ў паласу глыбокага крызісу. Застой у сацыяльна-эканамічным развіцці меў цяжкія вынікі. Іх аналіз прывёў спецыялістаў да наступнага вываду: у агульна-цывілізаваным плане ў радзе важных сфер і напрамкаў мы засталіся як бы ў мінулай тэхналагічнай эпосе, а краіны Захаду перайшлі ў іншую — эпоху высокіх тэхналогій, прынцыпова новых магчымасцей навукі і вытворчасці, новых форм жыццезабеспячэння людзей, аж да быту.

Вучоныя — гісторыкі, філосафы, палітолагі — і сёння вядуць спрэчкі аб тым, якая грамадская сістэма склалася ў СССР у 30—40-х гг. Адны гавораць, што гэта было раннесацыялістычнае грамадства, якое падверглася больш ці менш значным дэфармацыям. Другія сцвярджаюць, што створаны грамадскі лад нічога агульнага з сацыялізмам не мае. Трэція лічаць, што ўзнікшую грамадскую сістэму трэба разглядаць як

горшы з магчымых варыянтаў сацыялізму, маючы на ўвазе, што яшчэ К. Маркс крытыкаваў ідэі «казарменнага» сацыялізму, які прыгнятае чалавечую асобу, падначальвае яе дэталёвай рэгламентацыі.

Успомніце тое, што вы вывучалі ў курсе гісторыі, і падумайце: які пункт погляду вам уяўляецца найбольш правільным?

Вектар абнаўлення

Крызіс грамадства паказаў: так далей жыць нельга. Патрэбны значныя перамены ў жыцці грамадства. Нягледзячы на праследаванні іншадумцаў у 60—70-я гг., узмацнілася крытыка адміністрацыйна-бюракратычнай сістэмы, якая склалася, нараджаліся праекты рэформ у эканоміцы і палітыцы. Аб неабходнасці карэнных пераўтварэнняў у красавіку 1985 г. заявіў М. С. Гарбачоў. Аднак уяўленне аб тым, якія змены неабходны, якія грамадскія парадкі трэба ствараць, склалася не адразу. Яно ўдакладнялася ўжо ў ходзе рэформ, што пачаліся, па меры таго як усё больш зразумелым станавілася цяжкае становішча краіны.

Першапачаткова намячалася ўдасканаленне сістэмы, якое павінна было прывесці да паскоранага развіцця краіны. Жыццё даволі хутка паказала, што такім шляхам вывесці грамадства з крызісу не ўдаецца. Стала зразумела, што трэба не ўдасканальваць, а перабудоўваць асновы грамадскага ладу. Што гэта азначае?

На гэта пытанне даюцца розныя адказы.

Прыхільнікі сацыялістычнай ідэі лічаць, што неабходна стварыць новую мадэль сацыялізму — гуманны, дэмакратычны сацыялізм, г. зн. грамадства, мэтай якога з'яўляецца чалавек.

Гэтай пазіцыі супрацьстаіць другая: адказацца ад праектавання новых мадэлей грамадства і ісці па шляху, які ўжо праверaны вопытам і дасягненнямі найбольш развітых капіталістычных краін.

Існуе і трэці пункт погляду: не спрачацца аб паняццях (сацыялізм, капіталізм), а паслядоўна вырашаць наспелыя праблемы грамадскага развіцця, рухацца ўперад па шляху дэмакратычных пераўтварэнняў, каб у далейшым вучоныя вызначылі, як назваць грамадскі лад, што склаўся.

Аднак ёсць рад арыенціраў, якія ляжаць у ходзе карэнных дэмакратычных рэформ.

Сэнс гэтых пераўтварэнняў заключаецца ў тым, што для чалавека павінны быць створаны ўмовы жыцця

і працы, якія адпавядаюць сучаснай цывілізацыі. Маюцца на ўвазе, перш за ўсё, **грамадзянскія правы і свабоды;** рэалізацыя правоў грамадзян на ўзроўні прызнаных міжнародных норм; выключэнне любой дыскрымінацыі па нацыянальна-этнічных, палітычных, полаўзроставых прыметах; надзейная заканадаўчая абарона асобы і годнасці грамадзяніна; свабоднае самавызначэнне чалавека ў яго светапоглядзе і духоўных інтарэсах; свабода сумлення; павышэнне ролі суда і грамадскіх арганізацый у абароне грамадзянскіх правоў.

У якасці асновы дабрабыту абноўленага грамадства і кожнага чалавека выступае сумленная праца.

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя парадкі становяцца сродкам, а чалавек — мэтай. Уся сацыяльная сістэма павінна быць павернута тварам да чалавека, які з'яўляецца галоўнай каштоўнасцю грамадства.

У **эканамічнай** галіне маецца на ўвазе змешаная рыначная эканоміка з разнастайнымі формамі ўласнасці пры сацыяльнай справядлівасці і салідарнасці.

У **палітычным** плане — гэта грамадства, дэмакратычна ўладкаванае, з парламенцкай сістэмай, прынцыпам падзелу ўлады, вяршэнствам права. Гутарка ідзе аб забеспячэнні сапраўднага народаўладдзя шляхам фарміравання механізмаў грамадзянскага грамадства і прававой дзяржавы, аб дэмакратызацыі не толькі дзяржаўнай сістэмы, а і ўсяго грамадскага жыцця. Усё гэта павінна паслужыць магутным стымулам павышэння сацыяльнай актыўнасці і самадзейнасці мас.

Месца унітарнай дзяржавы павінен заняць **Саюз суверэнных дзяржаў.**

Радыкальныя перамены павінны адбыцца ў галіне **ідэалогіі, культуры, адукацыі.** Яны адкрываюць шырокую прастору духоўнаму развіццю самога чалавека і грамадства, у якім ён жыве, выяўленню талентаў, здольнасцей і прадпрымальнасці ва ўсіх галінах дзейнасці.

Наколькі жыццёвыя гэтыя арыенціры? Ці рэальныя такія змены? Іх рэальнасць, перш за ўсё, залежыць ад дакладнага аналізу сапраўднага жыцця савецкага грамадства, тэндэнцый яго развіцця. Іх рэальнасць звязана таксама з праўдзівай ацэнкай гістарычнага — і гераічнага, і трагічнага — вопыту краін, якія пазналі розныя варыянты сацыялістычнага развіцця.

Важны таксама ўлік багатага, рознабаковага вопыту сацыял-дэмакратыі. Яна ўнесла істотны ўклад у стварэнне каштоўнасцей сацыялізму, у правядзенне сацыяльных рэформ у інтарэсах працоўных у радзе краін, дзе сацыял-дэмакраты аказаліся ва ўладзе.

Жыццёвасць палітычных арыенціраў дэмакратычнай рэфармацыі вызначаецца апорай на лепшыя дасягненні чалавечага розуму, набыты ва ўсім свеце вопыт эфектыўнага гаспадарання, вырашэння сацыяльных праблем, развіцця дэмакратыі. Абноўленае грамадства не можа быць нічым іншым, як прадуктам сусветнай цывілізацыі і гістарычнай творчасці народа. Пераход да яго звязаны з пераадоленнем канфрантацыйнага падыходу, які супрацьпастаўляў сучасныя сацыяльныя сістэмы. І ў краінах Захаду, і ў нас адбываюцца падобныя па свайму зместу змяненні, выкліканыя ў канчатковым выніку развіццём сучасных вытворчых сіл, навукова-тэхнічным прагрэсам. Многія працэсы абнаўлення нашага грамадства з'яўляюцца працэсамі агульнацывілізацыйнымі, якія ў той ці іншай форме адбываліся ці адбываюцца цяпер і ў краінах з іншым сацыяльным ладам.

Такім чынам, мы коратка адказалі на пастаўленае ў пачатку параграфа пытанне: пераходзіць ад чаго да чаго заклікае нас ідэя абнаўлення грамадства. Аднак пераход, які пачаўся, аказаўся нялёгкім.

Супярэчнасці пераходнага перыяду

Перабудова выклікала глыбокія перамены, што закранаюць усе сферы жыцця. Пачаліся глыбокая эканамічная рэформа, рэформа палітычнай сістэмы, пераўтварэнне звышцэнтралізаванай дзяржавы ў саюз суверэнных рэспублік. У жыццё ўваходзяць свабодамыснасць і галоснасць. Новае палітычнае мысленне вызваліла ад канфрантацыйнага падыходу знешнюю палітыку.

Аднак задачы пераўтварэнняў у вялікай краіне, якая перажывае глыбокі крызіс, аказаліся надзвычайна складанымі. Навізна гэтых задач прывяла да таго, што ў пошуках правільных рашэнняў дапускаліся памылкі, а па шэрагу пытанняў прыняцце неабходных мер спазнялася. Між тым становішча ў краіне ўскладнялася. Пагоршылася харчовае забеспячэнне, у радзе раёнаў узніклі міжнацыянальныя канфлікты, аслабела дзяржаўная і працоўная дысцыпліна, узрасла злачыннасць.

Калі ж перабудова падышла да рашаючага этапа — пераразмеркавання ўлады і ўласнасці,— рэзка абвастрылася палітычная барацьба паміж узнікшымі ў краіне шматлікімі партыямі, рухамі, рознымі сацыяльнымі групамі.

Перабудова закранула інтарэсы тых, у чыіх руках была рэальная ўлада і хто ад імя народа распараджаўся грамадскім багаццем. Яна наткнулася на супрацьдзеянне з боку партыйна-дзяржаўнай бюракратыі, а таксама з боку тых сацыяльных сіл, якія прыстасаваліся да былой сістэмы, што гарантавала ім мінімум матэрыяльных даброт, незалежна ад працоўнага ўкладу. Палітычныя арганізацыі, якія іх прадстаўляюць, выступілі супраць радыкальных змен, за захаванне камандна-адміністрацыйнай сістэмы.

Абвастрылася барацьба і сярод прыхільнікаў перабудовы па пытанню аб яе тэмпах і метадах ажыццяўлення.

Сутыкненне прагрэсіўна-рэфарматарскіх і рэакцыйных сіл адбылося ў жніўні 1991 г. Антыканстытуцыйны пераварот, здзейснены праціўнікамі дэмакратычных пераўтварэнняў, праваліўся, а перамога дэмакратычных сіл прывяла да крушэння аслабленай к таму часу таталітарнай сістэмы.

Сучаснае савецкае грамадства — гэта складанае спалучэнне мінулага і цяперашняга, перапляценне разнастайных інтарэсаў, аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, спалучэнне супярэчнасцей, якія накапіліся раней, і супярэчнасцей пераходнага перыяду.

Што трэба зрабіць, каб выйсці з крызісу? На гэта пытанне даюцца розныя адказы. Назавём найбольш агульныя меркаванні, якія прапанавалася ўвесці ў антыкрызісную праграму.

Неабходна паслядоўнае, рашучае ажыццяўленне намечаных пераўтварэнняў у эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай і духоўнай сферах жыцця савецкага грамадства.

Толькі шляхам глыбокіх рэформ можна зняць супярэчнасці, абвастрэнне якіх выклікае напружанасць у грамадстве. Ні вяртанне назад, да панавання камандна-адміністрацыйнай сістэмы, ні затрымка на шляху ад папярэдняга да новага стану грамадства не могуць пераадолець крызіс, больш таго, прывядуць да пагоршання становішча.

Палітычная барацьба ў грамадстве павінна весціся

толькі канстытуцыйнымі сродкамі, у рамках законаў. Беспарадак, парушэнні законнасці не садзейнічаюць выхаду з крызісу, а толькі ўзмацняюць нестабільнасць у грамадстве.

Важнай умовай выхаду з крызісу з'яўляецца грамадзянская згода, супрацоўніцтва ўсіх прагрэсіўных сіл у ажыццяўленні антыкрызісных мер. Канфрантацыя, распальванне варожасці да тых ці іншых сацыяльных груп, нацый, палітычных арганізацый стварае толькі небяспеку грамадзянскай вайны з яе разбуральнымі вынікамі.

Падумайце, рэалізацыя якіх яшчэ ўмоў, акрамя названых, неабходна для выхаду краіны з крызісу.

Пытанні і заданні

1. Чаму стала неабходнай перабудова?

2. Якая сувязь перабудовы з агульначалавечымі каштоўнасцямі?

3. У чым заключаюцца галоўныя задачы абнаўлення грамадства ў эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай і духоўнай сферах?

4. У чым праяўляецца крызіс савецкага грамадства і якія шляхі выхаду з яго?

5. Як бы вы ахарактарызавалі сацыялістычнае грамадства, рысы якога паказаны ў наступных выказваннях сацыялістаў мінулага?

Тамаза Кампанела: «Размеркаванне ўсяго знаходзіцца ў руках службовых асоб; але паколькі веды, пашана і ўцехі з'яўляюцца агульным набыткам, то ніхто не можа нічога сабе прысвоіць... Нараджэнне патомства мае на ўвазе інтарэсы дзяржавы, а інтарэсы прыватных асоб — толькі пастолькі, паколькі яны з'яўляюцца часткамі дзяржавы...»

Гракх Бабёф: «...Знішчыць прыватную ўласнасць, прымацаваць кожнага чалавека ў адпаведнасці з яго здольнасцямі да майстэрства, якое ён ведае; прымусіць яго здаваць у натуры вынікі сваёй працы на агульны склад і стварыць простую адміністрацыю размеркавання... якая, ведучы ўлік усіх суграмадзян і ўсіх вырабаў, размяркуе апошнія на аснове стражайшай роўнасці...»

6. Ці ўдалося рэалізаваць наступную ідэю Ф. Энгельса: «...Гутарка ідзе аб стварэнні для **ўсіх людзей** такіх умоў жыцця, пры якіх кожны атрымлівае магчымасць свабодна развіваць сваю чалавечую прыроду, жыць з усімі блізкімі ў чалавечых адносінах і не баяцца насільнага разбурэння свайго дабрабыту... Мы зусім не хочам разбураць сапраўднае чалавечае жыццё з усімі яго ўмовамі і патрабаваннямі, наадварот, мы ўсяляк імкнёмся ствараць яго»?

Параўнайце гэта выказванне з ідэямі гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму, якія выкладзены ў параграфе. Свой вывад аргументуйце.

7. Выдатны рускі мысліцель М. А. Бярдзяеў пісаў у 1937 г.: «Камунізм па сваёй ідэі хацеў бы ажыццявіць не толькі справядлівасць, але і брацтва ў чалавечых адносінах... Але наіўна і смешна думаць, што брацтва паміж людзьмі можа быць здзейснена шляхам

знешняй прымусовай сацыяльнай муштроўкі, шляхам прывычкі... Для гэтага патрэбна дзеянне глыбінных духоўных сіл».

Ці згодны вы з гэтым меркаваннем? Сваю пазіцыю растлумачце.

8. Ці лічыце вы актуальнымі наступныя думкі К. Маркса: «Бюракратыя лічыць сябе канчатковай мэтай дзяржавы... дзяржаўныя задачы ператвараюцца ў канцылярскія задачы, або канцылярскія задачы ў дзяржаўныя... Бюракратыя мае ў сваім валоданні дзяржаву... гэта ёсць яе **прыватная ўласнасць»** (Творы. Т. 1. С. 271—272).

Свой пункт погляду аргументуйце.

9. Супастаўце наступныя паказчыкі:

«У канцы 70-х гг. у народнай гаспадарцы СССР пераважна ручной працай займалася каля 40 млн чалавек, а к сярэдзіне 80-х гг.— каля 50 млн».

«У сярэдзіне 80-х гг. толькі 29 % серыйна выпускаемай машынабудаваннем СССР прадукцыі адпавядала сусветнаму ўзроўню».

«Сяроднегадавыя тэмпы росту прадукцыйнасці працы склалі ў 1951—1960 гг. 8 %, у 1971—1975 гг.— 4,6 %, у 1981—1985 гг.— 3 %».

Аб чым сведчаць прыведзеныя лічбы? Якія прычыны адлюстраваных у іх тэндэнцый?

10. Растлумачце, як звязаны паміж сабой прыметы будучага грамадства, якія сфармуляваны ў Праграмнай заяве XXVIII з'езда КПСС (1990) «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму».

«У нашым разуменні гуманны, дэмакратычны сацыялізм — гэта грамадства, у якім:

мэтай грамадскага развіцця з'яўляецца чалавек; для яго ствараюцца ўмовы жыцця і працы, дастойныя сучаснай цывілізацыі; пераадольваецца адчужэнне чалавека ад палітычнай улады, створаных ім матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, забяспечваецца яго актыўнае ўключэнне ў грамадскія працэсы;

на аснове разнастайных форм уласнасці і гаспадарання забяспечваецца ператварэнне працоўных у гаспадароў вытворчасці, моцная матывацыя высокапрадукцыйнай працы, найлепшыя ўмовы для прагрэсу прадукцыйных сіл, рацыянальнага прыродакарыстання; гарантуюцца сацыяльная справядлівасць і сацыяльная абароненасць працоўных;

адзінай крыніцай улады з'яўляецца суверэнная воля народа; дзяржава, падкантрольная грамадству, гарантуе абарону правоў і свабод, гонару і годнасці чалавека незалежна ад яго сацыяльнага становішча, полу і ўзросту, нацыянальнай прыналежнасці і веравызнання; ажыццяўляецца свабоднае спаборніцтва ўсіх грамадска-палітычных сіл, якія дзейнічаюць у рамках закону.

Гэта грамадства, якое паслядоўна выступае за мірнае і раўнапраўнае супрацоўніцтва паміж народамі, павагу правоў кожнага народа вызначаць свой лёс».

Падумайце: ці можна змяніць толькі адзін з названых бакоў жыцця грамадства, не змяняючы іншыя? Аргументуйце свой адказ.

Раздзел IV. ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

§ 18. ЭКАНОМІКА І ЯЕ РОЛЯ Ў ЖЫЦЦІ СУЧАСНАГА ГРАМАДСТВА

Слова «эканоміка» — грэчаскага паходжання. Спачатку яно абазначала майстэрства кіравання дамашняй гаспадаркай. У наш час паняцце «эканоміка» абазначае шырокую галіну ў жыцці грамадства — гэта эканоміка прадпрыемстваў, народная гаспадарка ў цэлым, розныя бакі гаспадарчай дзейнасці, фінансы, грашовы абарот і многае іншае. Мы будзем гаварыць аб эканоміцы ў шырокім сэнсе слова, падразумяваючы сістэму грамадскай вытворчасці.

Вытворчасць

Вытворчасць — гэта працэс стварэння матэрыяльных даброт, неабходных для існавання і развіцця чалавечага грамадства.

У любой вытворчасці ўзаемадзейнічаюць **рабочая сіла** і **сродкі вытворчасці.** Рабочая сіла — гэта чалавечы фактар вытворчасці, а сродкі вытворчасці — гэта матэрыяльны фактар (успомніце, што абазначаюць паняцці «прадмет працы» і «сродкі працы»). Самі па сабе гэтыя фактары нічога не вырабляюць. Толькі іх злучэнне ў працэсе працы дазваляе ствараць жыццёвыя даброты, г. зн. ажыццяўляць вытворчасць. Паміж рабочай сілай чалавека, прадметамі працы і сродкамі працы ўзнікае складаная сістэма ўзаемадзеяння. Гэта ўзаемадзеянне, а таксама спосабы ўздзеяння чалавека на прадметы працы называецца **тэхналогіяй.**

Зладжанасць функцыяніравання названых фактараў, усіх людзей, што ўдзельнічаюць у працы, забяспечваецца **арганізацыяй вытворчасці.**

Вытворчасць на пэўным узроўні развіцця называецца **спосабам вытворчасці** (успомніце, што ўваходзіць у паняцці «спосаб вытворчасці», «прадукцыйныя сілы», «вытворчыя адносіны»).

Прадукцыйныя сілы — гэта вядучы бок грамадскай вытворчасці. Яны выяўляюць адносіны грамадства да прыроды.

Але ў працэсе вытворчасці людзі ўступаюць таксама і ў адносіны паміж сабою, г. зн. у **вытворчыя адносіны.** Яны таксама ўяўляюць сабою складаную сістэму, якая ўключае ў сябе адносіны ўласнасці, а так-

сама формы размеркавання вырабленага прадукту, яго абмену і спажывання. Іх мы разгледзім у далейшым.

Вытворчасць матэрыяльных даброт складае аснову жыцця чалавечага грамадства. Яна павінна быць няспыннай. Можна ўявіць сабе, што адбылося б, калі б спынілася нават на кароткі час вытворчасць электрычнасці ці вугалю, тканіны ці паперы.

Стан эканомікі і ўзровень жыцця

Існуе прамая залежнасць паміж станам эканомікі і ўзроўнем жыцця насельніцтва.

Спажыванне залежыць ад вытворчасці. Няцяжка заўважыць сувязь паміж аб'ёмам вытворчасці на душу насельніцтва і спажываннем. Так, у сярэдзіне 80-х гг. у ЗША на душу насельніцтва вырабляласа 117 кг мяса, а спажывалася на душу насельніцтва 119 кг, у Аўстраліі адпаведна — 150 і 102 кг, у Венгрыі — 216 і 79 кг, у Кітаі — 17 і 18 кг, у СССР — 61 і 62 кг. Павелічэнне ці змяншэнне спажывання залежыць таксама ад таго, купляе ці прадае краіна дадзены прадукт за мяжой. Аднак трэба помніць: для таго каб купіць што-небудзь за мяжой, трэба мець замежную валюту (грашовыя сродкі), а атрымаць яе можна за тавары ці паслугі. Напрыклад, прадаць іншы прадукт, на які ёсць попыт на міжнародным рынку. Так, каб закупіць за мяжою патрэбную колькасць збожжа, СССР вымушаны прадаваць нафту, і гэта пры тым, што ў нашай краіне ёсць цяжкасці з палівам. Зразумела, што ў гэтым выпадку больш выгадна было б вырабіць неабходную колькасць зерня ў сябе (а магчымасці для гэтага ёсць) і, што вельмі важна, захаваць усё сабранае.

Важнейшы паказчык эфектыўнасці вытворчасці — прадукцыйнасць працы. У сярэдзіне 80-х гг. у прамысловасці СССР у параўнанні з ЗША яна складала 55 %, у сельскай гаспадарцы — 20—25 %. Забяспечанасць насельніцтва таварамі масавага спажывання, прадуктамі харчавання звязана з гэтымі паказчыкамі.

Аднак прадукцыйнасць працы, як і абсалютныя паказчыкі вытворчасці (колькасць вырабляемага ў краіне металу, вугалю, нафты, аўтамабіляў, абутку і г. д.), хоць і маюць вялікае значэнне, але ўсё ж не поўнасцю характарызуюць стан эканомікі. Можна вырабіць многа электраэнергіі, сталі, збожжа і да т. п., але застацца беднымі. Як гэта можа быць? Так бывае

тады, калі гаспадарка краіны вядзецца нерацыянальна, з вялікімі затратамі і стратамі. Розныя рэсурсы, напрыклад, адпускаюцца на разнастайныя непрадукцыйныя затраты: утрыманне непамерна вялікай арміі і прамысловасці, якая абслугоўвае яе патрэбы, разбухлага бюракратычнага апарату, прадастаўленне дзяржаўных крэдытаў іншым краінам без цвёрдых гарантый іх своечасовага вяртання і да т. п. Прычынай нізкай эфектыўнасці гаспадаркі могуць быць устарэлыя тэхналогіі. Так, у СССР на здабычу адной тоны медзі затрачваецца 973 квт • гадзіны электраэнергіі, а ў ФРГ — у тры з лішнім разы менш. З-за нізкай эканамічнасці бытавых прыбораў расходуецца штогод лішніх 20 млрд квт · гадзін электраэнергіі, г. зн. столькі, колькі вырабляе гіганцкая электрастанцыя.

Уласнасць

Адносіны ўласнасці на сродкі вытворчасці складаюць аснову эканамічных адносін. Уласнасць — не проста валоданне рэчамі. За ўласнасцю стаяць адносіны паміж людзьмі. Пад эканамічнымі адносінамі ўласнасці разумеюцца адносіны людзей адзін да аднаго, абумоўленыя іх адносінамі да сродкаў вытворчасці і вырабленага з іх дапамогай прадукту. Уласнік сродкаў вытворчасці самастойна распараджаецца імі, выкарыстоўвае іх для арганізацыі вытворчасці і атрымання даходу. Іншымі словамі, каб разабрацца ў адносінах уласнасці, трэба высветліць пытанне: каму належаць сродкі вытворчасці і вырабленыя прадукты?

У сучасным грамадстве ўласнасць належыць розным гаспадарам. У замежным свеце найбольш распаўсюджанай з'яўляецца **карпаратыўная (акцыянерная)** уласнасць. Калі ў XIX ст. тыповай фігурай уласніка быў капіталіст-прадпрымальнік, то ў XX ст. развіццё атрымалі розныя віды **групавой уласнасці.** Тыповай формай такой уласнасці з'яўляецца акцыянернае грамадства (карпарацыя). У сярэдзіне 80-х гг. у ЗША з 15 млн прадпрыемстваў розных відаў было каля трох мільёнаў карпарацый, г. зн. 20 %. На іх прыходзілася 90 % валавога даходу ўсіх прадпрыемстваў краіны.

Акцыянернае таварыства выпускае каштоўныя паперы — акцыі, уласнікі якіх (акцыянеры) маюць права на атрыманне часткі даходу акцыянернага таварыства (дывідэнду), якая адпавядае суме акцый, і на ўдзел у кіраванні. Паколькі выпускаецца многа дробных акцый,

іх могуць купляць рабочыя і служачыя (у ЗША, напрыклад, у 1985 г. было 47 млн акцыянераў). Для прыняцця рашэнняў па справах акцыянернага таварыства практычна не могуць сабрацца адразу ўсе акцыянеры. Таму рэальнае кіраванне знаходзіцца ў руках групы буйных уласнікаў, якія маюць значную частку («кантрольны пакет»), але не абавязкова больш за 50 % акцый (практычна гэта можа быць 5—10 %). Іменна гэта група, а не ўсе акцыянеры, распараджаецца справамі акцыянернага таварыства.

Разам з групавой існуе і **індывідуальная прыватная ўласнасць.** Яна прадстаўлена, галоўным чынам, у сельскай гаспадарцы, рамястве, гандлі, сферы паслуг. Напрыклад, у ЗША сярэдзіны 80-х гг. у індывідуальнай уласнасці знаходзілася 10,7 млн прадпрыемстваў. Сярод іх значная колькасць дробных гаспадарак, заснаваных на асабістай працы вытворцы і яго сям'і. Дробная працоўная прыватная ўласнасць прадстаўлена сямейнымі фермамі ў сельскай гаспадарцы, майстэрнямі па рамонту бытавой тэхнікі, швейнымі, шавецкімі майстэрнямі, бензакалонкамі, харчовымі і галантарэйнымі крамкамі. У індывідуальнай прыватнай уласнасці знаходзіцца таксама значная колькасць дробных і сярэдніх фірм, якія выкарыстоўваюць наёмную працу.

У 70—80-х гг. у ЗША і краінах Заходняй Еўропы, разам з умацаваннем пазіцый буйных аб'яднанняў, узрасло значэнне дробных і сярэдніх прадпрыемстваў і фірм. Сярод агульнай колькасці дробныя прадпрыемствы (з колькасцю занятых 10—20 і менш чалавек) займаюць у краінах Заходняй Еўропы і ЗША ад 94 да 99 %. Іменна дробныя прадпрыемствы часта бяруць на сябе асваенне новай тэхнікі, выраб новых тавараў, што нярэдка звязана з рызыкай (падумайце: у чым заключаецца рызыка? Чаму рызыкуюць перш за ўсё дробныя прадпрыемствы?). Яны ажыццяўляюць паслугі па рамонту і абслугоўванню ўзрастаючай колькасці прамысловых вырабаў працяглага ўжытку (аўтамабіляў, халадзільнікаў, тэлевізараў і да т. п.). Многія дробныя фірмы ў капіталістычных краінах звязаны з буйнымі аб'яднаннямі, знаходзяцца ў вытворчай і фінансавай залежнасці ад іх. Развіццё дробнага і сярэдняга прадпрымальніцтва дазваляе лепш выкарыстоўваць эканамічны патэнцыял, не дапускае акасцянення форм гаспадарання, павышае іх гібкасць і прыстаса-

вальнасць да ўмоў, якія хутка мяняюцца.

Індывідуальная прыватная ўласнасць прадстаўлена ў эканоміцы не толькі Заходніх краін, але і краін Усходняй Еўропы, Кітая і іншых краін. У сучасным свеце прыватная ўласнасць іграе вялікую ролю: яна стымулюе ініцыятыву і прадпрымальнасць, адказныя адносіны да працы.

У эканоміцы канца XX ст. вялікае значэнне мае **дзяржаўная ўласнасць.** У краінах Заходняй Еўропы ў яе ўваходзяць, перш за ўсё, прадпрыемствы тых галін, якія абслугоўваюць вытворчасць і сацыяльна-бытавую сферу (грузавы транспарт, энергетыка, сувязь і г. д.), прамысловыя прадпрыемствы, банкі. Удзельная вага дзяржаўнага прадпрымальніцтва ў сумеснай вытворчасці на працягу XX ст. павышалася і дасягнула 15—20 %. Стварэнне дзяржаўных прадпрыемстваў часткова прадыктавана жаданнем паскорыць навукова-тэхнічны прагрэс. Так была створана атамная прамысловасць у ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі. Разам з тым дзяржава бярэ на сябе тэхнічнае пераўзбраенне слабых звенняў эканомікі. Напрыклад, у Вялікабрытаніі дзяржава пасля другой сусветнай вайны ўзяла на сябе расходы па развіццю транспарту і энергетыкі.

У 80-х гг. у радзе краін разгарнулася дэнацыяналізацыя, галоўным чынам, шляхам прыватызацыі, г. зн. пераходу ў прыватныя рукі буйных дзяржаўных прадпрыемстваў. Прычыны гэтых мерапрыемстваў, аб'яўленыя ўрадамі, заключаліся ў неэфектыўнасці, цяжкім фінансавым становішчы гэтых прадпрыемстваў. Але, як правіла, прыватызацыя нідзе не распаўсюджваецца на чыгункі, гідрастанцыі, пошту, каналы, партовыя збудаванні, якія маюць вялікае значэнне для нармальнага функцыяніравання эканомікі ў цэлым.

У СССР і краінах Усходняй Еўропы, некаторых краінах Азіі дзяржаўная ўласнасць у выніку сацыяльных рэвалюцый стала пануючай. Гэта шматлікія заводы, фабрыкі, шахты, саўгасы (дзяржгасы), сродкі транспарту і сувязі, банкі, асноўны жыллёвы фонд і г. д. У СССР і МНР у дзяржаўную ўласнасць была ператворана зямля. У Савецкім Саюзе ў сярэдзіне 80-х гг. звыш 90 % усёй прадукцыі ствараласа на дзяржаўных прадпрыемствах. У пачатку 90-х гг. у СССР і краінах Усходняй Еўропы пачаўся працэс раздзяржаўлення і частковай прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў.

Характар дзяржаўнай уласнасці істотна мяняецца ў

залежнасці ад таго, якія сацыяльныя сілы аказваюць на дзяржаўную ўладу ў той ці іншай краіне рашаючы ўплыў (манаполіі ці неманапалізаваная буржуазія, бюракратыя ці ўвесь народ і г. д.).

У эканоміцы многіх краін, як ва ўмовах сацыялістычнага, так і капіталістычнага развіцця, захавалася і **кааператыўная ўласнасць.** Вытворчы кааператыў — гэта самастойная арганізацыя, створаная групай людзей, якія добраахвотна аб'ядналіся для сумеснага выкарыстання ўласнай (ці арандаванай) маёмасці ў гаспадарчай дзейнасці. У кааператывах ажыццяўляецца самакіраванне, г. зн. іх члены самі сумесна вырашаюць пытанні гаспадарчай дзейнасці, выбіраюць органы аператыўнага кіравання. У СССР, а таксама ў краінах, якія выбралі пасля другой сусветнай вайны сацыялістычны шлях развіцця, кааператыўная ўласнасць набыла вялікую ўдзельную вагу, галоўным чынам, за кошт кааператыўных гаспадарак у вёсцы. Аднак сцвярджэнне адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў СССР прывяло да значнага адзяржаўлення сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў (калгасаў), да страты імі якасцей самакіравальных аб'яднанняў. Гэта істотна знізіла эфектыўнасць іх вытворчай дзейнасці.

Пры вялікай разнастайнасці форм уласнасці ў сучасным свеце **вы**значаюць дзве групы краін: у адной з іх (развітыя краіны Захаду, Японія і інш.) у вытворчасці пераважае карпаратыўная ўласнасць, а ў другой (СССР, краіны Усходняй Еўропы, Кітай і інш.) у цяперашні час — дзяржаўная ўласнасць.

Размеркавальныя адносіны

Ад адносін уласнасці залежаць і размеркавальныя адносіны. Вы ведаеце, што ў ходзе капіталістычнага развіцця сродкі вытворчасці сканцэнтраваліся ў руках нямногіх.

Створаная працаю наёмных работнікаў прыбавачная вартасць і ў наш час прысвойваецца ўласнікамі сродкаў вытворчасці. Аднак у развітых краінах сучаснага свету такое прысваенне не супадае з паняццем эксплуатацыі. Прыбавачная вартасць падзяляецца як бы на тры патокі.

Адна яе частка траціцца на расшырэнне вытворчасці, што, у асноўным, адказвае патрабаванням усяго грамадства.

Другая частка бярэцца праз сістэму падаткаў у дзяржаўны бюджэт і выкарыстоўваецца для ўтрымання

дзяржаўнага апарату, а таксама для сацыяльнай дапамогі бедным, беспрацоўным і да т. п., на іншыя дзяржаўныя патрэбы. У развітых краінах Захаду разгортваюцца вялікія ўрадавыя праграмы, якія садзейнічаюць росту ўзроўню жыцця, развіццю адукацыі і аховы здароўя. Створаны нацыянальныя сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Напрыклад, у Аўстрыі ў 70-х гг. былі павышаны пенсіі, школьнікі пачалі бясплатна атрымліваць падручнікі і карыстацца рознымі відамі транспарту, рэгулярна праводзяцца медагляды на вытворчасці і ў навучальных установах.

Што датычыцца трэцяй часткі прыбавачнай вартасці, то яна ўключае ў сябе плату за арганізацыю вытворчасці, г. зн. узнагароджанне за высокакваліфікаваную кіраўніцкую працу капіталіста-арганізатара ці нанятага капіталістам менеджэра (кіраўніка). Частка ж прыбавачнай вартасці, якая засталася, уяўляе сабой эксплуататарскі даход. Яго атрыманне абумоўлена ўласнасцю на капітал.

Для вялікай масы наёмных работнікаў, якія маюць акцыі, дывідэнды, што яны атрымліваюць, з'яўляюцца сціплым дапаўненнем да працоўных даходаў, стымулююць іх працу, зацікаўленасць у выніках дзейнасці карпарацыі. Асноўны даход усе рабочыя атрымліваюць у форме заработнай платы. У сучасных умовах уладальнікі прадпрыемстваў прымяняюць розныя сістэмы аплаты працы, накіраваныя на заахвочванне колькаснага і якаснага росту вытворчасці, імкнуцца зацікавіць рабочых у найбольшай аддачы.

Калі ўласнасць на сродкі вытворчасці належыць толькі частцы насельніцтва, розніца ў даходах вельмі значная. Напрыклад, калі ў ЗША параўнаць сумарныя даходы 10 % найбольш забяспечаных сем'яў з 10 % найменш забяспечаных, то першая група атрымлівае ў 7 разоў больш, чым другая. У тых краінах, дзе пераважае дзяржаўная ўласнасць, разрыў паміж 10 % сем'яў, якія займаюць верхнюю ступень на лесвіцы даходаў, і 10 % сем'яў, якія знаходзяцца на ніжняй ступені, значна менш: у СССР у сярэдзіне 80-х гг. ён склаў 3,5 раза. У першай групе краін багатая частка насельніцтва часткова атрымлівае даход, прысвойваючы вынікі неаплачанай працы рабочых. У другой — асноўнай законнай крыніцай высокіх даходаў сёння з'яўляецца ўласная прадукцыйная, кваліфікаваная праца. У СССР частка створаных агульнай працай

матэрыяльных даброт размяркоўваецца не праз зарплату, а праз грамадскія фонды спажывання. З іх прадстаўнікам усіх сацыяльных груп забяспечваецца бясплатнае навучанне і павышэнне кваліфікацыі, бясплатная медыцынская дапамога. З гэтых фондаў выплачваюцца дапамогі, стыпендыі, пенсіі, ажыццяўляецца шэраг іншых выплат і льгот.

У кааператывах розных краін даходы іх членаў залежаць ад вынікаў гаспадарчай дзейнасці калектыву. Выбраныя членамі кааператыву органы кіравання ўстанаўліваюць сістэму размеркавання даходаў прадпрыемства. Чым вышэйшыя даходы кааперытыва, тым большымі могуць быць заробкі яго членаў. Даход жа асобнага работніка залежыць не толькі ад даходу кааператыва, але і ад асабістага яго працоўнага ўкладу.

У прыватных гаспадарках, заснаваных на асабістай працы, даходы залежаць ад эфектыўнасці іх вядзення. Паколькі вырабленыя прадукты рыхтуюцца на продаж, вынікі дзейнасці любога прадпрыемства знаходзяцца ў прамой залежнасці ад цэн, якія складваюцца на рынку. Аб гэтым гутарка пойдзе ў наступным параграфе.

Пытанні і заданні

1. Як функцыяніруе грамадская вытворчасць?

2. Ад чаго залежыць узровень жыцця ў краіне?

3. Якія формы ўласнасці існуюць у сучасным свеце?

4. Якая ўзаемасувязь вытворчасці і размеркавання?

5. Супастаўце лічбы: 1) Вытворчасць сталі ў СССР у 1986 г. склала 161 млн тон. 2) Рад відаў айчынных сельскагаспадарчых машын цяжэйшыя, чым замежныя, на 30—40 %, а абсталяванне, грузавыя аўтамабілі — на 16 %. У выніку перарасход металу ў параўнанні з сусветнымі аналагамі складае 12—15 млн тон.

Зрабіце вывады.

6. У другой палавіне 80-х гг. гадавая выпрацоўка на аднаго занятага ў прамысловасці СССР склала ў разліку на долары 28 000, а ў ЗША — 59 000, у сельскай гаспадарцы адпаведна — 6100 долараў і 58 700 долараў.

Якія вывады вынікаюць з прыведзеных фактаў?

7. Страты зерня ў СССР пры ўборцы і падпрацоўцы складаюць 15—20 млн; прыкладна столькі ж страчваецца на стадыі захоўвання і перапрацоўкі. У сукупнасці гэта роўна аб'ёмам нашых закупак зерня за мяжою.

Пакажыце на гэтым і іншых аналагічных прыкладах, якія паказчыкі стану эканомікі ўплываюць на паказчыкі ўзроўню жыцця насельніцтва.

8. Як вы разумееце словы К. Маркса «Наёмная праца складаецца з аплачанай і неаплачанай працы» (Маркс К., Энгельс Ф. Творы. Т. 46. Ч. II. С. 69)?

9. Супастаўце наступныя паведамленні:

а) У ЗША 12 % багацейшых сем'яў валодаюць 62 % агульнай колькасці прамысловых акцый.

б) Эканамісты лічаць, што дастаткова мець 5—10 % сумы акцый, каб кіраваць справамі акцыянернай кампаніі.

Якая сувязь паміж гэтымі двума паведамленнямі?

10. На Першым з'ездзе народных дэпутатаў СССР адзін з дэпутатаў выказаў думку аб тым, што з улікам нашых традыцый і сацыяльнай накіраванасці ў руках дзяржавы дастаткова пакінуць 50 % эканомікі. Астатнія 50 % павінны быць перададзены ў рукі кааператываў і прыватнага, індывідуальнага сектара. Якія вашы адносіны да гэтай прапановы? Аргументуйце свой пункт погляду.

11. Прачытайце наступнае выказванне К. Маркса і падумайце: як звязаны прыватная ўласнасць работніка на яго сродкі вытворчасці і развіццё грамадскай вытворчасці?

«Прыватная ўласнасць работніка на яго сродкі вытворчасці ёсць аснова дробнай вытворчасці, а дробная вытворчасць складае неабходную ўмову для развіцця грамадскай вытворчасці і свабоднай індывідуальнасці самога работніка. Праўда, гэты спосаб вытворчасці сустракаецца і пры рабаўладальніцкім, і пры прыгонным ладзе, і пры іншых формах асабістай залежнасці. Аднак ён дасягае росквіту, праяўляе ўсю сваю энергію, набывае адэкватную класічную форму толькі там, дзе работнік з'яўляецца свабодным прыватным уласнікам сваіх, ім самім прымяняемых умоў працы, дзе селянін валодае полем, якое ён апрацоўвае, рамеснік — інструментамі, якімі ён валодае як віртуоз» (Маркс К., Энгельс Ф. Выбр. тв.: У 9 т. М., 1987. Т. 7. С. 701).

12. Ф. Энгельс пісаў у сваім творы «Анты-Дзюрынг»: «...Размеркаванне не з'яўляецца ўсяго толькі пасіўным вынікам вытворчасці і абмену; яно, у сваю чаргу, аказвае адваротны ўплыў на вытворчасць і абмен».

Растлумачце: як вытворчасць уплывае на размеркаванне? Як размеркаванне ўплывае на вытворчасць? Ці могуць размеркавальныя адносіны стымуляваць развіццё вытворчасці?

13. Рабочы купіў акцыю і атрымлівае дывідэнды. Другі рабочы купіў тры такія ж акцыі і атрымлівае дывідэнды ў 3 разы большыя, чым першы. Ці лічыце вы гэта справядлівым? Ці справядліва атрыманне даходу не толькі за працоўны ўклад, але і за ўкладзеныя ў акцыянерную кампанію сродкі?

14. Ці лічыце вы справядлівай большую аплату:
- за большую колькасць выраблена прадукцыі?
- за больш якасную прадукцыю?
- за больш кваліфікаваную, складаную працу?
- за працу ў больш цяжкіх умовах?

Свой пункт погляду аргументуйце.

15. Ці лічыце вы справядлівым, што лепшыя ў параўнанні з іншымі матэрыяльныя ўмовы мае чалавек:
- які лепш і больш працуе?
- які атрымаў вялікую спадчыну?
- які мае вялікі даход, уклаўшы грашовыя сродкі ў якое-небудзь прадпрыемства?

Сваю думку аргументуйце.

§ 19. РЫНАЧНЫЯ АДНОСІНЫ Ў СУЧАСНАЙ ЭКАНОМІЦЫ

Развіццё грамадства ў XX ст. паказала магчымасці двух варыянтаў арганізацыі эканамічнага жыцця, якія істотна адрозніваюцца. Адзін з іх — рыначная эканоміка. Другі — камандная эканоміка. Яны па-рознаму рашаюць пытанні аб тым, што, як і ў якой колькасці вырабляць; аб месцы чалавека ў сістэме грамадскай вытворчасці і размеркавання, аб яго маральных каштоўнасцях.

У рыначнай эканоміцы гэтыя пытанні рэгулююцца рынкам. Рынак — гэта сфера абмену тавараў. Часта рынкам называюць пэўнае месца (базар, ярмарка), дзе адбываецца гандаль. Аднак мы ўжываем паняцце «рынак» у іншым значэнні: рынак — гэта прапанаванне і попыт на тавары ў маштабе рэгіёна, краіны ці ўсяго свету. Праз рынак узаемадзейнічаюць таваравытворцы і спажыўцы.

У камандная эканоміцы ўсе рашэнні па пытаннях вытворчасці і размеркавання прымаюцца цэнтральнымі органамі кіравання (урадам). Таваравытворцы павінны строга выконваць дзяржаўныя планы.

Рынак і яго роля ў эканамічным жыцці

Рынак характарызуецца трыма важнейшымі прыметамі. Па-першае, гэта нерэгулюемае прапанаванне (вытворцы свабодна вырашаюць, якія тавары і ў якой колькасці вырабіць). Па-другое, гэта нерэгулюемы попыт (пакупнікі самастойна вызначаюць, што і колькі набыць). Па-трэцяе, нерэгулюемая цана, якая ўраўнаважвае попыт і прапанаванне (падумайце, чаму цана іх ураўнаважвае). Пры наяўнасці ўсіх трох прымет адбываецца рыначная саманастройка, або рыначнае рэгуляванне гаспадарчай дзейнасці.

У рыначным механізме дзейнічаюць два аб'ектыўныя эканамічныя законы: закон вартасці і закон попыту і прапанавання. Першы, як мы бачылі, фарміруе ўзровень сярэдніх цэн, другі вызначае суадносіны грашовых і таварных патокаў, якія ўтвараюцца на рынку. Разгледзім дзеянне гэтых законаў больш канкрэтна.

Калі тавар паступае на рынак, яго вартасць атрымлівае грашовае выражэнне, якое называецца цаной тавару. Але цана тавару, выражаная ў доларах,

фунтах стэрлінгаў, франках, марках, рублях і іншых грашовых адзінках, не з'яўляецца дакладным выражэннем вартасці. Яна можа быць вышэй ці ніжэй вартасці тавару. Гэта залежыць ад попыту і прапанавання на рынку. Калі попыт на тавары перавышае іх прапанаванне (многія жадаюць купіць, мала тавараў), цана на тавар расце. Калі прапанаванне перавышае попыт, цана падае.

Ваганні цэн вакол вартасці ўплываюць на дзейнасць таваравытворцаў. Вышэйшая цана (пры непазбежных выдатках вытворчасці) — большы прыбытак. Ніжэйшая цана — прыбытак памяншаецца. Калі цана, напрыклад, на агародніну расце, яе вырошчваць выгадна, гэта стымулюе да расшырэння вытворчасці. Аднак паступленне вялікай колькасці агародніны на рынак азначае павелічэнне прапанавання. І калі попыт адпаведна не расце, цана зніжаецца, г. зн. попыт і прапанаванне ўраўнаважваюцца на больш нізкім цэнавым узроўні і вытворчасць агародніны можа стаць нявыгаднай. Таваравытворцы будуць шукаць магчымасці вытворчасці больш выгаднага прадукту.

Такім чынам, рынак рэгулюе вытворчасць, «сігналізуе» праз цэны вытворцу, што вырабляць, якой якасці і ў якіх колькасцях. Але ўздзеянне рынку гэтым не абмяжоўваецца.

Каб уявіць сабе паўней гэта ўздзеянне, трэба разабрацца, з чаго складваецца вартасць тавару. Мы гаворым, што вартасць — арэчаўленая праца. Але ў кожным тавары — праца не аднаго, а многіх вытворцаў. Растлумачым гэта на прыкладзе.

Швейная фабрыка выпрабіла партыю сукенак. У гэтых сукенках заключана праца не толькі работніц фабрыкі, але і тых, хто вырабіў тканіну, ніткі, гузікі і іншыя выкарыстаныя матэрыялы, а таксама прылады працы. Інакш кажучы, у тавары заключана не толькі новая вартасць, створаная жывой працай работніц, але і вартасць раней выпрабленых матэрыялаў (перш за ўсё сыравіны), затрачанай электраэнергіі, амартызацыі машын, г. зн. іх зносу ў працэсе работы. Каб вырабіць новую партыю сукенак, уладальніку фабрыкі трэба прадаць першую партыю і на атрыманыя грошы закупіць новыя тканіны, іншыя матэрыялы, адрамантаваць, калі трэба, машыны, а таксама выплаціць рабочым зарплату.

Напрыклад, вартасць пашытых сукенак выражаецца

ў 200 тыс. грашовых адзінак (рублёў, долараў, марак, франкаў і да т. п.): 100 тыс.— гэта затраты на выкарыстаную сыравіну, матэрыялы, інакш кажучы,— вартасць гэтых матэрыялаў, якая ўвайшла ў вартасць сукенак. 50 тыс.— гэта вартасць тавараў і паслуг, якія забяспечваюць жыццядзейнасць рабочых і іх сем'яў за дні работы, г. зн. частка створанай іх працай вартасці, якая атрымлівалася ў выглядзе зарплаты. А яшчэ 50 тыс.? Гэта другая частка нанава створанай вартасці, якая складае прыбытак прадпрыемства. Уладальнік можа пасля выплаты падаткаў распарадзіцца ёю.

Калі попыт на рынку будзе вышэйшым за прапанаванне, цана на сукенку будзе вышэйшай за вартасць. Калі, напрыклад, партыю сукенак удасца прадаць за 250 тыс., то прыбытак складзе 100 тыс. Калі ж попыт акажацца нізкім, цана будзе ніжэйшай за вартасць. Так, калі партыю сукенак давядзецца прадаць за 150 тыс., то прыбытку не будзе. Выручаныя сродкі толькі пакрыюць расходы на куплю матэрыялаў, а таксама на зарплату рабочым.

Ці можна атрымаць прыбытак іншым шляхам? Так. Можна, напрыклад, скараціць расход матэрыялаў (напрыклад, за кошт больш рацыянальнага раскрою тканіны). Калі пры гэтым затраты скароцяцца, скажам, на 20 тыс., то на гэту суму павялічыцца прыбытак. Можна таксама павысіць прадукцыйнасць працы ў параўнанні з іншымі прадпрыемствамі за кошт прымянення больш дасканалай тэхнікі (напрыклад, выкарыстаць больш дасканалыя швейныя машыны). Дапусцім, за той жа час удалося пашыць у два разы больш сукенак і прадаць іх па сярэдняй рыначнай цане. Значыць, выручка складзе 400 тыс., з якіх 200 тыс. пойдзе на пакрыццё вытворчых затрат, 50 тыс.— на зарплату, а 150 тыс. складзе прыбытак.

Такім чынам, рынак прымушае зніжаць вытворчыя затраты (гаспадарыць больш эканомна), а таксама ўдасканальваць тэхніку, павышаць прадукцыйнасць працы. Наадварот, неэканомнае вядзенне справы, нізкая прадукцыйнасць працы робяць вытворчасць нявыгаднай (нізкі прыбытак), а, магчыма, і стратнай. У такім выпадку пагражае разарэнне.

Як мы бачылі, эканамічныя законы стымулююць тых вытворцаў, у якіх індывідуальныя затраты працы (як жывой працы рабочых, так і арэчаўленай у матэрыялах, сыравіне і інш.) ніжэйшыя за грамадска не-

абходныя (г. зн. сярэднія ў дадзенай галіне). Яны заахвочваюць павышэнне прадукцыйнасці працы, удасканальванне тэхнікі і тэхналогіі. Яны рэгулююць таксама размеркаванне рэсурсаў для вытворчасці тых ці іншых тавараў: робяць выгаднай вытворчасць тавараў, якіх не хапае, попыт на якія перавышае прапанаванне. Гэта і ёсць рыначны механізм рэгулявання прапорцый вытворчасці. Разам з тым адбываецца дыферэнцыяцыя таваравытворцаў: адны ўзбагачаюцца, іншыя — бяднеюць або церпяць банкруцтва.

Мы ахарактарызавалі тут рынак тавараў. Але ў рыначнай эканоміцы дзейнічаюць яшчэ рынкі працы і капіталу.

Рынак працы мае тыя ж тры прыметы, што і рынак тавараў: попыт, прапанаванне, цана. Што ж тут прадаецца і купляецца? Той асаблівы тавар, пра які мы гаварылі вышэй: рабочая сіла. Дзейнічае той жа механізм попыту і прапанавання. Калі многа спецыялістаў пэўнай прафесіі, а патрэба ў іх невялікая, то зарплата ім прапануецца невысокая, а частка з іх застаецца без работы. Наадварот, калі вялікі попыт на работнікаў якой-небудзь спецыяльнасці, а на рынку працы жадаючых атрымаць гэту работу мала, прадпрыемствы згаджаюцца на больш выгадныя для работніка ўмовы.

Рынак капіталу таксама, як і два разгледжаныя тыпы рынкаў, азначае прапанаванне і попыт, але ў якасці тавару тут выступаюць каштоўныя паперы (акцыі, аблігацыі), валюта. Так, акцыі, пра якія вам вядома як пра дакументы, што пацвярджаюць права саўладальніка прадпрыемства, прадаюцца і купляюцца. Калі справы прадпрыемства ідуць добра, то яго прыбытак вялікі, акцыі карыстаюцца попытам і прадаюцца па цане вышэй за намінальную (г. зн. абазначаную ў дакуменце). Напрыклад, тысячадоларавая акцыя прадаецца за 1300 долараў. І наадварот, калі акцыянерная кампанія нясе страты, утрымальнікі акцый імкнуцца пазбавіцца ад іх, цана на іх падае ніжэй за намінальную.

У залежнасці ад стану эканомікі якой-небудзь краіны яе валюта (долары, маркі, франкі і г. д.) абменьваецца на іншыя валюты ў той ці іншай прапорцыі.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя невымерна павялічыла каштоўнасць ведаў. Мяркуецца, што к 2000 г. у вартасці тавару 95 % будзе складаць інтэлект. Таму становіцца выгадна купляць і прадаваць інфармацыю, веды аб спосабах дзейнасці, новых тэхналогіях і да

т. п. На гэтай аснове развіваецца **рынак інфармацыі.**

Вялікую ролю ў функцыяніраванні рынку адыгрываюць біржы. Таварная біржа — гэта форма рынку тавараў, якія прадаюцца вялікімі партыямі, як правіла, па ўзорах. Фондавая біржа дае магчымасць купляць і прадаваць каштоўныя паперы (напрыклад, акцыі) і іншаземную валюту. Біржа працы здзяйсняе пасрэдніцкія аперацыі на рынку працы, рэгіструе беспрацоўных, садзейнічае іх працаўладкаванню.

Канкурэнцыя і манаполія

Паміж таваравытворцамі ідзе барацьба за найбольш выгадныя ўмовы вытворчасці і збыту тавараў. Яна называецца канкурэнцыяй. Перамагае ў гэтай барацьбе той, хто змог павысіць прадукцыйнасць працы, расшырыць вытворчасць, вырабіць тавары больш высокай якасці. Інакш кажучы, перамагае той, хто зніжае затраты жывой і арэчаўленай працы, а таксама паляпшае спажывецкія ўласцівасці тавараў.

У канкурэнтнай барацьбе ўдзельнічае мноства самастойных таваравытворцаў (ад рамеснікаў, фермераў да буйных фірм). Кожны з іх на свой страх і рызыку рашае пытанне, што і як вырабляць. Яго тавары на рынку сустракаюцца з аналагічнымі таварамі іншых таваравытворцаў, і кожны імкнецца заваяваць спажыўца. Ён расхвальвае свой тавар, выкарыстоўвае рэкламу, стараецца надаць тавару знешне прывабны выгляд. Спажывец жа хоча набыць тавар лепшай якасці і танней. Яго магчымасці абмежаваны. Якой фірме ён аддасць свой долар, марку, франк? У каго палічыць за лепшае купіць сукенку? Вырашыць сёння купіць пару абутку ці радыёпрыёмнік?

Каб не спыняць вытворчасць, трэба прадаць тавар і выкарыстаць атрыманыя сродкі для стварэння новай партыі тавараў. А каб абагнаць канкурэнтаў, трэба пастаянна прапанаваць на рынак новыя тавары, якіх няма ў саперникаў, пастаянна даваць рэкламу. У радзе выпадкаў, каб прадаць тавар, прыходзіцца ісці на зніжэнне цаны. Той, у каго затраты працы вялікія, не зможа зніжаць цану. Тавар не будзе прададзены ці будзе прададзены са стратамі. Дробным вытворцам цяжка вытрымліваць канкурэнтную барацьбу. Буйныя маюць больш шанцаў на перамогу, паколькі маюць больш магчымасцей для ўдасканальвання вытворчасці.

Вы ведаеце, што ў канцы XIX ст. буйныя таваравытворцы ў радзе краін пачалі аб'ядноўвацца ў саюзы

(картэлі, сіндыкаты, трэсты). Гэтыя саюзы сканцэнтравалі ў пэўных галінах рашаючую частку вытворчасці тавараў. Інакш кажучы, сталі манаполіямі. Сутнасць манаполіі — эканамічны дыктат шляхам устанаўлення манапольна высокіх (або нізкіх) цэн для атрымання манапольна высокага прыбытку.

Эканамічнае жыццё ўключае ў сябе элементы і канкурэнцыі і манаполіі. Узнікненне саюзаў капіталістаў не знішчае канкурэнцыю. Яна адбываецца таксама і паміж самімі саюзамі, а таксама паміж манапалістычнымі саюзамі і неманапалізаванымі прадпрыемствамі. Аднак манаполія параджае высокія цэны, неадпаведнасць попыту і прапанавання. Таму ў ЗША ўжо ў канцы XIX ст. паявіліся антытрэстаўскія законы, якія дзяржава выкарыстала для паляпшэння рыначнай сістэмы.

Рынак і дзяржава

Рынак у наш час не з'яўляецца адзіным рэгулятарам эканамічнага жыцця. На эканамічныя адносіны ўздзейнічае дзяржава, выкарыстоўваючы заканадаўства і эканамічныя метады. Важны рычаг рэгулявання эканомікі — дзяржаўныя заказы, закупкі тых ці іншых тавараў (перш за ўсё, ваеннага прызначэння), якія дазваляюць павялічыць попыт, г. зн. расшырыць унутраны рынак. Другім рычагом з'яўляюцца падаткі. Дзяржава павялічвае або зніжае стаўкі падаткаў з насельніцтва і з прадпрымальнікаў. Такім чынам яна садзейнічае расшырэнню вытворчасці ці тармозіць яе, стымулюе ці скарачае попыт. За кошт часткі сабраных падаткаў дзяржава прадастаўляе субсідыі прадпрымальнікам, заахвочваючы вытворчасць у тых ці іншых галінах. Нярэдка за кошт дзяржавы ажыццяўляюцца навуковыя даследаванні і доследна-канструктарскія распрацоўкі, што часткова пазбаўляе прадпрымальнікаў ад адпаведных расходаў і тым самым стымулюе вытворчасць пэўных відаў прадукцыі.

Сярод асноўных рычагоў уздзеяння на рынак — крэдытна-грашовая сістэма. Таваравытворцы ў пэўных сітуацыях (напрыклад, калі неабходна ўкласці сродкі ў тэхнічнае перааснашчэнне вытворчасці або калі папярэдняя партыя тавару не прададзена і выручка не паступіла) маюць патрэбу ў тым, каб пазычыць грошы. Грошы ў пазыку на кароткі ці працяглы тэрмін (крэдыт) даюць банкі. Пры гэтым, грошы павінны быць вернуты ў суме, якая на некалькі працэнтаў перавышае суму, узятую ў пазыку. Паніжаючы ці павышаючы працэнтную

стаўку, дзяржаўны банк абмяжоўвае ці расшырае магчымасці атрымання крэдыту. А гэта, у сваю чаргу, уплывае на магчымасці расшырэння вытворчасці тых ці іншых тавараў.

Уздзеянне дзяржавы на рынак ажыццяўляецца і з дапамогай эканамічнага праграмірования. Дзяржаўныя органы распрацоўваюць праграмы і прагнозы на рад гадоў, яны аналізуюць варыянты раўнавагі паміж вытворчасцю і спажываннем, паміж рознымі галінамі вытворчасці. На гэтай аснове даюцца рэкамендацыі таваравытворцам, прымаюцца рашэнні аб ільготных крэдытах і субсідыях і іншых мерах актывізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. «Ускоснае планаванне» рыначнай эканомікі з сярэдзіны XX ст. сцвердзілася ва ўсіх развітых краінах Захаду.

Сучасны рынак

Такім чынам, мы бачылі, што ў сучасных умовах ні адна з названых у пачатку параграфа мадэлей арганізацыі эканомікі (рэгулюемай толькі рынкам ці камандналй, рэгулюемай толькі дзяржавай) не характарызуе сучаснае эканамічнае жыццё.

Будучы «аўтаматычным рэгулятарам» гаспадарчага жыцця, рынак мае і негатыўныя бакі. Узнікае вялікая і часам неапраўданая дыферэнцыяцыя даходаў. Забяспечваючы імгненную выгаду, рынак не дазваляе правільна ацаніць доўгатэрміновыя праекты, звязаныя з сацыяльным забеспячэннем насельніцтва, выкарыстаннем неўзнаўляльных прыродных багацця ў і г. д. Гэта датычыцца і арганізацыі фундаментальных навуковых даследаванняў (напрыклад, у галіне тэарэтычнай фізікі і да т. п.). Рыначныя сістэмы развіваюцца цыклічна: гады росту змяняюцца гадамі застою ці спаду. Беспрацоўе, рост цэн, спекуляцыя каштоўнымі паперамі таксама ўзнікаюць на глебе свабоднага рынку.

Сучасны рынак значна адрозніваецца ад рынку эпохі свабоднай канкурэнцыі і ад рынку пачатку XX ст., калі ў асобных галінах панавалі картэлі і трэсты. У развітых краінах існуе «змешаная эканоміка», у якой адначасова дзейнічаюць нябачны рыначны механізм і дзяржаўнае рэгуляванне. Рыначны механізм вызначае цэны і вытворчасць у многіх сферах, а дзяржава рэгулюе эканоміку, рынак праз падаткі, расходы, крэдытную палітыку, праграмірование. Абодва бакі — рыначнае і дзяржаўнае рэгуляванне — неабходны. Як вобразна сказана ў шырока вядомым за мяжой падруч-

ніку «Эканоміка», кіраваць эканомікай пры адсутнасці таго ці іншага ўсё роўна, што спрабаваць апладзіраваць адной рукой.

На рынак уздзейнічае таксама і рэгуляванне на ўзроўні кампаній. Яны выкарыстоўваюць сучасную тэхніку і методыку збору, апрацоўкі і распаўсюджвання эканамічнай інфармацыі (аб таварах, цэнах, змяненнях попыту і г. д.). Атрымала развіццё новая тэорыя і практыка кіравання — маркетынг, арыентаваны на патрабаванні рынку, рэальны попыт і патрэбнасць пакупнікоў у таварах і паслугах.

Сучасная рыначная сістэма — гэта не сістэма хаосу і анархіі, хоць яна і не ліквідуе рыначную стыхію. Рыначная эканоміка — адпрацаваны механізм для кардынацыі дзейнасці таваравытворцаў і спажыўцоў. Ён развіваецца разам з грамадствам. З развіццём цывілізацыі становіцца цывілізаваным і рынак.

Адказ на пытанне «Што і ў якой колькасці вырабляць?» вырашаецца вытворцам. Але ён абавязкова павінен улічваць патрэбы і магчымасці спажыўца. У выніку гэтага не вытворца пануе над спажыўцом, а спажывец — над вытворцам. Сваімі грашамі ён галасуе за тыя ці іншыя тавары, адхіляе вырабы нізкай якасці. Пытанне «Як вырабляць?» вырашаецца пад уздзеяннем канкурэнцыі паміж таваравытворцамі. Каб перамагчы ў канкурэнтнай барацьбе, неабходна павышаць эфектыўнасць вытворчасці, зніжаць затраты, пастаянна абнаўляць тэхніку і тэхналогію.

Дынаміка рыначных цэн, параўнальная прыбытковасць ці стратнасць вытворчасці рэгулююць эканамічнае развіццё. Але элементы «сляпой канкурэнцыі», калі прадукцыю спачатку выпускаюць, а потым шукаюць пакупніка, захаваліся толькі ў абмежаваным маштабе. На сучасных рынках пануюць буйныя фірмы, якія арыентуюць вытворчасць на вядомых ім спажыўцоў, маюць з імі папярэднюю дамоўленасць (кантракт) аб колькасці, якасці, наменклатуры прадукцыі. Таму сучасны рынак называюць арганізаваным, «кантрактным» рынкам. Пільна вывучаецца масавы попыт, змены ў яго накіраванасці. Сумеснымі дзеяннямі буйных фірм і дзяржаўных органаў рыначная стыхія абмяжоўваецца, эканамічныя адносіны набываюць свядома арганізаваны характар. Разам з тым спалучэнне планавых і рыначных элементаў рэгулявання, як паказвае вопыт заходніх краін, не гарантуюць эканоміку ад незбалан-

саванасці і паяўлення дыспрапорцый. Неабходны пошук для кожнай канкрэтнай гістарычнай сітуацыі аптымальнага спалучэння рынкавых і дзяржаўных механізмаў рэгулявання эканомікі.

Для развіцця дзяржаўна-адасобленых гаспадарак вялікае значэнне мае абмен паміж імі на сусветным рынку. Цяпер ён мае развітую форму: існуюць і таварны рынак, і рынак капіталу, і рынак рабочай сілы. Існуе і ўласная сістэма цэн — сусветныя цэны. Міжнародныя эканамічныя арганізацыі, таварныя пагадненні паміж краінамі аказваюць уплыў на стан асобных таварных рынкаў.

Пытанні і заданні

1. Якія варыянты (мадэлі) арганізацыі эканамічнага жыцця існуюць у сучасным свеце?

2. Якія галоўныя прыметы рынку?

3. Як дзейнічаюць у рыначнай гаспадарцы эканамічныя законы?

4. Што значыць «рэгулюемы рынак»?

5. Якія асаблівасці сучаснага рынку?

6. Супастаўце два выказванні са старонак газет.

Першае: «Героі» рынку — прадпрымальнік, камерсант, бізнесмен, а зусім не простыя працаўнікі. Іх мэта — багацце, іх метады — «гульня без правіл», маральная ўсёдазволенасць. Прадпрымальнік жыве па закону моцнага, ён бязлітасны да «слабага». Яго душа, калі і моліцца, то толькі ідалам Поспеху. Яго кураж — рызыка, яго ўцеха — перамога любой цаной. Значыць, законы бізнесу — антыпод маралі. Канкурэнцыя — барацьба драпежнікаў».

Другое: «Прадпрымальнік, камерсант, банкір, менеджэр — ключавыя фігуры рынку. Яны зусім не мафіёзі, не спекулянты, не «ценявікі», не карупцыянеры. Патрабаванні рынку ўсталёўваюць няўхільныя нормы сумленнасці, прыстойнасці і даверу ў якасці ўмоў эфектыўнасці дзелавых адносін. А гэта ў цэлым дабратворна ўплывае на стан нораваў ва ўсіх сферах жыцця. Канкурэнцыя — суровая барацьба, але гэта «гульня па правілах», захаванне якіх пільна кантралюецца грамадскай думкай».

Які пункт погляду вы падзяляеце? Аргументуйце свой адказ.

7. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па эканоміцы М. Фрыдман піша: «Геніяльнасць Адама Сміта праявілася ў разуменні таго факта, што цэны на тавары, якія ўзнікаюць у выніку здзелак паміж пакупнікамі і прадаўцамі — інакш кажучы, цэны, якія ўтвараюцца ў выніку дзеяння законаў свабоднага рынку,— могуць каардынаваць дзеянні мільёнаў людзей, кожны з якіх мае на ўвазе сваю ўласную выгаду, прычым, каардынаваць такім чынам, што кожны з удзельнікаў здзелкі выйграе».

Растлумачце, як ажыццяўляецца ўзаемавыгадны абмен ва ўмовах рынку.

8. Параўнайце два выказванні з перыядычнага друку.

Першае: «Уцягненасць у рыначную эканоміку выганяе з чалавека імкненне да Ідэалу, духоўны пачатак, цягу да Вечнасці. Тым самым заводзіць яго ў балота мяшчанства, дробнабуржуазнай

абывацельшчыны. Ідэалам тут служыць «даход», усяго толькі «ўмеранасць і акуратнасць», адсюль крыхаборства, дробязныя разлікі...»

Другое: «У цывілізаваных рыначных адносінах пераадольваецца несумяшчальнасць «Інтарэсу» і «Ідэалу», якая здаецца. Асабісты інтарэс усё менш успрымаецца як своекарыслівасць. З другога боку, здымаецца «зачараванне» ахвярнасці, аскетызму, хадульнага «гераічнага энтузіязму» і павышаецца значнасць паўсядзённага існавання, бясспрэчная вартасць уласнага жыцця. Арыентацыя на асабісты інтарэс аказваецца карыснай і для ўсяго грамадства, спрыяючы ўдасканальванню чалавека».

Які погляд на рынак вы падзяляеце? Аргументуйце свой адказ.

9. У выніку ўдасканалення абсталявання працоўныя затраты на вытворчасць адзінкі прадукцыі скараціліся з 12 да 6 гадзін пры грамадска неабходным часе 12 гадзін. Вызначце, як змянілася выручка таваравытворцаў за адзінку прадукцыі.

10. Супастаўце ўздзеянне, якое аказвае на вытворчасць: а) канкурэнцыя; б) манаполія. Як адбіваецца на спажыўцах: а) канкурэнцыя таваравытворцаў у той ці іншай галіне; б) манаполія ў пэўнай галіне?

11. Растлумачце, чаму заходнія эканамісты лічаць аптымальнай «змешаную» эканоміку. Чаму не камандную? Не «свабодны рынак»?

12. Ці згодны вы са сцверджаннем заходняга вучонага эканаміста Ф. А. Хайека, які ў кнізе «Дарога да рабства» пісаў: «У канкурэнтным грамадстве ў бедных значна больш абмежаваныя магчымасці, чым у багатых, і тым не менш, бядняк у такім грамадстве намнога свабаднейшы, чым чалавек са значна лепшым матэрыяльным становішчам у грамадстве іншага тыпу»? Аргументуйце свой адказ.

§ 20. НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС І МАТЭРЫЯЛЬНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ

Сучасная эканоміка характарызуецца не толькі разгледжанымі вышэй вытворчымі адносінамі, але і адносінамі абмену і размеркавання. Прадукцыйнасць працы, колькасць і якасць выпускаемай прадукцыі, узровень жыцця насельніцтва залежаць ад стану прадукцыйных сіл грамадства. У сучасных умовах адбываюцца іх якасныя змены пад уздзеяннем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя

Сама назва працэсу, які адбываецца, гаворыць аб тым, што гутарка ідзе не аб паступовых плаўных зменах, а аб «скачку», аб пераходзе ад аднаго якаснага стану да другога. Інакш кажучы, навукова-тэхнічны прагрэс, які адбываўся працяглы час параўнальна павольна, у наш час прыняў паскораны характар.

Так, персанальныя камп'ютэры паявіліся ў канцы 70-х — пачатку 80-х гг., а ў 1989 г. у ЗША дзейнічала

ўжо 30 млн персанальных камп'ютэраў. Усяго толькі дзесяць гадоў спатрэбілася для масавага распаўсюджвання і выкарыстання «разумнай машыны»!

Далей, назва гэтай рэвалюцыі паказвае, што яна ахоплівае не толькі галіну тэхнікі, але і навуку. З сярэдзіны 50-х гг. XX ст. тэхніка матэрыяльнай вытворчасці пачынае развівацца пад рашаючым уздзеяннем навуковых ведаў. Навука становіцца пастаяннай крыніцай новых ідэй, якія паказваюць шляхі развіцця матэрыяльнай вытворчасці. Яна ператвараецца ў непасрэдна прадукцыйную сілу. Адкрыцці ў галіне атамнай і малекулярнай структуры рэчыва стварылі асновы вытворчасці новых матэрыялаў: поспехі хіміі зрабілі магчымым стварэнне рэчываў з зададзенымі ўласцівасцямі; вывучэнне электрычных з'яў у цвёрдых целах і газах паслужыла асновай узнікнення электронікі; даследаванне структуры атамнага ядра адкрыла шлях да выкарыстання атамнай энергіі; дзякуючы развіццю матэматыкі былі створаны сродкі аўтаматызацыі вытворчасці і кіравання.

Такім чынам, **навукова-тэхнічная рэвалюцыя** — гэта скачок у развіцці прадукцыйных сіл грамадства, пераход іх у якасна новы стан на аснове карэнных зрухаў у сістэме навуковых ведаў.

На першым этапе развіцця НТР (60—70-я гг.) важнейшай яе рысай стала аўтаматызацыя вытворчых працэсаў — паявілася яшчэ адно звяно ў машыне, якое ажыццяўляла непасрэдны кантроль за яе работай. Робаты, станкі з праграмным кіраваннем, гібкія вытворчыя лініі характарызуюць якасныя зрухі ў **тэхніцы,** у **прыладах вытворчасці.**

З канца 70-х гг. у развіцці НТР паявіліся якасна новыя рысы, звязаныя з поспехамі мікраэлектронікі. Гэты новы этап атрымаў назву **камп'ютэрнай (мікрапрацэсарнай) рэвалюцыі.** Першы мікрапрацэсар, створаны ў ЗША ў 1971 г., меў памер запалкавай пачкі, а па вылічальнай магутнасці быў роўны адной з першых ЭВМ, якія важылі дзесяткі тон. А сучасны мікракамп'ютэр змяшчаецца ў футляры з чвэрць запалкавай пачкі, але ў 40 разоў магутнейшы, чым першыя лямпавыя камп'ютэры, у 17 тысяч разоў лягчэйшы, у 1,5 тыс. раза меншы па аб'ёму, у 2,8 тыс. раза менш энергаёмкі, у 10 тыс. разоў таннейшы.

У аўтаматызаванай сістэме машын, якія цяпер паявіліся, разам з рухавіком, перадатачным механізмам

і рабочай машынай, заснаваная на ЭВМ прылада, што кіруе і кантралюе, вызваляе чалавека не толькі ад кантакту з рабочымі прыладамі (інструментамі), але і з самой рабочай машынай. Параметры дзеяння гэтых прылад цяпер могуць выйсці за межы не толькі фізічных, але і разумовых магчымасцей чалавека (напрыклад, не толькі недаступная руцэ чалавека хуткасць руху, але і непасільная для чалавечага мозгу хуткасць перапрацоўкі інфармацыі).

Вытворчасць робатаў, г. зн. аўтаматычна кіруемых машын, якія могуць перамяшчацца і выконваць дзеянні, звязаныя з маніпуляцыяй, пачалася ў 60-я гг. У 1977 г. у ЗША іх было 200, а ў 1984 г. ужо 12—14 тыс. А робат жа — гэта першая ў гісторыі машына, якая замяніла не толькі чалавечыя рукі, але і некаторыя функцыі чалавечага інтэлекту.

У цяперашні час ужо ёсць больш за 200 тыс. варыянтаў прымянення мікрапрацэсараў. Паявілася магчымасць пераходу ад асобных «астраўкоў аўтаматызацыі» да комплекснай аўтаматызацыі цэлых тэхналагічных працэсаў, якія базіруюцца на групе ўзаемазвязаных машын, абсталявання і прыбораў.

Поруч з тэхнікай рэвалюцыйныя змены адбываюцца ў **тэхналогіі,** г. зн. у спосабах уздзеяння на сыравіну, матэрыялы, на прадмет працы. Вучоныя зрабілі вывад, што рашаючую ролю ў вытворчасці сталі іграць інфармацыйна-інтэнсіўныя тэхналогіі і новае тэхналагічнае мысленне, якія вядуць да таго, што адбываецца не проста замена машын больш сучаснымі, а змяненне прынцыпаў вытворчасці.

Прадукцыя рамеснай вытворчасці ўключала два кампаненты: затраты на сыравіну і ручную працу (г. зн. тэхналогія характарызавалася **матэрыялаёмкасцю** і **працаёмкасцю**). Прамысловая рэвалюцыя ўнесла два новыя кампаненты: **капіталаёмкасць** і **энергаёмкасць.** НТР дапоўніла іх **навукаёмкасцю.** Вялікія расходы на навуковыя даследаванні ў масавай вытворчасці імкліва зніжаюцца ў разліку на адзінку прадукцыі.

Новыя тэхналагічныя працэсы ажыццяўляюцца часта на малекулярным, атамным і субатамным узроўнях. Так, метад дыфузійнай зваркі забяспечвае высакаякасныя злучэнні керамікі з магнітным сплавам, серабра з нержавеючай сталлю, сталі з алюмініем і г. д. Усяго можна злучыць больш за 750 пар металаў, неметалаў і сплаваў, якія не ўдавалася злучыць іншымі спосабамі.

Зварваемыя кампаненты звязваюцца на ўзроўні атамаў. У выніку з'явілася магчымасць атрымліваць вырабы складанай канфігурацыі. Дыфузная тэхналогія вельмі эканамічная.

Адным з найбольш перспектыўных напрамкаў з'яўляецца біятэхналогія, па значэнню супаставімая з электронікай. Біятэхналогія — гэта выкарыстанне тэхналагічных працэсаў у вытворчых мэтах. З дапамогай біятэхналогіі ўжо вырабляюцца ў вялікіх маштабах кармавы бялок, розныя медыкаменты.

На базе малекулярнай біялогіі з'явілася генная інжынерыя. Узнікла магчымасць шляхоў перасадкі чужых генаў у клетку, атрымліваць новыя віды арганізмаў жывёл і раслін, з запланаванымі якасцямі.

З'явіліся мембранная, лазерная, плазменная і іншыя тэхналогіі, якія якасна змяняюць вытворчыя працэсы.

Разам з тэхнікай і тэхналогіяй якасна мяняецца **прадмет** працы, г. зн. матэрыялы, якія апрацоўваюцца ў працэсе вытворчасці. Гэтыя змены звязаны, перш за ўсё, з дасягненнямі фізікі і хіміі. Стварэнне новых канструкцыйных матэрыялаў звязана з патрэбамі сучасных тэхналогій, якім неабходны магнітныя, керамічныя, аптычныя матэрыялы, а таксама з дэфіцытам мінеральнай сыравіны. Створаныя ў наш час пластмасы і сінтэтычныя валокны прымяняюцца ў аўтамабільнай, суднабудаўнічай, аэракасмічнай прамысловасці, у будаўніцтве і сельскай гаспадарцы. Замена стальных труб умацаванымі пластмасамі дазволіла нафтавай прамысловасці ЗША з'эканоміць 2 млрд долараў у год за кошт ліквідацыі страт ад карозіі металу. Звыштонкія хімічныя пакрыцці дазваляюць удасканаліць розныя дэталі электронных прыбораў, будуць выкарыстоўвацца ў хімічнай і харчовай прамысловасці.

Адбываюцца глыбокія перамены ў **крыніцах энергіі.** Развіваецца атамная энергетыка. У 1986 г. у агульным аб'ёме вытворчасці электраэнергіі ў СССР выраблена на АЭС 10 %, у Францыі — 69 %, у Японіі — 24 %. У ЗША гэты паказчык складае 16 %. Скачок у гэтай галіне чакаецца ў сувязі з рашэннем праблемы выкарыстання тэрмаядзернай энергіі.

НТР радыкальна мяняе **становішча чалавека** (суб'екта працы) у сістэме вытворчасці: чалавек выводзіцца за межы вытворчага працэсу, становіцца побач з вытворчасцю, выступае ў ролі кантралёра, наладчыка, рэгуліроўшчыка. Яшчэ раней чалавек перадаў машыне

спачатку выканальніцкую функцыю (уздзеянне з дапамогай інструмента на прадмет працы), а затым і рухальную, энергетычную. Разам са скарачэннем непасрэднага ўдзелу чалавека ў вытворчасці адбываецца расшырэнне апасродкаваных відаў працы, звязаных з выкананнем кантрольна-кіруючых і лагічных функцый усё больш высокага ўзроўню, з прыняццем рашэнняў.

НТР выклікае карэнныя зрухі ў **арганізацыі вытворчасці і працы, у сістэме кіравання вытворчасцю.** Аналіз першаснай інфармацыі і прыняцце рашэнняў пачынае ажыццяўляцца выключна з дапамогай ЭВМ.

НТР выклікае глыбокія змены не толькі ў матэрыяльнай вытворчасці, але і ў іншых сферах жыцця. Гэта — і рэзкае ўзрастанне аўтамабільных перавозак, і павелічэнне скорасцей чыгуначнага **транспарту,** і мадэрнізацыя авіяцыйнага транспарту. Аптычнае валакно і святлахвалевая тэхніка, а таксама дасягненні касмічнай тэхнікі (спадарожнікі) рэвалюцыянізуюць сродкі **сувязі.** Карэнныя перамены выклікае ўкараненне мікраэлектронікі ў **крэдытна-фінансавай сферы, гандлі, ахове здароўя.** Вынаходніцтва фотанабору рэвалюцыянізавала **газетную справу:** з дапамогай відэаэкрана, злучанага з камп'ютэрам, падрыхтаваны для публікацыі матэрыял адпраўляецца ў друкарскую машыну простым націсканнем кнопкі. Мікраэлектроніка актыўна ўваходзіць у **быт.** Відэамагнітафоны і відэакамеры, лічбавыя відэапрайгравальнікі, радыётэлефоны і відэакасеты, відэадыскі, кабельнае тэлебачанне інтэнсіўна мяняюць быт людзей. Хатнія персанальныя камп'ютэры кіруюць бытавымі прыборамі, дапамагаюць адукацыі, прымяняюцца пры надомных формах працы. У 1980 г. у ЗША было выпушчана 371 тыс. персанальных камп'ютэраў, а ў 1985 г.— ужо 6,6 млн. Іх выпуск перавысіў колькасць выпускаемых кухонных камбайнаў і бытавых кандыцыянераў. Новая хатняя тэхніка можа быць выкарыстана як у вытворчых мэтах, так і для адукацыі і адпачынку.

Новы тэхналагічны пераварот, які пачаўся, павінен прывесці ў будучым стагоддзі да новай, навукова-тэхналагічнай цывілізацыі.

Эканамічны змест новага этапа НТР

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя выклікала карэнныя змены якасці эканамічнага росту. Яны паявіліся перш за ўсё ва ўзмацненні сацыяльнай накіраванасці эканамічнага развіцця, г. зн. арыентацыі

на больш поўнае задавальненне патрэб чалавека. Можа быць, гэта звязана з распаўсюджваннем сярод прадпрымальнікаў гуманістычных ідэй? На справе іх штурхае ў гэтым напрамку эканамічная неабходнасць. Мы ўжо адзначалі: роля чалавечага фактара ў вытворчасці ўзрастае. Павышаецца значэнне шырыні профілю сучаснага спецыяліста, яго здольнасці хутка асвойвацца ў новай сітуацыі. Ад гэтага залежыць поспех фірмы. Высокая якасць работніка вытворчасці — гэта і яго кваліфікацыя, і здароўе, і псіхічны стан, і маральна-валявыя якасці, і агульная культура. Патрэбы чалавека працы невымерна ўзраслі. Усё гэта прымушае да ўзмоцненага развіцця індустрыі дабрабыту — тых галін, якія забяспечваюць павышэнне ўзроўню жыцця людзей. Названая прычына прымушае клапаціцца аб бяспецы ўмоў працы, захаванні дапушчальных норм забруджвання асяроддзя пражывання. Узрастае ўдзельная вага сродкаў, якія расходуюцца на сацыяльную сферу (адукацыя, ахова здароўя, транспарт, індустрыя адпачынку і г. д.).

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя абумовіла пераход на пераважна інтэнсіўны шлях развіцця вытворчасці. Гэта азначае, што асноўным фактарам эканамічнага росту становіцца памяншэнне колькасці занятых у вытворчасці, колькасці выкарыстоўваемай сыравіны і энергіі. Навукова-тэхнічны прагрэс дазваляе зберагчы працу і матэрыялы, павышаючы пры гэтым прадукцыйнасць працы і якасць прадукцыі.

Аслабленне залежнасці вытворчасці ад пастаўшчыка энергіі і сыравіны дазволіла адказацца ад тэрытарыяльнай прывязкі прадпрыемстваў, якія выпускаюць гатовую прадукцыю, да непасрэдных крыніц сыравіны.

Рэзка ўзраслі капіталаўкладанні ў галіны, якія вызначаюць навукова-тэхнічны прагрэс і навукаёмкія вытворчасці. Гэтыя галіны арыентаваны на выпуск новай, тэхнічна складанай прадукцыі. Так, у Японіі электронная тэхніка ўдасканальваецца пад дэвізам: вырабляць «лягчэй, танчэй, карацей і меншага памеру».

Рэзка паскорыліся тэмпы замены вырабляемай прадукцыі, абсталявання, тэхналогіі. Значна ўзрос кошт навуковых даследаванняў.

Уся сфера эканамічных адносін стала больш складанай і гібкай. Паявіліся комплексныя навукова-вытворчыя аб'яднанні і іншыя інтэгральныя арганізацыі, якія аб'ядноўваюць навуку, вытворчасць, адукацыю,

сферу абслугоўвання. Новая тэхналогія ўмацавала жыццяздольнасць дробных і сярэдніх прадпрыемстваў, асабліва прама ці ўскосна звязаных з новымі галінамі вытворчасці.

Хуткае развіццё ў сучасных умовах характэрна для сферы вытворчых і бытавых паслуг — транспарту, сувязі, энергетыкі, інфармацыйнага абслугоўвання.

Сацыяльныя вынікі НТР

Пад уплывам НТР мяняецца аблічча рабочага класа. Са сказанага вышэй можна зрабіць вывад аб дзвюх істотных зменах.

Першая адносіцца да галіновай і прафесіянальнай структуры рабочага класа: узрастае доля занятых у навейшых галінах, якія вызначаюць навукова-тэхнічны прагрэс (электронная, аэракасмічная, машынабудаўнічая); паяўляецца мноства новых прафесій (аператары, наладчыкі аўтаматычных станкоў і ліній і г. д.) і скарачаюцца многія старыя прафесіі (гарнякоў, тэкстыльшчыкаў і інш.).

Другая змена — агульны рост кваліфікацыі рабочага класа. З рабочымі буйных прадпрыемстваў змыкаюцца значныя катэгорыі інжынерна-тэхнічных кадраў. Напрыклад, калектыў сталеліцейшчыкаў, якія абслугоўваюць адзін з агрэгатаў на сучасным заходнегерманскім металургічным прадпрыемстве, складаецца са 150 чалавек. 25 з іх — рабочыя, якія кіруюць працэсамі каля пульта; прыкладна столькі ж — наладчыкі абсталявання; звыш 25 чалавек — інжынеры, астатнія — тэхнікі, праграмісты, спецыялісты па інфарматыцы, майстры. Прыбытак прадпрыемства з'яўляецца ў дадзеным выпадку вынікам усіх названых работнікаў.

На аўтаматызаваным прадпрыемстве вартасць вырабляецца **«сукупным рабочым»** — не толькі тымі работнікамі, хто непасрэдна абслугоўвае аўтаматыку, але таксама рабочымі і служачымі, якія распрацоўвалі прынцыпы аўтаматызацыі, праектавалі машыны, зрабілі іх, хто паставіў неабходную энергію, сыравіну і г. д. Нізавая інжынерна-тэхнічная інтэлігенцыя, канторскія служачыя збліжаюцца з рабочым класам і сёння з'яўляюцца яго часткай.

Да прамысловага пралетарыяту прымыкаюць работнікі невытворчых галін (гандлю, фінансаў, сферы паслуг).

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя ў краінах Заходняй Еўропы, Паўночнай Амерыкі, Японіі выклікала рост

беспрацоўя. Крах традыцыйных галін вытворчасці прывёў да масавых звальненняў рабочых устарэлых прафесій і нізкай кваліфікацыі. Павышаны попыт на рабочую сілу з боку новых галін вытворчасці далёка не заўсёды дазваляў набіраць людзей з ліку страціўшых работу. Абвастрылася праблема павышэння кваліфікацыі, атрымання новай спецыяльнасці. Значная частка беспрацоўных — людзі сярэдняга ўзросту і моладзь — часта не маюць магчымасці, часам — і жадання вучыц ца, прывесці сваю кваліфікацыю ў адпаведнасць з патрабаваннямі НТР. Іх лёс — сацыяльная дэградацыя, ператварэнне ў люмпен-пралетарыят, які жыве за кошт дапамогі, выпадковымі заробкамі, на сродкі дабрачынных арганізацый.

Як мы бачым, ва ўмовах НТР беспрацоўе параджаецца не толькі цыклічнымі спадамі вытворчасці, але і развіццём аўтаматызацыі, якая выцясняе жывую працу з вытворчасці, структурнай перабудовай эканомікі, што суправаджаецца звужэннем старых галін вытворчасці і адміраннем многіх традыцыйных прафесій.

З НТР звязаны і экалагічныя праблемы, якія былі разгледжаны раней.

Такім чынам, навукова-тэхнічная рэвалюцыя — працэс шматгранны, супярэчлівы. Яна азначае пераварот у прадукцыйных сілах, вялікую эканомію жывой працы, выцясненне яе з уласна вытворчага працэсу. Яна ж абвастрае праблему занятасці, узмацняе антрапагенную нагрузку на прыроднае асяроддзе.

НТР непамерна павялічвае тэхнічныя магчымасці вытворчасці прадметаў спажывання, стварае ўмовы для павышэння эфектыўнасці аховы здароўя і адукацыі. Але ж яна дазваляе стварыць гіганцкія сілы разбурэння і масавага знішчэння.

Навукова-тэхнічны прагрэс стварыў сродкі, якія дазваляюць зрабіць вышэйшыя дасягненні культуры здабыткам мільёнаў людзей. Ён жа стварыў вялікія магчымасці маніпуляваць свядомасцю людзей у неўласцівых ім мэтах.

Рэалізаваць у поўнай меры патэнцыял НТР у інтарэсах чалавека можа толькі гуманны, дэмакратычны лад, які выкарыстоўвае яе дасягненні на карысць усім і які не дапускае прысваення яе вынікаў толькі часткай грамадства.

Пытанні і заданні

1. У чым асаблівасці сучаснага этапа НТР?

2. Як у выніку НТР мяняецца становішча чалавека ў вытворчасці?

3. У чым заключаецца экалагічны крызіс?

4. Якія магчымасці дае навукова-тэхнічны прагрэс для гарманізацыі адносін паміж грамадствам і прыродай?

5. Падумайце, ці пацвердзіліся прыведзеныя ніжэй думкі Энгельса ў працэсе развіцця навукі і тэхнікі ў другой палавіне XX ст.

«Калі... тэхніка ў значнай ступені залежыць ад стану навукі, то ў значна большай меры навука залежыць ад **стану** і **патрэб** тэхнікі. Калі ў грамадства ўзнікае тэхнічная патрэба, то гэта рухае навуку наперад больш, чым дзесятак універсітэтаў» (Маркс К., Энгельс Ф. Творы. Т. 39. С. 174). Свой адказ аргументуйце.

6. Савецкі філосаф Б. М. Кедраў пісаў: «У цяперашніх узаемаадносінах паміж навукай, тэхнікай і вытворчасцю навука складае самы рэвалюцыйны, самы хуткадзейны і рухомы элемент, хоць яна і ўзнікла гістарычна значна пазней за вытворчасць, і ў былыя часы з'явілася адстаючым звяном у сістэме «навука — тэхніка — вытворчасць».

Ці супярэчыць гэта меркаванне прыведзенаму ў пятым заданні сцверджанню Энгельса? Свой вывад растлумачце.

7. Удумайцеся ў наступныя факты:

Амерыканская кампанія «Бэл сістэмз» штогод траціць на падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў 800 млн долараў. У ёй пастаянна заняты 7 тыс. выкладчыкаў, якія вядуць некалькі соцень розных курсаў і праграм.

У 1987 г. у ЗША была аб'яўлена праграма павышэння канкурэнтаздольнасці амерыканскай эканомікі, цэнтральным звяном якой стала перападрыхтоўка 1 млн работнікаў за кошт дзяржбюджэту.

Чаму амерыканская дзяржава і прадпрымальнікі ажыццяўляюць буйныя расходы на перападрыхтоўку работнікаў? Як гэтыя расходы звязаны з эфектыўнасцю вытворчасці? З прыбыткамі?

8. Сістэма сучасных суперкамп'ютэраў можа запомніць інфармацыю, якая ёсць ва ўсіх бібліятэках свету, г. зн. фактычна здольна авалодаць усёй гістарычна накопленай памяццю чалавецтва.

Падумайце, ці ёсць сэнс затрачваць сродкі на перападрыхтоўку кадраў (гл. заданне 7), калі машыны могуць «усё ведаць»?

9. На Сусветнай выстаўцы ў Японіі «Экспо-85» дэманстравалі робат «Фанук», які збіраў з дэталей уласную копію. Паспрабуйце зрабіць вывад з гэтага факта. Пакажыце адзін, два, тры ці больш вынікаў з працэсу робатызацыі сучаснай вытворчасці.

10. Ці згодныя вы з наступнымі выказваннямі сучаснага французскага філосафа тэхнікі Ж. Элюля: «Мне хацелася б удакладніць, што амаль да 70-х гг. нашага стагоддзя тэхніка была маналітнай сілай, арыентаванай у адным напрамку: яна... мела на мэце адно магчымае — рост ва ўсіх напрамках, разгортванне магутнасцей, вытворчасці і г. д. Сёння аўтаматызацыя і інфарматызацыя здольны мала-памалу змяніць арыентацыю тэхнікі. Сама па сабе тэхнічная мутацыя (змяненне, перамена.— **Рэд.**), інфарматызацыя тэхнікі не выкліча ніякіх змен у становішчы пралетарыяту, небагатых мас, ніякага вызвалення чалавека не прынясе, калі не будзе рашучасці свядомага выбару, волі, здольнай выкарыстаць тэхніку ў гэтым напрамку». Як вы думаеце, у чым можа праявіцца свядомы выбар? Ад каго

залежыць гэты выбар? Ці залежыць напрамак выкарыстання тэхнікі ад грамадскіх парадкаў, характару ўлады?

11. Амерыканскі філосаф і паэт Ральф Уолда Эмерсан (сярэдзіна XIX ст.) гаварыў: «Сапраўдны паказчык цывілізацыі — не ўзровень багацця, і не велічыня гарадоў, не мноства ўраджаю, а аблічча чалавека, якога выхоўвае краіна». Як вы разумееце гэтыя словы? Што мае на ўвазе Эмерсан пад «абліччам чалавека»? Што вы самі думаеце аб сапраўдным паказчыку цывілізацыі?

12. Па падліках амерыканскага эканаміста, лаўрэата Нобелеўскай прэміі В. Лявонцьева ў ЗША к пачатку 2000 г. новая тэхніка прывядзе да скарачэння 20 млн рабочых месц. Як, па-вашаму, грамадства павінна рэагаваць на такую пагрозу?

13. Некаторыя заходнія эканамісты выказалі думку, што «ў свеце заўтрашняга дня толькі для адной прафесіі з дзесяці спатрэбяцца веды і толькі адно месца з дваццаці будзе мець адносіны да высокаразвітой тэхнікі». Як вы адносіцеся да такога прагнозу? Свой пункт погляду аргументуйце.

§ 21. ЧАЛАВЕК У СІСТЭМЕ ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН

Кожны чалавек уступае з іншымі ў разнастайныя эканамічныя адносіны. Ён вырабляе тавары ці паслугі, атрымліваючы за іх плату; валодае большай ці меншай уласнасцю; выступае ў ролі прадаўца ці пакупніка. Грошы (а ў нас яшчэ і талоны, карткі, купоны) дазваляюць яму атрымліваць долю матэрыяльных і духоўных даброт, якія стварае грамадства.

У чалавеку, як у фокусе, сыходзяцца нябачныя ніці эканамічных сувязей і адносін.

Чалавек і адносіны ўласнасці

Заходнія вучоныя ўжо даўно разглядаюць у якасці свяшчэнных і неад'емных правоў чалавека ў індустрыяльным грамадстве — права набываць, валодаць і атрымліваць прыбытак. Які бедны ні быў бы чалавек, ён усё-такі чым-небудзь валодае і даражыць гэтай крыхай таксама, як уладальнік капіталу — сваім багаццем. У якасці ўласнасці чалавек лічыць сваё цела, свае веды, уменні, здольнасці да працы. Уласнасцю чалавека («інтэлектуальнай уласнасцю») з'яўляюцца яго вынаходніцтвы, напісаная ім музыка або навуковая праца.

Уласнасцю чалавека з'яўляецца абутак, адзенне, прадметы хатняга ўжытку, многія маюць уласны дом, дачу, аўтамашыну.

Грамадзянін СССР можа быць уласнікам працоўнай гаспадаркі (напрыклад, малога прадпрыемства), сялянскай і асабістай падсобнай гаспадаркі, уключаючы не-

абходныя для яе сродкі вытворчасці. Гэта ўласнасць ствараецца згодна з Законам за кошт працоўных даходаў, вядзення сваёй гаспадаркі, даходаў ад сродкаў, якія ўкладзены ў акцыі і іншыя каштоўныя паперы, набыцця маёмасці ў спадчыну.

Ва ўсіх пералічаных формах уласнасці чалавек з'яўляецца сапраўдным гаспадаром сродкаў вытворчасці і прадуктаў сваёй працы, якія ў яго ёсць, можа іх выкарыстоўваць па свайму меркаванню, прадаваць, дарыць, перадаваць у спадчыну, распараджацца імі, як ён лічыць патрэбным. Нармальны чалавек клапоціцца аб захаванні і павелічэнні сваёй уласнасці, яе беражлівым выкарыстанні.

Больш складана выглядаюць справы з прадпрыемствамі, дзе чалавек працуе па найму.

Калі існавала натуральная гаспадарка, чалавек уласнымі прыладамі працы ствараў прадукт, які сам жа і спажываў. У далейшым, з развіццём таварнай гаспадаркі, прадукт працы як бы «адыходзіў» ад вытворцы, хоць у рамесніка і селяніна была свая гаспадарка, свае сродкі вытворчасці. Пераход да капіталізму прывёў да вызвалення масы вытворцаў ад сродкаў вытворчасці. І сродкі працы, і прадукт працы сталі належаць капіталісту. Для рабочага яны — чужыя, чужая ўласнасць. Так капіталізм непрыметна ўзмацніў **адчужэнне** работніка ад сродкаў і прадукту вытворчасці. І праца таксама цяпер перастала быць працай для сябе, гэта — праца на ўладальніка фабрыкі. Адсюль і адносіны рабочага да такой працы як да чагосьці чужога, ад чаго імкнуцца пазбавіцца.

У наш час у развітых краінах Захаду пачуццё адчужэння работнікаў ад сродкаў вытворчасці ў той ці іншай ступені знімаецца ў выніку ўдзелу ў кіраванні вытворчасцю сумесна з гаспадарамі ўласнасці і менеджэрамі. Напрыклад, у Заходняй Еўропе практычна ўсюды ёсць рабочае прадстаўніцтва ў вытворчых заводскіх камітэтах. У радзе краін рабочыя прадстаўлены ў адміністрацыйных органах прадпрыемстваў. Гэта, з аднаго боку, вынік барацьбы рабочых арганізацый, а з другога — імкненне ўладальнікаў прадпрыемстваў пераадолець негатыўныя вынікі адчужэння пры захаванні прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

У нашай краіне Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. зрабіла важны крок да пераадолення адчужэння ад сродкаў і вынікаў вытворчасці, ад працы. Яна абвясці-

ла: «Зямля — сялянам, фабрыкі — рабочым!» Аднак камандна-адміністрацыйная сістэма, якая склалася ў краіне, дэкларуючы агульнанародны характар уласнасці, усталявала ўсеагульнае адзяржаўленне, што паставіла ўсіх удзельнікаў вытворчасці ў адчужаныя адносіны да сродкаў і вынікаў іх працы. Успрыманне грамадскай уласнасці як «нічыйнай», не сваёй параджала раўнадушша да яе лёсу, ляноту, ірвацтва, безадказнасць.

Эканамічная рэформа ў СССР (пра яе гутарка пойдзе ў наступным параграфе) заклікана пераадолець адчужэнне чалавека ад уласнасці, умоў і вынікаў яго працы. Важны напрамак змен — раздзяржаўленне, прыватызацыя ўласнасці. У калектыўным прадпрыемстве, у кааператыве, акцыянерным грамадстве чалавек на справе з'яўляецца сагаспадаром вытворчасці, разам з іншымі работнікамі, членамі кааператыва, акцыянерамі ён вырашае пытанні вытворчасці прадукцыі і размеркавання даходаў, а яго асабісты даход прама залежыць ад вынікаў гаспадарання.

Другі напрамак — гэта дэмакратызацыя кіравання дзяржаўнымі прадпрыемствамі, расшырэнне правоў працоўнага калектыву ў вырашэнні вытворчых і сацыяльных пытанняў.

І яшчэ адзін шлях пераадолення адчужэння ад працы — гуманізацыя ўмоў працы, змяненне зместу працы, яе ўзбагачэнне за кошт узрастання ў ёй творчых пачаткаў. Гэтыя змены непасрэдна звязаны з новай тэхнікай і тэхналогіяй.

Чалавек у вытворчасці

Навукова-тэхнічны прагрэс, як вам вядома, выклікае змяненне ролі чалавека ў вытворчасці, уздзейнічае на змест яго працоўнай дзейнасці.

Істотна змяняюцца суадносіны паміж фізічнай і разумовай працай, фізічнымі і інтэлектуальнымі здольнасцямі. Калі раней рабочы рэалізаваў у працэсе вытворчасці пераважна фізічныя здольнасці (вынослівасць, мускульную сілу, прафесійную натрэніраванасць), то стварэнне машын, якія выконваюць лагічныя аперацыі, ставіць на першы план такія здольнасці чалавека, як аналіз абставін, уменне супаставіць даныя, ставіць мэты і да т. п. Рэзкую мяжу паміж разумовай і фізічнай працай устанавіць цяжка. Рамонт каляровага тэлевізара звязаны і з ручной (фізічнай) працай, і з працай разумовай. А ці можна вылучыць два віды

працы, напрыклад, у дзейнасці хірурга?

Аднак і ў нас, і ва ўсім свеце навукова-тэхнічная рэвалюцыя цягне за сабою ўзмацненне разумовых функцый працы. Пры гэтым узрастае творчы пачатак: здольнасць ацэньваць сітуацыю і прымаць самастойныя рашэнні.

Навейшая тэхніка і тэхналогія стымулююць развіццё здольнасцей чалавека і у той жа час прад'яўляюць высокія патрабаванні да асобы работніка. Вынікам памылкі рабочага-станочніка магла стаць адна сапсаваная дэталь. Памылкі аператара аўтаматычнай лініі цягнуць за сабой сотні бракаваных дэталей. Памылкі аператара АЭС або памылкі пілота авіялайнера могуць кончыцца вельмі цяжкімі вынікамі. Здавалася б, работа зводзіцца да назірання за прыборамі і націскання кнопак. На справе ж узмацняюцца эмацыянальнае напружанне, псіхічныя нагрузкі. Узрастае роля маральных якасцей асобы: пачуцця адказнасці, самадысцыпліны, самаканторолю.

У вытворчасці значна павялічваецца роля «чалавечага фактара». На вопыце 62 карпарацый, якія маюць найбольшы поспех, амерыканскія даследчыкі прыйшлі да вываду: у якасці галоўнай крыніцы росту прадукцыйнасці трэба мець на ўвазе не капіталаўкладанні, не аўтаматыку, а людзей. Гутарка ідзе і аб кваліфікацыі работнікаў, і аб іх здольнасцях, і аб адносінах да працы.

Адносіны да працы паказваюць сувязь паміж чалавекам і грамадствам у працэсе вытворчай дзейнасці. У іх адлюстроўваецца імкненне чалавека рэалізаваць свае здольнасці ў працы для прагрэсу грамадства і свайго сацыяльнага самасцвярджэння. У нашай краіне частка працоўных усвядомлена, ініцыятыўна выконвае нарматывы працы, вызначаныя грамадствам. Яны праяўляюць арганізаванасць, беражлівасць, не мірацца з безгаспадарчасцю, расхлябанасцю, недысцыплінаванасцю. У гэтым зацікаўлена грамадства, у гэтым зацікаўлены і сам чалавек, які ганарыцца сваёй прафесійнай дзейнасцю, атрымлівае ад яе маральнае задавальненне. Але нямала людзей працуе спусціўшы рукавы, абы-як і гатовы жыць на грані беднасці, абы толькі не напружвацца на працы. Падумайце, якія прычыны такіх дэфармацый.

Змяненне адносін да працы звязана з пераадоленнем адчужэння работніка ад працы, развіццём пачуцця

гаспадара; з павышэннем агульнай культуры і кваліфікацыі работнікаў; з укараненнем у вытворчасць дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, скарачэннем удзельнай вагі манатоннай, цяжкай ручной працы; з паляпшэннем санітарна-гігіенічных, эстэтычных умоў працы; з паляпшэннем сацыяльна-псіхалагічнага клімату ў працоўных калектывах, развіццём вытворчай дэмакратыі.

Чалавек у адносінах размеркавання

Размеркавальныя адносіны функцыяніруюць на розных узроўнях (напрыклад, на ўзроўні краіны размеркаванне сродкаў вытворчасці і рабочай сілы па галінах народнай гаспадаркі і прадпрыемствах; на ўзроўні горада ці раёна — размеркаванне прадметаў спажывання і паслуг). На кожным з гэтых узроўняў у адносінах размеркавання ўдзельнічаюць людзі. Яны ўлічваюць прапорцыі паміж галінамі вытворчасці, спажываннем і вытворчасцю і да т. п. Выбіраючы прафесію або род дзейнасці, людзі ствараюць тыя грамадскія багацці, якія пасля размяркоўваюцца на тых ці іншых умовах.

Часцей за ўсё, калі гутарка ідзе аб размеркаванні, маюць на ўвазе размеркаванне тавараў і паслуг. Іменна гэтыя адносіны ў многім вызначаюць узровень і якасць жыцця чалавека. Размеркавальныя адносіны не толькі забяспечваюць чалавеку ўмовы для ўзнаўлення яго рабочай сілы, але і ў пэўнай меры фарміруюць матэрыяльныя і духоўныя патрэбы, вызначаючы, якія з іх могуць быць задаволены ўжо цяпер, а якія — толькі ў будучым.

Хто з вас не ведае, што ў нашым грамадстве прынцыпам размеркавання з'яўляецца: «Ад кожнага па здольнасцях, кожнаму — па працы». Паставім пытанне: ці так усё зразумела ў прывычным лозунгу? Што гэта значыць для чалавека і для грамадства? Гуманнае і справядлівае грамадства аб'ектыўна зацікаўлена ў тым, каб усе здольнасці работніка знаходзілі ўсё больш поўнае прымяненне, ажыццяўляліся і развіваліся на карысць іншых людзей. Аксіёмай з'яўляецца той факт, што ўсе людзі валодаюць рознымі здольнасцямі. Грамадства, арыентаванае на чалавека, як вышэйшую каштоўнасць, не можа не імкнуцца да выкарыстання такога багацця, як багацце разнастайных здольнасцей людзей.

А што ж сам чалавек? Ён павінен чакаць, калі яго

здольнасці будуць запатрабаваны і прызнаны грамадствам? Не, ад самога чалавека залежыць поспех у рэалізацыі сваіх талентаў і прызначэнняў. Каб паўнацэнна раскрыць здольнасці, іх неабходна ведаць, пастаянна вывучаць і развіваць у патрэбным для грамадства напрамку.

Выпраўленне дэфармацый у грамадстве, якое перажывае пакутлівыя пошукі выхаду да новых магчымасцей і перспектыў, паступовы адыход ад пануючай абязлічанасці грамадскага жыцця, недаацэнкі і прыніжэнні індывідуальнасці азначаюць адказ ад ураўняльнасці ў аплаце працы, адраджэнне цывілізаванай канкурэнцыі, спаборніцтва ў дасягненні гуманных мэт высакароднымі сродкамі.

Прынцып аплаты па працы таксама ставіць рад няпростых пытанняў перад чалавекам і грамадствам. Што значыць плаціць па працы? За час, праведзены на рабочым месцы? За колькасць выпрабленай прадукцыі? За кошт гэтай прадукцыі? Па якой працы ў нас павінна быць размеркаванне, па той, якая прызнана спажыўцом як карысная, прадукт якой куплены, ці, зыходзячы з таго, што праца любога чалавека заведама карысная? Відаць, варта прызнаць, што заведамае прызнанне прадукту карысным па-за рынкам прымушае грамадства прымаць на сябе страты, якія ўзнікаюць таму, што вытворцу заплачана за няякасную прадукцыю. Спажывец жа не хоча за яе плаціць. Ёсць тут і іншы немалаважны бок: страта працоўным чалавекам пачуцця справядлівасці, калі за працу карысную і патрэбную плацяць таксама (а нярэдка і істотна менш), як і за выпуск бракаванай прадукцыі або бессэнсоўнае правядзенне часу на рабочым месцы.

Калі пры размеркаванні па працы кожны чалавек прыблізна ведае меру, у адпаведнасці з якой яму належыць тая ці іншая колькасць тавараў і паслуг, то некалькі інакш абстаяць справы з размеркаваннем грамадскіх фондаў спажывання.

Ведаючы, як выкарыстоўваюцца грамадскія фонды спажывання, вы можаце на прыкладзе вашай сям'і вызначыць долю гэтых фондаў у сямейным даходзе. Для гэтага трэба падсумаваць пенсіі, стыпендыі, дапамогу, якую атрымліваюць члены сям'і, а таксама выдаткі дзяржавы на навучанне і выхаванне дзяцей, медыцынскае абслугоўванне, датацыі на жыллё. Разам з сумай

заробкаў працаздольных членаў сям'і гэта складзе даходную частку сямейнага бюджэту.

Імкненне павялічыць памеры даходаў прымушае чалавека праяўляць актыўнасць: працаваць па сумяшчальніцтву, займацца індывідуальнай працоўнай дзейнасцю ў свабодны час, прынімаць удзел у якім-небудзь працоўным аб'яднанні ў свабодны ад вучобы час і г. д.

Удзельнічаць у размеркаванні даводзіцца практычна кожнаму чалавеку. Члены сям'і рашаюць сумесна пытанне аб першачарговых пакупках. Дэпутаты розных узроўняў удзельнічаюць у абмеркаванні спосабаў размеркавання даходаў і расходаў на тэрыторыі, падначаленай Савету. Члены працоўных калектываў абмяркоўваюць спосабы вызначэння і памеры долі кожнага ў размеркаванні прыбытку. У нашай краіне сістэма размеркавання пакуль яшчэ такая, што, маючы сродкі на набыццё неабходнага тавару, спажывец залежыць ад чыноўніка, які займаецца на тым ці іншым узроўні размеркаваннем.

Напрыклад, у калгасе ёсць сродкі на пакупку будаўнічых матэрыялаў, але іх размяркоўваюць недзе ў арганізацыях, далёкіх ад вёскі. Чалавеку патрэбен абутак, але без талона ён не можа яго набыць, і г. д. Так складваюцца ненармальныя формы залежнасці ад тых, хто размяркоўвае і стварае ўмовы для шматлікіх злоўжыванняў. З імі вядуць барацьбу праваахоўныя органы, але па-сапраўднаму пазбавіцца ад гэтай «размеркавальнай» хваробы дапаможа рынак.

Падумайце чаму.

Чалавек у сістэме адносін спажывання

Чалавек-спажывец уступае ў адносіны з іншымі людзьмі наконт прадметаў спажывання. У тых ці іншых адносінах праяўляюцца асаблівасці чалавека як асобы. Патрэбнасці чалавека іграюць істотную ролю ў развіцці грамадства. Па-першае, яны забяспечваюць выбіральныя адносіны чалавека да навакольнага свету. Вобразна кажучы, патрэбнасці дазваляюць чалавеку бачыць і чуць тое, што ён хоча ўбачыць і пачуць з таго, што яму паказваюць. Гэта выбіральнасць праяўляецца ў любой сітуацыі выбару з альтэрнатыў, напрыклад, якую вырабіць прадукцыю ў падсобнай гаспадарцы, што купляць, куды ўкласці сваю працу і свае здольнасці і г. д.

Па-другое, патрэбнасці чалавека выконваюць ролю

рэгулятара вытворчасці, крытэрыяў выбару той ці іншай прадукцыі для выпуску ў вытворчасць і зняцця з вытворчасці. Пры гэтым патрэбнасці могуць змяняцца пад уплывам вытворчасці. Напрыклад, да таго часу, пакуль вытворчасць не забяспечыла рынак дастатковай колькасцю тэлевізараў па даступнай цане, насельніцтва цалкам абыходзілася без тэлевізараў. Патрэбнасці, якія задавальняюцца цяпер з дапамогай тэлевізара, раней знаходзілі другі выхад: людзі часцей хадзілі ў кіно, у тэатр, на стадыён, слухалі радыё, сустракаліся з роднымі і знаёмымі, чыталі кнігі і прэсу. Масавая вытворчасць тэлевізараў не толькі сфарміравала, але і ўмацавала патрэбнасць у праглядзе тэлеперадач, прытым не толькі чорна-белых, але і каляровых.

Яшчэ адна функцыя патрэбнасцей — пабуджальная сіла, якая накіроўвае ўсю грамадскую актыўнасць чалавека.

Дэфармацыі ў задавальненні разумных патрэбнасцей ва ўмовах дэфіцыту не могуць не выклікаць такіх пачварных з'яў, якія маральна калечаць асобу, як імкненне «дастаць» тую ці іншую рэч любымі сродкамі. Часта пры гэтым сапраўдны кошт рэчы і «прэстыжнасць», што ёй прыпісваецца, абсалютна не раўназначныя.

Нярэдка паміж рэччу, у якой мае патрэбу спажывец, і вытворцам паяўляецца пасрэднік, які займаецца размеркаваннем. Яго роля мяняецца ў залежнасці ад функцыяніравання рынку. Напрыклад, поўная насычанасць (ці перанасычанасць) рынку хлебам прадастаўляе спажыўцу выбар. Вытворца зацікаўлены ў збыце сваёй прадукцыі, клапоціцца аб яе якасці і асартыменце. Пасрэднік тут не мае магчымасці што-небудзь унесці ад сябе. Размеркавальныя адносіны функцыяніруюць у адпаведнасці з прынцыпам сацыялізму: кожны атрымлівае па працы. Ва ўмовах жа дэфіцыту спажывец аб'ектыўна аказваецца ў залежнасці не толькі ад вытворцы, але і ад пасрэдніка (прадаўца, асобы, якая загадвае «фондамі», спекулянта і г. д.). Цяпер спажывец не толькі сам не можа выбіраць прадукт у адпаведнасці са сваімі даходамі, патрэбнасцямі і густам, але вымушаны прымаць тыя ўмовы, якія навязвае яму вытворца, а нярэдка і пасрэднік: купляць хлеб не той якасці, купляць яго ў запас, стаяць у чарзе, карыстацца талонамі ці карткамі. Наяўнасць пасрэдніка прымушае і вытворцу лічыцца з гэтай умовай (бо ад другога

пасрэдніка можа залежаць атрыманне сыравіны, камплектуючых і да т. п.).

Яшчэ адна сітуацыя ўзнікае ў тым выпадку, калі патрэбнасць ёсць, а задавальненне яе за кошт працоўных даходаў немагчыма (цана вельмі высокая, заработная плата малая, прадмет з'яўляецца дэфіцытным і да т. п.), тады ўзнікае спакуса пайсці абходным шляхам, парушыўшы прынцып — па працы.

Калі нельга сумленнай працай зарабіць, а патрэба ў дадатковых сродках узнікае, то выхадаў з гэтай сітуацыі можа быць нямнога. Адны ўладкоўваюцца так, каб на рабоце толькі лічыцца, а падзарабляць на баку, хоць і на законнай аснове. Іншыя не шукаюць дадатковага заробку, але і на асноўнай рабоце што называецца «не выкладваюцца», так сказаць, працуюць па зарплаце. Трэція шукаюць непрацоўныя даходы, парушаючы прававыя нормы. Але, безумоўна, асноўная маса людзей працуе ў поўную сілу і пры такой сітуацыі, імкнучыся змяніць умовы жыцця і працы.

Такім чынам, адносіны размеркавання, абмену (дзейнасцю і прадуктамі яе) і спажывання аказваюць непасрэдны ўплыў на развіццё вытворчасці праз якасці чалавека, яго адносіны да працы, да іншых людзей, да самога сябе.

Атрымаўшы пэўную долю матэрыяльных даброт, чалавек «спажывае» (выкарыстоўвае) яе па-рознаму. Ёсць гаспадарчыя адносіны да спажываемых даброт. У гэтым выпадку спажывец паклапоціцца аб захаванасці рэчы, аб другасным выкарыстанні прадукту. Ён не выкіне зачарсцвелы хлеб, адрамантуе бытавую прыладу, паклапоціцца аб чыстым і ўстойлівым да непагадзі абутку, выключыць лішні асвятляльны прыбор. Гаспадарчыя адносіны могуць праяўляцца і ў «вытворчым спажыванні» — у эканоміі сыравіны, жывой працы, энергіі і да т. п. Іншы тып адносін — безгаспадарчасць. У ёй праяўляецца непавага да чужой і ўласнай працы. Нярэдка безгаспадарчасць суседнічае з нізкай культурай спажывання. «Урваць больш», прычым любым спосабам — зусім не значыць праявіць гаспадарлівасць. Скупасць, прагнасць нічога агульнага не маюць з беражлівасцю. Чалавек па-сапраўднаму культурны нават пры невысокім узроўні даходу знойдзе месца ў структуры спажываемых ім даброт духоўным дабротам. Ён «выкраіць» сродкі на кнігу, часопіс, на наведванне тэатра ці кіно. Чалавеку ж далёкаму ад культуры спа-

жывання і пры высокім узроўні даходу будзе не хапаць, заўсёды будзе мала. Дарэчы, вы самі можаце прывесці прыклады культурнага спажывання і прыклады супрацьлеглыя гэтаму. Пытанне аб культуры спажывання вечнае, як вечная праблема «чалавек і эканоміка».

Пытанні і заданні

1. У чым заключаецца праблема пераадолення адчужэння? Якія шляхі яе вырашэння?

2. Як змяняецца становішча чалавека ў сістэме вытворчых адносін?

3. Ад чаго залежаць даходы сям'і?

4. Што такое культура спажывання?

5. Па слоўніках «гаспадар» — гэта чалавек, які самастойна вядзе гаспадарку. Зразумела, што ён павінен быць надзелены рэальным правам выбіраць від дзейнасці па-свайму разуменню і зыходзячы са сваіх эканамічных інтарэсаў; самастойна арганізоўваць вытворчасць, знайсці лепшую для сябе тэхналогію, нарэшце, свабодна распараджацца прадуктам працы і атрыманым даходам. Якія эканамічныя ўмовы дазваляюць чалавеку рэалізаваць сябе як гаспадара?

6. Зрабіце вывад з аналізу наступных вынікаў сацыялагічнага даследавання, якое было праведзена ў ЗША ў пачатку 80-х гг.:

заработная плата звычайна займае адно з трох першых месцаў па значнасці сярод іншых крыніц задавальнення работай;

прыкладна 80 % апытаных выказалі незадаволенасць сваёй заработнай платай;

сярод людзей з аднолькавай заработнай платай людзі старэйшага ўзросту ці тыя, хто займаюць больш высокае службовае становішча, больш адукаваныя і кваліфікаваныя выказваюць меншую задаволенасць сваімі даходамі; мужчыны менш задаволены заработкам, чым жанчыны;

прыкладна 65 % апытаных адказалі, што яны час ад часу параўноўваюць сваю зарплату з заробкамі іншых, 25 % робяць гэта часта.

7. Ніжэй прыводзяцца даныя аб вызначэнні ўзроўню стрэсу, выклікаемага работай. Лічбы ад 10 да 0 абазначаюць: чым вышэйшая лічба, тым мацнейшы стрэс. Як, па-вашаму, можа быць звязана дадзеная характарыстыка прафесіі з узроўнем справядлівай аплаты за яе?

Шахцёр — 8,3; паліцэйскі — 7,7; журналіст, пілот грамадзянскай авіяцыі — 7,5; акцёр — 7,2; палітык — 7,0; урач — 6,8; настаўнік — 6,2; работнік сферы абслугоўвання — 6,0; менеджэр — 5,8; фермер — 4,8; эканаміст, паштальён, архітэктар — 4,0; банкір, аператар ЭВМ — 3,7; інжынер — 4,3; касметолаг — 3,5; нянька ў яслях — 3,3; бібліятэкар — 2,6.

8. У арт. 25 Усесаюзнай дэкларацыі правоў чалавека, прынятай ААН у 1947 г., гаворыцца, што кожны чалавек мае права на такі жыццёвы ўзровень, уключаючы ежу, адзенне, жыллё, медыцынскі догляд і сацыяльнае абслугоўванне, які неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту яго самога і яго сям'і, і права на забеспячэнне на выпадак хваробы, інваліднасці, удаўства, наступлення старасці ці іншай страты сродкаў да існавання па незалежных ад яго абставінах.

Якія на вашу думку эканамічныя ўмовы забяспячэння гэтага права чалавека?

На прыкладзе сваёй сям'і вызначце долю розных крыніц даходу ў забеспячэнні ўмоў для рэалізацыі гэтых правоў.

9. Як вы можаце растлумачыць даныя сацыялагічнага даследавання адносін багатых людзей да ролі грошай у іх жыцці (па даных англійскага даследавання 1984 г.); найбольш тыповымі былі наступныя адказы: «Я цвёрда ўпэўнены, што грошы могуць вырашыць усе мае праблемы»; «Усе мае думкі заняты фінансавымі пытаннямі»; «Спачатку грошы, потым уцехі»?

Як бы вы самі адказалі на пытанне аб ролі грошай у вашым жыцці? Правядзіце невялікае апытанне ў сваім класе, атрыманыя даныя пракаменціруйце.

10. Уявіце сябе ў ролі пакупніка. Вам патрэбен абутак. Якія ўласцівасці тавару для вас найбольш істотныя: адпаведнасць з модай; даступнасць цаны; зручнасць, практычнасць; фірма, фабрыка-вытворца; якасць зыходнай сыравіны або якія-небудзь іншыя? У якой меры вы лічыце сваю думку тыповай для вашых равеснікаў? Для людзей старэйшага ўзросту? Чым вы можаце растлумачыць сваю думку?

11. Дапусцім, што вам давялося ўдзельнічаць у абмеркаванні праекта Закона СССР аб абароне правоў спажыўца. Ва ўступнай частцы вызначаецца, хто такі спажывец: «грамадзянін, які выкарыстоўвае, набывае, заказвае або мае намер набыць ці заказаць прадукцыю для ўласных патрэб».

Ці лічыце вы правамерным і дастатковым такое тлумачэнне паняцця «спажывец»? Свой адказ аргументуйце.

12. У арт. 4 праекта Закона СССР аб абароне правоў спажыўца вызначаны наступныя правы спажыўцоў прадукцыі: права на гарантаваны ўзровень спажывання; належную якасць прадукцыі; бяспечную прадукцыю; поўную і дакладную інфармацыю аб прадукцыі; належную якасць гандлёвага і іншых відаў абслугоўвання; звяртацца ў суд і іншыя ўпаўнаважаныя дзяржаўныя органы; аб'яднанне ў грамадскія арганізацыі спажыўцоў.

Якія з гэтых правоў вы расшырылі б, дапоўнілі, выключылі, чаму?

§ 22. РАДЫКАЛЬНАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ РЭФОРМА Ў СССР

Да гэтага часу мы гаворым аб рысах эканамічнага развіцця, характэрных для ўсёй сучаснай цывілізацыі. Але эканоміка кожнай краіны мае спецыфіку, звязаную з геаграфічнымі ўмовамі, гістарычным развіццём, нацыянальнымі традыцыямі. Нас, натуральна, цікавіць становішча ў эканоміцы СССР. Савецкая эканоміка знаходзіцца ў пераходным стане. Адбываюцца глыбокія змены, выкліканыя эканамічнай рэформай.

Неабходнасць эканамічнай рэформы

Мы ўжо гаварылі аб двух магчымых варыянтах арганізацыі эканамічнага жыцця: рыначным і камандным.

У нашай краіне асаблівасці яе гістарычнага развіцця прывялі да стварэння камандна-

эканомікі, або, як звычайна гавораць, камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання. Гэта сістэма, якая існавала на працягу дзесяткаў гадоў, стала галоўнай прычынай застою ў 70-х гг., а затым і крызісу, у якім апынулася савецкая эканоміка ў 80-х гг.

Ва ўмовах панавання **камандна-адміністрацыйнай сістэмы** адбылося «адзяржаўленне» сродкаў вытворчасці. Гэта азначае, што скарачаліся кааператыўныя формы гаспадарання, а калгасы страчвалі рысы кааператыўных прадпрыемстваў, усё больш падначальваліся камандам дзяржаўных органаў. Была насільна ліквідавана індывідуальная працоўная дзейнасць, абмяжоўвалася асабістая падсобная гаспадарка жыхароў вёскі і іншых грамадзян. Фактычнае валоданне дзяржаўнымі сродкамі вытворчасці сканцэнтравалася ў руках міністэрстваў і іншых органаў дзяржаўнага апарату.

Усталяваўся жорсткі цэнтралізм: міністэрствы ўстанаўлівалі планавыя заданні кожнаму прадпрыемству, яны ж размяркоўвалі рэсурсы, г. зн. рашалі, каму і ў якой колькасці выдаць паліва, сыравіну, станкі, будаўнічыя матэрыялы і іншае абсталяванне.

Паколькі калектывы прадпрыемстваў не маглі самастойна распараджацца сродкамі вытворчасці, вырабленай прадукцыяй, атрыманым прыбыткам, іх работнікі паступова страчвалі пачуццё гаспадара вытворчасці. Мала хто звяртаў увагу на не ўстаноўленую ў цэхах дарагую тэхніку, якая ржавела, на мяшкі з угнаеннем, якія моклі пад дажджом, на нявыбраную з палёў бульбу і агародніну, якія гнілі. Падала зацікаўленасць у павелічэнні сваёй працай грамадскага багацця, зніжалася працоўная актыўнасць.

Каля 40 % ад агульнай колькасці прадпрыемстваў не толькі не прыносілі прыбытак, а былі стратнымі. Дзяржаўныя органы, каб падтрымаць іх, забіралі сродкі ў прадпрыемстваў, якія добра працавалі, і перадавалі тым, хто працаваў неэфектыўна. Гэта прыводзіла да ўраўнілаўкі ў аплаце працы тых, хто працаваў добра, і тых, хто не турбаваўся аб агульным дабрабыце. Многія пранікаліся ўтрыманскімі настроямі: «дзяржава ў нас багатая, яна абавязана ўсіх падтрымаць, усім нешта даваць». Ураўнілаўка і ўтрыманства білі па тых работніках і калектывах, якія працавалі лепш і былі здольны даць грамадству больш. Адхіленне ад рашэння вытворчых пытанняў, незацікаўленасць у росце грамадскага

багацця, утрыманства, ураўнілаўка — усё гэта адбівала ахвоту эфектыўна працаваць.

Узмацненне кантролю, загады і прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці не маглі кампенсаваць адсутнасць у працаўніка эканамічных імкненняў да напружанай працы. Разрастаўся плануючы, размяркоўваючы, кантралюючы бюракратычны апарат, але эканоміка не станавілася ад гэтага больш эфектыўнай. Ні адзін пяцігадовы план, пабудаваны на камандных прынцыпах, не быў выкананы.

Грамадскія інтарэсы падмяняліся інтарэсамі ведамстваў (міністэрстваў і іншых дзяржаўных органаў). Узніклі сур'ёзныя дыспрапорцыі ў эканоміцы, нарастаў дэфіцыт (нястача) многіх тавараў, распаўсюдзіліся прыпіскі (скажоная інфармацыя, якая завышала сапраўдныя вынікі вытворчай дзейнасці).

Ва ўмовах камандна-адміністрацыйнай сістэмы вытворчасць стала неўспрымальнай да навукова-тэхнічных новаўвядзенняў.

СССР пачаў уступаць іншым індустрыяльна развітым краінам адну эканамічную пазіцыю за другой. У навукова-тэхнічным прагрэсе, эфектыўнасці вытворчасці, якасці прадукцыі разрыў паміж савецкай эканомікай і эканомікай развітых капіталістычных краін пачаў узрастаць. Рост вытворчасці запаволіўся, а затым наступіла стагнацыя (ад лац.— рабіць нерухомым, спыняць).

Стала зразумела, што без карэнных пераўтварэнняў у эканоміцы краіна не зможа выйсці з крызісу, і жыццёвы ўзровень насельніцтва будзе падаць.

Да рыначнай эканомікі

Альтэрнатывай камандна-адміністрацыйнай сістэме кіравання народнай гаспадаркай, якая сябе зжыла, з'яўляецца рыначная эканоміка. Вышэйшыя органы ўлады краіны прыйшлі да вываду, што іншага варыянта арганізацыі эканамічнага жыцця, які дазволіў бы рушыць уперад эканамічнае развіццё краіны, не існуе. Жыццёвасць і рэзультатыўнасць рыначнай эканомікі даказаны сусветным вопытам. Абагульненне гэтага вопыту прывяло вучоных-эканамістаў да заключэння: рыначная сістэма — гэта дасягненне гістарычнага развіцця, агульначалавечая каштоўнасць, магутны сродак павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Таварна-грашовыя адносіны — гэта вядучы рэгулятар эканамічнага жыцця ва ўмовах любой развітой вытворчасці.

Пераход да рыначнай эканомікі ў нашай краіне дык-

туецца інтарэсамі чалавека. Рыначная эканоміка дазволіць стварыць умовы для заахвочвання працавітасці, творчасці, ініцыятывы і высокай прадукцыйнасці. Гэта створыць эканамічныя стымулы высокапрадукцыйнай працы, якія невымерна вышэй за адміністрацыйныя.

Пераход да рынку дазволіць арыентаваць вытворчасць на патрэбы людзей, стварыць эфектыўны механізм узаемавыгадных адносін вытворцы і спажыўца. Патрэбы спажыўца, а не манаполія вытворцы будуць вызначаць, што, у якой колькасці і якой якасці павінна быць прапанавана для продажу. Рыначная эканоміка паложыць канец хранічнаму дэфіцыту, дазволіць пераадолець ганьбу чэргаў, яна падарве базу для спекуляцыі.

Якія ж змены ў эканоміцы неабходны, каб забяспечыць пераход да рынку?

Гэта, перш за ўсё, стварэнне змешанай эканомікі, разнастайнасць раўнапраўных форм уласнасці, і з гэтай мэтай падтрымка **прадпрымальніцтва, раздзяржаўленне, прыватызацыя і развіццё канкурэнцыі.** Эфектыўнае функцыяніраванне рынку магчыма толькі пры ўмове, калі асноўная частка таваравытворцаў (прадпрыемстваў, арганізацый) валодае свабодай гаспадарчай дзейнасці і прадпрымальніцтва. Яны павінны не па загадах, а самастойна вызначаць, як выкарыстоўваць арандаваную ці перададзеную ў карыстанне маёмасць, што ім належыць. Яны самастойна рашаюць, што і як выпускаць. Гэтак жа самастойна яны выбіраюць пастаўшчыкоў сыравіны, абсталявання, паўфабрыкатаў і г. д., звязваюцца са спажыўцамі, дамаўляюцца аб цэнах. Нарэшце, таваравытворцы самі свабодна распараджаюцца сваім прыбыткам, які застаецца пасля выплаты падаткаў.

Для таго каб забяспечыць эканамічную свабоду, прыняты Закон «Аб уласнасці ў СССР». Грамадзяне СССР могуць весці ўласную працоўную гаспадарку: мець майстэрню ці іншае малое прадпрыемства ў сферы бытавога абслугоўвання, гандлю, грамадскага харчавання (магазіны, сталовыя і г. д.), у іншых галінах гаспадарчай дзейнасці. Жыхары вёскі — уласную сялянскую гаспадарку з гаспадарчымі пабудовамі, насаджэннямі на зямельным участку, прадукцыйнай і рабочай жывёлай, птушкай, сельскагаспадарчай тэхнікай, транспартнымі сродкамі. У тых сектарах эканомікі, дзе

дробная і сярэдняя вытворчасць застаецца эфектыўнай (напрыклад, у сферы паслуг), прыватная ўласнасць можа сыграць дадатную ролю ў развіцці эканомікі.

Згодна з названым законам, групамі грамадзян могуць быць створаны кааператывы, а таксама гаспадарчыя суполкі і таварыствы.

Разам са стварэннем новых прадпрыемстваў, павінна адбывацца вывядзенне большай часткі наяўных прадпрыемстваў з-пад дзяржаўнай апекі. Гэта не абавязкова пераход да індывідуальнай уласнасці, але і перадача ці продаж дзяржаўнай уласнасці працоўчым калектывам, кааператывам, акцыянерам. У выніку ўзнікае ўласнасць калектыўнага прадпрыемства, таварыства, кааператыва, акцыянернага грамадства. Калектывы могуць не толькі набываць, але і арэндаваць дзяржаўныя прадпрыемствы і маёмасць. Арэнда мяркуе перадачу ўласнікам права карыстацца і распараджацца яго ўласнасцю на пэўны тэрмін і за пэўную аплату.

Могуць таксама стварацца прадпрыемствы, якія з'яўляюцца ўласнасцю грамадскіх і рэлігійных арганізацый, замежных грамадзян і фірм, а таксама змешаныя прадпрыемствы.

Разам з тым у дзяржаўнай уласнасці (агульнасаюзнай, рэспубліканскай, камунальнай) застаюцца прадпрыемствы, якія маюць асоба важнае значэнне для жыццезабеспячэння насельніцтва краіны ці асобнага рэгіёна.

Такім чынам, пераўтварэнне дзяржаўнай уласнасці з казённа-бюракратычнай у грамадскую ўласнасць, якая кіруецца самімі калектывамі, стварэнне акцыянерных кааператыўных, сумесных і прыватных прадпрыемстваў вядзе да разнастайнасці **раўнапраўных форм уласнасці.**

Усім таваравытворцам, незалежна ад форм уласнасці, павінна быць дадзена самастойнасць, свабода прадпрымальніцтва, гарантавана неўмяшанне органаў дзяржаўнага кіравання ў іх работу. Важна таксама заахвочваць канкурэнцыю паміж імі, прыняць антыманапольныя меры, падтрымаць сетку дробных і сярэдніх прадпрыемстваў. Асновай эканамічных адносін павінны стаць узаемасувязі самастойных прадпрыемстваў — галоўных суб'ектаў рынку.

Важнейшая мера на шляху да рынку — **зямельная рэформа.** Яна накіравана на тое, каб зацвердзіць селяніна сапраўдным гаспадаром на зямлі і гаспадаром

вынікаў сваёй працы. Гэтаму садзейнічае развіццё разнастайных форм уласнасці, стварэнне аднолькавых умоў для развіцця як грамадска-калгаснай і саўгаснай, так і індывідуальнай, сямейнай, арэнднай гаспадаркі. Распараджацца зямлёй павінны Саветы народных дэпутатаў. Адміністрацыйныя органы дзяржаўнага кіравання сельскагаспадарчай вытворчасцю павінны быць ліквідаваны, што выключыць дыктат і адміністраванне, дасць селяніну магчымасць свабоднага выбару спосабаў гаспадарання.

Істотныя змены на шляху да рынку адбываюцца ў **цэнаўтварэнні.** Неад'емным элементам рыначнай эканомікі з'яўляюцца свабодныя рыначныя цэны, якія вызначаюцца попытам і прапанаваннем. Каб зрабіць пераход да такіх цэн менш хваравітым, мяркуецца ажыццявіць яго не адразу, а паэтапна, з увядзеннем, поруч з фіксаванымі, дагаварных і свабодных цэн. Гэта адносіцца перш за ўсё да цэн на спажывецкія тавары і паслугі.

Састаўной часткай мер пераходу да рынку з'яўляецца **рэформа банкаўскай сістэмы,** накіраваная на стварэнне, разам з дзяржаўнымі, самастойных камерцыйных банкаў, а таксама станаўленне ў СССР **эканомікі адкрытага тыпу,** якая развівалася б ва ўзаемасувязі і спаборнасці з эканомікай іншых краін.

Рыначныя адносіны дазволяць спалучаць эфектыўную сістэму **эканамічнага стымулявання** да рацыянальнага гаспадарання і выпуску прадукцыі вышэйшай якасці з **максімальнай свабодай** удзельнікаў у выбары форм і метадаў эканамічнай дзейнасці. Ніхто не стане вырашаць за таваравытворцу, што і як вырабляць, ніхто не будзе навязваць яму спосабы дзеяння. Чалавеку і калектыву больш відаць яго ўласная выгада, а памылкі вядуць да ўласных страт. Гэта прывучае да ашчаднасці і эканамічнай адказнасці.

Пераход да рынку выклікаў у многіх людзей сумненні: ці не прынясе рынак анархічнасць і стыхійнасць, пра якія нямала гаварылі і пісалі? Аднак, як мы бачылі, сучасная сусветная рыначная гаспадарка ў многім пераадолела ўласцівую для мінулага стыхійнасць. У сучасных умовах характэрнымі сталі вытворчасць на заказ, навуковае прагназіраванне патрэб, фарміраванне попыту, распрацоўка буйных навукова-тэхнічных праграм.

Сучасны рынак — не стыхія і не хаос. Ва ўсім свеце рынак з'яўляецца рэгулюемым. Пераважны варыянт

арганізацыі эканамічнага жыцця — не камандная сістэма, не свабодны рынак, а **змешаная эканоміка**. Дзяржава ўздзейнічае на рынак праз **бюджэт, падатковую** сістэму, праз грашовую і крэдытную палітыку, праз валютнае і таможнае заканадаўства, ствараючы неабходныя ўмовы для канкурэнцыі, прадпрымальніцтва і г. д.

Працэс пераходу да рынку пацягне за сабою і негатыўныя вынікі. Галоўныя з іх: магчымы рост цэн і беспрацоўе. Таму сярод запланаваных эканамічных пераўтварэнняў ёсць і меры па частковай **кампенсацыі** (г. зн. аплаце) насельніцтву страт, звязаных з пераглядам рознічных цэн на тавары і паслугі. Намячаецца таксама ўвядзенне сістэмы **індэксацыі** фіксаваных грашовых даходаў насельніцтва ў залежнасці ад росту спажывецкіх цэн (г. зн. у той ступені, у якой растуць цэны, павінны расці зарплаты, пенсіі, стыпендыі). У ліку гэтых мер і павышэнне мінімальнай заработнай платы.

Прадугледжваецца таксама і стварэнне механізму **падтрымання занятасці;** тыя, каму давядзецца памяняць рабочае месца, будуць мець магчымасць атрымаць дапамогу ў працаўладкаванні, перакваліфікацыі і г. д. Каму гэта адразу не ўдасца, атрымае дапамогу, якая дазволіць яму пратрымацца пэўны час.

Такім чынам, неабходна планамернае дзяржаўнае ўздзеянне на рынак з выкарыстаннем эканамічных рычагоў, стварэннем сістэмы сацыяльнай абароны, якая «гасіць» негатыўныя вынікі рыначных адносін. Аднак не дзяржаўнае ўздзеянне, а **рынак стане галоўным рэгулятарам эканамічнага жыцця.**

Праблема стабілізацыі эканомікі

Стратэгія пераходу да рынку была адобрана Вярхоўным Саветам СССР у кастрычніку 1990 г. Між тым рашэнні аб эканамічнай рэформе былі прыняты ў 1987 г. Яе задача: знайсці шляхі вяртання чалавека ў эканоміку як гаспадара, галоўнай дзеючай асобы. Трохгадовы пошук падвёў да цэнтральнага пункта эканамічнай рэформы — пераходу да рынку.

Аднак за мінулыя гады становішча ў эканоміцы пагоршылася. Рух да рынку даводзіцца пачынаць у неспрыяльных умовах.

Калі ў папярэднія гады адбылася стагнацыя, то на рубяжы 90-х гг. пачалося **скарачэнне маштабаў вытворчасці.** Ураджай 1990 г. быў у значнай частцы

страчаны, што прымусіла павялічыць закупкі некаторых відаў харчавання за рубяжом.

Адбыўся **развал спажывецкага рынку:** амаль усе прадукты харчавання і іншыя тавары масавага ўжытку сталі дэфіцытнымі. Сведчанне гэтаму — пустыя прылаўкі магазінаў, чэргі, талонна-размеркавальная сістэма. Паколькі знікла магчымасць свабодна закупляць патрэбныя тавары, прадпрыемствы, рэгіёны, рэспублікі пачалі практыкаваць натуральны абмен: зерне на машыны, газетную паперу на агародніну, паліва на адзенне. Гаспадарчыя сувязі, якія існавалі раней, аказаліся парушанымі.

Рост грашовых даходаў насельніцтва, з аднаго боку, і адсутнасць на рынку неабходных тавараў, з другога, павялі да росту цэн і змяншэння пакупной здольнасці рубля, г. зн. да далейшага **абясцэньвання грошай** (інфляцыя). Катастрафічнае становішча ў галіне фінансаў выявілася ў вялікім бюджэтным дэфіцыце: расходы дзяржавы намнога перавысілі яе даходы. Для пакрыцця такіх расходаў дзяржава вымушана выпускаць папяровыя грошы, якія не забяспечаны таварамі.

Цяжкасці ў народнай гаспадарцы стварылі спрыяльную глебу для развіцця **«ценявой эканомікі».** У яе ўваходзяць няўлічаныя дзяржавай віды эканамічнай дзейнасці, якія ажыццяўляюцца ў парушэнне норм права. Гэта і непрацоўныя даходы за кошт прыпісак, і розныя віды індывідуальнай і групавой працоўнай дзейнасці, якія ўтойваюцца ад рэгістрацыі і абкладання падаткамі, і падпольныя прадпрыемствы, і «чорны рынак», г. зн. спекуляцыя. Цэны «чорнага рынку» ў некалькі разоў перавышаюць дзяржаўныя.

У некаторых людзей, якія дрэнна разбіраюцца ў эканоміцы, уяўленне аб рыначных адносінах фарміравалася на аснове іх уражанняў аб «чорным рынку», «таўкучцы», дзе кожны гандлюе, чым можа, аб жуліках, якія імкнуцца прадаць непрыгодны тавар. Між тым усе названыя з'явы — гэта **антырынак,** які нічога агульнага не мае з цывілізаванымі рыначнымі адносінамі. Наадварот, адзіны шлях пераадолення гэтых пачварных з'яў — пераход да нармальнага рынку. Дзякуючы «ценявой эканомікі» нажываюцца сёння за кошт працоўных ва ўмовах развалу спажывецкага рынку.

Пытанне «Што нясе людзям рынак» зразумелае — мы ніколі не жылі ў нармальным рыначным асяроддзі. Тое, што ў нас называлася рынкам, абазначала рынач-

ныя адносіны, перавернутыя з ног на галаву. Не таварвытворцы канкурыравалі паміж сабой, змагаючыся за пакупніка, а пакупнікі, што стаяць у чэргах, мыкаюцца па магазінах у пошуках тавару, канкурыравалі адзін з другім: каму дастанецца тое, што недзе «даюць». Толькі пераход да нармальнай рыначнай эканомікі будзе садзейнічаць узнікненню здаровай канкурэнцыі, напаўненню прылаўкаў, паскарэнню тэхнічнага прагрэсу, паяўленню новых высакаякасных тавараў.

Крызісная сітуацыя, у якой пачынаецца гэты пераход, запатрабавала правядзення мер па стабілізацыі эканомікі. Якія гэта меры?

Перш за ўсё,— гэта аздараўленне фінансаў і грашовага абарачэння. Задача заключаецца ў тым, каб прывесці грашовую масу, якая знаходзіцца ў абарачэнні, у адпаведнасць с таварнымі рэсурсамі, умацаваць рубель.

Неабходна нармалізаваць спажывецкі рынак, г. зн. знайсці прымяненне лішняй суме грошай, якая накапілася ў насельніцтва, павялічыць паступленне на рынак тавараў і паслуг.

У перспектыве павінна быць забяспечана канверсаванасць рубля (ад лацінскага слова, якое абазначае: змяняць, ператвараць), г. зн. магчымасць яго выкарыстання для міжнародных разлікаў.

Трэба забяспечыць у пераходны перыяд устойлівасць гаспадарчых сувязей, паколькі іх парушэнне вядзе да дэзарганізацыі вытворчасці. Трэба таксама ўмацаваць знешнеэканамічнае становішча, нармалізаваць экспарт і імпарт, прыцягнуць замежны капітал.

Стабілізацыя народнай гаспадаркі і пераход да рыначнай эканомікі — узаемазвязаныя: аздараўленне эканомікі аблягчае рух да рынку, а крокі да рыначных адносін ствараюць перадумовы для ўключэння механізмаў самарэгулявання, стымулявання працоўнай актыўнасці.

Пытанні і заданні

1. Чаму стала неабходнай радыкальная эканамічная рэформа ў СССР?

2. Чым тлумачыцца прыняцце курса на рыначную эканоміку?

3. Якія галоўныя ўмовы пераходу да рынку?

4. У чым праяўляецца абвастрэнне крызісу эканомікі і якія асноўныя меры па яе стабілізацыі?

5. Ацаніце наступныя сітуацыі:

а) У галіне толькі адзін завод выпускае інструменты для ўсіх астатніх заводаў.

б) Камбінаты, якія выпускаюць газетную паперу і знаходзяцца ў руках аднаго міністэрства, дыктуюць новую цану ўсім газетна-часопісным выдавецтвам на сваю прадукцыю.

в) У мікрараёне адкрываецца толькі адна булачная, адна майстэрня і г. д.

Якія вынікі параджаюцца паказанымі сітуацыямі?

6. Якую сітуацыю вы лічыце нармальнай: калі вадзіцель таксі шукае пасажыра, ці калі пасажыр шукае таксі? Растлумачце свой пункт погляду.

7. Саўгасу даецца дзяржаўнымі органамі план, у якім указана, колькі надаіць малака, якое павінна быць пагалоўе кароў, якія нормы запасу кармоў, якія плошчы адвесці пад пасевы тых ці іншых кармавых культур, колькі сродкаў выдаткаваць на закупку будматэрыялаў для новага жывёльнага двара і г. д.

Які варыянт арганізацыі гаспадарчага жыцця ў гэтым праяўляецца? Як мог бы выглядаць альтэрнатыўны варыянт?

8. У літаратуры апісаны вопыт работы завода будаўнічых матэрыялаў у г. Сергіеў Пасад пад Масквой. Завод многія гады быў стратным. У 1988 г. яго здалі ў арэнду калектыву, які там працаваў. Гэты калектыў стварыў кааператыў і атрымаў рэальныя правы распараджацца вытворчасцю. Калектыў звольніў кожнага трэцяга рабочага і кожнага другога работніка апарату кіравання заводам. Пачалі абнаўляць тэхніку вытворчасці. Пусцілі ў справу тое, што раней не выкарыстоўвалася. У выніку — хутка выканалі ўсе заказы. Атрымалі вялікі даход. Кожны рабочы атрымаў за год прыкладна 6 тыс. рублёў.

Што змянілася на заводзе? Якая змена — галоўная? Якія вывады можна зрабіць з гэтага вопыту?

9. У 1981—1985 гг. у сельскую гаспадарку СССР было накіравана 227 млрд руб. капітальных укладанняў. Прырост валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў параўнанні з папярэдняй пяцігодкай склаў 10 млрд руб.

Якія вывады можна зрабіць з гэтага факта?

10. У працэсе пошуку шляхоў выхаду з крызісу абазначыліся дзве пазіцыі:

ці ўзнавіць старую мадэль жорсткага адміністрацыйна-размеркавальнага гаспадарання, якая заснавана на ўсеагульным адзяржаўленні эканамічнага жыцця;

ці неадкладна дэцэнтралізаваць усе сродкі вытворчасці і поўнасцю адказацца ад дзяржаўнага рэгулявання эканомікі.

Вызначце свае адносіны да гэтых пазіцый. Якая ваша ўласная пазіцыя? Аргументуйце яе.

11. На старонках друку выказаны два пункты погляду на рынак.

Першы: «Рыначнае грамадства стаіць на ідэі «ўсеагульнай карыснасці», прымушае рабіць выбар «на карысць Карысці». Тым самым беспрынцыповы разлік пакідае Дабру мізэрную долю чыстагану. На долю марнага, нявыгаднага, бескарыслівага выпадае толькі раўнадушша, у лепшым выпадку — зневажальная літасць. Адным словам, «прынцып карысці» губіць сумленне, душу чалавека, высушвае яго маральныя пачуцці».

Другі: «Магістральная тэндэнцыя чалавечай гісторыі дэманструе не проста ўшчэрбнасць, але архаічнасць самога выбару паміж Дабром і Карысцю. Абвінавачанні рынку былі б часткова справядлівыя для перыяду першапачатковага назапашвання капіталу і ран-

неіндустрыяльнай цывілізацыі. Жыццё паказвае, што «бескарыслівасць», якая ўкараняецца казарменным сацыялізмам, глушыць ініцыятыву, губіць душу чалавечую, нараджаючы мноства форм паказной і фальсіфікаванай, ды і проста вымушанай бескарыслівасці».

Як вы разумееце разыходжанне паміж двума пунктамі погляду? Які з пунктаў погляду вам здаецца больш правільным? Растлумачце чаму.

12. «Рэшткі» грошай «на руках» у насельніцтва з 104,7 млрд рублей на пачатак 1990 г. узраслі да 132,7 млрд руб. на пачатак 1991 г.

Як расцаніць гэты факт? Якія вынікі гэтых змен?

13. Прааналізуйце наступныя даныя:

а) У прамысловасці ў 1990 г. 2,4 тыс. арэндных прадпрыемстваў выпусцілі 5,2 % агульнага аб'ёму прадукцыі.

б) У 1990 г. колькасць дзеючых кааператываў выросла ў 1,4 раза і склала 260 тыс., дзе было занята, уключаючы сумяшчальніцтва, 6,2 млн чалавек.

в) У 1985 г. не было сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, а на 1.01.91 г. іх налічвалася 40,6 тыс. Ім было прадастаўлена 700 тыс. гектараў зямлі.

г) У 1990 г. індывідуальнай працоўнай дзейнасцю займалася 200 тыс. чалавек.

Аб чым сведчаць прыведзеныя лічбы? Як вы адносіцеся да змен, што адбываюцца?

14. 15 студзеня 1991 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Асновы заканадаўства Саюза ССР і рэспублік аб занятасці насельніцтва. У артыкуле 25 гаворыцца: «Дзяржава гарантуе грамадзянам, якія страцілі работу, упершыню шукаюць яе, а таксама якія жадаюць узнавіць працоўную дзейнасць пасля працяглага перарыву:

а) прадастаўленне асобых гарантый работнікам, якія вызваляюцца з прадпрыемстваў, з устаноў, арганізацый;

б) выплату стыпендый у перыяд прафесійнай падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі ці перападрыхтоўкі і ўключэння гэтага перыяду ў агульны і няспынны працоўны стаж;

в) выплату дапамогі па беспрацоўю;

г) аказанне матэрыяльнай дапамогі беспрацоўнаму грамадзяніну і членам яго сям'і з улікам наяўнасці састарэлых і непаўналетніх утрыманцаў».

Якія гарантыі ўстанаўлівае гэты артыкул закону? На каго ён распаўсюджваецца? Якое месца гэтыя меры займаюць у пераходзе да рынку?

Раздзел V. ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ І САЦЫЯЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ

§ 23. САЦЫЯЛЬНАЯ СТРУКТУРА ГРАМАДСТВА

Адносіны паміж людзьмі складаныя і шматгранныя. Сярод разнастайнасці гэтых адносін вылучым тыя, якія складваюцца паміж адносна ўстойлівымі сацыяльнымі супольнасцямі, групамі.

Сацыяльная структура грамадства. Яе састаўныя часткі

Любы чалавек належыць да тых ці іншых сацыяльных супольнасцей, кожная з якіх займае пэўнае месца ў сацыяльнай структуры грамадства. **Сацыяльная структура** — сукупнасць узаемазвязаных і ўзаемадзейных сацыяльных супольнасцей і адносін паміж імі.

Пад сацыяльнай агульнасцю разумеецца рэальна існуючая супольнасць людзей, што характарызуецца якімі-небудзь адзінымі, звязанымі з жыццём грамадства, прыметамі. Яна можа ўтрымліваць у сабе некалькі людзей і дзесяткі мільёнаў, можа быць кароткачасовай (напрыклад, пасажыры ў аўтобусе, гледачы ў тэатры) або ўстойлівай на працягу стагоддзяў (напрыклад, нацыі, класы).

У гэтым раздзеле гутарка пойдзе аб вялікіх устойлівых сацыяльных супольнасцях: сацыяльна-класавых (класы, сацыяльныя групы і слаі), сацыяльна-дэмаграфічных (моладзь, жанчыны, старыя), сацыяльна-этнічных (нацыі, народнасці).

Але ў працэсе эвалюцыі чалавецтва ў сацыяльнай структуры грамадства адбываецца накапленне змяненняў, якія ў выніку прыводзяць да якасных структурных зрухаў, паяўленню новых сацыяльных супольнасцей, змяненню або замене старых.

Па ходу развіцця грамадства яго сацыяльная структура становіцца больш разнастайнай і складанай. Гэта ўзрастаючае ўскладненне выклікана аб'ектыўнымі прычынамі і забяспечвае грамадству ўстойлівасць і магчымасць далейшага развіцця.

Для вызначэння змяненняў у сацыяльнай структуры грамадства вучоныя выпрацавалі мноства арыенціраў і падыходаў. Найбольшую вядомасць атрымалі тэорыя класаў і тэорыя стратыфікацыі.

К. Маркс і У. І. Ленін у якасці асноўных элементаў сацыяльнай структуры грамадства разглядаюць такія буйныя супольнасці, як класы. Класы азначаюць перш за ўсё адносіны людзей да ўласнасці на сродкі вытворчасці.

Па азначэнню У. І. Леніна, дадзенаму ім у рабоце «Вялікі пачын», класы — гэта вялікія групы людзей, якія адрозніваюцца:

па іх месцы ў гістарычна пэўнай сістэме грамадскай вытворчасці;

па іх адносінах да сродкаў вытворчасці;

па іх ролі ў грамадскай арганізацыі працы;

а таксама па спосабах атрымання і памерах той долі грамадскага багацця, якую яны маюць.

З гэтага азначэння вынікае, што адрозненні паміж людзьмі ў адносінах да ўласнасці на сродкі вытворчасці прыводзяць да таго, што адна частка грамадства можа прысвойваць сабе працу другой.

З дапамогай арыенціраў, дадзеных Леніным, можна вылучыць наступныя класы ў сучасным нам грамадстве:

Рабочы клас — наёмныя работнікі, якія не маюць сродкаў вытворчасці, жывуць перш за ўсё за кошт продажу сваёй рабочай сілы. Рабочы клас з'яўляецца асноўнай прадукцыйнай сілай індустрыяльнага грамадства.

Развіццё буйной грамадскай вытворчасці вядзе да хуткага росту колькасці рабочага класа і ўскладнення яго саставу. Так, за апошнія 30 гадоў доля асоб наёмнай працы ў эканамічна актыўным насельніцтве эканамічна развітых краін Захаду ўзрасла з 70—80 да 85—90 %. Высокія тэмпы росту колькасці рабочага класа назіраліся і ў краінах Усходняй Еўропы, СССР, Кітая, Паўднёва-Усходняй Азіі (з 1950 па 1980 г. яна павялічылася ў 3 разы).

Ва ўсіх індустрыяльна развітых дзяржавах адбываецца змяненне саставу рабочага класа. У катэгорыю працуючых па найму, акрамя прамысловых і сельскагаспадарчых рабочых, у сучасны момант уключаюцца канторскія і гандлёвыя служачыя, працаўнікі сферы паслуг і інш. (Прычым доля прамысловага рабочага класа памяншаецца ў адносінах да яго колькасці.)

Сялянства, як асобы грамадскі клас, фарміравалася ў ходзе разлажэння першабытна-абшчыннага ладу і ў эпоху феадалізму стала асноўным прадукцыйным класам, залежным ад феадалаў-землеўладальнікаў.

Капіталізм прыводзіць да развіцця дваістай прыроды дадзенага класа. Тыя сяляне, якія перайшлі ў састаў пралетарыяту або буржуазіі, цяпер часцей за ўсё сумяшчаюць функцыі гаспадара і работніка ў адной асобе.

Колькасць сялянства, якое складала ў дакапіталістычны перыяд большасць насельніцтва Зямлі, працягвае актыўна скарачацца (удзельная вага занятых у гэтай галіне складае цяпер для ЗША 3,5 % рабочай сілы; для Вялікабрытаніі — 2,7 %, для Японіі — 9,7 %; у СССР і краінах Усходняй Еўропы ўдзельная вага ся-

лянства больш значная, але працэс яе скарачэння актыўна працягваецца).

Узнікненне і развіццё капіталістычных адносін было звязана з паяўленнем класа **буржуазіі.** У першым раздзеле кнігі ўжо растлумачвалася, што марксізм звязвае багацце і ўплыў гэтага класа з валоданнем асноўнымі сродкамі вытворчасці і на базе гэтага прысваеннем неаплачанай працы рабочых. Буржуазія (капіталісты) арганізуе вытворчасць, вызначае яе мэты, распараджаецца атрыманай прыбавачнай вартасцю і г. д. Гэты клас складаецца з мноства сацыяльных слаёў — ад дробнай буржуазіі да буйной манапалістычнай буржуазіі. Апошняя іграе асаблівую ролю, робіць уплыў на знешнюю і ўнутраную палітыку капіталістычных краін.

Асаблівае становішча ў адносінах да класаў займае такая буйная сацыяльная група, як інтэлігенцыя.

Інтэлігенцыя (ад лацінскага слова, што азначае: які разумее, ведае) — сацыяльны слой людзей, прафесіянальна занятых разумовай (пераважна высокакваліфікаванай) працай. Аддзяленне разумовай працы ад фізічнай паклала пачатак развіццю інтэлігенцыі. У далейшым яна фарміравалася ў сувязі з ростам патрэбнасці ў высокакваліфікаваных спецыялістах, якая ўзрастала з развіццём вытворчасці і духоўнага жыцця грамадства.

Згодна з марксісцкім вучэннем аб класах інтэлігенцыя не з'яўляецца грамадскім класам, таму што яна не займае самастойнага становішча ў адносінах да ўласнасці і паходзіць з розных класаў і слаёў. У сучасны момант у сувязі з ростам НТР колькасць і роля інтэлігенцыі ў жыцці грамадства актыўна ўзрастае. Большасць інтэлігенцыі адносіцца да прамежкавых слаёў працуючых па найму спецыялістаў (служачыя, менеджэры, спецыялісты, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі па заказу і інш.).

Гаворачы аб буржуазіі і інтэлігенцыі, мы скарысталі такое паняцце, як «сацыяльны слой». **Сацыяльны слой** уяўляе сабой прамежкавую ці пераходную сацыяльную супольнасць, якая не валодае ўсімі прыметамі класа, але разглядаецца як важны элемент сацыяльнай структуры грамадства. Сацыяльныя слаі могуць быць унутрыкласавымі (напрыклад, буржуазія буйная, сярэдняя, дробная, гарадская і сельская, манапалістычная і неманапалістычная) і міжкласавымі (напрыклад, інтэлігенцыя).

У сучасны момант марксісцка-ленінская тэорыя кла-

саў падвяргаецца крытыцы за тое, што недастаткова паказвае змяненні, якія адбываюцца ў сацыяльнай структуры грамадства ў розных краінах.

Сучасная савецкая сацыялогія разглядвае класавую структуру грамадства як асноўную. Але для больш дакладнай характарыстыкі грамадства яна выпрацавала сацыяльна-слаявую структуру. Апошняя складаецца з 8—9 слаёў, утвораных па сукупнасці прымет (характар працы, кваліфікацыя, адукацыя, зарплата, роля ў кіраванні вытворчасцю) і дае больш дэталёвы малюнак сацыяльнай структуры.

Такі падыход да аналізу структуры грамадства ў некаторай ступені прыбліжаецца да тэорыі сацыяльнай стратыфікацыі, папулярнай у заходняй сацыялогіі. Асноўным элементам сацыяльнай структуры грамадства згодна з гэтай тэорыяй з'яўляецца страт (ад лацінскага слова, якое азначае — слой).

Калі ў марксісцка-ленінскай тэорыі асноўнай прыметай класавага падзелу грамадства з'яўляюцца адносіны да ўласнасці, то ў тэорыі стратыфікацыі падзел грамадства на страты адбываецца па іншых крытэрыях (напрыклад, прафесія, даход, адукацыя і інш.). Такі падыход да вывучэння сацыяльнай структуры дазваляе больш дакладна адлюстраваць змяненні, якія ў ёй адбываюцца.

Пры вывучэнні дынамікі сацыяльных змяненняў прыхільнікі тэорыі стратыфікацыі часта выкарыстоўваюць формулу вертыкальнай і гарызантальнай стратыфікацыі. Згодна з гэтай формулай чалавек у сваім жыцці можа пераходзіць (паднімацца або апускацца) з аднаго сацыяльнага ўзроўню ў другі. Або, застаючыся на тым жа ўзроўні, перамяшчацца з адной сацыяльнай групы ў другую.

Разгледзім магчымае перамяшчэнне чалавека ў вертыкальнай стратыфікацыі, якая мае сем узроўняў: 1) вышэйшы слой прафесіяналаў, адміністратараў; 2) тэхнічныя спецыялісты сярэдняга ўзросту; 3) камерцыйны клас; 4) дробная буржуазія; 5) тэхнікі і рабочыя, якія ажыццяўляюць кіраўніцкія функцыі; 6) кваліфікаваныя рабочыя; 7) некваліфікаваныя рабочыя.

Напрыклад, чалавек з сям'і кваліфікаванага рабочага, атрымаўшы дастатковыя сродкі ад бацькі, купіў кафэ, г. зн. падняўся па вертыкальнай стратыфікацыі ў слой дробнай буржуазіі. У далейшым ён за кошт прыбытку і сродкаў, якія былі выручаны ад продажу кафэ,

набыў сярэднюю фермерскую гаспадарку, што азначала яго пераход з сацыяльнай групы гарадской дробнай буржуазіі ў сельскую. Але той жа чалавек мог і не атрымаць магчымасці для сацыяльных перамяшчэнняў і застацца ў той сацыяльнай групе, да якой належаў яго бацька.

У сучасны момант у сувязі з эканамічным і сацыяльным развіццём грамадства сацыяльныя перамяшчэнні становяцца ўсё больш значнымі.

Наяўнасць маргінальных мас з'яўляецца характэрнай рысай сучаснага грамадства. Паняцце **маргіналізацыі** служыць для акрэслівання пагранічнасці або прамежкавасці ў адносінах да якіх-небудзь сацыяльных структур — класавых, нацыянальных, культурных. Галоўным у маргінальнасці з'яўляецца тое, што асоба губляе прыналежнасць да якой-небудзь пэўнай супольнасці. Звычайна гэта адбываецца ў выніку ўзаемадзеяння розных сацыяльных груп.

Напрыклад, ва ўсім свеце існуюць даволі буйныя сацыяльныя групы асоб без пэўнага месца жыхарства, якія перабіваюцца выпадковымі заробкамі. Многія з іх не былі ад нараджэння брадзягамі, а сталі імі ў сілу розных прычын: разарэння; аб'ектыўная немагчымасць атрымання адукацыі, кваліфікацыі для ўладкавання на цікавую і добра аплачваемую работу; непрыманне грамадскіх каштоўнасцей і ўлады і г. д.

Прычым памеры такіх маргінальных груп розныя ў краінах свету, што звязана перш за ўсё з уздымам сацыяльнай абароненасці іх грамадзян (магчымасцю атрымання здавальняючых умоў жыцця і працы).

Маргінальнымі прынята таксама лічыць групы людзей, якіх можна аднесці адразу да некалькіх сацыяльных слаёў. Калі, напрыклад, фермер з году ў год вымушаны шукаць сезонную (у зімовы час) работу на гарадскіх фабрыках або заводах і інш.

Прычыны сацыяльна-структурных змяненняў

Гіганцкім паскаральнікам сацыяльных змяненняў з'яўляецца навукова-тэхнічная рэвалюцыя, што выклікае глыбокія змяненні ў прадукцыйных сілах грамадства і ў характары вытворчых адносін, якія ўключаюць адносіны да ўласнасці на сродкі вытворчасці. Змяненні ў гэтай галіне непасрэдна вядуць да сацыяльных зрухаў.

Так, у мінулым стагоддзі і дробная і буйная буржуазія ўяўлялі сабой клас, які амаль выключна скла-

даўся з індывідуальных уласнікаў. У сучасны момант, як мы бачым, у развіцці краін Захаду побач з індывідуальнай прыватнай уласнасцю развіваюцца і іншыя формы: карпарацыйная, кааператыўная, на ўмовах партнёрства, дзяржаўная і г. д.

Кіраванне карпарацыямі звычайна перадаецца наёмным менеджэрам, якія прымаюць рашэнні па пытаннях капіталаўкладанняў, а таксама фінансавай, тэхнічнай, кадравай палітыкі. Вышэйшыя менеджэры амерыканскіх буйных карпарацый 40 % (свайго) сумарнага прыбытку атрымліваюць ад прыбытку са свайго акцыянернага капіталу. Выходзіць, што вышэйшыя менеджэры — гэта адначасова і высокакваліфікаваныя спецыялісты, і буржуа.

Такое становішча, калі трымальнікамі акцый з'яўляюцца прадстаўнікі самых розных слаёў насельніцтва, у тым ліку і рабочыя, стала тыповым для індустрыяльна развітых краін. У выніку межы паміж класамі сціраюцца, што дазваляе частцы заходніх сацыёлагаў заяўляць аб знікненні класаў. Але паколькі большасць эканамічна актыўнага насельніцтва жыве галоўным чынам за кошт узнагароды за працу (зарплаты), або, наадварот, вызваляецца ад удзелу ў вытворчым працэсе і занята толькі камерцыйна-прадпрымальніцкімі функцыямі, то казаць аб знікненні рабочага класа і буржуазіі рана.

Сацыяльныя перамяшчэнні. Роля дзяржавы ва ўрэгуляванні сацыяльных працэсаў

Змена чалавекам або групай людзей месца, якое яны займалі ў сацыяльнай структуры, называецца **сацыяльным перамяшчэннем** (інакш **мабільнасцю**). Напрыклад, селянін становіцца рабочым, прадстаўнікі дробнай буржуазіі пераходзяць у стан сярэдняй або дробнай і г. д. Змяненні ў сацыяльнай структуры пацвярджаюцца сацыялагічнымі даследаваннямі. Так, сярод інтэлігенцыі развітых краін свету малы працэнт патомнай інтэлігенцыі, значыць, асноўную масу сучасных працаўнікоў разумовай працы складаюць выхадцы з іншых сацыяльных супольнасцей.

Буйныя сацыяльныя перамяшчэнні абумоўлены патрэбнасцямі развіцця грамадства. Так, пераход масы сялян да наёмнай працы быў гістарычна заканамерны і выкліканы пераходам да індустрыяльнай стадыі развіцця. Аб'ектыўныя заканамернасці змянення сацыяльнай структуры азначаюць, што прыналежнасць чалаве-

ка да таго або іншага сацыяльнага слоя не вызначана назаўсёды. Калі, напрыклад, вашы бацькі — сяляне, то вы можаце выбраць рабочую прафесію і стаць гараджанінам або, скончыўшы інстытут, займацца разумовай працай, а можаце застацца ў вёсцы, працаваць на роднай зямлі.

У краінах сучаснага свету да актыўнага рэгулявання сацыяльных працэсаў падключаецца дзяржава. Яна не ў сілах ліквідаваць аб'ектыўныя тэндэнцыі змянення сацыяльнай структуры (напрыклад, перамяшчэння сялянства ў іншыя класы, слаі насельніцтва). Але дзяржава, выкарыстоўваючы законы, падатковую палітыку, іншыя сродкі перараэмеркавання нацыянальнага даходу, можа запаволіць ці паскорыць гэтыя працэсы, палегчыць становішча адных груп насельніцтва і ўскладніць яго для другіх. Так, наша дзяржава ў сучасны момант дапамагае станаўленню самастойных сялянскіх гаспадарак. У развітых еўрапейскіх краінах, у ЗША дзяржава таксама падтрымлівае дзейнасць фермерства і малых прадпрыемстваў.

Дзяржаўнае рэгуляванне сацыяльных адносін будуецца з улікам мэт эканамічнага і палітычнага развіцця. У той жа час не могуць не ўлічвацца і пануючыя ў грамадстве ўяўленні аб сацыяльнай справядлівасці. Гэтыя ўяўленні змяняліся ў ходзе гістарычнага развіцця. Сучаснае грамадства з паняццем «сацыяльная справядлівасць» звязвае, у першую чаргу, магчымасць атрымання роўнай аплаты за роўную працу і спецыяльную падтрымку тых слаёў насельніцтва, якія яшчэ або ўжо не могуць працаваць у поўную сілу (вучнёўская моладзь, старыя).

Узросшы ў апошнія гады ў радзе развітых краін узровень сацыяльнай абароненасці «слабых» слаёў насельніцтва адносяць да агульнацывілізаваных дасягненняў.

Сацыяльная справядлівасць знаходзіць сваё адлюстраванне ў грамадскай думцы (стан масавай свядомасці). І тое, што робіць дзяржава ў забеспячэнні сацыяльнай справядлівасці ў жыцці грамадства, праходзіць сур'ёзны кантроль з боку яго грамадзян.

Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі змяненняў у сацыяльнай структуры індустрыяльна развітых краін.
2. Раскрыйце асноўныя прычыны змяненняў у сацыяльнай структуры гэтых краін.

3. Па якіх крытэрыях можна вызначыць, да якой іменна сацыяльнай супольнасці адносіцца той ці іншы чалавек?

4. Асновай фінансавання сістэмы сацыяльнага забеспячэння (у тым ліку і выплат дапамогі па беспрацоўю) з'яўляюцца адлічэнні працоўных і іх работадаўцаў. Падумайце, выгадна ці не выгадна грамадству ўтрыманне значнай часткі працаздольнага насельніцтва, пазбаўленага магчымасці зарабляць сабе на жыццё.

5. У нашы дні сацыяльная структура грамадства ўсё больш становіцца неаднароднай. У той жа час свет усё больш набывае цэласнасць, а інтарэсы ўсяго чалавецтва маюць прыярытэт (першынство) у адносінах да інтарэсаў класавых. Ці не супярэчыць адна адной гэтыя тэндэнцыі? Свой пункт погляду растлумачце.

6. Ахарактарызуйце змяненні сацыяльнай структуры ЗША, якія адбыліся ў перыяд з 1950 г., на аснове даных, прыведзеных у табліцы:

Змяненне ў сацыяльнай структуры ЗША (класы і класападобныя групы) у працэнтах да эканамічна актыўнага насельніцтва краіны

	1950 г.	1970 г.	1980 г.	1984 г.	1995 г. (прагноз)
Эканамічна актыўнае (працуючае) насельніцтва	100	100	100	100	100
Буржуазія	2	3	3	3	3
Рабочы клас	75	79	76	75	74
Дробная буржуазія	20	10	9	9	8
Інтэлігенцыя	3	8	12	13	15

(Надель С. Н. Современный капитализм и классы // Рабочий класс и современный мир. 1989. № 4. С. 11.)

7. У Вялікабрытаніі 5 % насельніцтва, па даных за 1966 г., мелі ў сваім распараджэнні 56 % усяго асабістага багацця краіны. У 1985 г. адпаведныя лічбы паказвалі 5 % і 40 %. У той жа час у 1966 г. 50 % брытанцаў забяспечваліся толькі 3 % асабістага багацця краіны, к 1985 г.— адпаведна 50 % — 7 %.

Правядзіце аналіз лікавых даных і вызначце тэндэнцыі ў размеркаванні асабістага багацця Вялікабрытаніі сярод насельніцтва краіны. Апішыце, якія змяненні ў сацыяльнай структуры брытанскага грамадства звязаны з гэтым пераразмеркаваннем асабістага багацця.

§ 24. НАЦЫІ І МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ

Акрамя класаў і іншых сацыяльных груп, сацыяльную структуру грамадства складаюць этнічныя супольнасці: плямёны, народнасці, нацыі.

Сучаснае чалавецтва налічвае прыкладна дзве тысячы розных народаў (а ў нашай краіне іх больш чым 100). У той жа час незалежных дзяржаў у свеце больш за 160. Значыць, большасць народаў свету пра-

жывае ў многанацыянальных дзяржавах. Гэты факт трэба ўсвядоміць як мага глыбей. Усе мы жывём і заўсёды будзем жыць разам з людзьмі розных нацыянальнасцей. Гэтыя абставіны патрабуюць ад кожнага з нас асобай асабістай цярпімасці і адказнасці ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Заўсёды трэба памятаць, што ў народаў больш агульных рысаў, чым адрозненняў, і гэта агульнасць сёння, калі цэласнасць і ўзаемазвязанасць свету сталі вельмі адчувальнымі для кожнага з нас, будзе ўзрастаць. Разам з тым збліжэнне народаў не азначае адмаўлення іх нацыянальных асаблівасцей. Наадварот, іменна своеасаблівасць культуры розных народаў служыць жывой крыніцай духоўнага багацця ўсяго чалавецтва, бясконцай разнастайнасці сусветнай культуры.

Этнас, этнічная супольнасць

Кожны з нас мае права аднесці сябе да якой-небудзь нацыянальнасці. Нацыянальнасць — гэта прыналежнасць чалавека да пэўнай этнічнай (ад грэчаскага слова «этнас» — народ) супольнасці.

У курсах гісторыі разглядваліся такія этнічныя супольнасці, як род, племя, народнасць, нацыя. Іх развіццё звязана з ростам прадукцыйных сіл, гаспадарчых сувязей, наяўнасцю пэўных сацыяльных і культурных перадумоў. Так, род і племя характэрныя для першабытнага грамадства, народнасць фарміруецца тады, калі паяўляюцца класы і дзяржавы. З развіццём капіталізму ўзмацняюцца эканамічныя і культурныя сувязі, складваецца адзіны нацыянальны рынак, ліквідуецца гаспадарчая раздробленасць дадзенай народнасці, і розныя яе часткі згуртоўваюцца ў адно нацыянальнае цэлае. Узнікае нацыя.

Нацыя — найбольш развітая этнічная супольнасць. Яна складваецца на працягу доўгага гістарычнага перыяду ў выніку злучэння (перамешвання) прадстаўнікоў розных (роднасных і народнасных адзін аднаму) плямён і народнасцей. Людзей адной нацыі, як правіла, аб'ядноўвае агульнасць эканамічных сувязей, тэрыторыі, мовы, культуры. Гэтыя рысы не біялагічныя прыметы. Яны ўзнікаюць і фарміруюцца ў ходзе грамадскага развіцця. Так, руская нацыя ўзнікла ў працэсе пераадолення феадальнай раздробленасці і складвання адзінага агульнарасійскага рынку. Гэты працэс працякаў у барацьбе з ворагамі за незалежнасць, зацвярджэнне расійскай дзяржаўнасці. Сучасная руская мова

склалася на аснове старажытных славянскіх моў. Але, разам з тым, увабрала ў сябе масу слоў з іншых моў (лацінскай, грэчаскай, татарскай, французскай, англійскай, нямецкай і г. д.).

Не трэба ўяўляць сабе працэс этнічнага развіцця як ідэальна прамы шлях руху ад адной формы супольнасці да другой. Свет этнасаў — жывы шматколерны малюнак. Ён знаходзіцца ў вечным руху: этнасы ўзнікаюць, расцвітаюць, знікаюць. І ў кожнага народа — свой шлях, свой лёс. З гісторыі вы ведаеце, што многія, калісьці вядомыя народы адышлі ў небыццё (фінікійцы, скіфы, полаўцы і г. д.). Некаторыя з сучасных народаў узніклі яшчэ ў старажытнасці (армяне, грузіны). Англійская нацыя склалася ў XVI ст., руская ў XVII—XVIII стст. Дзесяткі нацый сфарміраваліся і фарміруюцца ў XX ст. І сёння чалавецтва прадстаўлена ўсёй шматколернасцю этнасаў — родам і племенем, народнасцю і нацыяй, што звязана з разнастайнасцю эканамічных, сацыяльных, культурных умоў іх жыццездольнасці.

Разважаючы аб асаблівасцях (рысах, прыметах) нацыі важна не выпусціць з-пад увагі, што этнас заўсёды знаходзіцца ў развіцці. Не варта ўзводзіць у догму тыя ці іншыя рысы, лічачы іх раз і назаўсёды дадзенымі. Ёсць этнасы, рассеяныя па розных краінах, г. зн. яны не маюць адзінай агульнай тэрыторыі, эканомікі, аднак іх прадстаўнікі лічаць сябе адной нацыяй. Рускія, якія жывуць у іншых краінах, называюць сябе рускімі. Здараецца, што прадстаўнікі адной нацыі гавораць на розных мовах. Усё больш і больш на Зямлі людзей, якія нарадзіліся ад змешаных шлюбаў (г. зн. ад бацькоў розных нацыянальнасцей),— яны маюць права выбіраць сабе нацыянальнасць любога з бацькоў. У большасці краін свету нацыянальнасць вызначаецца не дзяржаўнымі органамі, а самім чалавекам — добраахвотна. Па сучасных цывілізаваных мерках выбар нацыянальнасці па ўласнаму меркаванню — ёсць неад'емнае права кожнай асобы, адно з умоў яе свабоды.

Нацыянальная самасвядомасць асобы, г. зн. тое, кім сябе чалавек прызнае, да якога этнасу прылічвае,— вось яшчэ адна прымета нацыі, аб якой цяпер гавораць.

Дзве тэндэнцыі ў развіцці этнасу

У працэсе развіцця этнасу праяўляецца дзеянне дзвюх тэндэнцый. Адна з іх — гэта этнічная дыферэнцыяцыя, г. зн. аддзяленне, адасабленне людзей пэўнай

этнічнай групы, яе імкненне да самаразвіцця, да нацыянальнай самастойнасці, росту ўласнай эканомікі, палітыкі, культуры. Гэту тэндэнцыю называюць яшчэ нацыянальнай.

Другая — інтэграцыя, аб'яднанне нацый (яе яшчэ называюць інтэрнацыянальнай). Гэта тэндэнцыя вядзе да расшырэння сувязей паміж рознымі этнасамі, ломкі перагародак, да ўспрымання ўсяго лепшага, што створана іншымі народамі, да паглыблення эканамічных адносін, развіцця сувязей у сферы культуры і г. д. Абедзве тэндэнцыі ўзаемазвязаны. У іх аснове ляжаць аб'ектыўныя эканамічныя і сацыяльна-культурныя патрэбнасці.

Дзеянне гэтых тэндэнцый у развіцці этнасу назіраецца на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Абедзве яны садзейнічаюць прагрэсу цывілізацыі, бо адна вядзе да ўнутранага ўдасканалення, росквіту самога этнасу, другая садзейнічае ўзаемаабагачэнню, абмену нацыянальнымі каштоўнасцямі, усебаковаму збліжэнню народаў, умацаванню ўзаемаразумення, даверу, дружбы і міру. У канчатковым выніку абедзве тэндэнцыі садзейнічаюць развіццю чалавечай асобы.

Развіццё нацый і міжнацыянальных адносін у сучасным свеце

Адным з вядучых фактараў развіцця чалавецтва ў нашы дні з'яўляецца навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Яна прадугледжвае як спецыялізацыю вытворчасці, так і яе шырокую кааперацыю (супрацоўніцтва), бо хутка растучым прадукцыйным сілам цесна ў рамках адной нацыі і нават буйной многанацыянальнай дзяржавы (транснацыянальныя карпарацыі маюць сёння філіялы амаль ва ўсіх краінах свету і працягваюць нарошчваць сваю магутнасць). Ідзе працэс эканамічнай інтэграцыі народаў свету. А разам з гэтым і працэс натуральнага збліжэння народаў, інтэрнацыяналізацыі ўсіх бакоў жыцця. Яркі прыклад — Еўрапейская супольнасць (ЕС), якая аб'ядноўвае цяпер дванаццаць краін Заходняй Еўропы. Прычым працэс іх інтэграцыі працягваецца. Інтарэсы народаў ЕС адлюстроўваюць цэлы рад сумесных органаў. Сярод іх, напрыклад, Еўрапейскі Савет, які накіроўвае ўсю палітыку ЕС. У яго ўваходзяць кіраўнікі дзяржаў, Еўрапейскі парламент — заканадаўчы орган, які выбіраецца ўсім дарослым насельніцтвам ЕС.

Буйнейшым дасягненнем ЕС з'яўляецца старанна распрацаванае еўрапейскае права, якое паставіла між-

нацыянальныя адносіны народаў Заходняй Еўропы на цвёрдую глебу закона. Яго вяршэнства над правам нацыянальным прызнаюць усе дзяржавы ЕС. У выпадку канфліктаў для вырашэння складаных праблем арганізавана «трэцяя ўлада» — Суд еўрапейскіх супольнасцей, рашэнні якога абавязковыя для ўсіх дзяржаў.

Няцяжка заўважыць, што працэс інтэграцыі народаў ЕС дасягнуў высокай ступені. У апошні час гучаць прапановы аб ператварэнні ЕС у адзіную дзяржаву з агульным цэнтрам улады і кіравання. Усе дзяржавы, якія ўваходзяць у аб'яднанне (саюз, садружнасць), застаючыся поўнымі гаспадарамі на сваёй тэрыторыі, павінны будуць у гэтым выпадку добраахвотна перадаць агульнаму цэнтру права кіравання агульнымі справамі садружнасці. А цэнтр абавязаны будзе падтрымліваць баланс інтарэсаў — абараняць інтарэсы кожнага члена садружнасці. Новай дзяржаве ёсць ужо нават назва «Злучаныя Штаты Еўропы».

Акрамя такога аб'яднання суверэнных дзяржаў, сёння існуе і іншы шлях міжнацыянальнай інтэграцыі — так званае адкрытае многанацыянальнае грамадства, класічным прыкладам якога з'яўляюцца ЗША. У такой супольнасці няма афіцыйнага дзялення краіны на асобныя суверэнныя дзяржавы. Улада тут не ўмешваецца ў нацыянальнае жыццё сваіх грамадзян, а нацыянальная прыналежнасць з'яўляецца прыватнай (асабістай) справай саміх грамадзян. Дзяржава ж на аснове дэмакратычных законаў гарантуе кожнаму народу нацыянальна-культурную аўтаномію (самастойнасць) і ахоўнае права на свабоду ўсіх відаў аб'яднанняў: эканамічных, партыйных, прафесійных, нацыянальных, узроставых, па інтарэсах і г. д. Інакш кажучы, ва ўмовах многанацыянальнай дэмакратычнай дзяржавы людзі розных нацыянальнасцей свабодна суіснуюць, а таксама, пры жаданні, свабодна аб'ядноўваюцца ў патрэбныя ім суполкі ў адпаведнасці са сваімі асабістымі патрэбнасцямі і інтарэсамі, калі, вядома, гэтыя аб'яднанні не носяць злачыннага характару. Усякая ж дыскрымінацыя (прыніжэнне, ушчамленне, прымяншэнне правоў) па нацыянальнай прымеце — ёсць парушэнне правоў чалавека і караецца па законах дэмакратычнай дзяржавы.

Адзначаныя шляхі міжнацыянальнай інтэграцыі адлюстроўваюць вопыт сучаснай цывілізацыі. Гэтымі шляхамі ідуць сёння большасць развітых самастойных

дзяржаў Заходняй Еўропы, ЗША, Канады, некаторыя з краін, якія сталі на шлях развіцця, з многанацыянальным насельніцтвам (Сінгапур, Маўрыкій).

Не трэба ўпускаць з-пад увагі, што паспяховае вырашэнне міжнацыянальных праблем заўсёды грунтуецца на эканамічнай інтэграцыі, сацыяльна-культурных дасягненнях, якія задавальняюць разнастайныя патрэбнасці грамадзян.

Аднак дзейнічае і іншая тэндэнцыя — дыферэнцыяцыя. Жыццё абвяргае прадказанні тэарэтыкаў, якія доўгі час сцвярджалі, што ў развітых краінах ва ўмовах НТР будуць працякаць у асноўным працэсы інтэграцыі. А працэсы нацыянальнага самавызначэння, што праяўляюць сябе часам у канфліктнай форме, застануцца «здабыткам» толькі краін, якія сталі на шлях развіцця. У канцы 1960-х гг. адбыліся рэзкія этнічныя сутыкненні іменна ў развітых краінах — Канадзе (праблема франка-канадцаў), Францыі (праблема правінцыі Брэтань), Вялікабрытаніі (праблема Паўночнай Ірландыі), Бельгіі (праблема фламандцаў і вавілонаў), Іспаніі (праблема баскаў) і г. д.

Аказалася, што індустрыяльнае развіццё зусім не ўстараняе нацыянальных праблем, а нярэдка павялічвае іх, узмацняючы цягу асобных народаў да самастойнасці, нават да самаізаляцыі. Прычын таму шмат. Перш за ўсё іх трэба шукаць у эканамічнай і палітычнай сферах (крызісныя з'явы ў эканоміцы, спад вытворчасці, рост інфляцыі, рост цэн, рост беспрацоўя, рэзкае пагаршэнне экалагічнай абстаноўкі, антыдэмакратычныя законы і г. д.). Але асабліва цяжкія вынікі выклікае нацыянальнае насілле — падаўленне або прыніжэнне нацыі, ушчамленне яе правоў, забарона і праследаванне рэлігіі, культуры, мовы, традыцый і г. д.

Між тым нацыянальныя пачуцці вельмі ўразімыя. Па назіраннях псіхолагаў праяўленні нацыянальнага насілля выклікаюць у людзей стан глыбокага песімізму, роспачы, бязвыхаднасці. Свядома ці несвядома яны шукаюць «групу падтрымкі» ў крузе «сваіх», у нацыянальна блізкім асяроддзі, мяркуючы, што іменна ў ім яны набудуць душэўную раўнавагу і ахову. Нацыя як бы ўваходзіць у сябе, самаізалюецца, замыкаецца (тэндэнцыя дыферэнцыяцыі набывае рэакцыйныя рысы).

Пачынаецца пошук вінаватага ва ўсіх бедах нацыі. І паколькі сапраўдныя, глыбінныя (эканамічныя, палітычныя, ідэалагічныя) прычыны часта застаюцца скры-

тымі ад масавай свядомасці, то «галоўным віноўнікам» часцей за ўсё аказваюцца людзі іншай нацыянальнасці («іншародцы»), якія пражываюць на дадзенай або суседняй тэрыторыі, або «свае», але «здраднікі», «пераражэнцы». Складваецца «вобраз ворага» — небяспечная сацыяльная з'ява. Яна нярэдка параджае ідэалогію нацыяналізму і шавінізму, у аснове якой ідэал узвялічвання «сваёй» нацыі, пагарда да «чужых», а часам нават ідэалогію фашызму з яго чалавеканенавісніцкай ідэяй паўнацэнных і непаўнацэнных народаў і практыку генацыду, г. зн. вынішчэнне «чужых».

Прагрэсіўныя сілы вядуць напружаны пошук шляхоў выхаду са шматлікіх этнічных крызісаў. Калі кароткa, сціслa ахарактарызаваць дасягнутае, то можна сказаць: перадавой часткай сусветнай супольнасці ўсвядомлена і прынята каштоўнасць гуманістычнага падыходу да этнічных праблем. Сутнасць гэтага падыходу заключаецца, па-першае, у адказе ад нацыянальнага насілля ва ўсіх шматлікіх відах, а па-другое — у паслядоўным развіцці дэмакратыі, прававых пачаткаў у жыцці грамадства, у прызнанні прыярытэту правоў асобы над правамі дзяржавы і нацыі. Інакш кажучы, забеспячэнне правоў і свабод асобы, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, ёсць умова свабоды ўсяго народа. Гэта, бадай, асноўная ідэя сучаснага цывілізаванага падыходу да вырашэння нацыянальнага пытання.

Развіццё нацый і міжнацыянальных адносін у нашай краіне

Доўгія гады прынята было лічыць, што праблем у сферы нацыянальных адносін у нас няма і быць не можа. Актыўна прапагандавалася думка аб тым, што нацыянальнае пытанне ў СССР вырашана канчаткова, а народы нашай краіны звязаны вялікай непарушнай дружбай.

І раптам — падзеі ў Якуціі, Казахстане, Закаўказзі, Узбекістане, Малдове, Прыбалтыцы... Крывавыя, цяжка вырашальныя.

Што ж здарылася, чаму?

Адказ можа быць кароткім: крызісны стан, у якім аказалася наша грамадства, не мог не закрануць нацыянальных адносін, бо нацыі ж ёсць элемент яго сацыяльнай структуры.

Паспрабуем, аднак, асвяціць пытанне некалькі больш падрабязна.

З курса гісторыі вам вядома, што XX ст. стала векам

«гібелі імперый» (Аўстра-Венгерскай, Атаманскай, Германскай, Французскай, Партугальскай, Брытанскай, Расійскай і інш.). Наша краіна адной з першых уступіла на шлях цывілізаванага вырашэння нацыянальнага пытання. У ліку першых актаў Савецкай улады была «Дэкларацыя правоў народаў Расіі», у якой абвяшчаліся роўнасць і суверэнітэт усіх народаў Расіі, іх права на свабоднае самавызначэнне (аж да аддзялення), адмяняліся ўсе і ўсякія нацыянальныя і рэлігійныя прывілеі і абмежаванні. Інакш кажучы, абвяшчаўся поўны адказ ад палітыкі нацыянальнай няроўнасці і насілля.

Створаная «Дэкларацыяй» палітычная і юрыдычная аснова для ажыццяўлення фактычнага раўнапраўя ўсіх народаў краіны спалучалася з бурным ростам эканомікі — асабліва, як вам вядома, у найбольш адсталых у гаспадарчых адносінах рэспубліках, дзе былі дасягнуты нечуваныя тэмпы пераўтварэнняў. Рабіліся захады для практычнай рэалізацыі абвешчаных прынцыпаў, пры бескарыслівай дапамозе больш развітых у эканамічных адносінах народаў (Расіі, Украіны) паскорыліся тэмпы эканамічных пераўтварэнняў у раней адсталых раёнах краіны, развівалася нацыянальная культура. СССР быў абвешчаны федэрацыяй добраахвотна аб'яднаных, раўнапраўных рэспублік.

Непрадузяты погляд на нашу гісторыю перыяду 20-х гг. дазваляе ўбачыць дзеянне абедзвюх тэндэнцый у развіцці нацый: паспяховы рост эканомікі і культуры кожнага народа спалучаўся з іх узаемным абагачэннем і збліжэннем нацый. Суровай, але пераканаўчай праверкай садружнасці, якая склалася, была Вялікая Айчынная вайна. Фашызм, які разлічваў на ўзнікненне нацыянальных канфліктаў і хуткі распад Саюза, атрымаў аднадушны адпор. Гэты факт, як сведчанне рэальных дасягненняў у сферы нацыянальных адносін, нельга сёння ні забыць, ні перакрэсліць.

Але калі мы спынімся на канстатацыі толькі гэтых фактаў, гістарычная праўда будзе няпоўнай. Ужо ў тыя самыя гады, калі пачынаўся працэс станаўлення многанацыянальнага Саюза, паявіліся першыя прыметы недэмакратычнага, насільнага падыходу да вырашэння нацыянальнага пытання. І далей, на працягу ўсёй той гістарычнай паласы, якую называюць перыядам культу асобы Сталіна, а дакладней трэба называць перыядам станаўлення рэпрэсіўна-размеркавальнай,

камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання, дэфармацыя (скажэнне, скрыўленне) прынцыпаў «Дэкларацыі» нарастала і паглыблялася.

Сёння вядома маса фактаў грубага адступлення ад першапачатковай задумы. Тут і насільная ліквідацыя тысяч (!) нацыянальных раёнаў, і штучнае скарачэнне колькасці народнасцей, насільнае «зліццё» адных народнасцей з другімі, забарона мовы, культуры, звычаяў, дэпартацыя, г. зн. выгнанне з роднай зямлі цэлых народаў.

У рэальным жыцці цяжка разлічыць, дзе канчаюцца «старыя» праблемы, якія не атрымалі свайго вырашэння, а дзе пачынаюцца «новыя», што ўзніклі ўжо ў гады застою (60—80-я гг.). У гэты перыяд канчаткова склаўся эканамічны фундамент саюза народаў СССР — адзіны народна-гаспадарчы комплекс з вялікім вытворчым патэнцыялам. Ён стварыў агульную эканамічную прастору, змацоўваў садружнасць савецкіх народаў, федэрацыю рэспублік.

Працягвалася правядзенне ў жыццё палітыкі эканамічнага і культурнага выраўноўвання народаў. За лік сродкаў агульнасаюзнага бюджэту будаваліся фабрыкі, заводы, ВНУ ў рэспубліках, дзе раней іх практычна не было ці было яўна недастаткова. Цяпер усе народы краіны валодаюць значным прамысловым патэнцыялам, механізаванай сельскай гаспадаркай, развітой сеткай навуковых устаноў і ВНУ — факты, якія нельга адмаўляць.

Аднак гэтак жа наглядна бачны сёння і сур'ёзныя дэфармацыі. У гэтыя ж гады працягвала нарошчваць «мускулы» адміністрацыйна-камандная дыктатура. Усеўладныя міністэрствы і ведамствы вялі сябе таксама, як заваёўнікі ў чужой краіне, «вымотваючы» нацыянальныя багацці народаў, пагарджаючы пры гэтым патрэбнасцямі сацыяльна-эканамічнага развіцця саміх рэспублік, асаблівасцямі іх экалогіі, культуры, традыцый. Толькі злачыннае бюракратычнае раўнадушша да лёсу народаў магло парадзіць такі, напрыклад, «праект веку», як паварот паўночных рэк, або аб'явіць «неперспектыўнымі» тысячы вёсак рускага Нечарназем'я, навязваць аднабаковае монакультурнае развіццё асобным рэспублікам Сярэдняй Азіі і г. д. Такая палітыка прыводзіла да глыбокай грамадскай незадаволенасці, якая часам набывала канфліктны характар. Аднак нега-

тыўныя з'явы, што накопліваліся дзесяцігоддзямі, доўгі час не атрымлівалі належнай ацэнкі.

Перабудова, дэмакратызацыя і галоснасць выкрылі гэтыя з'явы і ў той жа час стварылі ўмовы для іх дэмакратычнага пераадолення.

Развіццё нацыянальных адносін, на думку многіх спецыялістаў, вучоных, палітыкаў, сёння павінна ісці па некалькіх напрамках. Па-першае, гэта ўстараненне скажэнняў і дэфармацый у самім нашым грамадстве, што правакуюць узнікненне праблем ва ўсіх сферах жыцця народа. Па-другое, гэта вырашэнне ўласна нацыянальных праблем на аснове дэмакратычных прынцыпаў роўнасці, самавызначэння і свабоднага развіцця. І па-трэцяе, паглыбленне і расшырэнне ў любой рэспубліцы правоў і свабод чалавека незалежна ад яго нацыянальнай прыналежнасці.

Пытанні і заданні

1. Як вы разумееце маральнае патрабаванне аб тым, што адносіны паміж людзьмі розных нацыянальнасцей патрабуюць ад кожнага з нас асабістай далікатнасці, цярпімасці і ўзаемнага паважання? Растлумачце на канкрэтных прыкладах.

2. Ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі ў развіцці этнасаў, растлумачце, чаму яны садзейнічаюць прагрэсу цывілізацыі.

3. Што характэрна для развіцця нацый і міжнацыянальных адносін у сучасным свеце?

4. Якімі шляхамі ідзе ў сучасным свеце працэс міжнацыянальнай інтэграцыі? Дакажыце, што гэты працэс заканамерны.

5. Раскрыйце сутнасць гуманістычнага падыходу да этнічных праблем.

6. У чым праяўляецца крызісны стан міжнацыянальных адносін у нашай краіне? Якія асноўныя прычыны гэтай з'явы?

7. Ахарактарызуйце асноўныя напрамкі пераадолення крызісу міжнацыянальных адносін у нашай краіне.

8. Вядома, што ў пачатку 20-х гг., калі ствараліся ўмовы для ўтварэння будучага Саюза ССР, У. І. Ленін лічыў магчымым назваць новую дзяржаву Саюзам Савецкіх Рэспублік Еўропы і Азіі. Ужо ў нашы дні акадэмік А. Дз. Сахараў бачыў у абноўленай дзяржаве Саюз Суверэнных Рэспублік Еўропы і Азіі.

Як вы разумееце, у чым сэнс назваў, што прапаноўваліся? Што, на ваш погляд, праявілася ў дадзеным выпадку: проста супадзенне назваў ці блізкасць пазіцый?

9. У савецкіх пашпартах ёсць пункт: нацыянальнасць. Амаль ні ў адной краіне свету гэтага пункта няма.

Як вы мяркуеце, наколькі апраўданы, неабходны ў пашпарце гэты пункт? Адказ абгрунтуйце.

10. Вядомаму амерыканскаму фізіку Роберту Апенгеймеру ў камісіі па расследаванню антыамерыканскай дзейнасці было зададзена пытанне: што вы ставіце вышэй — лаяльнасць (вернасць, сімпатыя, цярпімасць) у адносінах да айчыны ці лаяльнасць у адносінах да чалавецтва? Вучоны адказаў — лаяльнасць у адносінах

да чалавецтва. Гэта знішчыла яго кар'еру і вырашыла яго лёс — яго звольнілі з сакрэтнай работы назаўсёды.

Як вы ацэньваеце пазіцыю вучонага? Вашу думку абгрунтуйце.

А што сказалі б вы, калі б вам прыйшлося адказваць на такое пытанне?

11. Вядомага савецкага спевака, літоўца па паходжанню, Крыса Кельмі спыталі пасля трагічных падзей у Прыбалтыцы:

— Вы літовец, а жывяце сярод рускіх у Маскве...

— Для мяне наогул дзіка слухаць нават намёк на нацыянальнае адрозненне. Якая розніца, хто якой нацыянальнасці! А мая дзейнасць наогул не мае нацыянальнай прыналежнасці. Музыка — для ўсіх.

Так адказаў спявак.

Выкажыце вашу думку аб пазіцыі артыста. Адказ абгрунтуйце.

12. У адной маскоўскай газеце было апублікавана кароткае паведамленне аб аграбленні дзяўчыны. «Грабежнікаў,— пісаў журналіст,— удалося затрымаць. Імі аказаліся двое азербайджанцаў».

На гэту заметку прыйшло пратэстуючае пісьмо. Аўтар пісьма сцвярджаў, што журналіст фактычна зняважыў нацыянальную годнасць усіх азербайджанцаў. «Хіба мы не ведаем,— пісаў ён,— што ў злачынцаў няма нацыянальнасці? Хіба не ясна, што Сталін перш за ўсё не грузін, а Яжоў не рускі?»

А як вы ацэньваеце пазіцыі аўтараў? І якая ваша асабістая думка ў адносінах да апісваемай сітуацыі? Растлумачце, чаму вы так думаеце.

13. Вучоныя-этнографы (што займаюцца навукай аб народах) сутыкнуліся са здзіўляючым гістарычным фактам. Тыя ці іншыя народы маглі жыць на Зямлі вельмі доўгі час. Вядомы этнасы, якія ўзніклі яшчэ ў старажытнасці. Але няма ніводнага этнасу, які існаваў больш чым сорак вякоў. Чалавек жа ў яго сучасным выглядзе (Homo sapiens) паявіўся, прынамсі, 40—60 тысячагоддзяў (!) назад.

Якія думкі выклікаюць у вас гэтыя факты? Пастарайцеся на іх аснове сфармуляваць дастойны адказ рознага роду нацыяналістам, шавіністам, фашыстам, якія прапаведуюць нацыянальную нянавісць, варожасць, перавагу адных нацый над другімі.

§ 25. САЦЫЯЛЬНЫ СТАТУС АСОБЫ

Калі гавораць аб чалавеку «ён — асоба», звычайна маюць на ўвазе яго асаблівыя якасці, здольнасць самастойна, разумна мысліць, разважаць і дзейнічаць. Чалавек сапраўды становіцца і праяўляе сябе як асоба ў дзейнасці, у зносінах.

Сацыяльны статус асобы

Сацыяльныя сувязі паміж людзьмі ўтвараюцца на аснове выканання імі сацыяльных функцый (настаўнік, шафёр, бацька, сын і інш.). Функцыі, якія выконваюцца людзьмі, вызначаюць становішча людзей у сацыяльнай структуры. Так, калі Вы сёння вучань сярэдняй школы, то ў гэтай якасці Ваша асноўная функцыя — засвойваць культуру (веды, спосабы дзейнасці і г. д.). Акра-

мя гэтага, Вы, малады чалавек, а значыць, можаце дапамагаць тым, хто па ўзросту ці хваробе страціў сілы ці здольнасці працаваць. Якія яшчэ функцыі Вы выконваеце?

Сацыяльны статус (ад лацінскага слова, якое азначае «стан спраў», «становішча») — гэта становішча, займаемае ў грамадстве, ў адпаведнасці з узростам, полам, паходжаннем, прафесіяй, сямейным становішчам.

Пры вызначэнні становішча асобы ў грамадстве важнае значэнне маюць такія паняцці, як «прэстыж» і «аўтарытэт».

Прэстыж (ад французскага слова, якое азначае абаянне, зачараванне) — гэта ацэнка грамадствам (ці сацыяльнай групай) грамадскай значымасці тых ці іншых пазіцый, займаемых людзьмі. Быў час, калі ў нашым грамадстве прызнавалася вельмі прэстыжным стаць лётчыкам ці інжынерам, а цяпер растуць конкурсы ў гуманітарныя ВНУ; некаторыя людзі, у тым ліку і з вышэйшай адукацыяй, пераходзяць на работу ў магазіны, рэстараны, пункты прыёму шклопасуды. Калі вы прааналізуеце свае планы на далейшае жыццё, то згодзіцеся з тым, што прэстыжнасць у іх вызначэнні адыгрывае не апошнюю ролю.

Паняцце **«аўтарытэт»** (ад лац. autoritas — «годнасць», «улада») азначае ступень прызнання групай людзей асабістых і дзелавых якасцей каго-небудзь са сваіх членаў. Аўтарытэт звычайна адлюстроўвае ступень уплыву асобы ў сацыяльнай групе (ці грамадстве). Прэстыжнай можа быць прафесія, пасада, від дзейнасці. Аўтарытэт мае зусім пэўны, канкрэтны чалавек.

Некаторыя рысы, якія робяць уплыў на становішча асобы ў грамадстве, носяць аб'ектыўны характар, не залежаць ад самога чалавека (нацыянальнасць, сацыяльнае паходжанне). Але галоўнае, што вызначае сацыяльны статус асобы сёння,— гэта адукацыя, кваліфікацыя, іншыя асабістыя якасці. Такім чынам, асоба мае магчымасць рабіць уплыў на свой статус.

Напрыклад, калі чалавек «X» нарадзіўся ў Мексіцы ў сям'і небагатага селяніна, а чалавек «Y» — у сям'і брытанскага лорда, то ўжо першапачаткова, на стартавых пазіцыях яны маюць розныя, прадпісаныя грамадствам, статусы. Прычым не толькі ў тых краінах, дзе яны нарадзіліся. Так, паступленне ў амерыканскі універсітэт для патомка брытанскага роду, мабыць, не з'яўляецца вялікай праблемай — былі б у наяўнасці

пэўныя сумы грошай для аплаты за навучанне. Для мексіканца ж нават легальны ўезд у ЗША можа аказацца сур'ёзнай перашкодай (уезд на жыхарства ў ЗША для лацінаамерыканцаў абмежаваны).

Але апошні час сярод фамілій амерыканскіх вучоных і бізнесменаў можна даволі часта пачуць фаміліі кітайцаў, карэйцаў і тых жа лацінаамерыканцаў. Гэта значыць, што адбылося пэўнае змяненне «прадпісаных» пазіцый — статусаў у амерыканскім грамадстве. Але гэта азначае таксама і тое, што прадстаўнікі іншых рас і нацыянальнасцей змаглі пераадолець няроўнасць стартавых сацыяльных пазіцый сваёй працай, поспехамі ў разумовай дзейнасці дамагчыся пэўных «дасягаемых» пазіцый, г. зн. змянілі сваё сацыяльнае становішча.

Сацыяльная мабільнасць, магчымасць змяніць сацыяльны статус тым большая, чым вышэйшы ўзровень цывілізацыі грамадства. Ці можна было простаму чалавеку стаць дваранінам у дапятроўскі час у Расіі? Цяпер жа ў развітых краінах свету за кожным (праваздольным) чалавекам замацаваны правы, якія даюць яму магчымасць бесперашкодных сацыяльных перамяшчэнняў (напрыклад, прайсці шлях ад селяніна да прэзідэнта).

Кожны можа рэалізаваць сябе ў рамках любога сацыяльнага статуса. (Помніце прымаўку «Не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца».) У рэальным жыцці добрасумленны, працавіты чалавек праяўляе сябе з лепшага боку ў мностве сацыяльных пазіцый, напрыклад, і як дворнік, і як мастак, і як бацька. (Не сакрэт жа, што многія прафесіі не адразу ствараюць чалавеку ўстойлівае становішча ў грамадстве, асабліва матэрыяльнае.)

Лепшая рэалізацыя здольнасцей асобы магчыма пры знаходжанні чалавекам гармоніі з той дзейнасцю, якую ён выконвае. Але нярэдка людзі адказваюцца ад пошуку свайго асабістага шляху і дабіваюцца толькі прэстыжнага становішча ў грамадстве, г. зн. думаюць не столькі аб рэалізацыі сваіх асабістых здольнасцей, колькі аб прэстыжы, звязаным з прыналежнасцю да пэўнай сацыяльнай групы.

Сацыяльныя ролі асобы

З паняццем «сацыяльнага статуса» суадносіцца паняцце «сацыяльнай ролі». Калі сацыяльны статус — гэта пэўныя пазіцыі, якія займае асоба ў сацыяльнай

структуры, то сукупнасць засвоеных і выконваемых чалавекам сацыяльных функцый (і ўзораў паводзін), што прад'яўляе грамадства да чалавека, утварае змест яго сацыяльнай ролі (напрыклад, добрасумленны працаўнік, добрапрыстойны сем'янін і г. д.).

Часцей за ўсё мы звязваем слова «роля» з тэатральным дзеяннем. Іменна параўнанне ролі чалавека ў грамадстве і вобразнага яе ўвасаблення акцёрам на сцэне дазволіла Шэкспіру заявіць вуснамі аднаго з герояў сваёй п'есы «Как вам это понравится?»:

Весь мир — театр.
В нем женщины, мужчины — все актеры.
У них есть выходы, уходы.
И каждый не одну играет роль.
Семь действий в пьесе той.
Младенец, школьник, юноша, любовник,
Солдат, судья, старик.

У. Шекспір

І ўсё ж у рэальным жыцці ролі чалавека не напісаны. Чалавек адначасова і аўтар, і акцёр ім самім напісанай драмы. Другая справа, што ролю сваю яму прыходзіцца і «пісаць» і «іграць», зыходзячы з патрабаванняў грамадства, якія склаліся ў адносінах да яго.

Такім чынам, **сацыяльная роля** — гэта сукупнасць дзеянняў, што павінен выконваць чалавек, які займае пэўнае становішча ў дадзеным грамадстве, г. зн. валодае пэўным сацыяльным статусам. Так, настаўнік павінен прыходзіць у школу ў пэўны час, праводзіць урокі, правяраць сшыткі, весці журналы, прымаць удзел у рабоце выкладчыцкага калектыву і г. д.

Сацыяльная роля — адзін з важнейшых аспектаў узаемадзеяння чалавека з грамадствам. Грамадства вылучае ролевыя патрабаванні ў адносінах да чалавека, якія замацоўваюцца ў прадпісаннях, правілах, пала-жэннях закона і маралі. Напрыклад, па дасягненні паўналецця мужчына ў нашай краіне і некаторых іншых краінах павінен па закону прайсці тэрміновую ваенную службу. Уставы ваеннай службы поўнасцю вызначаюць прыклад паводзін для салдата.

Для кожнага канкрэтнага чалавека грамадскія патрабаванні групуюцца вакол займаемых ім сацыяльных пазіцый. Так, патрабаванні грамадства к прэзідэнту краіны і дробнаму служачаму розныя. І ўсё ж, нягледзячы на тое, што прэзідэнт па свайму сацыяльнаму статусу знаходзіцца на вяршыні сацыяльнай структуры

грамадства, для яго таксама вызначаны і правы, і абавязкі.

Кожны чалавек у сваёй жыццядзейнасці «іграе» не адну, а мноства роляў. Сукупнасць выконваемых чалавекам сацыяльных роляў паказвае тыя грамадскія адносіны і сувязі, у якія ён уключаны ў грамадскай сістэме.

Сацыяльныя гарантыі

Чалавек з першага дня нараджэння пападае ў сацыяльнае асяроддзе, у сістэму сацыяльных умоў, грамадскіх адносін. З гэтага ж часу ён набывае комплекс правоў і абавязкаў у адносінах да людзей і грамадства ў цэлым. Чалавек на працягу жыцця ўступае ў безліч адносін з іншымі людзьмі, грамадскімі арганізацыямі і групамі, дзяржаўнымі ўстановамі.

Важнейшае месца ў грамадстве належыць эканамічным адносінам. Напрыклад, адносіны чалавека да ўласнасці ў многім вызначаюць яго сацыяльны статус, яго сацыяльную дзейнасць. Але не трэба думаць, што эканамічныя адносіны ўбіраюць у сябе ўсе багацці жыцця. Механізмы сацыяльнага рэгулявання складаныя, і дзеянне іх мнагапланавае. Вядома, змяненне эканамічнай сістэмы цягне за сабой сур'ёзныя зрухі ў сацыяльнай структуры грамадства. Але значна павольней адбываюцца змяненні ў іншых сацыяльных рэгулятарах чалавечага жыцця (маралі, традыцыях, культуры і інш.), без якіх немагчыма нармальнае функцыяніраванне чалавечага грамадства.

«Людзі, людзі — гэта самае галоўнае,— пісаў Ф. М. Дастаеўскі.— Людзі даражэйшыя нават за грошы. Людзей ні на якім рынку не купіш і ніякімі грашамі, таму што яны не прадаюцца і не купляюцца, а... толькі вякамі выпрабляюцца... Чалавек ідэі і навукі самастойнай, чалавек самастойна дзелавы ўтвараецца толькі доўгім самастойным жыццём нацыі, векавой шматпакутнай працай яе...» Думаецца, што думка Ф. М. Дастаеўскага зразумелая: грамадства вякамі гісторыі вырошчвае свайго чалавека, выхоўвае яго, а значыць, і адносіцца да яго, як да свайго дзіцяці. У чалавека ўзнікаюць пэўныя абавязкі перад бацькоўскім грамадствам, але яно ў першую чаргу адказвае за паўнацэннае выхаванне і развіццё свайго чалавека.

Адносіны — «грамадства для чалавека» і «чалавек для грамадства» — трэба разглядваць у сукупнасці. Толькі пры ўмове ўстанаўлення «ўзаемных» адносін

паміж чалавекам і грамадствам магчыма найбольш поўнае развіццё талентаў, творчага патэнцыялу асобы, а значыць, і ўсяго грамадства. Чым больш грамадства аддае чалавеку, тым больш яно можа чакаць ад яго. Умовы працы і быту, адукацыя, ахова здароўя, сацыяльнае забеспячэнне — пенсіі, дапамогі і інш.— гэта толькі малая частка таго, што павінна найлепшым чынам забяспечыць грамадства. Клопат аб старых, дзецях, інвалідах — прымета цывілізаванасці грамадства, яго справядлівасці ў адносінах да сваіх грамадзян.

У якасці прыкладу справядлівага «сумленнага» грамадства можна разглядаць шведскае.

З 1932 г. у Швецыі, за выключэннем непрацяглых перыядаў, ва ўладзе знаходзіліся сацыял-дэмакраты. Яны ўсямерна заахвочвалі вытворчасць матэрыяльных каштоўнасцей, якая стымулявалася рыначнымі адносінамі пад кантролем дзяржавы, і па магчымасці, раўнамернае размеркаванне гэтых багацяў сярод насельніцтва краіны. (Швецыя займае шостае месца ў свеце па ўзроўню жыцця і першае — па раўнамернасці размеркавання даходаў унутры грамадства.)

Шведы не адразу, а паступова спасцігліі ісціну «дабрабыт не ўзнікае з нічога і не можа быць асабістым, ізаляваным». Больш за 50 % даходу яны аддаюць дзяржаве ў выглядзе падаткаў, якія часткова вяртаюцца да іх у якасці сацыяльных ільгот. Астатнія падаткі ідуць на дапамогу блізкім, якія аказаліся ў цяжкім становішчы.

Дзяржава (праз мясцовыя органы — камуны) можа аплачваць квартплату, калі яна залішне абцяжарвае бюджэт шведскай сям'і. Кожнаму дзіцяці да 16 гадоў налічваецца каля 5 тыс. крон у год (калі ў сям'і адзін з бацькоў і да т. п.). Дзяржава (як і ў Нарвегіі) у значнай ступені бярэ на сябе затраты на медыцынскае абслугоўванне. Гэта толькі некаторыя бакі забеспячэння рэальнай справядлівасці ў краіне. Высокая ступень юрыдычнай, сацыяльнай і бытавой абароненасці сталі прыметамі шведскага грамадства.

Узровень выканання грамадствам сваіх абавязкаў перад чалавекам у пэўнай ступені адлюстроўваецца ў наступных табліцах:

Працягласць жыцця ў асобных краінах (колькасць гадоў)

Краіна	Год	Усё насельніцтва	Мужчыны	Жанчыны
СССР	1988	70	65	74
Венгрыя	1987	70	66	74
Польшча	1986	71	67	75
ЗША	1987	75	72	78
Вялікабрытанія	1986	75	72	78
Францыя	1986	76	72	80
ФРГ	1987	75	72	78
Швецыя	1987	77	74	80
Японія	1987	78	76	81

Дзіцячая смяротнасць (колькасць дзяцей, якія памерлі ва ўзросце да аднаго года на 1 тыс. народжаных у 1988 г.)

СССР	Венгрыя	Польшча	ЗША	Вялікабрытанія	Францыя	ФРГ	Швецыя	Японія
25	16	16	10	9	8	8	6	5

Табліцы характарызуюць не толькі стан сістэмы аховы здароўя ў розных краінах, але перш за ўсё яны адлюстроўваюць узровень жыцця ў іх. Для таго ж каб людзі доўга жылі, недастаткова добрай медыцынскай дапамогі, неабходна забеспячэнне лепшых умоў працы і адпачынку, якаснае харчаванне і многае іншае.

Адказнасць грамадства перад чалавекам непасрэдна звязана з умацаваннем гарантый правоў асобы (эканамічных, сацыяльных, юрыдычных). **Сацыяльныя гарантыі** (ад французскага слова, што азначае «паручыцель») — гэта матэрыяльныя і юрыдычныя сродкі, якія забяспечваюць рэалізацыю сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-палітычных правоў членаў грамадства. Цывілізаванае грамадства прызвана гарантаваць чалавеку забяспечанасць работай, даступнасць адукацыі, медыцынскага абслугоўвання, жылля і г. д.

Гарантаваць сацыяльна-эканамічныя правы грамадства можа праз развіццё эканомікі, паляпшэнне якасці прадуктаў спажывання, расшырэнне жыллёвага будаўніцтва, удасканальванне сістэм аховы здароўя і адукацыі. Ахова юрыдычных правоў чалавека немагчыма без стварэння прававой дзяржавы, у якой правы вызначаны законам і не залежаць ад меркавання службовых асоб.

Устанаўліваючы адказнасць чалавека перад грамадствам, большасць людзей могуць гарантаваць тое, што асобны чалавек будзе выхаваны ў межах права, закона і маралі дадзенага грамадства, што сацыяльна небяспечны чалавек будзе ізаляваны ад іншых.

Права чалавека ў грамадстве цесна звязана з яго адказнасцю перад іншымі людзьмі.

Пытанні і заданні

1. Раскрыйце сэнс паняцця «сацыяльны статус асобы».
2. Якую ролю «прэстыж» і «аўтарытэт» адыгрываюць у імкненні людзей змяніць сацыяльны статус?
3. Якім чынам звязаны паняцці «сацыяльны статус» і «сацыяльная роля» асобы?
4. Што дазволіла К. Марксу запісаць наступную думку: «Як само грамадства нараджае чалавека... так і ён нараджае грамадства»? (Маркс К. і Энгельс Ф. З ранніх твораў. М., 1956. С. 589.)
5. Хто або што, па-вашаму, першаснае ў адносінах паміж чалавекам і грамадствам?
6. Як вы лічыце, якія ўмовы павінна гарантаваць грамадства для таго, каб сапраўды стала магчымым гарманічнае і ўсебаковае развіццё асобы?
7. Існуе тэзіс — «калектыў заўсёды правы...». Ці згодны вы з такім палажэннем? Свой адказ абгрунтуйце.
8. Як вы думаеце, ці магчыма стварэнне на Зямлі грамадства, якое забяспечыла б чалавеку поўнае і свабоднае яго развіццё? Якімі прыметамі яно павінна было б валодаць?
9. Ці набываеце вы абавязкі перад грамадствам, атрымліваючы пашпарт грамадзяніна СССР? Калі так, то пералічыце самыя асноўныя з іх.

§ 26. ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯЛЬНЫХ АДНОСІН У НАШАЙ КРАІНЕ

Змяненне сацыяльнай структуры савецкага грамадства

Грамадскія адносіны знаходзяцца ў пастаянным развіцці. Працэс абнаўлення савецкага грамадства не мог не выклікаць змен і ў сацыяльнай сферы.

Сацыяльная структура савецкага грамадства ў ходзе яго гістарычнага развіцця падверглася глыбокім змяненням. З курсаў гісторыі вы ведаеце, што найбольш буйныя сацыяльныя зрухі звязаны з перыядам другой палавіны 20—30-х гг. і 60—70-х гг. Першы з названых этапаў характарызаваўся фарсіраваным правядзеннем палітыкі індустрыялізацыі ў прамысловасці і калектывізацыі ў сельскай гаспадарцы. Прамым вынікам такой палітыкі стаў імклівы рост колькасці рабочага

класа, рады якога папаўняюцца выхадцамі з вёскі. Наколькі інтэнсіўны быў працэс, паказваюць наступныя лічбы: калі ў канцы 20-х гг. рабочы клас складаў $^{1}/_{8}$ частку насельніцтва краіны, то к пачатку 40-х гг.— ужо $^{1}/_{3}$.

Такое сацыяльнае пераразмеркаванне рабочай сілы адбывалася і адбываецца фактычна ва ўсіх індустрыяльна развітых краінах і носіць прагрэсіўны характар. Але ў СССР пераход «сялянства» ў «рабочыя» далёка не заўсёды быў выкліканы натуральным ходам эканамічнага развіцця, а часта паскараўся ўказаннямі зверху: рассяляньваннем у 30-я гг.; пераводам калгасаў у статус саўгасаў, г. зн. дзяржаўных прадпрыемстваў, дзе працуюць ужо не сяляне, а рабочыя, і іншымі падобнымі мерамі.

Разрыў традыцый жыцця, якія склаліся вякамі, звычайна цяжкая некваліфікаваная праца, сітуацыя нявызначанасці ў адносінах да бліжэйшага будучага ператваралі былых сялян у маргінальную масу. Такі стан для большасці «новых» рабочых быў часовым — яны набывалі кваліфікацыю, наладжвалі свой быт, адаптаваліся да ўмоў гарадскога жыцця. Але асобныя групы сельскіх жыхароў выбралі для сябе, напрыклад, сезонную работу (з вясны да восені ў вёсцы, а на зіму ў горад). Адначасовае знаходжанне ў некалькіх сацыяльных групах не рэдкасць і ў нашы дні.

У сацыяльным плане былыя сяляне аказаліся найбольш гібкім і падатлівым «матэрыялам». Ва ўмовах панавання камандна-адміністрацыйнай сістэмы гэта вяло да складвання спрошчанай мадэлі грамадскай структуры ў саставе: 1) кіраўніцкіх вярхоў, якія займаюць ключавое становішча ў грамадскай сістэме, і 2) радавых вытворцаў, якія ствараюць прыбавачны прадукт, што забіраецца першымі для далейшага размеркавання.

Для стварэння такой сістэмы было неабходна разбурыць сацыяльныя сувязі ў грамадстве, пазбавіць людзей сацыяльнай апоры. У сталінскі час і ў апошнія гады камандна-адміністрацыйная сістэма прыкладвала вялікія намаганні па разбурэнню грамадзянскага грамадства і дасягнула ў тым сур'ёзных поспехаў.

Сялянства к цяперашняму часу знясілена як клас. «Войны», якія яму аб'яўляліся камандна-адміністрацыйным апаратам, не прайшлі бясследна. Значная частка сялян і рабочых разбэшчаны стабільным зароб-

кам, без залежнасці ад укладзенай у вытворчасць працы.

Ураўняльнае размеркаванне, захаванне ў масавым парадку цяжкай ручной працы (у прамысловасці — 35 %, у будаўніцтве — 56 %, у сельскай гаспадарцы — каля 70 %), размеркаванне дадатковых грашовых сродкаў не па працоўнаму прынцыпу, а па прымеце «пажаданасці» актыўна ператварала многіх сялян і рабочых у маргінальную масу.

Інтэлігенцыя ў тым выглядзе, у якім яна прыйшла к 1917 г., аказалася залішне адукаванай і культурнай для камандна-адміністрацыйнай сістэмы, а значыць, і сацыяльна небяспечнай. У выніку — яшчэ адна «грамадзянская вайна», у якой былі страчаны лепшыя інтэлектуальныя сілы краіны і падарваны адносіны да інтэлігенцыі з боку сялянства і рабочых.

Буйны сацыяльны зрух у 60—70-х гг. быў звязаны з разгортваннем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, на першым вітку якога разам з ростам рабочага класа значна ўзрасла колькасць і сацыяльная значымасць навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі.

З канца 70-х гг. у жыцці нашага грамадства пачалі нарастаць крызісныя з'явы, якія ахапілі і сферу сацыяльных адносін.

Якімі б ні былі вялікімі разбурэнні натуральных сацыяльных сувязей у грамадстве, яны сталі адраджацца ў ходзе аднаўлення грамадства. Класавыя, прафесійныя, творчыя, тэрытарыяльныя, сацыяльныя супольнасці і арганізацыі складаюць аснову грамадзянскага грамадства.

У сучасны момант дзейнасць савецкіх людзей становіцца ўсё больш разнастайнай. Адбываецца адраджэнне прафесійнай і нацыянальнай самасвядомасці людзей. Казаць аб поўным аднаўленні самасвядомасці класаў і іншых грамадскіх груп у нашай краіне яшчэ рана. Але працэс гэты ідзе. Змяненні ў эканамічным жыцці (асабліва разнастайнасць форм уласнасці) прыводзяць да змен у сацыяльнай структуры грамадства, робяць яе яшчэ больш складанай. (Падумайце, якія сацыяльныя групы будуць фарміравацца ў сувязі з развіццём розных форм уласнасці.)

Стан сацыяльнай сферы грамадства

У другой палавіне 80-х гг. савецкае грамадства аказалася ў стане глыбокага сацыяльнага крызісу. Але крызісныя працэсы пачаліся значна раней.

У сярэдзіне 60-х гг. удзельная вага расходаў бюджэту на сацыяльна-культурныя патрэбы пачала зніжацца. К 1985 г. доля расходаў на асвету і ахову здароўя ўпала ў саюзным бюджэце ніжэй узроўню 1940 г. Негатыўная тэндэнцыя з асобай сілай праявілася ў рэспубліках Сярэдняй Азіі, дзе сацыяльная сфера прыходзіла ўсё ў большае запусценне.

На працягу трох дзесяцігоддзяў у радзе рэгіёнаў нашай краіны працягваецца зніжэнне нараджальнасці. Але гэта адбываецца не ва ўсіх рэгіёнах. У рэспубліках Сярэдняй Азіі, у сельскіх раёнах Закаўказзя захоўваецца высокі тэмп росту насельніцтва. Як вынік, у гэтых рэгіёнах адбываецца канцэнтрацыя сельскага насельніцтва, што вядзе да нізкага ўзроўню занятасці (беспрацоўе ў Сярэдняй Азіі), параджае нацыяналістычныя настроі ў адносінах да прыезджых.

Скарачаецца сярэдняя працягласць жыцця. За перыяд з 1970 па 1985 г. яна скарацілася на 0,4 года, у той жа час для насельніцтва Японіі і ЗША яе рост склаў адпаведна 3,6 і 3,2 года. У 80-я гг. было зафіксавана зніжэнне дзіцячай смяротнасці ў краіне, і ўсё-такі яна застаецца высокай у адносінах да таго ж паказчыка ў развітых краінах.

Працягвае захоўвацца слабая сацыяльная ўпарадкаванасць вёскі. Адсутнасць нармальнага медыцынскага абслугоўвання, роўных з гарадскім насельніцтвам магчымасцей у атрыманні якаснай адукацыі, знаёмства з дасягненнямі культуры, неразвітасць сферы быту — усё гэта ўзмацняе адток жыхароў сяла ў горад, выклікае запусценне вёскі.

Адной з самых вострых праблем сацыяльнай сферы з'яўляецца жыллёвая праблема. З-за недахопу жылля на многіх прадпрыемствах не хапае рабочых, высокая цякучасць кадраў. Нягледзячы на значныя маштабы жыллёвага будаўніцтва, у 70-х — пачатку 80-х гг. недастатковая забяспечанасць жыллём застаецца хранічнай. На будаўніцтва жылля ў нас ідзе 2 % валавога прадукту, у той час як у ЗША — 4 %.

Найбольш трывожным паказчыкам крызіснага стану сацыяльнай сферы з'яўляецца рост сярод насельніцтва краіны працэнта асоб, незадаволеных жыццём, як у цэлым, так і асобнымі яго бакамі (па даных на 1990 г., 54,5 % насельніцтва незадаволены сваім матэрыяльным становішчам; 53,8 % — заработнай платай; 46,7 % —

жыллёвымі ўмовамі; 88,8 % — забеспячэннем харчовымі таварамі; 75,8 % — умовамі працы).

Сацыяльны крызіс і сёння працягвае паглыбляцца. Гэта тлумачыцца тым, што перабудова пачалася ў перыяд падзення ўзроўню жыцця савецкіх людзей, з прычыны запавольвання тэмпаў прамысловай вытворчасці і прадукцыйнасці працы як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы. Структура эканомікі была такая, што толькі $^{1}/_{7}$ частка вытворчых фондаў забяспечвала выпуск тавараў народнага спажывання. Запушчанасць сацыяльнай сферы шмат у чым вызначалася астатковым прынцыпам размеркавання на патрэбы сацыяльнага забеспячэння, у той час як мілітарызацыя эканомікі паглынала каласальныя матэрыяльныя сродкі.

Усе гэтыя негатыўныя працэсы не маглі не ўскладніць правядзення сацыяльна-эканамічных рэформ у краіне. Трэба таксама ўлічваць, што пераўтварэнне эканамічнай сферы толькі пачалося.

Сацыяльная палітыка ў сучасных умовах

У перыяд перабудовы ўсё большае значэнне набывае сацыяльная палітыка, якую праводзіць урад у краіне. Ад яе эфектыўнасці і поспеху шмат у чым залежыць давер'е савецкіх людзей да ходу перабудовы.

Рашэнне сацыяльных праблем азначала б сур'ёзную перамогу працэсаў перабудовы ў краіне. У цяперашні час кіраўніцтва краіны пачынае рашучыя крокі па шляху рэформ у сацыяльнай сферы. Адбываецца пераарыентацыя прамысловасці на вытворчасць тавараў народнага спажывання (новыя капіталаўкладанні стымулююць тыя галіны прамысловай вытворчасці, якія непасрэдна працуюць на чалавека). Павінен быць пераадолены астаткавы прынцып фінансавання сацыяльнай сферы.

Ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі ў краіне расце беспрацоўе. У сучасны момант, як ужо адзначалася, для людзей, якія страцілі работу, будуць выплачвацца дапамогі; арганізуецца сістэма перакваліфікацыі для атрымання той прафесіі, на якую ёсць попыт; адкрываюцца біржы працы.

У асабліва цяжкім становішчы ў сучасны момант аказаліся пенсіянеры, інваліды, мнагадзетныя сем'і. Калі ў пачатку 60-х гг. сярэдняя пенсія складала больш за $^{2}/_{3}$ ад сярэдняй заработнай платы, то ў нашы дні яна не дасягае і палавіны сяреднямесячнай аплаты

працы. У сувязі з гэтым 15 мая 1990 г. Вярхоўным Саветам СССР быў прыняты закон «Аб пенсіённым забеспячэнні грамадзян у СССР». Па гэтаму Закону пенсіі па старасці і інваліднасці налічваюцца з улікам рэальнай вартасці жыцця, уводзяцца надбаўкі для тых, хто выйшаў на пенсію раней.

Клопат аб сем'ях, аб маці праяўляецца ў тым, што цяпер догляд за кожным дзіцем на працягу трох гадоў з дня нараджэння (усяго да шасці гадоў), а таксама час догляду за дзіцем-інвалідам, за дарослым інвалідам 1-й групы, старымі залічваецца ў агульны стаж работы таго, хто даглядае іх. Маці-гераіням пенсія назначаецца без працоўнага стажу.

Пенсіянеры цяпер атрымалі права работы з захаваннем поўнага заробку.

У нашы дні, акрамя дзяржавы, цэлы рад дабрачынных аб'яднанняў аказваюць дапамогу ў развіцці спецыяльнай сістэмы абслугоўвання інвалідаў. Але пакуль што магчымасці іх невялікія. У цэлым клопат грамадства аб інвалідах пакідае жадаць лепшага. Па-ранейшаму з'яўляецца праблемай уключэнне інвалідаў у актыўную працоўную дзейнасць.

Акрамя закона аб пенсіях, Вярхоўным Саветам і ўрадам краіны прымаюцца і іншыя законы, пастановы, накіраваныя на зняцце напружанасці ў сацыяльнай сферы. Дзеянне іх павінна аблягчыць жыццё савецкім людзям у складаны пераходны перыяд. Для паляпшэння стану савецкага грамадства неабходна ажыццявіць цэлы комплекс мер, як экстранных антыкрызісных, так і працяглых, накіраваных на стварэнне гуманнага і дэмакратычнага грамадства.

Да неадкладных мер адносяцца: распрацоўка і прыняцце новага дагавора аб саюзе рэспублік як суверэнных дзяржаў; насычэнне рынку таварамі першай неабходнасці пры захаванні на іх цвёрдых цэн; дадатковае фінансаванне сацыяльнага забеспячэння; асігнаванні на ахову здароўя і сістэму адукацыі; істотнае павелічэнне аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва; рашучае ўмацаванне дысцыпліны і правапарадку, барацьба са злачыннасцю. Дзейнасць у гэтым напрамку зняла б сацыяльную напружанасць у краіне.

Даўгачаснымі з'яўляюцца наступныя меры: рэалізацыя правоў і свабод чалавека і іх ахова незалежна ад яго сацыяльнага становішча, полу і ўзросту, нацыянальнай прыналежнасці і веравызнання на ўзроўні

прызнаных міжнародных норм; забеспячэнне ўмоў жыцця і працы, дастойных сучаснай цывілізацыі; гарантаванне сацыяльнай справядлівасці і сацыяльнай абароненасці. Праяўленне асаблівага клопату ў адносінах да дзяцей, старых і інвалідаў.

Для рэалізацыі і экстранных і даўгачасных мер неабходны значны ўздым вытворчасці і паляпшэння якасці прадукцыі, што выпускаецца. Як было сказана вышэй, гэта магчыма толькі праз развіццё рыначнай эканомікі, бо адміністрацыйна-камандныя меры цяпер ужо не дзейнічаюць (гл. вышэй: «Радыкальная эканамічная рэформа ў СССР»). Перыяд пераходу да рыначнай эканомікі часова пагаршае сацыяльнае становішча насельніцтва (асабліва такіх груп, як мнагадзетныя сем'і, пенсіянеры, інваліды). Таму для іх на пераходны перыяд уводзяцца меры сацыяльнай кампенсацыі (грашовыя выплаты, забеспячэнне прадуктамі харчавання, прамысловымі вырабамі і інш.).

Пытанні і заданні

1. Ці адлюстроўвае сацыяльная градацыя савецкага грамадства на два класы і сацыяльны слой інтэлігенцыі рэальны стан яго сацыяльнай сістэмы? Дайце аргументаваны адказ.

2. Ахарактарызуйце важнейшыя змены ў сацыяльнай структуры савецкага грамадства ў перыяд з 1917 г. і ў цяперашні час.

3. Ф. Энгельс пісаў: «І цяпер ёсць такія людзі, якія са свайго непрадузятага «вышэйшага пункту погляду» прапаведуюць рабочым сацыялізм, які лунае высока над іх класавымі інтарэсамі і класавай барацьбой і які імкнецца прымірыць у найвышэйшай гуманнасці інтарэсы абодвух класаў, што змагаюцца. Але гэта або навічкі, якім трэба шмат чаму павучыцца, або лютыя ворагі рабочых, ваўкі ў авечай шкуры». (Маркс К., Энгельс Ф. Творы. Т. 121. С. 265.) Як вы лічыце, ці захоўвае дадзенае палажэнне сваё значэнне для нашай краіны?

4. Ахарактарызуйце стан сацыяльнай сферы савецкага грамадства ў сучасны момант.

5. Якія, на вашу думку, перспектывы развіцця сацыяльных адносін у нашай краіне?

6. Якія меры па пераадоленню крызісу ў сацыяльнай сферы вы б вызначылі як неадкладныя і доўгатэрміновыя?

7. Ф. М. Дастаеўскі пісаў, што чалавек ідэі і навукі, самастойна дзелавы чалавек фарміруецца самастойным жыццём нацыі, яе векавой работай, і што паскараць «...штучна неабходныя і пастаянныя гістарычныя моманты жыцця народнага ніяк немагчыма» (Дастаеўскі Ф. М. Поўн. зб. тв. Т. 21. С. 93). У тыя ж гады філосаф-публіцыст П. М. Ткачоў заклікаў да хутчэйшай рэвалюцыі, якая «тады толькі і мае месца, калі меншасць не хоча жадаць, каб большасць усведамляла свае патрэбнасці» (Ткачоў П. М. Творы: У 2 т. М., 1976. Т. 2. С. 17). Як вы лічыце, хто быў правы ў гэтай гістарычнай спрэчцы? Свой адказ аргументуйце.

8. Ці раскрываюць якасць медыцынскага абслугоўвання даныя, прыведзеныя ў табліцах:

Забяспечанасць насельніцтва ўрачамі ўсіх спецыяльнасцей (на 10 тыс. чалавек насельніцтва на 1988 г.)

СССР	Венгрыя	Польшча	Вялікабрытанія	ЗША	ФРГ	Францыя	Японія
43,8	34,2	25,6	18,2	27,2	32,6	24,8	2,07

Забеспячэнне насельніцтва бальнічнымі койкамі (на 10 тыс. чалавек насельніцтва)

СССР 1988	Венгрыя 1988	Польшча 1988	Вялікабрытанія 1986	ЗША 1986	ФРГ 1987	Францыя 1986	Японія 1988
131,3	93,3	69,8	72,2	51,2	108,0	130,0	130,0

Якія сацыяльныя даследаванні, на вашу думку, трэба было правесці дадаткова для атрымання поўнага малюнка па якасці медыцынскай дапамогі ў пералічаных краінах?

9. Збярыце, выкарыстоўваючы перыядычны друк, матэрыялы, якія адлюстроўваюць развіццё сацыяльных адносін у краіне.

Раздзел VI. СУЧАСНАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ І ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

§ 27. ПАЛІТЫЧНАЯ СІСТЭМА І ЯЕ РОЛЯ Ў ЖЫЦЦІ ГРАМАДСТВА

Ці задумваліся вы калі-небудзь над пытаннем аб тым, чаму людзі, незалежна ад сацыяльнага статуса, праяўляюць такую жывую цікавасць да палітыкі? Чаму, скажам, радавому інжынеру або ўрачу, рабочаму або сельскаму працаўніку неабыякава, хто працуе ў вышэйшым органе дзяржаўнай улады? Чаму многія з іх гадзінамі сядзяць перад экранамі тэлевізараў, назіраючы за парламенцкімі дэбатамі, абмяркоўваюць законапраекты, удзельнічаюць у рэферэндумах, ідуць на мітынгі? Вядома, увага да палітыкі ва ўсіх людзей розная, як і ступень удзелу ў ёй. Аднак поўная раўнадушнасць да палітычных праблем праяўляецца рэдка, відаць, таму, што ад палітыкі ў многім залежыць развіццё грамадства, а значыць, і жыццё

кожнага чалавека і часам нават яго лёс. Акрамя таго, на думку псіхолагаў, удзел у палітыцы задавальняе натуральную патрэбнасць чалавека — патрэбнасць у зносінах, але ў зносінах асаблівых — з вялікімі сацыяльнымі групамі людзей і на больш высокім узроўні, што дае магутны імпульс развіццю асобы.

Што ж такое палітыка?

Што такое палітыка?

Палітыка разглядаецца ў шырокім і вузкім сэнсе. Палітыка ў вузкім сэнсе ў перакладзе з грэчаскай азначае **дзяржаўныя справы, майстэрства кіравання дзяржавай.**

Вы ведаеце, што ў любым сацыяльна неаднародным грамадстве, дзе існуюць разнастайныя супярэчлівыя інтарэсы нацый, класаў і інш., узнікае патрэбнасць у рэгуляванні адносін паміж імі, а значыць, у дзейнасці дзяржавы. Дзяржава ж, як правіла, выконвала і выконвае рад грамадска значных спраў: падтрыманне грамадскага парадку і стабільнасці ў грамадстве; выкарыстанне наяўных магчымасцей для эканамічнага развіцця; абарона бяспекі краіны. Дзяржаўныя справы выконваюцца дзякуючы спецыяльна распрацаваным мерам, палітычнай лініі, якая ўключае мэты, задачы, сродкі і шляхі дасягнення пастаўленых мэт. Гэта і ёсць палітыка ў «вузкім» сэнсе.

Для выканання грамадска значных спраў сучасная дзяржава мае заканадаўчыя органы (парламенты); выканаўчыя (урад і падпарадкаваныя яму міністэрствы і ведамствы); праваахоўныя (суд, пракуратура, паліцыя); армію. Дзяржава — асноўны палітычны інстытут улады, сутнасць якой — **здольнасць класа, сацыяльнай групы або індывіда праводзіць сваю волю (палітычную лінію) у грамадстве.**

Палітычная лінія дзяржавы ўнутры грамадства і на міжнароднай арэне ў большай ступені прадстаўляе, выказвае і абараняе інтарэсы адных класаў, нацый, сацыяльных груп і слаёў, у меншай — другіх. У выніку адны класы, сацыяльныя групы маюць уладу, другія — імкнуцца да ўлады, прад'яўляюць да яе тыя або іншыя патрабаванні. Паміж імі ўзнікае асобы від адносін — **палітычныя адносіны, гэта значыць дзейнасць, звязаная з пытаннямі дзяржаўнай улады.** Калі, напрыклад, рабочыя апрацоўчай прамысловасці Швейцарыі праз свае прафсаюзы вялі перагаворы з асобнымі прадпрымальнікамі і дабіліся рэкорднага

ў свеце павышэння пагадзіннай аплаты працы долараў,— гэта эканамічныя адносіны, але калі прафсаюзы ад імя рабочых выступілі перад дзяржавай з ініцыятывай увесці гэту аплату на ўсіх прадпрыемствах апрацоўчай прамысловасці краіны, узаконіць яе, выкарыстоўваючы дзяржаўную ўладу, то яны ўступілі ў сферу палітычных адносін.

Значыць, калі палітыка разглядаецца як адносіны паміж класамі, нацыямі, сацыяльнымі групамі, якія ўзнікаюць па пытанню дзяржаўнай улады, унутры грамадства, а таксама як адносіны паміж дзяржавамі на міжнароднай арэне — гэта значыць яна разглядаецца ў шырокім сэнсе.

У сучасным грамадстве галоўнымі ўдзельнікамі развітых палітычных адносін з'яўляюцца не столькі самі класы, нацыі, сацыяльныя групы, колькі створаныя імі недзяржаўныя арганізацыі. Менавіта праз іх клас, слой і г. д. або блокі сацыяльных сіл аказваюць уплыў на дзяржаву, на працэс выпрацоўкі і ажыццяўлення палітычнай лініі. Вакол дзяржавы ўзнікае густая сетка недзяржаўных арганізацый, якія, імкнучыся рабіць уплыў на дзяржаўную ўладу, уступаюць адна з адной у канкурэнтную барацьбу, у саюзы і кампрамісы. Гэта шырокая панарама палітычных адносін уяўляе не проста разрозненыя з'явы, а сістэму. Сістэма, як вы ведаеце,— гэта сукупнасць элементаў, якія пэўным чынам звязаны паміж сабой і ўтвараюць некаторую цэласнасць.

Прадбачым пытанне: што ж, палітычная сістэма — гэта сукупнасць дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый, якія адыгрываюць вялікую ролю ў палітыцы? Не зусім так.

Структура палітычнай сістэмы

У навуцы прынята выдзяляць чатыры асноўныя кампаненты (элементы) палітычнай сістэмы: 1) палітычныя адносіны; 2) палітычныя арганізацыі (інстытуты); 3) палітычныя нормы; 4) палітычныя погляды, ідэі, тэорыі, палітычная культура.

Да палітычных інстытутаў (арганізацыйнага кампанента палітычнай сістэмы) адносяцца, як ужо адзначалася, дзяржава, палітычныя партыі, прафсаюзы, кааператыўныя, маладзёжныя, жаночыя і іншыя арганізацыі і аб'яднанні. Усе гэтыя арганізацыі, як мы высветлілі, ствараюцца для таго, каб выказваць, абараняць у палітычнай сістэме шматгранныя сацыяль-

ныя інтарэсы: класавыя, групавыя, нацыянальныя, маладзёжныя, жаночыя, прафесіянальныя і інш.

Сярод недзяржаўных арганізацый найвялікшую ролю ў палітычным жыцці сучаснага грамадства адыгрываюць палітычныя партыі (ад лацінскага слова, якое азначае «частка», «група»). **Партыя звычайна вызначалася як найбольш актыўная і арганізаваная частка класа або слоя, якая выказвала і абараняла яго інтарэсы.** Аднак з сярэдзіны нашага стагоддзя, калі асноўнай формай палітычнай барацьбы партыі становіцца парламенцкая дзейнасць, на змену класавым (буржуазным, дробнабуржуазным, сялянскім, рабочым і інш.) пачалі прыходзіць «агульнанародныя» партыі.

Тэрмін «агульнанародная» нельга разумець літаральна, паколькі ніводная партыя не можа задаволіць інтарэсы ўсіх. Але кожная імкнецца ўлічваць у сваёй праграме інтарэсы не толькі пэўнага класа або слоя, а цэлага блока сацыяльных сіл. Напрыклад, сацыял-дэмакратычныя і камуністычныя партыі арыентуюцца на рэгуляванне змешанай эканомікі, дасягненне каштоўнасцей сацыяльнай справядлівасці, салідарнасці, абароны працоўных. Натуральна, што ў такой палітыцы зацікаўлены і рабочыя, і частка дробнай, сярэдняй буржуазіі, і пенсіянеры, і беспрацоўныя, а таксама іншыя найбольш неабароненыя слаі насельніцтва.

Кансерватыўныя і ліберальныя партыі, наадварот, выступаюць часцей за ўсё за абмежаванне ўмяшання дзяржавы ў эканамічную сферу, за актывізацыю яе найбольш магутнага — прыватнага — сектара.

Усе гэтыя партыі: сацыял-дэмакратычныя і камуністычныя, кансерватыўныя і ліберальныя — лічацца партыямі класічнага тыпу. Яны маюць разгалінаваны партыйны апарат; партыйнага лідэра; пастаяннае членства і крыніцы фінансавання. Лейбарысцкія партыі ў Вялікабрытаніі, Канадзе і іншых краінах, якія выказваюць пераважна інтарэсы рабочых, былі створаны па ініцыятыве прафсаюзаў, якія сталі калектыўнымі членамі гэтых партый і фінансуюць іх.

У 80-я гг. пачалі з'яўляцца новыя партыі — партыі «рухальнага тыпу». Яны бяруць за ўзор арганізацыйную структуру і дзейнасць сацыяльных рухаў (формы самадзейнасці насельніцтва). Напрыклад, партыя «зялёных» (ФРГ), якая ўзнікла на базе экала-

гічнага руху, характарызуецца поўнай адкрытасцю і галоснасцю ўнутрыпартыйнага жыцця, скарачэннем да мінімуму прафесіянальнага партыйнага апарату (у яго ўваходзяць усяго 11 чалавек), адсутнасцю пастаяннага партыйнага лідэра, а таксама традыцыйна аформленага пастаяннага членства. «Зялёныя» стварылі толькі пярвічныя (зямельныя) арганізацыі, адмовіўшыся ад аб'яднання партыі ў адзіны федэральны саюз. Такая аблегчаная, больш нефармальная структура, разлічаная не столькі на масавасць партыі, колькі на больш аператыўную гібкую работу з выбаршчыкамі, мае свае перавагі і дае, нярэдка, станоўчы вынік. «Зялёныя», напрыклад, на выбарах 1983 г. заваявалі 27 месцаў у бундэстагу (парламент).

Масавыя грамадска-палітычныя рухі (маладзёжны, рэлігійны, жаночы) і аб'яднанні (народныя франты), у адрозненне ад партый, практычна не маюць такога арганізацыйнага афармлення, як партыі, з'яўляюцца больш аморфнымі (расплыўчатымі) і нестабільнымі.

Заснаванне партыі або грамадска-палітычнага руху адбываецца на Устаноўчым з'ездзе або канферэнцыі. Любыя вусныя заявы аб факце нараджэння новай грамадска-палітычнай арганізацыі не лічацца дакладнай інфармацыяй.

У нашай краіне на сённяшні дзень існуюць больш як 20 палітычных партый; створаны грамадска-палітычныя рухі рэлігійнай арыентацыі (Хрысціянска-дэмакратычны саюз Расіі, партыя Ісламскага адраджэння і г. д.); атрымліваюць усё большае пашырэнне грамадска-палітычныя саюзы: Сялянскі саюз СССР, Аб'яднаны фронт працоўных СССР і інш.

Пэўную ролю ў палітычным жыцці краіны адыгрываюць таксама працоўныя калектывы. Яны вылучаюць кандыдатаў у народныя дэпутаты Саветаў усіх узроўняў, кандыдатаў у народныя суддзі, выбіраюць народных засядацеляў. Працоўнаму калектыву належыць права ўзбуджэння пытання аб адкліканні дэпутата, які не апраўдаў даверу выбаршчыкаў. Але асноўная роля працоўнага калектыву праяўляецца ў кіраванні справамі прадпрыемства. Яно выступае як самакіраванне ў адносінах да дзяржаўнага кіравання і яго органаў.

Асоба, з'яўляючыся членам палітычнай арганізацыі, нібы атаясамлівае сваю цікавасць з цікавасцю пэўнага сацыяльнага слоя, групы, класа, нацыі і звяз-

вае сябе з адпаведнай арганізацыяй, прадастаўляе ёй права выказваць і абараняць свой інтарэс на дзяржаўным узроўні.

Узаемадзеянне палітычных інстытутаў адбываецца на аснове пэўных палітычных норм. Найбольш важнымі з'яўляюцца **прававыя нормы:** канстытуцыі і законы, што базіруюцца на іх, іншыя нарматыўныя акты. Усе яны ўяўляюць сабой нормы — рамкі, якія ўстанаўліваюць межы дапушчальных палітычных паводзін. За адступленне ад іх накладаюцца дзяржаўныя санкцыі. Важнае значэнне для ажыццяўлення палітычнай дзейнасці маюць таксама нормы, якія ствараюцца грамадскімі арганізацыямі і рэгулююць адносіны ўнутры іх. Гэта перш за ўсё статутныя нормы гэтых арганізацый.

Пісаныя прававыя і статутныя нормы дапаўняюцца ў палітычным жыцці **няпісанымі звычаямі і традыцыямі.** Асабліва яны характэрныя для брытанскай палітычнай сістэмы. Лейбарысты (партыя існуе з 1906 г.), напрыклад, будуюць сваю праграму, абапіраючыся на асвечаную стагоддзямі традыцыю рабочага руху — традыцыю легальнай апазіцыі, і заўсёды выступаюць у якасці палітычных праціўнікаў партыі кансерватараў.

Палітычнае жыццё рэгулюецца і **этыка-маральнымі нормамі.** «Палітыка ёсць справа брудная» — так лічылася і так было стагоддзямі. Сёння, як ніколі, усё больш усведамляецца неабходнасць маральных паводзін у сферы палітыкі, адбываецца вяртанне да такіх маральных якасцей, як сумленне, гонар, высакароднасць. Але ці можна звесці палітычную дзейнасць да выканання простых і зразумелых 10 біблейскіх запаведзей? Відаць, не, хоць выкананне іх, як элементарнай асновы чалавечых адносін, абавязковае для кожнага індывіда. Справа ў тым, што маральныя нормы па-рознаму праламляюцца ў розных сферах жыцця, у тым ліку і ў палітычнай. Бо, каб заявіць, адстойваць, дабівацца праўды, мала грамадзянскага сумлення. Патрэбна і кампетэнтнасць. А сумленне, высакароднасць, як яны праяўляюцца ў палітыцы? Відаць, сумленне для палітычнага дзеяча — гэта перш за ўсё адзінства слова і справы; высакароднасць — талерантнасць (цярпімасць) і павага да чужой думкі (у тым ліку да думкі палітычных апанентаў), высокая персанальная адказнасць за сваю палітычную дзей-

насць. (Падумайце, якія яшчэ маральныя якасці неабходныя сёння для эфектыўнага ажыццяўлення палітычнай дзейнасці.)

У палітыку людзі (суб'екты палітыкі — асоба, сацыяльная група, слой, клас, народнасць, нацыя) заўсёды прыўносяць частку свайго ўнутранага свету: надзей, імкненняў, інтарэсаў, уяўленняў аб сэнсе жыцця і шчасці. Гэта адлюстроўваецца **ў палітычнай культуры (у палітычных поглядах, ідэях, тэорыях, у палітычных платформах і праграмах, у палітычных рашэннях, у адносінах да палітычных норм і інш.), у палітычных паводзінах.** Палітычная культура — надзвычай важны кампанент палітычнай сістэмы, паколькі свет палітыкі не існуе без чалавека, надзеленага свядомасцю. І ад таго, якія палітычныя і маральныя прынцыпы (каштоўныя арыентацыі) выбірае асоба ў працэсе палітычнай дзейнасці, залежыць эфектыўнасць палітыкі, а значыць, і жыццё грамадства ў цэлым, яго прагрэс. Нездарма палітычную культуру часта называюць «суб'ектыўным бокам» палітычнай сістэмы.

У выніку ўзаемадзеяння ўсіх (чатырох) кампанентаў палітычнай сістэмы ў грамадстве складаецца пэўны **палітычны парадак (палітычны рэжым).** Рэжымы бываюць дэмакратычнымі, аўтарытарнымі і таталітарнымі. Дэмакратычны парадак — гэта самы прагрэсіўны палітычны парадак, таму што ён стварае ўмовы для сапраўднай свабоды асобы, яе творчасці і самавыяўлення ва ўсіх сферах дзейнасці. Сёння дэмакратычны рэжым пануе ў многіх краінах свету. Аб ім мы падрабязна пагаворым у адным з наступных параграфаў. А зараз пералічым толькі некаторыя характэрныя прыметы гэтага паняцця: выбарнасць у органы дзяржаўнай улады; раздзяленне дзяржаўных улад на заканадаўчую, выканаўчую, судовую; шырокі спектр правоў і свабод грамадзян, іх абарона і гарантаванасць; дзейнасць недзяржаўных грамадска-палітычных арганізацый як раўнапраўных партнёраў дзяржавы; палітычны плюралізм; поўная галоснасць; шырокія магчымасці асобы рабіць уплыў на працэс прыняцця і ажыццяўлення палітычных рашэнняў.

Аўтарытарны рэжым заснаваны на ўладзе якога-небудзь аўтарытэту (ад лацінскага слова, якое азначае «зачынальнік», «заснавальнік», «творца»). Ва ўмовах такога рэжыму непадзельна пануе выканаўчая ўлада. Парламент, хоць і захоўваецца, але часта

значная яго частка назначаецца, а не выбіраецца. Ён ператвараецца ў дарадчую ўстанову пры кіраўніку дзяржавы, які займае, як правіла, усе ключавыя дзяржаўныя пасады. Асноўнымі метадамі дзяржаўнай дзейнасці становяцца загады і каманды. Асоба страчвае здольнасць да самастойнасці думак і дзеянняў, слепа падпарадкоўваючыся аўтарытэту.

Найбольш рэакцыйным антыдэмакратычным рэжымам з'яўляецца таталітарызм (ад лацінскага слова, якое перакладаецца як «увесь», «цэлы», «супольны»). Ён уяўляе насільнае палітычнае панаванне групы «выбраных» на чале з лідэрам (фюрэрам, дучэ і інш.). Асноўнымі прыметамі гэтага рэжыму з'яўляюцца: татальны кантроль за ўсімі сферамі жыцця грамадства; забарона канстытуцыйных правоў і свабод, дэмакратычных арганізацый; рэпрэсіі; мілітарызацыя грамадскага жыцця; панаванне адзінай агульнаабавязковай ідэалогіі. Ва ўмовах таталітарызму асоба знаходзіцца ў поўным падпарадкаванні ў пануючай групоўкі.

Такім чынам, мы разгледзелі элементы палітычнай сістэмы, у выніку ўзаемадзеяння якіх складаецца палітычны рэжым і ўтвараецца **цэласны механізм палітычнай улады.** (Звярніцеся яшчэ раз да вызначэння паняцця «палітычная ўлада», падумайце, для чаго яна ствараецца.)

Палітыка і кіраванне

Палітычная сістэма робіць мэтанакіраваны ўплыў на развіццё грамадства і яго сфер, г. зн. ажыццяўляе кіраванне ім. У чым жа сутнасць кіравання? Перш за ўсё ў вызначэнні мэт развіцця грамадства. У залежнасці ад зместу мэт палітыка бывае эканамічнай, сацыяльнай, нацыянальнай, у галіне развіцця палітычнай сістэмы, культурнай (унутраная) і ў галіне развіцця адносін паміж дзяржавамі (знешняя). Распрацоўка мэт, як правіла, належыць палітычным партыям. Пасля перамогі партыі на выбарах у парламент (вышэйшы заканадаўчы орган) яе палітычны курс прымае характар **агульнаабавязковых дзяржаўных наказаў,** якія абапіраюцца на прымусовую сілу дзяржавы.

Органы дзяржаўнага кіравання мабілізуюць грамадства на выкананне прынятых рашэнняў, з'яўляюцца асноўным рычагом уплыву на грамадскія працэсы. Пры гэтым ажыццяўляюцца асноўныя функцыі кіраўніцкага працэсу: апрацоўваецца і выкарыстоў-

ваецца інфармацыя, прымаюцца і рэалізуюцца дадатковыя рашэнні, ажыццяўляецца кантроль.

Пры распрацоўцы аператыўнай палітыкі часта выкарыстоўваюцца прагнастычныя навуковыя даследаванні. У ЗША, напрыклад, створаны Савет па знешніх зносінах, які на працягу многіх дзесяцігоддзяў выступае ў якасці цэнтра, што аказвае дапамогу афіцыяльным уладам у фарміраванні асноў амерыканскай знешняй палітыкі і стратэгіі.

Ускосны ўплыў на кіраўніцкі працэс аказваюць і непартыйныя грамадска-палітычныя арганізацыі. Яны выступаюць або ў абарону дзяржаўнай дзейнасці або супраць яе. У першым выпадку гэтыя арганізацыі садзейнічаюць кансалідацыі, аб'яднанню членаў грамадства вакол праводзімых дзяржаўных акцый; у другім — дыктуюць неабходнасць дадатковага ўзгаднення разнастайных грамадскіх інтарэсаў.

Трэба заўважыць, што ўзгадненне сацыяльных інтарэсаў можа ажыццяўляцца па-рознаму. Напрыклад, можна шляхам механічнага галасавання «за» і «супраць» высветліць пункт гледжання большасці і прызнаць яго як адзіна правільны. У тым выпадку меншасць аказваецца ўшчэмленай і існуючыя супярэчнасці ў грамадстве не толькі не вырашаюцца, але, наадварот, паглыбляюцца. Яскравым доказам гэтага з'яўляецца няспынная барацьба ў Ольстэры каталічнай меншасці, якая імкнецца абараніць свае ўласныя інтарэсы, з пратэстанцкай большасцю. Гэта барацьба настолькі актыўная, што ахвяры з абодвух бакоў вылічаюцца тысячамі чалавечых жыццяў.

Сёння многія буйныя палітычныя дзеячы і вучоныя-палітолагі прапануюць новы **кансенсуальны** падыход да вырашэння ўнутрыдзяржаўных і міжнародных праблем. Сутнасць кансенсуса — у пошуку **агульнай** згоды, палітычных кампрамісаў, накіраванасці на станоўчы вынік. Асноўным законам кансенсуса з'яўляецца прызнанне чужых інтарэсаў як гарантыі для ажыццяўлення інтарэсаў уласных. У гэтым заключаецца яго гуманізм.

Устаноўка на пошук згоды прадугледжвае выяўленне, абмеркаванне і ўлік усіх існуючых у грамадстве пунктаў гледжання, знаходжанне такіх прапаноў, што выклікаюць найменшае пярэчанне або супраць якіх ніхто не выступае.

Устаноўка на агульную згоду фарміруе новае палі-

тычнае мысленне, якому чужыя прадузятасць і непрымірымасць.

У цэлым сказанае дазваляе зрабіць вывад аб тым, што распрацоўка і ажыццяўленне палітыкі з'яўляецца асноўным зместам дзейнасці палітычнай сістэмы. Яна выступае як цэласны механізм кіравання грамадствам.

Пытанні і заданні

1. Што такое палітыка?
2. Якая структура палітычнай сістэмы?
3. У чым сутнасць кіравання грамадствам?
4. У 1906—1910 гг. у Расіі была праведзена Сталыпінская аграрная рэформа. Ці правільна назваць гэту рэформу палітыкай царскага ўрада? Аргументуйце свой адказ, абапіраючыся на паняцце «палітыка».
5. Уявіце, што вы размаўляеце з таварышам, які сцвярджае, што клуб, членам якога з'яўляецца яго старэйшы брат,— гэта новая палітычная партыя. Якія пытанні вы задалі б яму, каб пераканацца ў правільнасці яго слоў?
6. Ці правільнае наступнае меркаванне: «Палітычная ўлада — гэта здольнасць тых, хто кіруе, падпарадкоўваць сваёй волі кіруемых»? Аргументуйце свой адказ.
7. Ці правільнае, на ваш погляд, наступнае азначэнне: «Палітыка — гэта адносіны паміж класамі, сацыяльнымі групамі і слаямі ў межах дадзенай дзяржавы (унутраная) і паміж дзяржавамі (знешняя)»? Аргументуйце свой адказ.
8. Пералічыце асноўныя прыметы паняцця «палітычная сістэма», сфармулюйце азначэнне гэтага паняцця.
9. Ці можна з вашага пункту гледжання вырашыць супярэчнасці, якія існуюць у Нагорным Карабаху, па прынцыпу большасці? Аргументуйце свой адказ. Прывядзіце іншыя прыклады, якія даказваюць неабходнасць кансенсуальнага падыходу да вырашэння сацыяльных і нацыянальных канфліктаў у нашай краіне.
10. Ці з'яўляецца царква інстытутам палітычнай сістэмы? Свой адказ аргументуйце.

§ 28. ПРАВАВАЯ ДЗЯРЖАВА

Мы гаварылі аб разнастайнасці інстытутаў палітычнай сістэмы, закліканых выказваць у ёй розныя сацыяльныя інтарэсы. Які ж з гэтых інстытутаў з'яўляецца галоўным і чаму?

Галоўны інстытут палітычнай сістэмы

Відавочна, што ім з'яўляецца дзяржава, характэрная рыса якой — суверэннасць (вярхоўная ўлада, незалежнасць). Суверэннасць дзяржавы выражаецца ў тым, што ёй належыць права афіцыяльна прадстаўляць усё грамадства ў цэлым; выдаваць законы і іншыя нарматыўныя акты,

абавязковыя для выканання ўсімі членамі грамадства, ажыццяўляць правасуддзе.

Дзяржаўная ўлада мае ў сваім распараджэнні прафесіянальны апарат кіравання, а таксама спецыяльныя ўзброеныя атрады людзей — армію, паліцыю і г. д. Таму дзяржава выступае як сіла, здольная ажыццяўляць прымус у адносінах да любога члена грамадства.

Паколькі ў руках дзяржавы сканцэнтравана вялікая ўлада, яна можа ператварыцца ў велізарны жывы арганізм, які нагадвае біблейскае страшыдла — Левіяфана (нешта сярэдняе паміж бегемотам і марскім змеем). З дапамогай жа чыноўнікаў, арміі, паліцыі, суда лёгка можна падавіць інтарэсы сацыяльных груп, класаў і цэлага народа. Гісторыя ўстанаўлення фашызму ў Германіі і Італіі з'яўляецца яркім прыкладам таго, як пражэрлівы, страшэнны Левіяфан паглынаў грамадства, адбывалася адзяржаўленне яго сфер, ажыццяўляўся ўсеагульны (татальны) кантроль над асобай. Гэтыя адкрытыя тэрарыстычныя дыктатуры, як вы ведаеце, ператварыліся ў вельмі небяспечных праціўнікаў грамадскага прагрэсу.

У нашай краіне, пачынаючы з 30-х гг., дзяржава таксама праявіла нястрыманы нораў. Яна ўвяла прынцып: «Забаронена ўсё, акрамя дазволенага». Права ператварылася толькі ў каманду і загад. Невыпадкова самі спосабы (метады) кіравання атрымалі назву адміністрацыйна-камандных. Гэта стала трагедыяй для асобы, усяго савецкага народа, які страціў свабоду самавыяўлення і творчасці.

Але не ўсякая дзяржава — гэта «Левіяфан».

Прыметы прававой дзяржавы

У апошняй трэці XX ст. у многіх краінах свету склалася дзяржава з асаблівымі прыметамі, якія ў сукупнасці характарызуюць яе як дзяржаву прававую.

Удумайцеся ў словазлучэнне — прававая дзяржава. На першым месцы права, на другім — дзяржава. У сацыяльна-палітычным жыцці гэта азначае **вяршэнства права ў грамадстве, ва ўсіх яго сферах.** Гэта асноватворны прынцып усякай прававой дзяржавы. Непарушнасць яго замацоўваецца ў Канстытуцыі (Асноўным Законе) краіны і распаўсюджваецца на ўсе іншыя законы і іншыя нарматыўныя акты. На варце няўхільнага захавання канстытуцыйных прадпі-

санняў стаіць Вярхоўны суд і ўся сістэма судоў прававых дзяржаў.

Вяршэнства права (закона) у грамадстве — галоўны прынцып прававой дзяржавы. Ён прадвызначае і астатнія яе прынцыпы, у прыватнасці **падпарадкаванне закону самой дзяржавы і яе органаў, службовых асоб, іншых арганізацый, грамадзян.** У ФРГ, напрыклад, у звычайным парадку завялі крымінальную справу за нявыплату падаткаў супраць міністра эканомікі, у ЗША — супраць другой асобы ў дзяржаве — віцэ-прэзідэнта С. Агню.

Прававая дзяржава адрозніваецца ад неправавой і якасцю самога закона. Ён павінен быць гуманным, справядлівым, замацоўваць неад'емныя правы кожнага чалавека: права на жыццё, на належнае існаванне і інш. Наіўна і шкодна думаць, што гэтыя правы падараваны грамадзяніну дзяржавай. Ён валодае імі ад прыроды. «Кожны чалавек мае права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць»,— запісана ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Але свабода не можа быць абсалютнай, яна прадугледжвае абмежаванні, граніцы, гэта значыць мае пэўную меру. У грамадскім жыцці мера свабоды выражаецца ў форме права. Гэта мера павінна быць роўнай для ўсіх. Той, хто мае права на жыццё, напрыклад, павінен рабіць так, каб не падвяргаць небяспецы жыццё іншага чалавека, а тым больш рабіць замах на яго. Інакш права аднаго чалавека становіцца бяспраўнасцю, самавольствам для іншага, ператвараецца ў аднабаковую прывілею.

У правах чалавека выяўляюцца магчымасці яго дзеянняў у розных сферах: эканамічнай, палітычнай, сацыяльна-культурнай, асабістай. Чым шырэйшыя гэтыя правы, чым больш яны гарантаваныя, тым больш свабодная асоба. Калі ж натуральныя правы чалавека ўшчэмлены, ён адчувае сябе прыніжана, няўпэўнена, губляе здольнасць да творчасці і тым самым абмяжоўвае развіццё грамадства. У гэтым неаднаразова пераконваліся і самі арганізатары прававой дзяржавы. У ЗША, напрыклад, была распаўсюджана практыка падслухоўвання тэлефонных перагавораў урадавымі агентамі. У выніку гэтага парушаліся правы грамадзяніна на «прайвесі» (прыватнае, асабістае жыццё, яго інтымнасць, на адасобленасць, асабістыя адносіны, тайну карэспандэнцыі і да т. п.). Многія

амерыканцы, ведаючы аб падслухоўванні, сталі замкнёнымі, раздражняльнымі, пастаянна адчувалі страх. «А жыць з вачамі, поўнымі страху,— як справядліва адзначаў былы міністр юстыцыі ў адміністрацыі прэзідэнта Джонсана,— значыць жыць у нешчаслівай краіне».

Прававая дзяржава абвяшчае і канстытуцыйна замацоўвае свабоду людзей і іх роўнасць у правах у якасці прыроджаных уласцівасцей самога чалавека. Такім чынам, дзяржава прызнае аўтаномію асобы ў адносінах да сябе, выключае магчымасць ператварэння грамадзяніна ў свайго вернападданага, у сваю ўласнасць і разглядае як роўнага партнёра. Яна абараняе, ахоўвае ад самавольства правы чалавека, якія становяцца ядром усёй прававой сістэмы. І законы, і іншыя нарматыўныя акты, што зыходзяць ад дзяржавы, знаходзяцца ў адпаведнасці з правамі чалавека, падпарадкаваны прынцыпу іх непарушнасці. Менавіта таму **непахіснасць правоў чалавека, яго гонару і годнасці, яго інтарэсаў, іх абарона і гарантаванасць — яшчэ адзін прынцып прававой дзяржавы.**

Калі ствараліся класічныя канстытуцыйныя акты, напрыклад амерыканскі Біль аб правах, міжнародных стандартаў яшчэ не было. Больш таго, яны складаліся іменна пад уплывам класічных канстытуцый Захаду. Зараз жа на міжнародным узроўні сфармулявана каля 70 асноўных нарматыўных палажэнняў аб правах чалавека, кожнае з якіх можна падзяліць на больш канкрэтныя нормы. На гэтыя высокія міжнародныя стандарты сёння раўняюцца ўсе дзяржавы. Многія з іх уключылі ў свае канстытуцыі палажэнні Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека 1948 г. або спасылаюцца на яе як на адзін з вядучых дакументаў, які абвяшчае правы чалавека ў якасці агульначалавечых каштоўнасцей.

Самаабмежаванне дзяржавы правам, якое замацоўвае свабоду асобы, не з'яўляецца аднабаковай прывілеяй. Асоба згаджаецца на пэўныя абмежаванні і абавязваецца падпарадкоўвацца агульным вызначэнням дзяржавы, а дзяржава, як мы высветлілі, нясе адказнасць за захаванне правоў асобы, гарантуе ёй дастойныя ўмовы жыццядзейнасці. Значыць, у прававой дзяржаве ўсталёўваецца **прынцып узаемнай адказнасці дзяржавы і асобы.** Вось чаму дзяржаве не могуць быць чужыя сацыяльныя праграмы, якія

ідуць на карысць усім грамадзянам. Вось чаму ўсё часцей і часцей гавораць аб прававой сацыяльнай дзяржаве.

Прававая дзяржава (у адрозненне ад неправавой) ажыццяўляе кіраванне грамадствам у нарматыўным парадку, г. зн. праз законы, а не праз індывідуальныя акты — каманды, загады. Вядома, без апошніх грамадству не абысціся, але ў прававой дзяржаве яны зводзяцца да мінімуму, не супярэчаць законам і не выходзяць за іх рамкі. Акрамя таго, самі законы адлюстроўваюць аб'ектыўную неабходнасць, замацоўваюць адносіны ў грамадстве, якія складваюцца натуральна. Такім чынам, крыніцай законаў становіцца грамадзянскае грамадства, а не дзяржава.

Для таго каб законы былі справядлівымі, ажыццяўляліся справядлівымі сродкамі і абараняліся, неабходны эфектыўны кантроль за праваторчасцю, правапрымяненнем і праваабаронай. Гэтаму служыць **прынцып падзелу ўлад.**

Тры галіны ўлады

Прынцып падзелу ўлад — гэта падзел улады паміж органамі дзяржавы — заканадаўчымі, выканаўчымі, судовымі. Гэта азначае, што ні аднаму з дзяржаўных органаў не належыць уся дзяржаўная ўлада ў поўным аб'ёме. Кожны з іх ажыццяўляе толькі сваю, уласцівую яму функцыю і не мае права падмяняць дзейнасць іншага органа. Такое размежаванне накіравана на тое, каб утрымаць уладу ад магчымых злоўжыванняў.

Але пагадзіцеся з тым, што з трох галін дзяржаўнай улады нейкая адна павінна выйсці на першае месца. У адваротным выпадку дзяржаўны механізм будзе паражон нездаровай барацьбой за фактычнае вяршэнства або ператворыцца ў сілу тармажэння. Якая ж з трох галін займае вярхоўнае месца ў прававой дзяржаве? Ёй, вядома ж, з'яўляецца заканадаўчая ўлада. Менавіта яна надзяляе закон асноўнымі напрамкамі ўнутранай і знешняй палітыкі, забяспечвае вяршэнства закона ў грамадстве.

Ва ўсіх прававых дзяржавах заканадаўчая ўлада належыць парламенту (ад французскага слова «гаварыць») — прадстаўнічаму, выбарнаму органу.

У ЗША, напрыклад, парламентам з'яўляецца канграс, ён, як і большасць парламентаў іншых краін, складаецца з дзвюх палат — палаты прадстаўнікоў

і сената. Дэпутаты палаты прадстаўнікоў (усяго 435 чал.) выбіраюцца па тэрытарыяльных акругах і прадстаўляюць роўную колькасць выбаршчыкаў — 520 тыс. чал.

Сенат — раўнапраўны партнёр палаты прадстаўнікоў. У яго выбіраюцца 100 сенатараў — па 2 ад кожнага штата, незалежна ад плошчы штата, колькасці насельніцтва, запасаў прыродных рэсурсаў і фінансавага ўплыву.

Абедзве палаты ўтвараюць камітэты. «Заканадаўцы на пасяджэнні камітэтаў — гэта кангрэс за работай»,— пісаў прэзідэнт Вудра Вільсан. І сапраўды, менавіта ў камітэтах распрацоўваецца і фарміруецца палітыка кангрэса ў пэўных галінах, найбольш старанна вывучаюцца законапраекты, праводзяцца розныя даследаванні з мэтай, напрыклад, устанаўлення, ці праводзяць у жыццё ведамствы прынятае заканадаўства так, як яно было задумана вышэйшым заканадаўчым органам. На падставе атрыманых даных ажыццяўляецца дзейсны кантроль кангрэса за работай выканаўчай улады.

Праводзімыя даследаванні дапамагаюць таксама камітэтам вызначыць галіны, якія патрабуюць заканадаўчых ініцыятыў. Так, у абедзвюх палатах кангрэса ёсць спецыяльныя камісіі па справах састарэлых — для вывучэння ўсяго комплексу праблем, з якімі сутыкаюцца пажылыя амерыканцы.

Законапраекты ў працэсе ператварэння іх у законы могуць паступаць з палаты прадстаўнікоў у сенат і з сената ў палату прадстаўнікоў. Такім чынам выкарыстоўваюцца перавагі «другога чытання». Такая двайная праверка дае магчымасць адной палаце ў нейкай ступені рабіць уплыў на рашэнні другой. Пры гэтым, у выпадку ўзнікнення рознагалоссяў па законапраекту, ён паступае ў пагаджальныя камісіі з мэтай выпрацоўкі з двух варыянтаў законапраекта аднаго, прымальнага для абедзвюх палат. Потым законапраект, прыняты абедзвюма палатамі ў канчатковай форме, прадстаўляецца на подпіс прэзідэнту, пасля чаго ён становіцца законам.

Такая сувязь паміж палатамі дазваляе прымаць глыбока прадуманыя рашэнні. Яна стварае агульную аснову для работы ў палаце прадстаўнікоў і сенаце, умацоўвае супрацоўніцтва. Канчатковым вынікам такога двухбаковага вывучэння прапаноў па закана-

даўству з'яўляецца скарачэнне да мінімуму магчымасці памылак і прыняцця няправільных рашэнняў.

Бягучае жыццё дзяржавы складаецца са шматлікіх актаў рэалізацыі тых норм, якія прыняты заканадаўцамі. Таму тут выстаўляецца на першы план выканаўча-распарадчая галіна ўлады — урад і падпарадкаваныя яму ведамствы. У ЗША — гэта кабінет пры прэзідэнце, які складаецца з кіраўнікоў выканаўчых дэпартаментаў. Усяго 14 членаў кабінета. Кабінет не адказвае перад палатамі кангрэса, які не можа выказаць яму вотум недаверу. Аднак стрымліванне выканаўчай улады дасягаецца, па-першае, тым, што кангрэс зацвярджае большасць назначэнняў, зробленых прэзідэнтам. Па-другое, ён, абапіраючыся на свае кантрольныя функцыі, сочыць за правамернасцю дзейнасці службовых асоб. У яшчэ большай ступені кангрэс выкарыстоўвае свае фінансавыя паўнамоцтвы, уключаючы разгляд асігнаванняў ураду на канкрэтныя мэты.

У Францыі, у адрозненне ад ЗША, урад знаходзіцца ў двайным падпарадкаванні. Яго фарміруе і кантралюе прэзідэнт, але ён нясе адказнасць і перад Нацыянальным сходам (парламентам). Парламент можа выказаць ураду вотум недаверу. У сваю чаргу французскі прэзідэнт мае права роспуску Нацыянальнага сходу.

Існуючыя ў многіх краінах прэзідэнцкія рэспублікі, незалежна ад мадэлі — амерыканскай або французскай, прадугледжваюць наяўнасць выбранага народам «моцнага» прэзідэнта, якому ўручаецца вышэйшая выканаўчая ўлада.

Важную ролю ў барацьбе са злоўжываннямі ёй адыгрывае інстытут імпічмента — прыцягненне да адказнасці прэзідэнта і іншых службовых асоб за парушэнне закона.

У радзе дзяржаў (ФРГ, Італія, Грэцыя, Індыя) прэзідэнты выбіраюцца парламентам або асобай калегіяй з членаў парламента і валодаюць пераважна прадстаўнічымі функцыямі, напрыклад прадстаўляюць дзяржаву ў знешніх зносінах, маюць права памілаваць і да т. п. Яму хоць і належыць права фарміраваць урад, але ён звязаны з расстаноўкай партый у парламенце: можа назначыць кіраўніком урада толькі асобу, якой забяспечана станоўчае галасаванне ў парламенце, гэта значыць, як правіла, лідэра партыі

большасці (інакш урад не атрымае вотуму даверу).

Выканаўца не павінен падмяняць не толькі заканадаўцу, але і суддзю. Ніхто не можа быць суддзёй ва ўласнай справе. Таму грамадзянін у прававой дзяржаве мае права абскардзіць дзеянні выканаўчай улады (як некаторых службовых асоб, так і выканаўча-распарадчых органаў у цэлым) у незалежным судзе. Неяк у Парыжы на пасяджэнні адміністрацыйнага суда разбіраўся іск адной пенсіянеркі да Валеры Жыскар д'Эстэна, у той час прэзідэнта рэспублікі. Калі канцлер ФРГ Г. Коль на сваім аўтамабілі перавышае ў Боне скорасць, а паліцэйскі яго штрафуе — гэта лічыцца ў парадку рэчаў. Незалежнасць суда дасягаецца шляхам назначэння суддзяў або пажыццёва, або на працяглы тэрмін.

Ва ўсіх прававых дзяржавах створаны і Канстытуцыйныя суды, якія забяспечваюць праверку законаў і падзаконных актаў з пункту гледжання іх адпаведнасці Канстытуцыі.

Прававыя дзяржавы сусветнай супольнасці не ідэальныя. Яны складаліся па-рознаму, маюць свае асаблівасці і недахопы. Але ў гэтым працэсе прасочваецца агульная рыса — рух чалавецтва да свабоды, усвядомленае імкненне ўтаймаваць дзяржаву — «Левіяфана», прымусіўшы яе паважаць і абараняць права, гонар і годнасць асобы як вышэйшую каштоўнасць.

Пытанні і заданні

1. Пакажыце, што дзяржава з'яўляецца галоўным звяном палітычнай сістэмы.

2. Растлумачце, чаму дзяржава са слугі грамадства можа ператварыцца ў грознае страшыдла — Левіяфана. Як вы разумееце гэта вобразнае параўнанне?

3. Ахарактарызуйце прынцыпы прававой дзяржавы.

4. Адзін з філосафаў старажытнасці Цыцэрон гаварыў: «Мы можам стаць свабоднымі толькі тады, калі станем рабамі закона». Як вы разумееце гэты выраз? Ці адпавядае ён вашым унутраным перакананням і чаму?

5. Вы з'яўляецеся сведкам спрэчкі двух таварышаў аб прынцыпах прававой дзяржавы. Першы сцвярджае, што галоўным з'яўляецца вяршэнства закона ў грамадстве: Другі лічыць, што прыярытэт належыць прынцыпу непахіснасці свабоды асобы, яе правоў і інтарэсаў, гонару і годнасці. А як лічыце вы?

6. Укажыце, на якія з ніжэйпрыведзеных палажэнняў вы пачалі б абапірацца, перш чым станоўча ацаніць абмяркоўваемы ў грамадстве законапраект. Свой выбар аргументуйце.

а) Узгодненасць у законапраекце інтарэсаў грамадства, сацыяльных груп, асобы.

б) Прыярытэт у ім класавых інтарэсаў над нацыянальнымі.
в) Зацвярджэнне ў законапраекце правоў і свабод асобы.
г) Прыярытэт у ім дзяржаўных інтарэсаў над асабістымі.

7. Адзін з членаў Фінляндскага парламента расказвае: «У нас забаронена апладзіраваць выступаючым, забаронены нападкі на апанентаў. Нельга, напрыклад, сказаць: «Пан Н. ілжэ». Больш пераважна будзе: «Член парламента Н., на жаль, мала выкарыстоўвае праўду ў сваёй прамове» і г. д. Калі мы выступаем, то не персанальна супраць чалавека, а супраць яго лініі».

Ці існуе сувязь паміж прыведзенымі фактамі і працэсам фарміравання прававой дзяржавы? Аргументуйце свой адказ.

8. Пасля Вялікай французскай рэвалюцыі 1789 г. у многіх краінах Еўропы ўзнік суд прысяжных як адказ прадстаўнікам кіруючых класаў на нездавальненне «трэцяга» саслоўя прафесійнымі суддзямі. У такім судзе судовы разбор вядзецца не толькі прафесійнымі суддзямі, але і камісіяй прысяжных — непрафесіяналамі, якім належыць права выносіць канчатковы прыгавор. Цяпер у суда прысяжных ёсць свае прыхільнікі і праціўнікі.

Прывядзём аргументы прыхільнікаў суда прысяжных:

«Прысяжным цалкам чужая тая руціннасць і нерухомасць погляду, якія лёгка выпрацоўваюцца ў карэнных суддзяў у выніку пастаянных кантактаў з крымінальнымі справамі. Ў сумленні прысяжных трэба бачыць лепшы карэктыў для станоўчага закона, лепшы сродак для распазнавання, ці адпавядае дадзены закон існуючаму ў грамадстве правасуддзю. Суд гэты валодае такой незалежнасцю меркаванняў, якіх не мае суд карэнны (прафесійны.— **Рэд.**)».

А вось аргументы праціўнікаў суда прысяжных:

«Прысяжныя залішне падуладныя эмоцыям, не могуць ацэньваць доказы». «Злачынствы становяцца ўсё больш складанымі і заблытанымі, іх разбор патрабуе спецыяльных пазнанняў. У якое становішча мы ставім юрыдычна недасведчаных людзей?»

А які ваш пункт гледжання? Аргументуйце свой адказ.

9. У кангрэсе ЗША 100-га склікання (1987—1988) сярэдні ўзрост кангрэсменаў складаў 51,4 года. Сярэдні ўзрост членаў палаты прадстаўнікоў — 50,7 года, сенатараў — 54,4 года, самаму малодшаму споўніўся 31 год, старэйшаму было 87 гадоў.

Па прафесійнай адзнацы 247 заканадаўцаў былі юрыстамі. 170 членаў кангрэса — спецыялісты банкаўскай справы і бізнесмены, 50 — працавалі ў сферы адукацыі, 25 — спецыялізаваліся ў сельскай гаспадарцы, 28 — былыя журналісты, 5 — інжынеры, 1 — оптаметрыст, 1 — ветэрынар. Акрамя таго, у склад кангрэса ўваходзілі 16 былых губернатараў штатаў, каля 60 былых работнікаў апарату кангрэса, 6 былых прафесіянальных спартсменаў, 1 акцёр, 2 былыя грамадзянскія лётчыкі і 1 былы астранаўт.

Якія вывады вы маглі б зрабіць на падставе аналізу прыведзенай статыстыкі?

§ 29. ПАЛІТЫЧНЫ ПЛЮРАЛІЗМ

На гэту тэму нядаўна ў адной з маладзёжных аўдыторый праводзіўся «круглы стол». Яго ўдзельнікі — юнакі і дзяўчаты, неабыякавыя да інтэлектуальнай працы, да навуковых ведаў у галіне палітыкі. Яны

думаюць, разважаюць, спрачаюцца, імкнучыся разабрацца ў складаных пытаннях. Спадзяёмся, паважаны чытач, што гэта размова за «круглым сталом» вас зацікавіць і вы прымеце ў ёй удзел.

У апошні час усё часцей і часцей пачало ўжывацца слова «плюралізм». Мы чуем і чытаем: «плюралізм форм уласнасці і гаспадарчай дзейнасці», «плюралізм светапоглядаў», «палітычны плюралізм»... Што гэта — новае моднае слова або складаная грамадская з'ява? У чым яго сутнасць?

Пытанне не простае, тым больш што панятце трактуецца неадназначна ў нашай літаратуры. Абапіраючыся на яе, нам трэба будзе абмяняцца думкамі па наступных пытаннях: што такое плюралізм? якая сувязь палітычнага плюралізму з плюралізмам у іншых сферах грамадскага жыцця? што такое шматпартыйнасць? ці садзейнічае развіццё шматпартыйнасці ўдаскаканенню палітычнага плюралізму і дэмакратыі?

Што такое плюралізм?

Аляксандр. Я чытаў, што плюралізм паходзіць ад лацінскага слова «множны».

Відаць, множнасць інтарэсаў, поглядаў, эканамічных і сацыяльна-палітычных інстытутаў — гэта і ёсць плюралізм. Яго антыподам з'яўляецца манапалізм. Напрыклад, манапалізм у нашай краіне ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы: манапольнае права на ўладу, сканцэнтраванае ў руках партыйна-дзяржаўнай вярхушкі; панаванне дзяржаўнай уласнасці, якая абвяшчалася агульнанароднай, але поўнасцю была падпарадкавана адміністрацыйна-бюракратычнаму апарату; непадзельнае панаванне адной ідэалогіі. У гэтых умовах крытычны разгляд многіх з'яў расцэньваўся як ачарненне, з навешваннем нярэдка палітычных ярлыкоў, праследаваўся ўладамі. Яскравы прыклад таму жыццё выдатнага вучонага, чалавека і грамадскага дзеяча — Андрэя Дзмітрыевіча Сахарава.

Алена. Так, манапалізм страшны яшчэ і таму, што ў чалавека практычна адсутнічае свабода выбару паводзін у грамадстве. Думай, як усе! Рабі, як усе! І гэта становіцца нормай, якая вызначае твае паводзіны. У мяне манапалізм асацыіруецца з тэатрам. На сцэне рухаюцца і падаюць рэплікі ключавыя фігуры п'есы: генеральныя сакратары, прэзідэнты, міністры і вузкае кола блізкіх ім асоб. Асноўнае ж насельніцтва займае месцы гледачоў. Месцы аплачаны, што

дае права выказваць сваю думку, як правіла, бурнымі апладысментамі. Менавіта таму я — за плюралізм, г. зн. за шматаблічнасць грамадскага жыцця, яго неаднолькавасць, за прызнанне разнастайных інтарэсаў і светапоглядаў людзей, за стымуляванне, напрыклад, у эканоміцы нашай краіны фермерскай гаспадаркі, арэнды, акцыянерных форм арганізацыі прадпрыемстваў і інш. Але думаю, што плюралізм не проста шматграннасць думак, розных пунктаў погляду і інш., як лічыць Саша. Бо, калі прытрымлівацца яго логікі, то тады прыйдзецца прызнаць, што і ў перыяд застою наша грамадства было плюралістычным. На самай справе, існавалі розныя міністэрствы, ведамствы, прадпрыемствы, грамадска-палітычныя арганізацыі, класы, сацыяльныя групы. Думаецца, што для плюралізму адной разнастайнасці думак, пунктаў погляду і інш. недастаткова. Відаць, паняцце «плюралізм» уключае і іншыя прыметы.

Вядучы. Як мы бачым, дыскусія аб плюралізме — гэта не проста спрэчка аб словах. Гутарка ідзе аб двух процілеглых прынцыпах арганізацыі грамадства — плюралістычным і манапалістычным. Выступаючыя сышліся на думцы, што плюралізм, у адрозненне ад манапалізму, прадугледжвае прызнанне **множнасці, разнароднасці элементаў грамадства ў якасці крыніцы грамадскага прагрэсу, а таксама стымуляванне шматграннасці грамадскага жыцця.** Не забароны, не праследаванні, а заахвочванне развіцця разнастайных відаў уласнасці, новых грамадскіх арганізацый, палітычных партый, культурных устаноў і інш., як сказала Лена,— важнейшае праяўленне плюралізму.

Разам з тым у дыскусіі выявіліся процілеглыя пункты гледжання. Саша атаясамлівае паняцце «плюралізм» з множнасцю ідэй, поглядаў, эканамічных, сацыяльна-палітычных інстытутаў і г. д. Дарэчы, такая трактоўка гэтага паняцця шырока распаўсюджана ў літаратуры.

Алена, угледзеўшы ў Сашыных разважаннях супярэчнасць, лічыць, што паняцце «плюралізм» больш шырокае, якое ўключае рад узаемазвязаных прымет. Якая ж думка іншых удзельнікаў дыскусіі?

Сяргей. На маю думку, для плюралізму як прынцыпу арганізацыі грамадства (сацыяльнай арганізацыі) неабходна, каб разнастайныя грамадскія структуры, ідэі былі **раўнапраўнымі і адносна самастой-**

нымі. На самай справе, мы ведаем, што ў нашай краіне існавалі, напрыклад, дзяржаўная і калгасна-кааператыўная формы ўласнасці, гэта значыць была «разнастайнасць» («множнасць») у эканоміцы. Але менавіта таму, што дзяржаўная ўласнасць лічылася асноўнай, прыярытэтнай, а не раўнапраўнай з уласнасцю калгасна-кааператыўнай, апошняя адсоўвалася на другі план, развівалася вельмі слаба.

Або, скажам, грамадскія арганізацыі: прафсаюзы, камсамол, творчыя саюзы (пісьменнікаў, кампазітараў, архітэктараў, мастакоў). Думаецца, што ў выпадку прадастаўлення ім адноснай аўтаноміі (самастойнасці) і роўных правоў з дзяржавай, яны змаглі б стаць базай для развіцця грамадзянскага грамадства і як раўнапраўныя партнёры дзяржаўных органаў садзейнічалі б пошуку аптымальных шляхоў развіцця грамадства. Замест гэтага грамадскія арганізацыі ператварыліся ў «рычагі», «прывадныя пасы» партыйна-дзяржаўных структур, што прывяло да застою.

Такім чынам, толькі адносная самастойнасць і раўнапраўе разнародных элементаў грамадства даюць магчымасць уступаць ім у канкурэнтную барацьбу аднаго з адным, садзейнічаючы тым самым грамадскаму прагрэсу.

Таццяна. Я згодна з тым, што адносная самастойнасць (аўтаномнасць) і раўнапраўе разнастайных элементаў грамадства з'яўляюцца яшчэ адной прыметай плюралізму. Кожная грамадская структура, напрыклад палітычная партыя, павінна даказваць сваю прагрэсіўную ролю не з дапамогай прававых і іншых прывілей, а шляхам дасягнення большай эфектыўнасці. Хачу асабліва падкрэсліць, што дзякуючы прадастаўленню кожнаму грамадскаму інстытуту (напрыклад, прадпрыемству), кожнаму грамадзяніну роўнай самастойнасці ў вызначэнні сваіх мэт і дзеянняў у грамадстве, па-першае, ствараецца спрыяльная абстаноўка для творчасці, ініцыятывы, пошукў альтэрнатыўных шляхоў развіцця; па-другое, узнікае «здаровая» канкурэнтная барацьба паміж грамадскімі інстытутамі, яна — свайго роду гарантыя супраць злоўжывання ўладай.

Аляксандр. А па-мойму, мы вельмі перабольшваем ролю барацьбы. Барацьба — гэта размежаванне, узаемныя абвінавачанні і пагрозы, спробы асобных груп выдаць любую сваю «ініцыятыву» і думку за адзіна

правільную, імкненне навязаць яе грамадству ва ультыматыўнай форме, байкоты інтарэсаў і аргументаў іншага боку.

Нядаўна мне давялося пабываць на мітынгу. Хацеў паназіраць «галоснае супастаўленне думак», як абяцалі арганізатары гэтага мітынгу. А што было на самай справе? Спрацоўваў прынцып размежавання — «мы — яны», «так — не», «адмаўляем — адабраем»...

Вядучы. Так, на жаль, трэба прызнаць, што многія мітынгі нецывілізаваныя, калі шукаюць «ворага» або ствараюць «вобраз ворага», якога кляймяць, не саромячыся ў выразах.

Але, Саша, мы ж ведаем, што барацьба можа весціся ў розных формах. Грамадзянская вайна, напрыклад, або тэрарыстычныя акты — гэта насільныя формы вырашэння канфліктаў. Калі ж гутарка ідзе аб плюралізме, то маюцца на ўвазе, відаць, іншыя спосабы вырашэння канфліктаў, супярэчнасцей. Ці не так?

Сяргей. Я якраз і хацеў падкрэсліць, што гутарка ідзе менавіта аб «здаровай» канкурэнцыі (саперніцтве) паміж элементамі грамадства. Плюралізм прадугледжвае вырашэнне канфліктаў (супярэчнасцей) абавязкова **ў рамках закона.** Тут я бачу сувязь плюралізму з прававой дзяржавай...

Таццяна. І яшчэ з дэмакратычным грамадствам, паколькі плюралізм прадугледжвае таксама адмову ад **дыктатуры і насілля,** гэта значыць вырашэнне канфліктаў мірнымі спосабамі, прызнанне народнага суверэнітэту, забеспячэнне правоў і свабод асобы.

Вядучы. Ну, а якія ж мірныя цывілізаваныя формы вырашэння супярэчнасцей (у тым ліку канфліктаў) у грамадстве?

Алена. Вучоныя адносяць да іх наступныя: **цярпімасць да апанентаў** (праціўнікі ў публічнай гутарцы, дыскусіі і г. д.); **гатоўнасць да кампрамісаў, пошук кансенсуса** (згоды). Гэтыя формы на Захадзе называюць яшчэ «дэмакратычнымі правіламі гульні».

Аляксандр. Калі мы ўжо загаварылі пра Захад і «дэмакратычныя правілы гульні», то ў гэтай сувязі, з майго пункту гледжання, вялікую цікавасць для нас мае асоба 41-га прэзідэнта ЗША Джорджа Буша. Ёсць такі афарызм: «Чалавек — гэта стыль». Я чытаў, што Дж. Буш у выпадках, калі трэба выпрацаваць альтэрнатывы для вырашэння важнага пытання або атрымаць аб'ектыўную ацэнку сітуацыі, запрашае сваіх

саветнікаў і экспертаў для ўдзелу ў групавых дыскусіях. Гэтыя сустрэчы ён праводзіць дэмакратычна, не навязвае свой пункт гледжання, а, наадварот, стварае ўсе ўмовы для творчага, адкрытага абмену думкамі. Людзі з яго асяроддзя заўважылі, што Буш асабліва ўважліва прыслухоўваецца да думкі апанентаў, імкнецца лепш усвядоміць іх пазіцыю і знайсці рацыянальнае зерне ў іх крытычных заўвагах.

Стараннае захаванне «джэнтльменскіх правілаў» Дж. Буш прыўнёс у галіну знешняй палітыкі, лічачы, што не ўсе сродкі добрыя для дасягнення мэты. Ён прыхільнік тых, хто хоча рабіць палітыку «чыстымі рукамі». Пішуць, што ўсе яго паводзіны заснаваны на стратэгіі партнёрства, а ў роўным партнёрстве не бывае ні пераможцаў, ні пераможаных.

Дарэчы, нядаўна выйшла яго кніга «Гледзячы ў будучыню». Гэта палітычная біяграфія. У ёй шмат цікавага і павучальнага, асабліва для тых, хто хоча сур'ёзна далучыцца да «вялікай» палітыкі.

Вядучы. Па-мойму, вельмі цікавая і змястоўная інфармацыя. Дзякуй, Саша.

А зараз паспрабуем абагульніць сказанае. Мы высветлілі, што плюралізм — складаная грамадская з'ява, прынцып сацыяльнай арганізацыі, антыпод манапалізму. Плюралізм характарызуецца сукупнасцю наступных прымет: прызнанне множнасці, разнароднасці элементаў грамадства ў якасці крыніцы грамадскага прагрэсу; стымуляванне разнастайнасці грамадскага жыцця шляхам стварэння канкурэнцыі і апазіцыі; раўнапраўнасць і адносная аўтаномнасць усіх элементаў грамадства; вырашэнне грамадскіх супярэчнасцей (канфліктаў) у цывілізаваных формах — талерантнасць, кампрамісы, кансенсус і г. д.

Гэтыя прынцыпы могуць праяўляцца ва ўсіх сферах жыцця грамадства, таму гавораць аб плюралізме эканамічным, сацыяльным, палітычным і г. д.

Дзякуючы плюралізму ў грамадстве ствараецца неабходная сістэма стрымлівання і процівагаў, баланс паміж разнастайнымі элементамі, якія, канкуруючы ў цывілізаваных формах адзін з адным, развіваюцца самі і садзейнічаюць сацыяльнаму прагрэсу ў цэлым.

Прывядзіце факты, якія пацвярджаюць гэта палажэнне.

Аляксандр. Возьмем, напрыклад, экалагічныя рухі, накіраваныя супраць абураючага самавольства міні-

стэрстваў і ведамстваў, якія вынішчаюць у імя «вала» прыроду, а разам з ёй і людзей. Ужо цяпер у актыве экалагічных рухаў непрыманне «праекта веку» — перакідкі паўночных рэк, спыненне будаўніцтва рада электрастанцый у густанаселеных раёнах і іншыя ініцыятывы. Але дай волю некаторым «зялёным», яны былі б не супраць прымусіць грамадства выпрацоўваць электраэнергію толькі з дапамогай ветракоў. Ім, значыць, таксама патрэбны разумныя абмежаванні. Думаю, што Кабінет міністраў СССР, напрыклад, закліканы распрацоўваць агульнасаюзныя эканамічныя праграмы, і Саветы народных дэпутатаў, якія ажыццяўляюць уладу на месцах,— гэта палітычныя процівагі «зялёных». Яны не павінны ігнараваць каштоўныя прапановы экалагічных рухаў. Наадварот, ім трэба шляхам узгаднення розных пунктаў гледжання прыйсці да кансенсуса для таго, каб абясшкодзіць навакольнае прыроднае асяроддзе, а значыць, і жыццё чалавека.

Алена. Напэўна, стрымліваючыя інстытуты не заўсёды могуць належаць да адной сферы дзейнасці, як у прыкладзе Аляксандра. Так, манаполію вытворцы прадукцыі можна абмежаваць не толькі канкурэнцыяй іншых вытворцаў, але і выкарыстоўваючы антытрэстаўскае заканадаўства, кантроль з боку прафсаюзаў, таварыстваў спажыўцоў, падатковую палітыку. Гэта робіцца ў многіх краінах, а зараз часткова і ў нас.

Таццяна. У тваім прыкладзе, Лена, прасочваецца ўзаемасувязь эканомікі і палітыкі. Я лічу, што плюралізм у эканоміцы і сацыяльнай сферы немагчымы без плюралізму палітычнага, на якім базіруецца прававая дзяржава. Сапраўды, ва ўмовах пачатага пераходу да рыначнай эканомікі менавіта эфектыўны дэмакратычны кантроль, як казала Алена, здольны прадухіліць з'яўленне паразітуючых сацыяльных груп. Менавіта ён здольны забяспечыць прыкладную роўнасць магчымасцей грамадзян у праяўленні сваіх здольнасцей і працавітасці, ініцыятывы і прадпрымальнасці, паступовую адмову ад ураўнілаўкі ў аплаце працы. У сваю чаргу развіццё палітычнага плюралізму немагчыма без плюралізму духоўнага. Думаю, што кожнаму з нас і грамадству ў цэлым трэба будзе яшчэ вызваліцца ад догмаў і забабонаў, замшэлых стэрэатыпаў.

Вядучы. Мы разгледзім праяўленні і ўзаемасувязь плюралізму ў розных сферах грамадскага жыцця. Прыметы (прынцыпы) плюралізму маюць агульначалавечы

характар. Усе ж людзі зацікаўлены ў большай свабодзе мэт і дзеянняў, у мірным вырашэнні ўзнікаючых грамадскіх супярэчнасцей, у сацыяльным прагрэсе. Таму плюралізм, у тым ліку палітычны, разам з прававой дзяржавай, з'яўляецца універсальным дасягненнем цывілізацыі, агульначалавечай каштоўнасцю.

Важнейшым праяўленнем палітычнага плюралізму, аб якім гутарка ідзе ніжэй, з'яўляецца шматпартыйнасць. Што ж такое шматпартыйнасць?

Што такое шматпартыйнасць?

Таццяна. Усё вельмі проста. Шматпартыйнасць — гэта значыць многа партый. Чым іх больш, тым больш дэмакратычная палітычная сістэма. Выбаршчыкам ва ўмовах шматпартыйнасці даецца магчымасць шырокага выбару паміж праграмамі кандыдатаў, якія прадстаўляюць тую або іншую партыю. А паміж самімі партыямі ўзнікае вострая канкурэнтная барацьба за ўладу.

Сяргей. А па-мойму, шматпартыйнасць узнікае пры наяўнасці больш чым адной партыі. Не магу згадзіцца з тым, што крытэрыем дэмакратызму з'яўляецца мноства партый. Бо, калі іх колькасць перавышае нейкую аптымальную велічыню, любыя дэмакратычныя выбары (прэзідэнцкія, парламенцкія, муніцыпальныя) прыводзяць да драбнення галасоў выбаршчыкаў, да неабходнасці паўторных галасаванняў і выбараў, а галоўнае — да непазбежнасці кааліцыйных форм улады. Гэтыя формы вызначаюцца няўстойлівасцю і недаўгавечнасцю. Узяць хоць бы, напрыклад, гісторыю пасляваеннай Італіі. Кіруючыя кааліцыі, што змяняюць адна адну, жывуць там ад крызісу да крызісу, пасля чаго адбываюцца выбары, якія зноў-такі не даюць перавагі ні аднаму з удзельнікаў выбарчай барацьбы.

Таццяна. Значыць, Сяргей, ты супраць шматпартыйнасці, адмаўляеш права грамадзян на аб'яднанне ў партыі як форму выяўлення сваіх інтарэсаў, свабоднай думкі?

Сяргей. Зусім не. Я за шматпартыйнасць; супраць таго, каб штучна стрымліваць рост узнікаючых, напрыклад, у нашай краіне партый і нефармальных арганізацый, якія прэтэндуюць на гэту ролю. Працэс складвання шматпартыйнасці — аб'ектыўны. Ён адлюстроўвае пэўныя грамадскія патрэбнасці — гранічна шырокі спектр палітычных поглядаў людзей. Але выступаю супраць таго, каб, як я ўжо сказаў, лічыць

мноства гэтых партый крытэрыем дэмакратыі, а кааліцыйную ўладу ідэалам палітычнага плюралізму. Ты ж гэта мела на ўвазе?

Таццяна. Увогуле, так.

Вядучы. Паспрабуем разабрацца ў гэтым складаным пытанні. У навуцы сапраўды шматпартыйнасць часцей за ўсё вызначаецца як наяўнасць у грамадстве больш за адну партыю. Але трэба адрозніваць **шматпартыйнасць як грамадскую з'яву,** гэта значыць існаванне ў той або іншай краіне больш за адну партыю, і **шматпартыйнасць** (або двухпартыйнасць) **як сістэму партыйнай улады,** гэта значыць непасрэдны ўдзел партый у выбарчых кампаніях і дзейнасць прадстаўнікоў гэтых партый у органах улады.

Возьмем, напрыклад, ЗША. Там множнасць партый. Ёсць Сацыялістычная партыя, Сацыял-дэмакратычная, Камуністычная, Дэмакратычная, Рэспубліканская і г. д.— гэта значыць існуе шматпартыйнасць. У заходніх краінах еўрапейскага кантынента, напрыклад у Францыі, таксама множнасць партый. Яны — база грамадзянскага супольніцтва, садзейнічаюць развіццю дэмакратыі. Але пры наяўнасці мноства партый у ЗША толькі дзве апошнія — Дэмакратычная і Рэспубліканская, як вы ведаеце, уключаюцца ў барацьбу за ўладу. Пры гэтым адна з партый — заўсёды на чале ўлады; другая — у апазіцыі. Так склалася двухпартыйная сістэма палітычнай улады ў Амерыцы.

У Францыі, ФРГ, Італіі і іншых заходніх краінах еўрапейскага кантынента існуе шматпартыйная сістэма. Там, у адрозненне ад ЗША, у барацьбе за ўладу ўдзельнічаюць не дзве, а некалькі з дзеючых у краіне буйных партый. У Францыі, напрыклад, гэта рух «Аб'яднанне ў падтрымку рэспублікі», «Саюз за французскую дэмакратыю», «Французская сацыялістычная партыя» і інш. Гэтыя партыі ўтвараюць у вышэйшых органах улады блок і кааліцыі.

Многія палітолагі лічаць, што толькі пры развітой шматпартыйнай сістэме можна забяспечыць больш свабоднае волевыяўленне грамадзян, хоць, вядома, магчымы непажаданыя змяненні тых ці іншых кіруючых кааліцый.

Іншыя мяркуюць, як і Сяргей, што аптымальнай з'яўляецца двухпартыйная сістэма, таму што любы выбаршчык (незалежна ад узроўню сваёй адукацыі) заўсёды можа зрабіць просты выбар «за» або «су-

праць» той адной партыі, якая знаходзіцца на чале ўлады.

Давайце разам падумаем, калі пры двухпартыйнай сістэме толькі адна з партый стаіць ва ўладзе, то чым гэта сістэма адрозніваецца ад аднапартыйнай.

Аляксандр. Яна адрозніваецца, па-першае, тым, што ў кіруючай партыі заўсёды ёсць крытыкі, сапернікі, апаненты, якія не даруюць ёй памылак; і па-другое, тым, што партыя не зліта з органамі ўлады (як гэта да нядаўняга часу лічылася нармальным, напрыклад, у нас).

Алена. Але, заваяваўшы ўладу, партыя, якая перамагла на выбарах, атрымлівае права замясціць тыя або іншыя дзяржаўныя пасады сваімі прыхільнікамі, праз якіх і праводзіць сваю палітыку.

Аляксандр. Так і павінна быць. Інакш цяжка было б ажыццяўляць уладу, аб чым гаварыў Сяргей. Аднак ва ўмовах шматпартыйнасці кіруючая партыя праводзіць сваю палітыку не ў распуснай абстаноўцы палітычнага манапалізму, а ва ўпартай барацьбе з прадстаўнікамі іншых палітычных сіл. Мы ж ведаем, што выканаўчая ўлада дзейнічае ў такіх краінах пад кантролем улады заканадаўчай, у проціборстве з ёй, а ў заканадаўчых органах заўсёды тая або іншая колькасць мандатаў у руках апазіцыйных партый. Гэта і ёсць сістэма процівагаў, якія характарызуюць плюралізм.

Таццяна. Думаю, што і двухпартыйная і шматпартыйная сістэмы палітычнай улады, безумоўна, з'яўляюцца прагрэсіўнымі, лепшымі за аднапартыйную. Але і яны не ідэальныя. Плюралізм жа, акрамя процівагаў, як мы высветлілі, прадугледжвае роўнасць магчымасцей. Па-мойму, для многіх краін Захаду характэрны няпоўны, частковы палітычны плюралізм. Там фармальна правы ўсіх партый роўныя. Але на справе кандыдаты малых партый, гэтаксама як і незалежныя кандыдаты, не маюць магчымасці шырока выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі для прапаганды сваіх ідэй. Скажам, у час прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 1980 г. у ЗША Дж. Картэр і Р. Рэйган выдаткавалі 18 млн долараў толькі на тэлевізійную рэкламу. Невялікая партыя наўрад ці мае такія сродкі. Невыпадкова палітычнай арэнай (пры наяўнасці множнасці партый) авалодваюць буйныя традыцыйныя партыі, якія чаргуюцца на чале ўлады.

Алена. Я згодна з Таццянай у тым, што ў многіх

краінах Захаду выпрацаваны механізм шматпартыйнасці яшчэ не ідэальны, мае істотныя недахопы. Да іх я яшчэ аднесла б наяўнасць «груп націску», або лобі. У ЗША, напрыклад, шматлікія лабісцкія арганізацыі аказваюць націск на кангрэс і ўрад. Нездарма іх называюць трэцяй палатай амерыканскага кангрэса. Творцы амерыканскай канстытуцыі разлічвалі, што сістэма падзелу ўлад будзе надзейнай гарантыяй ад празмернага ўплыву лабісцкіх арганізацый. Аднак, на жаль, да сённяшняга дня яны дастаткова моцныя, напрыклад нафтавае лобі ў ЗША. Сенатар Лонг, чыя сям'я ўклала буйныя сродкі ў нафтавую прамысловасць, у 70-я гг. з'яўляўся старшынёй фінансавага камітэта кангрэса і садзейнічаў прыняццю заканадаўстваў, якія абараняюць правы нафтавых магнатаў. А сенатар Л. Олдс у 1949 г. быў зняты з пасады старшыні фінансавага камітэта, паколькі актыўна выступаў за дзяржаўнае рэгуляванне цэн на нафту і газ.

У той жа час, нягледзячы на недахопы функцыяніравання двух- і шматпартыйнай сістэм у краінах Захаду, думаю, што ігнараваць іх вопыт нельга, тым больш што гэтыя сістэмы пастаянна ўдасканальваюцца.

Сяргей. Безумоўна, дзейнасць лабісцкіх арганізацый, наяўнасць партый, якія маюць выгады і перавагі, парушаюць прынцып роўных магчымасцей. Але парушэнне ўзгаднення паміж уладай і грамадскай думкай часта ліквідуецца за кошт з'яўлення «новых сацыяльных рухаў» — жаночага, экалагічнага, маладзёжнага. У апошні час у заходніх краінах з'явіліся групы спажыўцоў, групы па ахове навакольнага асяроддзя і г. д., якія садзейнічаюць нейтралізацыі груп прадпрымальнікаў. Гэтыя арганізацыі асабліва распаўсюджаны ў Швецыі, Аўстрыі, Нідэрландах. Яны садзейнічаюць складванню сістэмы так званага «сацыяльнага партнёрства». Таму я падзяляю думку Лены пра тое, што ігнараваць вопыт функцыяніравання шматпартыйных сістэм, які склаўся на Захадзе, нельга.

Вядучы. Такім чынам, мы ўсе сышліся на думцы, што шматпартыйнасць у краіне — прымета плюралізму. Дзякуючы ёй развіваюцца і ўдасканальваюцца грамадзянскае супольніцтва, палітычны плюралізм і дэмакратыя.

Нягледзячы на недахопы двух- або шматпартыйнай сістэмы палітычнай улады, ігнараваць вопыт заходніх дэмакратый немэтазгодна, таксама як і поўна-

сцю капіраваць яго. Відаць, толькі ўзаемнае ўзбагачэнне палітычнага вопыту ўсіх краін сучаснай цывілізацыі — надзейны шлях да дасягнення палітычнага плюралізму.

Пытанні і заданні

1. Растлумачце, чаму шматпартыйнасць з'яўляецца неад'емным элементам плюралізму.

2. Як вы разумееце поўны і частковы (няпоўны) палітычны плюралізм?

3. Дж. Вашынгтон, бацька-заснавальнік амерыканскай дзяржаўнасці, выступаў супраць палітычных партый як выразнікаў супярэчнасцей у грамадстве. «Яны толькі бударажаць грамадства неабгрунтаванымі спрэчкамі»,— гаварыў ён. А які ваш пункт гледжання? Свой адказ растлумачце.

4. Ці правільнае, з вашага пункту гледжання, наступнае меркаванне: «Няма сэнсу штучна фарсіраваць працэс шматпартыйнасці, гэтаксама як і ствараць для яго юрыдычныя і іншыя перашкоды»? Аргументуйце свой адказ.

5. Падумайце, у якіх выпадках партыйна-палітычны плюралізм можа ўзмацніць анархію ў грамадстве. Прывядзіце прыклады.

6. Як вы думаеце, ці трэба адчыняць дзверы ў наша легальнае жыццё тым арганізацыям, якія ў сваіх праграмах заклікаюць да змянення грамадскага ладу без насілля? Свой адказ абгрунтуйце.

7. Вызначце асноўныя этапы дыскусіі. Якія пытанні, меркаванні выклікалі ў вас найбольшую цікавасць і чаму?

8. Хто з удзельнікаў дыскусіі, з вашага пункту гледжання, лепш за ўсіх справіўся з задачай калектыўнага абмеркавання? Свой адказ растлумачце.

9. Як вы ацэньваеце свой удзел у дыскусіі і ўдзел у ёй сваіх таварышаў? Растлумачце чаму.

10. Падрыхтуйце невялікае паведамленне: «Палітычны партрэт А. Дз. Сахарава».

§ 30. ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ

Кожная краіна характарызуецца, як падкрэслівалася раней, сваім «палітычным кліматам», палітычным парадкам, які складаецца ў выніку ўзаемадзеяння ўсіх кампанентаў палітычнай сістэмы: палітычных норм, інстытутаў, палітычнай культуры. Самым прагрэсіўным з усіх існуючых рэжымаў з'яўляецца дэмакратычны рэжым.

Што такое дэмакратыя?

Калі б паэты пісалі оды аб дэмакратыі, то яны б, напэўна, параўналі яе з легендарнай птушкай Фенікс, якую сто разоў спальвалі, але яна зноў і зноў адраджалася з попелу і кожны раз у больш дасканалым выглядзе. Тэрмін «дэмакратыя» перакладаецца з грэчаскай мовы як «улада народа». Яе асноватворнымі

прынцыпамі з'яўляюцца народаўладдзе, роўнасць і свабода асобы. Гэтыя прынцыпы замацаваны сёння ва ўсіх канстытуцыях дэмакратычных краін.

У прэамбуле канстытуцыі Французскай Рэспублікі (1958) гаворыцца: «Французскі народ урачыста абвяшчае сваю прыхільнасць да правоў чалавека і прынцыпаў нацыянальнага суверэнітэту».

«Чалавечая годнасць непарушная. Паважаць і абараняць яе — абавязак усякай дзяржаўнай улады» — артыкул 1 Асноўнага закона ФРГ.

«Дзяржаўная ўлада грунтуецца на непахісным даверы народа, яе аўтарытэт зыходзіць ад народа, яе паўнамоцтвы ажыццяўляюцца пры дапамозе народа, а плёнам яе карыстаецца народ. Гэты прынцып агульны для ўсяго чалавецтва» — з прэамбулы канстытуцыі Японіі.

«Уся ўлада ў СССР належыць народу» — артыкул 2 Канстытуцыі СССР (1977).

Здавалася б, усё зразумела: замацавалі ў Канстытуцыі народаўладдзе, правы і свабоды асобы — і вось яна дэмакратыя. У рэальнай рэчаіснасці, у жыцці ўсё больш складана. Практыка паказала, што для ажыццяўлення сапраўднай (а не фармальнай) улады народа, яго магчымасці ўплываць на палітычныя рашэнні і дзеянні дзяржавы неабходна стварыць у грамадстве пэўныя ўмовы. Да іх адносяцца: сапраўды свабодныя і роўныя выбары ў парламент, гарантаванасць на справе правоў меншасці і правоў грамадзян, у тым ліку права на іншадумства, актыўная дзейнасць разнастайных недзяржаўных арганізацый як раўнапраўных партнёраў дзяржавы, свабодная прэса, вопыт (уменні) грамадзян пісьменна і эфектыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці.

Звярніце ўвагу на гэтыя ўмовы. Яны непасрэдна звязаны з функцыяніраваннем прававой дзяржавы, развіццём палітычнага плюралізму, фарміраваннем палітычнай культуры асобы і ў сукупнасці ўтвараюць дэмакратычны рэжым. Дэмакратыю таму нярэдка называюць спосабам арганізацыі палітычнай сістэмы.

Сапраўдная палітычная дэмакратыя не можа існаваць без эканамічнай свабоды.

Ва ўсіх дэмакратычных краінах менавіта свабодная эканамічная дзейнасць на аснове разнастайных форм уласнасці садзейнічае дыферэнцыяцыі разнастайных сацыяльных інтарэсаў, узнікненню недзяржаўных арганізацый, развіццю палітычнага плюралізму.

Значыць, дэмакратыя — гэта не толькі спосаб арганізацыі палітычнай сістэмы, але і ўсяго жыцця грамадства.

Ці з'яўляюцца парламентарыі «слугамі народа»?

Дэмакратыя як народаўладдзе бывае прадстаўнічай і непасрэднай. Непасрэдная дэмакратыя — гэта прамое выяўленне асобай сваіх інтарэсаў. Праз рэферэндумы, мітынгі, забастоўкі і г. д. грамадзянін аказвае непасрэдны ўплыў на палітычныя рашэнні і дзеянні дзяржаўных органаў і службовых асоб.

Прадстаўнічая дэмакратыя выражаецца ў тым, што грамадзяне ўдзельнічаюць ў палітыцы не напрамую, а праз сваіх прадстаўнікоў, дэпутатаў.

Класічнай формай прадстаўнічай дэмакратыі з'яўляецца парламенцкая дэмакратыя. Парламентарызм закліканы забяспечыць усім аднолькавыя магчымасці ў выбранні прадстаўнікоў улады. На тых, каго выбралі, ускладаецца абавязак прадстаўляць волю і інтарэсы народа, які іх вылучыў.

Разгледзім механізм рэалізацыі парламенцкай дэмакратыі.

Выбары ў парламент праводзяцца па выбарчых акругах. Амерыканскі кангрэс, напрыклад, кожныя дзесяць гадоў даручае заканадаўцам штатаў перагляд граніц выбарчых акруг з тым, каб выявіць змяненні ў колькасным складзе жыхароў. Гэта ўлічваецца для таго, каб кожны кангрэсмен прадстаўляў прыкладна аднолькавую колькасць выбаршчыкаў. Такая практыка існуе і ў іншых дэмакратычных краінах.

Пераважнае права вылучэння кандыдатаў належыць палітычным партыям. Для таго каб дабіцца поспеху на выбарах, партыя павінна ўлічваць інтарэсы не толькі нейкага аднаго класа або сацыяльнага слоя, але цэлага блока сіл.

Партыі, выпрацоўваючы перадвыбарную праграму, свой варыянт палітыкі, старанна вывучаюць запыты розных сацыяльных груп. Асабліва вялікіх поспехаў у гэтым плане дабіліся сацыял-дэмакраты Швецыі. Знаходзячыся на чале ўлады больш за паўстагоддзя, яны не толькі ўлічваюць патрабаванні галіновых і рэгіянальных прафсаюзаў (калектыўных членаў партыі), але і бачаць перад сабой малюнак усяго грамадства, патрэбы і нястачы ўсіх сацыяльных груп, і не ў апошнюю чаргу, асабліва сацыяльна неабароненых. Адсюль і

шматгадовыя намаганні па стварэнню развітой сістэмы сацыяльнай абароненасці, рэгулюемай дзяржавай.

Пасля вылучэння сваіх кандыдатаў партыя ім аказвае падтрымку ў канкурэнтнай барацьбе з кандыдатамі ад іншых партый. Вялікую дапамогу ў гэтай рабоце ёй аказваюць арганізацыі, аб'яднанні, клубы выбаршчыкаў, у тым ліку маладзёжныя студэнцкія арганізацыі.

У фарміраванні Французскай сацыялістычнай партыі таксама адыгралі велізарную ролю маладзёжныя палітычныя клубы, многія з якіх потым увайшлі ў яе склад. «Добраахвотнікі», прыцягнутыя да ўдзелу ў выбарчай кампаніі, вядуць пастаянную работу па наладжванню кантактаў дэпутата з выбаршчыкамі: арганізуюць сходы, мітынгі, распаўсюджваюць матэрыялы, звоняць па тэлефоне, пасылаюць пісьмы і г. д. Гэта робіцца ва ўсіх класічных еўрапейскіх масавых партыях, якія маюць пастаяннае членства. Такім чынам, палітычныя партыі, з'яўляючыся часткай грамадзянскай супольнасці, цесна звязаны з выбаршчыкамі і забяспечваюць сваім кандыдатам падтрымку на выбарах.

У ЗША прыхільнікам Рэспубліканскай або Дэмакратычнай партыі, які не мае пастаяннага партыйнага членства, можа аб'явіць сябе любы амерыканец. Для правядзення перадвыбарнай кампаніі створаны спецыяльны Інстытут практычнай палітыкі. Ён — памочнік кандыдата ў дэпутаты. Супрацоўнікі гэтага інстытута — спецыялісты рознага профілю: адны займаюцца тэхнічнымі пытаннямі (напрыклад, забеспячэннем машынкамі, паперай, камп'ютэрамі), другія — арганізацыяй сустрэч з выбаршчыкамі, трэція — аналізам іх вынікаў. Але і пры амерыканскім варыянце да актыўнага ўдзелу ў выбарчай кампаніі прыцягваецца вялікая колькасць грамадзян — «аматараў».

Выбары, у ходзе якіх выбаршчыкі выносяць свой прыгавор, з'яўляюцца праверкай поспеху або няўдачы дзейнасці партый. У перыяд паміж выбарамі адбываецца свайго роду дыялог партый і выбаршчыкаў, калі адзін бок (партыя) спрабуе пераканаць другі (выбаршчыка) у тым, што менавіта яна найлепшым чынам адлюстроўвае яго інтарэсы. Выбаршчыкі ў сваю чаргу праз механізм адваротнай сувязі ўздзейнічаюць на змест партыйнай палітыкі, дабіваюцца яе карэкціроўкі ў тым або іншым напрамку.

Дэпутаты, выбраныя ў парламент ад кожнай партыі, утвараюць парламенцкія фракцыі, або, як іх іншы раз называюць, парламенцкія партыі. Члены той партыі, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў на выбарах,— пераможцы. Яны з'яўляюцца членамі партыі большасці і праводзяць у парламенце, іншых дзяржаўных органах сваю палітыку. Дэпутаты ад партыі, якая прайграла на выбарах, становяцца членамі партыі меншасці і знаходзяцца ў апазіцыі.

Разам з тым партыйныя фракцыі ў парламенце маюць роўныя правы. Прывядзём прыклад. Палата прадстаўнікоў у кангрэсе ЗША выбірае старшыню — Спікера. Яго кандыдатуру загадзя абмяркоўваюць члены фракцыі большасці і прадстаўляюць у час пасяджэння палаты. Нягледзячы на тое што вынік выбараў загадзя прадвызначаны, меншасць таксама вылучае свайго кандыдата, які, прайграўшы на выбарах старшыні палаты, становіцца лідэрам партыі меншасці ў парламенце.

Значыць, правы меншасці ў парламенце не толькі не ўшчамляюцца, а наадварот, яны абаронены існуючымі традыцыямі і нарматыўнымі дакументамі. У час правядзення парламенцкіх дэбатаў партыя меншасці заўсёды мае магчымасць выказацца па тым або іншым пытанні. Абарона правоў меншасці з'яўляецца важнейшым дэмакратычным прынцыпам. Невыпадкова дзейнасць парламента характарызуюць як парламенцкую дэмакратыю.

Перамога на выбарах не вядзе да страты сувязі дэпутата з выбаршчыкамі. Па існуючых правілах парламенцкіх дэмакратый дэпутат нясе двайную адказнасць: і перад партыяй і перад выбаршчыкамі, прычым адказнасць перад выбаршчыкамі лічыцца прыярытэтнай.

Кожны парламентарый разумее, што месца ў парламенце — не забяспечаная на ўсё жыццё сінекура (добра аплачаная пасада, якая не патрабуе асаблівай працы). Для яго небяспечна адрывацца ад выбаршчыкаў. Аб тым, якое вялікае значэнне надаюць дэпутаты асабістым кантактам з выбаршчыкамі, можна меркаваць толькі па адной лічбе: у 70-я гады амерыканскія кангрэсмены, напрыклад, наведваліся ў свае акругі ў сярэднім 35 разоў у год. Парламентарыі вядуць таксама пастаянную перапіску з выбаршчыкамі, аб'ём якой велізарны. Такія формы інфармацыі аб настроях

выбаршчыкаў дапаўняюцца сацыялагічнымі даследаваннямі і апытаннямі разнастайных сацыяльных груп насельніцтва з мэтай выявіць грамадскую думку краіны, напрыклад, аб дзейнасці таго або іншага парламентарыя. Вынікі грамадскіх апытанняў (не заўсёды прыемныя для дзяржаўных дзеячаў) шырока апавяшчаюцца.

Галоснасць — неад'емная рыса дэмакратыі — гэта і аб'ектыўная, поўная інфармацыя аб усім, што адбываецца ў краіне, у свеце; гэта і свабода выказвання думак (плюралізм думак); гэта і справядлівая крытыка, нягледзячы на асобы. Ва ўмовах дэмакратыі ні адзін палітык не можа паўтарыць словы Напалеона: «Я ніколі не чытаю газет. Яны публікуюць толькі тое, што пажадаю Я...».

Што ж датычыць узаемаадносін дэпутатаў (партыйных фракцый) са сваімі партыямі, то існуе прынцып, згодна з якім партыйная фракцыя непасрэдна не падпарадкоўваецца партыі. Яна праводзіць партыйныя праграмныя ўстаноўкі, улічваючы канкрэтную сітуацыю. Са свайго боку партыйныя органы і форумы вызначаюць мэты і задачы партыйнай фракцыі ў форме самых агульных рэкамендацый.

Але парламенцкая дэмакратыя не ідэальная, як можа паказацца на першы погляд. Яна мае хібы. Самы істотны — сістэма фінансавання выбарчай кампаніі. У ЗША, напрыклад, кандыдат сам забяспечвае свой палітычны бізнес. Калі ўлічыць, што ў сярэднім выдаткі на выбранне ў кангрэс дасягаюць 600 тыс. долараў, то кангрэсменам можа стаць далёка не заўсёды самы здольны да палітычнай дзейнасці чалавек.

Акрамя таго, існуе няроўнасць і паміж асобнымі групамі кандыдатаў, у прыватнасці — навічкамі і былымі кангрэсменамі. Апошнія, атрымліваючы грашовую падтрымку ад урада, скажам, на паштовыя расходы, маюць значна большыя магчымасці для правядзення рэкламнай кампаніі. Невыпадкова ў амерыканскім кангрэсе самы высокі працэнт перавыбраных.

На Захадзе кансерватыўныя і ліберальныя партыі фінансуюць сваіх кандыдатаў дзякуючы ахвяраванням бізнесу, а сацыял-дэмакраты і часткова камуністы звяртаюцца да сродкаў прафсаюзаў. Фінансавая залежнасць кандыдатаў ад сваіх непасрэдных «дабрадзеяў» дапаўняецца карупцыяй у асяроддзі палітыкаў, узмацненнем лабізму. Вынікам гэтага з'яўляецца нездаваль-

ненне грамадскасці. Яно знаходзіць адлюстраванне ў пікетах, мітынгах пратэсту, забастоўках, узнікненні новых грамадскіх рухаў. Незадаволенасць палітыкай кіруючых партый выяўляецца ў тым, што выбаршчыкі аддаюць свае галасы ў падтрымку «новых партый», напрыклад партыі «зялёных» (ФРГ) або «незалежных» кандыдатаў. Аднак, як адзначалася раней, яны не маюць магчымасці шырока выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі для прапаганды сваіх ідэй.

Цяпер ва ўсіх краінах парламенцкай дэмакратыі дэбатуецца пытанне аб тым, каб увесці больш шырокае дзяржаўнае фінансаванне выбарчай кампаніі і зрабіць тэлебачанне і іншыя сродкі масавай інфармацыі даступнымі любому кандыдату.

Другі недахоп парламенцкай дэмакратыі заключаецца ў тым, што адбор кандыдатаў праводзіцца самімі партыямі, унутры якіх існуюць розныя палітычныя плыні. Выбаршчыкі часцей за ўсё не маюць права выбіраць паміж кандыдатурамі ўнутры партый. У цяперашні час некаторыя партыі, напрыклад Італьянская кампартыя, спрабуюць увесці новы прынцып адбору кандыдатаў, сутнасць якога ў тым, каб у пярвічных выбарах прымалі ўдзел не толькі члены партыі, але і ўсе яе прыхільнікі.

Трэба адзначыць таксама, што, нягледзячы на абвешчанае ўсеагульнае выбарчае права, некаторыя слаі насельніцтва пазбаўляюцца магчымасці ўдзельнічаць у выбарах з-за ўстанаўлення розных цэнзаў — маёмаснага, аседласці, пісьменнасці. Так, заканадаўства ЗША ўстанаўлівае 50 выбарчых цэнзаў такога роду. У прыватнасці, цэнз аседласці дазваляе ўдзел у выбарах толькі асобам, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнага штата не менш за тры, шэсць месяцаў або адзін год. Гэта абмежаванне адхіляе ад удзелу ў выбарах перш за ўсё сельскагаспадарчых рабочых і беспрацоўных, якія вымушаны ў пошуках заработку калясіць са штата ў штат.

Мы прывялі толькі некаторыя тыповыя недахопы парламенцкай дэмакратыі. У палітычнай практыцы розных дэмакратычных краін іх значна больш.

Як жа ацаніць у цэлым парламенцкую дэмакратыю, улічваючы ўсе «за» і «супраць». Парламенцкая дэмакратыя з'яўляецца бясспрэчным дасягненнем сучаснай цывілізацыі. Яна, будучы класічнай формай прадстаўнічай дэмакратыі, спалучаецца з формамі непасрэднай

дэмакратыі. Гэта спалучэнне дапамагае выявіць інтарэсы і настроі розных груп насельніцтва і выказаць іх у палітыцы.

Ці пераканаўча прагучалі ў тэксце аргументы на карысць такога вываду? Вырашайце самі.

Пытанні і заданні

1. Растлумачце, чаму дэмакратыя з'яўляецца спосабам арганізацыі палітычнай сістэмы, усяго жыцця грамадства.

2. Якія дэмакратычныя прынцыпы вам вядомыя? Як вы разумееце прынцып абароны правоў меншасцей?

3. Якая роля партый у парламенцкіх дэмакратыях?

4. Пакажыце, як ажыццяўляецца сувязь дэпутатаў з выбаршчыкамі.

5. Ці згодны вы з тым, што парламентарыі — «слугі народа»? Аргументуйце свой адказ.

6. У Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Канадзе, дзе ініцыятыву стварэння рабочых партый бралі на сябе прафсаюзы, якія станавіліся калектыўнымі членамі гэтых партый, узнікла своеасаблівая лейбарысцкая мадэль цеснага спалучэння прафсаюзаў і непасрэднага кіраўніцтва партыі, дэпутатаў ад яе.

У Японіі, Германіі і паўночных краінах Заходняй Еўропы, асабліва ў Скандынавіі, таксама ўстанавілася ўзаемадзеянне прафсаюзаў і кіраўніцтва партыі, але з захаваннем аўтаноміі кожнага з бакоў. Гэтыя партыі называюць сябе сацыял-дэмакратычнымі і іншы раз (як, напрыклад, у Швецыі) дадаюць азначэнне «рабочая», каб падкрэсліць, чые інтарэсы абараняюць у першую чаргу.

У ЗША інтарэсы сацыяльна ўшчэмленых слаёў грамадства бярэ на сябе галоўным чынам Дэмакратычная партыя, а прафсаюзы, будучы самай магутнай арганізацыяй амерыканскіх рабочых, выступаюць у якасці кансультантаў урада па ўсіх важных пытаннях.

Якое палажэнне ўрока пацвярджаюць гэтыя факты? Якую з прыведзеных мадэляў прадстаўніцтва рабочага класа ў парламентах вы лічыце найлепшай (аптымальнай)?

7. Заходнегерманская партыя «Ды Грунен» («зялёныя») у сваёй праграме ставіць наступныя задачы: неадкладная адмова ад выкарыстання атамнай энергіі ў любых мэтах, перараэмеркаванне нацыянальнага багацця зверху ўніз, экалагічнае абнаўленне прамысловасці, барацьба супраць ушчамлення правоў чалавека (асабліва жанчын, моладзі, пенсіянераў). Гэту праграму падтрымлівае большасць партыйцаў.

А вось па пытаннях тактыкі думкі членаў партыі падзяліліся. Адна частка — «фундаменталісты» разглядаюць парламент толькі ў якасці трыбуны, дзе можна выказваць свой пункт гледжання. Яны — праціўнікі ўступлення «зялёных» у якія б там ні было блокі або кааліцыі з іншымі партыямі, лічаць, што галоўным сродкам дасягнення пастаўленых мэт павінны быць масавыя («грамадзянскія ініцыятывы»). Другія — «рэалісты», наадварот, выступаюць за актыўнае супрацоўніцтва і разумныя кампрамісы з іншымі палітычнымі сіламі.

Заўважым, што, па выніках сацыялагічных даследаванняў, 97 % заходнегерманскіх выбаршчыкаў, якія галасуюць за «Ды Грунен», маладзейшыя за 35 гадоў.

Ці падтрымліваеце вы стратэгічныя ўстаноўкі праграмы «зялёных»? Ці па ўсіх пунктах? Абгрунтуйце свой пункт гледжання. Калі б вам давялося выбіраць паміж двума кандыдатамі — «фундаменталістам» і «рэалістам», каму б вы аддалі перавагу і чаму?

§ 31. ПАЛІТЫЧНЫ СТАТУС АСОБЫ

Прынцыпамі дэмакратыі, як паказана вышэй, з'яўляюцца роўнасць і свабода асобы, народаўладдзе. Яны выступаюць у грамадскім жыцці як прызнаныя дзяржавай і замацаваныя ў канстытуцыях правы грамадзян — сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, культурныя, асабістыя. Адзначалася таксама, што гэтыя правы непарыўныя з абавязкамі асобы перад грамадствам і дзяржавай.

У сукупнасці правы і абавязкі, змешчаныя ў прававых актах, характарызуюць прававое становішча асобы ў грамадстве — яе прававы статус.

Якое ж прававое становішча асобы ў палітычных сістэмах дэмакратычных краін?

Аб'ектыўна магчымыя палітычныя ролі асобы

Звернемся да тэксту Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Менавіта ў ёй, як вядома, зафіксаваны агульнапрызнаныя правы, якія сталі міжнароднымі стандартамі, на якія раўняюцца многія канстытуцыі свету.

Да неад'емных палітычных правоў і свабод асобы адносяцца: права на грамадзянства, на свабоду асобы, сумлення і рэлігіі, на свабоду ўстаноў і свабоднае выяўленне іх, на свабоду мірных сходаў і аб'яднанняў. Кожны чалавек мае права прымаць удзел у кіраванні сваёй краінай непасрэдна або праз сваіх прадстаўнікоў. Разам з тым «кожны мае абавязацельствы перад грамадствам, у якім толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы» (Арт. 29, п. 1). Пры гэтым мэта заканадаўчых абмежаванняў правоў і свабод чалавека можа быць толькі адна — забеспячэнне... правоў і свабод іншых і задавальненне справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве» (Арт. 29, п. 2).

Гэтыя палажэнні замацоўваюцца, канкрэтызуюцца ў заканадаўчых актах многіх дзяржаў, што забяспечвае прававы статус іх грамадзян.

Вядома, што дынамічным бокам статуса з'яўляецца «роля»: чалавек не толькі займае пэўнае месца ў сацыяльнай, палітычнай структуры грамадства, але і вы-

конвае ў адпаведнасці з гэтым месцам пэўныя функцыі. Палітычныя ролі асобы шматгранныя: роля выбаршчыка, дэпутата, члена якой-небудзь недзяржаўнай арганізацыі, забастоўшчыка, мітынгуючага і інш.

Чаму неабходная культура дэмакратыі?

Удзел у палітыцы і ўплыў на палітыку — з'ява не супадаючая. Далёка не ўсякая актыўная палітычная дзейнасць грамадзяніна эфектыўная і стваральная.

Возьмем, напрыклад, мітынгі. Гэта — адна з форм, у якой рэалізуецца натуральнае права грамадзяніна выказваць сваю думку. Лічыцца, што мітынг — арганізаваная форма палітычных дзеянняў. Сапраўды, у яго ёсць арганізатары, мэты і задачы, напрыклад настроіць як мага больш шырокае кола выбаршчыкаў на карысць таго або іншага кандыдата і выйграць выбарчую кампанію.

У той жа час мітынг, як і іншая шматлікая сходка, можа ператварыцца пры пэўных умовах у стыхійны некіруемы працэс, які суправаджаецца зменай настрояў удзельнікаў, выбухам амбіцый, нястрымнымі эмоцыямі. Прысутны народ ператвараецца ў натоўп, а дэмакратыя з улады народа ў ахлакратыю — уладу натоўпу. Для ахлакратыі характэрныя імпульсіўнасць дзеянняў, калі пачуцці пераважаюць над розумам, «глухата» да самых важкіх аргументаў і довадаў, беспрычынная лютасць, якая не прымае дыялога. Чалавек становіцца агрэсіўным, часам нагадваючы булгакаўскага Шарыкава, які гатовы ў любы момант інстынктыўна накінуцца на кошку. Чаму гэта адбываецца? Чалавек у натоўпе ананімны, і гэта вядзе да меншай рацыянальнасці ўчынкаў, да іх большай раскаванасці. Людзі заражаюць адзін аднаго эмоцыямі, адбываецца лавінападобнае нагнятанне пачуццяў, кіраваць якімі пасля пераходу праз пэўны рубеж даволі складана.

Гісторыя і сучаснасць ведаюць нямала выпадкаў, калі мірная дэманстрацыя або мітынг ператвараліся ў бясчынствуючы натоўп, які змятаў усё на сваім шляху. А ахвярамі ахлакратыі становяцца часта зусім невінаватыя людзі.

Такім чынам, права пераконваць людзей, арганізоўваць палітычныя акцыі, дарэчы як і іншыя палітычныя правы, ускладаюць большую адказнасць на грамадзяніна (прававую, маральную, палітычную) за вынікі сваіх дзеянняў. Негатыўныя вынікі непазбеж-

ныя, калі арганізатары і ўдзельнікі, дапусцім, не захоўваюць дэмакратычных правілаў паводзін. Якія ж гэта правілы? Праўдзівая, выверaная інфармацыя і стрыманы (а не ўзбуджаны) тон мовы прамоўцаў, прадастаўленне слова не толькі сваім прыхільнікам, але і апанентам, цярпімасць да процілеглага пункту погляду і павага да чалавечага гонару.

Псіхолагі ўстанавілі, што эфектыўнасць мерапрыемства становіцца вышэйшай, а праяўленні ахлакратыі слабейшымі, калі правільна выбраць месца правядзення мітынгу, не зацягваць яго, улічваць, што гарачыня, духата, стомленасць адмоўна адбіваюцца на паводзінах людзей, мець на ўвазе, што ў цэнтры — бліжэй да прамоўцаў, дзе людзі стаяць у гушчы,— эмоцыі больш моцныя; чым далей ад цэнтра знаходзіцца чалавек, тым менш ён падуладны масаваму псіхозу.

Сёння для пісьменнага, эфектыўнага ўдзелу ў палітыцы ад грамадзяніна патрабуюцца, па-першае, рознабаковыя палітычныя веды, па-другое, арыентацыі ў сваёй дзейнасці на каштоўнасці і правілы жыцця дэмакратычнага грамадства, па-трэцяе, авалоданне гэтымі правіламі (спосабамі дзейнасці) для выканання разнастайных палітычных ролей. Названыя ўмовы ў сукупнасці характарызуюць палітычную культуру асобы.

Ці складаная роля выбаршчыка?

Кожны грамадзянін у залежнасці ад жыццёвых акалічнасцей, асабістых патрэбнасцей, здольнасцей і магчымасцей выбірае сабе канкрэтную палітычную ролю або ролі. Не ўсе змогуць пайсці на мітынг або стануць, напрыклад, удзельнікамі жаночага руху. Не ўсе, натуральна, захочуць, зрабіць палітыку сваёй прафесіяй. Так, гэта і не абавязкова.

Тым не менш існуе неабходны, гарантаваны канстытуцыямі мінімум палітычнай дзейнасці. Да яго адносяцца дэмакратычныя выбары. Удзел у іх — справа адказная. Галасуючы ж за кандыдата ў дэпутаты, асоба дэлегіруе яму права выказваць і абараняць свае інтарэсы на дзяржаўным узроўні. Як жа папярэдзіць або, па крайняй меры, зменшыць памылку свайго выбару?

Галоўнае — прааналізаваць і ацаніць перадвыбарную праграму кандыдата. Чаму? Таму, што сутнасць дэпутацкай дзейнасці — выкананне сваёй перадвыбарнай праграмы. Яна распрацоўваецца кандыдатам з улікам патрэб і запатрабаванняў жыхароў сваёй выбарчай акругі, а таксама агульных праграмных установак той

партыі, якую ён прадстаўляе. У выпадку заваявання большасці ў парламенце гэтыя ўстаноўкі, як вы ведаеце, вызначаюць палітычны курс краіны.

Значыць, выбаршчык галасуе перш за ўсё за перадвыбарную праграму кандыдата. Што ж уяўляе сабой гэты дакумент і якім патрабаванням ён павінен адпавядаць? «Моцная», здольная вытрымаць канкурэнцыю праграма мае дакладна сфармуляваную мэту, якая можа аб'яднаць інтарэсы розных груп насельніцтва. Так, у перадвыбарных праграмах кандыдатаў ад сацыялістычных і сацыял-дэмакратычных партый Захаду прапагандуецца мэта дасягнення свабоды, справядлівасці і салідарнасці.

Вось як растлумачваюць яны, напрыклад, ідэю салідарнасці: салідарнае грамадства — гэта разгалінаваная сістэма сацыяльнага забеспячэння, паляпшэння аховы здароўя і сістэмы адукацыі, барацьбы з беспрацоўем, аховы навакольнага асяроддзя, жыллёвага будаўніцтва, расшырэння сферы паслуг, клопатаў аб дзецях, моладзі, жанчынах, развіцця індывідуальных і калектыўных правоў і свабод. Вядома ж, гэтыя гуманныя мэты не пакідаюць абыякавымі выбаршчыкаў Францыі і Аўстрыі, Заходняй Германіі і Швецыі. Невыпадкова ў гэтых краінах сацыялісты і сацыял-дэмакраты або падоўгу знаходзяцца на чале ўлады або складаюць моцную апазіцыю кіруючым партыям.

У перадвыбарнай палітычнай праграме абазначаюцца таксама сродкі дасягнення пастаўленай мэты. Сацыялісты і сацыял-дэмакраты паказваюць, што адным са сродкаў дасягнення свабоды, справядлівасці з'яўляецца ўскоснае рэгуляванне эканамічных працэсаў. Напомнім, што яно ажыццяўляецца, у прыватнасці, шляхам падаткаабкладання прадпрыемстваў. Прычым самыя буйныя сумы спаганяюцца з найбольш буйных прадпрыемстваў, якія належаць карпарацыям і прыватным уладальнікам, падаткі ў меншым памеры выплачваюць дзяржаўныя, кааператыўныя і індывідуальныя прадпрыемствы. Большая частка гэтых сродкаў папаўняе сацыяльныя фонды дзяржавы.

У «моцнай» праграме змяшчаюцца і важкія для выбаршчыка довады ў яе абарону. Іншымі словамі, знаёмства з ёй павінна даваць дакладны і ясны адказ на пытанне: якія эканамічныя, сацыяльныя, дэмакратычныя і духоўныя даброты набудуць выбаршчык і яго сям'я, калі праграма будзе выканана? І нарэшце, яшчэ

адно патрабаванне — мова перадвыбарнай праграмы павінна быць строгая і зразумелая, дакладная і яркая.

Такім чынам, выбаршчык можа ацэньваць перадвыбарную праграму кандыдатаў па наступных крытэрыях: мэта, сродкі яе дасягнення, аргументацыя, мова. Трэба ўлічваць таксама, наколькі рэалістычныя і гуманныя заяўленыя ў ёй пазіцыі, ці адпавядаюць яны дэмакратычным каштоўнасцям.

Правільная ацэнка перадвыбарнай праграмы — важная, але не адзіная ўмова беспамылковага выбару кандыдата ў палітычныя дзеячы. Выбаршчыку заўсёды цікава ведаць, каму ён уручае мандат даверу. Што гэта за чалавек? Якая яго біяграфія і нават якое яго асабістае жыццё? Задумаемся, а ці не марная гэта цікавасць? На самай справе, ад таго, як складзена перадвыбарная праграма, можна ў некаторай ступені меркаваць аб інтэлектуальных здольнасцях кандыдата, яго кругаглядзе, а галоўнае — кампетэнтнасці. Але ці дастаткова гэтага? Успомнім вядомы афарызм: «Самае сур'ёзнае выпрабаванне — выпрабаванне ўладай». Псіхолагі і палітолагі лічаць, што ўлада разбэшчвае многіх людзей. Нават добрыя могуць стаць дрэннымі, а дрэнныя напэўна стануць яшчэ горшымі. Таму людзі, якія маюць тыранічны характар, не павінны быць дапушчаны да ўлады.

Нярэдка да палітычнай дзейнасці імкнецца чалавек, які канфліктуе з блізкімі людзьмі, а таксама не змог знайсці сваё месца ў прафесійным калектыве. Для такога чалавека палітычная дзейнасць можа стаць сродкам кампенсацыі асабістых або творчых няўдач. З такіх людзей іншы раз часта вырастаюць кар'ерысты — гэта значыць тыя, хто ставіць асабістыя поспехі вышэй грамадскай справы, хоча дабіцца вялікіх поспехаў сам у адрозненне ад тых, хто хоча дабіцца вынікаў дзеля справы, набывае высокі прафесіяналізм і рухаецца па службовай лесвіцы. Таму цікавасць, якая праяўляецца да біяграфіі і асабістага жыцця палітычных дзеячаў, не з'яўляецца такой ужо марнай. Галоўнае, каб не было перакосаў, калі, скажам, дэталі асабістага жыцця кандыдата робяць большы ўплыў, чым яго перадвыбарная праграма.

На якія ж якасці асобы кандыдата трэба звяртаць асаблівую ўвагу выбаршчыку? Ці ёсць такія рысы, якімі павінен у першую чаргу валодаць чалавек, які

прэтэндуе на ролю палітычнага дзеяча? Вось як на гэтыя пытанні адказаў Эган Бар — адзін з лідэраў міжнароднай і заходнегерманскай сацыял-дэмакратыі: «Вядома, ён павінен распазнаваць аб'ектыўныя праблемы развіцця грамадства, бачыць, у чым заключаецца магчымасць і небяспека, ведаць свае мэты і ў залежнасці ад гэтага прымаць рашэнні, выконваць свае абяцанні... Неабходныя і здольнасць прабіўной сілы, і ўменне пераконваць... згуртоўваць і прыцягваць да сябе людзей».

Палітычны дзеяч павінен валодаць таксама талерантнасцю (цярпімасцю), душэўнай чуласцю, быць высакародным і сумленным — да такога вываду прыйшлі многія народныя дэпутаты СССР, вядомыя вучоныя нашай краіны, абмяркоўваючы праблему суадносін маралі і палітыкі.

Такім чынам, вы бачыце, што паспяховае ажыццяўленне простай на першы погляд ролі выбаршчыка патрабуе ад асобы высокай палітычнай культуры.

Палітычны лідэр або імітатар

Вядома, што палітычныя дзеячы, якія займаюць аднолькавы статус, па-рознаму разумеюць сваю ролю. Ёсць сапраўдныя палітычныя лідэры, а ёсць імітатары.

Палітычны лідэр — гэта чалавек, які найбольш поўна адлюстроўвае і абараняе інтарэсы народа або пэўнай сацыяльнай групы, валодае сукупнасцю якасцей, неабходных палітычнаму дзеячу.

Імітатар заўсёды іграе ролю кагосьці, хто больш разумны, лепшы, цікавейшы, чым ён сам. Такі палітычны дзеяч клапоціцца перш за ўсё аб тым, каб любымі сродкамі спадабацца, стварыць сабе прывабны палітычны імідж (знешняе аблічча, вобраз). Ну, і што ж,— запытаецеся вы,— хіба знешнія рысы палітыка не маюць значэння? Наадварот, маюць вялікае значэнне. У паліталогіі існуе нават спецыяльны раздзел — іміджалогія, якая вывучае заканамернасці фарміравання і ўплыву вобраза палітычнага лідэра на свядомасць людзей. І той, хто не ўлічвае гэтых заканамернасцей, нярэдка прайграе ў вачах людзей. Калі, напрыклад, у заходнегерманскім парламенце з'явіліся маладыя дэпутаты ад партыі «зялёных» у залатаных джынсах, тоўстых світэрах да калень і стаптаных красоўках, публіка была шакіравана, хрысціянскія дэмакраты глядзелі на сваіх новых калег з абурэннем, сацыял-дэмакраты і лібералы — з іроніяй, а прэзідэнт бундэстага Рыхард Шцюклен усё не мог зразумець, як

яму рэагаваць на «зялёных» дэпутатаў, якія ў ходзе дэбатаў раскладалі на каленях вязанне і нават іншы раз вылазілі на трыбуну з пруткамі і маткамі шэрсці.

Падкрэслім яшчэ раз, што для імітатара важным з'яўляецца толькі знешні малюнак сваёй ролі палітыка, але рэальнымі якасцямі на гэту ролю ён не валодае. Імітатар ахвотна падхоплівае папулярныя ў людзей думкі, можа гаварыць лепш, чым думаць, і таму робіць падманлівае ўражанне. Такіх людзей часта называюць папулістамі.

Што ж такое папулізм і як ён праяўляецца?

Папулізм — гэта палітычная гульня па правілах, якія дазваляюць дабіцца маментальнасці вынікаў дзякуючы таму, што масы больш падатлівыя на простыя тлумачэнні складаных пытанняў, на прымітыўныя, але знешне прывабныя лозунгі. Любімы прыём папулістаў — не закранаць свае палітычныя праграмы, а бязлітасна бічаваць палітычных сапернікаў. У Вялікабрытаніі існуе нават спецыяльны тэрмін для такіх выступленняў — «паклёп, накіраваны супраць палітычных праціўнікаў» (даслоўна «паліванне брудам»). Папуліст не шкадуе перадвыбарных абяцанняў, асабліва не задумваючыся, наколькі яны рэальныя. І трэба заўважыць, што ў выйгрышы аказваецца нярэдка той, хто менш адказны і патрабавальны ў сваіх абяцаннях.

Чаму ж выбаршчыкі пападаюцца на такія хітрасці? Таму што шырокаму колу людзей з недастаткова высокай палітычнай культурай больш зразумелыя спрошчаныя варыянты палітычных рашэнняў, простыя тлумачэнні складаных праблем. Вам, напэўна, не раз даводзілася чуць: «Навошта ўскладняць, трэба прасцей, адным махам — паздымаць усіх, і справа з канцом!» «Навошта яны возяцца з гэтымі папраўкамі да законаў, ці нельга адразу зрабіць добры ўказ?»

Такія разважанні таксама папулізм. Бо калі б людзі не мелі стойкага непрымання да ўсялякага роду складанасцей, калі б яны не пераносілі сваё раздражненне і нецярпенне на палітыку, з вялікай павагай ставіліся да высокапрафесійнай разумовай працы палітычных выбраннікаў, то напэўна не існавалі б і не прымяняліся «палітычныя антыправілы».

Пытанні і заданні

1. У чым, на ваш погляд, падабенства і адрозненне паміж палітыка-прававым і сацыяльным статусам асобы?

2. Растлумачце, чаму перадвыбарная праграма кандыдата ў дэпутаты важны, але не адзіны крытэрый ацэнкі палітычнага дзеяча.

3. Чым адрозніваецца, на ваш погляд, кар'ерыст ад чалавека, які рухаецца па службовай лесвіцы (робіць кар'еру)? Свой адказ аргументуйце.

4. Гегель пісаў: «Без запалу ніколі не было б і не можа быць нічога здзейснена вялікага. Толькі мёртвая, а вельмі часта крывадушная мараль выступае супраць запалу як такога». Ці супярэчыць гэта сцвярджэнне палажэнню ўрока аб неабходнасці перавагі ўлады розуму над пачуццямі ў палітычнай дзейнасці? Аргументуйце свой адказ.

5. Вы з'яўляецеся сведкам спрэчкі двух таварышаў. Адзін сцвярджае, што папулізм — гэта падладжванне да мас і, значыць, гэта дрэнна. Другі, наадварот, лічыць, што папулізм — гэта блізкасць да народа і, значыць, гэта добра. Хто з удзельнікаў спрэчкі больш блізкі да навуковай ісціны і чаму?

6. Уявіце, што вы адзін з арганізатараў руху старшакласнікаў «За дэмакратызацыю школы». Распрацуйце праект праграмы, які б вы прадставілі на абмеркаванне сваім таварышам.

7. Сфармулюйце праблемы, што найбольш востра стаяць у вашай школе, ініцыятыву вырашэння якіх маглі б узяць на сябе вучні. Падрыхтуйце разам са сваімі аднадумцамі праграму дзеянняў.

8. Адзін з удзельнікаў выбараў народных дэпутатаў СССР, перш чым пакінуць у выбарчым бюлетэні адну з чатырох уключаных у спіс для тайнага галасавання кандыдатур, правёў наступную работу: пацікавіўся, за каго з кандыдатаў будуць галасаваць яго таварышы, як былі апрануты кожны з кандыдатаў на сустрэчах з выбаршчыкамі, каго з іх раней паказвалі па тэлебачанні? Калі б вы былі выбаршчыкам, якія б крокі зрабілі, перш чым уручыць мандат даверу аднаму з кандыдатаў? Аргументуйце свой адказ.

9. Уявіце, што вы — арганізатар мітынгу. Якія з названых дзеянняў вы б зрабілі:

а) паведаміў бы аб мітынгу толькі сваім палітычным прыхільнікам;

б) паведаміў бы аб мітынгу не толькі сваім палітычным прыхільнікам, але і палітычным апанентам;

в) даў бы слова ўсім жадаючым;

г) даў бы слова толькі сваім палітычным прыхільнікам;

д) паспрабаваў бы выкрыць сваіх палітычных апанентаў, заклікаў бы да бязлітаснай барацьбы з імі?

Свой выбар растлумачце.

10. У 80-я гады ў ЗША выбаршчыкі, сутыкнуўшыся з інтэлектуальнымі цяжкасцямі ў вызначэнні сапраўдных перадвыбарных праграм кандыдатаў ад рэспубліканскай і дэмакратычнай партый на пасаду прэзідэнта, галасавалі за найбольш абаяльнага з іх. Кандыдаты ж у сваіх выступленнях нават не закраналі пытанняў перадвыбарнай праграмы і сканцэнтравалі ўвагу на бязлітаснай крытыцы адзін аднаго. Які вывад урока ілюструе прыведзены факт? Прывядзіце іншыя прыклады, якія пацвярджаюць гэты вывад.

11. Уявіце, што вам прапанавалі прыняць удзел у дыскусіі вучоных на тэму «Ці не абмяжоўвае мараль палітычную эфектыўнасць?». Якія пытанні вы ўзнялі б у гэтай дыскусіі? Свой выбар растлумачце.

Раздзел VII. ДУХОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

§ 32. ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА

Вы ўжо пазнаёміліся з эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай сферамі жыцця сучаснага грамадства. Аднак паняцце цывілізацыі ўключае ў сябе яшчэ адзін вельмі важны элемент — культуру. Ступень яе развіцця паказвае дасягненні канкрэтнай гістарычнай цывілізацыі, вызначае яе месца ў радзе былых і будучых цывілізацый. Што ж такое культура, якая яе структура, якое месца яна займае ў жыцці чалавека і грамадства?

Што такое культура?

Тэрмін «культура» лацінскага паходжання. Першапачаткова ён азначаў апрацоўку глебы, яе культываванне. У далейшым слова «культура» атрымала больш абагульненае значэнне. Таму што з'явы культуры вывучаюць многія канкрэтныя навукі (археалогія, этнаграфія, гісторыя, эстэтыка і г. д.), кожная з іх дае ёй сваё азначэнне. Такім чынам, у сусветнай літаратуры налічваецца да 500 азначэнняў «культуры». Звернемся да аднаго з іх, якое часцей за ўсё сустракаецца ў грамадскіх навуках. У найбольш агульным выглядзе пад культурай разумеюць усе віды пераўтваральнай дзейнасці чалавека і грамадства, а таксама вынікі гэтай дзейнасці.

Вам вядома, што адрозніваецца культуру матэрыяльную і духоўную. Напомнім, што матэрыяльная культура ствараецца ў працэсе матэрыяльнай вытворчасці (прадуктамі яе з'яўляюцца станкі, абсталяванне, будынкі і г. д.). Духоўная культура ўключае ў сябе працэс духоўнай творчасці і створаныя пры гэтым духоўныя каштоўнасці ў выглядзе музыкі, карцін, навуковых адкрыццяў, рэлігійных вучэнняў і да т. п. Гэтыя элементы культуры непарыўна звязаны паміж сабой. Матэрыяльная вытворчая дзейнасць чалавека ляжыць у аснове яго дзейнасці ў іншых галінах жыцця. З другога боку, вынікі яго разумовай дзейнасці матэрыялізуюцца, ператвараюцца ў рэчы, тэхнічныя сродкі, творы мастацтва. Напрыклад, нашы веды ў электроннай тэхніцы адносяцца да духоўнай культуры, а камп'ютэры, тэлевізары, створаныя на аснове гэтых ведаў, адносяцца да матэрыяльнай.

Такім чынам, мы высветлілі, што культура з'яўляецца істотнай характарыстыкай жыцця грамадства, а значыць, яе нельга аддзяляць ад чалавека як сацыяльнай істоты.

Сам чалавек фарміруецца ў працэсе сваёй дзейнасці як культурна-гістарычная істота. Яго чалавечыя якасці ёсць вынік засваення ім мовы, далучэння да існуючых у грамадстве каштоўнасцей, традыцый, авалодання ўласцівымі для дадзенай культуры прыёмамі і навыкамі дзейнасці і г. д. Біялагічна ж чалавеку даецца толькі арганізм, які мае пэўную будову, схільнасці, функцыі. Таму не будзе перабольшаннем, калі сказаць, што культура ўяўляе сабой **меру чалавечага ў чалавеку.**

Пазнаёмімся больш падрабязна з працэсам вытворчасці і збірання культурных каштоўнасцей.

Традыцыі і наватарства ў культуры

Духоўная культура — своеасаблівая цэласнасць яе формаў: мастацтва, навукі, маралі, рэлігіі. У гісторыі развіцця культуры маецца цэлы рад асаблівасцей. Збіранне культурных каштоўнасцей ідзе як бы ў двух напрамках: па вертыкалі і гарызанталі.

Першы напрамак (па вертыкалі) звязаны з перадачай культурных каштоўнасцей, усіх станоўчых дасягненняў ад аднаго пакалення да другога, г. зн. з **пераемнасцю** ў культуры. Выразна выяўляецца заканамернасць пераемнасці ў навуцы: тут можна наглядна прасачыць сувязь даследаванняў. Напрыклад, выяўленне В. Рэнтгенам нябачных праменяў прывяло А. Пуанкарэ да гіпотэзы аб сувязі паміж гэтымі праменямі і з'явай флюарэсцэнцыі. А. Бекерэль, правяраючы дадзеную гіпотэзу, выпадкова зафіксаваў невядомае раней самаадвольнае выпраменьванне урану, што ў сваю чаргу прывяло Кюры (мужа і жонку) да адкрыцця радыю і з'явы радыеактыўнасці ў радзе іншых элементаў.

Зыходзячы з гэтых фактаў, можна сказаць, што без Еўклідавай геаметрыі не было б і геаметрыі Лабачэўскага, без адкрыццяў Ньютана — тэорыі адноснасці Эйнштэйна.

Найбольш устойлівы бок культуры — гэта культурныя традыцыі, элементы сацыяльнай і культурнай спадчыны, якія не проста перадаюцца ад пакалення да пакалення, але і захоўваюцца на працягу доўгага часу.

Традыцыі падразумяваюць, што́ мае права на спадчыну і як атрымліваць у спадчыну. Традыцыйнымі могуць быць каштоўнасці, ідэі, звычаі, абрады і г. д. Паспрабуйце самі прывесці прыклады.

Традыцыі, якія існуюць вакол нас, прыйшлі да нас з розных эпох, розных цывілізацый. Так звычай адзначаць вясенняе свята масленіцы прыйшоў да нас ад старажытных славян, а правіла этыкету прапускаць жанчыну наперад дайшло да нас з перыяду ранняй дзікасці. Тварцамі традыцый былі людзі розных эпох, прадстаўнікі розных сацыяльных груп, таму традыцыі часам такія супярэчлівыя. Кожнае пакаленне выбірае тыя або іншыя традыцыі і ў гэтым сэнсе выбірае не толькі будучае, але і мінулае.

З курса гісторыі вы, напэўна, памятаеце, у якой вострай форме ўзнікла праблема культурнай традыцыі ў Кітаі ў 60-я гг., калі была абвешчана так званая «вялікая культурная рэвалюцыя», якая прынесла краіне многа няшчасця. Была перапынена вучоба ў школах і вышэйшых навучальных установах, закрываліся бібліятэкі і музеі, падвяргалася ганенням творчая інтэлігенцыя. Творы вялікіх гуманістаў мінулага аб'яўляліся «рэакцыйнымі», знішчаліся культурныя каштоўнасці. Прыведзены прыклад сведчыць пра тое, што праблема адносін да культурнай спадчыны ў пэўных сітуацыях, асабліва ў пераломныя моманты развіцця грамадства і культуры, набывае востры палітычны характар. Успомніце, як стаялі праблемы адносін да культурнай спадчыны мінулага ў нашай краіне ў першыя гады Савецкай улады.

Другая лінія прымнажэння культурных каштоўнасцей (па гарызанталі) найбольш выразна праяўляецца ў мастацкай культуры. Яна выяўляецца ў тым, што, у адрозненне ад навукі, пераходзяць у спадчыну ў якасці каштоўнасцей не асобныя кампаненты, актуальныя ідэі, часткі тэорыі, а цэласны мастацкі твор. Шэкспір «не перакрывае» Дантэ, гэтак жа як Дантэ — славутых трагічных паэтаў старажытнасці. Аднак мастацкі твор XIX ст. чытачамі XX ст. успрымаецца ўжо зусім па-іншаму. Гэта адбываецца не толькі таму, што змянілася грамадства (яго эканоміка, палітыка, сацыяльнае асяроддзе), але і таму, што змянілася і сама культура. З'явіліся новыя яе тварцы, якія робяць уплыў сваімі творамі на свядомасць людзей, што жывуць у XX ст. Таму Л. Талстой стаў успрымацца інакш, калі з'явіліся ў

літаратуры такія імёны, як У. Набокаў, Б. Пастэрнак. І ў гэтым тагачасным існаванні і ўзаемадзеянні твораў розных эпох нараджаецца культура сучаснай цывілізацыі.

Да гэтага часу мы разглядалі працэс прымнажэння культурных каштоўнасцей, цяпер звернемся да праблемы развіцця культуры. Фарміраванне ж яе дапускае не толькі захаванне лепшых элементаў старога, але і стварэнне новага, прырашчэнне культурнага багацця ў працэсе творчасці. Гаворка ідзе пра наватарства ў культуры. Адразу варта агаварыцца, што не ўсякае наватарства ёсць творчасць. Стварэнне новага становіцца адначасова творчасцю культурных каштоўнасцей тады, калі яна набывае грамадскую значнасць, атрымлівае водгук у іншых людзей. Калі паэт у сваіх лірычных вершах гаворыць ад першай асобы, расказвае пра свае пачуцці і перажыванні, радасці і пакуты, ён стварае культуру пастолькі, паколькі змест і форма яго паэзіі выклікаюць водгук у душах людзей, абуджаюць у адказ пачуцці ў публікі, прыносяць ёй эстэтычную асалоду. А калі чый-небудзь рыфмаваны тэкст такімі ўласцівасцямі не валодае, то ён не будзе ні паэзіяй, ні творчасцю культуры.

Бывае, праўда, што творы мастацтва або навуковыя адкрыцці не знаходзяць прызнання ў сучаснікаў. Але калі гэта сапраўдныя духоўныя каштоўнасці, час іх прыходзіць, і наступныя пакаленні аддаюць ім належнае. Так было, напрыклад, з працамі Цыялкоўскага, карцінамі Малевіча, Шагала.

У творчасці культуры ўсеагульнае арганічна зліта з унікальнасцю. Кожная культурная каштоўнасць непаўторная, незалежна ад таго, ідзе размова пра мастацкі твор ці вынаходства, навуковае адкрыццё і г. д. Тыражыраванне ў той або іншай форме ўжо вядомага — гэта распаўсюджванне, а не стварэнне культуры.

Мы пазнаёміліся са шляхамі развіцця культуры грамадства, цяпер больш падрабязна разгледзім культуру сучаснай цывілізацыі. Што яна сабой уяўляе?

Культуры ў культуры

У рамках пэўнай гістарычнай эпохі заўсёды існавалі розныя культуры: інтэрнацыянальная і нацыянальная, свецкая і рэлігійная, дарослая і маладзёжная, заходняя і ўсходняя. У сучасным грамадстве асаблівае значэнне набылі «масавая» і «элітарная».

«Масавая» культура ўзнікла са з'яўленнем грамадства масавай вытворчасці і масавага спажывання. З'яўленне і развіццё радыё, тэлебачання, сучасных сродкаў сувязі, а потым відэа і камп'ютэраў садзейнічала распаўсюджванню гэтай культуры. У заходняй сацыялогіі тэрмін «масавая культура» перш за ўсё азначае «камерцыйная», якая разглядае мастацтва, навуку, рэлігію як прадметы спажывання. Творы «масавай» культуры здольныя пры продажы даваць прыбытак, а для гэтага даводзіцца ўлічваць густы і запатрабаванні масавага гледача, чытача, аматара музыкі.

Таксама як і ў любым іншым відзе камерцыі, неад'емнай часткай «масавай» культуры з'яўляецца рэклама. Некаторыя выдавецтвы, кінакампаніі расходуюць да 15—20 % прыбытку на рэкламу сваёй прадукцыі і на вывучэнне густаў яе спажыўцоў. У адпаведнасці з запатрабаваннямі гледачоў камерцыйны кінематограф прапануе набор фільмаў жахаў, меладрам, баевікоў, секс-фільмаў. Улічваючы патрэбнасці моладзі ў самасцвярджэнні, яе імкненне да лідэрства, у кіно і літаратуры з'явіўся станоўчы герой, нейкі супермен тыпу славутых Джэймса Бонда, Рэмба, Індыяна Джонса і да т. п. Гэтыя абаяльныя звышлюдзі надзелены смеласцю, спрытам, рашучасцю. Яны заўсёды атрымліваюць перамогу.

Сапраўднымі пачынальнікамі «масавай» культуры сталі бізнесмены з Галівуда. Яны распрацавалі цэлую сістэму вытворчасці такіх карцін, якія сёння запаланілі экраны ўсіх кінатэатраў свету. Цяпер усё часцей гавораць пра мастацкую экспансію амерыканскага кінематографа ў Еўропе, Азіі і Лацінскай Амерыцы.

Камерцыялізацыі паступова падвяргаліся кнігадрукаванне, прэса, жывапіс, музыка, фатаграфія.

Нельга абысці ўвагай і ўплыў «масавай» культуры на псіхіку чалавека. Услед за аўстрыйскім псіхолагам З. Фрэйдам большасць даследчыкаў лічаць, што тут дзейнічае механізм «унушэння і заражэння». Чалавек як бы перастае быць самім сабой, а становіцца часткай масы, уліваецца ў яе. Ён заражаецца «калектыўным настроем» і калі слухае рок-музыку або глядзіць кіно ў вялікай зале, і калі сядзіць дома каля тэлевізара. Пры гэтым людзі часта ствараюць сабе куміраў у асобе кіназорак, вядучых тэлепраграмы, мод

ных мадэльераў, папулярных пісьменнікаў, чаму актыўна дапамагае створаная вакол іх рэклама. У амерыканскага пісьменніка Эла Моргана ёсць раман «Великий человек». Перад яго героем — сціплым рэпарцёрам нечакана адкрываецца бліскучая перспектыва. У аўтамабільнай катастрофе гіне славуты акцёр Герб Фулер. Рэпарцёру прапануюць зрабіць спецыяльную перадачу пра яго. І ён сустракаецца з людзьмі, якія добра ведалі кінаакцёра. Пасля кожнай сустрэчы выяўляецца ўсё больш страшэнная неадпаведнасць паміж міфічным і сапраўдным Фулерам. «Великий человек» на справе аказаўся нікчэмным п'яніцай, распуснікам, цынікам, эгаістам і грубіянам. «Мы стварылі Фулера з падраных ануч»,— шчыра гаворыць магутны прэзідэнт тэлесеткі.

У «масавай» культуры многа назваў: пацяшальнае мастацтва, мастацтва антыстомы, кіч (ад нямецкага жаргоннага «халтура»), паўкультура. У 80-я гг. тэрмін «масавая культура» стаў прымяняцца радзей. Ён скампраметаваў сябе тым, што выкарыстоўваўся выключна ў адмоўным сэнсе. У наш час яго замяніла паняцце «папулярная культура», або поп-культура. Характарызуючы яе, амерыканскі філолаг Майкл Бел гаворыць: «Гэта культура дэмакратычная. Яна адрасавана ўсім людзям, без адрознення класаў, нацый, узроўню беднасці і багацця». Акрамя таго, дзякуючы сучасным сродкам масавай камунікацыі людзям сталі даступныя многія творы мастацтва, якія маюць высокую мастацкую каштоўнасць.

«Масавай» або поп-культуры часта супрацьпастаўляюць «эліТарную», складаную па зместу і цяжкую для ўспрымання. Гэта фільмы Феліні, Таркоўскага, кнігі Кафкі, Беля, Базена, Во́негута, карціны Пікасо, музыка Дзюваля, Шнітке. Творы, адпаведныя рамкам гэтай культуры, арыентаваныя на вузкае кола людзей, якія разбіраюцца ў мастацтве. Яны з'яўляюцца тэмай ажыўленых спрэчак сярод мастацтвазнаўцаў і крытыкаў, але масавы глядач можа не звярнуць на іх ніякай увагі або проста не зразумець.

Камерцыйная выгада не з'яўляецца мэтай для стваральнікаў элітарных твораў мастацтва, якія імкнуцца да наватарства, поўнага самавыяўлення і мастацкага ўвасаблення сваіх ідэй. Пры гэтым з'яўляюцца унікальныя творы мастацтва, якія часам (як гэта здарылася з фільмамі Ко́палы і Берталучы, з карцінамі Саль-

ватора Далі і Шамякіна) прыносяць іх стваральнікам не толькі прызнанне, але і немалы даход, таму што становяцца вельмі папулярнымі.

Памылкова было б лічыць, што «папулярная» і «элітарная» культуры варожыя адна адной. Дасягненні, мастацкія прыёмы, ідэі элітарнага мастацтва праз некаторы час перастаюць быць наватарскімі і пераймаюцца масавай культурай, павышаючы яе ўзровень. З другога боку, поп-культура прыносіць прыбытак і дае магчымасць кінакампаніям, выдавецтвам, дамам мадэляў падтрымліваць тварцоў элітарнага мастацтва.

У апошні час філосафы загаварылі пра з'яўленне экраннай культуры. Гэта звязана з камп'ютэрнай рэвалюцыяй. Экранная культура складваецца на аснове сінтэзу камп'ютэра з відэатэхнікай. Асабістыя кантакты і чытанне кніг адыходзяць на другі план. З'яўляецца новы тып зносін, заснаваны на магчымасцях свабоднага выхаду асобы ў свет інфармацыі. Такія, напрыклад, відэатэлефоны або электронныя банкі даных, камп'ютэрныя сеткі, якія дазваляюць атрымліваць на экране камп'ютэраў інфармацыю з архіваў, кнігасховішч, бібліятэк. Выкарыстанне камп'ютэрнай графікі дае магчымасць павялічыць хуткасць і якасць атрымання інфармацыі. Камп'ютэрная «старонка» нясе за сабой новы тып мыслення і адукацыі. Для яго характэрныя хуткасць, гібкасць, рэактыўнасць. Менавіта гэтай культуры належыць будучае.

Такім чынам, мы пазнаёміліся з некаторымі культурамі ў культуры сучаснага грамадства. Як вы думаеце, чаму былі выбраны якраз гэтыя культуры?

Дыялог культур

Мы ўжо гаварылі пра тое, што «масавая» і «элітарная» культуры ўзаемадзейнічаюць адна з адной. Пагаворым больш падрабязна пра дыялог розных культур і пра тое, што з'яўляецца вынікам гэтага дыялога.

Для прыкладу разгледзім нацыянальную і інтэрнацыянальную культуры. Крыніцы нацыянальных адрозненняў неабходна шукаць у гістарычных умовах фарміравання тых або іншых культур. Гэтыя адрозненні маюць глыбокія карані, якія адлюстроўваюць асаблівасці грамадскага жыцця той або іншай сацыяльна-гістарычнай або этнічнай супольнасці людзей, яе ўзаемасувязі з прыродай. Культурныя адрозненні — адна з крыніц разнастайнасці гістарычнага працэсу,

якае надае яму маляўнічасць і мнагамернасць. Кожная нацыянальная культура непаўторная, унікальная. І гэта непаўторнасць, незаменнасць азначае неабходнасць асабліва асцярожна да яе адносіцца.

З другога боку, ужо ў антычнай цывілізацыі ішоў працэс узаемадзеяння культур. Па меры таго як гісторыя станавілася сусветнай, узнікалі перадумовы для стварэння інтэрнацыянальнай культуры як у рамках асобных шматнацыянальных дзяржаў, так і ў маштабах усяго чалавецтва ў цэлым. Навукова-тэхнічны прагрэс, агульныя тэндэнцыі ў развіцці адукацыі, пастаяннае перамяшчэнне насельніцтва, сусветны падзел працы — гэтыя і іншыя фактары аказваюць уздзеянне на культуру і грамадскае жыццё ў напрамку іх далейшай інтэрнацыяналізацыі. Апошняя прыводзіць да ўзмацнення і паглыблення ўзаемапранікнення культур, але параджае і разнастайныя праблемы. Інтэрнацыяналізацыя сустракае супраціўленне там, дзе яна пашыраецца насільна. У некаторых краінах, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, імкненне да адасаблення нацыянальнай культуры з'яўляецца формай пратэсту супраць неакаланіялізму і засілля заходняй «масавай» культуры.

Ва ўмовах інтэрнацыяналізацыі абвастраюцца праблемы захавання культуры малых народаў. Некаторыя народнасці Поўначы не маюць сваёй пісьменнасці, а вусная мова хутка забываецца.

Гэтыя праблемы можна вырашыць толькі пры ўмове дыялога культур. Перш за ўсё гэта павінен быць дыялог «роўных і розных». Напрыклад, існаванне ў Швейцарыі трох дзяржаўных моў (нямецкай, французскай, італьянскай) стварае роўныя ўмовы для развіцця культур народаў гэтай краіны.

Дыялог дапускае таксама ўзаемапранікненне, узаемаўзбагачэнне. Невыпадкова культурны абмен (выстаўкі, канцэрты, фестывалі і г. д.) стаў добрай традыцыяй у жыцці сучаснай цывілізацыі. У выніку дыялога ствараюцца агульначалавечыя культурныя каштоўнасці, важнейшымі з якіх з'яўляюцца маральныя нормы, такія, як гуманізм, міласэрнасць, узаемадапамога.

Дыялог прыводзіць да ўзнікнення новай (якасці) — з'яўляецца транскультура — гэта адзінства ўсіх культур, якое ўяўляе сабой нешта іншае, новае, а не проста арыфметычная іх сума. У апавяданні Х. Л. Борхеса

«Алеф» апісваецца адзін надзвычай яркі пункт прасторы, у якім сабраны ўсе іншыя пункты. Пры гэтым робіцца гэта так, што яны не накладваюцца і не засланяюць адзін аднаго. Транскультура — гэта Алеф культурнага свету. Гэта дыялог, даведзены да лагічнага канца. Яна ствараецца на нашых вачах.

Пытанні і заданні

1. Што такое культура? Якія асноўныя яе віды? Чым адрозніваецца матэрыяльная культура ад духоўнай і што паміж імі агульнае?

2. У чым праяўляюцца традыцыі і наватарства ў культуры?

3. Якія культуры ў культуры вы ведаеце? Раскажыце пра іх.

4. Што такое дыялог культур? Прывядзіце прыклады такога дыялога ў рэальным жыцці.

5. В. Мандэльштам пісаў: «У свяшчэнным экстазе паэты гавораць на мовах усіх часоў, усіх культур. Для іх няма нічога немагчымага. Як пакой памяраючага адкрыты для ўсіх, так і дзверы старога свету насцеж расчынены перад натоўпам. Раптоўна ўсё стала набыткам агульным. Ідзіце і бярыце». Як гэта выказванне паэта звязана з праблемай пераемнасці ў культуры? У чым асаблівасць пераемнасці ў мастацтве?

6. Вядомая пісьменніца Рэталь Грэгар пісала: «Сучасны «масавы чалавек» глядзіць на тэлевізар з такім жа абажаннем, як на ікону. Ранейшыя веравызнанні старэюць, на змену ім прыходзяць новыя. Людзям абавязкова трэба ў што-небудзь верыць. Таму рана ці позна поп-культура выцясняе свайго канкурэнта — рэлігію». Ці згодны вы з такім выказваннем? Абгрунтуйце свой адказ.

7. Якія напрамкі сучаснай музыкі вы аднеслі б да «элітарнай» культуры, а якія да «масавай»?

8. К. Маркс пісаў, што людзі самі робяць сваю гісторыю, але яны робяць яе не так, як ім уздумаецца, пры абставінах, якія не самі яны выбралі, а якія непасрэдна ёсць у наяўнасці, дадзены ім і перайшлі з мінулага. Ці правільная гэта думка ў адносінах да развіцця культуры? Аргументуйце свой адказ.

9. Ствараючы алегарычны вобраз узаемадзеяння чалавека і масы, мастак-ілюстратар Вержыл Фінглей малюе велізарнае страшыдла з клыкастым усмешлівым ротам, гатовае сажраць чалавека. Які бок уздзеяння «масавай» культуры на асобу знайшоў адлюстраванне ў гэтым малюнку?

10. Кожная з навук, якая займаецца вывучэннем культуры грамадства, дае ёй сваё азначэнне. Напрыклад:

Гісторыя: культура з'яўляецца вынікам гістарычнага развіцця. У яе ўваходзіць усё тое, што людзі зрабілі і што перадаецца ад пакалення да пакалення — прылады, сімвалы, арганізацыі, агульная дзейнасць, погляды, вераванні.

Псіхалогія: культура — асобае прыстасаванне людзей да прыроднага навакольля і эканамічных праблем. Яна складаецца з усіх вынікаў такога прыстасавання.

Педагогіка: культура — гэта паводзіны, якім чалавек навучыўся, а не атрымаў у якасці біялагічнай спадчыны.

Якая агульная рыса культуры знайшла адлюстраванне ў гэтых азначэннях?

11. Успомніце, што такое плюралізм у палітыцы. Падумайце, ці можна гаварыць пра плюралізм у культуры. Аргументуйце свой пункт погляду.

12. Лонданская прэса ставіць у прамую залежнасць рост злачыннасці ў краіне (у 1983 г. на 25 % у параўнанні з 1978 г.) ад шырокага распаўсюджвання відэамагнітафонаў (на долю Англіі прыпадала $^1/_6$ частка ўсёй відэаапаратуры, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні ў свеце). Цяпер відэатэхніка атрымлівае шырокае распаўсюджанне і ў нашай краіне. Ці згодны вы з вывадамі англійскай прэсы? Аргументуйце свой пункт погляду.

§ 33. НАВУКА. АДУКАЦЫЯ

Вы ўжо ведаеце, што навука з'яўляецца адной з форм духоўнай культуры грамадства. Яе развіццё — важнейшы фактар абнаўлення ўсіх асноўных сфер жыццядзейнасці чалавека: і матэрыяльнай вытворчасці, і сацыяльна-палітычных адносін, і духоўнага жыцця.

Што такое навука?

Навуку ў цэлым можна разглядаць з трох пунктаў погляду: як асобую сістэму ведаў; як сістэму арганізацый і ўстаноў (напрыклад, галіновыя НДІ, Акадэмія навук, ВНУ), якія выпрацоўваюць, захоўваюць і распаўсюджваюць гэтыя веды; як асобы від дзейнасці — сістэму навуковых даследаванняў.

Зробім неабходныя тлумачэнні. Што трэба разумець пад словамі **асобая сістэма** ведаў? Чым навуковыя веды адрозніваюцца ад звычайнага чалавечага вопыту? Каб спрасціць нашу задачу, разгледзім некалькі прыкладаў, у якіх прадэманстраваны розныя віды ведаў. Чалавек, які што-небудзь ведае або ўмее рабіць, можа сказаць:

а) Я умею (ведаю як) вытачыць дэталь на такарным станку;

б) Я ведаю, як скласці праграму на мове Пралог або Ліспі для сучаснай ЭВМ;

в) Я ведаю, чаму падымаецца ў паветра і лятае апарат, які цяжэйшы за паветра (рэактыўны самалёт), я ўмею ім кіраваць і г. д.

Нават з гэтага кароткага пераліку відаць, наколькі разнастайныя веды чалавека, якіх розных прадметаў яны датычаць. Прыведзеныя ў гэтых прыкладах веды адносяцца да практычнай дзейнасці чалавека, іх можна назваць хутчэй за ўсё практычнымі ўменнямі.

А ў чым жа тады асаблівасць навуковых ведаў? У глыбокім пранікненні ў сутнасць з'яў, у іх тэарэ-

тычным характары. Навуковыя веды пачынаюцца тады, калі за сукупнасцю фактаў усведамляецца заканамернасць — агульная і неабходная сувязь паміж імі, што дазваляе растлумачыць, чаму дадзеная з'ява праходзіць так, а не інакш, прадказаць далейшае яе развіццё. З часам некаторыя навуковыя пазнанні пераходзяць у абсяг практыкі.

Непасрэдная мэта навукі — апісанне, тлумачэнне і прадказанне працэсаў і з'яў рэчаіснасці, г. зн. у шырокім сэнсе — тэарэтычнае яе адлюстраванне. Мова навукі істотна адрозніваецца ад мовы іншых форм культуры, мастацтва перш за ўсё. Яна больш выразная, больш строгая. Навука — гэта мысленне ў паняццях, мастацтва — у мастацкіх вобразах.

Функцыі сучаснай навукі

На розных этапах развіцця грамадства навуковыя веды выконвалі розныя функцыі. Мянялася і месца навукі ў залежнасці ад умоў яе развіцця і попыту на яе ў тыя або іншыя эпохі. Так, антычная навука абапіралася на вопыт матэматычных і астранамічных даследаванняў, назапашаны ў больш старажытных грамадствах (Егіпет, Месапатамія). Узнікшыя там элементы навуковых ведаў яна ўзбагаціла і развіла. Гэтыя навуковыя дасягненні былі даволі абмежаваныя. Але ўжо тады многія з іх актыўна выкарыстоўваліся ў земляробстве, будаўніцтве, гандлі, мастацтве.

Эпоха Адраджэння з яе пераважным інтарэсам да праблем чалавека і яго свабоды садзейнічала развіццю індывідуальнай творчасці і гуманітарнай адукацыі. Але толькі ў канцы гэтай эпохі стварыліся перадумовы для ўзнікнення і паскоранага развіцця новай навукі. Першым, хто зрабіў рашучы крок у стварэнні новага прыродазнаўства, якім пераадольвалася процілегласць навукі і практыкі, быў польскі астраном Мікалай Капернік. Капернікаўскім пераваротам, які пачаўся 4,5 стагоддзя назад, навука ўпершыню аспрэчыла ў рэлігіі яе права непадзельна вызначаць фарміраванне светапогляду. Для таго ж каб прыняць «геліяцэнтрычную» сістэму Каперніка, неабходна было не толькі адмовіцца ад некаторых догматаў рэлігіі, але і згадзіцца з уяўленнямі, якія супярэчылі звычайнаму ўспрыманню.

Павінна было прайсці нямала часу, перш чым навука змагла стаць вызначальным фактарам у рашэнні пы-

танняў першаступеннай светапоглядная значнасці, якія датычацца структуры матэрыі, будовы Сусвету, узнікнення і сутнасці жыцця, паходжання чалавека. Яшчэ больш часу спатрэбілася для таго, каб прапанаваныя навукай адказы на гэтыя і іншыя пытанні сталі элементамі агульнай адукацыі. Без гэтага навуковыя ўяўленні не маглі ператварыцца ў састаўную частку культуры грамадства. Так узнікла і ўмацавалася **культурна-светапоглядная функцыя** — адна з важнейшых для сучаснай навукі.

У XIX ст. мяняюцца адносіны паміж навукай і вытворчасцю. Такую важнейшую **функцыю навукі, як ператварэнне яе ў непасрэдную прадукцыйную сілу,** упершыню адзначыў К. Маркс у сярэдзіне мінулага стагоддзя, калі сінтэз навукі, тэхнікі і вытворчасці быў не столькі рэальнасцю, колькі перспектывай. Безумоўна, навуковыя веды і тады не былі ізаляваны ад тэхнікі, якая хутка развівалася, але сувязь паміж імі насіла аднабаковы характар: некаторыя праблемы, узнікшыя ў ходзе развіцця тэхнікі, станавіліся прадметам навуковага даследавання і нават давалі пачатак новым навуковым дысцыплінам. Прыкладам можа служыць стварэнне класічнай тэрмадынамікі, якая абагульніла багаты вопыт выкарыстання паравых рухавікоў.

З часам, аднак, прамыслоўцы і вучоныя пачалі бачыць у навуцы магутны каталізатар працэсу бесперапыннага ўдасканальвання вытворчасці. Усведамленне гэтага рэзка змяніла адносіны да навукі і з'явілася істотнай перадумовай яе рашаючага павароту ў бок практыкі. З рэвалюцыянізуючым уплывам навукі на сферу матэрыяльнай вытворчасці вы ўжо пазнаёміліся. Успомніце і прывядзіце прыклады гэтага ўплыву.

Сёння ў навуцы ўсё больш выразна выяўляецца яшчэ адна **функцыя — яна пачынае выступаць у якасці сацыяльнай сілы,** непасрэдна ўліваючыся ў працэс сацыяльнага развіцця. Найбольш ярка гэта праяўляецца ў сітуацыях, калі даныя і метады навукі выкарыстоўваюцца для распрацоўкі маштабных планаў і праграм сацыяльнага і эканамічнага развіцця. Напрыклад, такіх, як праграма эканамічнай і палітычнай інтэграцыі краінчленаў ЕЭС, праграм пераходу эканомікі нашай краіны да рынку.

Істотным з'яўляецца комплексны характар падобных планаў, якія маюць на ўвазе ўзаемадзеянне гуманітарных і тэхнічных навук. Сярод гуманітарных

асабліва важную ролю пры гэтым адыгрываюць палітычная эканомія, філасофія, сацыялогія, псіхалогія, паліталогія, г. зн. грамадскія навукі.

Вельмі важная функцыя навукі як сацыяльнай сілы ў рашэнні глабальных праблем сучаснасці. У якасці прыкладу тут можна ўзяць экалогію. Вядома, што навука — адзін з фактараў тых зусім не бяскрыўдных змен, якія адбываюцца сёння ў сферы пражывання чалавека. Гэтага не ўтойваюць і самі вучоныя. Яны былі сярод тых, хто першымі сталі падаваць сігналы трывогі. Цяпер яны спрабуюць не толькі дакладна вызначыць маштабы экалагічнай небяспекі, але і знайсці шляхі яе пераадолення.

Такім чынам, навука аказвае комплекснае ўздзеянне на грамадскае жыццё, асабліва інтэнсіўна закранаючы тэхніка-эканамічнае развіццё і кіраванне грамадствам.

Этыка навукі

У навуцы, як і ў любой галіне чалавечай дзейнасці, узаемаадносіны паміж тымі, хто ў ёй заняты, і дзеянні кожнага з іх падпарадкоўваюцца пэўнай сістэме этычных норм, якія вызначаюць, што дапушчальна, што заахвочваецца, а што лічыцца недазволеным і непрымальным для вучонага ў розных сітуацыях. Гэтыя нормы можна падзяліць на тры групы.

Да першай адносяцца агульначалавечыя патрабаванні і забароны, такія, як «не ўкрадзі», «не хлусі», прыстасаваныя, зразумела, да асаблівасцей навуковай дзейнасці. Напрыклад, як штосьці падобнае на крадзеж, ацэньваецца ў навуцы плагіят, калі чалавек выдае навуковыя ідэі, вынікі, атрыманыя кім-небудзь іншым, за свае.

Да другой групы адносяцца этычныя нормы навукі, якія служаць для ўстанаўлення і абароны спецыфічных, характэрных якраз для навукі каштоўнасцей. Прыкладам такіх норм з'яўляецца бескарыслівы пошук і адстойванне ісціны. Шырока вядомы афарызм Арыстоцеля: «Платон мне сябар, але ісціна даражэйшая», сэнс якога ў тым, што ў імкненні да ісціны вучоны не павінен лічыцца ні са сваімі сімпатыямі і антыпатыямі, ні з якімі б то ні было іншымі навуковымі меркаваннямі. Гісторыя навукі з удзячнасцю шануе імёны людзей, якія не адракліся ад сваіх навуковых перакананняў у час надзвычай цяжкіх выпрабаванняў і нават перад тварам самой смерці. Успомніце трагічны лёс

славутага вучонага М. І. Вавілава, які памёр ад голаду і хвароб у Саратаўскай турме НКУС. Менавіта яму належаць словы: «Мы на крыж пойдзем, а ад сваіх перакананняў не адмовімся».

Да трэцяй групы адносяцца маральныя правілы, якія датычаць узаемаадносін навукі і вучонага з грамадствам. Гэты круг этычных норм часта абазначаюць як праблему свабоды навуковага пошуку і сацыяльнай адказнасці вучонага. Праблема сацыяльнай адказнасці вучонага мае глыбокія гістарычныя карані. На працягу стагоддзяў, з часу зараджэння навуковага пазнання, вера ў сілу розуму суправаджалася сумненнямі: як будуць выкарыстоўвацца яго тварэнні? Ці з'яўляюцца веды сілай, якая служыць чалавеку, і ці не абернуцца яны супраць яго?

Сёння, калі так востра паўсталі праблемы неадназначнасці, а іншы раз і небяспечнасці сацыяльных вынікаў навуковых даследаванняў, гэтыя пытанні сталі асабліва актуальнымі.

Звернемся да прыкладу. Сярод галін навуковых ведаў, у якіх актуальна праблема сацыяльнай адказнасці вучонага за вынікі яго дзейнасці, асобае месца займаюць генная інжынерыя, біятэхналогія, біямедыцынскія і генетычныя даследаванні чалавека. Бясспрэчныя дасягненні гэтых навук спалучаюцца з растучай для чалавецтва небяспекай непрадуманага або зламыснага выкарыстання іх метадаў або адкрыццяў, што можа прывесці да з'яўлення так званых арганізмаў-мутантаў з зусім новымі спадчыннымі ўласцівасцямі, якія раней не сустракаліся на Зямлі і эвалюцыйна не абумоўлены. Менавіта таму, напрыклад, суд у Германіі забараніў канцэрну «Хехст» дабудоўваць устаноўку па вытворчасці інсуліну з дапамогай генна-інжынернай тэхналогіі, хоць канцэрн ужо ўлажыў у яе 60 млн долараў, і такі інсулін вырабляецца ў іншых краінах. Фармулёўка суда была наступнай: «Генная інжынерыя ўяўляе сабой новую якасць у тэхналогіі, звязаную з рызыкай для існавання чалавека, якое не можа быць адэкватна ацэнена ў цяперашні час».

Такога ж характару боязь прымусіла ў 1975 г. вядучых вучоных свету добраахвотна заключыць мараторый на цэлы рад даследаванняў у гэтай галіне.

Развіццё геннай інжынерыі і блізкіх ёй галін ведаў прымушае ў многім па-новаму асэнсаваць сувязь свабоды і адказнасці ў дзейнасці вучоных. На працягу

стагоддзяў многім з іх не толькі словам, але і справай даводзілася сцвярджаць і абараняць прынцыпы свабоднага навуковага пошуку перад тварам невуцтва, фанатызму, забабонаў. Сёння ідэя неабмежаванай свабоды даследавання, якая была, безумоўна, прагрэсіўнай на працягу многіх стагоддзяў, ужо не можа прымацца безагаворачна без уліку сацыяльнай адказнасці. Ёсць жа адказная свабода і ёсць прынцыпова процілеглая ёй свабодная безадказнасць, якая тоіць у сабе пры сучасных і будучых магчымасцях навукі вельмі вялікую небяспеку для чалавека і чалавецтва.

Адукацыя

«Усякая перабудова грамадства заўсёды звязана з перабудовай школы. Патрэбны новыя людзі, сілы — іх павінна падрыхтаваць школа. Дзе грамадскае жыццё прыняло пэўную форму, там і школа адпаведна ўстанавілася і цалкам адпавядае настрою грамадства». Напісаныя ў другой палавіне XIX ст., гэтыя словы не страцілі сваёй актуальнасці і цяпер.

У жыцці кожнага чалавека ідзе працэс сацыялізацыі — засваення сацыяльнага вопыту. Ён ажыццяўляецца двума шляхамі: у ходзе стыхійнага ўплыву абставін жыцця на асобу і ў выніку мэтанакіраванага ўздзеяння грамадства на чалавека, г. зн. у працэсе выхавання. Такое мэтанакіраванае ўздзеянне аказваецца перш за ўсё праз тую сістэму адукацыі, якая склалася ў грамадстве і адпавядае яго патрабаванням. Але грамадства неаднароднае: кожны клас, сацыяльная група, нацыя маюць сваё ўяўленне аб змесце адукацыі. З гісторыі вядома, што, як толькі заходзіла размова пра вызначэнне зместу канкрэтных вучэбных курсаў, тут жа ўзнікалі палітычныя, навуковыя, рэлігійныя і іншыя рознагалоссі. Адсюль узнікла неабходнасць дзяржаўнага рэгулявання сістэмы адукацыі, якая з'яўляецца актуальнай для сучаснай цывілізацыі.

Звернемся да прыкладаў. Шведская школа ў век камп'ютэрызацыі... Грамадству патрэбны высокаадукаваныя, упэўненыя ў сабе людзі, якія ўмеюць прымаць адказныя рашэнні і добра знаёмыя з асновамі сучаснай тэхнікі. Што для гэтага робіцца? Ажыццяўляецца індывідуальны падыход да вучня, улічваюцца асаблівасці яго асобы. Для правядзення ў жыццё гэтай ідэі неабходна мець дастатковую колькасць настаўнікаў. У 70-я гг. у Швецыі на аднаго настаўніка прыпадала 19 вучняў, цяпер — толькі 9. Адсутнасць адзнак да 8-га

класа захоўвае псіхалагічную раўнавагу школьнікаў. Дэмакратызм сістэмы адукацыі заключаецца ў тым, што фактычна няма школ для асабліва таленавітых вучняў. У адукацыі існуе культ матэматыкі — гэта адзнака часу. «Адукацыя тым больш паўнацэнная, чым больш матэматыкі»,— лічаць шведы. Можна спрачацца наконт правільнасці тых або іншых падыходаў гэтай дзяржавы да сістэмы адукацыі, але важна, што краіна поўнасцю забяспечвае сябе кваліфікаванымі спецыялістамі.

Заходнееўрапейскіх менеджэраў, фінансістаў, журналістаў, дэпутатаў, выкладчыкаў і чыноўнікаў установ папрасілі назваць краіны, дзе, на іх думку, падрыхтоўка маладых спецыялістаў ажыццяўляецца найбольш эфектыўна. У галіне «інжынерынга» з вялікім адрывам першае месца прысуджана выпускнікам заходнегерманскіх вузаў. У чым жа сакрэт такога высокага ўзроўню тэхнічнай адукацыі? Па еўрапейскіх мерках у Германіі выпускаюць многа інжынераў: штогод 25 тыс. чалавек, г. зн. у 2 разы больш, як у суседняй Францыі. На тэхнічныя факультэты можа паступіць любы малады чалавек, які атрымаў поўную сяроднюю адукацыю. Да сістэмы вышэйшай адукацыі Германіі непрыдатна паняцце «падрыхтоўка інжынера». Інжынера рыхтуюць строга запраграміравана або для работ на вытворчасці ў строгай адпаведнасці з будучай спецыяльнасцю, або для сістэмы навукова-даследчыцкіх і вопытна-канструктарскіх работ. Для студэнтаў адукацыя фактычна бясплатная, што, аднак, не зрабіла іх адносіны да дыплома менш адказнымі. Тэарэтычна завяршыць поўны курс можна за 8—9 семестраў, але многія студэнты вучацца ў інстытуце 12—14. Кампаніям патрэбны спецыялісты, а не ўладальнікі дыпломаў, таму студэнты лічаць за лепшае вучыцца не спяшаючыся. Высокая якасць адукацыі дасягаецца яе сувяззю з практыкай. Спецыялізацыя будучых інжынераў пачынаецца з першага семестра, а работа над дыпломам спалучаецца з 26 тыднёвай стажыроўкай на прамысловым прадпрыемстве.

У сучасным свеце існуе велізарная колькасць разнастайных тыпаў школ і іншых навучальных устаноў: гэта квакерскія школы ў Англіі, якія даюць рэлігійна-пацыфісцкую* адукацыю, агульнаадукацыйныя школы і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы ў нашай краіне, духоўныя семінарыі ва ўсіх хрысціян-

* *Пацыфізм* — палітычная плынь, якая характарызуецца пасіўнай пропаведдзю міру і асуджэннем войнаў.

скіх краінах і медрэсэ ў мусульманскіх дзяржавах Усходу, універсітэты, каледжы, тэхнічныя школы. Але ў гэтай надзвычайнай разнастайнасці сістэм і відаў адукацыі можна прасачыць агульныя напрамкі яе развіцця ў сучасным свеце.

Вылучым невялікі, але актуальны круг праблем. Гэта перш за ўсё праблема пераадолення непісьменнасці. У нашы дні кожны чацвёрты жыхар зямнога шара не ўмее чытаць і пісаць. Колькасць непісьменных складае 1 млрд чалавек. У той жа час імкненне ахапіць адукацыяй усіх прывяло да зніжэння яе якасці. Пра нізкі ўзровень ведаў гаворыць, напрыклад, такі факт: 13 % школьнікаў СССР і 14 % у ЗША не змаглі знайсці сваю краіну на карце.

Адставанне школы ад сучасных патрабаванняў выклікала цікавую з'яву — амаль адначасовыя школьныя рэформы ў розных краінах. «Мэтай рэформ,— гаварылася ў дакуменце ўрада ЗША,— павінна быць дасягненне высокай якасці адукацыі ва ўсіх сферах». «Некаторых паляпшэнняў у школьнай адукацыі недастаткова,— сцвярджаюць аўтары рэформ у Вялікабрытаніі.— Мы павінны павысіць якасць адукацыі». Аналагічнымі былі мэты школьных рэформ у Балгарыі, Венгрыі, СССР, Францыі... Экстэнсіўны шлях развіцця школы (падумайце, у чым яго асаблівасці) вычарпаў сябе ў вядучых краінах свету. Іх сучасная стратэгія ў дадзенай галіне — дасягненне якасці, якая адпавядае патрабаванням XXI стагоддзя. Для гэтага праводзіцца гуманізацыя, гуманітарызацыя і інтэрнацыяналізацыя адукацыі.

Гуманізацыя прадугледжвае вялікую ўвагу з боку грамадства да асобы, яе псіхалогіі, інтарэсаў, запатрабаванняў. Асаблівая ўвага ўдзяляецца маральнаму выхаванню чалавека. Многа робіцца для далучэння да адукацыі інвалідаў. Напрыклад, дзеючае ў Францыі заканадаўства гарантуе маладым інвалідам, якія імкнуцца атрымаць вышэйшую адукацыю, рад істотных прывілей: яны маюць права на замацаванне за імі пастаянных памочнікаў; кіраўніцтва ВНУ абавязана пераабсталяваць вучэбныя аўдыторыі так, каб палегчыць доступ у іх студэнтаў з парушанымі рухальнымі функцыямі. У фінансавых адносінах людзі, пашкоджаныя фізічнай немаччу, карыстаюцца перавагамі пры атрыманні стыпендыі і могуць патрабаваць кампенсавання транспартных расходаў. Падобныя спрыяльныя

ўмовы далі свой вынік: у 1990 г. у Парыжскіх універсітэтах вучылася 400 інвалідаў, у Туры — 100, у Грэноблі — 60.

Гуманітарызацыя мае намер узмацніць увагу грамадства да вывучэння грамадскіх дысцыплін, якія маюць першаступеннае значэнне ў жыцці сучаснага чалавека. Гэта перш за ўсё эканамічная тэорыя, сацыялогія, паліталогія. У школах Германіі існуе абавязковы курс — уводзіны ў сацыяльнае права, які знаёміць вучняў з асновамі палітычных і прававых ведаў.

Інтэрнацыяналізацыя прадугледжвае стварэнне адзінай сістэмы адукацыі для розных краін. Асабліва хутка гэты працэс ідзе ў тых галінах, якія займаюцца падрыхтоўкай спецыялістаў, вельмі неабходных у сучасных умовах. Для патрэб краін ЕЭС была створана еўрапейская школа бізнесу. Яе філіялы знаходзяцца ў Парыжы, Оксфардзе, Берліне, Мадрыдзе. У 1989 г. са 170 прынятых у яе студэнтаў 43 % склалі французы, 20 % — немцы, 10 % — іспанцы і англічане, 17 % прыпадала на іншыя народы.

Кіраўнікі каледжаў і універсітэтаў у Японіі купляюць цэлыя студэнцкія гарадкі ў Францыі, ЗША, Італіі для таго, каб даць сваім выхаванцам вопыт знаёмства з іншым светапоглядам і ідэямі. Прыведзеныя прыклады даказваюць, што адукацыя сёння разглядаецца чалавецтвам як адна з асноўных каштоўнасцей, без якой немагчыма далейшае развіццё грамадства.

Пытанні і заданні

1. Што такое навука?
2. У чым заключаецца праблема этыкі ў навуцы?
3. Якая роля адукацыі ў жыцці сучаснага грамадства?
4. «У навуковым вывучэнні прадметаў дзве асноўныя, або канчатковыя, мэты: прадбачанне і карысць»,— сцвярджаў Д. І. Мендзялееў. Як вы разумееце сэнс гэтых слоў?
5. Французскі сацыёлаг Жак Эмоль у дакладзе на міжнароднай канферэнцыі ў ЗША ў 1962 г. сказаў: «Дзе мае месца тэхніка, там немагчыма эвалюцыя цывілізацыі... Усякае раскаянне дарэмнае, любая надзея на зварот да мінулага стану нерэальная». Чым выкліканы песімізм яго слоў? Ці згодны вы з ім?
6. Прэзідэнт ЗША Дж. Кенэдзі ў спецыяльным пасланні кангрэсу адзначыў: «Перад нашай нацыяй не стаіць больш важнай задачы, як распаўсюджванне і ўдасканальванне магчымасцей адукацыі для ўсяго нашага народа... Адукацыя — гэта найбольш выгаднае капіталаўкладанне, якое можа зрабіць грамадства, і адначасова самая багатая ўзнагарода, якую яно можа прысудзіць». Як вы разумееце сэнс гэтага выказвання? Чаму прэзідэнт ЗША надае такое значэнне адукацыі?

7. Вучоныя лічаць сучасную навуку прадуктам эпохі Адраджэння, яе культуры, вельмі супярэчлівай, але перамогшай традыцыі сярэдневякоўя. Як вы думаеце, чаму сучасная навука зарадзілася якраз у гэты час? Якія вывады вынікаюць з гэтага факта?

8. Што ў нашы дні трэба разумець пад словамі паэта аб тым, што першы абавязак культурнага чалавека — у асвеце быць з векам нароўні?

9. Выказваецца ідэя пра неабходнасць прававога рэгулявання пытанняў этыкі ў навуцы, г. зн. дакладнага рэгламентавання, на якую тэму можна весці даследаванне, а на якую нельга. Як вы ставіцеся да гэтай ідэі?

10. Карыстаючыся матэрыяламі сродкаў масавай інфармацыі, раскрыйце функцыі сучаснай навукі.

11. Больш як 80 гадоў назад У. М. Бехцераў, выступаючы на адкрыцці інстытута ў Пецярбургу, сказаў: «У наш час вышэйшыя школы маюць толькі прафесійныя задачы, яны рыхтуюць юрыстаў, урачоў, архітэктараў і г. д. Але пры гэтым упушчана з-пад увагі: у цэнтр гэтай работы павінен быць пастаўлены чалавек; для дзяржавы, акрамя прафесійных дзеячаў, патрэбны асобы, якія разумелі б, што такое чалавек, як і па якіх законах развіваецца яго псіхіка». Як вы думаеце, ці захавала гэта выказванне сваю актуальнасць? Чаму?

§ 34. РЭЛІГІЯ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ

Адной з самых старажытных форм культуры з'яўляецца рэлігія. На ўроках гісторыі і з папярэдніх раздзелаў нашага курса вы даведаліся, што рэлігійныя ўяўленні людзей зарадзіліся ў глыбокай старажытнасці. Яны таксама, як і рэлігійныя абрады і культы, адрозніваліся вялікай разнастайнасцю. Важнай вяхой у гісторыі чалавецтва стала з'яўленне сусветных рэлігій: будызму, хрысціянства, мусульманства.

На пэўнай стадыі развіцця рэлігіі ўзнікае царква. У яе ўлонні складваецца духоўная іерархія, паяўляюцца свяшчэннікі. Царква аб'ядноўвае веруючых аднаго веравызнання, распрацоўвае адзіныя нормы іх паводзін.

Не страціла свайго значэння рэлігія і ў нашы дні.

Роля рэлігіі ў сучасным свеце

Звернемся да лічбаў. Па даных амерыканскага інстытута Гэлапа, у 1985 г. верылі ў бога і найвышэйшую істоту 95 % жыхароў Амерыкі, 96 % — Лацінскай Амерыкі, 94 % — ЗША, 89 % — Азіі, 78 % — Заходняй Еўропы.

Даныя, якія сведчаць аб шырокім распаўсюджанні рэлігіі, яшчэ не адлюстроўваюць яе ролю ў сучасным грамадстве. Гэту ролю цяжка ацаніць адназначна, таму што рэлігія аказвае вельмі **супярэчлівы** ўплыў на розныя сферы жыцця людзей.

Пачнём з характарыстыкі ўздзеяння рэлігіі на духоўнае жыццё чалавека, перш за ўсё на маральнасць. Пропаведзь абсалютных (вечных, нязменных) маральных каштоўнасцей была характэрнай для ўсіх рэлігій свету і засталася актуальнай у наш век, поўны зла і насілля. 211-ы аят Карана абвяшчае: «Што вы выдаткоўваеце з дабра, тое — бацькам, блізкім, сіротам, бедным падарожным. Што б вы ні рабілі з дабра — сапраўды Алах пра тое ведае». Здзіўляе мудрасць запаведзей, абвешчаных у Нагорнай пропаведзі Хрыста: «Кожны, хто гневаецца на брата свайго дарэмна, падлягае суду», «Калі даяце міласціну — не званіце аб гэтым», «Не збірайце сабе скарбаў на зямлі», «Не судзіце — дык не суджаны будзеце». Падумайце, як вы разумееце сэнс кожнай з гэтых запаведзей.

Прыведзеныя маральныя правілы не толькі не страцілі свайго значэння, але і набылі новы глыбокі сэнс, таму што звернуты ўнутр чалавека. З іх дапамогай людзі, стомленыя ад сацыяльных катастроф, могуць заглянуць у сябе і яшчэ раз задумацца аб сэнсе свайго жыцця. Ды і самі служкі культу садзейнічаюць таму, каб чалавек прыйшоў падумаць менавіта ў храм: знаходзяць час для няспешнай гутаркі, умеюць слухаць, маўчаць, дапамагчы парадай і справай. Яны часта звяртаюцца са словамі суцяшэння да самых «прапашчых» слаёў грамадства — злачынцаў. Напрыклад, хор евангелісцкіх хрысціян-баптыстаў рэгулярна з дабрачыннымі канцэртамі наведвае калоніі, дзе адбываюць пакаранне жанчыны.

Ва ўсе часы адным з галоўных фактараў, якія падтрымліваюць рэлігійнасць, быў страх, разгубленасць чалавека перад пагрозай смяртэльнай небяспекі, невырашальных у дадзеных умовах праблем. Часта невылечна хворыя, адзінокія, страціўшыя надзею людзі шукаюць суцяшэння ў бога, пачынаюць верыць у цуды. Царква не пакідае без сваёй увагі і гэту катэгорыю людзей. Яна праяўляе сапраўдную міласэрнасць. Так, у адной з маскоўскіх бальніц працуюць прыхаджане і свяшчэннаслужыцелі Елахоўскага сабора. Яны даглядаюць цяжкахворых.

Асабліва ўзрастае ўплыў царквы ў пераломныя моманты гісторыі. Там, дзе старыя ідэалы грамадства страчваюць сваю каштоўнасць, а новыя яшчэ не паспелі ўзнікнуць, на дапамогу прыходзіць рэлігія са сваімі вечнымі маральнымі запаведзямі. Так было ў Польшчы.

З абвастрэннем крызісу ў краіне значна павялічыўся прыток веруючых у касцёлы. Цяпер гэта адбываецца і ў нашай краіне, дзе ў апошні час назіраецца небывалы інтарэс да рэлігіі сярод розных слаёў насельніцтва. Падумайце, у чым ён выяўляецца. Прывядзіце прыклады.

Рэлігія спрадвеку была носьбітам культурных каштоўнасцей. Яна сама з'яўляецца адной з форм культуры. Велічныя храмы, яркія фрэскі і абразы, цудоўныя літаратурныя і рэлігійна-філасофскія творы, царкоўныя абрады, маральныя запаведзі надзвычай узбагацілі культурны фонд чалавецтва. Сярод іх храм Васілія Блажэннага і сабор Парыжскай багамацеры, Рублёўская троіца і фрэскі Сімона Ушакова, працы Салаўёва, Бярдзяева, Фларэнскага, Біблія і Каран, абрады хрышчэння і вянчання і г. д.

У цяперашні час адной з галоўных задач царквы стала захаванне гэтых культурных помнікаў. І яна з ёй добра спраўляецца. Нездарма ў апошні час у нашай краіне дзяржава вяртае ў рукі веруючых культавыя будынкі.

Далей звернемся да палітычнага жыцця грамадства. Нягледзячы на аддзяленне царквы ад дзяржавы, у многіх краінах захоўваецца палітычны ўплыў царквы. Адзначым у гэтай сувязі прысягу на Біблії ў судзе і пры ўступленні на некаторыя пасады, напрыклад на пасаду прэзідэнта ЗША. У амерыканскіх узброеных сілах маюцца ваеннаслужачыя капеланы (свяшчэннікі каталіцкай царквы). Іх функцыі заключаюцца ў абслугоўванні рэлігійных патрэбнасцей салдат і афіцэраў і ўздзеянні на асабовы склад у духу, адпаведным інтарэсам дадзенай дзяржавы. Царква ўдзельнічае і ў палітычным жыцці многіх дзяржаў. Яркім прыкладам могуць служыць створаныя ў некаторых краінах Заходняй Еўропы партыі, якія аб'ядноўваюць веруючых і выражаюць іх сацыяльныя інтарэсы. Некаторым з іх: Хрысціянска-дэмакратычнай партыі ў Італіі і Хрысціянска-дэмакратычнаму саюзу ў Германіі ўдалося стаць кіруючымі. Удзел царквы ў палітычных і грамадскіх рухах праяўляецца ў дзейнасці клерыкальных прафсаюзаў, маладзёжных і жаночых арганізацый, студэнцкіх саюзаў, сялянскіх таварыстваў, кааператываў. Праз іх яна ўздзейнічае на самыя розныя слаі насельніцтва.

Царква сёння выступае актыўным удзельнікам ба-

рацьбы за мір. Цэнтральнае месца ў прапаведніцкай дзейнасці рымскага папы Іаана Паўла II займае праблема ліквідацыі вайны з жыцця чалавецтва. «Дасягнуты прагрэс пераходзіць у сваю процілегласць. Ён параджае розныя пагрозы чалавеку, у першую чаргу пагрозу тэрмаядзернай вайны. Толькі першынство маральнасці над тэхнікай можа садзейнічаць вырашэнню глабальных праблем»,— лічыць папа Іаан Павел II.

Прагрэсіўны пачатак праяўляецца і ў дзейнасці сусветнага Савета хрысціянскіх цэркваў, які адкрыта асуджае расізм і каланіялізм, перыядычна выдзяляючы значныя грашовыя сродкі на падтрымку антырасісцкіх рухаў.

Рэлігійныя дзеячы прымаюць удзел у вырашэнні экалагічных праблем. У маі 1989 г. у Швейцарыі ў г. Базелі адбылася Усееўрапейская ўсехрысціянская асамблея, якая сабрала 20 тыс. прадстаўнікоў хрысціянскіх цэркваў. Яна заклікала хрысціян Еўрапейскага кантынента звярнуцца да сваіх урадаў з просьбай зрабіць усё, што ад іх залежыць, каб прадухіліць драпежніцкае выкарыстанне прыродных рэсурсаў і захаваць навакольнае асяроддзе.

Дагэтуль мы гаварылі пра **аб'яднальную** ролю рэлігіі ў жыцці сучаснага грамадства. Тут яна выступае як сіла, якая згуртоўвае людзей на аснове высокіх маральных каштоўнасцей; агульных сацыяльных інтарэсаў, калі размова ідзе пра хрысціянскія або ісламскія партыі, прафсаюзы і іншыя арганізацыі; на аснове сумеснай дзейнасці, накіраванай на вырашэнне агульначалавечых праблем.

У той жа час адрозненні ў рэлігійных поглядах могуць стаць фактарам, які раз'ядноўвае людзей.

Адной з найбольш вострых праблем сучаснага свету з'яўляецца праблема рэлігіі і вайны. «Свяшчэннай», патрэбнай богу, абвясцілі Іран і Ірак, якія проціборствуюць, вайну 1980 г., дзе загінулі тысячы людзей. Па волі Алаха, як заяўляе Садам Хусейн, адбылася акупацыя Кувейта ў 1990 г. У выніку ўспыхнуў буйнейшы міжнародны канфлікт, пачалася вайна ў зоне Персідскага заліва. Не адышоў у мінулае рэлігійны экстрэмізм*.

Прыкладам можа служыць узнікшы ў 80-я гг. рух

---

* *Экстрэмізм* — прыхільнасць да надзвычайных поглядаў і захадаў у палітыцы.

сікхаў (індыйская рэлігійная абшчына) за стварэнне сваёй нацыянальнай дзяржавы Халістан. У барацьбе за ажыццяўленне гэтай ідэі яны пайшлі па шляху арганізацыі палітычных забойстваў. Ахвярамі тэрарыстаў сталі ні ў чым не вінаватыя грамадзяне, рэлігійныя і грамадскія дзеячы. Кульмінацыйным пунктам у ланцугу страшэнных злачынстваў стала забойства 31 кастрычніка 1984 г. прэм'ер-міністра Індыі Індзіры Гандзі.

Часам царква ўмешваецца ў дзяржаўныя справы, жадаючы ўмацаваць кансерватыўныя традыцыі. У выбарчай кампаніі 1988 г. у ЗША актыўны ўдзел прымалі рэлігійныя фундаменталісты*, якія выступалі за ўвядзенне абавязковых малітваў у школах, забарону абортаў, абмежаванне палітычнай актыўнасці жанчын.

Супярэчлівае ўздзеянне рэлігіі на асобу. З аднаго боку, яна заклікае яе прытрымлівацца высокіх маральных норм, далучае да культуры. З другога — многія рэлігійныя абшчыны прапаведуюць пакорлівасць, адказ ад актыўных дзеянняў.

Разнастайнасць рэлігій. Верацярпімасць

На чым жа адыгрываюцца тыя, хто імкнецца выкарыстаць рэлігію як сілу, якая раз'ядноўвае людзей? Перш за ўсё на разнастайнасці рэлігійных вераванняў, сект, царкоўных арганізацый. Тут мы сустракаем і розныя формы політэізму (мнагабожжа), якія вядуць традыцыі ад першабытных рэлігій (вера ў духаў, пакланенне раслінам, жывёлам, душам памёршых). З імі суседнічаюць розныя формы монатэізму (адзінабожжа). Гэта нацыянальныя рэлігіі: канфуцыянства (Кітай), маздаізм (Іран), іудаізм (Ізраіль) і г. д.— і сусветныя рэлігіі, якія былі сфарміраваны ў эпоху ўзнікнення сусветных імперый і знайшлі сабе прыхільнікаў сярод розных народаў, што гавораць на розных мовах: будызм, хрысціянства, іслам. Менавіта сусветныя рэлігіі робяць найбольш значны ўплыў на развіццё сучасных цывілізацый. Што ж яны сабой уяўляюць?

Будызм (у перакладзе — «прасвятленне») — самая ранняя па часу паяўлення сусветная рэлігія. Найбольшае распаўсюджанне атрымала ў Азіі. Цэнтр цяжару будыйскага вучэння ляжыць у маральнай галіне, у нор-

* *Рэлігійны фундаменталізм* — плынь, якая выступае супраць перагляду ўстарэлых рэлігійных паняццяў.

мах паводзін чалавека. Праз роздум і сузіранне чалавек можа дасягнуць ісціны, знайсці правільны шлях выратавання і, прытрымліваючыся запаведзей святога вучэння, прыйсці да дасканаласці. Элементарныя, абавязковыя для ўсіх запаведзі зводзяцца да пяці: не забіваць ні адной жывой істоты, не браць чужой уласнасці, не дакранацца да чужой жонкі, не гаварыць няпраўды, не піць віна. Але для тых, хто імкнецца дасягнуць дасканаласці, гэтыя пяць забарон развіваюцца ў цэлую сістэму значна больш строгіх законаў. Забарона забойства зводзіцца да таго, што нельга забіваць нават непрыметных для вока насякомых. Забарона браць чужую ўласнасць замяняецца патрабаваннем адказацца ад усякай уласнасці наогул і г. д.

Адна з важнейшых запаведзей будызму — любоў і міласэрнасць да ўсіх жывых істот. Будызм прадпісвае пры гэтым не рабіць розніцы паміж імі і адносіцца з аднолькавай добразычлівасцю да добрых і злых, да людзей і жывёл. Паслядоўнік Буды ні ў якім разе не павінен плаціць злом за зло, таму што пры гэтым не знішчаюцца, а толькі ўзрастаюць варожасць і пакута. Нельга нават абараняць іншых ад насілля і караць за забойства. Паслядоўнік Буды павінен спакойна, цярпліва адносіцца да зла, ухіляючыся толькі ад удзелу ў ім.

У цяперашні час самую значную грамадска-палітычную і культурную ролю будызм адыгрывае ў краінах паўвостраў Індакітай. У Бірме, Камбоджы, Тайландзе ён выступае як дзяржаўная рэлігія. У Японіі будызм, разбіўшыся на мноства сект, пераплятаецца з нацыянальным сінтаізмам, утварыўшы так званыя новыя рэлігіі.

У 1950 г. утварылася «Сусветнае Брацтва будыстаў», у 1970 г.— «Азіяцкая будысцкая канферэнцыя за мір». Насуперак асноўнай ідэі будысцкага веравучэння, гэтыя арганізацыі актыўна ўдзельнічаюць у міжнароднай палітыцы, у барацьбе за мір. Асаблівасцю сучаснага будызму з'яўляецца тое, што ён усё больш ператвараецца з рэлігіі ў нейкае філасофскае вучэнне, своеасаблівую сістэму маралі.

Хрысціянства — другая па часу ўзнікнення з сусветных рэлігій. У цяперашні час гэта самая распаўсюджаная рэлігія. Яе прыхільнікаў звыш 1024 млн чалавек (у Еўропе і Амерыцы). Правілы маралі хрысціянства выказаны ў запаведзях Майсея: «Не забівай», «Не крадзі», «Не пралюбадзейнічай», «Шануй бацьку твайго і

маці тваю», «Не рабі сабе куміра», «Не вымаўляй імя госпада бога дарэмна»...

Цэнтральнай ідэяй хрысціянства з'яўляецца ідэя грэшнасці чалавека як прычыны ўсіх яго няшчасцяў і вучэнне аб пазбаўленні ад грахоў пры дапамозе малітваў і пакаяння. Пропаведзь цярплівасці, пакоры, даравання крыўд бязмежная: «Любіце ворагаў вашых»,— вучыць Ісус.— «Благаслаўляйце тых, хто праклінае Вас, дзякуйце тым, хто ненавідзіць Вас, і маліцеся за тых, хто крыўдзіць Вас».

Вам ужо вядома, што ў 1054 г. хрысціянства раскалолася на два самастойныя напрамкі: заходні (каталіцкі) і ўсходні (праваслаўны).

У сучасным свеце ёсць каталіцкія цэрквы, што прызнаюць кіраўніком рымскага папу, які знаходзіцца ў Ватыкане, пратэстанцкія і 15 самастойных праваслаўных цэркваў.

Усё, што мы дагэтуль гаварылі пра ролю рэлігіі ў сучасным свеце, у найбольшай ступені характэрна для хрысціянства. Хрысціянства аказалася больш за ўсё прыстасаваным да змен, якія адбываюцца ў грамадстве. Хрысціянскія багасловы навучыліся ўжывацца з навукай, беручы на ўзбраенне асобныя навуковыя тэорыі. Так, абараняючы рэлігійнае вучэнне пра стварэнне свету, яны спасылаюцца на тэорыю пра сусвет, які пашыраецца. Царква актыўна выкарыстоўвае сродкі масавай інфармацыі для распаўсюджвання рэлігійных поглядаў. Напрыклад, каталіцкая арганізацыя «Божая справа» мае ў сваім распараджэнні 694 газеты і часопісы, 38 рэкламных агенцтваў. Хрысціянства ідзе па шляху рэлігійнага мадэрнізму — пазбаўлення ад найбольш застарэлых элементаў дактрыны і стварэння новых, максімальна набліжаных да запатрабаванняў сучаснага чалавека рэлігій. У 70-я гг. у ЗША паявілася «грамадзянская рэлігія», якая злучае ідэі хрысціянства з думкай аб богавыбранасці ЗША і прызначанасці гэтай краіны да маральнага кіраўніцтва светам.

Былы каталіцкі свяшчэннік Х. Мынарэк стварыў у пачатку 80-х гг. новую рэлігію, якую ён назваў экарэлігіяй. Галоўнай маральнай каштоўнасцю ў ёй абвяшчалася «салідарнасць з усімі, хто жыве на Зямлі».

Іслам (мусульманства) — самая позняя па часу ўзнікнення сусветная рэлігія. На зямлі налічваецца 800 млн прыхільнікаў ісламу. Найбольшае распаўсю-

джанне рэлігія атрымала ў Паўночнай Афрыцы, Паўднёва-Заходняй і Паўднёвай Азіі.

Іслам у перакладзе на рускую мову азначае «пакорлівасць». Чалавек па Карану істота слабая, схільная да грэху, ён не ў стане нічога дабіцца ў жыцці сам. Яму застаецца спадзявацца на міласэрнасць і дапамогу Алаха. Калі чалавек будзе верыць у бога, выконваць прадпісанні мусульманскай рэлігіі, то заслужыць вечнае жыццё ў раі. Патрабуючы ад веруючых пакорлівасці Алаху, іслам прадпісвае такую ж пакорлівасць і зямным уладам.

Характэрнай асаблівасцю мусульманскай рэлігіі з'яўляецца тое, што яна энергічна ўмешваецца ва ўсе сферы жыцця людзей. Асабістае, сямейнае, грамадскае жыццё веруючых мусульман, палітыка, прававыя адносіны, суд — усё павінна падпарадкоўвацца рэлігійным законам. У сувязі з гэтым цяпер усё часцей гавораць аб працэсах «ісламізацыі» ў сучасным свеце, пад якімі маюць на ўвазе, па-першае, змест палітычных праграм, што вылучаюцца і ажыццяўляюцца ў радзе краін мусульманскага свету (у Пакістане, Іране, Лівіі). Хоць ажыццяўленне гэтых праграм можа быць розным, усе яны сваёй мэтай аб'яўляюць пабудову «ісламскага грамадства», дзе эканамічнае, сацыяльнае, палітычнае жыццё будзе вызначацца нормамі ісламу.

Па-другое, «ісламізацыяй» называюць працяглае распаўсюджванне гэтай рэлігіі ў многіх раёнах Азіі, Афрыкі, Індыі, Далёкага Усходу. Рухі пад ісламскімі лозунгамі неаднародныя, але ў іх выразна відаць імкненне ператварыць ісламскі свет у галоўную сілу на міжнароднай арэне. Асабліва актыўна ў гэтым напрамку дзейнічаюць Лівія, Саудаўская Аравія, Егіпет, Туніс, Марока. Напрыклад, Лівія і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты падпісалі пагадненне аб выдзяленні 20 млн долараў на ўтрыманне ісламскіх культурных цэнтраў і правядзенне там сумесных мерапрыемстваў па ўкараненню мусульманскай рэлігіі.

Працэс «ісламізацыі» вельмі супярэчлівы. З аднаго боку, ён адлюстроўвае імкненне народаў краін, якія развіваюцца, вызваліцца ад рэштак каланіялізму і заходняга ўплыву, з другога — у руках экстрэмістаў ісламскія лозунгі могуць прынесці чалавецтву незлічоныя беды.

Такім чынам, пры ўсім адрозненні сусветных рэлігій у духоўных, маральных каштоўнасцях, якія імі прапа-

ведуюцца, многа агульнага. Гэта робіць магчымым не толькі дыялог культур, але і дыялог рэлігій. Ён знаходзіць выяўленне ў цярпімасці да чужой рэлігіі і прызнанні яе права на свабоднае існаванне, у свабодзе веравызнання — праве асобы прытрымлівацца любой рэлігіі або не прызнаваць ніякай.

У аэрапорце сталіцы Сінгапура знаходзіцца малельны дом, у розных пакоях якога прадстаўнікі розных рэлігій могуць адстаяць імшу, службу. У г. Баўцэне (Германія) у адным будынку знаходзяцца праваслаўны і каталіцкі храмы. Гэта прыклады сапраўднай верацярпімасці.

Дыялог дапускае таксама ўзаемадзеянне. У адносінах да рэлігіі гэта выяўляецца ў сумесных дзеяннях веруючых розных веравызнанняў і атэістаў у вырашэнні глабальных праблем, якія стаяць перад чалавецтвам. Прыналежнасць да той або іншай рэлігіі не павінна служыць перашкодай да такога супрацоўніцтва. Права выбару ў любым выпадку павінна застацца за чалавекам.

Пытанні і заданні

1. Што такое рэлігія? Якія яе формы вы ведаеце?
2. Якую ролю іграе рэлігія ў жыцці сучаснага грамадства?
3. Якія асноўныя напрамкі развіцця сусветных рэлігій у нашы дні? Што такое «ісламізацыя» і «рэлігійны мадэрнізм»?
4. У чым вы бачыце агульныя рысы маральных запаведзей у розных сусветных рэлігіях?
5. Што агульнае ў культу асобы з рэлігійным культам? Ці выпадкова і там і тут ужываецца слова «культ»?
6. Закон СССР «Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях» гарантуе права грамадзяніна на вызначэнне і выяўленне сваіх адносін да рэлігіі, на бесперашкоднае веравызнанне рэлігіі і выкананне рэлігійных абрадаў, прызнаваць любую рэлігію або не прызнаваць ніякай, распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі. Чаму, на ваш погляд, узнікла неабходнасць прыняцця гэтага закона і чаму яго называюць адным з самых прагрэсіўных законаў нашага часу?
7. Б. Расел, англійскі філосаф, у кнізе «Чаму я не хрысціянін» сцвярджае: «Чым мацнейшымі былі рэлігійныя пачуцці і глыбейшымі дагматычныя вераванні на працягу таго або іншага перыяду гісторыі, тым большай жорсткасцю адрозніваўся гэты перыяд. У часы, калі людзі сапраўды верылі ў хрысціянства, існавала інквізіцыя з яе катаваннямі, і не было такога роду жорсткасці, які не быў бы пушчаны ў ход супраць усіх пластоў насельніцтва ў імя рэлігіі».

Ці згодны вы з гэтымі выказваннямі? Прывядзіце аргументы, якія пацвярджаюць або абвяргаюць гэта выказванне.

8. У чым прычыны асаблівай папулярнасці ранніх форм рэлігіі ў нашы дні? Чаму людзі сталі ўсё часцей звяртацца да магіі, астралогіі, хірамантыі?

9. Існуе думка, што павышэнне працэнта веруючых сярод моладзі ў нашай краіне звязана не столькі з верай у бога, колькі з прывабнасцю абрадаў вянчання, хрышчэння, прычасця і г. д. Гэта значыць маладых прыцягвае знешні (абрадавы) бок рэлігіі. А як думаеце вы?

10. Па матэрыялах перыядычнага друку прывядзіце прыклады плённага супрацоўніцтва паміж рэлігійнымі і дзяржаўнымі арганізацыямі ў нашай краіне.

11. У выніку апытання, праведзенага ў Маскве амерыканскімі сацыёлагамі і Інстытутам сацыяльных даследаванняў, былі атрыманы наступныя даныя (у працэнтах):

	Веруючыя ў бога	Неверуючыя ў бога	Веруючыя ў тагасветнае жыццё	Асобы, у жыцці якіх рэлігія адыгрывае важную ролю
Усяго масквічоў	10	43	7	13
да 30 гадоў	11	45	6	9
30—44 гады	8	47	5	10
45—60 гадоў	9	43	8	11
звыш 60 гадоў	13	38	10	22
мужчыны	5	58	4	8
жанчыны	13	32	9	17
рабочыя	9	42	6	12
«сінія каўнерыкі»	4	55	4	5
асобы разумовай працы	9	37	10	21
«белыя каўнерыкі»	11	41	7	13

Прааналізуйце гэтыя даныя. Чаму такі высокі працэнт веруючых сярод моладзі? Выкажыце сваю думку.

12. Аўтар артыкула «Пра фанатыкаў атэізму і свабоду веравызнання», апублікаванага ў газеце «Известия» ад 5 сакавіка 1991 г., лічыць, што прапаганда атэізму, якой прафесійна займаюцца спецыяльна для гэтага створаныя яшчэ ў сталінскую эпоху дзяржаўныя ўстановы, і атэістычны змест школьных курсаў гісторыі, біялогіі, хіміі і г. д. з'яўляюцца парушэннем закона «Аб свабодзе веравызнання ў СССР». Ці згодны вы з гэтым аўтарам?

13. У серыі тэлевізійных перадач «Вечар з Познерам» адбылася сустрэча з рэлігійнымі дзеячамі, на якой абмяркоўвалася роля рэлігіі ў сучасным грамадстве. Вядучы задаў служыцелям культу пытанне: «10 запаведзей Майсея існуюць 2000 гадоў. Ці стала чалавецтва менш забіваць, красці?» Што б вы адказалі на гэта пытанне?

Вызначце месца рэлігіі ў духоўным жыцці чалавека.

§ 35. ДУХОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ СУЧАСНАГА ЧАЛАВЕКА

Агульначалавечая культура і асоба

Гісторыя чалавечай культуры — гісторыя чалавечага розуму. Гістарычны вопыт пакаленняў увасоблены ў створаных ім культурных каштоўнасцях. Пры знаёмстве чалавека з каш-

тоўнасцямі мінулага культура чалавечага роду як бы пераліваецца ў духоўны свет асобы, садзейнічаючы яе інтэлектуальнаму і маральнаму развіццю.

У працэсе ўнутранага жыцця чалавек асэнсоўвае зробленае і абдумвае новыя дзеянні для ажыццяўлення сваіх мэт. Паспяховыя і непаспяховыя дзеянні зноў даюць пажыву для роздуму, для іх ацэнкі.

Да духоўнага жыцця, да жыцця чалавечай думкі адносяць, як правіла, веды, веру, пачуцці, патрэбнасці, здольнасці, імкненні і мэты чалавека. Духоўнае жыццё чалавека немагчыма таксама без перажыванняў, якія надаюць афарбоўку ўнутранаму свету асобы: радасці, аптымізму і смутку, веры і расчаравання. Чалавеку ўласціва імкненне да самапазнання і самаўдасканалення.

Чым больш развіты чалавек, тым вышэйшая яго культура, тым багацейшае яго духоўнае жыццё.

Палажэнне аб тым, што чалавек не можа жыць па-за грамадствам, цяпер ужо ні ў кога не выклікае сумненняў. А значыць, і цывілізаванае існаванне чалавека немагчыма па-за культурай, якая яго акружае. З'яўляючыся на свет, чалавек не выбірае, як і сваіх бацькоў, тое культурна-гістарычнае асяроддзе, у якім яму давядзецца пражыць свой век. Умовай для нармальнай жыццядзейнасці і чалавека і грамадства з'яўляецца авалоданне назапашанымі ў грамадстве ведамі, уменнямі, каштоўнасцямі, паколькі кожны чалавек — неабходнае сувязное звяно ў эстафеце пакаленняў, жывая сувязь паміж мінулым і будучым чалавецтва.

Свабодна і проста жыве ў сучаснай культуры той чалавек, які з малых гадоў вучыцца арыентавацца ў ёй, выбіраць для сябе каштоўнасці, якія адпавядаюць асабістым схільнасцям і здольнасцям і не супярэчаць правілам чалавечых зносін. Чалавек мае велізарны патэнцыял да ўспрымання культурных каштоўнасцей і развіцця сваіх здольнасцей. Здольнасць да самаразвіцця і самаўдасканалення — прынцыповае адрозненне чалавека ад усіх іншых жывых істот.

Сучасная духоўная культура грамадства валодае бязмежнай разнастайнасцю навуковых і рэлігійных вучэнняў, палітычных тэорый, этычных* і эстэтычных

---

* *Этыка* — вучэнне аб маралі і яе ролі ў жыцці грамадства.

уяўленняў і ідэалаў. У іх увасоблены дасягнутыя чалавецтвам веды аб месцы, становішчы і прызначэнні чалавека. У кожную гістарычную эпоху чалавецтва па-рознаму адказвала на вечныя пытанні: што ёсць дабро? што ёсць прыгажосць? што павінен рабіць чалавек? Кожная вялікая этычная сістэма мінулага і сучаснага прапануе свой шлях да шчасця і асабістай дасканаласці: праз пазнанне, праз чысціню матываў, праз унутраны спакой, праз самаахвярнасць і г. д. Такім чынам, дыяпазон духоўнай культуры «ад Буды да Маркса», назапашаны чалавецтвам, дае кожнаму чалавеку практычна неабмежаваную магчымасць выбару духоўных каштоўнасцей, найбольш адпаведных яго ўстаноўкам, густам, здольнасцям і ўмовам жыцця.

Любому грамадству, любой культуры неабыякава, які выбар зробіць асоба. Таму ва ўсе часы, у тым ліку і сёння, чалавека самымі рознымі спосабамі вучаць, накіроўваюць, упрошваюць, падбухторваюць, пагражаюць, ганьбуюць, заахвочваюць, берагуць, прыгнятаюць, прымушаюць... І калі б чалавек у такім «неаднастайным асяроддзі» культурнага (таксама не вельмі культурнага і зусім не культурнага) уздзеяння падпарадкоўваўся б усім заклікам і любому націску, то ён быў бы непазбежна ўцягнуты ў віхуру хаосу, расколаты, разрэзаны на сотні і тысячы частак. Але гэтага не адбываецца. Захаваць сваю непаўторнасць, застацца самім сабой нават у выключна супярэчлівых умовах чалавек можа пастолькі, паколькі ён з'яўляецца асобай. Быць асобай — значыць мець здольнасць арыентавацца ў разнастайнасці ведаў і сітуацый і несці адказнасць за свой выбар, быць у стане процістаяць многім адмоўным уздзеянням. Чым больш складаны свет і чым багацейшая палітра варыянтаў жыццёвых імкненняў, тым больш актуальная праблема свабоды выбару ўласнай жыццёвай пазіцыі.

Светапоглядны компас

Узаемаадносіны чалавека і культуры, якая яго акружае, у працэсе развіцця цывілізацыі пастаянна мяняліся. Але захавалася тое галоўнае, што істотна для гэтых адносін. Агульначалавечая культура і культура кожнай асобы ўзаемазалежныя: чалавек выступае як носьбіт агульнай культуры чалавецтва, і як яе крытык, і як яе тварэц, а агульначалавечая культура выступае як абавязковая ўмова станаўлення і развіцця духоўнай культуры асобы.

Галоўным у паняцці «духоўная культура асобы» можна лічыць актыўныя, творчыя і разам з тым адказныя **адносіны** чалавека да жыцця — прыроды, грамадства, іншых людзей, да самога сябе. Духоўная культура чалавека не можа быць зведзена да адной толькі начытанасці, эрудыцыі, хоць і гэта вельмі важна. Культуру чалавека, або яго «культурнасць», вельмі цяжка ацаніць. Важна ведаць, хто і з якой мэтай ацэньвае, мець уяўленні пра крытэрыі такой ацэнкі (гарадскія жыхары ацэньваюць сельскіх, а тыя — гараджан; старыя ацэньваюць моладзь і г. д.) і разумець, што гэтыя ацэнкі могуць быць вельмі рознымі і нават процілеглымі. Але ёсць прымета духоўнай культуры асобы, якая сярод іншых крытэрыяў адыгрывае галоўную ролю — гатоўнасць чалавека да самааддачы і самаразвіцця. Калі «Я для сябе» (нават для вельмі адукаванага чалавека), то «Нашто Я»? Сапраўды, цяжка рабіць вывад аб духоўнай культуры кампазітара, мастака, пісьменніка, якія яшчэ не пазнаёмілі людзей са сваёй творчасцю, не выявілі свайго Я ў канкрэтным творы.

Самааддачы папярэднічае і спадарожнічае пастаяннае абагачэнне асобай свайго духоўнага свету дасягненнямі агульначалавечай культуры — інакш аддаваць проста не будзе чаго.

Не патрэбна мець асаблівую фантазію, каб уявіць, якая магутная плынь інфармацыі навальваецца сёння на чалавека, уздзейнічаючы на яго свядомасць і пачуцці. У гэтай сітуацыі вялікае значэнне набываюць выбарчыя адносіны да крыніц інфармацыі, да яе зместу. А гэта ўжо прама залежыць ад **светапогляду** асобы, ступені развітасці яе мыслення, сістэмы цэнасных арыентацый.

Узнікненне паняцця «светапогляд» адносіцца да канца XVIII ст., калі пераход да індустрыяльнай цывілізацыі адкрыў радавому чалавеку больш шырокі выбар варыянтаў паводзін, павысіў значэнне яго самасвядомасці і свядомай дзейнасці. Найбольш развітая тэарэтычная думка таго часу — нямецкая класічная філасофія адрэагавала на гэта шляхам вылучэння паняцця «светапогляд». Светапогляд, карацей кажучы, азначае «ўяўленне аб навакольным свеце» — гэта бачанне свету, гэта тое, **як** глядзіць чалавек на свет, **з якіх пазіцый** рашае ён асноўныя жыццёвыя пытанні. Таму няма людзей, якія не мелі б наогул ніякага светапогляду. Свядомасць сучаснага чалавека нагружана навуковымі данымі,

маральнымі і эстэтычнымі нормамі і ідэаламі, рэлігійнымі вераваннямі, штодзённым вопытам, практычнымі ведамі і г. д. Прызначэнне светапогляду для чалавека — служыць арыенцірам у навакольным свеце і выяўленнем сваіх асобасных адносін да яго. А таму не самі па сабе веды (тэарэтычныя, практычныя і інш.) пра свет і чалавека складаюць асаблівасць светапогляду, а іх **накіраванасць на чалавека**, на яго праблемы, магчымасць адказаць дзякуючы гэтым ведам на надзённыя пытанні аб сэнсе, месцы, прызначэнні і перспектывах Чалавека ў свеце.

Светапогляд асобы непаўторны, як непаўторны кожны чалавек. Колькі людзей, столькі і індывідуальных светапоглядаў. Светапогляд чалавека фарміруецца перш за ўсё пад уздзеяннем навакольнага культурнага асяроддзя, асабістага вопыту, адукацыі, выхавання, асаблівасцей яго характару. Але ў розных індывідуальных светапоглядах поруч з сур'ёзнымі адрозненнямі ёсць і нешта агульнае, інакш людзі проста не разумелі б адзін аднаго і ніколі не змаглі б дамовіцца паміж сабой. Мільёны жывуць і працуюць на Зямлі, прыгнечаныя мітуснёй штодзённасці, і ў іх няма ні магчымасці, ні сіл для таго, каб усвядоміць тое агульнае, што родніць светапогляды розных людзей, каб усвядоміць прынцыпы свайго светапогляду і сфармуляваць іх у ясным выглядзе. Гэта часам робяць пісьменнікі, вучоныя, але гэта — прафесійная справа філосафа, філосаф свядома выпрацоўвае і выказвае сваё бачанне свету, свае адносіны да свету, сваю ацэнку свету і грамадства. І калі грамадства прымае прапанаванае філосафам тлумачэнне будовы навакольнага свету ў адпаведнасці з яго ацэнкай, то светапогляд гэты становіцца набыткам усіх, асновай іх светапогляду.

Светапогляд чалавека пастаянна змяняецца, адлюстроўваючы змены ў свеце і ў ведах аб ім. Адкрываючы свет, чалавек пранікае ў яго тайны. Але самае значнае адкрыццё, важнейшага за якое няма на Зямлі,— гэта адкрыццё і пазнанне чалавекам сябе як асобы. Для сучаснага светапогляду характэрна паступовае асэнсаванне ўсім чалавецтвам галоўнай мэты развіцця чалавека і грамадства.

У цэнтры сучаснага светапогляду Чалавек як вышэйшая каштоўнасць і галоўнае багацце грамадства. Адрозненне новага мыслення, заснаванага на прызнанні гэтага прынцыпу, заключаецца ў тым, што калі раней

акцэнт рабіўся на тым, якія патрабаванні прад'яўляе тая або іншая сістэма (навукова-тэхнічная, эканамічная, сацыяльна-палітычная і да т. п.) да якасцей чалавека (пераважна да яго прафесійнай і маральнай дзейнасці), то цяпер акцэнт пераносіцца на патрабаванні, якія ідуць ад чалавека, ад яго інтарэсаў, запатрабаванняў. Гэта значыць, сутнасць у новай пастаноўцы пытанняў: не толькі «Які чалавек патрэбны грамадству?», але і «Якое грамадства патрэбна чалавеку?», каб яно ў поўнай меры адпавядала магчымасцям чалавека, яго эстэтычным маральным патрабаванням да выгод, камфортнасці, не наносіла страт яго чалавечай годнасці, пачуццю свабоды, прыгажосці і маральнай задаволенасці. Агульначалавечы розум шукае адказ на гэта пытанне. Але для цывілізацыі важна, што яно ўжо пастаўлена: сам чалавек мае патрэбу ў абароне не менш, як асяроддзе.

Грані духоўнасці чалавека

Не можа быць поўнай характарыстыка духоўнай культуры чалавека, калі ў ёй не закранаюцца маральныя рысы чалавека. Добра, калі чалавек імкнецца да ведаў, павышае ўзровень развіцця свайго інтэлекту. І тут, як вы ўжо мелі магчымасць пераканацца на папярэдніх уроках тэмы, важна ведаць, на што накіраваны гэтыя веды, у якой меры яны звязаны з гуманістычнымі мэтамі (аднаму веды патрэбныя, каб стварыць сродак лячэння невылечных цяпер хвароб, другому — каб вынайсці хітрамудрую прыладу для рабавання банка...).

Светапоглядная ідэя каштоўнасці «радавога» чалавека, яго жыцця, прымушае сёння вылучыць у культуры, якая традыцыйна разумеецца як ёмішча агульначалавечых каштоўнасцей, **каштоўнасці маральныя** як важнейшыя, якія абумоўліваюць у сучаснай сітуацыі самую магчымасць яго існавання на Зямлі. І ў гэтым напрамку планетарны розум робіць першыя, але добра прыметныя крокі: ад ідэі маральнай адказнасці навукі да ідэі злучэння палітыкі і маралі.

Сёння агульначалавечыя маральна-этычныя нормы, гуманізм распаўсюджваюцца са сферы міжасобасных узаемадзеянняў, ператвараючыся ў прынцып, і на міжнародныя адносіны: «Нават калі мы сапернікі, давайце паводзіць сябе цывілізавана, не сячы сук, на якім сядзім...». Каб глыбей усвядоміць цану гэтага гіганцкага

кроку ў духоўным развіцці чалавецтва, паспрабуем успомніць, як часта мы апускаем рукі ў бяссіллі, не маючы магчымасці вырашыць спрэчку паміж двума людзьмі. Насельніцтва зямнога шара больш як 5 млрд чалавек, якія размаўляюць прыкладна на 5660 мовах і жывуць у больш як 160 дзяржавах. Усе гэтыя людзі працуюць у сферы 40 тыс. прафесій, вучацца ў розных тыпах навучальных устаноў, належаць да розных сацыяльных сістэм, класаў, узроставых груп. Адны з іх знаходзяцца на вяршыні найвялікшых дасягненняў сусветнай культуры, другія гібеюць у невуцтве, жывучы ў грамадстве, якое недалёка адышло ад першабытнай абшчыны. Кожны круціцца ў пэўным коле з'яў, людзей, прадметаў, кіруючыся рознымі патрэбнасцямі, інтарэсамі, матывамі. Ці не дзіўна, што чалавецтва існуе, нягледзячы на светапоглядную разнастайнасць і вавілонскае стоўпатварэнне норм і прынцыпаў, што яго не ўтапіла хваля агрэсіі, злосці і нянавісці адзін да аднаго. І галоўная заслуга ў гэтым належыць маралі.

Шлях свабоды, прагрэсу, павагі чалавечай годнасці і абароны вялікіх маральных каштоўнасцей на ўсім працягу гісторыі чалавецтва не быў лёгкім. Пераканацца ў гэтым вам дапаможа зварот да сваіх ведаў па гісторыі. У цэнтры нашай размовы — агульначалавечыя маральныя каштоўнасці. Няпісаныя правілы і нормы зносін паміж супляменнікамі, якія зарадзіліся ў першабытным грамадстве,— патрабаванні паслухмянасці, незласлівасці да сваіх, павагі да жанчыны-маці і павагі да старэйшых, стойкасці ў горы і мужнасці ў барацьбе з небяспекай — адлюстроўвалі натуральную няроўнасць паміж маладымі і старымі, моцнымі і слабымі, здаровымі і хворымі і тым самым падтрымлівалі адзінства роду, забяспечвалі яго існаванне як маналітнага, жыццеўстойлівага цэлага. Далей, звяртаючыся да прыкладаў з гісторыі, вы можаце самастойна прасачыць непрастое ўзыходжанне чалавецтва да маральных вышынь, у якім было многа заваёў і многа няўдач. У аснове маральнасці заўсёды ляжыць несупадзенне, часам трагічнае, двух пачаткаў — імкнення да ўласнай выгады і ўсведамлення адказнасці перад іншымі людзьмі. Рэгулюючая роля маралі нацэлена на тое, каб спалучыць волю кожнага чалавека з незлічонай колькасцю іншых людскіх воль.

Няцяжка пераканацца, што ў кожным грамадстве

(дакладней, у кожнай культуры) існуе нейкая зладжанасць, своеасаблівы кансенсус адносна таго, што лічыць мараллю. З папярэдніх урокаў вам вядома, што, напрыклад, у рамках хрысціянскай традыцыі вобраз маралі вызначаўся дзесяцісловуем Майсея, а яшчэ Нагорнай пропаведдзю Ісуса Хрыста. Новы час выпрацаваў ідэал, у якім маральная асоба паўстае ў якасці свабоднага грамадзяніна.

Этычны кансенсус грамадства можа мяняцца або відазмяняцца. Менавіта такое змяненне перажываем мы ў цяперашні час. Найвялікшым паваротам у маральным прагрэсе ўсяго чалавецтва можна лічыць фарміраванне новага паняцця — «грамадскае шчасце», якое дазваляе па-новаму глянуць на адносіны да вайны і міру, прыродных умоў і г. д. Цывілізацыя доўга ішла да ўсведамлення таго, што ў паняцці «агульнае шчасце» ўвасоблены не толькі клопат пра абарону інтарэсаў усяго чалавецтва, але і ўсведамленне неабходнасці стварэння **ўмоў, вартых чалавека, для развіцця кожнага, любога чалавека.**

Якія ж **маральныя** каштоўнасці можна лічыць агульначалавечымі? Тыя, якія павінны дзейнічаць у любым грамадстве: дабрата, міласэрнасць, гатоўнасць дапамагчы трапіўшаму ў бяду, сумленне, мужнасць, справядлівасць, годнасць — гэты пералік, думаецца, можа прадоўжыць кожны з вас.

Арыентаванасць на агульначалавечыя каштоўнасці — характэрная рыса духоўна развітога чалавека.

Яшчэ адна грань духоўнасці чалавека звязана з паняццямі прыгожага і гарманічнага, з заканамернасцямі мастацкага асваення чалавекам свету, з усім тым, што дае магчымасць людзям тварыць «па законах прыгажосці». Найвялікшыя магчымасці для духоўнай культуры асобы змяшчае ў сабе мастацтва. Увасабляючы ў сваіх вобразах ідэал прыгажосці, мастацтва заахвочвае чалавека да творчасці. Мастацтва, перапрацоўваючы ўсе ўражанні жыцця ў прыгожае, абуджае ў людзях мастакоў, выхоўвае здольнасць знаходзіць унутраную гармонію прадметаў, суадносіць іх уласцівасці з грамадскімі патрэбнасцямі чалавека; вучыць адчуваць і разумець прыгажосць, тварыць у адпаведнасці з яе законамі, фарміруе эстэтычна цэнасную арыентацыю чалавека ў свеце. Сюжэт мастацкай карціны свету пастаянны. Гэта чалавек у навакольным

свеце. Аднак кожнае канкрэтнае грамадства на пэўным этапе свайго культурнага развіцця напаўняе гэты сюжэт сваім зместам. Кожны раз у творах мастацтва пановаму адлюстроўваюцца і чалавек, і свет, і сувязныя іх ніці.

На прыкладзе вывучэння ў школе айчыннай і зарубежнай літаратуры вы маглі пераканацца ў тым, якое месца ў жыцці людзей на працягу ўсёй біяграфіі чалавецтва адыгрываў такі від мастацкага асваення рэчаіснасці, як літаратура. Літаратура і мастацтва — гэта спосаб пазнання свету, і сродак выпраўлення звычаяў, сродак зносін, і дзейсны інструмент барацьбы ідэй на розных этапах культурна-гістарычнага развіцця грамадства. Мастацтва інфармуе, вучыць, дапамагае ў працы, упрыгожвае побыт, развясельвае ў часы адпачынку, нарэшце, духоўна ўзрушае, узвышае. Таму вельмі памыляюцца тыя, хто звузіў для сябе ўсё багацце мастацкай культуры толькі да займальнага прызначэння. Мастацтва для чалавека — не астравок забыцця ад жыццёвай мітусні, хутчэй за ўсё — крыніца, з якой бяруць вытокі і якімі пастаянна жывяцца душа чалавека, яго творчы пачатак.

Нікчэмныя духам

Дзіўна, але гэта так. Пры гіганцкім патэнцыяле, набытым духоўнай культурай чалавецтва, ва ўсе часы былі не толькі энцыклапедысты, вытанчаныя эстэты, але і нікчэмныя духам. Ёсць яны і сёння, толькі адны ўсведамляюць гэта, а іншыя не. Вось тыповы прыклад з пошты маладзёжнай газеты: «Мы, маладыя, развучыліся рабіць дабро, збяднелі духоўна. Ад гэтага нашы беды, неразуменне, замкнёнасць, нікчэмныя крыўды, няпраўда, жорсткасць, якія раз'ядаюць душу...». Антыподам духоўнасці чалавека з'яўляецца бездухоўнасць, цынізм. Апошняе характарызуецца як пагардлівыя адносіны да культуры грамадства, да яго духоўных, у асаблівасці маральных, каштоўнасцей. Цынізм, як крайняе выяўленне бездухоўнасці, праяўляецца ў здзеку над тым, што складае гістарычныя дасягненні культуры чалавецтва, у глумленні над маральнымі прынцыпамі, абсмейванні дарагіх людзям ідэалаў, у зневажанні годнасці чалавека.

Бездухоўнасць праяўляецца ў неразвітым інтэлекце і прымітывізме эмацыянальна-мастацкай сферы чалавека, абдзеленага культурай. Адносіны да мастацкіх твораў выяўляюцца ў яго пераважна ў форме разва-

жанняў «падабаецца» або «не падабаецца». Перакананы, што вам даводзілася сутыкацца з такімі разважаннямі, за якімі не стаіць ні сталы аналіз, ні глыбокае пачуццё, ні матываванасць ацэнкі.

На старонках дадзенага вучэбнага дапаможніка вы неаднаразова сутыкаліся з неабходнасцю быць асцярожнымі і стрыманымі ў ацэнках, асабліва ў тых, якія датычаць свету асобы. Гэта правіла прымяняльна і ў падыходзе да праблем бездухоўнасці. Вядома, што чалавек — з'ява складаная. У рамках праблемы, якая нас цікавіць, можна вылучыць у чалавеку яго культуру ўнутраную і знешнюю.

Апошняя, а менавіта тое, як чалавек сябе падае ў кампаніі — яго манеры, мова, знешні выгляд і г. д.— можа быць падманлівай. За знешнімі вытанчанымі манерамі і граматнай мовай можа затаіцца драпежнік, а не чалавек.

Калі ж гавораць пра людзей бездухоўных, то, як правіла, маюць на ўвазе людзей са змешанай шкалой каштоўнасцей, якія не ўмеюць адрозніваць добрае ад дрэннага. У іх недастаткова развіта маральнае ўяўленне. Так, яны не здольныя мысленна «прымяніць» да самога сябе вынікі дрэннага ўчынку, зробленага ў адносінах да іншага чалавека. Гэта значыць мысленна паставіць сябе ў становішча пацярпеўшага па іх віне або ад іх саміх. Такія людзі вылучаюцца бессардэчнасцю, адсутнасцю станоўчых маральных прынцыпаў, сумлення.

Камфортна і цікава жыць у грамадстве духоўна багатых, маральна развітых, розных па характару і здольнасцях свабодных людзей. Падумаем, што трэба рабіць, каб грамадства стала такім.

Пытанні і заданні

1. Што складае духоўнае жыццё чалавека?

2. Як звязаны паміж сабой агульначалавечая культура і духоўнае багацце асобы?

3. Якую ролю ў жыцці чалавека адыгрывае яго светапогляд? Выявіце сувязь светапогляду з агульнай культурай асобы.

4. Якія каштоўнасці і чаму называюцца агульначалавечымі? Што азначае прызнанне прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей для грамадства і для чалавека?

5. Растлумачце наступную думку: «Нікчэмны чалавек даражыць малымі каштоўнасцямі, вялікі або сапраўдны Чалавек — вялікімі». Ці могуць наогул быць каштоўнасці вялікія і каштоўнасці малыя? Вялікія і маленькія людзі?

6. В. А. Сухамлінскаму належаць словы: «Гуманнасць немагчыма без чуласці да чалавека. Любіць чалавецтва прасцей, як аднаго чалавека. Дапамагчы аднаму чалавеку цяжэй, чым заявіць: «Я люблю свой народ». Пракаменціруйце выказванне. Растлумачце, у чым сэнс цяжкасцей, пра якія гаворыць аўтар.

7. Што ўяўляе сабой кругагляд чалавека? Ці згодны вы з наступным выказваннем: «Дурасць разумных людзей з яснай галавой і вузкім кругаглядам парадзіла многа катастроф»? Ці вядомы вам прыклады, якія пацвярджаюць прыведзенае назіранне?

8. Што такое коснасць? Чаму коснасць — смяротны вораг маралі?

9. Часта даводзіцца чуць выказванні ў абвінаваўчым тоне пра людзей з «двайной» мараллю. Што такое «двайная» мараль? Ці заўсёды гэта толькі дрэнна або толькі добра?

10. Вучням 5-га класа было прапанавана наступнае заданне: «Уявіце сабе вялікі пажар. У яго полымі вось-вось загіне вельмі рэдкае мастацкае палатно старой італьянскай школы і маленькая птушачка — апошні экземпляр гэтага віду. У вашым распараджэнні некалькі секунд, за якія вы можаце выратаваць нешта адно. Або палатно, або клетку з птушачкай. Вырашайце». Як вы думаеце, які быў вынік выканання задання? Якую версію ўласнага рашэння вы прапанавалі б пяцікласнікам?

11. Праілюструйце вядомымі вам прыкладамі наступныя выказванні: «Мараль і на самай справе дзіўная штука. Яе наяўнасць непрыметна, але затое адсутнасць адбіваецца самым пагібельным чынам...». Па якіх прыметах можна меркаваць пра адсутнасць маралі?

12. Вызначце па слоўніку змест паняццяў: «банальнасць», «пошласць», «цынізм». Чаму гэтыя паняцці — сінонімы бездухоўнасці? Ці сустракаліся вы з іх праяўленнем у сваім жыцці? Што вы пры гэтым адчувалі? Як праявіліся вашы пачуцці?

13. Ці правільна, што нельга пазнаць сябе, не пазнаўшы знешняга свету? Ці правільна адваротнае? Свой пункт гледжання аргументуйце.

14. Паспрабуйце на аснове апытання аднакласнікаў скласці спіс аўтараў па краінах, творы якіх, па-вашаму, уваходзяць у залаты фонд сусветнай скарбніцы мастацкай літаратуры.

15. Выхаванцы калоніі для непаўналетніх правапарушальнікаў, адказваючы на пытанне анкеты «Якія якасці цэніце ў людзях?», далі наступныя адказы: справядлівасць, дабрату, чуласць.

«Якія якасці ёсць асабіста ў вас?» — ... ... (няма адказу або вельмі невыразны адказ).

«Якія якасці характару вам перашкаджаюць у жыцці?» — празмерная мяккасць, дабрата і чуллівасць.

Псіхолагі лічаць, што невыразнае ўяўленне чалавека аб сабе можа прывесці да няпэўных паводзін і правапарушэння. Праверце, ці так гэта.

§ 36. СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў СССР

Сёння ўсе мы ў нашай краіне — сучаснікі, сведкі і ўдзельнікі гераічнага і драматычнага часу — спрабуем пераасэнсаваць скрозь шкалу агульначалавечых

каштоўнасцей, назапашаных сусветнай і айчыннай культурай, шлях, пройдзены народам, сваімі роднымі і блізкімі, перамены, якія адбываюцца ў краіне.

Крытэрыі культурнага прагрэсу

Любая складаная з'ява грамадскага жыцця не можа быць ацэнена адназначна — «добра» або «дрэнна», паколькі ў ёй можа быць і тое, і другое. Многае залежыць ад крытэрыяў ацэнкі. Так, у духоўнай культуры любога грамадства можна адрозніць два аднолькава рэальныя абліччы: адно — аблічча ўстойлівасці, гармоніі і аднадушнасці, а другое — аблічча перамен, канфліктаў, напружанасці і нявырашаных праблем. Таму ў ацэнцы стану культуры нашага грамадства варта пазбягаць крайнасцей: як узнёслага аптымізму, так і змрочнага песімізму.

Узровень развіцця духоўнай культуры любой краіны вымяраецца аб'ёмам духоўных каштоўнасцей, якія ствараюцца ў ёй, маштабам іх распаўсюджання і глыбінёй засваення іх людзьмі, кожным чалавекам. Ацэньваючы ўзровень духоўнага прагрэсу, важна ведаць, колькі навукова-даследчых інстытутаў, універсітэтаў, тэатраў, бібліятэк, музеяў, запаведнікаў, школ, кансерваторый і да т. п. створана ў краіне. Але такіх колькасных паказчыкаў мала. Важная і якасць духоўнай прадукцыі — навуковых адкрыццяў, кніг, адукацыі, кінафільмаў, спектакляў, карцін, музыкальных твораў. Узятыя разам, гэтыя паказчыкі вызначаюць канчатковую мэту духоўнай культуры — здольнасць кожнага чалавека да творчасці, яго ўспрымальнасць да самых высокіх дасягненняў культуры. Гэта значыць важна не толькі тое, што створана ў культуры, але і як гэтымі дасягненнямі карыстаюцца людзі. Таму важным крытэрыем культурнага прагрэсу грамадства з'яўляецца ступень дасягнення сацыяльнай роўнасці людзей у далучэнні іх да каштоўнасцей культуры. Для прыкладу можна ўзяць два самыя вядомыя оперныя тэатры ў свеце: Вялікі тэатр у Маскве і тэатр Ла-Скала ў Мілане. У нас не ўсе, хто хоча, могуць трапіць у тэатр з-за адсутнасці білетаў, у Італіі — з-за іх дарагоўлі. Але і тыя, і другія гледачы могуць пазнаёміцца з шэдэўрамі опернай класікі не выходзячы з дому, па радыё або тэлебачанні, у грамзапісе. Такім чынам, сродкі масавай інфармацыі садзейнічаюць выраўноўванню магчымасцей усіх людзей, незалежна ад геаграфіі пражывання і ўзроўню даходаў, у далучэнні да культуры. Было б жаданне. Тое

ж можна аднесці да тэатральнай творчасці і выяўленчага мастацтва.

Яшчэ адзін крытэрый культурнага развіцця той або іншай краіны – наяўнасць неабходных умоў для найбольш поўнага выяўлення і развіцця творчых сіл, здольнасцей і талентаў чалавека. Сюды можна аднесці разнастайныя навучальныя ўстановы, музычныя і мастацкія школы, студыі, клубы па інтарэсах, самадзейныя тэатры і многае іншае. Садзейнічае рэалізацыі творчых магчымасцей і дарослых і дзяцей таксама блізкасць культурных цэнтраў або добра наладжаны транспарт, які скарачае дарогу да іх. Гэта значыць усё тое, што прынята называць інфраструктурай (комплекс сродкаў, якія абслугоўваюць у дадзеным выпадку вытворчасць і спажыванне духоўных каштоўнасцей). Апошняе немалаважна. На сёння толькі кожнае дваццатае дзіця ў нашай краіне вучыцца ў музычнай школе. Хоць тых, хто жадае, але не мае магчымасці вучыцца музыцы, значна больш.

Экалогія культуры

Крызісная сітуацыя, якая склалася ў нашай краіне, з асаблівай сілай праявілася ў духоўным жыцці грамадства. Становішча ў культуры нашай айчыны ацэньваецца як вельмі цяжкае і нават катастрафічнае. Пры невычэрпным культурным патэнцыяле, набытым папярэднімі пакаленнямі і нашымі сучаснікамі, пачалося і імкліва набірае тэмп амаль пагалоўнае духоўнае збяднення нашага народа. Масавае бескультур'е народа — прычына многіх бед у эканоміцы, прыродакарыстанні. Заняпад маралі, бязлітаснасць, рост злачыннасці і насілля — злыя парасткі на глебе бездухоўнасці. Некультурны ўрач абыякавы да пакут хворага, некультурны чалавек раўнадушны да творчага пошуку, некультурны будаўнік будуе піўны ларок на месцы храма, некультурны земляроб псуе зямлю... Замест роднай мовы, багатай прыказкамі і прымаўкамі,— мова, засмечаная іншаземнымі, блатнымі слоўцамі, а то і нецэнзурнай лаянкай. Сёння пад пагрозай разбурэння тое, што стагоддзямі стварaў інтэлект, дух, талент нацыі — разбураюцца старажытныя гарады, гінуць кнігі, архівы, творы мастацтва, страчваюцца народныя традыцыі майстэрства. Небяспеку для сучаснага і будучага краіны выклікае бядотнае становішча навукі і адукацыі. Па выніках Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1989 г., зарэгістравана 4,3 млн непісьменных (людзей, якія лі-

чаць сябе такімі). А калі б палічылі людзей, якія ледзьве ўмеюць чытаць і практычна не ўмеюць пісаць,— гэта лічба павялічылася б у многа разоў.

Па міжнародных стандартах інтэлектуалізацыі моладзі, выпрацаваных па ініцыятыве ЮНЕСКА, СССР у 50-я гг. займаў 3-е месца ў свеце пасля ЗША і Канады. У 1985 г.— мы ўжо на 45-м, а ў 1990 г.— на 50-м месцы ў свеце.

Такі стан айчыннай культуры звязаны са станам эканомікі краіны, а значыць, і са станам матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння культуры. У адпаведнасці з вядомым вам астаткавым прынцыпам фінансавання сацыяльна-культурнай сферы сёння на культуру, як і дзесяць гадоў назад, расходуецца не больш за 1,2 % дзяржаўнага бюджэту. Сюды ўваходзяць расходы на тэлебачанне, радыё, друк, кіно. Гэта значыць, што ў дзень на культурныя патрэбы аднаго жыхара дзяржава траціць менш як 3 капейкі. Абсталяванне аднаго месца ў школе ў нашай краіне каштуе ў сярэднім 58 руб. (у Швецыі — 1200 долараў). Для цывілізаванага грамадства недапушчальна эканомія на культуры і адукацыі, таму што яна паварочваецца самымі згубнымі вынікамі, ставячы пад сумненне само існаванне цывілізацыі.

Выклікае трывогу сацыяльна-эканамічнае становішча работнікаў культуры. Мастакі і музыканты пакутуюць ад адсутнасці рэпетыцыйных залаў і майстэрань. І гэта пры тым, што ў нас толькі 62 сімфанічныя аркестры, а ў ЗША — 1,5 тыс. Са сферы навукі, мастацтва, адукацыі ідзе інтэнсіўны адток спецыялістаў, у тым ліку і за мяжу. Па ацэнках спецыялістаў, працягвае разбурацца генафонд нацыянальнай культуры: паміраюць, не ўзнікшы, творчыя школы, напрамкі, пазбаўлены кіраўніцтва мастацкія калектывы.

«Прадухіліць катастрофу культуры» — так назвалі сваю адозву да Прэзідэнта СССР дзеячы навукі, мастацтва і адукацыі ў 1990 г. У ёй — занепакоенасць грамадскасці наступленнем рыначных адносін на культуру. Ніякая культура, лічаць яны, не можа існаваць ва ўмовах рынку без падтрымкі дзяржавы (альтэрнатыва — ахвяраванні прыватных фірм, але для гэтага іх патрэбна мець вельмі многа і вельмі багатыя). Інакш духоўны вакуум, які ўсё больш разрастаецца, будзе запаўняцца азартнай гульнёй, п'янкай, бойкамі.

Зразумела, культура, літаратура, мастацтва не могуць быць поўнасцю ў баку ад рыначных адносін, канкурэнцыі, барацьбы за спажыўца. У разумнай меры самаакупнасць неабходна. Але нельга дапускаць поўнай яе камерцыялізацыі. Напрыклад, з мэтай павышэння рэнтабельнасці Вялікі тэатр нельга ператвараць у філіял закусачнай Макдональда, аддаваць мастацтва на водкуп рынку. Інакш мастакі пападуць у новую несвабоду і страцяць незалежнасць, а грамадства панясе вялікія маральныя страты.

Другі напрамак пошуку прычын надыходзячай катастрофы прыводзіць нас да ацэнкі той ролі ў лёсе культуры, якую многія дзесяцігоддзі адыгрывала адміністрацыйна-камандная сістэма. Вядома, што яна не мела патрэбы ў разнастайнасці чалавечай асобы. Талент — гэта амаль заўсёды непрадбачаныя думкі і паводзіны. Для дабрабыту той сістэмы неабходна было адваротнае — татальны кантроль за паводзінамі членаў грамадства. Галоўны сродак у дасягненні аднадумства і «глыбокага задавальнення» — ідэалагічная і палітычная цэнзура. Асаблівасць цэнзуры заключалася ў тым, што яе заўсёды ажыццяўляе нейкі слой людзей, якія прысвоілі сабе права ведаць «лепш за ўсіх», што маральна, а што не маральна, што карысна народу, а што не. Татальная ідэалагізацыя культуры душыла ўсё крытычнае, але пакідала шэрае, безаблічнае, казённае. Дастаткова ўспомніць плынь вытворчых раманаў і кінафільмаў, дзе зло ў асобе кансерватара іграла ў паддаўкі з дабром у асобе наватара, і апошні заўсёды перамагаў. Усё творчае, што не змяшчалася ў рамках міфа аб сацыяльным дабрабыце, асядала на паліцах спецзахаў. Так з'явіліся «палічнае» кіно і «самвыд». У грамадстве выспявалі дзве ўзаемавыключальныя тэндэнцыі: з аднаго боку — рост фальшу, крывадушнасці, амаральнасці і бездухоўнасці, а з другога — рост незадавальнення, пратэсту, процістаяння. Прадстаўнікоў апошняга, людзей здольных да іншадумства і духоўнай апазіцыі, улады ахрысцілі «дысідэнтамі» (ад лацінскага — «нязгодны») і антысаветчыкамі. Да людзей, якія выбралі гэты жыццёвы шлях і не жадалі, паводле слоў А. І. Салжаніцына, «удзельнічаць у хлусні і падтрымліваць яе свядома», прымяняўся шырокі набор карных мер — ад лагераў да прымусовай высылкі за мяжу. Такі лёс выбралі акадэмік, нобелеўскі лаўрэат А. Дз. Сахараў, пісьменнік А. І. Салжаніцын, кіна-

рэжысёр А. Таркоўскі, музыкант М. Растраповіч, спявачка Г. Вішнеўская і многія іншыя.

Дзякуючы людзям з неспакойным сумленнем у нашым духоўным жыцці ішло накапленне маральнай энергіі перабудовы, усведамленне неабходнасці перамен і ў сферы культуры. Духоўнае ачышчэнне грамадства, пачатае з сярэдзіны 80-х гг., адбываецца вельмі марудна і пакутліва, пераадольваючы супраціўленне тых, хто хоча «змяніць, нічога не мяняючы». Цяпер у краіне складваецца новая атмасфера свабоды творчасці. Адыходзіць у мінулае праблема ідэалагічнай цэнзуры. Аднак цяпер нашай краіне спатрэбіцца некалькі соцень гадоў, каб апублікаваць усё тое, што ў свой час асела ў рэдакцыях, і тое новае, што напісана ўжо ў іншай атмасферы творчасці.

«Манкуртызм» у культуры

Адраджэнне культуры з'яўляецца важнейшай умовай абнаўлення нашага грамадства. Але культура, як вы ведаеце, не стаіць на месцы і пастаянна змяняецца. Адсюль пытанне: ажыццяўляць адраджэнне якой культуры? Акадэмік Дз. С. Ліхачоў лічыць, што класічнай культуры. Існуюць і іншыя меркаванні, якія дамагаюцца адраджэння народнай (сялянска-патрыярхальнай) культуры. Уступаючы ў гэту дыскусію, можна далей спытаць, чаму гэту, а не, напрыклад, купецкую або мяшчанскую? Відаць, адказаць на гэта пытанне немагчыма, таму што няма ніякай адзінай «сапраўднай», «правільнай» або яшчэ нейкай іншай ідэальнай культуры, тым больш што зварот у мінулае проста немагчымы. Нельга з культуры нешта выкрасліць, нешта пакінуць. Патрэбна прызнаць яе такой, якая яна ёсць у поўным аб'ёме станоўчага і негатыўнага.

Чалавецтву ў цэлым уласціва ідэалізацыя мінулага. На ўсім працягу гісторыі старыя горка ўздыхалі і ў дакор моладзі прыпаміналі, што раней людзі былі непараўнана больш шчырымі і спагадлівымі. А ўсё таму, што ў бога верылі... Раней — гэта калі? У часы Брэжнева? Хрушчова? А можа, пры Сталіне? Або ў мінулым стагоддзі, калі секлі розгамі сялян, бізунамі білі рабочых, хавалі жывымі ў каменных мяшках студэнтаў? У мінулым тысячагоддзі? «Дзедаўшчына», калі старэйшы сілай прымушае малодшага мыць яму анучы, хіба толькі сёння з'явілася? Ды ёй тысяча гадоў! Наўрад ці хто сёння захоча звароту ў наша жыццё такой народнай культуры, калі галава сям'і ботамі забіваў насмерць

жонку, цягаў за косы дачку, сцябаў лейцамі дарослага сына. Ідэалізацыі мінулага садзейнічае недаацэнка дасягненняў сучаснага. У наш час новы, гуманны ўклад жыцця, заснаваны на лепшых традыцыях мінулага і сучаснага, увабраўшы лепшыя агульначалавечыя культурныя каштоўнасці, пакуль яшчэ нясмела, але пракладвае сабе дарогу, робячы ўсё больш недапушчальным усё тое, што было такім натуральным і безагаворачным зусім нядаўна.

Пасля кожнага сацыяльнага ўзрушэння, вайны, рэвалюцыі людзям даводзілася вырашаць — што і як аднавіць, што і чаму будаваць, у якім напрамку тварыць. І заўсёды людзі зносілі адны дамы, будавалі і перабудоўвалі іншыя. Але пры гэтым свята захоўвалі тое, што яны лічылі агульнанацыянальным набыткам.

Праблема абароны і захавання культурнай спадчыны мінулага, якое ўвабрала ў сябе агульначалавечыя каштоўнасці,— праблема агульнапланетарная. Яна заключаецца ў тым, што гістарычныя помнікі культуры гінуць. І ад няўмольнага разбуральнага ўздзеяння прыродных фактараў, сярод якіх, акрамя натуральных уздзеянняў сонца, ветру, марозу і вільгаці, яшчэ і «ненатуральныя» — шкодныя прымесі ў атмасферы, кіслотныя дажджы і інш. І ад паломніцтва турыстаў і экскурсантаў, калі цяжка захаваць культурны скарб у некранутым выглядзе. Так, Эрмітаж у Санкт-Пецярбургу не быў пры закладцы разлічаны на наведванне яго мільёнамі людзей у год. Або Нова-Афонская пячора, у якой з-за мноства турыстаў змяніўся ўнутраны мікраклімат.

Праблема захавання культурнай спадчыны мінулага мае ў кожнай краіне свае асаблівасці. Для нашай краіны гэта праблема стаіць асабліва востра. Барацьба з рэлігіяй, якая прыняла ў 1930-я гг. характар стыхійнага бедства, вылілася ў масавае знішчэнне цэркваў. Заадно ў тыя гады і наступныя знішчалі і іншыя помнікі: так былі знесены частка Кітайгародскай сцяны і Красныя вароты, Сухарава вежа ў Маскве, Успенскі сабор у Яраслаўлі, Троіцкі кафедральны сабор у Архангельску. Моцна пацярпелі Санкт-Пецярбург, Кіеў, Волагда і многія іншыя гістарычныя гарады.

Акадэмік Дз. С. Ліхачоў заўважыў, што да пэўных граніц страты ў прыродзе можна вярнуць... У іншым становішчы помнікі культуры. Іх страты неадноўныя, таму што помнікі культуры заўсёды індывідуальныя,

заўсёды звязаныя з пэўнай эпохай, з пэўнымі майстрамі. Кожны помнік разбураецца назаўсёды. «Запас» помнікаў культуры, «запас» культурнага асяроддзя надзвычай абмежаваны ў свеце, і ён спусташаецца з хуткасцю, якая ўсё прагрэсіруе.

Для будучага развіцця культуры драматычна ўсякае знішчэнне жывых традыцый, навыкаў, прыёмаў творчасці. Прыкладам можа паслужыць гаротны лёс музея драўлянага дойлідства ў Кіжах. Звяліся на рускай зямлі майстравыя-цесляры, знаёмыя з усімі прамудрасцямі збудаванняў з дрэва. Паміраюць старыя, якія памятаюць народныя песні, народныя рэцэпты, знікаюць старажытныя промыслы. Бяднее наша культура.

Вельмі многа нясе страт айчынная культура ад вандалаў, сучасных манкуртаў. У рамане Ч. Айтматава «Буранный полустанок (И дольше века длится день...)» прыводзіцца легенда аб атрыманні ў выніку страшэнных катаванняў стопрацэнтнага раба — манкурта. Манкурт — раб, які не памятае свайго мінулага, не ўсведамляе сябе чалавечай істотай, звязанай з сабе падобнымі, і ні за што не нясе адказнасці. Імя персанажа ў нашы дні стала хадзячай назвай. Ім можа быць і чыноўнік з міністэрства, будаўнік, старшыня калгаса. Ды хто хочаш, каму абыякава мінулае і будучае свайго народа.

Прывядзём сумны, але вельмі тыповы прыклад. Польскія рэстаўратары падрадзіліся бескарысліва дапамагчы ў аднаўленні былой прыгажосці палаца ў Царыцыне. Рупліва і старанна былі ўзведзены ўсе архітэктурныя аздабленні аднаго з крылаў палаца. Адной-чы раніцай, прыступаючы да работы на другім участку, яны выявілі, што ўся іх мінулая работа знішчана. Разламаны і пакалечаны вежка і зубцы калісьці прыгожых сцен. Усё перабіта і згаджана. Пасля гэтага палякі паехалі. Зніклі назаўсёды, пакінуўшы на недабудаванай сцяне палаца надпіс: «Рускія, што вы робіце?». Але ў манкуртаў няма нацыянальнасці... Яны рабы ўласнай цемнаты.

Незапатрабаваная культура

Назапашанае чалавецтвам духоўнае багацце, якое тыражуецца пры дапамозе навейшых дасягненняў НТР, робіць духоўныя каштоўнасці больш даступнымі кожнаму, чым гэта было 100 або нават 50 гадоў назад. Інфармацыя, якая перадаецца сучаснымі сродкамі масавай камунікацыі, здольна наблізіць дасягненні культуры да чалавека на адлегласць выцягнутай рукі, але

чалавеку патрэбна яшчэ «дакрануцца» да яе, каб стаць духоўна больш багатым. Але! Глядзяць, слухаюць усе, а «дакранаюцца» нямногія. Перад чалавекам мора кніг і іншай друкаванай прадукцыі. Між тым на ўсё насельніцтва нашай краіны прыпадае толькі 40—50 млн актыўных чытачоў, прыкладна 100 млн маюць дамашнія бібліятэкі (200—350 кніг). Для параўнання: у Францыі на 100 чалавек — 58 ніколі не чыталі кніг. У ЗША — 25 % моладзі да 21 года таксама абыходзяцца без чытання кніг (сёння гэты паказчык складае ўжо 37 %). Або іншы прыклад. Моладзь цікавіцца, актыўна слухае сучасную музыку. Але веды аб музычнай культуры вельмі павярхоўныя. Спецыяльна праведзенае апытанне сярод моладзі ў нашай краіне паказала, што юнакі і дзяўчаты могуць назваць некалькі супермодных айчынных і зарубежных ансамбляў поп-рок напрамкаў. І практычна не ведаюць пра іншыя музычныя напрамкі, слаба інфармаваны пра дасягненні айчынных кампазітараў і выканаўцаў, пра міжнародныя конкурсы і г. д.

Заўважана, што тыя віды культуры і мастацтва, якія вымагаюць ад чалавека сур'ёзных разваг, г. зн., да якіх трэба «дакрануцца» розумам і сэрцам, расцэньваюцца па-абывацельску настроенай моладдзю як нудныя, сумныя, цяжкія або залішне нялёгкія для разумення іх глыбіні. «Сапраўды, сучаснаму чалавеку, стомленаму работай, транспартам, паскораным тэмпам жыцця, неабходны перадышкі, а значыць,— адпачынак і забавы. І тут права кожнага рашаць самастойна: пачытаць кнігу, пайсці ў кіно, тэатр, паглядзець тэлевізар або напіцца і пабіцца. Уся справа ў тым, што той, хто шукае ў культуры толькі займальнасці, не знайшоўшы яе, лёгка знаходзіць заменнік. У выніку замест культуры паяўляецца эрзацкультура. І культура панкаў, і культура наркаманаў — гэта таксама культура, але культура **не** з вялікай літары, а перавернутая, яна не абагачае, а спустошвае чалавека.

Ва ўсім свеце назіраецца спад наведвання тэатраў, музеяў, выставачных і канцэртных залаў. Характэрна гэта тэндэнцыя і для нашай краіны. Паўпустыя тэатральныя залы многіх гарадоў. Савецкі акцёр і рэжысёр А. Яфрэмаў заўважыў, што панізіўся культурны ўзровень нашага грамадства і тэатр хутка адрэагаваў, ён жа вечна жывы дыялог сцэны і гледача. Задумаемся: аб прычыне або аб выніку гаворыць вядомы дзеяч культуры? Гэта ж «...прадмет мастацтва... стварае публіку,

якая разумее мастацтва і здольна цешыцца прыгажосцю...» (Маркс К. Творы. Т. 12. С. 718). З пачатку 80-х гг. пачалося скарачэнне маштабаў наведвання кіно, асабліва айчыннага, прыкладна на 12 % на аднаго жыхара. За апошнія тры гады наведванне айчынных кінафільмаў упала амаль на паўмільярда білетаў, пры тым, што кінавытворчасць ідзе поўным ходам і штогод здымаецца больш як 300 фільмаў. А зараз праверце сябе: назавіце хоць бы дзесятак з іх. Заданне можна прадоўжыць адносна назваў зарубежных фільмаў. Вывады прапануем зрабіць самастойна.

Аднак было б несправядліва не заўважаць тых пазітыўных зрухаў у культуры, якія адбываюцца сёння ў нашай краіне. Вяртанне ў духоўнае жыццё народа культурнай спадчыны ва ўсёй яе разнастайнасці, дэідэалагізацыя культуры, выкараненне манаполіі дзяржавы ў галіне культуры, стварэнне ўмоў для творчасці і свабоднага выбару людзьмі культурных каштоўнасцей і відаў культурнай дзейнасці, пашырэнне міжнародных культурных сувязей і многае іншае.

Пытанні і заданні

1. Якія асноўныя крытэрыі культурнага прагрэсу грамадства?

2. Як крызісны стан вядомых вам сфер грамадскага жыцця паўплываў на культуру нашага грамадства?

3. Назавіце вядомыя вам шляхі выраўноўвання магчымасцей людзей у далучэнні іх да дасягненняў культуры.

4. Ці можна прымяніць да культуры паняцце «экалогія»? У якім сэнсе ўжываецца дадзенае словазлучэнне? Аргументуйце наступнае выказванне: «Культура выратуе грамадства, калі грамадства абароніць культуру». Растлумачце, чаму і ад каго культуру патрэбна абараняць.

5. Правядзіце невялікае даследаванне на тэму «Культурназаймальныя запатрабаванні насельніцтва». Складзіце апытальнік і па выніках гутарак падрыхтуйце зводную табліцу, якая адлюстроўвае асаблівасці запатрабаванняў моладзі, старэйшага пакалення, мужчын і жанчын. Зрабіце неабходныя вывады.

6. Створаная ў 1946 г. камісія пры ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры — ЮНЕСКА — падрыхтавала на міжурадавай аснове збор помнікаў культуры, прызнаных агульнапланетарным набыткам культуры, на ўтрыманне якіх выдзяляюцца ўстаноўленыя сумы. У названым зборы 10 аб'ектаў знаходзіцца на тэрыторыі нашай краіны. Высветліце, якія помнікі нашай айчыны з'яўляюцца і агульнапланетарнай каштоўнасцю.

7. Разумная дзяржава заўсёды шануе свой інтэлектуальны і мастацкі набытак, не дапускае «ўцечкі мазгоў і талентаў» за межы краіны. Прапануйце ўласны праект праграмы па захаванню інтэлектуальнага патэнцыялу краіны.

8. Пакажыце ролю адраджэння роднай мовы ў справе адраджэння культуры нацыі. У чым заключаецца культурная цэннасць народных песень, казак, прыказак і прымавак?

9. Збярыце матэрыял і падрыхтуйце выступленне на тэму «Зварот скарбаў рускага зарубежжа».

10. Французскі мастак Эжэн Дэлакруа заўважыў: «Думаючы пра раманы Вальтэра, пра трагедыі Расіна і пра тысячы іншых шэдэўраў, узнікае пытанне: як? Няўжо ўсё гэта было створана толькі для таго, каб людзі праз кожную чвэрць стагоддзя пыталіся, ці няма чаго-небудзь сярод тварэнняў чалавечага розуму, што магло б іх развесяліць?» У чым сутнасць выказанай аўтарам трывогі? У чым актуальнасць думкі і клопату мастака?

11. Супастаўце наступныя пункты гледжання. Паспрабуйце абараніць кожны з іх і выпрацаваць агульную пазіцыю:

Пісьменнік У. М. Крупін: «Падлічана, што 48 % сельскага насельніцтва не ахоплена гарадскімі спектаклямі. Я падумаў: слава богу, хоць гэтыя 48 % выратаваны. Якія спектаклі мы даём народу...»

Рэжысёр А. Яфрэмаў: «Тэатр павінен паказваць жыццё такім, якім яно ёсць на самай справе, не баючыся прынесці гледачу боль. Таму што ён і ёсць праца душы...»

§ 37. ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ГРАМАДСТВЫ

Роля інфармацыі ў сучасным свеце. Інфармацыйнае грамадства

Уявіце сабе горад будучага. Паркі, азёры, клумбы, крыштальна чыстае паветра. Індывідуальныя машыны знаходзяцца за горадам. Пад вуліцамі размешчаны кабельныя сеткі, якія забяспечваюць разнастайныя віды камунікацый. Адпала патрэбнасць у дзелавых паездках. Уся неабходная інфармацыя паступае на дамашні экран. Грашовыя разлікі ажыццяўляюцца з дапамогай банкаўскіх картак. Калі гэтыя карткі выкарыстоўваюцца для аплаты, машыны аўтаматычна пераводзяць любую суму з аднаго банкаўскага рахунку на іншы. Людзі носяць пры сабе спецыяльныя радыёпрыборы, праз якія аўтаматычна выклікаюцца паліцыя і «хуткая дапамога». Дамы забяспечаны сігнальнымі сістэмамі на выпадак пажару. Злачыннасць канула ў мінулае, вулічных грабяжоў не здараецца, таму што людзі не носяць пры сабе ўласную наяўнасць. Адбыліся вялікія перамены і ў палітычным жыцці. Актыўны абмен інфармацыяй, улік мноства поглядаў прывялі да фарміравання адзінай палітычнай платформы для ўсіх партый і сацыяльных груп. Наступіла эпоха небывалай дэмакратыі — такую карціну будучага малюе амерыканскі сацыёлаг Дж. Марцін.

Вырашальнае значэнне ў пераходзе да такога грамадства і ў самой яго жыццядзейнасці набываюць інфармацыйныя працэсы, новыя спосабы атрымання, захоўвання, распаўсюджвання інфармацыі.

Інфармацыя (ад лац. informatio — «растлумачэн-

не», «выклад») — некаторыя звесткі, сукупнасць якіх-небудзь даных. Вучоныя пад «інфармацыяй» разумеюць не толькі слова або матэматычны знак, але і любы сігнал — шум прыбою, гудок лакаматыва, шамаценне лісця, нават паўза, цішыня — ацэньваецца імі як інфармацыя. Патрэбнасць перадаць і запомніць інфармацыю прывяла да ўзнікнення мовы, пісьменнасці, выяўленчага мастацтва, кнігадрукавання, тэлеграфа, радыё, тэлебачання. Нарэшце былі вынайдзены ЭВМ, прызначаныя спецыяльна для аўтаматычнай апрацоўкі інфармацыі. Яны дапамагаюць «справіцца з інфармацыйным выбухам» — з'явай, якая ўзрастае па ўзыходзячай лініі. Напрыклад, аб'ём усіх навуковых публікацый за адзін 1985 г. перавысіў усё тое, што было выдадзена ў перыяд паміж эпохай Адраджэння і 1976 г., г. зн. за 500 гадоў.

У індустрыяльна развітых краінах людзі ўжо цяпер падвяргаюцца плыні інфармацыі, якая ў два з лішнім разы пераўзыходзіць нарматыўную здольнасць чалавека да яе засваення. Сучасная камп'ютэрная тэхніка дазваляе рабіць вылічэнні, розныя лагічныя аперацыі з велізарнай хуткасцю, якая ў многа разоў перавышае магчымасці чалавека, чалавечага мозга і са значна меншымі затратамі. У 1952 г. 1 млн аперацый займаў 10 хвілін і каштаваў 300 долараў. У 1986 г. для гэтага патрабавалася паўсекунды і 0,06 долара. Цяпер яшчэ менш. Усё гэта дае падставу гаварыць пра тое, што свет знаходзіцца каля вытокаў «камп'ютэрнай рэвалюцыі», у выніку якой адбудуцца змены ва ўсім сучасным цывілізаваным укладзе і будзе створана інфармацыйнае грамадства.

Канадскі вучоны Мак-Люэн распрацаваў трохступеньчатую мадэль Сусветнай гісторыі: першая ступень — племянны індывід — «чалавек, які слухае», у яго пераважае вуснае маўленне ў якасці сродку камунікацыі. Другая ступень — эпоха тыпаграфскага або індустрыяльнага індывіда, якая пачалася з XV ст.,— перамога друкаванага слова над вусным. Гэта быў «чалавек, які глядзіць». Трэцяя ступень — перамога электроннай камунікацыі.

Сімвалічным актам «нараджэння» інфармацыйнай эры «аб'яўляецца запуск штучнага спадарожніка Зямлі, які стаў тэхналагічным каталізатарам фарміравання сапраўднай глабальнай сувязі нервовай сістэмы планетарнай цывілізацыі. Святой тройцай новага

грамадства сталі камунікацыйны спадарожнік, кабельнае тэлебачанне і персанальны камп'ютэр.

Ідэя дамінуючай ролі электроннай тэхнікі і інфарматыкі развівалася ўжо з канца 60-х гг. З пачатку 80-х гг. замацаваўся тэрмін «інфармацыйнае грамадства». У немалой ступені гэтаму садзейнічалі «бум» інфарматыкі і камерцыйная рэклама, якая паказвала камп'ютэр як свайго роду пароль у будучае. Вядомыя заходнія сацыёлагі (Д. Бел, Масуда і інш.) лічаць, што інфармацыйнае грамадства ўяўляе сабой абагульненае паняцце, якое ахоплівае ўсе бакі жыцця.

У тэхнічнай сферы мы назіраем шырокае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у вытворчае, эканамічнае, дзелавое жыццё, у сістэму адукацыі і побыт. У эканамічнай сферы інфармацыя ператварылася ў тавар, у сацыяльнай — інфармацыя становіцца галоўным фактарам змянення якасці жыцця, у палітычнай — маецца на ўвазе свабодны доступ да разнастайнай інфармацыі, закліканай забяспечыць на гэтай аснове шырокі абмен думак; у культурнай сферы абмен інфармацыяй дапаможа фарміраванню нормаў і каштоўнасцей, якія адпавядаюць патрэбнасцям новага грамадства. Такім чынам, інфармацыйнае грамадства — гэта грамадства, у якім інфармацыя і ўзровень яе выкарыстання абумоўліваюць эканамічнае развіццё і сацыяльныя змены. У такім грамадстве ўзровень жыцця, характар працы, адпачынку, сістэмы адукацыі, рынак непасрэдна зазнаюць на сабе растучы ўплыў інфармацыі і ведаў.

Напрыклад, інфармацыйны «выбух» адкрывае магчымасці для найбольш гнуткай сістэмы арганізацыі працы, ствараюцца «расклады па індывідуальнаму выбару». Зменныя графікі работы ў 1980 г. былі ў 38 % «сініх каўнерыкаў» ФРГ, 27 % — у ЗША. У выніку прадукцыйнасць працы вырасла, а дысцыпліна палепшылася. Павялічыўся аб'ём начной работы, асабліва ў сферы паслуг: 15—25 % занятых у гэтай сферы працуюць у начную змену. Супермаркеты і банкі функцыяніруюць кругласутачна.

Гэта новая сістэма вытворчасці дае магчымасць стварыць дробныя працоўныя калектывы на аснове электроннай тэхнікі. Ужо цяпер многія фірмы дазваляюць сваім служачым працаваць дома. Завод перастаў быць асноўнай мадэллю вытворчасці. Ды і самі заводы прыметна змяняюцца. Прадукцыя навейшых прадпрыемстваў не з'яўляецца больш масавай. Выкарыстоў-

ваецца менш сыравіны, энергіі, робяцца спробы падняць на небывалы ўзровень дызайн. Працоўныя ўжо не прымацаваны да рытму «канвеера». Узровень шуму знізіўся да мінімуму. На рабочых месцах машына суседнічае з зелянінай і кветкамі. Безумоўна, такіх прадпрыемстваў цяпер нямнога, але за імі будучае.

Інфармацыйнае грамадства дае прастор велізарнай разнастайнасці крыніц энергіі — воднай, сонечнай, геатэрмальнай, прыліўной, атрыманай з біямасы, тэрмаядзернай.

У сучасных школах камп'ютэры ўжо не бяруць на сябе функцыі збору і абагульнення інфармацыі аб паспяховасці; камп'ютэрныя праграмы выкарыстоўваюцца для навучання мовам, ігры на музыкальных інструментах. Амерыканцы распрацоўваюць сістэму, з дапамогай якой студэнты, якія маюць персанальныя камп'ютэры, будуць падключацца да універсітэцкай камп'ютэрнай сеткі. Гэта сапраўды рэвалюцыя ў адукацыі.

Інфармацыйная тэхніка адкрывае многа магчымасцей для дэмакратыі, яна дазваляе праводзіць электронныя плебесцыты і апытанні поглядаў, тэлеканферэнцыі з урадам. Тэлекамунікацыйная кабельная сетка забяспечыць двухбаковую сувязь паміж грамадзянінам і палітычным дзеячам, якая дасць магчымасць улічваць думкі большасці людзей у час прыняцця важных палітычных рашэнняў.

Інфармацыйнае грамадства: праблемы

«Над горадам лятае электронная абаронца-птушка. Яна заклікана вырашыць адну з самых складаных праблем, якія стаяць перад чалавецтвам,— выключыць злачыннасць з жыцця грамадства. Як толькі зламыснік адважыцца загубіць ахвяру, «разумная птушка», у якую ўведзена самаабучальнае ўстройства, паражае патэнцыял злачынца электрычным зарадам»,— так пачынае сваё апавяданне славуты амерыканскі пісьменнік-фантаст Р. Шэклі. Але што атрымліваецца: птушка аказалася не ў стане разабрацца ў рэальных супярэчнасцях жыцця. Яна абрушвае кары на мясніка, паляўнічага, паралізуе нармальнае жыццё горада. Фінал апавядання «Абаронца-птушка» носіць характар папярэджання людзям. Для знішчэння абаронцы-птушкі сканструяваны самакіравальныя механізмы-ястрабы. Аўтаматы спараджаюць новыя аўтаматы, а праблема ліквідацыі злачыннасці застаецца

нявырашанай. НТП часта прыносіць чалавецтву многа нечаканасцей, і не ўсе яны, на жаль, прыемныя.

Татальная аўтаматызацыя і робатызацыя інфармацыйнага грамадства надзвычай абвастрае і без таго сур'ёзную праблему беспрацоўя. У 1988 г. у ЗША палавіна аўтамабіляў была сабрана з дапамогай аўтаматаў. У 1990 г. робаты ліквідавалі каля 1 млн рабочых месцаў. Паводле падліку французскага ўрада, ЭВМ к канцу бягучага стагоддзя прывядуць да скарачэння колькасці прамысловых рабочых на 40 %, а канторскіх служачых і ІТР на $^1/_3$.

У Японіі ўжо ў пачатку 80-х гг. паявіліся першыя бязлюдныя прадпрыемствы. Сярод беспрацоўных з кожным годам павялічваецца колькасць кваліфікаваных спецыялістаў: вопытных інжынераў, канторскіх работнікаў, бухгалтараў. Як адзначана ў дакладзе вучоных— членаў Рымскага клуба, «армія «стальных каўнерыкаў» (робатаў) выцясняе сінекаўнерыкавых і белакаўнерыкавых работнікаў».

Мікраэлектроніка робіць усё большы і большы ўплыў на міжнародны падзел працы ў глабальным маштабе. Вынік гэтага — пашырэнне бездані паміж багатымі і беднымі краінамі: са скарачэннем долі жывой працы ў кошце прамысловых вырабаў памяншаецца прыцягальнасць краін, якія развіваюцца, як пастаўшчыкоў таннай рабочай сілы. Па гэтай прычыне буйнейшыя дзяржавы свету ўсё менш укладваюць капіталы ў эканоміку краін, што сталі на шлях развіцця.

Яшчэ больш востра стаіць праблема электронікі і вайны. Вядомы англійскі фізік Барнабі падлічыў, што выдаткі на даследаванні і распрацоўку ў галіне ўзбраення дасягаюць 50 млрд долараў у год — 10 % усіх расходаў чалавецтва. Імі занята 400 тыс. вучоных і інжынераў вышэйшай кваліфікацыі. Найбольш небяспечнымі Барнабі лічыць поспехі ў галіне ваеннай электронікі, якія павялічваюць пагрозу сусветнай атамнай вайны. Да іх адносіцца перш за ўсё — павышэнне дакладнасці і надзейнасці стратэгічных ракет.

Камп'ютэрызацыя, як высветлілася, нясе ў сабе пэўную пагрозу для свабоды асобы. Цяпер каля палавіны амерыканцаў працуюць у буйных карпарацыях, якія збіраюць дэталёвую інфармацыю пра адукацыю, сям'ю, прывычкі служачых. Камп'ютэры змянілі колькасць і якасць інфармацыі. Яны зрабілі магчымым атрыманне даных аб прыватным жыцці практычна любога грама-

дзяніна ЗША (даныя рэгіструюцца аўтаматычна).

Складаным аказалася ўзаемадзеянне чалавек — тэхніка. У ілюстрацыі да адной з кніг пра сацыяльны ўплыў інфарматыкі мастак дасціпна выразіў уяўленне аб будучым чалавека ў век электронікі: на малюнку паказаны чалавек, які думае і размаўляе лічбавым кодам, нібы вылічальная машына. Тут адлюстравалася існуючая ў век кібернетыкі боязь людзей, што асоба можа стаць прыдаткам вылічальнай машыны. Яна як бы ператвараецца ў прастога аператара, дзеянні якога даведзены да аўтаматызму. Мысліцельныя функцыі чалавека адыходзяць на другі план.

Найбольш складанай аказалася сувязь паміж інфармаванасцю насельніцтва і глыбінёй дэмакратыі. Велізарная роля сродкаў масавай інфармацыі ў жыцці грамадства спарадзіла дзве тэндэнцыі: з аднаго боку, усё часцей узнікаюць магутныя калектыўныя псіхозы — шавіністычны экстаз, натхненне, паніка; з другога — назіраецца масавая апатыя і апалітычнасць ад празмернасці інфармацыі. Аб ролі ў жыцці грамадства сродкаў масавай камунікацыі пагутарым асобна.

Сродкі масавай камунікацыі

Да сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі традыцыйна прылічваюць кіно, радыё, тэлебачанне, друк, відэа. Пры найбольш пашыраных трактоўках тэрміна яго змест уключае таксама рэкламу, фатаграфію, моду, дызайн.

У цяперашні час паняцці «сродкі масавай інфармацыі» і «сродкі масавай камунікацыі» сталі сінонімамі, таму што ўсё больш узмацняецца адваротная сувязь паміж спажыўцамі і вытворцамі інфармацыі. Гэта адбываецца пры дапамозе пісем у рэдакцыі газет, часопісаў, радыё і тэлеперадач, тэлефонных званкоў у студыю камерцыйных каналаў, прамых трансляцый, тэлемастоў.

Сродкі масавай інфармацыі часам называюць «чацвёртай уладай» (пасля заканадаўчай, выканаўчай і судовай), улічваючы ступень іх уздзеяння на насельніцтва. Прывядзём адзін прыклад.

У 30-х гг. у ЗША радыёвяшчальная кампанія «Каламбія» ажыццявіла перадачу інсцэніроўкі рамана Г. Уэлса «Война миров». Аўтар пастаноўкі пастараўся прыдаць ёй характар поўнай дакументальнай дакладнасці. Ён перанёс месца дзеяння ў Амерыку, даў іншую назву твору — «Вторжение с Марса» і пера-

працаваў яго так, што на слых ён успрымаўся, як надзвычай эмацыянальная і ў той жа час хранікальная справаздача аб падзеях, якія адбываюцца. Эфект перадачы быў непрадбачаны. Яна працягвалася ўсяго час, з 8 да 9 вечара, але мала хто з слухачоў даслухаў да канца і даведаўся пра гібель марсіян, якія ўварваліся на Зямлю. Перадача выклікала масавы псіхоз, паніка ахапіла не толькі Нью-Йорк, але і іншыя гарады. Насельніцтва спрабавала пакінуць сваё жыллё і знайсці хоць якое-небудзь сховішча. Нервовыя хваляванні адных людзей прыводзілі ў бальніцы, а другіх, раздаўленых ашалелым натоўпам,— у моргі. У паліцэйскіх участках і рэдакцыях газет бесперапынна званілі тэлефоны — амерыканцы спрабавалі ўстанавіць праўдзівасць і памеры катастрофы.

Ва ўмовах рэзкага ўзрастання ролі сродкаў масавай інфармацыі асаблівае значэнне набывае пытанне аб тым, у чыіх руках знаходзяцца друк і радыё, тэлебачанне, рэклама, якія ідэі яны прапагандуюць, ці сугучныя гэтыя ідэі агульначалавечым каштоўнасцям.

Сучаснае грамадства стварыла вялікую разнастайнасць крыніц масавай інфармацыі. Напрыклад, толькі ў СССР у 1990 г. выходзіла 8532 газеты, 5295 часопісаў, не гаворачы ўжо пра велізарную колькасць радыёперадач і тэлепраграм. Чалавеку цяжка разабрацца ў такой разнастайнасці. Часта вырашальную ролю іграе знешняя прывабнасць і рэклама таго або іншага сродку масавай інфармацыі. Гэта асабліва добра разумеюць амерыканцы — на ЗША прыпадае каля 70 % сусветных выдаткаў на рэкламу.

Падвядзём вынікі. Сродкі масавай інфармацыі сталі неад'емнай часткай жыцця сучаснага грамадства. Яны не проста паведамляюць людзям разнастайныя звесткі, але і актыўна ўдзельнічаюць у фарміраванні грамадскай думкі. Сродкі масавай інфармацыі могуць дапамагчы разабрацца ў праблеме або адвесці ад правільнага яе разумення, таму вельмі важна для сучаснага чалавека набыць уменне арыентавацца ў разнастайнай плыні інфармацыі.

Пытанні і заданні

1. Што такое інфармацыя?
2. Як вы ставіцеся да карціны будучага горада, якую малюе амерыканскі сацыёлаг Дж. Марцін? Ці здаецца яна вам рэальнай?
3. Арганізуйце дыспут на тэму «Інфармацыйнае грамадства: «за» і «супраць».

4. Амерыканскі сацыёлаг Герберт Сайман лічыць, што са з'яўленнем камп'ютэра чалавек страчвае ўяўленне аб сабе як аб адзінай разумнай істоце, таксама як з адкрыццём Капернікa і Галілея ён перастаў усведамляць сябе цэнтрам сусвету, а са з'яўленнем тэорыі Дарвіна пахіснуўся міф аб чалавеку як завяршэнні божага тварэння.

Ці згодны вы з гэтым сцвярджэннем? Свой пункт погляду абгрунтуйце.

5. Д. Бел піша: «Менеджэральная эліта — гэта дзеці не былых уласнікаў, а людзей, якія падняліся наверх дзякуючы тэхнічнай кампетэнтнасці. Эліта ведаў будзе выконваць у інфармацыйным грамадстве ролю эксперта».

Як вы ставіцеся да гэтага выказвання? Ці лічыце вы яго правільным?

6. Правядзіце невялікае сацыялагічнае даследаванне: падрыхтуйце пытанні, правядзіце анкету, якая дапаможа ўстанавіць, якія газеты і часопісы, тэмы і радыёпраграмы пераважна чытаюць, глядзяць, слухаюць вучні вашага класа, вашы бацькі, настаўнікі. Паспрабуйце растлумачыць прычыны гэтых пераваг.

7. Чаму сродкі масавай інфармацыі называюць «чацвёртай уладай» у дзяржаве?

8. Акадэмік Н. Майсееў піша: «Толькі па-сапраўднаму інтэлігентнае грамадства, якое ўсведамляе сутнасць тых бед, якія цягнуць за сабой войны, забруджванне навакольнага асяроддзя, можа быць здольнае прыняць новыя прынцыпы маралі і маральнасці. Міжнародная асветніцкая праграма павінна ў максімальнай ступені выкарыстоўваць усе сучасныя сродкі масавай інфармацыі, сярод якіх асобае месца будзе займаць тэлематыка — сімбіёз тэлебачання, інфарматыкі, вылічальнай тэхнікі, касмічных сродкаў сувязі. Яна бурна развіваецца ўжо цяпер — тэлемасты, якія даюць магчымасць людзям у любой частцы зямнога шара не толькі атрымліваць інфармацыю з першых рук, але бачыць і задаваць пытанні дакладчыку. Тады, калі гэтыя сродкі камунікацый стануць такімі ж даступнымі, як і персанальныя ЭВМ, паявяцца важнейшыя СМІ і масавага агульнапланетарнага выхавання».

Як вы ставіцеся да гэтага выказвання?

§ 38. САЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАГНОЗЫ

Чалавек заўсёды імкнецца прадбачыць будучае. Пры гэтым заўважана, што цяга да прадбачання асабліва ўзмацняецца ў пераломныя моманты, ва ўмовах высокіх тэмпаў змен. Многія славутыя мысліцелі мінулага пакінулі нам свае праекты будучага ладу чалавечага грамадства. «Ідэальнае» грамадства Платона, гарманічнае грамадства сацыялістаў-утапістаў, марксісцкія ўяўленні аб камунізме, пераход да якога, паводле думкі заснавальнікаў марксізму, азначаў бы пачатак сапраўднай гісторыі чалавецтва — усе гэтыя сюжэты ўжо разглядаліся ў папярэдніх раздзелах кнігі. Тут жа, у заключным параграфе, размова пойдзе пра сучасную сацыяльную прагностыку.

Што такое футуралогія?

У нашым стагоддзі зарадзілася цэлая галіна грамадазнаўства, якая ахоплівае распрацоўку канцэпцый будучага, аналіз магчымых перспектыў сацыяльных працэсаў. Тэрмін «футуралогія» (паходзіць ад грэчаскага і лацінскага слоў — «вывучэнне будучага») быў прапанаваны ў 1913 г. сацыёлагам О. Флетхеймам.

У 60-я гг. адбыўся своеасаблівы прагнастычны бум. З'явілася многа арганізацый, навуковых цэнтраў па вывучэнню будучага. Адной з найбольш аўтарытэтных міжнародных арганізацый стаў Рымскі клуб, створаны з мэтай больш глыбокага вывучэння асаблівасцей развіцця чалавецтва ў эпоху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. У адным з першых дакладаў быў зроблены вывад аб тым, што пры захаванні існуючых тэндэнцый эканамічнага развіцця ў першай палавіне XXI ст. чакаецца глабальная катастрофа. У далейшым асобныя вывады гэтага даклада былі падвергнуты абгрунтаванай крытыцы. Аднак яго аўтарам удалося галоўнае — звярнуць увагу на вострыя праблемы сучаснасці, і ў першую чаргу экалагічнага характару.

У прагностыцы прынята адрозніваць бліжэйшае будучае (25—30 гадоў), агляднае будучае (70—80 гадоў) і далёкае (або фантастычнае) будучае. Адносна непасрэднага будучага можна выказваць зусім дакладныя меркаванні. Напрыклад, дастаткова пэўна прадказваецца колькасць насельніцтва на планеце, запасы прыроднай сыравіны, дасягальныя тэхналагічныя ўзроўні эканомікі і г. д.

Уяўленні ў рамках агляднага будучага носяць характар імаверных, магчымых прагнозаў. Пра далёкае ж будучае мы можам выказваць толькі некаторыя гіпатэтычныя здагадкі.

Ці можна адрозніць навуковы прагноз ад утопіі?

Такая пастаноўка пытання выглядае не марнай. Ужо не адзін раз у гісторыі чалавецтва тыя або іншыя праекты ўяўляліся як абсалютна праўдзівы і адзіна магчымы варыянт будучага. Але праходзіў час, а прадказанні не збываліся. Для людзей, якія пранікліся верай у гэтыя ідэі і магчымасць іх ажыццяўлення, наступаў поўны драматызму момант прасвятлення, краху ілюзій. Але спакуса утапізму не знікала, адраджалася ізноў і ізноў у новым, яшчэ больш прывабным «адзенні». Паралельна ўзмацнялася і крытыка утапізму, рабіліся

спробы вызначыць яго «родавыя» рысы. Класікі марксізму, напрыклад, расцэньвалі погляды на будучае Фур'е, Сен-Сімона, Оўэна як утапічныя перш за ўсё таму, што гэтыя мысліцелі не выявілі рэальных шляхоў пераходу грамадства на новую ступень развіцця. А вось што піша пра прыметы ўтапізму філосаф і багаслоў Г. В. Фларoўскі (1893—1979). «Грамадскаму утапізму ўласціва вера ў магчымасць канчатковага ажыццяўлення ў рамках гісторыі. Усё роўна, куды ў часе адносіцца сапраўднае ажыццяўленне гэтага беззаганнага грамадскага ладу — у беззваротнае мінулае, у далёкае або ўжо надыходзячае будучае, або прызнаецца ўжо дасягнутым у сучаснасці». Вырашальнае значэнне тут набывае сам факт дасягнення такога стану, які выключае «не толькі патрэбнасць, але саму магчымасць паляпшэння... Смак і імкненне да дробязнай рэгламентацыі незвычайна характэрныя для самых розных напрамкаў утапічнай думкі».

Безумоўна, веданне некаторых рыс утапічных канструкцый яшчэ не ёсць гарантыя ад «упадзення ў спакусу утапізму». Галоўным крытэрыем ісціны любых, у тым ліку і прагрэсіўных ідэй, выступае практыка, рэальны ход грамадскага развіцця чалавецтва. І тут заснавальнікі марксізму, якія неаднаразова падкрэслівалі гэты вывад, бясспрэчна, мелі рацыю.

Але як хочацца прыадкрываць заслону будучыні. І футуралогія прапануе даволі разнастайны арсенал метадаў і сродкаў сацыяльнага прагназіравання, якія дазваляюць зрабіць прадказанні больш дакладнымі.

Асноўныя метады сацыяльнага прагназіравання

Адным са сродкаў даследавання з'яўляецца экстрапаляцыя (ад лацінскіх слоў — extra — «праз», «паза»; polio — «выпрасцваю», «змяняю»), якая дапускае прадаўжэнне ў будучым тэндэнцый сучаснага. «Што будзе з грамадствам, асобнай яго сферай, асобнай сацыяльнай групай, калі ўсталяваныя характарыстыкі іх развіцця захоўваюцца?» — вось на якое пытанне можна адказаць, выкарыстоўваючы дадзены метад. Аднак у сітуацыі паскарэння грамадскіх працэсаў, іх хуткіх і часта радыкальных змен экстрапаляцыя, узятая ў адрыве ад іншых метадаў, не можа даць надзейных прагнозаў.

Канструюючы магчымае будучае, даследчыкі выкарыстоўваюць метад мадэліравання (ад лацінскага слова modulus — «мера», «узор», «норма»). Рэальны аб'-

ект, працэс замяняецца яго тэарэтычным аналагам, схемай. Вывучэнне мадэлі дае магчымасць рабіць вывады і аб самім арыгінале.

У прагназіраванні адрозніваюць мадэлі-праекты і мадэлі-сцэнарыі. Праекты будучага часцей за ўсё арыентаваны на дасягненне пэўных мэт, пажаданых станаў грамадства. А паколькі ўяўленні аб аптымальным жыццепарадку ў розных людзей, сацыяльных груп розныя, у грамадстве адначасова можа існаваць мноства праектаў будучага сацыяльнага ладу. Некаторыя з іх мы разгледзім у далейшым.

Сцэнарнае мадэліраванне — гэта вызначэнне таго, што будзе, калі ажыццяўляць тыя або іншыя меры, рабіць захады ў зададзеным напрамку. Прыкладам прагнозу-сцэнарыя можна лічыць прагназіраванне наступлення «ядзернай зімы» ў выпадку ўзнікнення ў свеце ядзернага канфлікту.

У пэўных умовах, калі, напрыклад, трэба вызначыць, якім чынам можна выйсці на аптымальны шлях развіцця, асабліва значэнне набываюць прагнозы не будучых станаў, а арганізуемых працэсаў, г. зн. у гэтых умовах важны не праект самой «пабудовы», а ўяўленні аб характары і паслядоўнасці яе будавання. Для нашай краіны на сучасным этапе яе развіцця такога характару прагнозы асабліва актуальныя.

Альтэрнатывы будучыні

Якія ж варыянты магчымага будучага чалавецтва і шляхоў пераходу да яго атрымалі сёння найбольш шырокае распаўсюджанне?

Пакідаючы ўбаку дэталі, можна гаварыць пра два напрамкі ў футуралогіі: сацыяльна-аптымістычны і экапесімістычны. Паяўленне першага напрамку, які зарадзіўся ў 60-я гг., было ў многім звязана з развіццём навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Узніклі і ўмацаваліся надзеі, што з дапамогай НТР будуць вырашаны многія вострыя сацыяльныя праблемы. У рамках гэтага напрамку ўзніклі тэорыі «індустрыяльнага грамадства», канвергенцыі дзвюх сістэм.

У далейшым даволі аптымістычныя прагнозы будучага давалі прыхільнікі тэорыі постіндустрыяльнага, або інфармацыйнага грамадства. Аб тым, якім яно бачыцца сёння, вы ўжо даведаліся з папярэдніх параграфаў.

Хваля эканамічных і экалагічных крызісаў 70-х гг. узмацніла песімістычныя настроі ў грамадстве. Гэта

адбілася на характары сацыяльных прагнозаў. Так, прадаўжаючы песімістычную лінію Шпенглера, некаторыя актыўныя ўдзельнікі Рымскага клуба распрацавалі «катастрафічныя» сцэнарыі будучага, дзе абгрунтоўваецца ідэя непазбежнай гібелі цывілізацыі пад уплывам паскоранага працэсу забруджвання навакольнага асяроддзя, скарачэння прыродных рэсурсаў, спынення росту эканомікі. Адзін з заснавальнікаў гэтага напрамку амерыканскі вучоны Д. Форэстэр (нарадзіўся ў 1918 г.) у сваёй кнізе «Мировая динамика» выклаў асновы тэорыі «граніц росту». Прадухіленне будучага краху цывілізацыі аўтар бачыў у магчыма больш хуткім пераходзе да «нулявога росту» (адмаўленне ад будаўніцтва новых прадпрыемстваў, прастое ўзнаўленне насельніцтва, выкарыстанне толькі такіх крыніц энергіі, якія ўзнаўляюцца, гэта значыць сонечнай энергіі, гідрарэсурсаў і г. д.). У далейшым тэорыя «граніц росту» была падвергнута сур'ёзнай крытыцы. Як вы думаеце чаму?

Свет боскай дасканаласці

Прагназіраваць бліжэйшае і далёкае будучае спрабуе не толькі навука. Карціны будучыні, прароцтвы будучыні чалавецтва — неад'емная частка рэлігійнай свядомасці. У апошняй кнізе Бібліі — Апакаліпсісе — гаворыцца пра набліжэнне Царства Божага на Зямлі. Здаўна ўзніклі два напрамкі ў разуменні таго, як яно з'явіцца ў свет. Адны ўяўлялі гэта як раптоўнае ўмяшанне звышнатуральных сіл, якія поўнасцю разбураць стары свет, перапоўнены да гэтага часу сіламі зла. Другія пакідалі месца светламу фіналу: пераход да Новага Іерусаліма яны разглядалі як узыходжанне на новую ступень развіцця чалавецтва.

Сярод тых, хто верыў у светлае будучае, быў і французскі філосаф Тэяр дэ Шардэн (1881—1955). Тэяр адрознівае тры паслядоўныя стадыі эвалюцыі: «пераджыццё», «жыццё» (біясфера) і «феномен чалавека» (наасфера — ад грэчаскіх слоў, якія азначаюць «розум» і «шар»). Духоўнае аб'яднанне чалавецтва, лічыць філосаф, вядзе яго да Звышжыцця і Звышчалавецтва. Тэяр перакананы, што ўсё развіццё навукі, культуры, сацыяльных адносін вядзе да гэтага вышэйшага духоўнага пункта, які ён называе «пунктам Амега».

Уяўленні Тэяра сёння многім здаюцца прыгожай, але неажыццявімай марай. Аднак пра магчымасць

набліжэння эры наасферы як найбольш жаданай будучыні чалавецтва разважаюць цяпер не толькі тэарэтыкі-багасловы, але і вучоныя — даследчыкі прыроды. Рускі вучоны У. І. Вярнадскі (1863—1945), выкарыстоўваючы паняцце «наасфера», развіваў ідэю аб будучым зліцці дзвюх тэндэнцый развіцця: прыроднай і сацыяльна гуманітарнай. Чалавецтва, пазнаючы законы прыроды, развіваючы тэхніку, надасць новы стан усёй біясферы. А вось як разважае пра шляхі пераходу ў эпоху наасферы наш сучаснік вучоны Н. Майсееў. Чалавецтва — гэта мора разнастайнасці. Усе людзі розныя, яны непадобныя адзін на аднаго. І вось разнастайнасць — залог прагрэсу, здароўя чалавецтва як біялагічнага віду. Разам з тым людзі павінны навучыцца жыць разам. Без гэтага ў чалавека проста не будзе будучыні. «Уменне шукаць кампрамісы, павага да чужых жыццёвых стандартаў, уменне шанаваць прыроду, заглушаць уласную агрэсію... набыццё пачуцця агульнапланетарнай супольнасці — гэта тыя атрыбуты маральнасці, якія неабходныя ўжо ў самым бліжэйшым будучым. Не ў пункце Амега, а ў значна больш блізкім пункце, скажам, Амега-штрых». (Моисеев Н. Человек и ноосфера. М., 1990. С. 270—271).

Замест заключэння

Свет на парозе новага тысячагоддзя. З надзеяй і трывогай за лёс цывілізацыі мы сёння глядзім у будучыню. Якія прагнозы-сцэнарыі ўвасобяцца ў рэчаіснасць? А магчыма, гэта будуць нейкія, невядомыя нам варыянты развіцця? Адказ дасць само жыццё. Аднак і цяпер ужо ясна, што ніякага загадзя падрыхтаванага для нас будучага няма. Нават Апакаліпсіс да апошняга імгнення дае чалавеку свабоду выбару: памнажаць сілы зла або актыўна тварыць дабро. Грамадскае развіццё, асабліва ў пераломныя моманты, змяшчае ў сабе розныя, нярэдка альтэрнатыўныя магчымасці. Якія з іх будуць ажыццёўлены на практыцы? У канчатковым выніку гэта залежыць ад свядомай і актыўнай дзейнасці людзей, а значыць, і ад вашай дзейнасці. Дарогу ў будучыню мы пракладваем сёння. Выжыванне і прагрэс чалавецтва ў многім залежыць ад таго, у якой ступені распаўсюдзіцца новае мысленне, што грунтуецца на агульначалавечых каштоўнасцях. Зразумеўшы небяспеку канфрантацыі, усвядоміўшы значэнне дасягненняў цяперашняй і папярэдніх цывілізацый як бясспрэчных каштоў-

насцей, якія трэба берагчы і прымнажаць, пераканаўшыся ў неабходнасці сумесных і ўзгодненых намаганняў перад пагрозай глабальных праблем, розум чалавецтва выведзе яго з сацыяльных тупікоў.

Расказваючы на старонках гэтай кнігі пра блуканні і адкрыцці чалавечай думкі, пра былыя цывілізацыі і сучасны свет, мы імкнуліся паказаць, як нараджалася ў тэорыі і рэальным вопыце тое, што сёння мы адносім да агульначалавечых каштоўнасцей, якім доўгім і цяжкім быў і застаецца шлях да іх успрымання ўсімі людзьмі. Мы верым, што яны стануць арыенцірамі і ў вашым жыцці і чалавецтва зможа пераступіць не толькі за парог наступнага, але і далейшага тысячагоддзя.

ЗМЕСТ

Аддзел першы. **НА ШЛЯХУ ДА СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ**

Раздзел I. **Мысліцелі мінулага і сучаснасці аб грамадстве і яго развіцці**

§ 1. Грамадства і грамадскія адносіны 5
§ 2. Развіццё ведаў аб грамадстве 13
§ 3. Марксісцкае вучэнне аб грамадстве, ч. I 21
§ 4. Марксісцкае вучэнне аб грамадстве, ч. II 28
§ 5. Гістарычны лёс марксізму. (Развіццё марксісцкага вучэння ў XX ст.) 36
§ 6. Развіццё грамадазнаўства ў XX ст. 45
§ 7. Праблемы сучаснага грамадазнаўства 54

Раздзел II. **Цывілізацыі мінулага**

§ 8. Што такое сусветная цывілізацыя 60
§ 9. Асаблівасці старажытных цывілізацый 67
§ 10. Старажытныя цывілізацыі Еўропы 75
§ 11. Свет варварства 86
§ 12. Цывілізацыя эпохі сярэдневякоўя 96
§ 13. Пераход да індустрыяльнай цывілізацыі 107
§ 14. Цывілізацыя Усходу 118

Аддзел другі. **СУЧАСНАЕ ГРАМАДСТВА — ЦЭЛАСНЫ І ЎЗАЕМАЗВЯЗАНЫ СВЕТ**

Раздзел III. **Сучасны этап сусветнага цывілізаванага развіцця і наша грамадства**

§ 15. Сучасныя цывілізацыі 126
§ 16. Глабальныя праблемы сучаснасці 132
§ 17. Савецкае грамадства ў сучасным свеце 141

Раздзел IV. **Эканамічнае развіццё сучаснай цывілізацыі**

§ 18. Эканоміка і яе роля ў жыцці сучаснага грамадства . . . 150
§ 19. Рыначныя адносіны ў сучаснай эканоміцы 159
§ 20. Навукова-тэхнічны прагрэс і матэрыяльная вытворчасць 168
§ 21. Чалавек у сістэме эканамічных адносін 177
§ 22. Радыкальная эканамічная рэформа ў СССР 187

Раздзел V. **Цывілізацыя і сацыяльнае развіццё**

§ 23. Сацыяльная структура грамадства 197
§ 24. Нацыі і міжнацыянальныя адносіны 205
§ 25. Сацыяльны статус асобы 215
§ 26. Тэндэнцыі развіцця сацыяльных адносін у нашай краіне 222

Раздзел VI. **Сучасная цывілізацыя і палітычнае жыццё**

§ 27. Палітычная сістэма і яе роля ў жыцці грамадства . . . 229
§ 28. Прававая дзяржава 238
§ 29. Палітычны плюралізм 246
§ 30. Парламенцкая дэмакратыя 257
§ 31. Палітычны статус асобы 265

Раздзел VII. **Духоўныя каштоўнасці сучаснай цывілізацыі**

§ 32. Духоўная культура 273
§ 33. Навука. Адукацыя 282
§ 34. Рэлігія ў сучасным свеце 291
§ 35. Духоўнае жыццё сучаснага чалавека 300
§ 36. Сучасныя праблемы духоўнай культуры ў СССР . . . 310
§ 37. Інфармацыйныя грамадствы 320
§ 38. Сацыяльныя прагнозы 327

Учебное издание

БОГОЛЮБОВ Леонид Наумович
ГЛУШКОВ Евгений Анатольевич
ЖИЛЬЦОВА Евгения Ивановна и др.

ЧЕЛОВЕК И ОБЩЕСТВО
Основы современной цивилизации
Учебное пособие для учащихся
средних учебных заведений

Минск, издательство «Народная асвета»

На белорусском языке

Вучэбнае выданне

БАГАЛЮБАЎ Леанід Навумавіч
ГЛУШКОЎ Яўгеній Анатольевіч
ЖЫЛЬЦОВА Яўгенія Іванаўна і інш.

ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА
Асновы сучаснай цывілізацыі
Вучэбны дапаможнік для вучняў
сярэдніх навучальных установ

Загадчык рэдакцыі *В. В. Зань*. Рэдактар *Л. А. Цімафеева*. Вокладка мастака *М. М. Грыбава*. Мастацкі рэдактар *А. І. Раманцоў*. Тэхнічны рэдактар *Л. П. Сопат*. Карэктары *Г. М. Булат, З. М. Грышэлі, В. С. Бабеня*.

ИБ № 3385

Здадзена ў набор 12.12.91. Падпісана ў друк 14.01.92. Фармат 84×108$^{1}/_{32}$. Папера друк. № 2. Гарнітура літаратурная. Высокі друк з ФПФ. Умоўн. друк. арк. 17,64. Умоўн. фарба-адбіт. 17,85. Ул.-выд. арк. 19,03. Тыраж 65 000 экз. Заказ 1815. Цана 6 р. 80 к.

Выдавецтва «Народная асвета» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа.
220005, Мінск, Чырвоная, 23.

6 р. 80 к.

чалавек і грамадства